Летапіс беларускай шляхты



Святую веру продкаў,
свой род,
культуру і Айчыну
шануй і беражы

А. Стацкевіч-Чабаганаў

Анатоль Статкевіч-Чабаганаў



Я – сын Ваш

Мінск
«Роднае слова»

Некрашэвічы герба «Любіч»



Татуры герба «Данброва»



Сеўрукі герба «Курч»



Кернажыцкія герба «Юноша»



Мастіловічы герба «Даленга»



Мінск
«Роднае слова»

УДК 929.7:929.52(476)
ББК 63.2(4Беи)
С78

Серыя заснавана ў 2011 годзе
Заснавальнік серыі *А. В. Статкевіч-Чабаганаў*

Рэцэнзент
доктар гістарычных навук *Г. Я. Галенчанка*

Аўтар выказвае падзяку за практычную дапамогу ў падрыхтоўцы выдання акадэміку-сакратару аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі *А. А. Каваленю*, акадэміку *Р. Г. Гарэцкаму*, вучонаму сакратару камісіі па гісторыі навукі НАН Беларусі *В. А. Гапоненцы*, дырэктару Інстытута гісторыі НАН Беларусі *В. В. Даніловічу*, доктару філалагічных навук *А. В. Мальдзісу*, доктару гістарычных навук *Э. Р. Іофе*, доктару гістарычных навук *С. Я. Рассадзіну*, дырэктару Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі *А. К. Галубовіч*, супрацоўнікам архіва – *Н. А. Барсуковай*, *Г. М. Брэгеру*, *Д. В. Лісейчыкаву*, *С. А. Рыбчонку*, а таксама *У. Вяроўкіну-Шалюту*, *А. І. Дзярновічу*, *І. В. Сурмачэўскаму*, *А. А. Шумкову* (Санкт-Пецярбург).

Статкевіч-Чабаганаў, А. В.
С78 Я – сын Ваш : Некрашэвічы герба «Любіч». Татуры герба «Данброва». Сеўрукі герба «Курч». Кернажыцкія герба «Юноша». Маствіловічы герба «Даленга» / Анатоль Статкевіч-Чабаганаў. – Мінск : Роднае слова, 2012. – 592 с. : іл. – (Летапіс беларускай шляхты).
ISBN 978-985-90254-1-9

Выданне серыі «Летапіс беларускай шляхты» (знак серыі – «Страла выратавання») прысвечаны гісторыі беларускіх родаў ад найстаражытнейшых часоў да нашых дзён. Кнігі змяшчаюць кароткае апісанне і радаводныя роспісы, а таксама цікавыя факты і займальныя сюжэты з жыцця прадстаўнікоў беларускай шляхты, копіі гістарычных дакументаў і фотаздымкаў. У радаводных роспісах першы лік абазначае парадкавы нумар прадстаўніка роду, другі – ад якога продка ён паходзіць. Такая форма дае магчымасць лёгка ўбачыць і прасачыць роднасныя сувязі і ступень роднасці. Чырвоным колерам вылучаны імёны продкаў аўтара.

Гэтая кніга з'яўляецца трэцяй у серыі «Летапіс беларускай шляхты» і змяшчае апісанне родаў Некрашэвічаў, Татураў, Сеўрукаў, Кернажыцкіх, Маствіловічаў. Яна выдаецца на рускай і беларускай мовах і будзе цікавая не толькі гісторыкам, архівістам, краязнаўцам, але і шырокаму колу чытачоў.

УДК 929.7:929.52(476)
ББК 63.2(4Беи)

ISBN 978-985-90254-2-6

По благаславенні Высокапраасвяшчэннейшага
Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага,
Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі
ФІЛАРЭТА





Белорусская Православная Церковь
Митрополит Минский и Слуцкий,
Патриарший Экзарх всея Беларуси

Беларуская Праваслаўная Царква
Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі,
Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі

«...ибо, где сокровище ваше, там будет и сердце ваше» (Мф. 6, 21)

В Белорусской Православной Церкви знают Анатолия Васильевича Стецкевича-Чебоганова как одного из бескорыстных жертвователей, принимающих посильное участие в восстановлении храмов и монастырей, порушенных в периоды лихолетий. Его тщанием был сооружен скульптурный образ святой праведной Софии, княгини Слуцкой в городе Слуцке.

Обычно на вопрос, почему личные время и средства он направляет на эти цели, Анатолий Васильевич скромно, но с достоинством отвечает: «Я думаю, это от моих предков». И это не дежурный ответ, ибо его деятельность имеет еще одно благочестивое направление, которое заключается в собирании сведений о своих близких и далеких предках, в построении родового древа как по отцовской, так и по материнской линиям.

Любовь к предкам изначально свойственна всем людям, но не каждый умеет различить ее в суете взрослого сердца, когда жизнь погружает его в свои стремнины и водовороты. Но она оживает, когда пробуждается в душе желание окинуть мысленным

взором историю своего рода, составить его летописание. Она оживает, когда приходит помысел тихой молитвы о бабушке и дедушке и о всех сродниках наших как ныне живущих, так и отошедших в Вечность. Иногда эти воспоминания теплы и величественны, иногда горьки и печальны, но они всегда нам дороги. Мы ответственны не только за себя и за свое ближайшее потомство. Ответственность наша должна простираться и в глубину всего рода, дабы научаться у предков подвигу любви и веры и своими поступками не посрамить их честь; дабы нашим активным деланием исправлять имевшую иногда место бездеятельность наших прародителей, а порою – и их отступничество от праотеческой веры, от вековых обычаев и наставлений.

У Бога нет мертвых: у Него все живы! А значит, мы все – одна семья, одна земля, один народ, одна вера, один крестный жизненный путь по образу Христа Спасителя. И воскресение наше будет всеобщим. Оно уже началось, если в сердце человека луч Божественной любви не заглушается стихиями мира сего, но становится негасимым пламенем.

Мы приветствуем благочестивые намерения, воплотить которые взял на себя труд Анатолий Васильевич в данном исследовании, и надеемся, что о научных достоинствах проделанного им труда, а также о фактологической его точности сделают свои благожелательные и объективные отзывы и суждения представители научного сообщества – специалисты в этой области.

Желаю автору помощи Божией на избранном им, по зову его благочестивых предков, поприще.

С благословением



Митрополит Минский и Слуцкий,
Патриарший Экзарх всея Беларуси

30.03.2011 г.

МІНУЛАЕ – ДАЛЁКАЕ, АЛЕ СВАЁ, РОДНАЕ...

Я чалавек, як раней казалі, паспаліты і да выбранага, прывілеяванага саслоўя – шляхты – адносін, здаецца, не маю. Аднак наша гісторыя, наша супольная мінуўшчына мне таксама дарагая, як і кожнаму грамадзяніну. Таму з задавальненнем назіраю, што цікавасць да падзей мінулага ў нашым грамадстве расце, што шэрагі гісторыкаў, краязнаўцаў пашыраюцца. Гісторыя – частка культуры, без якой мы не можам усвядоміць сябе, адказаць на фундаментальнае пытанне духоўнага кшталту – хто мы такія? Спасціжэнне гісторыі, даследаванне яе ўрокаў, досведу дазваляюць знайсці ў мінулым неабходную апору для сучаснасці, глыбей зразумець нерэалізаваныя, упушчаныя магчымасці і свой патэнцыял.

Усё гэта добра вядома Анатолю Статкевічу-Чабаганаву, які, апроч таго што з’яўляецца годным прадстаўніком шляхецкага роду, заявіў пра сябе як грунтоўны гісторык, наследнік старадаўняга летапісца Нестара, аўтара славутай «Аповесці мінулых гадоў».

Анатоль Статкевіч-Чабаганаў паставіў перад сабой высакародную і амбітную мэту – шляхціч! – стварыць маштабны летапіс беларускай шляхты. Першы том пад назвай «Я – сын Ваш: Статкевічы, Сацкевічы-Статкевічы герба “Касцеша” і Карафа-Корбуты герба “Корчак”» выйшаў у 2011 г. і быў станоўча ацэнены грамадскасцю.

Вяртанне да родных вытокаў... Але Анатоль Васільевіч, здаецца, ніколі з імі не парываў, не разлучаўся. Яны, у першую чаргу, у постацях самавітых продкаў, у адзіным радаводным дрэве, духоўнай спадчыне, якую зберагаюць архіўныя сховішчы, сямейныя паданні, старыя партрэты і фатаграфіі, надмагільныя помнікі.

Дзяржаўныя мужы, руплівыя працаўнікі, смелыя воіны – абаронцы Айчыны, навукоўцы... Нямала такіх і ў новым томе, які вы, паважаны чытач, трымаеце сёння ў руках.

Кожны з іх пранёс праз час, што выпаў на яго долю, свае мары, надзеі, страты, смутак і боль, спадзяваўся, жыў і змагаўся. Наша гісторыя ніколі не была простай, а яна ж заўсёды складаецца з чалавечых жыццяў, чалавечай дзейнасці, абумоўленай і пазначанай сваім часам.

Узяць, напрыклад, Сцяпана Міхайлавіча Некрашэвіча (1883 – 1937) – аднаго з герояў гэтага тома. Пра род Некрашэвічаў герба «Любіч», звязанага сваяцкімі сувязямі з іншымі шляхецкімі родамі, А. Статкевіч-Чабаганаў піша: «Няпростая была ў прадстаўнікоў гэтага роду доля. За многія стагоддзі яны спазналі славу і веліч, узлёты і падзенні. Але ніводны дакумент не расказаў пра несумленнасць, дбанне пра асабістую выгоду, здраду і зайздрасць. Наадварот, заўсёды гаворка ідзе пра “высакароднасць паходжання”, працалюбства і адданасць абавязку. С. М. Некрашэвіч – аўтарытэтны беларускі мовазнавец, арганізатар навукі ў рэспубліцы, заслугі яго перад Беларуссю вялікія. Ён меў непасрэднае дачыненне да стварэння Інстытута беларускай культуры (1922), з’яўляўся яго старшынёй, а затым і віцэ-прэзідэнтам Беларускай акадэміі навук і акадэмікам. У 1930 г. ён быў арыштаваны, высланы ва Удмурцкую АССР, затым, у 1937 г., арыштаваны паўторна і прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Прысуд быў выкананы літаральна назаўтра».

Постаць беларускага вучонага-адраджэнца С. М. Некрашэвіча здзіўляе сваёй веліччу, высакароднасцю, патрыятычнымі памкненнямі і трагізмам.

«У біяграфіі Сцяпана Некрашэвіча, – адзначаў гісторык-краязнавец В. Раманцоў, – ёсць усё: гонар, слава, патаемнае і жах. Яна прымушае захапляцца, здзіўляцца, засмучацца, шкадаваць і пакутаваць. На прыкладзе жыццёвага шляху Некрашэвіча можна вывучаць гісторыю Беларусі пачатку XX стагоддзя». З гэтым нельга не пагадзіцца.

Цікава прачытаць у гэтым томе летапісу А. Статкевіча-Чабаганава і пра род Татураў герба «Данброва», які таксама вядзе свой пачатак з сівой даўніны і які даў свету нямала выдатных асобаў, у тым ліку вядомага археолага Генрыха Татура.

Я меў гонар быць блізка знаёмым, нават сябраваць, з цудоўным пісьменнікам-перакладчыкам Міколам Татурам, але нават не здагадваўся, што перада мной шляхціч, ды яшчэ такога шаноўнага роду. У даведніку «Пісьменнікі Савецкай Беларусі» (Мінск, 1981) пра яго сказана: «Мікола (Мікалай Ігнатавіч) Татур нарадзіўся 03.03.1919 г. ва ўрочышчы Застар’е Клічаўскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям’і». Цяпер, дзякуючы росшукам А. Статкевіча-Чабаганава, мы ведаем, што нарадзіўся Мікола Татур не «ва ўрочышчы Застар’е», а «ў маёнтку Урочышча Застар’е» ў сям’і былога афіцэра царскай арміі. Мікола Ігнатавіч усё жыццё з годнасцю прадстаўляў свой род, у час Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у партызанскім руху, быў цяжка паранены і доўга лячыўся ў шпіталях, узнагароджаны ордэнамі і медалямі, але пра свае заслугі гаварыць не любіў, быў чалавекам вельмі сціплым. Шмат працаваў, перакладаў мастацкія тэксты з рускай і польскай моў, з’яўляўся дырэктарам Бюро прапаганды мастацкай

літаратуры Саюза пісьменнікаў Беларусі. Даведаўшыся, што Мікола Ігнатавіч Татур належаў да такога слаўнага роду, я неяк па-іншаму пачаў успрымаць незабыўную постаць гэтага чалавека...

Трэба адзначыць, што акрамя родаў Некрашэвічаў і Татураў у гэтым томе даследаваны таксама за перыяд больш чым пяцьсот гадоў роды Кернажыцкіх, Маствіловічаў, Сеўрукаў з Сотвы Курчэвічаў.

Цікава, што прадстаўнік старажытнага роду Кернажыцкіх герба «Юноша» палкоўнік Ленарт Кернажыцкі ў другой палове XVI ст. ажаніўся з Раінай Маствіловіч, падчашанкай троцкаю са знакамітага шляхецкага роду, вядомага ў ВКЛ яшчэ з XIV ст.

Як відаць з даследавання Анатоля Статкевіча-Чабаганава, Маствіловічы, якія паходзілі з Жамойцкай зямлі, у ліку іншых 48 родаў ВКЛ каталіцкага паходжання атрымалі герб «Даленга» ў час Гарадзельскай уніі ў 1413 г.

Продкі А. Статкевіча-Чабаганава таксама беражліва захоўвалі звесткі пра сваё мінулае. Ён часта ўзгадвае Васіля Міхайлавіча Курчэвіча-Сеўрука, які зрабіў значную працу па даследаванні свайго старажытнага роду: «Я сколько могъ, то и открылъ потемки для потомковъ, хотя быть можетъ ни одинъ не помянетъ и добрымъ словомъ за трудъ». Магчыма, за горыччу гэтых слоў хаваецца надзея і вера Васіля Міхайлавіча, што ўсё ж такі знойдзецца нехта з нашчадкаў, які прадоўжыць яго працу.

Хочацца зазначыць, што мара родзіча аўтара гэтай кнігі збылася.

Анатоль Статкевіч-Чабаганаў заклікае і кожнага з нас зірнуць нераўнадушным позіркам у мінулае, успомніць сваіх «дзядоў», аддаць ім належнае, ушанаваць памяць, каб не страціць з імі духоўнай сувязі, каб далёкае мінулае аднойчы стала родным і блізкім...

Вгниломедов

Уладзімір Гніламёдаў,
доктар філалагічных навук,
акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Некрашэвічы герба «Любіч»





Герб «Любіч»
роду Некрашэвічаў.

Прадстаўнікі дваранскага роду Некрашэвічаў знаходзіліся ў шматлікіх сваяцкіх сувязях з Карафа-Корбутамі, Рудзінскімі, Тычынамі. Гэта добра відаць з іх радаводнага роспісу. У маіх пра...прабабуль Матроны Грыгор'еўны, Агаф'і Фёдараўны і Арыны Данілаўны, народжаных Некрашэвіч, быў агульны продак – Павел Сямёнавіч Некрашэвіч. Агаф'я Фёдараўна стала жонкай Гервазія Тычыны, Матрона Грыгор'еўна – жонкай яго сына Якава, Арына Данілаўна выйшла замуж за Сцяпана Рудзінскага.

Вывучыўшы карані знакамітага прадстаўніка роду Некрашэвічаў – першага віцэ-прэзідэнта Акадэміі навук БССР Сцяпана Міхайлавіча Некрашэвіча (1883 – 1937), я выявіў, што ўсе тры мае пра...прабабулі – яго блізкія родзічы.

Акрамя таго, высветлілася, што ў Сцяпана Міхайлавіча ёсць прамыя продкі з нашага роду Карафа-Корбутаў: яго прапрабабуля, Агата Васільеўна, даводзілася роднай сястрой Івану Васільевічу Карафа-Корбуту, дзеду Наталлі Васільеўны – маёй прабабулі.

Вядома, што многія з Некрашэвічаў былі злучаны сваяцкімі сувязямі з выбітнымі асобамі беларускай інтэлігенцыі.

Так, дачка Алены Грыгор'еўны Некрашэвіч, дваюраднай сястры Сцяпана Міхайлавіча Некрашэвіча, Алена Міхайлаўна стала жонкай народнага паэта БССР Петруся Броўкі.

Зарына Уладзіміраўна Кулеўская, унучатая пляменніца Сцяпана Міхайлавіча, выйшла замуж за сына Якуба Коласа Данілу Міцкевіча.


Многія цікавыя старонкі з гісторыі роду Некрашэвічаў, схаваныя ў далечыні стагоддзяў, адкрыліся мне дзякуючы архіўным матэрыялам.




Сцяпан Міхайлавіч Некрашэвіч. Мінск. 1920-я гг. (гл. «Некрашэвічы» 325/275).

Няпростая была ў прадстаўнікоў гэтага роду доля. За многія стагоддзі яны спазналі як узлёты, так і падзенні. Але ніводны дакумент не расказаў пра несумленнасць, дбанне пра асабістую выгоду, здраду і зайздрасць. Наадварот, заўсёды гаворка ідзе «пра высакароднасць паходжання», працалюбства і адданасць абавязку.

Нават герб «Любіч», якім карысталіся Некрашэвічы, сведчыць, паводле польскіх летапісцаў, пра вялікія ваенныя паслугі, аказаныя Айчыне ў старажытныя часы, і «абаронен дваранскай перавагай». А ў гербе тым: у блакітным полі «ў шчыце падкова ўніз гакамі пастаўленая», на ёй – кавалерыйскі крыж, другі крыж у сярэдзіне падковы, над прылбіцай з каронай – тры страусавыя пёры. Ужо самі элементы герба – і шчыт, і шлем, і падкова, і кавалерыйскі крыж – гавораць пра тое, кім былі яго ўладальнікі. Адна са старажытных грамат расказвае, што харунжаму Сямёну Некрашэвічу самім каралём польскім Жыгімонтам III Вазам «дозволено купить от Василия Сегеня землю Лопоце называемую». А народжаны ад Сямёна сын Павел па духоўным завяшчанні 1639 г. «отказал своим трем сыновьям – Христофору, Ивану и Никифору вотчинное имение Некращевизна именуемое, имение же Лопоце, отцом Семеном приобретенное, записал из тех сыновей своих двум последним».





Радаводнае дрэва Некрашэвічаў. *НГАБ, ф. 319, воп. 1, спр. 1173.*



Алена Грыгор'еўна Некрашэвіч. Рэчыца. 25.09.1910 г. *З архіўных матэрыялаў Дзяржаўнага літаратурнага музея Петруся Броўкі* (гл. «Некрашэвічы» 341/280).



Міхаіл Антонавіч Радзеўскі – муж Алены Грыгор'еўны Некрашэвіч. 1907(?) г. *З архіўных матэрыялаў Дзяржаўнага літаратурнага музея Петруся Броўкі.*

Такім чынам, Сямён Некрашэвіч знаходзіўся ў пашане ў самога караля Жыгімонта III Вазы. І нашчадкі Сямёна не былі абдзелены ўвагай высокіх заступнікаў. Як відаць з прывілеяў польскіх каралёў 1647 і 1654 гг., унук Сямёна Хрыстафор меў званне чашніка, адзін з праўнукаў, Сідар, быў стольнікам, а другі праўнук, Самуіл (Сцяпан), па прывілеі 1689 г. польскага караля Яна III Сабескага знаходзіўся на пасадзе пасланніка Чарнігаўскага ваяводства.

Тут важна ўдакладніць, што ад названых вышэй сыноў Сямёна Некрашэвіча і пайшлі галіны родаў маіх прабабуль: ад Івана – галіна Агаф'і, ад Хрыстафора – Арыны (як і акадэміка Сцяпана Міхайлавіча Некрашэвіча), ад Нікіфара – Матроны.

Некрашэвічы і ў наступных стагоддзях былі людзьмі паважанымі, мелі маёмасць і зямельныя надзелы. Гэта пацвярджае пастанова Мінскага дэпутацкага дваранскага сходу ад 9 сакавіка 1854 г., у адпаведнасці з якой

АТТЕСТАТЪ.

Атэстат Алены Грыгор'еўны Некрашэвіч аб заканчэнні Парыцкага жаночага вучылішча духоўнага ведамства. 18.05.1906 г.
З архіўных матэрыялаў Дзяржаўнага літаратурнага музея Петруся Броўкі.



Пятрусь Броўка,
народны паэт БССР.
Мастак М. І. Гусеў. 1958 г.
З калекцыі А. Статкевіча-Чабаганава.

прадстаўнікі роду Лявон, Антон і Лаўрэнцій Некрашэвічы прызнаны «ў дваранскай годнасці».

Малая радзіма Некрашэвічаў – гэта слуцкі рэгіён з яго наваколлем: зямля «Лопоце называемая», маёнтак Некрашэўшчызна, засценкі Сыцянец, Кулакі, Млынка, Куляшы, Шабунькі. Назвы некаторых мясцін захаваліся і сёння. Ды і цэрквы, прыхаджанамі якіх былі Некрашэвічы, – Старобінская Мікалаеўская, Цараўская Іаана-Багаслоўская, Прусаўская Раство-Багародзіцкая, Пагосцкая Іаана-Прадцечанская – знаходзіліся недалёка адна ад адной.

З часам, калі сем'і павялічваліся і кожнаму сыну трэба было даць свой надзел зямлі, прыйшлося Некрашэвічам асвойваць новыя мясціны.



Злева направа: Алена Міхайлаўна Радзеўская, дачка Алены Грыгор'еўны Некрашэвіч, Юрый Пятровіч Броўка, Пётр Усцінавіч Броўка. Масква. 1947 г. *Фота з архіва Дзяржаўнага літаратурнага музея Петруся Броўкі.*

Нехта паехаў на Мазыршчыну, нехта – на Бабруйшчыну, а продкі Сцяпана Міхайлавіча Некрашэвіча перабраліся пад Парычы разам з Карафа-Корбутамі і Рудзінскімі, з якімі былі ў блізкім сваяцтве. Жылі ў засценках Віктарын, Дражня, Майсееўка, Данілаўка. Па архіўных дакументах добра прасочваюцца прычыны і час пераездаў, відаць, як пашыраецца і ўмацоўваецца род, як маладыя сем'і пакідаюць вотчыны і абжываюцца на новых надзелах.

Адметны той факт, што адзін з Некрашэвічаў, сын Нікіфара-Нікадзіма Некрашэвіча і Агаты Васільеўны Карафа-Корбут Самуіл, які пакінуў родавае гняздо і пераехаў у пошуках лепшай долі пад Парычы, выбіраць жонку ўсё ж вярнуўся на Случчыну. Яго спадарожніцай стала Ірына Сямёнаўна з роду Івашкевічаў, прабабуля акадэміка С. Некрашэвіча. Вянчанне адбывалася ў Пагосцкай Срэценскай царкве 8 студзеня 1822 г.



Рака Бярэзіна. 1913 г. *Фота Г. А. Блюміна з альбома выхаванак Парыцкага жаночага вучылішча духоўнага ведамства.* У вучылішчы выхоўваліся і прадстаўніцы роду Некрашэвічаў.

«...Смотрите, какая тихая сегодня река. Как зеркало гладкая, как стеклышко чистая. Как картина вверх ногами – смотри, как красиво в ней отражаются облака, какое высокое и ясное в воде небо».

Ваня Бароўскі.

У акладных лістах дадатковых збораў з дробнапамесных уладальнікаў трэцяга стану Бабруйскага павета за 1893 г. значылася некалькі Некрашэвічаў. Грыгорый Некрашэвіч валодаў фальваркам Лучак, а ў ім – 40 дзесяцін зямлі, 32 – лесу. У Івана Некрашэвіча з фальварка Сялец было 25 дзесяцін зямлі і 25 – лесу. У Нікіфара Некрашэвіча, уладальніка фальваркаў Баравое і Пагарэлае, – 30 дзесяцін зямлі і 11 – лесу. У журнале генеральнай праверкі гандлёвых і прамысловых прадпрыемстваў Забалоцкай воласці Бабруйскага павета Мінскай губерні за 1894 г. таксама знаходзім прозвішчы Некрашэвічаў. Адзін з іх, Грыгорый, «апякае пастаялы двор у вёсцы Закальное на зямлі княгіні Гагенлоэ». Там у яго два памяшканні і «адзін даход, сума гадавога абароту 2500 рублёў, сума чыстага прыбытку 500 рублёў».



Сцяпан Міхайлавіч Некрашэвіч. Мінск. 1920-я гг.

А ўвогуле ўласную зямлю мелі многія з роду Некрашэвічаў. Яскравае сведчанне гэтаму – спіс землеўладальнікаў Мінскай губерні за 1876 г., дзе сустракаюцца Пётр, Сцяпан, Фёдар, Васіль і Іван Некрашэвічы. Выкупілі яны хто 177, хто 117 дзесяцін зямлі ў двух паветах: Мазырскім і Бабруйскім. Дарэчы, у Бабруйскім павеце праз дзесяць гадоў ужо значылася 12 землеўладальнікаў з роду Некрашэвічаў.

У маёнтку Данілаўка гэтага ж павета, што за некалькі кіламетраў ад Парычаў, грунтоўна ўладкаваўся і Міхаіл Некрашэвіч. Ён меў значны надзел зямлі – 334 дзесяціны (прыкладна 350 *га*). 26 красавіка 1883 г. у Міхаіла нарадзіўся сын Сцяпан, якога сёння ведаюць не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі. Выбітны вучоны-мовазнавец, аўтар шматлікіх навуковых прац, кніг і слоўнікаў, ён неаднаразова прыязджаў на малую радзіму, каб яшчэ і яшчэ раз прыслухацца да каштоўных крыніц народнай мовы.



Парыцкая Свята-Духава царква Бабруйскага павета. Разбурана бальшавікамі. 1913 г.
Фота Г. А. Блюміна.

Храм, которого нет

Паричи, святая высота...
Синева прибрежная увяла.
Ничего не скажет пустота
Здесь, где церковь Пущиных стояла.

Даже ощущения вины,
Призрачности даже не осталось.
Вместо белокаменной стены –
Воздуха измученная вялость...

Изяслав Котляров.

Дзівосны Парыцкі край знакаміты сваёй старажытнай гісторыяй і цікавымі людзьмі.

Першае пісьмовае згадванне пра вёску Парычы сустракаецца ў 1639 г. у «інвентарным спіску» Бабруйскага староства ВКЛ. Ішлі гады, і Парычы ператварыліся ў мястэчка, што разрасталася, напаўнялася людзьмі. Тут з'явілася шматлікая яўрэйская абшчына, пачалі будавацца школа, бальніца, запрацавалі вінакурня, канатны і цукровы заводы, ажыла прыстань – у тыя часы найбуйнейшая ва ўсёй акрузе. Тут ішоў даволі прыбытковы гандаль лесам.



Памятны камень Сцяпану Міхайлавічу Некрашэвічу каля хаты, дзе ён жыў. Побач А. Статкевіч-Чабаганаў. Вёска Данілаўка. 2007 г.

У цэнтры мястэчка віравала вялікая базарная плошча з бакалейнымі, скабянымі і галантарэйнымі крамамі. Вакол размяшчаліся корчмы і дамы гандляроў. У Парычах і сёння памятаюць, якія людныя кірмашы праводзіліся тут у тыя далёкія часы. Прадавалася-куплялася ўсё: тытунь, посуд, мыла, свечкі, дары палёў і лясоў, мануфактурныя тавары, а таксама рыба, коні і многае іншае.

У тыя часы ў Парычах дзейнічала некалькі праваслаўных храмаў, касцёл і сінагога.

Адраджэнне мястэчка супала з новым гістарычным перыядам. Пасля далучэння ў 1793 г. гэтай часткі беларускіх зямель да Расійскай імперыі яно было падаравана імператарам Паўлам І свайму фавурыту і прыдворнаму вяльможу адміралу Пятру Іванавічу Пушчыну. Род Пушчыных праславіўся на палях бітваў, а таксама праз знакамітых дзекабрыстаў – братоў Івана і Міхаіла. Іх бацька, генерал-лейтэнант і сенатар Іван Пятровіч Пушчын, пабудаваў у Парычах царкву ў гонар Святога Духа. У плане яна нагадвала прадаўгаваты крыж. Пры сыне Івана Пушчына Міхаіле была складзена белакаменная царква, прыхаджанамі якой з'яўляліся некалькі пакаленняў Некрашэвічаў. У ёй 2 студзеня 1850 г. хрысцілі Міхаіла Паўлавіча – бацьку акадэміка



Выпуск выхаванак Парыцкага жаночага вучылішча духоўнага ведамства. 30.05.1913 г.
Фота Г. А. Блюміна.

Сцяпана Некрашэвіча, а 7 ліпеня 1915 г. адпявалі яго маці – Еву Дзмітрыеўну.

Іван Пушчын быў адным з тых афіцэраў, хто выйшаў 14 снежня 1825 г. на Сенацкую плошчу. Ён сябраваў з Аляксандрам Пушкіным яшчэ з часоў вучобы ў Царскасельскім ліцэі. Гэта менавіта пра Івана Пушкін пісаў: «Мой первый друг, мой друг бесценный!»

Неабходна адзначыць, што Пушчыны шмат зрабілі для Парычаў, і асабліва Марыя Якаўлеўна, жонка Міхаіла Пушчына. Яна арганізавала хор дзяўчынак пры мясцовай праваслаўнай царкве і адкрыла першае жаночае вучылішча Святой Марыі Магдалены, выхаванкай якога была і Алена Грыгор'еўна Некрашэвіч, дваюрадная сястра акадэміка Сцяпана Міхайлавіча Некрашэвіча, а таксама некаторыя іншыя прадстаўніцы гэтага роду.



Сцяпан Міхайлавіч Некрашэвіч (у другім радзе справа) з таварышамі па службе. Першая сусветная вайна. 1916 г.

[illegible]

Некрашевич Степан Михайлович

Адваротны бок фатаграфіі. Тэкст і подпіс Сцяпана Міхайлавіча Некрашэвіча.

5/I 22.
Минск

Высокоуважаемый
Профессор!

Перед отъездом из Минска Вы высказали опасение перед [illegible] снова приехать в Минск. Долго ждал Вас, чтобы лично побеседовать с Вами об Институте Белорусской культуры и предложить Вам занять должность директора института. Не дождавшись Вас, обращаюсь к Вам с этим предложением письменно. Надеюсь, что Вы, дорогой профессор, не откажете в просьбе Акад. Центра и всего Белорусского гражданства

Ліст старшыні Акадэмцэнтра Наркамасветы БССР С. М. Некрашэвіча акадэміку Я. Ф. Карскаму з прапановай стаць дырэктарам Інбелкульта (на 2 старонках).
Фонд Музея гісторыі НАН Беларусі.

и согласиться по прежнему
работать над исследованием
белорусского языка, руково-
дить группою в области этих
исследований и одновремен-
но с этим подготовлять
тот профессорский кадр,
который так необходим для
Белорусского Университета и
вообще всей Белоруссии.

Глубоко уважающий
Вас С. Некрашевич

P.S. Поступило ходатайство
перед Совнаркомом об
ассигновании Романову
5 милл. руб. Когда получится
постановление, переведу
его в Минск.

Багаты на гісторыю і культуру Парыцкі край, што захоўвае мноства старажытных таямніц, стаў той крыніцай, з якой Сцяпан Міхайлавіч Некрашэвіч чэрпаў натхненне для сваёй шматграннай працы.

Беларускі мовазнавец прайшоў вялікую і складаную дарогу жыцця. Першапачатковую адукацыю ён атрымаў у сваёй Данілаўцы ад вясковага «дарэктара». А потым былі Панявежская настаўніцкая семінарыя, Віленскі настаўніцкі інстытут. Аднак працаваць па спецыяльнасці Сцяпану Некрашэвічу давялося нядоўга. Пачалася Першая сусветная вайна, і маладога настаўніка прызвалі ў армію. У 1917 г. пасля лютаўскай рэвалюцыі добра адукаваны, разважлівы і разумны салдат быў выбраны членам армейскага камітэта 6-й арміі Румынскага фронту.

Гэта прывяло яго потым у Адэсу. Прыехаўшы на канферэнцыю, Сцяпан Некрашэвіч затрымаўся ў паўднёвым украінскім горадзе на некалькі гадоў, працуючы на карысць роднай Беларусі. Пад яго кіраўніцтвам быў створаны і дзейнічаў Беларускі нацыянальны камісарыят, які дапамагаў салдатам-беларусам. А калі была абвешчана Беларуская Народная Рэспубліка, С. Некрашэвіч стаў яе прадстаўніком у гэтым рэгіёне.

Працуючы ў губернскім аддзеле народнай асветы Адэсы, Сцяпан Некрашэвіч змог адкрыць «30 пачатковых беларускіх школ і беларускую змешаную гімназію ў складзе першых чатырох класаў». Такія лічбы здаюцца неверагоднымі, калі ўспомніць час і месца, дзе гэта ўсё адбывалася!

Пэўна, Сцяпан Міхайлавіч зразумеў сваё прызначэнне, убачыў свой шлях. І, вярнуўшыся на радзіму ў 1920 г., з вялікім натхненнем узяў удзел у развіцці нацыянальнай культуры, стварэнні сучаснай літаратурнай мовы. Пачалося дзесяцігоддзе напружанай працы.


У студзені 1922 г. Сцяпан Некрашэвіч звярнуўся да прафесара Яўхіма Фёдаравіча Карскага, які тады жыў у Петраградзе, з пісьмовай прапановай заняць пасаду дырэктара Інстытута беларускай культуры і, як і раней, працаваць над даследаваннем беларускай мовы, а таксама кіраваць іншымі вучонымі ў галіне такіх даследаванняў і рыхтаваць прафесарскія кадры.

Яўхім Фёдаравіч Карскі адказаў Некрашэвічу як дарагому земляку, што «всеми силами готов поработать на благо нашей Белоруссии», але ў Мінску цяжка займацца навуковай дзейнасцю, а ў Петраградзе ён можа зрабіць значна больш для Беларусі. Карскі абяцаў прыязджаць у Мінск, каб дзяліцца сваімі вопытам і ведамі.

І сапраўды, Яўхім Карскі шмат у чым дапамог маладым вучоным у перыяд станаўлення беларускай навукі.



Гаўрыла Гарэцкі і Сцяпан Некрашэвіч. Мінск. 1926 г.



Минск
Акцентр Наркомпросбела 68
Агульны сход студэнтаў беларусаў Масквы адчыняючы беларускі клюб шчыра вітае адчыненьне інстытуту беларускае культуры і жадае карысны працы
№52 Старшыня Гарэцкі

Москва, Малая Никитская 18, тел. 2-88-00

Вітанне студэнтаў-беларусаў Масквы ў сувязі з адкрыццём Інстытута беларускай культуры. 1922 г.


1

2

3

4

5

6


7

8

9













1. С. М. Некрашэвіч, старшыня Інбелкульта (1922–1925).
2. У. М. Ігнатоўскі, прэзідэнт Інбелкульта (1925–1928).
3. В. Ю. Ластоўскі, неадменны сакратар Інбелкульта (1927–1928).
4. І. Д. Луцэвіч (Янка Купала), правадзейны член Інбелкульта.
5. К. М. Міцкевіч (Якуб Колас), правадзейны член Інбелкульта.
6. Я. Ю. Лёсік, правадзейны член Інбелкульта.
7. Д. Ф. Жылуновіч (Цішка Гартны), правадзейны член Інбелкульта.
8. Б. І. Эпімах-Шыпіла, правадзейны член Інбелкульта.
9. У. І. Пічэта, правадзейны член Інбелкульта.
10. М. І. Гарэцкі, правадзейны член Інбелкульта.
11. Г. І. Гарэцкі, правадзейны член Інбелкульта.
12. І. І. Замоцін, правадзейны член Інбелкульта.
13. М. М. Дурнаво, правадзейны член Інбелкульта.
14. С. Л. Гельтман, правадзейны член Інбелкульта.
15. С. Ю. Матулайціс, загадчык кафедры гісторыі Літвы.

Фонд Музея гісторыі НАН Беларусі.

У верасні 1926 г. Сцяпан Некрашэвіч разам з Гаўрылам Гарэцкім узяў удзел у святкаванні 20-годдзя беларускай прэсы, якое арганізаваў Віленскі беларускі нацыянальны камітэт, а незадоўга да гэтага яны разам пабывалі ў замежнай камандзіроўцы – у Польшчы і Германіі. Паездка прайшла, як адзначае Радзім Гарэцкі ў кнізе «Браты Гарэцкія», вельмі паспяхова. На той час Гаўрыла Гарэцкі быў дацэнтам, загадчыкам кафедры сельскагаспадарчай эканоміі і эканамічнай геаграфіі, сябрам праўлення Беларускай дзяржаўнай акадэміі сельскай гаспадаркі ў г. Горкі. А яго брат, вядомы пісьменнік Максім Гарэцкі, у лютым 1926 г. з сям'ёй пераехаў у Горкі, дзе яму прапанавалі ўзначаліць кафедру беларускай мовы і літаратуры той жа навучальнай установы, у якой да гэтага працаваў яго брат Гаўрыла Гарэцкі. Адпрацаваўшы там каля двух гадоў, Максім вярнуўся ў Мінск на пасаду вучонага спецыяліста Інстытута беларускай культуры.

Так здарылася, што Інбелкульт мабілізаваў навуковыя сілы Беларусі, аб'яднаўшы вакол сябе найлепшыя кадры вучоных, якія цесна супрацоўнічалі з многімі навуковымі ўстановамі Савецкага Саюза. З цягам часу ўзнікла неабходнасць у правядзенні больш глыбокіх даследаванняў у розных галінах навукі. Для інтэнсіўнага развіцця навуковай дзейнасці ў беларускай культуры патрабавалася ўстанова новага тыпу – акадэмія.

У 1928 г. у Маскве на пасяджэнні Палітбюро Цэнтральнага камітэта Усесаюзнай камуністычнай партыі бальшавікоў была задаволена просьба Беларусі аб перайменаванні Інстытута беларускай культуры ў Акадэмію навук. Рашэнне падпісаў сакратар ЦК І. В. Сталін.

Пастановай Савета народных камісараў (старшыня М. Галадзед) і Цэнтральнага выканаўчага камітэта БССР (старшыня А. Чарвякоў) ад 13 кастрычніка 1928 г. Інстытут беларускай культуры быў рэарганізаваны ў Акадэмію навук. Гэтай жа пастановай урадавай камісіі было даручана завяршыць рэарганізацыю да 10-годдзя стварэння БССР.

У склад урадавай камісіі ад Інстытута беларускай культуры ўвайшлі У. Ігнатоўскі і С. Некрашэвіч. Быў распрацаваны Статут акадэміі, створаны Прэзідыум і асабовы склад правадзейных членаў установы.

Трэба адзначыць, што Сцяпан Некрашэвіч актыўна займаўся і навуковай, і грамадскай дзейнасцю. Ён неаднаразова выбіраўся дэпутатам усебеларускіх з'ездаў Саветаў, членам Цэнтральнага выканаўчага камітэта БССР, з'яўляўся старшынёй першай шматгаліновай

2

ПРОТОКОЛ № 46

ЗАСЕДАНИЯ ПОЛИТБЮРО ЦК ВКП(б) от 11-го ОКТЯБРЯ 1928 ГОДА.

ПРИСУТСТВОВАЛИ:

Члены ПБ ЦК ВКП:	т.т.Калинин,Молотов,Рыков,Сталин.
Канд.в члены ПБ:	т.т.Каганович,Микоян.
Члены Ц.К.В.К.П:	т.т.Бауман,Бубнов,Догадов,Кржижановский,Кубяк,Менжинский,Михайлов, Пятницкий,Рухимович,Смирнов А.П., Сокольников,Сулимов,Толоконцев.
Канд.в члены ЦК:	т.т.Брюханов,Криницкий,Межлаук, Мельничанский,Уншлихт.
Члены През. ЦКК:	т.т.Орджоникидзе,Сольц,Шкирятов,Яковлев,Янсон.

Слушали:	Постановили:
РЕШЕНИЯ ПОЛИТБЮРО ОТ 8.Х.28 г.	
21.- Просьбу ЦК Белоруссии о переименовании Института Белорусской Культуры в Академию Наук.	21.- Удовлетворить.

СЕКРЕТАРЬ ЦК [signature]

164-с

Пратакол пасяджэння Палітбюро ЦК УКП(б) ад 11.10.1928 г. аб перайменаванні Інстытута беларускай культуры ў Акадэмію навук. *Расійскі дзяржаўны архіў сацыяльна-палітычнай гісторыі (РДАСПГ), ф. 17, воп. 3, спр. 1814, арк. 2.*



Злева зверху. Супрацоўнікі Інбелкульта. Злева направа, першы рад: Я. Купала, А. Круталевіч, Я. Лёсік, С. Некрашэвіч, У. Чаржынскі, В. Шэмпель, М. Байкоў; другі рад: М. Грамыка, Л. Більдзюкевіч, Ч. Родзевіч, Я. Колас, К. Гадыцкі-Цвірко, Я. Дыла. 1922 г. *Фонд Музея гісторыі НАН Беларусі.*
Справа зверху. Удзельнікі першай Усебеларускай краязнаўчай канферэнцыі. Лістапад 1924 г. *Фонд Музея гісторыі НАН Беларусі.*
Справа знізу. Супрацоўнікі Інбелкульта. Злева направа, першы рад: М. Азбукін, У. Чаржынскі; другі рад: Ч. Родзевіч, В. Міхальскі, С. Некрашэвіч, Я. Купала, Я. Колас; трэці рад: А. Круталевіч, М. Гуткоўскі, М. Грамыка. 1925 г. *Фонд Музея гісторыі НАН Беларусі.*

навукова-даследчай установы краіны – Інстытута беларускай культуры. З 26 снежня 1928 г. Сцяпан Некрашэвіч быў зацверджаны правадзейным членам і першым віцэ-прэзідэнтам Акадэміі навук БССР. Яшчэ праз год – ён дырэктар Інстытута мовазнаўства. Здавалася б, такая нагрузка, столькі спраў і абавязкаў... Але малады акадэмік паспяваў ствараць кнігі і слоўнікі, весці вялікую навуковую працу, выдаваць даследаванні па мовазнаўстве. Вынікам яго дзейнасці стала навуковая праца «Да характарыстыкі беларускіх гаворак Парыцкага раёна» (1929).


Першая Ўсебеларуская Краязнаўчая Конфэрэнцыя
Лістапад 1924 году





Сядзяць: першы справа Сцяпан Міхайлавіч Некрашэвіч, трэці справа Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч (Якуб Колас). 1920-я гг. *Фонд Музея гісторыі НАН Беларусі.*



Стаіць другі справа Сцяпан Міхайлавіч Некрашэвіч. 1920-я гг. *Фонд Музея гісторыі НАН Беларусі.*



Злева направа: Міхась Лынькоў, Якуб Колас,
Пятрусь Броўка. 1950-я гг.


Навуковец неаднаразова наведваў малую радзіму. Менавіта ў гэтым рэгіёне ён змог адчуць усю паўнату і першародную прыгажосць роднай мовы. Нездарма сэнсам жыцця Сцяпана Міхайлавіча стала адраджэнне беларускай мовы. Гэта зблізіла яго з такімі выбітнымі прадстаўнікамі беларускай культуры, як Янка Купала, Якуб Колас, Змітрок Бядуля, Кандрат Крапіва. Яны працавалі разам, і мы бачым іх побач на многіх фотаздымках таго часу.

Аднак грамадства было ўжо напярэдадні вялікай бяды: бальшавікі пачалі рыхтаваць новую вайну супраць свайго народа. Пакуль гэта былі толькі першыя хвалі, першыя прыкметы...

Сцяпан Міхайлавіч, напэўна, адчуваў гэта: невыпадкова летам 1930 г. яны разам з акадэмікам Вацлавам Ластоўскім накіраваліся ў навуковую камандзіроўку ў далёкую Томскую вобласць, дзе планавалі вывучаць жыццё і побыт беларускіх перасяленцаў. Але для ўсёмагутных рэпрэсіўных органаў не існавала вялікіх адлегласцей.



Сцяпан Міхайлавіч Некрашэвіч
з жонкай Марыяй Сяргееўнай
Ціманьковай. 1929 г.



ПРАТАКОЛ № 21/1.

Пасяджэньня Прэзыдыуму Беларускай Акадэміі Навук
ад 13.VIII.1930 г.

ПРИСУТНІЧАЛІ: т.т. Ігнатоўскі, Пезок, Вялуга і пры адпаведных пытаньнях Круноўскі і Гафштэйн.

1. Слухалі: Аб зьняцьці з адказных пасад у БАН ак. Некрашэвіча.
1. Пастанавілі: Прымаючы пад увагу антысавецкую работу ак. Некрашэвіча С. М., выключыць яго са складу члена Прэзыдыуму БАН і зьняць з пасады старшыні Аддзелу Гуманітарных Навук, з пасады дырэктара Інстытуту мовы і старшыні Слоўнікавай і Аспіранскай камісіі, аб чым прасіць СНК БССР зацьвердзіць гэту пастанову.

2. Слухалі: Аб зьняцьці з адказных пасад у БАН акадэмікаў Лёсіка і Ластоўскага В.
2. Пастанавілі: Прымаючы пад увагу антысавецкую работу акадэмікаў Лёсіка і Ластоўскага, зьняць акадэміка Лёсіка Я. з пасады старшыні Тэрміналёгічнай камісіі і акадэміка Ластоўскага В. з пасады загадчыка катэдры этнаграфіі.

Прэзыдэнт: У. Ігнатоўскі

Сакратар пасяджэньня: [signature]

Пратакол № 21/1 пасяджэння Прэзідыума Беларускай акадэміі навук ад 13.08.1930 г. *Цэнтральны навуковы архіў (ЦНА) НАН Беларусі, ф. 1, воп. 1, спр. 6, арк. 239.*

АНКЕТА №

...рестованных и задержанных с зачислением за О.Г.П.У.

...неверные показания в анкете, будут подвергнуты строжайшей ответственности.

...ПРОСЫ:	ОТВЕТЫ:
1-я часть (заполняется заключенным).	
....	Некрашэвіч
....	Сцяпан Міхайлавіч
...го государства	СССР
....	Беларус
(откуда происходит)...	Губ. Мінская уезд Бабруйскі вол. Нікрашэвіч ...

Анкета допыту Сцяпана Міхайлавіча Некрашэвіча. 1930 г. *Архіў КДБ Рэспублікі Беларусь.*

Раніцай 21 ліпеня 1930 г. на параходзе «Табольск», што плыў па сібірскай рацэ Об, беларускія навукоўцы Сцяпан Некрашэвіч і Вацлаў Ластоўскі былі арыштаваны.

У архіве КДБ мне ўдалося пазнаёміцца з дакументамі, што датычацца арышту і допытаў Сцяпана Некрашэвіча, а таксама прыгавораў яму. Найперш хвалявала, якія абвінавачванні былі прад'яўлены вядомаму вучонаму ў далёкім 1930-м. Як сведчаць пратаколы, Некрашэвіч у мінулым быў членам партыі эсэраў, консулам Беларускай Народнай Рэспублікі ў Адэсе, з 1921 г. нібыта з'яўляўся членам кіраўнічага цэнтра контррэвалюцыйнай арганізацыі «САБ – СВБ» (Саюз адраджэння Беларусі – Саюз вызвалення Беларусі), здзяйсняў сувязь і здабываў важную інфармацыю, выкарыстоўваючы для гэтага замежныя камандзіроўкі, наладзіў і падтрымліваў кантакты з платонаўскай манархічнай арганізацыяй.

Сцяпана Некрашэвіча выслалі ў г. Сарапул Удмурцкай АССР тэрмінам на пяць гадоў. Там ён працаваў планавіком-эканамістам, бухгалтарам і, пэўна, верыў у свой светлы дзень. Але дзень той так і не настаў. Вучонага зноў арыштавалі. У абвінаваўчым заключэнні сцвярджалася, што Сцяпан Міхайлавіч з'яўляўся агентам польскай разведкі з 1920 г., па заданні якой праводзіў шпіёнскую работу на тэрыторыі СССР і вербаваў новых асоб для ўдзелу ў агентурнай працы, быў членам нацыянал-фашысцкай арганізацыі з 1917 года, праводзіў шкодніцкую працу ў сістэме народнай адукацыі Беларусі.

Фінал гэтай гісторыі тыповы для таго часу. Ваенная калегія Вярхоўнага Суда СССР 19 снежня 1937 г. прыгаварыла Сцяпана Міхайлавіча Некрашэвіча да вышэйшай меры пакарання з канфіскацыяй усёй асабістай маёмасці. Прысуд быў выкананы літаральна на наступны дзень.

Яго жонка Марыя Сяргееўна Ціманькова, не вытрымаўшы выпрабаванняў, рана пайшла з жыцця.

Пастановай Вярхоўнага Суда БССР ад 10 чэрвеня 1988 г. Сцяпан Міхайлавіч Некрашэвіч быў рэабілітаваны.

Трагічны лёс і брата Сцяпана Міхайлавіча – Іосіфа, пра якога нават родзічы ў той час стараліся не ўзгадваць – гэта пагражала вялікімі непрыемнасцямі. Іосіф свядома выбраў свой шлях і не прызнаў новую ўладу, стаў афіцэрам Добраахвотнай арміі Дзянікіна. Ідэалам для Іосіфа і яго аднадумцаў былі манархія, праваслаўе. Ён нядоўга прабыў дома пасля рэвалюцыі. Адыходзячы, сказаў:

– Мой лёс мне вядомы, мяне чакаюць на Доне, усе мае сябры там.



Першы злева Міхась Міцкевіч, брат Якуба Коласа,
трэцяя – М. Рытэр-Каханоўская, чацвёртая – Акановіч?
(Ганна Міхайлаўна Некрашэвіч), сястра Сцяпана Міхайлавіча
Некрашэвіча, шосты – Міхась Тулейка. Настаўнікі школы
«У Міхельсона». ЗША. 06.03.1954 г.

Пакланіўшыся дому, Іосіф пайшоў, каб больш ніколі не вярнуцца. Па некаторых звестках, ён трапіў у палон да чырвоных і быў расстраляны...

Сястра Сцяпана Міхайлавіча Ганна Акановіч у час Другой сусветнай вайны выехала спачатку ў Германію, потым, пасля смерці мужа, – у Амерыку. У 1950-я гг. выкладала ў Нью-Ёрку ў школе Міхельсона разам з прадстаўнікамі беларускай інтэлігенцыі – М. Міцкевічам, М. Тулейкам, М. Каханоўскай.


Кланяюся ўсяму слаўнаму і шматпакутнаму роду Некрашэвічаў і шчыра веру, што «чалавек па натуры сваёй не востраў. Ён кавалачак Кантынента, частка цэлага. Хто б ні памёр, гэта адмірае часціца цябе, бо ў табе змяшчаецца чалавецтва...».



Будынак, у якім з 1925 да 1928 г. знаходзіўся
Інбелкульт. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 15.
Фонд Музея гісторыі НАН Беларусі.



Агульны сход членаў Інбелкульта.
Фонд Музея гісторыі НАН Беларусі.


KRYVIČIUS mėnesinis Literatūros, kultūros ir visuomeninio gyvenimo laikraštis
Redaktoriai
V. LASTAUSKAS ir K. DUŠ-DUŠAUSKAS

КРЫВІЧ


МЕСЯЧНІК літэратуры, культуры і грамадзкага жыцьця
пад рэдакцыяй
В. ЛАСТОЎСКАГА і К. ДУЖ-ДУШЭЎСКАГА

Vytauto prosp. Nr. 30, Kaunas, Lietuva.

„27“ сьнежня 1923 г.

Ліст камісару адукацыі У. Ігнатоўскаму, падпісаны В. Ластоўскім 27.12.1923 г. (на 2 старонках). *Фонд ЦНА НАН Беларусі.*

це цікавага і цэннага матэрыялу па беларусаве-
дзенню і бел. філёлёгіі, што павінна цікавіць
[illegible] навуковыя кругі. У сваім часопісе ма-
[illegible] трымаліся лёяльнай опозыцыі на-
[illegible] Савецкай ўлады, дык, думаю, што не могуць
быць перашкодай да абмену выдавецтвамі?
Калі знойдзеце магчымым зрабіць абмен, пра-
шу адрасаваць друкі гэтак: Lietuva, Kaunas, [illegible]
[illegible] [illegible] р. [illegible] „Кры-
вічы" або: Дэпт. Предст. Р.С.С.Р. в Литве. Пра-
ро. Мінску для Ред. „Крывіч".
Мы адвольна будзем пасылаць [illegible], а ў
[illegible] [illegible] і [illegible], аб [illegible]
[illegible] у Менску, калі толькі будзем [illegible]
[illegible], а гэта [illegible] для інфармацыі [illegible]
У нас робіцца даволі значная работа на [illegible]
[illegible], ці немагчыма [illegible] таго, што
Вы зробіце? Маю шмат матэрыялаў [illegible]
[illegible] [illegible], ці немагчыма было
[illegible] кантакт, а адвольна [illegible]
[illegible] Вашым [illegible] у гэтай [illegible]
рабоце.
Чакаю ад Вас адказу. Прашу [illegible]
[illegible] у глыбокай да Вас [illegible]
В. Ластоўскі



27

ПРАТАКОЛ

пасядженьня Прэзыдыуму Інстытуту Беларускае Культуры ад 10/XII г.г.

Прысутнічалі: Старшыня ІБК – т. Некрашэвіч С. члены прэзыдыуму – т.т. Гринблат М. і Дыла Я. і члены ІБК: Смоліч А., Дручыц В. Красінскі М., і Колас Я /Міцкевіч К./

Старшыня сходу – Некрашэвіч, Секратар – Дыла Я.

Слухалі. Пастанавілі:

Навуковы з'езд Беларусазнаўцаў.

Прызнаць пажаданым склікаць навуковы з'езд беларусазнаўцаў у сярэдніх чыслах чэрвеня 1926 г. з метамі:

а/ падсумоўваць на ім навуковыя вынікі па усім галінам беларусазнаўства за увесь мінулы час;

б/ абгаварыць на ім усе спрэчныя пытаньні беларусазнаўства, якія навукова не высьветлены былі дагэтуль.

в/ абгаварыць і намячаць наступныя чарговыя заданьні навуковай далейшай працы па усім галінам беларусазнаўства.

Лічыць патрэбным на з'ездзе мець гэтыя секцыі:

а/ Секцыя белар. мовы й літэратуры,
б/ " " мастацтва,
в/ " гісторыі і археолёгіі Беларусі,
г/ " этнографіі Беларусі,
д/ " па вывуч. прыроды Беларусі,
е/ " народнай гаспадаркі Беларусі,
ж/ " антрополёгіі і медыцыны.

Прыблізны лік запрошаных можа быць каля 150 асоб, з якіх 100 з тэрыторыі БССР, а іншыя як з РСФСР, УССР, ЗСФСР, так і з-за рубяжу.

Камісія па складаньню навуковага апісаньня БССР /справаздача Смоліча А./


Згодна з даданага РНК БССР даручэньня ІБК аб падрыхтоўцы такога выданьня, на што старшыня РНК даў згоду аб адпуску патрэбных на організацыю справы сродкаў, лічыць патрэбным склікаць адразу ж агульную рэдакцыйную камісію па гэтаму выданьню у асобе членаў ІБК т.т. Смоліча А., і Дыла Я., з далучэньнем да іх Шчубёра М.

Старшыня сходу [signature]

Секратар [signature]

Пратакол пасяджэння Прэзідыума Інбелкульта. *ЦНА НАН Беларусі, ф. 67, воп. 1, спр. 3, арк. 27*.

Акт прыёмнай камісіі па перадачы дакументаў у секцыю навуковых работнікаў пры Беларускім саюзе работнікаў асветы. 1924 г. *ЦНА НАН Беларусі, ф. 67, воп. 1, спр. 4, арк. 100.*



ПРАТАКОЛ 4

агульнага сходу Інбелкульту ад 1-га лютага 1924 году

Прысутныя : Старшыня Некрашэвіч, члены : Азбукін, Вольскі, Грамыка, Гуткоўскі, Друшчыц, Лёсік, Дубовіч, Годзевіч, Серада, Дудзінскі, Цвікевіч, Чарвінскі. Сакратар Круталевіч.

Парадак дня : Аб беларускіх катэдрах у ВУЗ'ах ССРБ

Слухалі:

Аб катэдрах беларусазнаўства у ВУЗ'ах ССРБ.

Пастанавілі:

I. Інстытут Беларускай Культуры лічыць, што кандыдаты на катэдры беларусазнаўства у ВУЗ'ах ССРБ павінны зацьвярджацца толькі пасьля згоды з боку Інстытуту Беларускай Культуры.

Слухалі:

...кандыдатуры гр. Воўк-Левановіча на катэдру гісторыі беларускай ... у Белар. Дзяржаўным Універсытэце. Інфармацыя Некрашэвіча, Лёсіка, Чарвінскага і Друшчыца.
У спрэчках прынялі ўдзел: ..., Дубовіч, Азбукін, Гуткоўскі, ...скі, Друшчыц.


Пастанавілі:

II. Інбелкульт, разглядзеўшы кандыдатуру гр. Воўк-Левановіча у якасьці асістэнта на катэдры гісторыі беларускай мовы у Беларускім Дзяржаўным Універсытэце, заслухаўшы інфармацыю гр. Лёсіка, Чарвінскага і Друшчыца аб дакладзе Воўк-Левановіча аб 1-ым ... г. г. у Гуманітарнай Радзе Бел. Дз. У-та, - ухваліў адносіны прэзыдыуму Інбелкульта да Бел. Дз. У-ту ад 13/1 м.г. і лічыць зацьверджаньне гр. Воўк-Левановіча у якасьці асістэнта па ... з боку Бел. Дзяржаўнага У-ту супярэчным з гэтымі адносінамі.
/ Пастанова праходзіць большасьцю галасоў: за - 10, процiў - 3, устрымаўся 1 /.

СТАРШЫНЯ [signature]

СЭКРАТАР [signature]

Пратакол № 4 агульнага сходу Інбелкульта ад 01.02.1924 г.
ЦНА НАН Беларусі, ф. 67, воп. 1, спр. 8, арк. 4.



ПРАТАКОЛ 8

агульнага сходу Інстытуту Беларускае Культуры ад 27 лютага 1924 г.

СЛУХАЛІ:


ПАСТАНАВІЛІ:

Даклад ... аб культурнай працы на Украіне.

Прыняць да ведама.

Пратакол № 8
агульнага сходу
Інбелкульта ад
27.02.1924 г.
ЦНА НАН Беларусі, ф. 67, воп. 1, спр. 8, арк. 8.

Пратакол № 1
пасяджэння
Прэзідыума
Інбелкульта
ад 27.03.1924 г.
*Фонд ЦНА
НАН Беларусі.*



ПРАТАКОЛ № 2

Прэзыдыуму Інстытуту Беларускае Культуры ад 25/IV -24г.

Старшыня - Некрашэвіч.

ЧЛЕНЫ: -Цьвікевіч і Дыла.

СЭКРАТАР - Грамыка.

РАЗГЛЯДАЛІ:

...дносьнік Беларускага Прадстаўніцтва аб утварэньні літар для гукаў "дз" і "дж".- Даручыць сэкратару скласьці адказ, згодна абгаворанаму ...

Пытаньне аб утварэньні тэрміналогічных камісій. - Утварыць наступныя камісіі /з прапановай распачаць працу - 5 мая г.г. і скончыць не пазьней 15 чэрвеня г.г.

1/ Прыродніцую - з удзелам с.с. Гуткоўскага /дакладчык/, [illegible] і К.Міцкевіча /адказны сэкратар/.

2/ Хэмічную - Родзевіча /дакладчык/, Сушынскага і Кругатовіча /адказны сэкратар/.

3/ Медычную - Цьвікевіча /дакладчык і адказны сэкратар/, Зурса і Каравайчыка.

4. Гістарычную - Чарвінскага /дакладчык/ Друшчыца і Дылы /адказны сэкратар/.

5/ Лясную - Троцкага /дакладчык/ Смоліча /адказны сэкратар/ і Міцкевіча.


6/ Заалягічную - Азбукіна /дакладчык і адказны сэкратар/ Цьвікевіча і Сэрады.

Даручыць М.Байкову перакласьці з украінскае мовы "Інструкцыю для зьбіраньня матар'ялу" - тэрмінам да 10 мая.

Старшыня С. Некрашэвіч

Сэкратар. Мік. Грамыка

Пратакол № 2 пасяджэння Прэзідыума Інбелкульта ад 25.04.1924 г. Старшыня С. Некрашэвіч. *Фонд ЦНА НАН Беларусі.*



№ 14, 4
-15-

П Р А Т А К О Л
агульнага сходу І. Б. К. ад 25/VI- 1924-году.

Былі прысутны: Дыла, Грамыка, Дручыц, Пічэта, Сербау, Сімановскі, Радзевіч, Бібіла, Мурашка, Бурдзейка, Каминскі, Забела, С. Мелешка, Залуцкі В., Некотихин, Салун, Варашыя, Сьцепуржынскі, Шлюбскі і Воук-Леванович. / 20 чалавек/.

Старшынствуе - М. Г Р А М Ы К А.

Старшыня аквяміць з метай сходу абгаварыць пытаньне аб урачыстасьці: сьвяткаваньня 400-лецьця друку на Беларусі /Скарынінскага свята/.

Пытаньне гэтае у першы раз было абгаварана у Гістарычнай секцыі І.Б.К. Ставіцца пытаньне аб выбары " Агульнай Камісіі"ад розных установ, аб чым І.Б.К. павінен увасьці з належнай ініцыятывай.

С.с. Дручыц, Дыла прамаўляюць супраць агульнай Камісіі.

Большасьцю прыймаецца пастанова аб даручэньні Прэзыдыуму ІБК распрацаваць палажэньне аб Камісіі. Абіраецца затым "Рэдакцыйная Камісія" дзеля рэдагаваньня кніжак якія маюць быць выдрукаваны з прычыны сьвята з друку. У Камісію абраны: Пічэта, Дручыц, Некрашэвіч, Лёсік і Пятуховіч. Камісія сама абірае Старшыню. Прасіць В. Дручыца склікаць першае пасяджэньне Камісіі.

Сэкратар М. Грамыка

П Р А Т А К О Л
агульнага сходу І. Б. К. з дакладамі СЕРЖПУТОЎСКАГА і ПРОХОРОВА аб выніках музычна-этнографічнай экспедыцыі, арганізаванай у Н.Т. ІНБЕЛКУЛЬТАМ.

24.

Былі прысутны: Некрашэвіч, Міцкевіч, Смандракоу, Круталевіч, Гуткоускі, Серада, Радзеускі, Аабукін, Шлюбскі, Байкоу, Мелешка, Дыла, Нарманэвіч, Ауцэвіч, Плаунок/Бядуля/, Дручыц, Сушынскі і Шымански. Грамыка (сэкратар).

5.

У спрэчках, і запытаньнях, якія вынікалісь цікавым дакладам прынялі удзел: Дыла, Некрашэвіч, Грамыка, Смандракоу, Нарманэвіч і інш.


Былі праслуханы народныя сьпевы, запісаныя фонографам.

Пастанавілі: дзякаваць дакладчыкам і прасіць іх даць апрацаваны матэр'ял у Інбелкульт.

Сэкратар М. Грамыка

Пратакол № 8 агульнага сходу Інбелкульта ад 25.06.1924 г. Старшыня М. Грамыка. *Фонд ЦНА НАН Беларусі.*

Часовы склад навуковай рады Інбелкульта. *Фонд ЦНА НАН Беларусі.*



В Российскую Академию
Наук.

Ленинград
Университетская наб. 5.

Институт Белорусской Культуры извещает, что первая партия в 300 книг, высланных Книгохранилищем РАН в 13 почтовых посылках, получена 23 мая 1925г.

Не имея сведений о причинах, задерживающих дальнейшую высылку обещанных Непременным Секретарем С.Ф.ОЛЬДЕНБУРГОМ нашему представителю С.М.НЕКРАШЕВИЧУ изданий Академии, Институт Белорусской Культуры просит ускорить досылку всех обещанных изданий и вместе с тем прислать список книг, вошедших в состав первой партии, и не отказать в дальнейшем сопровождать каждую высылаемую партию книг соответствующим списком.

Ученый Секретарь
Института Белорусской Культуры

Завед. Библиотекой
Инбелкульта

Ліст Інбелкульта ў Расійскую акадэмію навук аб атрыманні кніг. *Фонд ЦНА НАН Беларусі.*

РАСКЛАД
ШТАТНЫХ ПАСАДАЎ ІБК на 1925/26 апер. год.

	пэнсия у мес.	пэнсия за год.
I. Прэзыдыум.		
1. Старшыня ІБК і яго Прэзыдыуму – проф. ІГНАТОЎСКІ У.	–	–
2. Нам. Старшыні ІБК, – КАРАШЭЎСКІ Я.	183р.	2196р.
3. " " " СМОЛІЧ А.	200 р.	2400р.
4. Член Прэзыдыуму ІБК – БАЙЛУГА М.	183р.	2196р.
5. Навуковы Сакратар ІБК – ДЫЛА Я.	200р.	2400р.
II. Сэкцыі.		
а) беларускае мовы й літэратуры.		
6. Нам. Старшыні сэкцыі	26р.	312р.
7. Сакратар "	22р. 62к.	271р. 44к.
8. падсэкцыі мовы	20р. 32к.	243р. 84к.
б) мастацкая.		
9. Сакратар сэкцыі – Шчакаціхін М.	45р. 24к.	542р. 88к.
10. " тэападсэкцыі – Ільлінскі М.	20р. 32к.	243р. 84к.
в) гістарычна-археолёгічная.		
11. Старшыня сэкцыі – проф. Пічэта У.	26р. –	312р. –
12. Сакратар " – Друшчыц В.	22р. 62к.	271р. 44к.
г) па вывучаньню рэвруху на Беларусі.		
13. Сакратар сэкцыі – Мялешка М.	22р. 62к.	271р. 44к.
д) пэдагогічная.		
14. Нам. Старшыні сэкцыі –	26р. –	312р. –
15. Сакратар –	22р. 62к.	271р. 44к.
е) этнографічная.		
без штатных пасадаў.		
ж) прыродазнаўчая.		
16. Сакратар сэкцыі – Вяршук В.	45р. 24к.	542р. 88к.
17. " заопадсэкцыі –	20р. 32к.	243р. 84к.
18. хемотпадсэкцыі –	20р. 32к.	243р. 84к.
19. ботпадсэкцыі –	20р. 32к.	243р. 84к.
з) мэдычная.		
20. Нам. Старшыні сэкцыі – Дывікевіч І.	62р. –	624р. –
21. і) сельска-гаспадарчая.		
21. Сакратар сэкцыі – Грыбоўскі І.	45р. 24к.	542р. 88к.
22. лясное падсэкцыі –	20р. 32к.	243р. 84к.

Штатны расклад Інбелкульта на 1925/26 г. *Фонд ЦНА НАН Беларусі.*

184

У Інбелкульт


Члена І.Б.К. Івана
Луцэвіча

Заява

Прашу даць мне на 1½ месяцы
отпуск (з 15 ліпня да 1 верасьня)
Ів. Луцэвіч

14/VII – 25 г.
Менск

Заява І. Луцэвіча (Янкі Купалы) у Інбелкульт аб прадстаўленні адпачынку. 14.07.1925 г. *Фонд ЦНА НАН Беларусі.*



СКЛАД НАВУКОВАЙ РАДЫ ІНБЕЛКУЛЬТУ

1. ІГНАТОЎСКІ
2. КАРАНЕЎСКІ
3. ПІЛЮГА
4. СМОЛІЧ
5. ЦЬВІКЕВІЧ А.
6. ГОЛЬДМАН /Польаддзел/
7. ЭРЭНМАН /Яўаддзел/
8. ЖЫЛУНОВІЧ
9. АРГІРОЎ /Моладняк/
10. БАЛІЦКІ /ЛЁСІК/ Мовазнаўчая
11. ДЫЛА /КРАСІНСКІ/ Мастацкая
12. КАРАНЕЎСКІ /ГРАМЫКА/ Прыродазнаўчая
13. БАРСУКОЎ /І. ЦЬВІКЕВІЧ/ Медычная
14. УСЬПЕНСКІ /ВАСІЛЕЎСКІ/ НОТ
15. ПЯТРОВІЧ /КАРП/ Сац.-эканамічная
16. ВАЙНГЕР Секцыя мовы і літаратуры
17. ОКСЬЛЕНДОР Яўаддзелу ІБК
18. СОСІС Секцыя гістарычная Яўаддзелу

Персанальна:

19. МІЦКЕВІЧ /Я. КОЛАС/
20. ГАРЭЦКІ М.
21. ДРУТЧЫЦ В.
22. КІСЬЛЯКОЎ Н.
23. ТРАМПОВІЧ Н.
24. ЛУЦЭВІЧ /Я. КУПАЛА/
25. НЕКРАШЭВІЧ Сьц.

Склад навуковай рады Інбелкульта.
Фонд ЦНА НАН Беларусі.

-56-

ОРГАНІЗАЦЫЙНАЯ СТРУКТУРА ІНСТЫТУТУ БЕЛАРУСКАЕ КУЛЬТУРЫ Ў ПЕРСПЭКТЫВЕ на 1927-30 год.

Спэцыяльнасьці (катэдры)	Дасьледчыя Установы	У якім годзе пачне працу.
	АДДЗЕЛ ГУМАНІТАРНЫХ НАВУК.	
	А. Кляса філёлёгіі.	
1. Мовазнаўства агульнае і параўнаўчае		1928/29г.
2. Гісторыя беларускае мовы.	Камісія гістарычнага слоўніка беларускае мовы	існуе.
3. Беларуская мова (сучасная жывая мова)	1) Камісія слоўніка жывой беларускай мовы.	існуе.
	2) Дыялектолёгічная Камісія	"
	3) Камісія літаратурнай мовы	"
	4) Інстытут Навуковае Мовы з тэрмінолёгічнымі сэкцыямі па прыродазнаўчых і гуманітарных навуках.	"
4. Гісторыя старой беларускай літаратуры.		1929/30г.
5. Гісторыя новай беларускай мовы.	1) Камісія для выданьня твораў пісьменьнікаў.	існуе.
	2) Камісія для складаньня біографічнага слоўніка пісьменьнікаў.	"
6. Гісторыя народнай творчасьці.		1928/29г.
7. Этнографія Беларусі.	1) Камісія для вывучэньня матэр'яльнай культуры.	існуе.
	2) Фольклёрная Камісія	"

Арганізацыйная структура Інбелкульта ў перспектыве на 1927–1930 гг.
ЦНА НАН Беларусі, ф. 67, воп. 1, спр. 28, арк. 56.


- 4 -

С Ь П І С

правадзейных членаў Інстытуту Беларускае Культуры.

1. Проф. Ігнатоўскі Усевалад Макаравіч. На Катадры Гісторыі Беларусі.
2. Некрашэвіч Сьцяпан Міхайлавіч. " " жывой белар. мовы.
3. Лёсік Язэп Юрэвіч. " " Белар. Навук. мовы.
4. Проф. Смоліч Аркадзь Антонавіч. " " Геаграфіі Беларусі.
5. Проф. Замоцін Іван Іванавіч. " " Гісторыі Беларускае Літэратуры.
6. Проф. Ясінскі Антон Нікітавіч. " " Сусьветнай Гісторыі.
7. Проф. Пічэта Уладзімір Іванавіч. " " Гісторыі права і гаспадаркі Беларусі.
8. Проф. Бліадухо Мікола Тодаравіч. " " Геалёгіі.
9. Проф. Афанасьеў Якаў Нікітавіч. " " Глебазнаўства.
10. Ластоўскі Вацлаў Юстынавіч. " " Этнографіі.
11. Луцэвіч Іван Дамінікавіч. " Клясе прыгожага пісьменства.
12. Міцкевіч Констанцін Міхайлавіч. " "-" "-" "-"
13. Жылуновіч Зьмітро Хведаравіч. " "-" "-" "-"
14. Проф. Матулайціс Станіслаў Юрэвіч. " Катэдры Гісторыі Літвы ў сувязі з Гісторыяй Беларусі.
15. праф. [illegible] Міт. Міколаевіч.

Спіс правадзейных членаў Інбелкульта. *ЦНА НАН Беларусі, ф. 67, воп. 1, спр. 28, арк. 61.*



— 38

ДА ПРАЭКТУ: "СТАТУТУ ІНСТЫТУТУ БЕЛАРУСКАЕ КУЛЬТУРЫ" у рэдакцыі КЗП.

Ц.Б.Сэкцыі Навуковых Працаўнікоў БССР, разглядеўшы на сваім пасяджэньні 13|XII-27 г. праэкт "Статуту Інстытуту Беларускай Культуры", між іншымі сваімі заўвагамі знайшло пропуск у §§ 33-42, дзе гаворыцца аб Прэзыдыуме ІБК, а менавіта: у гэтым паздзеле, як і ў іншых §§, нічога ня сказана, з якой катэгорыі навуковых працаўнікоў павінен абірацца прэзыдыум Інбелкульту, - з правадзейных членаў ці навуковых працаўнікоў. Такі прыкры пропуск, будзець, можа быць повадам, што ў прэзыдыум ІБК могуць быць абраны і навуковыя супрацоўнікі, што зьяўляецца зусім ненармальным. І запраўды, ва ўсіх адпаведных Інбелкульту ўстановах (Усесаюзнай Акадэміі Навук, Акадэміі Навук УССР і ва ўсіх іншых) прэзыдыумы абіраюцца выключна з правадзейных членаў (акадэмікаў) і ні ў якім выпадку не з навуковых працаўнікоў. Апошняя катэгорыя навуковых працаўнікоў лічыцца дапаможным навуковым пэрсаналам пры правадзейных членах, а таму, зразумела, па самой сутнасьці справы ня можа быць кіраўніком навуковага жыцьця ўстановы.

Будучы прадстаўнікам Ц.Б.Сэкцыі Навуковых Працаўнікоў на пасяджэньні КЗП 14|VI, я, згодна з пастановай Ц.Б.Сэкцыі, унёс прапанову аб дапаўненьні "Статуту ІБК" параграфам, дзе-б гаварылася, што прэзыдыум Інбелкульту (Прэзыдэнт, Віцэ-Прэзыдэнт і Неадменны Сакратар) абіраліся з правадзейных членаў ІБК, аднак, мая прапанова КЗП была адхілена.

Лічу, што КЗП у гэтых адносінах паступіла зусім няправільна, бо і запраўды, не паказаўшы, з каго абіраецца Прэзыдыум, пава гэта трацілася прэстыж Інбелкульту між іншымі адпаведнымі саюзнымі і эўропейскімі навуковымі ўстановамі, у якіх прэзыдыумы абіраюцца заўсёды ня толькі з правадзейных членаў, але і з выдатнейшых вучоных эўропейскага маштабу (Прэзыдыум Усесаюзнай Акадэміі: Прэзыд. Акад. КАРПІНСКІ, Віцэ-Прэз. Акад. ФЕРСМАН (раней - акад. СТЕКЛОВ), Неадменны Сакратар Акад. ОЛЬДЕНБУРГ); дзеля гэтага ўношу ў пратакол пасяджэньня КЗП погляд Ц.Б.Сэкцыі Навуковых Працаўнікоў, як асобную думку, і прашу яго зачытаць на пасяджэньні СНК, калі будзе разглядацца праэкт "Статуту ІБК".-

15|VI-1927 г.

Прадстаўнік Ц.Б.Сэкцыі Нав.Прац.,
Правадз.Член ІБК - С.НЕКРАШЭВІЧ.

Рэкамендацыі С. Некрашэвіча аб унясенні дадаткаў і ўдакладненняў у праект Статута Інбелкульта. *ЦНА НАН Беларусі, ф. 67, воп. 1, спр. 28, арк. 38.*

КІРАЎНІЦТВА СПРАЎ
САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ І ЭКАНАМІЧНАЕ НАРАДЫ БЕЛАРУСКАЕ ССР.
Сакратарыят СНК.

На В. №
Нумар №
Справа №

Інстытуту БелКультуры, НК Асьветы, Сэкцыі Навуковых працаўнікоў Саюзу Працасьветы
Да ведама і выкананьня.

ВЫПІС


з пратаколу № 16 п. 220 распарадчага пасяджэньня Савету Народных Камісараў Беларускае ССР ад 26 верасьня 1927 г.

РАЗГЛЯДАЛІ	ПАСТАНАВІЛІ
3. Аб рэарганізацыі Інстытуту Беларускае Культуры. Падае Інст. Бел. Культуры Дакл. т. Ігнатоўскі	220. 1. Усю справу рэарганізацыі Інстытуту Беларускае Культуры, згодна зацьверджанаму СНК статуту аб Інстытуце Беларускае Культуры, даручыць Прэзыдыуму Інстытуту Беларускае Культуры з удзелам Народнага Камісара Асьветы ці яго прадстаўніка і прадстаўніка Сэкцыі Навуковых Працаўнікоў. 2. На час рэарганізацыі Інстытуту Беларускае Культуры увесьці ў склад Прэзыдыуму Інстытуту Беларускае Культуры т. в. НЕКРАШЭВІЧА. 3. У патрэбных выпадках Прэзыдыум Інстытуту Беларускае Культуры ўтварае адпаведныя камісіі, ці запрашае да ўдзелу ў сваёй працы патрэбных спэцыялістаў. 4. Сьпіс першага складу правадзейных членаў Прэзыдыуму Інстытуту Беларускае Культуры зацьвярджаецца Саветам Народных Камісараў БССР.

САКРАТАР СНК БССР (Н. УГАРАЎ)

№ 1707/13
„26" верасьня 1927 г.
гор. Менск.

Выпіска з пратакола № 16 п. 220 пасяджэння Савета Народных Камісараў БССР ад 26.09.1927 г. аб рэарганізацыі Інстытута беларускай культуры. *Фонд ЦНА НАН Беларусі.*



145

ПРАТАКОЛ

пасядзаньня Камісіі Інстытуту Беларускай Культуры для разгляду праекту статуту Беларускай Акадэміі Навук ад 8/XI-28 году.

ПРИСУТНІЧАЛІ: т.т. Ігнатоўскі, Ластоўскі, Некрашэвіч і Смоліч.

СЛУХАЛІ: Аб зьменах у статуце Інстытуту Беларускай Культуры ў сувязі з рэарганізацыяй яго ў Беларускую Акадэмію Навук (даклад т. Ігнатоўскі).

ПАСТАНАВІЛІ: 1) Ува ўсіх выпадках дзе сустракаецца назва "Інстытут Беларускае Культуры" замяніць яго назвай "Беларуская Акадэмія Навук". Там дзе будзе гаварыцца ў першы раз аб правадзейных членах Акадэміі пасьля гэтых слоў у дужках паставіць слова "акадэмік".

2) § 15 цяперашняга статуту Інстытуту Беларускай Культуры падзяліць на два параграфы, сфармуляваўшы іх замест існуючага тэксту так:

§ 15ª (§15) "Кандыдаты ў члены БАН вылучаюцца навуковымі ўстановамі і вышэйшымі школамі, культурнымі і грамадзкімі організацыямі, адпаведнымі народнымі камісарыятамі, атаксама паасобнымі вучонымі і іх групамі".

§ 15ᵇ (16) "Кандыдатуры ў члены БАН разглядаюцца асобай камісіяй, якая складаецца з акадэмікаў сумежных спэцыяльнасьцяў, выдзеленых Акадэмічнай Радай БАН і з прадстаўнікоў НКА, секцыі навуковых працаўнікоў саюзу працасьветы і непасрэдна зацікаўленых ведамстваў".

3) Замест § 23 цяперашняга статуту увесьці наступныя §§.

§ 23-а - "Навуковыя працаўнікі БАН падзяляюцца на наступныя катэгорыі: а) дырэктары ўстаноў, б) навуковыя супрацоўнікі 1-га разраду (вучоныя спэцыялісты), в) навуковыя супрацоўнікі 2-га разраду, або асыстэнты і г) аспіранты".

§ 23б - "Дырэктарам навуковай установы Акадэміі можа быць абраны па пастанове Рады аддзелу асоба з навуковых супрацоўнікаў першага разраду, або наогул з вучоных, якія вядомы сваімі навуковымі працамі і адміністрацыйнымі навыкамі. Абраны зацьвярджаецца Акадэмічнай Радай БАН".

§ 23в - "Навуковымі супрацоўнікамі 1-га разраду абіраюцца асобы, якія вядуць самастойную навуковую працу па сваёй спэцыяльнасьці і выявілі сябе ў гэтым кірунку кампэтэнтнымі навуковымі дасьледчыкамі".

Навуковымі супрацоўнікамі 2-га разраду абіраюцца з добра навукова падрыхтаваных у сваёй спэцыяльнасьці асоб, тыя якія выявілі свае здольнасьці да дасьледчай працы і спэцыяльныя веды у адпаведных галінах навукі або мастацтва.

Навуковыя супрацоўнікі абіраюцца радамі аддзелаў і сэктараў БАН і зацьвярджаюцца Прэзыдыумам БАН".

4) § 40 цяперашняга статуту ІБК аб абавязках і правох неадменнага сакратара БАН распрацаваць па матэр'ялах статуту усесаюзнай Акадэміі Навук, а менавіта паводле §§ 41, 44-46 апошняй.

5) у § 58 цяперашняга статуту ІБК замест слоў "можа мець сваю друкарню" прыняць: "мае сваю друкарню".

6) Апроч паказаных зьмен §§ цяперашняга статуту ІБК увесьці ўсім новыя параграфы:

а) Аб узаемаадносінах з Галоўнавукай НКА - устанавіць пасьля § 9 цяперашняга статуту наступны §: "БАН свае пляны працы каардынуе з агульным плянам Галоўнавукі".

б) А аб узаемаадносінах з іншымі дасьледчымі установамі прыняць агульныя палажэньні такога зьместу:

§ 54а - "Пры БАН могуць існаваць аўтаномныя дасьледчыя установы (інстытуты, таварыствы і т.д.), якіх дзейнасьць, кіраваньне і узаемаадносіны з Акадэміяй вызначаюцца іх статутамі, (зацьверджанымі СНК), або асобнымі палажэньнямі".


Пратакол пасяджэння камісіі Інбелкульта па разглядзе праекта Статута Беларускай акадэміі навук ад 08.11.1928 г. *Фонд ЦНА НАН Беларусі.*

-2-

Арганізацыйная структура
Інстытуту Беларускае Культуры на 1928/29 эканам. год.

	Спэцыяльнасьці (катэдры)	Дасьледчыя установы	Адзнакі аб часу адчыненьня установы
		АДДЗЕЛ ГУМАНІТАРНЫХ НАВУК. А. Кляса філёлёгіі.	
1	Гісторыя беларускае мовы.	1) Камісія гістарычнага слоўніка беларускае мовы.	Існуе.
		2) Камісія вывучэньня помнікаў беларускага пісьменства.	1928/29 г.
2	Беларуская мова (сучасная жывая мова).	1) Камісія па складаньню слоўніка жывой беларускай мовы.	Існуе.
		2) Дыялектолёгічная Камісія	"
		3) Камісія літаратурнай мовы.	"
3	Беларуская навуковая мова.	Інстытут Навуковае Мовы з Тэрміналёгічнымі секцыямі па прыродазнаўчых і гуманітарных навуках.	"
4	Гісторыя беларускае літаратуры.	1) Камісія для выданьня твораў беларускіх пісьменьнікаў.	"
		2) Камісія для складаньня біографічнага слоўніка пісьменьнікаў.	1928/29 г.
5	Этнографія Беларусі.	1) Камісія для вывучэньня матэр'яльнае культуры	1928/29 г.
		2) Фольклёрная Камісія.	Існуе.
6	Яўрэйская мова.	1) Лінгвістычная Камісія	"
		2) Камісія па складаньню дыялектолёгічнага атласу і тэрміналёгіі Яўрэйскага Сэктару.	"
		3) Камісія акадэмічнага слоўніку яўрэйскае мовы.	1928/29 г.
7	Яўрэйская літаратура.	1) Літаратурная Камісія	Існуе.
8	Этнографія яўрэйскага народу.	Камісія для вывучэньня яўрэйскага фольклёру.	

Арганізацыйная структура Інбелкульта ў перспектыве на 1928 – 1929 гг.
ЦНА НАН Беларусі, ф. 67, воп. 1, спр. 28, арк. 2.



122

ПРАТАКОЛ №3

пасяджэньня Прэзыдыуму Беларускай Акадэміі Навук ад 29 студзеня 1929 г.

ПРИСУТНЫМІ БЫЛІ: т.т. Ігнатоўскі, Балуга, Ластоўскі, Некрашэвіч, Смоліч, Вайнгер і Казак.

[illegible] С Л У Х А Л І-І. Аб прыцягненьні да працы акадэмікаў.

[illegible]ПАСТАНАВІЛІ: Даручыць акадэміку Вальфсону прадставіць у Прэзыдыум БАН плян арганізацыі катэдры марксызму і ленінізму, пасьля чаго і прызначыць яго загадчыкам гэтае катэдры.

[illegible] С Л У Х А Л І: Аб парадку зацьвярджэньня плянаў працы БАН.

[illegible]ПАСТАНАВІЛІ: Усе пляны канцэнтруюцца ў Віцэ-Прэзыдэнта БАН, які загадвае агульна-пляновай часткай БАН. На яго-ж ускладаецца абавязак аб гэтых плянах зрабіць даклад у прэзыдыуме БАН. Даклад гэты павінен заключаць у сабе крытыку плянаў устаноў БАН адпаведна асноўным заданьням Акадэміі, як перспэктыўным плянам і метавай установіцы. Усе члены прэзыдыуму да дакладу ў прэзыдыуме аб плянах працы павінны папярэдне азнаёміцца з імі. У Акадэмічнай Радзе аб плянах працы робяць даклады загадчыкі аддзелаў і нацсэктараў. Проект рэзалюцыі па дакладу падаецца Віцэ-Прэзыдэнту. Такі парадак зацьвярджэньня плянаў працы прыняць на гэты год. На будучы час пляны прац Акадэміі павінны падавацца ў закончаным відзе ў пачатку акадэмічнага году, што і прапанаваць выконваць загадчыкам устаноў БАН.

[illegible] С Л У Х А Л І: Аб выніках Краязнаўчай Конфэрэнцыі.

[illegible]ПАСТАНАВІЛІ: Для апрацаваньня рэзалюцыі на падставе абгавору гэтага пытаньня ў Прэзыдыуме выдзеліць тройку ў складзе т.т. Ластоўскага, Вайнгера і Казака. Проект рэзалюцыі прадставіць на наступнае пасяджэньне Прэзыдыуму. Скліканьне тройкі ўскласьці на т. Ластоўскага.

[illegible] С Л У Х А Л І: Склад Акадэмічнае Рады.

[illegible] ПАСТАНАВІЛІ: Зацьвердзіць наступны склад Акадэмічнае Рады: 1) Ігнатоўскі, 2) Жылуновіч, 3) Дурнаво, 4) Ластоўскі, 5) Замоцін, 6) Лёсік, 7) Мілкевіч, 8) Луцэвіч, 9) Матуляйціс, 10) Бялуха, 11) Афанасьеў, 12) Гарэцкі, 13) Некрашэвіч, 14) Шчупак, 15) Ясінскі, 16) Малюмацкі, 17) Трайнігер, 18) Пятровіч, 19) Вальфсон, 20) Вышалескі, 21) Балуга, 22) Валіцкі, 23) Смоліч, 24) Віткоўскі, 25) Казак, 26) Ленц, 27) Фаддзеенка, 28) Эпімах-Шыпіла, 29) Трапановіч, 30) Розанаў. Апроч гэтага замацаваць адно месца члена Акадэмічнае Рады для Яўсэктару, якому і прапанаваць выдзеліць свайго прадстаўніка.

[illegible] С Л У Х А Л І: Аб залічэньні т. Розанава звыштатным асьпірантам.


[illegible]ПАСТАНАВІЛІ: Пытаньне адкласьці да запаўненьня ім згодна формы анкеты кандыдата на асьпіранта.

[illegible] С Л У Х А Л І: Аб вызваленьні т. Гольтмана ад абавязкаў загадчыка Польсэктару.

[illegible]ПАСТАНАВІЛІ: У сувязі з новым прызначэньнем і выездам т. Гольтмана з

Пратакол № 3 пасяджэння Прэзідыума Беларускай акадэміі навук ад 29.01.1929 г.
ЦНА НАН Беларусі, ф. 1, воп. 1, спр. 2, арк. 122.

Пратакол № 45 пасяджэння Прэзідыума Беларускай акадэміі навук ад 28.12.1929 г. Старонка першая. *ЦНА НАН Беларусі, ф. 1, воп. 1, спр. 2, арк. 101.*



\- 2 -

102

[illegible] перспектыўным плане працы дзейнасьці Яўсэктару прадугледзіць [illegible] Яўсэктару у інстытут яўрэйскай культуры у 1931/32 годзе [illegible].

III. С л у х а л і: Аб скліканьні Акадэмічнай Рады.
П а с т а н а в і л і: Склікаць Акадэмічную Раду на 7 студзеня 1930 [illegible]. Вызначыць наступную павестку дня: [illegible] Выданьні БАН і пляны прац БАН на бягучы год.

IV. С л у х а л і: Аб скліканьні канфэрэнцыі краязнаўства.
П а с т а н а в і л і: Дазволіць ЦБК склікаць канфэрэнцыю краязнаў[illegible] на 25/I-1930 г., асыгнаваўшы на гэта 1.200 руб.

V. С л у х а л і: Аб праверцы і выдзяленьні навуковых архіваў устано[illegible], якія могуць быць аддадзены у Цэнтрархіў.
П а с т а н а в і л і: Для [illegible] мэты вылучыць камісію у складзе т.т. Даўгяла, Мілеўскі і Касьпяровіча пад старшынствам т. Даў[illegible]. Камісіі закончыць працу на працягу 10-ці дзён.

VI. С л у х а л і: Пастанова бюро аспірантаў аб т.Гембіцкім.
П а с т а н а в і л і: Прымаючы пад увагу, што на Інстытуту гісторычных навук вольных месц аспірантаў няма, у залічэньні штатным аспірантам т.Гембіцкага адмовіць.

VII. С л у х а л і: Заява т.Даныцова аб звальненьні яго ад працы.
П а с т а н а в і л і: Задаволіць просьбу т.Даныцова аб часовым вызваленьні яго ад працы у Хэмічнай Лябараторыі для паездкі на Донбас [illegible] павышэньня кваліфікацыі на фабрычнай вытворчасьці і даручыць [illegible]елу Прыроды і Гаспадаркі заключыць з ім умову аб звароце яго на [illegible]у у БАН праз 9 месяцаў. Разам з гэтым даручыць Аддзелу Прыроды і [illegible]даркі запрасіць на працу у Хэмічную Лябараторыю БАН т.Пратасеня.

VIII. С л у х а л і: Аб камандыроўцы т.Ганчарыка.
П а с т а н а в і л і: Камандыраваць т.Ганчарыка у г.Ленінград на [illegible] нараду па садова-паркавай справе, якая адбудзецца пры Галоўным Батанічным Садзе 4-5 студзеня 1930 году. Даць на гэтую камандыроўку [illegible]90 руб.

IX. С л у х а л і: Аб камандыроўцы т.Некрашэвіча.
П а с т а н а в і л і: Даць т.Некрашэвічу камандыроўку у Ленінград [illegible] 5 дзён з выплатай сутачных па 5 руб. кватэрных выдаткаў і дарогі.


X. С л у х а л і: Пляны працы катэдры глебазнаўства.
П а с т а н а в і л і: Даручыць Аддзелу Прыроды і Народнай Гаспадаркі [illegible] у пляны працы той тэмы досьледаў, якія былі прыняты тройкай у складзе т.т. Блюгі, Смоліча і Пятровіча. Забясьпечыць выкананьне навукова-досьледчых прац катэдры глебазнаўства па пацігодным адпаведным [illegible] і навуковымі працаўнікамі. Аб гэтай пастанове паведаміць [illegible] Афанасьева.

XI. С л у х а л і: Проект палажэньня аб гідро-мэтэоролёгічнай слу[illegible]
П а с т а н а в і л і: Паказаны проект палажэньня прыняць і паслаць [illegible] камісію.


Прэзыдэнт Беларускай Акадэміі Навук У. Ігнатоўскі

Сакратар пасяджэньня [illegible]

Пратакол № 45 пасяджэння Прэзідыума Беларускай акадэміі навук ад 28.12.1929 г. Старонка другая. Подпіс прэзідэнта Беларускай акадэміі навук У. Ігнатоўскага.
ЦНА НАН Беларусі, ф. 1, воп. 1, спр. 2, арк. 102.



Вокладка «Беларускага лемантара» Н. Некрашэвіча. Берлін. 1922 г. *Фонд Цэнтральнай навуковай бібліятэкі (ЦНБ) імя Я. Коласа НАН Беларусі.*



ІНСТЫТУТ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ
КАМІСІЯ ПА ЎКЛАДАНЬНЮ СЛОЎНІКА ЖЫВОЙ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

С. НЕКРАШЭВІЧ

ДА ПЫТАНЬНЯ АБ УКЛАДАНЬНІ СЛОЎНІКА ЖЫВОЙ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

(Даклад, чытаны на сходзе Мовазнаўчай секцыі ІБК 8 ліпеня 1925 г. і прыняты ў аснову працы Камісіі па ўкладаньню слоўніка жывой беларускай мовы)

МЕНСК—1925

Вокладка брашуры С. Некрашэвіча «Да пытаньня аб укладаньні слоўніка жывой беларускай мовы». Мінск. 1925 г. *Фонд ЦНБ імя Я. Коласа НАН Беларусі.*

ІНСТЫТУТ БЕЛАРУСКАЕ КУЛЬТУРЫ

АДДЗЕЛ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ

ПРАЦЫ

АКАДЭМІЧНАЕ КОНФЭРЭНЦЫІ ПА РЭФОРМЕ БЕЛАРУСКАГА ПРАВАПІСУ І АЗБУКІ.


(14—21 ЛІСТАПАДА 1926 г.)

ПАД РЭДАКЦЫЯЙ
Старшыні Аддзелу Мовы і Літаратуры
С. НЕКРАШЭВІЧА
— і —
Старшыні Інстытуту Беларускае Культуры
Ў. ІГНАТОЎСКАГА

ВЫДАНЬНЕ ІНСТЫТУТУ БЕЛАРУСКАЕ КУЛЬТУРЫ.
У МЕНСКУ — 1927.

Вокладка брашуры аддзела мовы і літаратуры Інбелкульта «Працы акадэмічнае конфэрэнцыі па рэформе беларускага правапісу і азбукі» (14–21 лістапада 1926 г.). *Фонд ЦНБ імя Я. Коласа НАН Беларусі.*

Вокладка брашуры аддзела мовы і літаратуры Інбелкульта «Програма для зьбіраньня асаблівасьцяй беларускіх гаворак і гаворак пераходных да суседніх моваў». Мінск. 1927 г. *Фонд ЦНБ імя Я. Коласа НАН Беларусі.*



ІНСТЫТУТ БЕЛАРУСКАЕ КУЛЬТУРЫ
АДДЗЕЛ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ
ФОЛЬКЛЁРНА-ДЫЯЛЕКТОЛЁГІЧНАЯ КАМІСІЯ

ПРОГРАМА


для зьбіраньня асаблівасьцяй беларускіх гаворак і гаворак пераходных да суседніх моваў.

АПРАЦАВАЛІ:
С. НЕКРАШЭВІЧ і П. БУЗУК.

МЕНСК. 1927.



Вокладка «Расійска-беларускага слоўніка». Укладальнікі С. Некрашэвіч і М. Байкоў. Мінск. 1928 г. *Фонд ЦНБ імя Я. Коласа НАН Беларусі.*



С. Некрашэвіч.

Да характарыстыкі беларускіх гаворак Парыцкага раёну.

(Кароткі этнографічна-лінгвістычны нарыс).

Гаворкі Парыцкага раёну ў шмат якіх адносінах зьяўляюцца для беларускага дыялектолёга цікавымі гаворкамі, бо як раз па тэрыторыі Парыцкага раёну праходзяць граніцы некалькіх моўных зьяў, што становяць сабою найбольш характэрныя асаблівасьці беларускае мовы. Гэтая абставіна, а таксама маё блізкае знаёмства з гаворкамі раёну і падалі мне думку ўзяцца за вывучэньне гаворак гэтага раёну [1]).

Параўноўваючы гаворкі Парыцкага раёну з іншымі дасьледаванымі беларускімі гаворкамі, трэба сказаць, што яны бліжэй за ўсё стаяць да дасьледаваных О. Воўк-Левановічам гаворак в. Татаркавічы

[1]) Для вывучэньня Парыцкіх гаворак я зрабіў дзьве паездкі. Першая мая паездка адбылася ўлетку 1927 г. разам з этнографам А. Ягоравым, які запісаў народныя песьні (мэлёдыі). Мы пабывалі ў наступных вёсках: Палешках, Пакалічах, Дабравольнічыне, Клявоўцы і ў м. Парычах. Апрача таго, я яшчэ адзін пабываў у в. в. Слабодцы, Коўчыцах, Майсееўцы (Літоўскай) і Малімонах.


Улетку 1928 г. сумесна з А. Ягоравым і праф. П. А. Бузуком я паехаў у Парыцкі раён у другі раз. Цяпер мы разам пабывалі ў в.в. Рамановічах, Чэрніне, Дуброве і Чыркавічах. У Чыркавічах П. А. Бузук застаў, і ў далейшым я езьдзіў удвох з А. Ягоравым. Мы пабывалі ў Парычах, Даніловічах, Васілеўцы і Красаўцы. Апрача таго, я яшчэ адзін пабываў у в. в. Вознелі і Карпілаўцы Глускага раёну. На абедзьве паездкі мною было затрачана каля 20 дзён. Тэрмін безумоўна малы для дакладнага вывучэньня гаворак даволі такі вялікага раёну, тым больш, што з гэтага раёну як раз няма ніякіх матар'ялаў, — ні ў друкаваных матар'ялах ранейшых этнографаў (Фольклёрныя матар'ялы П. Шэйна, А. Сержпутоўскага, І. Сербава, Н. Янчука датычаць іншых раёнаў Бабруйскай акругі) ні ў рукапісным зборы фольклёрных матар'ялаў Катэдры этнографіі Беларускае Акадэміі Навук, якія можна-б было скарыстаць у мэтах вывучэньня гаворак Парыцкага раёну.

Калі аднак я адважыўся характарызаваць усе Парыцкія гаворкі, то выключна таму, што я ведаю гаворку шмат якіх вёсак раней (Забалацьця, Тумараўкі, Ісгопак, Прапасоў, Мядзьведава і інш.).

Зразумела, што мне хацелася даць дакладнае апісаньне гаворак раёну. З гэтай мэтай я звярнуўся з дыялектолёгічнай програмай да настаўніцтва Парыцкага раёну з просьбай аб ёй запаўненьні. На жаль з 43 разасланых друкаваных програм ні на адну з іх адказаў не паступіла. Не паступіла таксама ад настаўніцтва адказаў і на мае кароткія пісьмовыя запытаньні адносна некаторых моўных зьяў, што мяне цікавілі, за выключэньнем настаўнікаў Красаўскай школы С. Г. Мітраховіча і Пратасаўскай В. І. Бараноўскага, якім тут і выражаю сваю шчырую падзяку.

Аднак я ўсё-ж спадзяюся, што ўсе характэрныя асаблівасьці беларускіх гаворак Парыцкага раёну мною адзначаны, і што ў маёй працы значных недахопаў не будзе.

Артыкул С. Некрашэвіча «Да характарыстыкі беларускіх гаворак Парыцкага раёну». *Фонд ЦНБ імя Я. Коласа НАН Беларусі.*



Вокладка брашуры С. Некрашэвіча «Да характарыстыкі беларускіх гаворак Парыцкага раёну». Мінск. 1929 г. *Фонд ЦНБ імя Я. Коласа НАН Беларусі.*



Карта Парыцкага раёна (з працы С. Некрашэвіча). *Фонд ЦНБ імя Я. Коласа НАН Беларусі.*



Пралетары ўсіх краін, злучайцеся! Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

ЗБОР ЗАКОНАЎ І ЗАГАДАЎ
Рабоча-Сялянскага Ўраду Беларускай Соцыялістычнай Савецкай Рэспублікі.

СОБРАНИЕ ЗАКОНОВ И РАСПОРЯЖЕНИЙ
Рабоче-Крестьянского Правительства Белорусской Социалистической Советской Республики.

№ 42 | 9 сьнежня 1927 г. | Аддзел I.

№ 42 | 9 декабря 1927 г. | Отдел I.

ЗЬМЕСТ

Пастанова Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР.

Арт. 223. Аб зьняцьці з тав. Васілевіча, Івана Антонавіча, абавязкаў Народнага Камісара Фінансаў БССР і аб назначэньні тав. Мікуліча, Васіля Зьмітравіча, Народным Камісарам Фінансаў БССР.

Пастанова Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР.

Арт. 224. Аб увекавечаньні памяці А. Ф. Мясьнікова—першага Старшыні Ваенна-Рэвалюцыйнага Камітэту Заходняй Вобласьці і Фронту.

Пастановы Савету Народных Камісараў БССР.

Арт. 225. Аб складзе Прэзыдыуму Інстытуту Беларускае Культуры.

Арт. 226. Аб зацьверджаньні правадзейных членаў Інстытуту Беларускае Культуры.

СОДЕРЖАНИЕ

Постановление Президиума Центрального Исполнительного Комитета БССР.

Ст. 223. Об освобождении тов. Василевича, Ивана Антоновича, от обязанностей Народного Комиссара Финансов БССР и о назначении т. Микулича, Василия Дмитриевича, Народным Комиссаром Финансов БССР.

Постановление Президиума Центрального Исполнительного Комитета и Совета Народных Комиссаров БССР.

Ст. 224. Об увековечении памяти А. Ф. Мясникова—первого Председателя Военно-Революционного Комитета Западной Области и Фронта.

Постановление Совета Народных Комиссаров БССР.

Ст. 225. О составе Президиума Института Белорусской Культуры.

Ст. 226. Об утверждении действительных членов Института Белорусской Культуры.

Пастанова Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР.

Арт. 223. Аб зьняцьці з тав. Васілевіча, Івана Антонавіча, абавязкаў Народнага Камісара Фінансаў БССР і аб назначэньні тав. Мікуліча, Васіля Зьмітравіча, Народным Камісарам Фінансаў БССР.


Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

Постановление Президиума Центрального Исполнительного Комитета БССР.

Ст. 223. Об освобождении тов. Василевича, Ивана Антоновича, от обязанностей Народного Комиссара Финансов БССР и о назначении тов. Микулича, Василия Дмитриевича, Народным Комиссаром Финансов БССР.

Президиум Центрального Исполнительного Комитета БССР постановляет:

Збор законаў і загадаў Рабоча-сялянскага ўраду БССР № 42 ад 09.12.1927 г.
Фонд ЦНБ імя Я. Коласа НАН Беларусі.



№ 42 Арт. 225—226

Пастановы Савету Народных Камісараў БССР.

Арт. 225. Аб складзе Прэзыдыуму Інстытуту Беларускае Культуры.

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе зацьвердзіць наступны склад Прэзыдыуму Інстытуту Беларускае Культуры:

1. Прафэсар Ігнатоўскі, Усевалад Макаравіч, Прэзыдэнт Інстытуту Беларускае Культуры;
2. Балуга, Мікола Ільліч, Віцэ-Прэзыдэнт Інстытуту Беларускае Культуры;
3. Ластоўскі, Вацлаў Юстынавіч, Нязьменны Сакратар Інстытуту Беларускае Культуры;
4 Некрашэвіч, Сьцяпан Міхайлавіч, Старшыня Аддзелу Гуманітарных Навук Інстытуту Беларускае Культуры;
5. Смоліч, Аркадзь Антонавіч, Старшыня Аддзелу Прыроды і Гаспадаркі Інстытуту Беларускае Культуры;
6. Гальтман, Сьцяпан Лявонавіч, Загадчык Польскага Сэктару Інстытуту Беларускае Культуры;
7. Аршанскі, Барыс Міхайлавіч, Загадчык Яўрэйскага Сэктару Інстытуту Беларускае Культуры.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР *М. Галадзед.*

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР *М. Мароз.*

3 лістапада 1927 г.
г. Менск.

Апублікавана ў № 270 газэты „Савецкая Беларусь" за 29 лістапада 1927 г.

Арт. 226. Аб зацьверджаньні праваздейных членаў Інстытуту Беларускае Культуры.

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе зацьвердзіць праваздейнымі членамі Інстытуту Беларускае Культуры:

№ 42 Ст. 225—226

Постановления Совета Народных Комиссаров БССР.

Ст. 225. О составе Президиума Института Белорусской Культуры.

Совет Народных Комиссаров БССР постановляет утвердить следующий состав Президиума Института Белорусской Культуры:

1. Профессор Игнатовский, Всеволод Макарович, Президент Института Белорусской Культуры;
2. Балуга, Николай Ильич, Вице-Президент Института Белорусской Культуры;
3. Ластовский, Владислав Устинович, Непременный Секретарь Института Белорусской Культуры;
4. Некрашевич, Степан Михайлович, Председатель Отдела Гуманитарных Наук Института Белорусской Культуры;
5. Смолич, Аркадий Антонович, Председатель Отдела Природы и Хозяйства Института Белорусской Культуры;
6. Гальтман, Степан Леонтьевич, Заведующий Польским Сектором Института Белорусской Культуры;
7. Оршанский, Борис Михайлович, Заведующий Еврейским Сектором Института Белорусской Культуры.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР *Н. Голодед.*

Управляющий Делами Совета Народных Комиссаров и Экономического Совещания БССР *М. Мороз.*

3 ноября 1927 г.
г. Минск.

Опубликовано в № 270 газеты „Советская Беларусь" от 29 ноября 1927 г.

Ст. 226. Об утверждении действительных членов Института Белорусской Культуры.

Совет Народных Комиссаров БССР постановляет утвердить действительными членами Института Белорусской Культуры:

539

Пастановы Савета Народных Камісараў БССР: арт. 225 «Аб складзе Прэзыдыуму Інстытуту Беларускае Культуры»; арт. 226 «Аб зацьверджаньні правадзейных членаў Інстытуту Беларускае Культуры». *Фонд ЦНБ імя Я. Коласа НАН Беларусі.*

ЦАНА 15 кап.

№ 42 Арт. 226

1. Прафесара Ігнатоўскага, Усевалада Макаравіча, па катэдры гісторыі Беларусі;
2. Некрашэвіча, Сцяпана Міхайлавіча, па катэдры жывой беларускай мовы;
3. Лёсіка, Язэпа Юр'евіча, па катэдры беларускай навуковай мовы;
4. Прафесара Смоліча, Аркадзя Антонавіча, па катэдры геаграфіі;
5. Прафесара Замоціна, Івана Іванавіча, па катэдры беларускай літаратуры;
6. Прафесара Ясінскага, Антона Мікітавіча, па катэдры сусьветнай гісторыі;
7. Заслужанага Прафесара Пічэту, Уладзіміра Іванавіча, па катэдры гісторыі права і гаспадаркі Беларусі;
8. Прафесара Блюдухо, Міколу Тодаравіча, па катэдры геолёгіі;
9. Прафесара Афанасьева, Якуба Мікітавіча, па катэдры глебазнаўства;
10. Ластоўскага, Вацлава Юстынавіча, па катэдры этнографіі;
11. Народнага поэта Луцэвіча, Івана Дамінікавіча (Янку Купалу), па клясе прыгожага пісьменства;
12. Народнага паэта Міцкевіча, Кастуся Міхайлавіча (Якуба Коласа), па клясе прыгожага пісьменства;
13. Жылуновіча, Зьмітра Хведаравіча, па клясе прыгожага пісьменства;
14. Прафесара Матулайціса, Станіслава Юр'евіча, па катэдры гісторыі Літвы ў сувязі з гісторыяю Беларусі.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР *М. Галадзед.*

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР. *М. Мароз.*

3 лістапада 1927 г.
г. Менск

Апублікавана ў № 270 газэты „Савецкая Беларусь" ад 29 лістапада 1927 г.

Выданьне Кіраўніцтва Спраў СНК і Эканамічнай Нарады БССР.

№ 42 Ст. 226

1. Профессора Игнатовского, Всеволода Макаровича, по кафедре истории Белоруссии;
2. Некрашевича, Степана Михайловича, по кафедре живого белорусского языка;
3. Лёсика, Иосифа Юрьевича, по кафедре белорусского научного языка;
4. Профессора Смолича, по кафедре географии;
5. Профессора Замотина, Ивана Ивановича, по кафедре белорусской литературы;
6. Профессора Яснинского, Антона Никитича, по кафедре всеобщей истории;
7. Заслуженного профессора Пичету, Владимира Ивановича, по кафедре истории права и хозяйства Белоруссии;
8. Профессора Блюдухо, Николая Федоровича, по кафедре геологии;
9. Профессора Афанасьева, Якова Никитича, по кафедре почвоведения;
10. Ластовского, Вацлава Устиновича, по кафедре этнографии;
11. Народного поэта Луцевича, Ивана Доминиковича (Янку Купалу), по классу изящной литературы;
12. Народного поэта Мицкевича, Константина Михайловича (Якуба Коласа), по классу изящной литературы;
13. Жилуновича, Дмитрия Федоровича, по классу изящной литературы;
14. Профессора Матулайтиса, Станислава Юрьевича, по кафедре истории Литвы в связи с историей Белоруссии.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР *Н. Голодед.*

Управляющий Делами Совета Народных Комиссаров и Экономического Совещания БССР *М. Мороз.*

3 ноября 1927 г.
г. Минск


Опубликовано в № 270 газеты „Советская Белоруссия" от 29 ноября 1927 г.

Издание Управления Делами СНК Экономического Совещания БССР.

Галоўлітбел № 150. (3100 экз.)

Менск, 2-я друк. БДВ № 600.

Спіс правадзейных членаў Інстытута беларускай культуры (з пастановы Савета Народных Камісараў БССР). *Фонд ЦНБ імя Я. Коласа НАН Беларусі.*



ПОСТАНОВЛЕНИЕ
ПРЕДСЕДАТЕЛЯ СОВЕТА НАРОДНЫХ КОМИССАРОВ.

Вследствие смерти известного белорусского историографа проф. А.П. САПУНОВА ПОСТАНОВЛЯЮ:

1. Оставшиеся после смерти А.П. САПУНОВА рукописи его трудов, книги, картины, предметы старины и искусства об'явить национальной собственностью и передать в Институт Белорусской Культуры.

2. Отпустить Институту Белорусской Культуры на организацию похорон А.П.САПУНОВА 300 руб.

3. Предоставляемую А.П.САПУНОВУ постановлением Совнаркома от 2 [illegible] по ставке ответственного работника 17-го разряда выдавать в размере 50% его жене САПУНОВОЙ.

Председатель Совета
Народных Комиссаров /подпись/

С подлинным верно:
Секретарь Главпрофобра

Пастанова старшыні Савета Народных Камісараў БССР па арганізацыйных пытаннях у сувязі са смерцю прафесара А. Сапунова. *Фонд ЦНА НАН Беларусі.*



ЗЬВЯЗДА

ПАСТАНОВА

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

аб рэарганізацыі Інстытуту Беларускай Культуры ў Беларускую Акадэмію Навук

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. ЧАРВЯКОЎ
Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД
Сакратар ЦВК А. ХАЦКЕВІЧ

Беларуская Акадэмія Навук

Новы этап у развіцьці беларускай культуры

НАД СЬВЕЖАЮ УРНАЮ

1-я старонка газеты «Звязда» ад 14.10.1928 г. з пастановай ЦВК і СНК БССР аб рэарганізацыі Інбелкульта ў Беларускую акадэмію навук. *Фонд ЦНБ імя Я. Коласа НАН Беларусі.*

Падпіска на набыццё мармуровай дошкі для ўстаноўкі на доме па вул. Камунальнай у Мінску, дзе нарадзіўся Максім Багдановіч. *Фонд ЦНА НАН Беларусі.*

РАДАВОДНЫЯ РОСПІСЫ

Род Некрашэвічаў герба «Любіч» прызнаны ў дваранстве пастановай Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 27.07.1804 г. Зацверджаны ўказам Сената ад 31.01.1851 г., № 662.

I КАЛЕНА

1 **Сямён,** шляхціч герба «Любіч», парнаўскі харунжы. Купіў з дазволу польскага караля Жыгімонта III Вазы ў 1588 г. у Васіля Сегеня маёнтак Лопаць.

II КАЛЕНА

2/1 **Павел.** Валодаў вотчынным маёнткам Некрашэўшчызна, які завяшчаў у 1639 г. тром сынам: Івану, Хрыстафору і Нікіфару. Маёнтак Лопаць пакінуў Івану і Нікіфару.

III КАЛЕНА

3/2 **Іван.** Разам з братамі Хрыстафорам і Нікіфарам валодаў вотчынным маёнткам Некрашэўшчызна, які атрымаў згодна з завяшчаннем бацькі ад 1639 г. Разам з братам Нікіфарам прадаў у 1645 г. Фадзею Ракіцкаму, паручыўшыся за сваіх сыноў Сідара і Самуіла, маёнтак Лопаць з трыма сялянамі, што застаўся ад бацькі.

4/2 **Хрыстафор,** чашнік па прывілеі польскага караля Уладзіслава IV Вазы [1647] г. Разам з братамі Іванам і Нікіфарам валодаў вотчынным маёнткам Некрашэўшчызна, які атрымаў па завяшчанні бацькі ад 1639 г.

5/2 **Нікіфар.** Разам з братамі Хрыстафорам і Іванам валодаў вотчынным маёнткам Некрашэўшчызна, які атрымаў згодна з завяшчаннем бацькі ад 1639 г. Разам з братам Іванам прадаў у 1645 г. Фадзею Ракіцкаму, паручыўшыся за сына Паўла, маёнтак Лопаць з трыма сялянамі, што застаўся ад бацькі.

IV КАЛЕНА

6/3 **Сідар,** стольнік па прывілеі польскага караля Яна II Казіміра Вазы [1654] г. Купіў 02.07.1697 г. у дваюрадных братоў Зянона і Дзям'яна Нікіфаравічаў зямлю ў Слуцкім павеце. У 1701 г. купіў у дваюраднага брата Лявона Хрыстафоравіча зямлю ў маёнтку Шабунькі. У Слуцкім замку пакінуў завяшчанне ад 04.06.1727 г. сынам Самуілу і Івану на зямлю.

7/3 **Самуіл (Сцяпан),** пасланнік Чарнігаўскага ваяводства па прывілеі польскага караля Яна III Сабескага [1689] г. У 1701 г. купіў у дваюраднага брата Лявона Хрыстафоравіча зямлю ў маёнтку Шабунькі. Па рэестры шляхты Слуцкага княства ад 18.05.1733 г., значыўся казаком, жыў у засценку Шабунькі.

НГАБ, ф. 694, воп. 2, спр. 7406, арк. 14 адв.

8/4 **Лявон.** Валодаў зямлёй у маёнтку Шабунькі, якую ў 1701 г. прадаў дваюрадным братам Сідару і Самуілу Іванавым.

9/4 **Мацвей.**



По описи утвержденныхъ дѣлъ №

ДѢЛО

Минскаго Дворянскаго Депутатскаго Собранія

о дворянскомъ происхожденіи

рода

Первоначальныя определенія Депут. Собранія

Указъ Правительствующаго Сената объ утвержденіи

отъ 18 года, за № 662

Справа Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу аб дваранскім паходжанні роду Некрашэвічаў.
НГАБ, ф. 319, воп. 2, спр. 2244.

10/4 **Іван.** Па рэестры шляхты Слуцкага княства ад 18.05.1733 г., жыў у засценку Шабунькі.

НГАБ, ф. 694, воп. 2, спр. 7406, арк. 14 адв.

11/5 **Павел.** Па прывілеі польскага караля Яна ІІ Казіміра Вазы [1665] г. валодаў падараваным ленным маёнткам Старыя Чыбкавічы. 02.12.1690 г. у Слуцкім замку запісаў пратэст аб крадзяжы каралеўскіх грамат, пажалаванняў князёў і іншых дакументаў на валоданне маёнткамі. 13.11.1670 г. атрымаў атэстат ротмістра Андрэя Тарасевіча аб яўцы на апалчэнне.

12/5 **Зянон.** Разам з братам Дзям'янам прадаў 02.07.1697 г. дваюраднаму брату Сідару Іванавічу зямлю ў Слуцкім павеце.

13/5 **Дзям'ян.** Разам з братам Зянонам прадаў 02.07.1697 г. дваюраднаму брату Сідару Іванавічу зямлю ў Слуцкім павеце. Прадаў 20.03.1714 г. Фёдару Валадковічу зямлю ў маёнтку Танежыцы[1].

V КАЛЕНА

14/6 **Самуіл,** казак. Па інвентары маёнтка Пагост Навагрудскага ваяводства 1751 г., жыў у засценку Сыцянец, валодаў 1/2 і 1/4 «казацкай» валокі, 2 коньмі, 2 валамі.

НГАБ, КМФ-5, воп. 1, спр. 3178, арк. 136.

15/6 **Іван.** Па рэестры шляхты Слуцкага княства ад 18.05.1733 г., жыў у засценку Шабунькі.

НГАБ, ф. 694, воп. 2, спр. 7406, арк. 14 адв.

Разам са сваякамі судзіўся з дваюраднымі братамі Міхаілам і Сямёнам Самуілавічамі аб заваладанні імі маёнткам Некрашэўшчызна, атрыманым у спадчыну па роўным падзеле, у сувязі з чым да заканчэння справы атрымаў ад караля Рэчы Паспалітай Аўгуста ІІІ у 1737 г. ахоўную грамату.

16/7 **Міхаіл.** Разам з братам Сямёнам у 1737 г. заваладаў усім маёнткам Некрашэўшчызна, атрыманым у спадчыну па роўным падзеле з іншымі сваякамі. Прэтэнзіі з боку сваякоў спыніліся толькі ў 1793 г. заключэннем міравога пагаднення з яго сынамі.

17/7 **Сямён.** Разам з братам Міхаілам у 1737 г. заваладаў усім маёнткам Некрашэўшчызна, атрыманым у спадчыну па роўным падзеле з іншымі сваякамі. Прэтэнзіі з боку сваякоў спыніліся толькі ў 1793 г. заключэннем міравога пагаднення з яго пляменнікамі.

Жонка – Еўдакія, *1711 г. н. У 1787 г. жыла ў засценку Шабунькі, была прыхаджанкай Цараўскай Іаана-Багаслоўскай царквы. Памерла, пахавана 20.01.1787 г. святаром Цараўскай Іаана-Багаслоўскай царквы Сімяонам Кранікоўскім[2].

18/7 **Васіль.** Па рэестры шляхты Слуцкага княства ад 18.05.1733 г., жыў у засценку Шабунькі.

НГАБ, ф. 694, воп. 2, спр. 7406, арк. 14 адв.

19/8 **Грыгорый,** казак. Па рэестры шляхты Слуцкага княства ад 18.05.1733 г. (*НГАБ, ф. 694, воп. 2, спр. 7406, арк. 5 адв.*) і інвентарам маёнтка Пагост Навагрудскага ваяводства 1733 г. (*НГАБ, КМФ-5, воп. 1, спр. 3177, арк. 101*) і 1751 г. (*НГАБ, КМФ-5, воп. 1, спр. 3178, арк. 134*), жыў у засценку Язовіны, валодаў у 1733 г. 1/4 валокі зямлі пад будынкам і ў 1751 г. 1/2 «казацкай» валокі, 1/10 валокі «аселай» зямлі, 2 коньмі, [4] валамі. Разам са сваякамі судзіўся з траюраднымі братамі Міхаілам і Сямёнам Самуілавічамі аб заваладанні імі маёнткам Некрашэўшчызна, атрыманым у спадчыну па роўным падзеле, у сувязі з чым да заканчэння справы атрымаў ад караля Рэчы Паспалітай Аўгуста ІІІ у 1737 г. ахоўную грамату.

20/8 **Аляксандр.** Па рэестры шляхты Слуцкага княства ад 18.05.1733 г., жыў у засценку Шабунькі.

НГАБ, ф. 694, воп. 2, спр. 7406, арк. 14 адв.

Разам са сваякамі судзіўся з траюраднымі братамі Міхаілам і Сямёнам Самуілавічамі аб завалоданні імі маёнткам Некрашэўшчызна, атрыманым у спадчыну па роўным падзеле, у сувязі з чым да заканчэння справы атрымаў ад караля Рэчы Паспалітай Аўгуста III у 1737 г. ахоўную грамату.

21/9 **Аляксандр.** Па рэестры шляхты Слуцкага княства ад 18.05.1733 г. і інвентары маёнтка Пагост Навагрудскага ваяводства 1733 г., жыў у засценку Язовіны.

НГАБ, ф. 694, воп. 2, спр. 7406, арк. 5 адв.

22/10 **Сцяпан.**

23/11 **Іван,** рэестравы. Па рэестры шляхты Слуцкага княства ад 18.05.1733 г., жыў у засценку Сыцянец.

НГАБ, ф. 694, воп. 2, спр. 7406, арк. 6.

Разам са сваякамі судзіўся з траюраднымі братамі Міхаілам і Сямёнам Самуілавічамі аб завалоданні імі маёнткам Некрашэўшчызна, атрыманым у спадчыну па роўным падзеле, у сувязі з чым да заканчэння справы атрымаў ад караля Рэчы Паспалітай Аўгуста III у 1737 г. ахоўную грамату.

24/11 **Гаўрыіл.** Разам са сваякамі судзіўся з траюраднымі братамі Міхаілам і Сямёнам Самуілавічамі аб завалоданні імі маёнткам Некрашэўшчызна, атрыманым у спадчыну па роўным падзеле, у сувязі з чым да заканчэння справы атрымаў ад караля Рэчы Паспалітай Аўгуста III у 1737 г. ахоўную грамату.


Жонка – Агафія, *1710 г. н. Памерла ва ўзросце 90 гадоў, пахавана 05.05.1800 г. святаром Цараўскай Іаана-Багаслоўскай царквы Сімяонам Кранікоўскім[3].

VI КАЛЕНА

25/16 **Фадзей,** *1748 г. н. Разам з братамі валодаў вотчынным маёнткам Некрашэўшчызна з дзевяццю хатамі сялян, якія ў 1790 г. прадаў аршанскаму ротмістру Івану Акулічу, паручыўшыся за сына Луку. У 1793 г. заключыў міравое пагадненне са сваякамі Андрэем і Максіміліянам Грыгор'евічамі, Антонам Аляксандравічам, Іванам, Васілём і Уладзіславам Іванавічамі з нагоды продажу іх часткі вотчыннага маёнтка Некрашэўшчызна, тым самым паклаўшы канец шматгадовай варожасці. Жыў у засценку Сухалессе (Сухалесішча, Клешава), быў прыхаджанінам Цараўскай Іаана-Багаслоўскай царквы. Памёр ва ўзросце 66 гадоў «натуральнаю» смерцю, пахаваны 03.11.1814 г. святаром Цараўскай Іаана-Багаслоўскай царквы Раманам Мінкевічам[4].

Жонка – **Еўфрасіння Уладзіславаўна (Уладзіміраўна) Забродская** (гл. «Забродскія» 123/56), *1762 г. н. Жыла ў засценку Сухалессе (Сухалесішча, Клешава), была прыхаджанкай Цараўскай Іаана-Багаслоўскай царквы. Разам са Стэфанам Аляксеевічам Кулеўскім была хроснай 28.12.1800 г. у Стэфана[5], 16.07.1802 г. – ва Уліты[6], 01.01.1806 г. – у Ганны[7], 26.07.1811 г. – у Макарыя[8], дзяцей Аляксандра (Аляксея) Мацвеевіча і Кацярыны Аляксандраўны Кулеўскіх. Памерла ва ўзросце 61 года ад гарачкі, пахавана 23.03.1823 г. святаром Цараўскай Іаана-Багаслоўскай царквы Раманам Мінкевічам[9].

26/16 **Іван,** *1740 г. н. Разам з братамі валодаў вотчынным маёнткам Некрашэўшчызна з дзевяццю хатамі сялян, якія ў 1790 г. прадаў аршанскаму ротмістру Івану Акулічу. У 1793 г. заключыў міравое пагадненне са сваякамі Андрэем і Максіміліянам Грыгор'евічамі, Антонам



Działo się na Sessyi Deputacyi Wywodowey Gubernii Mińskiey

Wywód Familii Urodzonych Niekraszewiczów

Roku Tysiąc Ośmsetnego czwartego Miesiąca Julii Dwudziestego Siódmego Dnia

Przed Nami Stanisławem [illegible] Marszałkiem Gubernskim Mińskim Kawalerem Orderu Świętey Anny Drugiey Klassy oraz Deputatami z Powiatów Gubernii Mińskiey do dekretowania y roztrząsania dowodów Szlacheckich obranymi. Złożony został wywód Familii Urodzonych Niekraszewiczów, przez Urodzonego [illegible] Syna Symona Niekraszewicza z którego okazało się że ta Familia używa Herbu Lubicz pieczęci

Вызначэнне Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 27.07.1804 г. аб далучэнні да дваранскага роду асоб роду Некрашэвічаў (на 8 старонках; польская мова). *НГАБ, ф. 319, воп. 2, спр. 2244, арк. 510–513 адв.*

na Tarczy wystawiony nadeń na [illegible] [illegible] przez Konstytu-
cyi y urzędu [illegible], na Hełmie [illegible] prosta Strza-
ły [illegible] podług Świadectwa [illegible] [illegible]
z dawnych czasów prerogatywy Szlachetny ze wszelką
wolnością y swobodą temu Stanowi [illegible] zapewnione
zostają, usługi wojenne podług przepisów Praw
krajowych pełniła, ciągle utrzymujące się w tym Zaszczycie
dotychczas, z której to Familij [illegible] wywodzący się od
Trzech Braci [illegible] przez Nas Deputacyą
1\. [illegible] [illegible] Jana, Krzysztofa y Mikołaja
rodzonych Braci Niekraszewiczów, [illegible] [illegible]
Szlachetney y pochodzenia swego w następnym sposobie
Dowodami pisma wyprowadzili: że Jan Niekraszewicz
wyżej [illegible] [illegible] miał Synów Dwóch Sidora y
2 Samuela, a Krzysztof Brat Jana miał Trzech Synów Ma-
cieja, Iwana y Leona... Mikołay Trzeci Brat ich miał
Synów Trzech Dawida Zenona y Demjana [illegible]
[illegible] Dnia [illegible] Roku Tysiąc Siedemset [illegible]
[illegible] Roku Decembra Drugiego. Extrakt Ma-
nifestu [illegible] Przywilejów Królewskich Na-
dań [illegible] y różnych dalszych Dokumentów na
gruntowną posesyę przez Dawida Syna Mikoła-
ja Niekraszewicza w [illegible] Ruskim [illegible]
nego. Tysiąc Siedemset Dziewięćdziesiątego Siódmego Ro-
ku Julij Drugiego. [illegible] [illegible] od [illegible]

311

: Demiana Synow Krzysztofa Niekraszewiczow Syna
pomienia Trzeciego Brata Jak Sendu. Sidorowi Syno
wi Jana Niekraszewiczowi Stryjecznemu swemu
Brat, na grunt w Sakuniach w Powiecie Reckim
dawniey leżący wydana. Tegoż Siedmset Siedm
dziesiątego Novembra Trzynastego. Ekstrakt Ak-
tacja Trzecewicza Kollekcyna z popisu generalnego
y rozpisywania Chanu, że Paweł Syn Krzysztofa Nie-
kraszewicz konia swoy prowadził. Tegoż Siedm
set pierwszego Grunu Chrzcim w dome Syna:
Krzysztofa Sidorowi y Samuelowi Synom Jana
Braciom stryjecznym na grunt leżący w Sakuniach
Że Sidor Jana Syn spłodził Synów Jana y Sa- 3
muela. Samuel Jana Syn a Brat Sidora miał
Synów Trzech Symona, Michała y Bazylego.
Maciey Syn Krzysztofa miał Syna Alexandra.
Iwan Syn Krzysztofa miał Syna Stefana. Paweł
Krzysztofa Syn miał Synów Jana y Iwana w po-
koleniu Trzecim to pokazuje. Tegoż Siedmset Dwu
dziestego Siódmego. Juny czwartego Podawany w
tym że czasie w Zamku Reckim aktykowany Testa-
ment Sidora Jana Syna rozpisujący grunt na Synów.

Samuela y Jana — [illegible] Ziemskich Trybunalskiego [illegible]-
ciego Marca piątego extrakt Documentu podpisane-
go przez Andrzeia Bauda [illegible] [illegible] [illegible]
go następuiącego, a przez Jana Baudowicza, Samuela
Sidorowicza y Bazylego Samuelowicza Niecrasz-
ewiczow akceptowanego. [illegible] [illegible] [illegible]
Roku [illegible] [illegible] zaświadczenie z Duchowne-
go [illegible] [illegible] u nie znajdowany się
4 Metryk chrzcielnych wydane. — Że z Jana Syna
Sidora Jerzy z Samuela Sidora Syna Michał
z Symona Samuela Syna, Jan, Michał y Fran-
ciszek y Jan — z Michała Samuela Syna, Ja-
[illegible], Bazyli, Jan, y Jan — z Bazylego Samuela
Syna, Mikołay, Andrzey — z Alexandra Macieja
Syna Józef, y Michał — z Stefana Iwana
Syna Grzegorz — z Jana Syna Bauda, Gabriel
w [illegible] czwartym pokoleniu — a z Jerzego
Jana Syna Michał y Antoni, z Michała Samu-
ela Syna Michał — z Jana Syna Symona.

519

Andrzey y Symon. z Alechsego Syna Symona
Bazyli. z Tadeusza Syna Michała, Alexy y
Daniel y Symon. z Bazylego Michała Syna
Stefan y Jakub. z Jana Syna Michała. Jakub
Piotr, Franciszek y Jan. z Jozefa Syna Alexan
dra Michał. z Gabryela Syna Jana, Jan.
w pokoleniu piątym pochodzą. Następnie z
Alechsego Syna Jonnego. Jan, Antoni y Jakub.
z Antoniego Syna Jonnego. Filip y Symon. z
Jana Syna Gabryela Jan, Jozef y Ludwik.
w pokoleniu Szóstym z Ludwika Syna Jana
Jan y Michał. w pokoleniu Siódmym, z ktorych
po większey części w Życiu zostaiący, dziś składa
ią liczną Familią, y wszyscy podług wolno
ści Szlacheckiey utrzymuią się. Dowodem
czego. Dowiezyone Sprawy Szlacheckie zdo
no, w ktorych za Szlachtę Czynszową zapisan
e.

po zdoieniu iawnych Dowodow pisma. De-
putacya Wywodowa Gubernii Minskiey to wszyst
ko przyznawszy y znaiąc oraz zastosowawszy, iż przy
będąca się Familia urodzonych Niekraszewiczow od
dawna prerogatywą Szlachetną zaszczycona, a od Za
szłych Protoplastow Dowody pisma probujące
Rodowitości Szlacheckiey wywodu, daley Swiadectwa
w zaginionych Metrykach, y Znaki Szlacheckie ze
wszystkie posiadała Antecessorow w wolności Szla
checkiey chcę przy usłudze swey Szlachty zdrzym
iż się od nikogo nie obiecowani, powszechnie na
prawdziwą Szlachtę uznani. na Fundamencie
wię wyżey wyrażonych Dowodow pisma.
My Marszałek Gubernski y Deputaci z Po
wiatow Gubernii Minskiey wybrani maiąc się
stosownie do przepisu Praw w Dyplommacie
pod Rokiem Tysiąc Siedmset Ośmdziesiątt pią
tym Nayiaśnieyszey Szlachcie nadanym wy
rażonych. Niemniey też pilnuiąc się prawdzi
w Ukazie z Rządzącego Senatu na Nayiaśnieyszą

573

Konfirmacyą Nayiaśnieyszego Monarchy pod
Dniem piątym Maja Tysiąc Osimset pierwszego
Roku wydanym Familią Urodzonych Niekras
szewiczow iako to Dziś wywodzących się Jerzego
Syna Jana y iego Dwóch Synow Archerego
y Antoniego.– Jana, Antoniego y Jakuba Synow
Archerego.– Filipa y Symona Synow Anto-
niego.– Michała Syna Samuela, y iego Syna
Archerego.– Jana Symona Syna z Dwoma Synami
Andrzejem y Symonem.– Archerego Symona Syna
z Synem Bazylim.– Franciszka y Jana Synow
Symona.– Tadeusza Michała Syna z Trzema
iego Synami, Archerym, Danielem y Symonem.
Bazylego Michała Syna z dwoma Synami Ste-
fanem y Jakubem.– Jana Syna Michała y Jego
czterech Synow. Jakuba, Piotra, Franciszka y
Jana.– Jana Mikołaja y Andrzeja Synow Ba-
zylego.– Józefa z Synem iego Michałem, y Michała
Synow Alexandra.– Grzegorza Syna Stefana.– Gabry-
ela z Synem Janem. Syna Jana.– Jana, Józefa y Ludwika

Dwoma Synami Janem y Michałem, Synów Jana za
prawdziwą Szlachtę Polską uznawamy, do Xięgi Szla
checkiey Gubernij Mińskiey części pierwszey wpisuiemy
a spełniaiąc wolę Prawa Patentt na Imie wyżey
wyrażonego się starszego Syna Symona Niecraszewicza
wydać Determinuiemy —

Michał Wankiewicz Marszałek [illegible]

Antoni Bogdaszewski Deputat Pow[illegible]

[illegible] Oficjalnie z pod [illegible]

[illegible]

Michał Rymsza [illegible] Deputat [illegible]

[illegible] Deputat [illegible]

Julian Nietubowicz Deputat Pińsk[illegible]

Sekretarz Grzegorz Olendzki

Аляксандравічам, Іванам, Васілём і Уладзіславам Іванавічамі з нагоды продажу іх часткі вотчыннага маёнтка Некрашэўшчызна, тым самым паклаўшы канец шматгадовай варожасці. Жыў у засценку Сухалессе (Сухалесішча, Клешава) Слуцкага павета. Памёр ва ўзросце 60 гадоў, пахаваны 01.02.1800 г. святаром Цараўскай Іаана-Багаслоўскай царквы Сімяонам Кранікоўскім[10].

Жонка – Марыяна Забродская.

27/16 **Васіль.** Разам з братамі валодаў вотчынным маёнткам Некрашэўшчызна з дзевяццю хатамі сялян, які ў 1790 г. прадаў аршанскаму ротмістру Івану Акулічу. У 1793 г. заключыў міравое пагадненне са сваякамі Андрэем і Максіміліянам Грыгор'евічамі, Антонам Аляксандравічам, Іванам, Васілём і Уладзіславам Іванавічамі з нагоды продажу іх часткі вотчыннага маёнтка Некрашэўшчызна, тым самым паклаўшы канец шматгадовай варожасці.

28/16 **Іва (Іван).** Разам з братамі валодаў вотчынным маёнткам Некрашэўшчызна з дзевяццю хатамі сялян, які ў 1790 г. прадаў аршанскаму ротмістру Івану Акулічу. У 1793 г. заключыў міравое пагадненне са сваякамі Андрэем і Максіміліянам Грыгор'евічамі, Антонам Аляксандравічам, Іванам, Васілём і Уладзіславам Іванавічамі з нагоды продажу іх часткі вотчыннага маёнтка Некрашэўшчызна, тым самым паклаўшы канец шматгадовай варожасці. Жыў у засценку Кулешы (Сухалессе). Памёр ва ўзросце 18 гадоў, пахаваны 06.06.1797 г. святаром Цараўскай Іаана-Багаслоўскай царквы Сімяонам Кранікоўскім[11].

29/19 **Максіміліян.** Па інвентары маёнтка Пагост Навагрудскага ваяводства ад 23.04.1787 г. (*НГАБ, ф. 694, воп. 2, спр. 6423, арк. 22 адв. – 23*), жыў у засценку Язовіны, валодаў 1 і 1/60 валокі зямлі, 1 канём, 2 валамі, плаціў чынш 30 злотых 6 2/3 грошаў. Заключыў у 1793 г. міравое пагадненне са сваякамі Фадзеем, Іванам, Васілём і Іванам Міхайлавічамі з нагоды продажу іх часткі вотчыннага маёнтка Некрашэўшчызна, тым самым паклаўшы канец шматгадовай варожасці.

Жонка – Іаанна.

30/19 **Андрэй.** Заключыў у 1793 г. міравое пагадненне са сваякамі Фадзеем, Іванам, Васілём і Іванам Міхайлавічамі з нагоды продажу іх часткі вотчыннага маёнтка Некрашэўшчызна, тым самым паклаўшы канец шматгадовай варожасці.

Жонка – Ганна.

159/66 **Марфа,** нарадзілася 04.07.1811 г., ахрышчана 04.07.1811 г. святаром Гаўрыілам Бабарыкіным у Старобінскай Мікалаеўскай царкве. Хросныя бацькі – жыхар фальварка Старына арандатар Геранім Тацярняўскі, праваслаўнага веравызнання, і жонка Ануфрыя Хрушчэўскага Алена, каталіцкага веравызнання[200].

160/66 **Іван,** нарадзіўся 15.06.1817 г. Ахрышчаны 16.06.1817 г. святаром Гаўрыілам Бабарыкіным у Старобінскай Мікалаеўскай царкве. Хросныя бацькі – жыхар фальварка Старына памешчык N і жонка Міхаіла Цэйзіка Ганна[201]. Жыў у засценку Сыцянец. Разам з жонкай Майсея Грыгор'евіча Некрашэвіча Агафіяй Пятроўнай быў хросным 13.07.1831 г. у Яўфіміі[202], дачкі Яўхіма Фёдаравіча і Марыі Фёдараўны Клішэвічаў; з жонкай Андрэя Некрашэвіча Марыяй Дзям'янаўнай 18.07.1837 г. – у Ганны[203], дачкі Яна Грыгор'евіча і Агафіі Пятроўны

Сеўрукаў; з Агафіяй Іванаўнай 10.11.1837 г. – у Матроны[204], дачкі Венядзікта Іванавіча і Глікерыі Дзям'янаўны Некрашэвічаў; з Аленай Грыгор'еўнай Некрашэвіч 10.05.1839 г. – у Ірыны[205], дачкі Майсея Грыгор'евіча і Агафіі Іванаўны Некрашэвічаў.

161/67 **Сымон,** *1792 г. н. Па рэвізскай сказцы ад 29.08.1795 г., разам з бацькамі жыў у засценку Сыцянец на зямлі князя Дамініка Радзівіла.

162/67 **Ганна,** *1800 г. н. Жыла ў засценку Сыцянец. Разам з Грыгорыем Некрашэвічам была хроснай 24.12.1817 г. у Варвары[206], дачкі Грыгорыя Іванавіча і Марыі Васільеўны Сеўрукаў.

Муж – Марцін Андрушкевіч, 22 гадоў, жыхар вёскі Раткаў, прыхаджанін Прускай Раство-Багародзіцкай царквы. Шлюб 25.01.1820 г. у Старобінскай Мікалаеўскай царкве. Святар – Гаўрыіл Бабарыкін. Сведкі – жыхар засценка Раткаў Пётр Клакоўскі і жыхар засценка Сыцянец Грыгорый Некрашэвіч[207].

163/67 **Ксенія,** нарадзілася 25.01.1821 г., ахрышчана 27.01.1821 г. святаром Гаўрыілам Бабарыкіным у Старобінскай Мікалаеўскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Сыцянец Грыгорый Некрашэвіч і дачка Нікіфара Некрашэвіча Марыя, дзяўчына[208].

164/67 **Матрона,** нарадзілася 25.03.1802 г., ахрышчана святаром Гаўрыілам Бабарыкіным у Старобінскай Мікалаеўскай царкве. Хросныя бацькі – Фама Сямёнавіч Сеўрук і жонка Грыгорыя Некрашэвіча Марыя[209]. Жыла ў засценку Сыцянец. Разам з Грыгорыем Некрашэвічам была хроснай 18.11.1820 г. у Кацярыны, дачкі Грыгорыя Іванавіча і Агафіі Васільеўны Сеўрукаў[210].

165/67 **Раман,** *1793 г. н. Па рэвізскай сказцы ад 29.08.1795 г., разам з бацькамі жыў у засценку Сыцянец на зямлі князя Дамініка Радзівіла. Разам з Марыяй Грыгор'еўнай Некрашэвіч быў хросным 27.02.1829 г. у Пракопія[211], сына Грыгорыя Андрэевіча і Матроны Іванаўны Іскрыцкіх; з Ганнай Грыгор'еўнай Сеўрук 26.08.1829 г. – у Адрыяна[212], сына Мацвея Андрэевіча і Алены Некрашэвічаў. Разам з жыхаром вёскі Паварчычы Іванам Некрашэвічам быў сведкам пры шлюбе 30.06.1829 г. Ісідара Васільевіча Некрашэвіча і Параскевіі Паўлаўны Заневіч[213].

Жонка – Параскевія Фёдараўна (Грыгор'еўна, Мацвееўна). Разам з Якавам Некрашэвічам была хроснай 14.05.1809 г. у Алены[214], дачкі Марціна Грыгор'евіча і Фёклы Пятроўны Некрашэвічаў; з Грыгорыем Некрашэвічам 02.02.1810 г. – у Ганны[215], дачкі Грыгорыя Іванавіча і Агафіі Васільеўны Сеўрукаў; 22.01.1825 г. – у Еўфрасінні[216], дачкі Мацвея Андрэевіча і Настасіі Грыгор'еўны Некрашэвічаў; з Грыгорыем Сеўруком 30.03.1820 г. – у Алены[217], дачкі Грыгорыя Уладзіслававіча і Еўдакіі Данілаўны Некрашэвічаў.

166/67 **Грыгорый.** Разам з Ганнай Іванаўнай Некрашэвіч быў хросным 24.12.1817 г. у Варвары[218], дачкі Грыгорыя Іванавіча і Марыі Васільеўны Некрашэвічаў; з Матронай Іванаўнай Некрашэвіч 18.11.1820 г. – у Кацярыны[219], дачкі Грыгорыя Іванавіча і Агафіі Васільеўны Сеўрукаў; з Ірынай Раманаўнай Некрашэвіч 18.08.1831 г. – у Мірона[220], сына Венядзікта і Глікерыі Некрашэвічаў; з Марыяй Нікіфараўнай Некрашэвіч 27.01.1821 г. – у Ксеніі[221], дачкі Яна Уладзіміравіча і Еўфрасінні Пятроўны Некрашэвічаў; з Матронай Грыгор'еўнай Некрашэвіч 25.02.1821 г. – у Агафіі[222], дачкі Рамана Іванавіча і Параскевіі Грыгор'еўны Некрашэвічаў; з Марыяй Сеўрук 17.12.1821 г. – у Івана[223], сына Стэфана Андрэевіча і Ганны Некрашэвічаў. Разам

з Пятром Клакоўскім быў сведкам пры шлюбе 25.01.1820 г. Марціна Андрушкевіча і Ганны Іванаўны Некрашэвіч[224]; з Паўлам Казлоўскім – пры шлюбе 02.05.1820 г. Фёдара Казлоўскага і Ірыны Грыгор'еўны Сеўрук[225].

167/67 **Венядзікт,** нарадзіўся 14.03.1806 г., ахрышчаны святаром Гаўрыілам Бабарыкіным у Старобінскай Мікалаеўскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Сыцянец Фама Сеўрук і жонка Грыгорыя Сеўрука Яфімія[226]. Жыў у засценку Сыцянец.

Жонка – Глікерыя Дзям'янаўна. Разам з Грыгорыем Нікіфаравічам Некрашэвічам была хроснай 03.06.1832 г. у Марыі[227], дачкі Марціна Грыгор'евіча і Ірыны Паўлаўны Сеўрукаў.

168/68 **Мікалай,** *1797 г. н. Да жаніцьбы жыў у засценку Кутнева. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у вёсцы Астраўкі на арэнднай зямлі князя Радзівіла.

Жонка – Матрона Сямёнаўна Івашкевіч, жыхарка засценка Кутнева. Шлюб 18.01.1825 г. у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Святар – Іўстын Прорвіч.

169/68 **Васіль,** *1810 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у вёсцы Астраўкі на арэнднай зямлі князя Радзівіла.

170/69 **Іван,** нарадзіўся 18.04.1808 г., ахрышчаны 19.04.1808 г. святаром Гаўрыілам Бабарыкіным у Старобінскай Мікалаеўскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Сыцянец Іаан Некрашэвіч і жонка Дзмітрыя Сеўрука Ганна[228].

171/69 **Алена,** нарадзілася 29.03.1820 г., ахрышчана 30.03.1820 г. святаром Гаўрыілам Бабарыкіным у Старобінскай Мікалаеўскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Сыцянец Грыгорый Сеўрук і жонка Рамана Некрашэвіча Параскевія[229]. Жыла ў засценку Сыцянец. Разам з Кузьмой Паўлавічам Івашкевічам была хроснай 28.08.1832 г. у Настасіі[230], 15.09.1836 г. – у Феадоры[231], з Іванам Нікіфаравічам Некрашэвічам 10.05.1839 г. – у Ірыны[232], дачок Майсея Грыгор'евіча і Агафіі Іванаўны Некрашэвічаў.

172/69 **Матрона,** нарадзілася 05.11.1801 г., ахрышчана святаром Гаўрыілам Бабарыкіным у Старобінскай Мікалаеўскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Сыцянец Іван Уладзіслававіч Некрашэвіч і дачка Грыгорыя Некрашэвіча Марыя[233]. Разам з Яфімам Свірскім была хроснай 28.04.1815 г. у Ірыны[234], з Грыгорыем Некрашэвічам 25.02.1821 г. – у Агафіі[235], дачок Рамана Іванавіча і Параскевіі Мацвееўны (Грыгор'еўны) Некрашэвічаў. Мела дзяцей: Марыю, Мітрафана, Грыгорыя, Івана, Аляксандру, Усцінію, Захарыя.


Муж – **Якаў Гервазіевіч Тычына,** дваранін (гл. «Тычыны» 81/44).

173/69 **Еўдакія,** нарадзілася 08.03.1831 г.

174/69 **Давід,** нарадзіўся 04.07.1803 г., ахрышчаны святаром Гаўрыілам Бабарыкіным у Старобінскай Мікалаеўскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Сыцянец Іаан Некрашэвіч і дачка Грыгорыя Некрашэвіча Марыя, дзяўчына[236].

175/69 **Ганна,** нарадзілася 04.02.1800 г., ахрышчана святаром Старобінскай Мікалаеўскай царквы. Хросныя бацькі – Пётр Даніілавіч Пількевіч і дачка Грыгорыя Некрашэвіча Марыя[237]. Пахавана 04.08.1800 г. святаром Старобінскай Мікалаеўскай царквы[238].

176/69 **Ануфрый,** нарадзіўся 12.06.1810 г., ахрышчаны 14.06.1810 г. святаром Гаўрыілам Бабарыкіным у Старобінскай Мікалаеўскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Сыцянец Грыгорый Сеўрук і жонка Фамы Сеўрука Параскевія Аляксандраўна[239].



Выпіска з метрычных кніг Старобінскай Мікалаеўскай царквы аб нараджэнні 05.11.1801 г. Матроны Грыгор'еўны Некрашэвіч – маці Аляксандры Якаўлеўны Карафа-Корбут (Тычыны), прапрабабулі Анатоля Статкевіча-Чабаганава (гл. «Некрашэвічы» 172/69). *НГАБ, ф. 136, воп. 13, спр. 546, арк. 120 адв.*

IX КАЛЕНА

177/72 **Іван.**

178/73 **Мікалай,** нарадзіўся 14.06.1837 г.

179/73 **Іосіф,** нарадзіўся 11.09.1841 г.

180/75 **Сямён.**

181/76 **Дзям'ян.**

182/76 **Міхаіл.**

183/77 **Фёдар.**

184/79 **Фёдар.**

185/79 **Ігнацій.**

186/79 **Сямён.**

187/81 **Давід.**

188/84 **Філімон,** нарадзіўся 22.11.1839 г. Памёр 03.02.1840 г. ад адру, пахаваны 05.02.1840 г. святаром Цараўскай Іаана-Багаслоўскай царквы Іаанам Мінкевічам[240].

189/89 **Стэфан.**

190/89 **Іван.**

191/89 **Раман.**

192/89 **Фёдар.**

193/109 **Іаан,** нарадзіўся 24.07.1848 г., ахрышчаны 29.07.1848 г.

194/111 **Васіль,** нарадзіўся 01.01.1860 г., ахрышчаны 03.01.1860 г.

195/111 **Павел,** нарадзіўся 24.07.1861 г., ахрышчаны 28.07.1861 г.

196/114 **Сцяпан,** нарадзіўся 23.03.1826 г.

197/114 **Іван,** нарадзіўся 14.11.1836 г., ахрышчаны 15.11.1836 г. святаром Паўлам Якаўлевічам Яромічам у Парыцкай Свята-Духавай царкве Бабруйскага павета. Хросныя бацькі – жыхары засценка Дражня Мацвей Якаўлевіч Рудзінскі і дачка Максіма Некрашэвіча Домна, дзяўчына[241]. Жыў у засценку Дражня. Разам з Ульяніяй Іосіфаўнай Рудзінскай быў хросным 03.06.1862 г. у Іўсціна[242], сына Стэфана Іванавіча і Ксаверыі Львоўны Карафа-Корбутаў. Разам з Аляксандрам Ануфрыевічам Некрашэвічам быў сведкам з боку маладога пры шлюбе 31.10.1865 г. Мікалая Пятровіча Кадзельскага і Еўфрасінні Данілаўны Некрашэвіч[243]. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 31.12.1869 г. далучаны да дваранскага роду[244]. Памёр паміж 1866 і 1869 гг.

Жонка – Еўфрасіння Васільеўна.

198/114 **Сямён,** памёр ва ўзросце 3 гадоў ад воспы, пахаваны 27.10.1835 г. святаром Парыцкай Свята-Духавай царквы Паўлам Яромічам[245].

199/114 **Павел,** дваранін. У 1857 г. жыў у засценку Дражня, быў прыхаджанінам Парыцкай Свята-Духавай царквы Бабруйскага павета. Разам з Ганнай Грыгор'еўнай Рудзінскай быў хросным 05.05.1857 г. у Пелагіі[246], дачкі Стэфана Іванавіча і Ксаверыі Львоўны Карафа-Корбутаў. Валодаў 169 дзесяцінамі зямлі ў маёнтку Данілаўка Бабруйскага павета па купчай крэпасці 19.03.1871 г.

Жонка – Агаф'я Сямёнаўна. Разам з Пятром Іванавічам Корбутам была хроснай 03.01.1850 г. у Сцяпана[247], з Карлам Чарнышэвічам 09.02.1858 г. – у Сямёна[248], сыноў Іосіфа Паўлавіча і Ганны Грыгор'еўны Рудзінскіх. Памерла 21.02.1899 г. ва ўзросце 68 гадоў «ад пухліны», пахавана 22.02.1899 г. святаром Парыцкай Свята-Духавай царквы Міхаілам Адонскім[249].

200/114 **Пётр,** нарадзіўся 21.12.1822 г., ахрышчаны святаром Паўлам Мігеем у Парыцкай Свята-Духавай царкве Бабруйскага павета. Хросныя бацькі – дваранін засценка Дражня Аляксандр Нікіфаравіч Некрашэвіч і жонка двараніна **Івана Корбута** Еўдакія Іванаўна[250].

201/117 **Параскевія,** нарадзілася 15.10.1830 г., ахрышчана 19.10.1830 г. святаром Паўлам Яромічам у Парыцкай Свята-Духавай царкве Бабруйскага павета. Хросныя бацькі – жыхары фальварка Віктарын Васіль Якаўлевіч Рудзінскі і жонка **Івана Васільевіча Корбута** Пелагея Феадораўна[251].

Выпіска з метрычных кніг Парыцкай Свята-Духавай царквы Бабруйскага павета аб смерці 21.02.1899 г. ва ўзросце 68 гадоў дваранкі фальварка Данілаўка Агаф'і Сямёнаўны Некрашэвіч (гл. «Некрашэвічы» 199/114). Агаф'я Сямёнаўна Некрашэвіч – бабуля Сцяпана Міхайлавіча Некрашэвіча.
НГАБ, ф. 136, воп. 23, спр. 18, арк. 243 адв. – 244.

202/117 **Глікерыя,** нарадзілася 06.05.1837 г., ахрышчана 08.05.1837 г. святаром Паўлам Якаўлевічам Яромічам у Парыцкай Свята-Духавай царкве Бабруйскага павета. Хросныя бацькі – жыхары засценка Дражня Васіль Якаўлевіч Рудзінскі і жонка Івана Васільевіча Корбута Пелагія Іванаўна[252].

203/119 **Мар'яна,** *1817 г. н.

204/119 **Васіль,** нарадзіўся 07.03.1826 г.

205/119 **Домна.** Разам з Мацвеем Якаўлевічам Рудзінскім была хроснай 15.11.1836 г. у Івана, сына Самуіла Нікіфаравіча і Ірыны Сямёнаўны Некрашэвічаў[253]; з Грыгорыем Васільевічам Рудзінскім 10.08.1838 г. – у Мацвея, сына Лявонція Якаўлевіча і Еўфрасінні Іванаўны Рудзінскіх[254].

206/119 **Фёдар,** нарадзіўся 04.06.1830 г., ахрышчаны 06.06.1830 г. святаром Паўлам Яромічам у Парыцкай Свята-Духавай царкве Бабруйскага павета. Хросныя бацькі – шляхціч фальваркa Віктарын Самуіл Нікіфаравіч Некрашэвіч і жонка **Івана Васільевіча Корбута** Пелагея Іванаўна[255]. Разам з жонкай Стэфана Корбута Ксеніяй Лявонцьеўнай быў хросным 27.01.1863 г. у Грыгорыя[256], 17.10.1864 г. – у Анастасіі[257], з Ганнай Андрэеўнай Рудзінскай 26.02.1867 г. – у Парфірыя, з Марыяй Стэфанаўнай Корбут 06.08.1869 г. – у Стэфана[258], дзяцей дваран Пятра Іванавіча і Ганны Данілаўны Корбутаў. Разам з Паўлам Васільевічам Рудзінскім быў сведкам з боку маладой пры шлюбе 31.10.1865 г. Мікалая Пятровіча Кадзельскага і Еўфрасінні Данілаўны Некрашэвіч[259]. Валодаў 158 дзесяцінамі зямлі ў маёнтках Майсееўка і Пухаўшчына Бабруйскага павета па купчай крэпасці 13.04.1871 г., у 1888 г. – 157 дзесяцінамі зямлі ў маёнтку Майсееўка Парыцкай воласці. Разам з Яўстафіем Лявонцьевічам Бараноўскім быў сведкам з боку маладога пры шлюбе 25.05.1880 г. Іосіфа Пятровіча Карафа-Корбута і Марфы Стэфанаўны Муравіцкай[260].

207/123 **Фелікс,** *1815 г. н. У 1823 г. разам з бацькамі жыў у засценку Віктарын.

208/126 **Іван,** *1821 г. н. У 1823 г. разам з бацькамі жыў у засценку Віктарын.

209/127 **Марцін.**

210/127 **Нікіфар.** Жонка – Таццяна Сямёнаўна.

211/127 **Марк,** нарадзіўся 29.03.1809 г., ахрышчаны 30.03.1809 г. святаром Гаўрыілам Бабарыкіным у Старобінскай Мікалаеўскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Язовіны Грыгорый Некрашэвіч і дачка Марціна Некрашэвіча Настасія, дзяўчына[261].

212/127 **Марыя,** нарадзілася 02.07.1811 г., ахрышчана 03.07.1811 г. святаром Гаўрыілам Бабарыкіным у Старобінскай Мікалаеўскай царкве. Хросныя бацькі – жыхар засценка Трасцянец Лявон Некрашэвіч і жонка жыхара засценка Язовіны Міхаіла Некрашэвіча Марыя Іванаўна[262].

213/127 **Фяўронія,** *1807 г. н. Жыла ў засценку Язовіны. Памерла ва ўзросце 1 года «ад завалу галоўкі», пахаваная 15.03.1808 г. святаром Старобінскай Мікалаеўскай царквы Гаўрыілам Бабарыкіным[263].

214/128 **Фёдар.**

215/129 **Васіль.**

216/138 **Фама.**

217/138 **Іаанікій,** нарадзіўся 18.11.1808 г., ахрышчаны 19.11.1808 г. святаром Гаўрыілам Бабарыкіным у Старобінскай Мікалаеўскай царкве. Хросныя бацькі – фон-юнкер Ярмоланскага драгунскага палка Васіль Ступін і дачка жыхара засценка Язовіны Данілы Некрашэвіча Марыя, дзяўчына[264].

218/138 **Фёдар.**

Выпіска з метрычных кніг Парыцкай Свята-Духавай царквы Бабруйскага павета аб нараджэнні 04.06.1830 г. Фёдара Максімавіча Некрашэвіча. Хросныя бацькі – Самуіл Нікіфаравіч Некрашэвіч і Пелагея Іванаўна Карафа-Корбут. Фёдар Максімавіч Некрашэвіч – прадзед Алены Міхайлаўны Радзеўскай, жонкі Петруся Броўкі (гл. «Некрашэвічы» 206/119).
Самуіл Нікіфаравіч Некрашэвіч – прадзед Сцяпана Міхайлавіча Некрашэвіча.
Пелагея Іванаўна – другая жонка Івана Васільевіча Карафа-Корбута, дзеда прабабулі Анатоля Статкевіча-Чабаганава – Наталлі Васільеўны Сацкевіч-Статкевіч (Карафа-Корбут).
НГАБ, ф. 136, воп. 13, спр. 27, арк. 390 адв.

219/140 **Феадосія,** нарадзілася 01.06.1825 г., ахрышчана святаром Іўсцінам Прорвічам у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве Слуцкага павета. Хросныя бацькі – жыхары засценка Кутнева Фёдар Гурыновіч і жонка Кузьмы Івашкевіча Алена Якаўлеўна[265].

220/140 **Якаў,** нарадзіўся ў засценку Трасцянец у сям'і дваран Лявонція Данілавіча і Агафіі Пятроўны Некрашэвічаў, ахрышчаны 23.03.1805 г. святаром Аляксандрам Прорвічам у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – Мацвей Івашкевіч і жонка Дзям'яна Івашкевіча Марыя Іванаўна[266].

221/140 **Пульхерыя,** нарадзілася 03.08.1831 г. у засценку Кутнева ў сям'і дваран Лявонція Данілавіча і Ірыны Іосіфаўны Некрашэвічаў, ахрышчана 03.08.1831 г. святаром Іўсцінам Аляксандравічам Прорвічам у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Кутнева Фёдар Пятровіч Гурыновіч і жонка Кузьмы Паўлавіча Івашкевіча Алена Якаўлеўна[267].

222/140 **Ксенія,** нарадзілася ў засценку Трасцянец у сям'і дваран Лявонція Данілавіча і Агафіі Пятроўны Некрашэвічаў, ахрышчана 24.01.1801 г. святаром Аляксандрам Прорвічам у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – Мацвей Івашкевіч і жонка Грыгорыя Ермалінскага Феадора[268]. Жыла нейкі час разам з бацькам і мачахай у вёсцы Грэбень Мазырскага павета, адкуль у 1813 г. перасялілася ў засценак Трасцянец.

Муж – Міхаіл Фаміч Корбут, жыхар засценка Кутнева, 20 гадоў. Шлюб 18.01.1825 г. у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Святар – Іўсцін Прорвіч. Сведкі – жыхары засценка Кутнева Сцяпан Рудзінскі і Дзям'ян Корбут[269].

223/140 **Захарый,** нарадзіўся 05.09.1809 г. у засценку Трасцянец у сям'і дваран Лявонція Данілавіча і Агафіі Пятроўны Некрашэвічаў, ахрышчаны 05.09.1809 г. святаром Аляксандрам Прорвічам у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – Мацвей Івашкевіч і жонка Самуіла Івашкевіча Ксенія Грыгор'еўна[270].

224/140 **Сцяпан,** нарадзіўся 28.11.1818 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., разам з бацькамі жыў у засценку Кутнева на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[271]. Разам з Ганнай Сцяпанаўнай Беразоўскай быў хросным 05.06.1837 г. у Фёклы, дачкі Івана Грыгор'евіча і Агафіі Сцяпанаўны Кунцэвічаў[272]. Разам з Фамой Антонавічам Бараноўскім быў сведкам з боку маладога пры шлюбе 10.05.1863 г. Івана Віктаравіча Кернажыцкага і Фёклы Андрэеўны Некрашэвіч[273]. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 31.12.1869 г. далучаны да дваранскага роду[274]. Па купчай крэпасці 1858 г. валодаў 58 дзесяцінамі зямлі ў маёнтку Борычаў Мазырскага павета.

Жонка – Паўліна Францава.

225/140 **Алена,** нарадзілася 11.07.1826 г., ахрышчана 11.07.1826 г. святаром Іўсцінам Прорвічам у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве Слуцкага павета. Хросныя бацькі – жыхары засценка Кутнева Фёдар Гурыновіч і жонка Кузьмы Івашкевіча Алена Якаўлеўна[275]. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., разам з бацькамі жыла ў засценку Кутнева на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[276].

226/140 **Андрэй,** нарадзіўся 17.10.1820 г., ахрышчаны 24.10.1820 г. святаром Іўсцінам Прорвічам у Пагосцкай Срэценскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Трасцянец Марцін Некрашэвіч і дачка Якава Рудзінскага Алена, дзяўчына[277]. Жыў у засценку Кутнева на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[278]. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад

31.12.1869 г. далучаны да дваранскага роду[279]. Зацверджаны ўказам Сената ад 03.07.1873 г.

227/140 **Мар'яна,** *1821 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., разам з бацькамі жыла ў засценку Кутнева на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[280].

228/140 **Іван,** нарадзіўся 06.05.1808 г. у засценку Трасцянец у сям'і дваран Лявонція Данілавіча і Агафіі Пятроўны Некрашэвічаў, ахрышчаны 10.05.1808 г. святаром Аляксандрам Прорвічам у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Трасцянец Мацвей Івашкевіч і жонка Фамы Грынцэвіча Матрона Самуілаўна[281]. Памёр паміж 1866 і 1869 гг.

Жонка – Тэрэза Грыгор'еўна.

229/140 **Іван,** нарадзіўся ў засценку Трасцянец у сям'і дваран Лявонція Данілавіча і Агафіі Пятроўны Некрашэвічаў, ахрышчаны 24.06.1802 г. святаром Аляксандрам Прорвічам у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Трасцянец Мацвей Івашкевіч і жонка Грыгорыя Ермалінскага Феадора[282].

230/140 **Іван,** нарадзіўся ў 1824 г., памёр ад гарачкі, пахаваны 27.06.1825 г. святаром Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царквы[283].

231/140 **Елізавета,** нарадзілася 01.09.1810 г., ахрышчана 04.09.1810 г. у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Трасцянец Зіновій Рудзінскі і жонка Стэфана Пльніцкага Настасія Іванаўна[284].

232/140 **Уліта.** Жыла ў засценку Кутнева. Разам з Андрэем Рудзінскім была хроснай 17.02.1829 г. у Фёдара[285], са Стэфанам Антонавічам Рудзінскім 19.06.1833 г. – ва Ульяніі[286], 06.02.1838 г. – у Агафіі[287], дзяцей Міхаіла Фаміча і Ксеніі Лявонцьеўны Корбутаў.

233/141 **Фама.**

234/141 **Мікалай.**

235/141 **Марцін.**

236/141 **Іван.**

237/141 **Данііл,** нарадзіўся 01.10.1845 г., ахрышчаны 02.10.1845 г. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 24.08.1871 г. далучаны да дваранскага роду.

238/142 **Харыціна,** нарадзілася 05.10.1824 г., ахрышчана 06.10.1824 г. святаром Іосіфам Міцкевічам у Прускай Раство-Багародзіцкай царкве Слуцкага павета. Хросныя бацькі – жыхар засценка Вялікая Млынка Феадор Вішнеўскі і дачка Сямёна Вішнеўскага Ірына, дзяўчына[288]. Разам з бацькамі жыла ў засценку Млынка Вялікая на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[289].

239/142 **Аляксей (Аляксандр),** нарадзіўся 10.02.1828 г., ахрышчаны 11.02.1828 г. святаром Іосіфам Міцкевічам у Прускай Раство-Багародзіцкай царкве Слуцкага павета. Хросныя бацькі – Феадор Вішнеўскі і жонка Паўла Барынчыка Анастасія Іванаўна[290]. Жыў у засценку Млынка Вялікая.

Жонка – Лукія Грыгор'еўна.

240/142 **Еўдакія,** нарадзілася 08.03.1831 г., ахрышчана 08.03.1831 г. святаром Іосіфам Фёдаравічам Міцкевічам у Прускай Раство-Багародзіцкай царкве. Хросныя бацькі – Фёдар Іванавіч Вішнеўскі і жонка Грыгорыя Бараноўскага Дарыя Іванаўна[291].

241/142 **Дзмітрый,** нарадзіўся 25.10.1819 г., ахрышчаны 26.10.1819 г. святаром Якавам Шыманоўскім у Прускай Раство-Багародзіцкай царкве Слуцкага павета. Хросныя бацькі – жыхар засценка Млынка Вялікая Феадор Вішнеўскі і дачка Сямёна Вішнеўскага Ірына, дзяўчына[292]. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., разам з бацькамі жыў у засценку Млынка Вялікая на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[293].

242/142 **Марта,** *1833 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., разам з бацькамі жыла ў засценку Млынка Вялікая на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[294].

243/142 **Ірына,** нарадзілася 15.04.1836 г., ахрышчана 16.04.1836 г. святаром Іосіфам Кузьмічом Журакоўскім у Прускай Раство-Багародзіцкай царкве. Хросныя бацькі – жыхар засценка Касынічы Фама Іванавіч Бялькевіч і жыхарка засценка Млынка Вялікая, жонка Фёдара Лаўрэнцьевіча Вішнеўскага Марыя[295].

244/150 **Ядвіга,** *1827 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў засценку Касынічы на арэнднай зямлі князя Радзівіла.

245/150 **Тэадора,** *1833 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў засценку Касынічы на арэнднай зямлі князя Радзівіла.

246/151 **Алена,** *1831 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў засценку Касынічы на арэнднай зямлі князя Радзівіла.

247/152 **Лявон,** *1831 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Касынічы на арэнднай зямлі князя Радзівіла.

248/165 **Домна,** нарадзілася 20.01.1812 г., ахрышчана святаром Гаўрыілам Бабарыкіным у Старобінскай Мікалаеўскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Сыцянец Грыгорый Сеўрук, праваслаўнага веравызнання, і жонка «кухара» фальварка Старына Івана Ліхадзіеўскага Варвара Іванаўна, каталіцкага веравызнання[296]. Жыла ў засценку Сыцянец. Разам з Андрэем Казлоўскім была хроснай 10.09.1828 г. у Іосіфа[297], сына Івана Грыгор'евіча і Еўфрасінні Пятроўны Сеўрукаў.

Муж – Лука Фёдаравіч Смольскі, жыхар засценка Заброцкія, 22 гадоў. Шлюб 08.06.1831 г. у Старобінскай Мікалаеўскай царкве. Святар – Гаўрыіл Бабарыкін. Сведкі: з боку маладога – жыхар засценка Заброцкія Фёдар Мацвеевіч Матусевіч, з боку маладой – жыхар засценка Сыцянец Грыгорый Паўлавіч Некрашэвіч[298].

249/165 **Ірына,** нарадзілася 26.04.1815 г., ахрышчана 28.04.1815 г. святаром Гаўрыілам Бабарыкіным у Старобінскай Мікалаеўскай царкве. Хросныя бацькі – дваранін Яфімій Свірскі, які часова жыў у засценку Сыцянец, і дачка Грыгорыя Некрашэвіча Матрона[299]. Жыла ў засценку Сыцянец. Разам з Грыгорыем Уладзіслававічам Некрашэвічам была хроснай 18.08.1831 г. у Мірона[300], сына Венядзікта Іванавіча і Глікерыі Дзям'янаўны Некрашэвічаў.

250/165 **Агафія,** нарадзілася 23.02.1821 г., ахрышчана 25.02.1821 г. святаром Гаўрыілам Бабарыкіным у Старобінскай Мікалаеўскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Сыцянец Грыгорый Некрашэвіч і дачка Грыгорыя Некрашэвіча Матрона, дзяўчына[301].

251/165 **Данііл,** нарадзіўся 11.12.1823 г., ахрышчаны 12.12.1823 г. святаром Стэфанам Бабарэкам у Старобінскай Мікалаеўскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Сыцянец Грыгорый Сеўрук і дачка Нікіфара Некрашэвіча Марыя, дзяўчына[302].

252/165 **Грыгорый,** нарадзіўся 16.11.1825 г., ахрышчаны 17.11.1825 г. святаром Стэфанам Бабарэкам у Старобінскай Мікалаеўскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Сыцянец Грыгорый Сеўрук і дачка Нікіфара Некрашэвіча Марыя. Жыў у засценку Сыцянец[303].

253/165 **Таццяна,** нарадзілася 16.01.1828 г., ахрышчана 17.01.1828 г. святаром Гаўрыілам Бабарыкіным у Старобінскай Мікалаеўскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Сыцянец Грыгорый Сеўрук і дачка Нікіфара Некрашэвіча Марыя, дзяўчына[304].

254/166 **Іван,** нарадзіўся ў 1816 г. Памёр ва ўзросце 1 года «з чыр'я», пахаваны 06.04.1817 г. святаром Старобінскай Мікалаеўскай царквы Гаўрыілам Бабарыкіным[305].

255/167 **Мірон,** нарадзіўся 17.08.1831 г., ахрышчаны 18.08.1831 г. святаром Стэфанам Бабарэкам у Старобінскай Мікалаеўскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Сыцянец Грыгорый Уладзіслававіч Некрашэвіч і дачка Рамана Іванавіча Некрашэвіча Ірына, дзяўчына[306]. Жыў у засценку Сыцянец.

256/167 **Матрона,** нарадзілася 10.11.1837 г., ахрышчана святаром Іаанам Нікіфаравічам Айціновічам у Старобінскай Мікалаеўскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Сыцянец Іаан Нікіфаравіч Некрашэвіч і Агафія Іванаўна[307]. Жыла ў засценку Сыцянец.

257/168 **Сымон,** *1828 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у вёсцы Астраўкі на арэнднай зямлі князя Радзівіла.

258/168 **Якаў,** *1832 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у вёсцы Астраўкі на арэнднай зямлі князя Радзівіла.

Жонка – Варвара Якаўлеўна.

259/168 **Аўдакія.** Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў вёсцы Астраўкі на арэнднай зямлі князя Радзівіла.

260/168 **Васіль.** Зацверджаны ў дваранстве ўказам Сената ад 17.06.1863 г. Валодаў 157 дзесяцінамі зямлі ў маёнтках Майсееўка і Пухаўшчына Бабруйскага павета па купчай крэпасці ад 13.04.1871 г.

Жонкі: 1. Варвара Васільеўна, ад яе дзеці Канстанцін, Аўксенцій, Мікалай; 2. Кацярына Іванаўна Статкевіч. Шлюб 10.05.1881 г. у Зелянковіцкай царкве Бабруйскага павета. Ад яе дзеці Іван, Ігнацій, Антоній.

X КАЛЕНА

261/177 **Андрэй.**

262/178 **Аляксандр,** нарадзіўся 01.03.1887 г.

263/186 **Іван,** нарадзіўся 20.06.1873 г.

264/186 **Сямён,** нарадзіўся 05.09.1875 г.

265/186 **Пётр,** нарадзіўся 23.08.1880 г.

266/186 **Міхаіл,** нарадзіўся 16.07.1883 г.

267/186 **Нікіфар,** нарадзіўся 29.07.1886 г.

268/197 **Еўфрасіння,** нарадзілася 27.06.1857 г., ахрышчана 29.06.1857 г. святаром Фёдарам Смолічам у Парыцкай Свята-Духавай царкве Бабруйскага павета. Хросныя бацькі – дваране засценка Дражня Павел Васільевіч Рудзінскі і Марыя Пятроўна Жаўрыд[308]. Памерла 10.08.1857 г. «ад слабасці», пахаваная 12.08.1857 г. святаром Парыцкай Свята-Духавай царквы Фёдарам Смолічам[309].

269/197 **Сцяпан,** нарадзіўся 29.10.1859 г., ахрышчаны 31.10.1859 г. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 31.12.1869 г. далучаны да дваранскага роду[310].

270/197 **Іўсціна,** нарадзілася 24.09.1867 г., ахрышчана 30.09.1867 г. святаром Антоніем Савічам у Парыцкай Свята-Духавай царкве Бабруйскага павета. Хросныя бацькі – аднадворцы засценка Дражня Павел Васільевіч Рудзінскі і Сафія Стэфанаўна Корбут[311].

271/197 **Сямён,** нарадзіўся 02.02.1864 г., ахрышчаны 03.02.1864 г. святаром Фёдарам Смолічам у Парыцкай Свята-Духавай царкве Бабруйскага павета. Хросныя бацькі – дваране засценка Дражня Павел Васільевіч Рудзінскі і Сафія Стэфанаўна Корбут, дзяўчына[312]. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 31.12.1869 г. далучаны да дваранскага роду[313].

272/197 **Сцепаніда,** нарадзілася 12.11.1861 г., ахрышчана 14.11.1861 г. святаром Фёдарам

Смолічам у Парыцкай Свята-Духавай царкве Бабруйскага павета. Хросныя бацькі – дваране засценка Дражня Павел Васільевіч Рудзінскі і жонка Івана Лісоўскага Караліна Міхайлаўна[314]. Памерла 04.02.1864 г. «ад крупу», пахаваная 06.02.1864 г. святаром Парыцкай Свята-Духавай царквы Іаанам Лукашэвічам[315].

273/199 **Фёкла,** нарадзілася 19.09.1867 г., ахрышчана 24.09.1867 г. святаром Антоніем Савічам у Парыцкай Свята-Духавай царкве Бабруйскага павета. Хросныя бацькі – дзячок Парыцкай Свята-Духавай царквы Арцемій Шапко і жонка дыякана Аляксея Пігулеўскага Ульянія Кузьмінічна[316].

Муж – Грыгорый Фёдаравіч Некрашэвіч (гл. «Некрашэвічы» 280/206).

274/199 **Агрыпіна,** нарадзілася 14.06.1863 г., ахрышчана 18.06.1863 г. святаром Фёдарам Смолічам у Парыцкай Свята-Духавай царкве Бабруйскага павета. Хросныя бацькі – дзячок Парыцкай Свята-Духавай царквы Арцемій Шапко і настаўніца Парыцкага жаночага вучылішча духоўнага ведамства Параскевія Жураkоўская[317].

Муж – Міхаіл Сямёнавіч Забэла, 28 гадоў, мешчанін з засценка Малінава, прыхаджанін Глускай Уваскрэсенскай царквы, першым шлюбам. Шлюб 08.06.1883 г. у Парыцкай Свята-Духавай царкве. Сведкі: з боку маладога – дваране засценка Малінава Сільвестр Якаўлевіч Статкевіч і Андрэй Сямёнавіч Мажэйка, з боку маладой – дваранін засценка Данілаўка Міхаіл Грыгор'евіч Рудзінскі і адстаўны бамбардзір Уладзімір Паўлавіч Некрашэвіч[318].

275/199 **Міхаіл,** нарадзіўся 01.01.1850 г., ахрышчаны 02.01.1850 г. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 31.12.1869 г. далучаны да дваранскага роду[319]. Валодаў 334 дзесяцінамі зямлі ў маёнтку Данілаўка Бабруйскага павета.

Жонка – Ева Дзмітрыеўна. Разам з Нікіфарам Грыгор'евічам Рудзінскім была хроснай 22.04.1891 г. у Ірыны[320], 26.11.1895 г. – у Грыгорыя[321], 17.01.1899 г. – у Таццяны[322], дзяцей Даніла Паўлавіча і Параскевіі Фёдараўны Некрашэвічаў; з Сямёнам Паўлавічам Рудзінскім 16.08.1899 г. – у Наталіі[323], дачкі Нікіфара Грыгор'евіча і Алены Якаўлеўны Рудзінскіх. Памерла 21.07.1915 г. ва ўзросце 58 гадоў ад туберкулёзу лёгкіх, пахавана 23.07.1915 г. святаром Парыцкай Свята-Духавай царквы Міхаілам Адонскім[324].

276/199 **Анастасія,** нарадзілася 26.10.1857 г., ахрышчана 27.10.1857 г. святаром Фёдарам Смолічам у Парыцкай Свята-Духавай царкве Бабруйскага павета. Хросныя бацькі – дваране засценка Дражня Грыгорый Васільевіч Рудзінскі і жонка Васіля Некрашэвіча Настасія Майсееўна[325].

Муж – Васіль Максімавіч Корбут, дваранін засценка Малінава, першым шлюбам, 33 гадоў. Шлюб 22.01.1882 г. у Парыцкай Свята-Духавай царкве. Святар – Васіль Байкоў. Сведкі: з боку маладога – дваране засценка Малінава Самуіл Андрэевіч Сыцько і Ігнацій Ануфрыевіч Мажэйка, з боку маладой – жыхар мястэчка Парычы дваранін Людзвіг Дамброўскі і бамбардзір з фальварка Данілаўка Уладзімір Паўлавіч Некрашэвіч[326].

277/199 **Уладзімір.** Разам з Людзвігам Дамброўскім быў сведкам з боку маладой 22.01.1882 г. пры шлюбе Васіля Максімавіча Корбута і Анастасіі Паўлаўны Некрашэвіч[327]; з Міхаілам Грыгор'евічам Рудзінскім 08.06.1883 г. – пры

Выпіска з метрычных кніг Парыцкай Свята-Духавай царквы Бабруйскага павета аб нараджэнні 19.09.1867 г. Фёклы Паўлаўны Некрашэвіч (гл. «Некрашэвічы» 273/199). Бацькі – дваране вёскі Данілаўка Павел Самуілавіч і Агаф'я Сямёнаўна Некрашэвічы. Фёкла Паўлаўна Некрашэвіч – бабуля Алены Міхайлаўны Радзеўскай, жонкі Петруся Броўкі, і цётка Сцяпана Міхайлавіча Некрашэвіча. Павел Самуілавіч і Агаф'я Сямёнаўна – дзядуля і бабуля Сцяпана Міхайлавіча Некрашэвіча (гл. «Некрашэвічы» 199/114). *НГАБ, ф. 136, воп. 18, спр. 48, арк. 235 адв.*

шлюбе Міхаіла Сямёнавіча Забэлы і Агрыпіны Паўлаўны Некрашэвіч[328].

Жонка – Агафія Яўстафіеўна Бараноўская, 22 гадоў, дваранка засценка Майсееўка, першым шлюбам. Шлюб 06.02.1884 г. у Парыцкай Свята-Духавай царкве. Сведкі: з боку маладога – дваранін засценка Данілаўка Міхаіл Грыгор'евіч Рудзінскі і мешчанін Антон Андрэевіч Ліпскі, з боку маладой – селянін засценка Майсееўка Якаў Іванавіч Цішкевіч і дваранін Васіль Мікалаевіч Некрашэвіч[329].

278/199 **Іван,** нарадзіўся 19.04.1872 г., ахрышчаны 25.04.1872 г. святаром Антоніем Савічам у Парыцкай Свята-Духавай царкве Бабруйскага павета. Хросныя бацькі – дзячок Парыцкай царквы Арцемій Савіч Шапко і аднадворка Варвара Васільеўна Некрашэвіч[330].

279/199 **Данііл.** Жыў у фальварку Данілаўка.

Жонка – Параскевія Фёдараўна. Разам з Мікалаем Міхайлавічам Некрашэвічам была хроснай 29.08.1899 г. у Наталіі, дачкі Уладзіміра Паўлавіча і Агафіі Яўстафіеўны Некрашэвічаў[331].

280/206 **Грыгорый.** Жыў у засценку Майсееўка Бабруйскага павета, быў прыхаджанінам Парыцкай Свята-Духавай царквы. Разам з Анастасіяй Фёдараўнай Муравіцкай быў хросным 06.09.1892 г. у Елізаветы[332], з Наталляй Міхайлаўнай Некрашэвіч 15.09.1896 г. – у Надзеі[333], дачок Уладзіміра Паўлавіча і Агафіі Яўстафіеўны Некрашэвічаў. Валодаў у 1911 г. 78 дзесяцінамі зямлі ў маёнтку Майсееўка Парыцкай воласці Бабруйскага павета[334].

Жонка – Фёкла Паўлаўна Некрашэвіч, цётка акадэміка Сцяпана Міхайлавіча Некрашэвіча (гл. «Некрашэвічы» 273/199). Разам з Аляксандрам Фёдаравічам Некрашэвічам была хроснай 16.03.1898 г. у Дарыі[335], дачкі Міхаіла Паўлавіча і Евы Дзмітрыеўны Некрашэвічаў.

281/206 **Аляксандр.** Жыў у засценку Майсееўка Бабруйскага павета, быў прыхаджанінам Парыцкай Свята-Духавай царквы. Разам з Наталляй Паўлаўнай Некрашэвіч быў хросным 24.08.1880 г. у Наталіі[336], з Настассяй Фёдараўнай Некрашэвіч (у замужжы Муравіцкай) 05.12.1882 г. – у Мікалая[337], 06.08.1885 г. – у Марыі[338], 06.04.1892 г. – у Іосіфа[339], з Фёклай Паўлаўнай Некрашэвіч 16.03.1898 г. – у Дарыі[340], дзяцей Міхаіла Паўлавіча і Евы Дзмітрыеўны Некрашэвічаў. Разам з Яўстафіем Стэфанавічам Бржазоўскім быў сведкам з боку маладой пры шлюбе 25.05.1880 г. Іосіфа Пятровіча Карафа-Корбута і Марфы Стэфанаўны Муравіцкай[341].

282/206 **Анастасія.** Жыла ў засценку Майсееўка Бабруйскага павета, была прыхаджанкай Парыцкай Свята-Духавай царквы. Разам з братам Аляксандрам Фёдаравічам Некрашэвічам была хроснай 05.12.1882 г. у Мікалая, 06.08.1885 г. – у Марыі[342], 06.04.1892 г. – у Іосіфа[343], дзяцей Міхаіла Паўлавіча і Евы Дзмітрыеўны Некрашэвічаў; з братам Грыгорыем Фёдаравічам Некрашэвічам 06.09.1892 г. – у Елізаветы[344], дачкі Уладзіміра Паўлавіча і Агафіі Яўстафіеўны Некрашэвічаў.

Муж – Усцін Сцяпанавіч Муравіцкі, мешчанін. Шлюб паміж 1885 і 1892 гг.

283/209 **Сцяпан.**

284/209 **Пётр.**

285/210 **Павел.**

286/210 **Іван,** нарадзіўся 20.06.1836 г., ахрышчаны 23.06.1836 г.

Жонка – Фёкла Аляксееўна.

287/210 **Андрэй,** нарадзіўся і ахрышчаны 01.12.1841 г.

Выпіска з метрычных кніг Парыцкай Свята-Духавай царквы Бабруйскага павета аб нараджэнні 14.06.1863 г. Агрыпіны Паўлаўны Некрашэвіч (гл. «Некрашэвічы» 274/199). Агрыпіна Паўлаўна Некрашэвіч (цётка Сцяпана Міхайлавіча Некрашэвіча) – жонка Міхаіла Сямёнавіча Забэлы (хросны дзеда Анатоля Статкевіча-Чабаганава – Міхаіла Іванавіча Сацкевіча-Статкевіча), дваюраднага брата прадзеда Анатоля Статкевіча-Чабаганава – Івана Вікенцьевіча Сацкевіча-Статкевіча. Пляменнік Міхаіла Сямёнавіча Фёдар Іванавіч Забэла праходзіў у 1930-я гг. па адной справе са Сцяпанам Міхайлавічам Некрашэвічам і загінуў у высылцы. *НГАБ, ф. 136, воп. 18, спр. 35, арк. 11 адв.*

Выпіска з метрычных кніг Парыцкай Свята-Духавай царквы Бабруйскага павета аб шлюбе 08.06.1883 г. двараніна засценка Малінава Міхаіла Сямёнавіча Забэлы і дваранкі Агрыпіны Паўлаўны Некрашэвіч (на 2 старонках). Сярод сведак – дваранін засценка Малінава Сільвестр Якаўлевіч Сацкевіч-Статкевіч і Уладзімір Паўлавіч Некрашэвіч. Уладзімір Паўлавіч Некрашэвіч – дзядзька Сцяпана Міхайлавіча Некрашэвіча. Сільвестр Якаўлевіч Сацкевіч-Статкевіч – брат Вікенція Якаўлевіча Сацкевіча-Статкевіча, прапрадзеда Анатоля Статкевіча-Чабаганава. *НГАБ, ф. 136, воп. 18, спр. 22, арк. 466 адв. – 467.*

...ода. Часть вторая. О бракосочетавшихся

288/210 **Канстанцін,** нарадзіўся 03.05.1844 г., ахрышчаны 03.05.1844 г.

289/210 **Філіп,** нарадзіўся 13.10.1849 г., ахрышчаны 18.10.1849 г.

290/210 **Якаў,** нарадзіўся 19.03.1839 г., ахрышчаны 20.03.1839 г.

291/214 **Аляксей.**

292/214 **Павел.**

293/215 **Міхаіл.**

294/215 **Венядзікт.**

295/218 **Сямён.**

296/218 **Фёдар.**

297/218 **Грыгорый.**

298/218 **Іосіф.**

299/224 **Якаў,** нарадзіўся 20.03.1835 г., ахрышчаны 21.03.1835 г. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 31.12.1869 г. далучаны да дваранскага роду[345].

300/224 **Іосіф,** нарадзіўся 07.09.1837 г., ахрышчаны 08.09.1837 г. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 31.12.1869 г. далучаны да дваранскага роду[346].

301/224 **Палікарп,** нарадзіўся 23.02.1864 г., ахрышчаны 24.02.1864 г. святаром Уладзімірам Прорвічам у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве Слуцкага павета. Хросныя бацькі – дваранін засценка Кутнева Неафіт Сцяпанавіч Рудзінскі і жонка Венядзікта Андрэевіча Івашкевіча Марфа Іванаўна[347].

302/224 **Міхаіл,** нарадзіўся 02.12.1873 г., ахрышчаны 01.01.1874 г. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 06.06.1888 г. далучаны да дваранскага роду. Зацверджаны ўказам Сената ад 30.11.1888 г.[348]

303/226 **Ірына (Рыіна),** *1855 г. н. Жыла ў засценку Кутнева.

304/226 **Любоў,** *1858 г. н. Жыла ў засценку Кутнева.

305/228 **Дзям'ян,** нарадзіўся 27.10.1842 г., ахрышчаны 29.10.1842 г. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 31.12.1869 г. далучаны да дваранскага роду[349].

306/228 **Мікалай-Саба,** нарадзіўся і ахрышчаны 06.12.1824 г.

Жонка – Францішка Геранімаўна.

307/234 **Іван,** нарадзіўся 21.10.1870 г.

308/234 **Андрэй.**

309/236 **Аляксей,** нарадзіўся 16.03.1879 г., ахрышчаны 18.03.1879 г. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 18.02.1891 г. далучаны да дваранскага роду. Зацверджаны ўказам Сената ад 30.04.1891 г.[350]

310/236 **Міхаіл,** нарадзіўся 12.11.1888 г., ахрышчаны 13.11.1888 г. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 18.02.1891 г. далучаны да дваранскага роду. Зацверджаны ўказам Сената ад 30.04.1891 г.[351]

311/239 **Пётр.**

312/239 **Гаўрыіл,** нарадзіўся і ахрышчаны 06.03.1860 г. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 31.12.1869 г. далучаны да дваранскага роду[352].

313/239 **Феафіл,** нарадзіўся і ахрышчаны 07.12.1862 г. Вызначэннямі Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 31.12.1869 г. і 15.03.1873 г. далучаны да дваранскага роду[353].

314/239 **Марыя,** нарадзілася 21.02.1870 г., ахрышчана святаром Паўлам Маскалевічам у Пруской Раство-Багародзіцкай царкве Слуцкага павета. Хросныя бацькі – дваранін Міхаіл Іванавіч Бараноўскі і жонка аднадворца Ільі Грыгор'евіча Іскрыцкага Марыя Міхайлаўна[354]. Памерла 21.10.1870 г. (або 10.01.1871 г.) ад кашлю, пахавана 23.10.1870 г.[355] (або 12.01.1871 г.[356]) святаром

Выпіска з метрычных кніг Парыцкай Свята-Духавай царквы Бабруйскага павета аб нараджэнні 26.10.1857 г. Анастасіі Паўлаўны Некрашэвіч (гл. «Некрашэвічы» 276/199). Анастасія Паўлаўна Некрашэвіч – цётка Сцяпана Міхайлавіча Некрашэвіча, жонка Васіля Максімавіча Карафа-Корбута, дваюраднага брата прабабулі Анатоля Статкевіча-Чабаганава – Наталлі Васільеўны Сацкевіч-Статкевіч (Карафа-Корбут; гл. «Карафа-Корбуты I» 27/23). *НГАБ, ф. 136, воп. 19, спр. 1, арк. 133 адв.*

Выпіска з метрычных кніг Парыцкай Свята-Духавай царквы Бабруйскага павета аб шлюбе 22.01.1882 г. дваранiна засценка Малiнава Васіля Максімавіча Карафа-Корбута і дваранкі засценка Данілаўка Анастасіі Паўлаўны Некрашэвіч (на 2 старонках). Сведка з боку маладога – Самуіл Андрэевіч Сыцько. *НГАБ, ф. 136, воп. 23, спр. 15, арк. 89 адв. – 99.*



года. Часть вторая, о бракосочетавшихся

Кто совершал таинство	Кто были поручители	Подпись свидетелей записи по желанию

Прускай Раство-Багародзіцкай царквы Паўлам Маскалевічам.

315/239 **Пелагія,** нарадзілася 06.10.1871 г., ахрышчана 07.10.1871 г. святаром Паўлам Маскалевічам у Прускай Раство-Багародзіцкай царкве Слуцкага павета. Хросныя бацькі – дваранін засценка Вялікая Мліна Міхаіл Іванавіч Бараноўскі і дачка Нікіфара Фёдаравіча Бараноўскага Марыя[357].

316/258 **Грыгорый,** нарадзіўся 08.01.1839 г., ахрышчаны 09.01.1839 г. святаром Іаанам Айцiновічам у Старобінскай Мікалаеўскай царкве. Хросныя бацькі – шляхціч засценка Сыцянец Венядзікт Андрэевіч Некрашэвіч і шляхцянка Марыя Нікіфараўна Некрашэвіч, дзяўчына[358].

Памёр 23.01.1839 г. ад прастуды, пахаваны 25.01.1839 г. святаром Старобінскай Мікалаеўскай царквы Іаанам Айцiновічам[359].

317/258 **Данііл,** нарадзіўся 17.12.1839 г., ахрышчаны 18.12.1839 г. святаром Іаанам Айцiновічам у Старобінскай Мікалаеўскай царкве. Хросныя бацькі – шляхціч засценка Сыцянец Мацвей Андрэевіч Некрашэвіч і шляхцянка Марыя Нікіфараўна Некрашэвіч, дзяўчына[360].

318/260 **Канстанцін,** нарадзіўся 03.07.1870 г., ахрышчаны ў Прускай Раство-Багародзіцкай царкве Слуцкага павета. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 21.07.1899 г. далучаны да дваранскага роду. Зацверджаны ўказам Сената ад 13.07.1900 г.[361]

319/260 **Аўксенцій,** нарадзіўся 14.02.1873 г., ахрышчаны ў Парыцкай Свята-Духавай царкве Бабруйскага павета. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 21.07.1899 г. далучаны да дваранскага роду. Зацверджаны ўказам Сената ад 13.07.1900 г.[362]

320/260 **Мікалай,** нарадзіўся 28.11.1878 г., ахрышчаны ў Парыцкай Свята-Духавай царкве Бабруйскага павета. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 21.07.1899 г. далучаны да дваранскага роду. Зацверджаны ўказам Сената ад 13.07.1900 г.[363]

321/260 **Іван,** нарадзіўся 22.02.1882 г., ахрышчаны ў Парыцкай Свята-Духавай царкве Бабруйскага павета. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 21.07.1899 г. далучаны да дваранскага роду. Зацверджаны ўказам Сената ад 13.07.1900 г.[364]

322/260 **Ігнацій,** нарадзіўся 25.05.1886 г., ахрышчаны ў Парыцкай Свята-Духавай царкве Бабруйскага павета. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 21.07.1899 г. далучаны да дваранскага роду. Зацверджаны ўказам Сената ад 13.07.1900 г.[365]

323/260 **Антон,** нарадзіўся 07.07.1890 г., ахрышчаны ў Парыцкай Свята-Духавай царкве Бабруйскага павета. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 21.07.1899 г. далучаны да дваранскага роду. Зацверджаны ўказам Сената ад 13.07.1900 г.[366]

XI КАЛЕНА

324/275 **Марыя,** нарадзілася 02.08.1885 г., ахрышчана 06.08.1885 г. святаром Васілём Байковым у Парыцкай Свята-Духавай царкве Бабруйскага павета. Хросныя бацькі – дваранін засценка Майсееўка Аляксандр Феадоравіч Некрашэвіч і дваранка Анастасія Феадораўна Некрашэвіч, дзяўчына[367]. Разам з Нікіфарам Грыгор'евічам Рудзінскім была хроснай 27.04.1907 г. у Фёдара[368], сына Данііла Паўлавіча і Параскевіі Фёдараўны Некрашэвічаў.

325/275 **Сцяпан,** нарадзіўся 26.04.1883 г. Жыў у маёнтку Данілаўка Бабруйскага павета

Парыцкай воласці. Акадэмік і віцэ-прэзідэнт Акадэміі навук Беларускай ССР. Скончыў Панявежскую настаўніцкую семінарыю (1908), Віленскі настаўніцкі інстытут (1913), Адэскі міжнародны інстытут (2 курсы). Павышаў кваліфікацыю ў Ленінградскім навукова-даследчым інстытуце мовы і літаратуры (1925 – 1926). Быў старшынёй Інстытута беларускай культуры (Інбелкульта), дырэктарам Інстытута мовазнаўства АН БССР.

Грамадскі і дзяржаўны дзеяч, неаднаразова выбіраўся дэлегатам з'ездаў Саветаў і членам ЦВК БССР, навуковец-мовазнавец.

21.07.1930 г. арыштаваны АДПУ на параходзе «Табольск» у г. Томску разам з акадэмікам В. Ластоўскім. Абвінаваўчае заключэнне калегіі АДПУ ад 10.04.1931 г.: «Некрашевич Степан Михайлович, 47 лет, белорус. Бывший член партии белорусских эсеров, бывший консул Белорусской Народной Рады в Одессе, член президиума Белорусской Академии наук.

а) в период с 1921 года по день ареста был членом руководящего центра контрреволюционной организации САБ-СВБ и выполнял основные задачи этой организации.

б) как член центра выполнял задачи по связи и обоюдной передаче информации, используя для этого научные заграничные командировки.

в) наладил и поддерживал связь с Платоновской монархической организацией. Совершил преступления по статьям 76, 64, 65, 66, 69, 70. Выслать в г. Сарапул Удмурдской АССР сроком на пять лет, считать срок с 21.07.1930 г.». Пасля тэрмін высылкі быў прадоўжаны яшчэ на два гады.

Зноў арыштаваны 10.12.1937 г. Абвінаваўчае заключэнне Ваеннай калегіі Вярхоўнага Суда СССР ад 19.12.1937 г.: «Степан Михайлович Некрашевич являлся агентом польской разведки с 1920 г., по заданию которой проводил шпионскую работу на территории СССР и вербовал новых лиц для шпионской работы. Был участником национал-фашистской организации с 1917 г., по заданию которой проводил вредительскую работу в системе народного образования Белоруссии, то есть совершил преступления по статьям 69, 70 и 76 УК БССР. Приговорить С. М. Некрашевича к высшей мере наказания – расстрелу с конфискацией всего лично ему принадлежащего имущества».

Прысуд прыведзены ў выкананне ў г. Мінску 20.12.1937 г.

Рэабілітаваны па абвінавачаннях 1937 г. Ваеннай калегіяй Вярхоўнага Суда СССР 12.10.1957 г., па абвінавачаннях 1931 г. – 10.06.1988 г. Судовай калегіяй Вярхоўнага Суда БССР.

Жонка – Марыя Сяргееўна Ціманькова.

326/275 **Іосіф,** нарадзіўся 01.04.1892 г., ахрышчаны 06.04.1892 г. святаром Міхаілам Афонскім у Парыцкай Свята-Духавай царкве Бабруйскага павета. Хросныя бацькі – дваранін засценка Майсееўка Аляксандр Феадоравіч Некрашэвіч і жонка мешчаніна Усціна Сцяпанавіча Муравіцкага Анастасія Феадораўна[369].

Афіцэр арміі Дзянікіна. Расстраляны бальшавікамі на Доне.

327/275 **Мікалай,** нарадзіўся 03.12.1882 г., ахрышчаны 05.12.1882 г. святаром Васілём Байковым у Парыцкай Свята-Духавай царкве Бабруйскага павета. Хросныя бацькі – дваранін засценка Майсееўка Аляксандр Феадоравіч Некрашэвіч і Анастасія Феадораўна Некрашэвіч, дзяўчына[370]. Разам з Параскевіяй Фёдараўнай

Некрашэвіч быў хросным 29.08.1899 г. у Наталлі[371], дачкі Уладзіміра Паўлавіча і Агафіі Яўстафіеўны Некрашэвічаў.

328/275 **Дар'я,** нарадзілася 12.03.1898 г., ахрышчана 12.03.1898 г. святаром Міхаілам Адонскім у Парыцкай Свята-Духавай царкве Бабруйскага павета. Хросныя бацькі – дваранін засценка Майсееўка Аляксандр Фёдаравіч Некрашэвіч і жонка Грыгорыя Фёдаравіча Некрашэвіча Фёкла Паўлаўна[372]. Скончыла Мар'інагорскі тэхнікум. Працавала ў хімічнай лабараторыі ў г. Мінску.

Муж – Струеў; дзеці Леанід і Мікалай.

329/275 **Наталля,** нарадзілася 18.08.1880 г., ахрышчана 24.08.1880 г. святаром Васілём Байковым у Парыцкай Свята-Духавай царкве Бабруйскага павета. Хросныя бацькі – дваранін засценка Майсееўка Аляксандр Фёдаравіч Некрашэвіч і дваранка фальварка Данілаўка Наталля Паўлаўна Некрашэвіч, дзяўчына[373]. Разам з Грыгорыем Фёдаравічам Некрашэвічам была хроснай 15.09.1896 г. у Надзеі, дачкі Уладзіміра Паўлавіча і Агафіі Яўстафіеўны Некрашэвічаў[374].

Муж – Пётр Філіпавіч Старжынскі, 27 гадоў[375], гарніст з дваран засценка Мядзведава Рэчыцкага павета, прыхаджанін Яўтушкавіцкай царквы; першым шлюбам. Шлюб 02.02.1898 г. Святар Парыцкай Свята-Духавай царквы.

Дачка Соф'я Пятроўна Старжынская (1899 – 1979). Скончыла настаўніцкую гімназію. Муж Соф'і – Уладзімір Пятровіч Кулеўскі (1896–1959). Скончыў у 1918 г. Мінскую духоўную семінарыю. Вучыўся ў БДУ і Кіеўскім камерцыйным інстытуце. З гэтых вучэбных устаноў быў адлічаны з-за паходжання. Бацька Уладзіміра Кулеўскага Пётр Фёдаравіч у 1930 г. быў раскулачаны, у 1937 г. расстраляны. Дочкі: 1. Зарына Уладзіміраўна Кулеўская (1927 – 1996). Муж Зарыны – Даніла Канстанцінавіч Міцкевіч – сын Якуба Коласа. Дзеці: Алёна (муж Аляксандр Кім, сын Юрый, 1987 г. н.); Андрэй, 1952 г. н.; 2. Іна Уладзіміраўна Кулеўская, 1934 г. н. Скончыла БДУ і аспірантуру ў Інстытуце высокамалекулярных злучэнняў Акадэміі навук СССР у г. Ленінградзе. Кандыдат хімічных навук. Працуе ў Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь.

330/275 **Праскоўя.** Муж – Андрэй Самуілавіч Сыцько (гл. «Сыцько» 259/219).

331/275 **Ганна.**

Муж – Аляксандр Акановіч. Падчас гітлераўскай акупацыі Ганна і Аляксандр выкладалі ў беларускай школе ў г. Мінску. У 1944 г. выехалі ў Германію. Аляксандр Акановіч памёр у Германіі. Ганна пераехала ў ЗША, дзе разам з братам Якуба Коласа – Міхаілам Міцкевічам, М. Рытэр-Каханоўскай, Міхаілам Тулейкам і іншымі беларускімі эмігрантамі выкладала ў школе Міхельсона ў г. Нью-Ёрку. Сыны: 1. Алік, служыў у ваеннай метэаслужбе ў г. Новы Арлеан; 2. Вадзім, працаваў галоўным інжынерам ЦКБ Акадэміі навук БССР (сын Аляксандр, дачка Алена, жыве ў ЗША).

332/277 **Надзея,** нарадзілася 12.09.1896 г., ахрышчана 15.09.1896 г. святаром Міхаілам Адонскім у Парыцкай Свята-Духавай царкве Бабруйскага павета. Хросныя бацькі – дваранін засценка Майсееўка Грыгорый Фёдаравіч Некрашэвіч і Наталля Міхайлаўна Некрашэвіч[376].


333/277 **Елізавета,** нарадзілася 01.09.1892 г., ахрышчана 06.09.1892 г. святаром Міхаілам Адонскім у Парыцкай Свята-Духавай царкве Бабруйскага павета. Хросныя бацькі – дваранін фальварка Майсееўка Грыгорый




Зверху: Праскоўя Міхайлаўна Некрашэвіч (Сыцько; гл. «Некрашэвічы» 330/275).
Знізу: Соф'я Пятроўна Кулеўская (Старжынская), Уладзімір Пятровіч Кулеўскі (гл. «Некрашэвічы» 329/275).






Метрической книги на

Выпіска з метрычных кніг Парыцкай Свята-Духавай царквы Бабруйскага павета аб шлюбе 02.02.1898 г. гарніста з дваран засценка Мядзведава Рэчыцкага павета, прыхаджаніна Яўтушкавіцкай царквы Пятра Філіпавіча Старжынскага і дваранкі фальварка Данілаўка Наталлі Міхайлаўны Некрашэвіч. Наталля Міхайлаўна – сястра Сцяпана Міхайлавіча Некрашэвіча і бабуля Іны Уладзіміраўны і Зарыны Уладзіміраўны Кулеўскіх. Зарына Уладзіміраўна – жонка Данілы Канстанцінавіча Міцкевіча, сына Якуба Коласа. *НГАБ, ф. 136, воп. 23, спр. 18, арк. 146 адв.*



Выпіска з метрычных кніг Парыцкай Свята-Духавай царквы Бабруйскага павета аб нараджэнні 01.04.1892 г. Іосіфа Міхайлавіча Некрашэвіча. Бацькі – дваране Міхаіл Паўлавіч і Ева Дзмітрыеўна Некрашэвічы (гл. «Некрашэвічы» 326/275). Іосіф Міхайлавіч Некрашэвіч – брат Сцяпана Міхайлавіча Некрашэвіча. Быў афіцэрам Добраахвотніцкай арміі Дзянікіна. Расстраляны бальшавікамі на Доне падчас грамадзянскай вайны. *НГАБ, ф. 136, воп. 23, спр. 16, арк. 106 адв. – 107.*



Зверху: Сцяпан Міхайлавіч Некрашэвіч (гл. «Некрашэвічы» 325/275). Фота са справы АДПУ. 1930 г.
Архіў КДБ Рэспублікі Беларусь.
Знізу: Мікалай Грыгор’евіч Некрашэвіч (гл. «Некрашэвічы» 342/280).
Дар’я Міхайлаўна Некрашэвіч (Струева; гл. «Некрашэвічы» 328/275).





Выпіска з метрычных кніг Парыцкай Свята-Духавай царквы Бабруйскага павета аб нараджэнні 18.08.1880 г. Наталлі Міхайлаўны Некрашэвіч (гл. «Некрашэвічы» 329/275). Бацькі – дваране фальварка Данілаўка Міхаіл Паўлавіч і Ева Дзмітрыеўна Некрашэвічы. Наталля Міхайлаўна Некрашэвіч – сястра Сцяпана Міхайлавіча Некрашэвіча і бабуля Іны Уладзіміраўны і Зарыны Уладзіміраўны Кулеўскіх. *НГАБ, ф. 136, воп. 23, спр. 15, арк. 19 адв.*

Фёдаравіч Некрашэвіч і жонка мешчаніна Усціна Сцяпанавіча Муравіцкага Анастасія Фёдараўна[377].

334/277 **Алена,** нарадзілася 10.05.1885 г., ахрышчана 12.05.1885 г. святаром Васілём Байковым у Парыцкай Свята-Духавай царкве Бабруйскага павета. Хросныя бацькі – дваранін засценка Малінава Васіль Максімавіч Корбут і дваранка засценка Майсееўка Дарыя Яўстафіеўна Бараноўская, дзяўчына[378]. Памерла 18.12.1885 г. ад воспы, пахаваная 20.12.1885 г. святаром Парыцкай Свята-Духавай царквы Васілём Байковым[379].

335/277 **Ганна,** *1890 г. н. Жыла ў фальварку Данілаўка.

Муж – Вячаслаў Мікалаевіч Карвіна-Караткевіч, 28 гадоў, дваранін сядзібы Дабужа; першым шлюбам. Шлюб 23.01.1911 г. у Парыцкай Свята-Духавай царкве. Святар – Міхаіл Адонскі. Сведкі: з боку маладога – дваранін засценка Майсееўка Сямён Паўлавіч Рудзінскі і дваранін сядзібы Мядзведава Мікалай Грыгор'евіч Старжынскі, з боку маладой – рэчыцкі мешчанін Ігнацій Сямёнавіч Садлуха і селянін Ануфрый Іванавіч Сільвестровіч[380].

336/277 **Наталія,** нарадзілася 22.08.1899 г., ахрышчана 29.08.1899 г. святаром Міхаілам Адонскім у Парыцкай Свята-Духавай царкве Бабруйскага павета. Хросныя бацькі – дваране фальварка Данілаўка Мікалай Міхайлавіч Некрашэвіч і жонка Данііла Паўлавіча Некрашэвіча Параскевія Фёдараўна[381].

337/279 **Ірына,** нарадзілася 20.04.1891 г., ахрышчана 22.04.1891 г. святаром Міхаілам Адонскім у Парыцкай Свята-Духавай царкве Бабруйскага павета. Хросныя бацькі – дваране фальварка Данілаўка Нікіфар Грыгор'евіч Рудзінскі і жонка Міхаіла Паўлавіча Некрашэвіча Ева Дзмітрыеўна[382]. Памерла 31.03.1915 г. ад брушнога тыфу, пахавана 01.04.1915 г. святаром Парыцкай Свята-Духавай царквы Міхаілам Адонскім[383].

338/279 **Грыгорый,** нарадзіўся 22.11.1895 г., ахрышчаны 26.11.1895 г. святаром Міхаілам Адонскім у Парыцкай Свята-Духавай царкве Бабруйскага павета. Хросныя бацькі – дваране засценка Данілаўка Нікіфар Грыгор'евіч Рудзінскі і жонка Міхаіла Паўлавіча Некрашэвіча Ева Дзмітрыеўна[384].

339/279 **Фёдар,** нарадзіўся 21.04.1907 г., ахрышчаны 27.04.1907 г. святаром Міхаілам Адонскім у Парыцкай Свята-Духавай царкве Бабруйскага павета. Хросныя бацькі – дваране фальварка Данілаўка Нікіфар Грыгор'евіч Рудзінскі і дзяўчына Марыя Міхайлаўна Некрашэвіч[385]. Памёр 29.04.1907 г. «ад прыроджанай слабасці», пахаваны 30.04.1907 г. святаром Парыцкай Свята-Духавай царквы Міхаілам Адонскім[386].

340/279 **Таццяна,** нарадзілася 15.01.1899 г., ахрышчана 17.01.1899 г. святаром Міхаілам Адонскім у Парыцкай Свята-Духавай царкве Бабруйскага павета. Хросныя бацькі – дваране фальварка Данілаўка Нікіфар Грыгор'евіч Рудзінскі і жонка Міхаіла Паўлавіча Некрашэвіча Ева Дзмітрыева[387].

341/280 **Алена,** нарадзілася 20.09.1889 г. Жыла ў аколіцы Майсееўка, у фальварку Данілаўка. Дваюрадная сястра акадэміка Сцяпана Міхайлавіча Некрашэвіча. Вучылася ў Парыцкім жаночым вучылішчы духоўнага ведамства.

Муж – Міхаіл Радзеўскі. Дзеці: 1. Алена Міхайлаўна Радзеўская – жонка народнага паэта Беларусі Петруся Броўкі. Сын Юрый; 2. Ігар


ВЫПИСЬ ИЗЪ МЕТРИЧЕСКОЙ КНИГИ, ЧАСТЬ ПЕРВАЯ, О РОДИВШИХСЯ, ЗА 1889 ГОДЪ.

Выпіска з метрычнай кнігі Парыцкай Свята-Духавай царквы Бабруйскага павета аб нараджэнні 20.05.1889 г. Алены Грыгор'еўны Некрашэвіч (гл. «Некрашэвічы» 341/280). Бацькі – дваране аколіцы Майсееўка Грыгорый Фёдаравіч і Фёкла Паўлаўна Некрашэвічы.
З архіўных матэрыялаў Дзяржаўнага Літаратурнага музея Петруся Броўкі.

Міхайлавіч Радзеўскі, працаваў захавальнікам фондаў музея Петруся Броўкі (г. Мінск).

342/280 **Мікалай.** Кандыдат біялагічных навук. З канца 1930-х гг. жыў у г. Алма-Ата. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, быў паранены. Узнагароджаны ордэнамі і медалямі СССР. Пасля вайны працаваў у Акадэміі навук Казахстана, пасля ў Растоўскім універсітэце. Памёр у 1970-я гг.

Жонка – N, кандыдат біялагічных навук, працавала ў Растоўскім універсітэце. Дзяцей не было.

343/286 **Грыгорый,** нарадзіўся 25.09.1867 г., ахрышчаны 30.09.1867 г.

344/300 **Іван,** нарадзіўся 07.09.1902 г.

345/300 **Аляксей,** нарадзіўся 14.02.1887 г.

346/306 **Парфірый,** нарадзіўся 09.11.1866 г.

347/306 **Андрэй,** нарадзіўся 01.10.1870 г.

348/306 **Сямён,** нарадзіўся 10.07.1861 г., ахрышчаны 24.07.1861 г. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 31.12.1869 г. далучаны да дваранскага роду[388].

Татуры герба «Данброва»







Герб роду Татураў «Данброва».

Прабабуля майго дзеда Міхаіла Іванавіча Сацкевіча-Статкевіча – Ганна Самуілаўна Татур.

З роду Татураў выйшла шмат знакамітых асоб, у тым ліку і беларуская паэтэса Наталля Татур. «Наш род, – распавядала сама Наталля, – у Польшчы лічыўся адным з найстаражытнейшых. Першапачаткова прозвішча гучала як Тур, а тая галіна роду, што перасялілася з Францыі, пісала яго звычайна з прыстаўкай "Ля". У час Варфаламееўскай ночы палякі-каталікі пакінулі краіну, і мае продкі, перасякаючы межы Княства Літоўскага, кімсьці былі названы Татурамі.

Генрых Татур – вядомы этнограф, заснавальнік найбагацейшага прыватнага этнаграфічнага музея, яго імя змешчана ў нацыянальнай энцыклапедыі. Мой кузен Анджэй Татур – вядомы польскі даследчык Антарктыкі, знакаміты ўнікальнай знаходкай шкілета двухметровага пінгвіна. Мой родзіч быў прадвадзіцелем мінскага дваранства. Бацька, Мікалай Татур, стаў беларускім пісьменнікам, а бабуля па матчынай лініі была не толькі дырэктарам кандытарскай фабрыкі, але і перакананай камуністкай. Увогуле, цікавы род, цікавыя людзі».

Гэта меркаванні Наталлі Мікалаеўны адносна паходжання роду Татураў, але звернемся да фактаў і дакументаў мінулага.

Справа Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу пра дваранскае паходжанне Татураў ахоплівае некалькі стагоддзяў. Мінулае адлюстравана ў ёй на 1565 аркушах. Гістарычныя факты гавораць пра знакамітасць старажытнага роду, які меў свой герб – «Данброва».



Наталля Мікалаеўна Татур – член Саюза пісьменнікаў Беларусі і Расіі. 1990-я гг.

Легенда сведчыць, што ў 1096 г. крыжаносцы на чале з Готфрыдам Бульёнскім рушылі ў паход да Труны Гасподняй у Іерусалім. Войскам не ўдалося заваяваць горад, тады Готфрыд папрасіў дапамогі ў польскага манарха Крываўста. Польскі атрад рыцараў узначаліў Дамброўскі. За праяўленую ў бітве адвагу і мужнасць пры ўзяцці Іерусаліма слаўны воін атрымаў ад Готфрыда Бульёнскага герб, які назвалі «Данброва».

На шчыце герба ў сінім полі – срэбраная падкова, на якой размешчаны залаты крыж, на канцах той падковы – яшчэ два крыжы; на шлеме, па-шляхецку каранаваным, адлюстравана птушынае крыло, пранізанае стралою.

Да ўладальнікаў герба паважліва ставіліся многія знакамітыя асобы і нават польскія каралі, што засведчана летапісцамі: «Прозвішча Татур мае прывілеі дваранскага паходжання і карыстаецца ўласцівымі гэтаму званню правамі». Дваранскія правы захоўваліся за Татурамі на працягу некалькіх стагоддзяў. Доказам таму служаць дакументы, дзе сустракаецца прозвішча Татур: прывілей княжны Ганны Радзівіл, выдадзены Невяроўскім і Івану Татуру 30 мая 1754 г., выпіс патэнта на навагрудскага ротмістра Івана Татура ад 19 верасня 1786 г., трохгадовая закладная здзелка на фальварак Плехаў і інш. На жаль, многія дакументы былі спалены падчас войнаў. І ўсё ж тых, што засталіся, хапіла, каб прызнаць Татураў «радавітымі і старажытнымі польскімі дваранамі» і ўнесці іх «у дваранскую кнігу Мінскай губерні ў першую частку».



Радаводнае дрэва
і герб «Данброва»
Татураў. *НГАБ,
ф. 319, воп. 1, спр. 18,
арк. 1–2.*

Надзвычай цікавыя архіўныя матэрыялы знойдзены ў апошні час. Напрыклад, гісторыя Ізыдора Татура і Фамы Іодкі. Апошні паквапіўся на кавалак зямлі, на які быццам бы не было дакументаў. Справа дайшла да суда, і там высветлілася, што дакументы ўсё-такі ёсць, і з іх вынікае, што ў фальварку Бярозаўшчына «межы зямлі пазначаны ў купчай». Акрамя таго, знайшліся дакументы, якія сведчаць, што дзед Ізыдора Самуіл Татур «за жыццё сваё набыў надзел зямлі, Перцаўшчызна названы, у Слуцкім павеце», і гэты надзел знаходзіўся з мая 1802 г. у «бясспрэчным валоданні» сям'і.

Не менш цікавы і другі дакумент – фармулярны спіс аб службе акалодачнага наглядчыка Маскоўскай гарадской паліцыі Вікенція Восіпава Татура. Вікенцій Восіпаў меў два срэбраныя медалі, значок за выдатную стральбу, вузкі і шырокі шаўроны і атрымліваў за год 550 рублёў жалавання. Да гэтага быў грэнадзёрам Растоўскага палка. Вызначыўся Вікенцій Татур і на службе ў маскоўскай паліцыі.

Стала вядома і пра Хрызастома-Лаўрэнція-Даменіка Іванава Татура, прадвадзіцеля слонімскага павятовага дваранства – бацьку Генрыха Татура. Са знойдзеных звестак вынікае, што Татуры пакінулі


ВСЕПРЕСВѢТЛѢЙШІЙ, ДЕРЖАВНѢЙШІЙ
ВЕЛИКІЙ ГОСУДАРЬ ИМПЕРАТОРЪ
АЛЕКСАНДРЪ НИКОЛАЕВИЧЪ,
САМОДЕРЖЕЦЪ ВСЕРОССІЙСКІЙ, ГОСУДАРЬ ВСЕМИЛОСТИВѢЙШІЙ!

Справа аб вяртанні зямлі Перцаўшчызна (маёнтак Пукава), набытай Самуілам Іванавічам Татурам. *НГАБ, ф. 120, воп. 1, спр. 210, арк. 25–26 адв.* Самуіл Татур – бацька Ганны Забэлы (Татур), прабабулі дзеда Анатоля Статкевіча-Чабаганава – Міхаіла Іванавіча Сацкевіча-Статкевіча.


на Слонімшчыне добры след. Дзядзька Генрыха Татура быў святаром аднаго з мясцовых касцёлаў і надзвычай паважаным чалавекам. Адсюль паходзіла і маці ўжо згаданага вядомага археолага, калекцыянера і кнігазнаўцы Генрыха Татура. Захаваўся яе ліст сыну, напісаны ў Слоніме.

Да гэтага часу пра асобу Генрыха Татура пішуць газеты, часопісы, як нашы, так і замежныя, даючы пры гэтым розныя ацэнкі яго дзейнасці. Дата яго нараджэння доўгі час заставалася нявысветленай. Мне ўдалося ўстанавіць, што ён нарадзіўся 17 верасня 1846 г. у Слоніме. Фотаздымкаў вядомага беларускага археолага знайсці не ўдалося, існуе толькі апісанне яго знешнасці.

А што пісалі пра Генрыха Татура яго сучаснікі? Звернемся да твораў Аляксандра Ельскага, вядомага дзеяча беларускай культуры, пісьменніка, публіцыста, этнографа, збіральніка помнікаў пісьменства і гісторыі роднага краю. У яго нарысе «Гарады і мястэчкі» ёсць цікавае сведчанне: «Археалагічна-этнаграфічны музей пры мясцовым губернскім статыстычным камітэце знаходзіцца ў памяшканні губернатара, мае да 600 археалагічных знаходак каменнай і бронзавай эпох, каля 1000 тамоў польскіх і лацінскіх старажытных твораў, сабраных у былых бібліятэках касцёлаў, некалькі тысяч розных мясцовых работ, што адносяцца да этнаграфіі, пэўную колькасць айчынных манет і розных памятак, а таксама збор чалавечых чарапоў, узятых з дагістарычных курганоў. Музей гэты дзесяць гадоў таму быў створаны і ўкамплектаваны здольным даследчыкам, археолагам Генрыхам Татурам. Цікавасць у гэтым зборы выклікае выкананая названым Татурам неапублікаваная археалагічная карта Мінскай губерні, на якой абазначаны ўсе мясцовасці, дзе ёсць дагістарычныя помнікі: курганы, гарадзішчы, насыпы, замкі, памятныя камяні і іншае. Татур падзяліў усе помнікі на 25 груп і адзначыў на Міншчыне да 30 000 курганоў і да 1000 гарадзішчаў і насыпаў».




Узнагароды Вікенція Восіпава Татура: медаль у памяць царавання імператара Аляксандра III (злева) і медаль у памяць каранавання імператара Мікалая II (гл. «Татуры» 443/273).



Татуровъ

1843 Года Сентября 6. дня

Вызначэнне Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 06.09.1843 г. аб далучэнні да дваранскага роду Татураў Слонімскага павятовага прадвадзіцеля дваранства Хрызастома Іванава Татура. Хрызастом Іванавіч – бацька Генрыха Татура (на 2 старонках; гл. «Татуры» 101/32). *НГАБ, ф. 319, воп. 1, спр. 317, арк. 480–480 адв.*



Warszawa, d. 1 .... 1881 r.

341

REDAKTOR i WYDAWCA
CZASOPISMA TYGODNIOWEGO
WĘDROWIEC.

REDAKCYA
SŁOWNIKA GEOGRAFICZNEGO
Królestwa Polskiego i krajów przyległych.
Ulica Nowy-Świat Nr. 59.

Szanowny Panie!

Tego rodzaju szczegóły, o jakich Szanowny Pan wspomina, Słownik bardzo chętnie zamieszczać będzie i na ... opisowy pomników (nomenklatura musi być zawsze podawana pod miejscowością, w której pomnik się znajduje) w zasadzie się zgadzam, rezerwując sobie jednak wszelką swobodę skracania artykułów. Litera D drukować się będzie do 1/III 1881

Z głębokiem uszanowaniem
Sługa

Ліст Генрыху Татуру з выдавецтва «Слоўнік геаграфічны» з прапановай аб супрацоўніцтве (польская мова). *Матэрыялы археолага Генрыха Татура. Літоўскі дзяржаўны гістарычны архіў (LVIA), ф. 716, воп. 4, спр. 219, с. 341.*


Удумаўшыся ў гэтыя лічбы, можна ўявіць аб'ём работ, выкананы нястомным даследчыкам. «Энцыклапедыя гісторыі Беларусі» так характарызуе нашага земляка: «...беларускі археолаг, гісторык, краязнавец, калекцыянер. Член Мінскага статыстычнага камітэта, павятовы маршалак дваранства. З 1874 г. вёў археалагічныя раскопкі ў Мінскай губерні, склаў яе археалагічную карту з апісаннем помнікаў».

Па пытаннях папаўнення калекцыі старажытнай зброі, а таксама бібліятэкі для свайго Нясвіжскага замка з Г. Татурам раіўся князь Антоній Радзівіл. З Г. Татурам плённа супрацоўнічаў граф Э. Чапскі. Генрых Хрыстафоравіч браў удзел у рабоце 9-га археалагічнага з'езда, які адбываўся ў Вільні, з грунтоўным дакладам пра сваю дзейнасць. Гэта быў сапраўды адукаваны, дасведчаны чалавек. Нездарма Іван Луцкевіч, адзін з заснавальнікаў газеты «Наша Ніва», лічыў Г. Татура сваім настаўнікам. Аляксандр Уласаў пісаў: «Мы і Казімір Кастравіцкі [родзіч вядомага французскага паэта Гіёма Апалінэра (Кастравіцкага), бацькі якога паходзілі з-пад Навагрудка] былі ў музеі Татура сотні разоў, расказвалі яму пра свае "беларускія планы"...

Строгі стары, лысы, з рыжай барадой, падобны да прарока Майсея, быў з намі адной думкі. Седзячы вечарамі ў сваім прыстанку, закіданым кальчугамі, мячамі, старымі кнігамі, дакументамі, мэбляю, іконамі, ён выслухоўваў нашы "даклады" пра яшчэ нясмелыя спрэчкі з палякамі


Его Высокоблагородію
Г. Татуру
№ 365

Канверт з адрасам. Правадзейнаму члену Мінскага губернскага статыстычнага камітэта Генрыху Татуру. *Матэрыялы археолага Генрыха Татура. LVIA, ф. 716, воп. 4, спр. 221.*



М. В. Д.

Секретаря

Минскаго Губернскаго Статистическаго Комитета.

дня 1876 г.


№ 365

Ліст сакратара Мінскага губернскага статыстычнага камітэта Генрыху Татуру.
Матэрыялы археолага Генрыха Татура. LVIA, ф. 716, воп. 4, спр. 223, с. 1.


і абрусіцелямі, часам рабіў заўвагі, прыводзіў аргументы з гісторыі Беларусі.

Кастравіцкі быў духам "Белавежскай пушчы", з народа, ад Татура на нас веяла духам Гедыміна, Ягайлы, Канстанціна Астрожскага, менскіх, слуцкіх і ўсіх фундатараў і будаўнікоў беларускай мінуўшчыны. Гэта былі два магіканы, дзве крыніцы, якія захавалі зародак беларускай ідэі і не далі ёй згаснуць».

У кнізе «Археалогія і краязнаўства Беларусі XVI ст. – 30-я гг. XX ст.» прафесар Л. Аляксееў піша пра Генрыха Татура як пра дылетанта, але і не адмаўляе яго заслугі ў справе, якой наш родзіч быў адданы ўсё жыццё: «Г. Х. Татур збіраў старажытнасці з чатырнаццаці гадоў. Гэты своеасаблівы чалавек, апантаны страсцю калекцыянера, займаўся яшчэ і раскопкамі. Г. Х. Татур валодаў несумненна вялікімі, хоць і спецыфічнымі, ведамі археалагічных старажытнасцей Беларусі, якія ён з цягам часу і абагульніў. Рассылаючы па Мінскай вобласці спецыяльныя анкеты, ён склаў археалагічную карту Мінскай губерні. Ім самім былі зроблены назіранні, што па цячэнні Бярэзіны распаўсюджаны курганы конусападобнай востраканечнай формы,



Алфавіт з работы Генрыха Татура «Система подразделения археологических памятников на пространстве Минской губернии». 1893 г. Рукапіс. *Матэрыялы археолага Генрыха Татура. LVIA, ф. 716, воп. 4, спр. 218.*


Система подраздѣленія
Археологическихъ
памятниковъ
напространствѣ
Минской губерніи.

Г. Х. Татуръ.

1893 г.


Тытульны ліст з даследавання Генрыха Татура «Система подразделения археологических памятников на пространстве Минской губернии». 1893 г.
Матэрыялы археолага Генрыха Татура. LVIA, ф. 716, воп. 4, спр. 215.

а па верхнім цячэнні ракі Пціч – сустракаюцца ў форме чатырохвугольнай і ўсечанай піраміды, трохвугольная форма піраміды вельмі рэдкая, заўважана толькі на правым беразе Бярэзіны ў Ігуменскім павеце, валікі (доўгія курганы) сустракаюцца толькі ў вярхоўях Бярэзіны, пра што ён і казаў».

Генрых Татур добра ведаў пахавальныя абрады розных рэгіёнаў, месцы з найбольшай колькасцю рэчаў у курганах. Ведаў ён і гарадзішчы ў Мінскай губерні: «…у самай вялікай колькасці і самыя цудоўныя ўмацаванні, – пісаў ён, – знаходзяцца па цячэнні Бярэзіны і яе прытоках, асабліва з правага боку, сярод азёр у вярхоўях гэтай ракі ў паўночнай частцы Барысаўскага павета і сярод балот даволі рэдкія і менш моцныя. Плывучы ўверх па цячэнні ракі Случ, заўважаеш, што яны зноў сустракаюцца ў вялікай колькасці і ў больш значных памерах».




Іван Луцкевіч (злева)
і Аляксандр Уласаў.
Пачатак XX ст.



Археологическіе памятники
на пространствѣ
Минской губерніи
составляютъ:

А. Земляныя насыпи.
Б. Каменные памятники.
В. Металлическіе памятники.
Г. Органическіе памятники.
Д. Надводныя свайныя постройки.
Е. Дороги, плотины, мосты и проч.
Ж. Преданія.

Пералік тэм, якія асвяціў Генрых Татур у сваім даследаванні «Система подразделения археологических памятников на пространстве Минской губернии». 1893 г. *Матэрыялы археолага Генрыха Татура. LVIA, ф. 716, воп. 4, спр. 215.*



МИНСКОЙ
ГОРОДСКОЙ
УПРАВЫ.

Ноября 4 дня 189_ г.

№ 19167

г. Минскъ.

Г. Г. Х. Татуру

2


Городская Управа имеетъ честь препроводить при семъ Вамъ, Милостивый Государь планъ предполагаемой Общественной библіотеки, причемъ проситъ вступить въ переговоры съ Судебнымъ Вѣдомствомъ относительно перестройки зданія архива подъ публичную библіотеку.

Членъ Управы К. [illegible]

Секретарь [illegible]

Столоначальникъ [illegible]

Ліст Мінскай гарадской управы ад 04.11.189? г. Генрыху Татуру з прапановай абмеркаваць праект перабудовы будынка архіва пад публічную бібліятэку. *Матэрыялы археолага Генрыха Татура. LVIA, ф. 716, воп. 4, спр. 223, с. 2.*



МИНСКІЙ
ГОРОДСКОЙ
ГОЛОВА.
Апрѣля 12 дня 1893 г.
№ 3015
г. Минскъ.

Свидѣтельство.

Минская Городская Управа симъ удостовѣряетъ, что предъявитель сего Дворянинъ Генрихъ Христофоровичъ Татуръ, согласно п. 8 ст. 2 Гор. Пол. 11 Iюня 1892 г. уполномоченъ Минской Городской Управой выработать проектъ устройства въ г. Минскѣ публичной библiотеки, и управленiя для этого подходящаго помѣщенiя и всего относящагося до этой библiотеки, съ тѣмъ, что бы выработанные имъ по сему предмету матерiалы были представлены въ Управу. Вслѣдствiе чего Городская Управа покорнѣйше проситъ всѣ присутственныя мѣста и учрежденiя въ [illegible] Татуръ будетъ относиться не отказать ему въ законномъ содѣйствiи. Апрѣля 12 дня 1893 г.
г. Минскъ.


Городской Голова гр. К. Чапскiй.

Секретарь [signature]

Пасведчанне Мінскага гарадскога галавы графа Эмерыка Чапскага ад 12.04.1893 г., якое пацвярджае, што Генрыху Татуру даручана выпрацаваць праект стварэння ў г. Мінску публічнай бібліятэкі. *Матэрыялы археолага Генрыха Татура. LVIA, ф. 716, воп. 4, спр. 223, с. 1.*

Пісалі пра нястомнага археолага і краязнаўцу вядомыя даследчыкі З. Даўгяла, А. Каўка, У. Мархель, Г. Каханоўскі. Аднак, на жаль, да гэтай пары няма асобнай кнігі пра жыццё і дзейнасць гэтага неардынарнага чалавека. Некаторыя звесткі можна ўзяць толькі з архіўных дакументаў. Напрыклад, з вызначэння Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу вядома пра далучэнне да дваранскага роду Татураў Генрыха-Франца Хрызастомава Татура, што адбылося 14 лістапада 1853 г. Яшчэ адзін дакумент – справа Мінскай аб'яднанай палаты крымінальнага і грамадзянскага суда па спрэчках паміж удавой калежскага саветніка К. Леміхавай, жонкай калежскага саветніка А. Пярхуравай, інжынерам-капітанам В. Багдановічам з аднаго боку і дваранінам Г. Татурам – з другога аб праве валодання спадчынай пасля смерці А. Мезенцавай у маёнтку Крушыны Ігуменскага павета.

У той час квітнела фундатарства, у пашане быў талент, і некаторыя багатыя людзі імкнуліся яго падтрымліваць. Вось і А. Мезенцава звярнула ўвагу на маладога археолага Татура, які, відаць, неаднойчы зазіраў у маёнтак Крушыны, праводзіў раскопкі ў тых мясцінах, расказваў пра знаходкі і свае планы на будучыню. Невыпадкова ў 1866 г. з'явіўся дакумент, дзе


Началось 25 Сен. 1878
По настольному № 714
По описи № 2994
30.110.
ДѢЛО
3го стола
МИНСКОЙ СОЕДИНЕННОЙ ПАЛАТЫ
УГОЛОВНАГО И ГРАЖДАНСКАГО
СУДА


Справа Мінскай аб'яднанай палаты крымінальнага і грамадзянскага суда па спрэчцы паміж удавой калежскага саветніка К. Леміхавай, жонкай калежскага саветніка А. Пярхуравай, інжынерам-капітанам В. Багдановічам і дваранінам Генрыхам Татурам аб праве наследавання пасля смерці ўдавы стацкага саветніка А. Мезенцавай маёнтка Крушыны Ігуменскага павета за 1876–1882 гг. (на 189 аркушах). *НГАБ, ф. 147, воп. 3, спр. 19953, арк. 206–209 адв.*



ГЛАВНОЕ УПРАВЛЕНІЕ
ИМѢНІЯМИ И ДѢЛАМИ
КНЯЗЯ АНТОНА ВИЛЬГЕЛЬМОВИЧА РАДЗИВИЛЛА
Г. НЕСВИЖЪ, МИНСКОЙ ГУБ.

Его Высокоблагородію
Генрику Татуру
Въ г. Минскъ
Торговая улица домъ Гурвича № 6.

Канверт Галоўнага ўпраўлення маёнткамі і справамі князя Антона Вільгельмавіча Радзівіла, г. Нясвіж Мінскай губ., Генрыху Татуру з адрасам: Гандлёвая вуліца, дом Гурвіча № 6. *Матэрыялы археолага Генрыха Татура. LVIA, ф. 716, воп. 4, спр. 221.*




13

Kraków 5/VII 92


Łaskawy Panie!

Запіска графа Эмерыка Чапскага Генрыху Татуру (польская мова). *Матэрыялы археолага Генрыха Татура. LVIA, ф. 716, воп. 4, спр. 221, с. 13.*


Wielmożny Panie Dobrodzieju!

Najniższy Sługa

Ліст графа Эмерыка Чапскага з маёнтка Станькава на гербавай паперы Чапскіх Генрыху Татуру (польская мова). *Матэрыялы археолага Генрыха Татура. LVIA, ф. 716, воп. 4, спр. 223, с. 12.*




ZARZĄD GŁÓWNY DÓBR
J. O. Księcia Ordynata
Antoniego Radziwiłła
ZAMEK NIEŚWIESKI
Sierpnia 17 dnia 1899 r.
№ 140.

Do
Wielmożnego Pana
Henryka Tatura
w Mińsku.

Z rozporządzenia J.O. Księcia Ordynata Antoniego Radziwiłła Zarząd Główny ma honor zawiadomić W. Pana, że w tych czasach J.O. Książę Ordynat będzie w Mińsku i osobiście obejrzy zbroję zaproponowaną przez W. Pana do nabycia pismem Jego z dnia [illegible]/16 b. m. Sierpnia.

Za Głównego Zarządzającego
[illegible]


Паведамленне князя Антонія Радзівіла Генрыху Татуру пра візіт і агляд прапанаванай старажытнай зброі (польская мова).
Матэрыялы археолага Генрыха Татура. LVIA, ф. 716, воп. 4, спр. 223, с. 7.



Запіска графа Эмерыка Чапскага з маёнтка Станькава Генрыху Татуру з цэнамі на набытыя антыкварныя кнігі (польская мова). *Матэрыялы археолага Генрыха Татура. LVIA, ф. 716, воп. 4, спр. 223.*

А. Мезенцава завяшчала свой маёнтак Г. Татуру. У дадатковым завяшчальным распараджэнні ад 29 жніўня 1868 г. фундатарка пісала, што калі ўлады не дазволяць перадаць маёнтак Крушыны Татуру ў вотчыннае валоданне, то яна «завяшчае Татуру выкупную ссуду за сялянскія надзелы ў яе маёнтку, колькі такой належыць і дазваляе яму, Татуру, атрымаць з яе маёнтка 8 тысяч рублёў за паслугі, а да атрымання гэтых грошай жыць у тым маёнтку і кіраваць бескантрольна, з абавязацельствам толькі плаціць за казённыя павіннасці».

Маёнтак Крушыны так і не дастаўся маладому даследчыку. Аб'яднаная палата пры разглядзе духоўнага завяшчання А. Мезенцавай патлумачыла, што пераход нерухомай маёмасці Генрыху Татуру ва ўласнасць як асобе рымска-каталіцкага веравызнання «за сілаю Найвышэйшага ўказа ад 10 снежня 1865 года дапушчаны быць не можа». Не дапамог і Урадавы сенат, куды Татур звярнуўся са скаргаю. Прычына адмовы была вядомая: нядаўна пракацілася паўстанне, удзельнікі якога пазбаўляліся сваіх званняў, маёнткаў і зямель. Каб захаваць нажытае, многія перадавалі маёмасць тым, хто не меў адносін да вірлівых падзей. Вось і з'явіўся Найвышэйшы ўказ, які закрануў і Татура. Аднак, нягледзячы на няўдачу, Генрых Татур прадоўжыў археалагічныя пошукі на абшарах Міншчыны і Віцебшчыны.




Его Высокоблагородію
Г-ну Татуръ
въ Минскѣ
Торговая

Запіска графа Эмерыка Чапскага з маёнтка Станькава Генрыху Татуру з цэнамі на антыкварныя кнігі. *Матэрыялы археолага Генрыха Татура. LVIA, ф. 716, воп. 4, спр. 223.*




Его Высокоблагородію
Г-ну Татуръ
въ Минскѣ
Торговая д. Фурса

Канверт з адрасам Генрыха Татура: г. Мінск, вул. Гандлёвая, дом Фурса. *Матэрыялы археолага Генрыха Татура. LVIA, ф. 716, воп. 4, спр. 223.*



Ліст графа Эмерыка Чапскага Генрыху Татуру з цэнамі на кнігі (польская мова). *Матэрыялы археолага Генрыха Татура. LVIA, ф. 716, воп. 4, спр. 223, с. 49.*




Канверт з адрасам Генрыха Татура: г. Мінск, вул. Гандлёвая, 5. *Матэрыялы археолага Генрыха Татура. LVIA, ф. 716, воп. 4, спр. 223, с. 48.*


FILIP SULIMIERSKI. NOWY ŚWIAT, 59.

Татуру


Канверт у маёнтак Крушыны Генрыху Татуру з выдавецтва «Слоўнік геаграфічны». *Матэрыялы археолага Генрыха Татура. LVIA, ф. 716, воп. 4, спр. 223, с. 340.*




Ліст графа Эмерыка Чапскага Генрыху Татуру з цэнамі на набытыя антыкварныя прадметы (польская мова). *Матэрыялы археолага Генрыха Татура. LVIA, ф. 716, воп. 4, спр. 223, с. 54.*

У створаным Г. Татурам прыватным музеі знаходзілася вялікая калекцыя старажытных рэчаў і кніг, якая ацэньвалася на той час у 200 тысяч рублёў. Пасля смерці збіральніка ў 1907 г. калекцыю хацела набыць Расійская акадэмія навук, але грошы хутка не знайшліся, таму экспанаты былі распрададзены і, на жаль, назаўсёды страчаны для нашай краіны.

Хацелася б асобна спыніцца на лёсе калекцыі Генрыха Татура. Асаблівую цікавасць выклікае гісторыя знаходжання праваслаўнымі вернікамі цудадзейнай іконы Божай Маці «Знамение», якую Генрых Татур раней атрымаў ад Тышкевічаў. У Епархіяльнай хроніцы за 1907 год сказана: «Як вядома, у Лагойску ў даўніну была цудадзейная ікона Божай Маці “Знамение”. У цяжкія для праваслаўных часы (XVI–XVII стст.) гэтая ікона была захоплена ўніятамі. Які яе далейшы лёс, цяжка сказаць. Мы ведаем пра яе толькі ў апошні час. Ікона гэтая захоўвалася ў вялікай тайне ў нябожчыка мінскага археолага Г. Х. Татура...»





Ліст графа Эмерыка Чапскага Генрыху Татуру (польская мова). *Матэрыялы археолага Генрыха Татура. LVIA, ф. 716, воп. 4, спр. 223, с. 39.*

Пасля смерці Генрыха Татура епіскап Мінскі і Тураўскі Міхаіл разам з мінскім губернатарам наведаў яго старажытнасховішча і даручыў святару А. Ленскаму весці перамовы з удавой па пытанні вяртання праваслаўнай царкве цудадзейнай іконы Божай Маці «Знамение». Перамовы прайшлі паспяхова. 8 верасня 1907 г. з прычыны перанясення старажытнай іконы з г. Мінска ў мястэчка Лагойск Барысаўскага павета адбыўся вялікі хросны ход: «Ніколі яшчэ ў Мінску не было такой шматлюднай працэсіі (удзельнічала некалькі дзясяткаў тысяч чалавек)».

Даследавалі тэму спадчыны Г. Татура гісторыкі-мастацтвазнаўцы Ю. Піскун і А. Хадыка, а таксама доктар філалагічных навук А. Мальдзіс.

Найбольш значная частка калекцыі была выкуплена ў 1907 г. ва ўдавы Г. Татура графам Тышкевічам, а іншая частка, на думку даследчыкаў, апынулася ў архіве ўніяцкага мітрапаліта А. Шаптыцкага ў Львове. Пераканаў мітрапаліта пра неабходнасць яе набыцця ўкраінскі прафесар-славіст І. Свянціцкі, а садзейнічаў гэтаму вядомы дзеяч беларускай культуры І. Луцкевіч.

Лічыцца, што сёння частка калекцыі Г. Татура знаходзіцца ў Музеі ўкраінскага мастацтва, створанага І. Свянціцкім. Хочацца думаць, што такім чынам яна была выратавана і захавана...

Цікавы лёс яшчэ адной прадстаўніцы знакамітага роду – Ганны

Самуілаўны Забэлы, народжанай Татур, прабабулі майго дзеда Міхаіла Іванавіча Сацкевіча-Статкевіча.

Прапрадзед яе бацькі Васіль 10 ліпеня 1596 г. па прывілеі польскага караля Жыгімонта III Вазы атрымаў у валоданне Бярэзніцкае староства з сялянамі. Яго сын Іван служыў у літоўскіх войсках і па прывілеі польскага караля Яна Казіміра 7 мая 1660 г. быў уганараваны чынам падпалкоўніка. Унук Лявон таксама нёс вайсковую службу ў чыне маёра, 20 мая 1704 г. атрымаў ахоўную грамату польскага караля Аўгуста II Моцнага.



Ганна Радзівіл. Сярэдзіна XVIII ст.

Дзед Ганны Іван у 1722 г. атрымаў прывілей ад княжны Ганны Радзівіл, валодаў вотчынным маёнткам Пурневічы з сялянамі ў Навагрудскім ваяводстве і быў жанаты з Канстанцыяй з роду Касынскіх. Яго брат Феадор служыў у літоўскіх войсках палкоўнікам і жыў у спадчынным маёнтку Каросна.

Дзядзька Ганны Станіслаў прадоўжыў справу сваіх продкаў – як і яны, служыў у літоўскіх войсках. Граматай польскага караля Аўгуста III 12 ліпеня 1759 г. быў павышаны ў званні – з капітана ў маёры – і ўніверсалам польскага караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага ад 3 ліпеня 1767 г. запрошаны на сейм.

Пра бацьку Ганны – Самуіла – нам вядома, што ён быў ахрышчаны 15 жніўня 1748 г. ксяндзом Канстанцінам Дунцэвічам у Бабовенскім касцёле. Набыў надзел зямлі Перцаўшчызна ў Слуцкім павеце ў правадзейнага стацкага саветніка Бярновіча. Жыў, як відаць з пасямейнага спіса дваран Слуцкага павета 1796 г., у засценку Марозаўшчына, які знаходзіўся ўсяго за некалькі кіламетраў ад маёнтка Дашкі, вотчыны яго будучай жонкі Феліцыяны Фёдараўны Карыбут-Дашкевіч.

Ганна, яе браты і сёстры былі ахрышчаны ў Бабовенскім касцёле. Пасля 1796 г. сям'я перасялілася ў фальварак Бярозаўшчына, дзе раней жылі продкі Татураў. І, магчыма, у гэты час яны перайшлі ў праваслаўе. Як відаць з метрычных кніг, Татуры сталі прыхаджанамі Пукаўскай Георгіеўскай царквы, там 6 красавіка 1821 г. адпявалі бацьку Ганны.

У тыя далёкія часы, як і сёння, да сітуацыі, калі ў адным родзе былі і праваслаўныя, і уніяты, і каталікі, ставіліся цярпліва. Аднак часам на гэтай глебе ўзнікалі сур'ёзныя праблемы.

Так атрымалася і ў Ганны Татур. Яна выйшла замуж за Андрэя Забэлу. Яе абраннік быў каталіцкай веры, таму маладыя абвянчаліся ў Грозаўскім касцёле па рымска-каталіцкім абрадзе. Ганна перастала наведваць Пукаўскую царкву, а ўсіх народжаных дзяцей сям'я хрысціла ў Грозаўскім касцёле.


Аднак калі ў першай палове XIX ст. расійскай дзяржавай праводзілася дзейнасць па скасаванні уніі, пачаліся разбіральніцтвы ў прыходах: каго лічыць праваслаўнымі, а каго аднесці да рымска-каталіцкай веры. Гэта датычылася і сям'і Ганны, дзе, на думку святароў, быў здзейснены незаконны пераход у каталіцтва.

Так і ўзнікла справа «Аб спакушэнні з праваслаўя ў лацінства дваранкі Ганны Забэлавай (Татур) і дзяцей яе: Сімяона, Васіля, Франца, Іосіфа, Казіміра, Мар'яны, Антаніны і Францішкі», якая была пачата 24 красавіка 1851 г. Мінскай духоўнай кансісторыяй. Фактычна гэтая гісторыя пачалася на дзесяць гадоў раней і доўжылася ажно да 1875 г. Да таго часу Ганна памерла, а страсці ўсё кіпелі яшчэ гадоў дваццаць.

Вось што пісаў у 1862 г. яе сын Франц у сваім прашэнні імператару Аляксандру Мікалаевічу: «У 1841 г. Мінскай губерні Ігуменскага павета вёскі Пукава прыходскі святар Ксенафонт Шанец, пасварыўшыся з дзядзькам маім Мартынам Самуілавічам Татурам, па злосці ўчыніў начальству данос, што мы, Татуры, у дзеянні сваім і роўна, як і я з братамі і сёстрамі, народжаныя ад дачкі Самуіла Татура Ганны, спакусіліся з праваслаўя ў рымскі абрад. Па гэтым данясенні праведзена было приставам 1-га разраду Ігуменскага павета агульнае з духоўнымі дэпутатамі рымскімі і праваслаўнымі следства, у час якога прысяжнымі паказаннямі шасці старэйшых апытаных жыхароў і метрычнымі выпіскамі аб нараджэнні і хрышчэнні нас саміх і бацькоў нашых даказалі, што як Татуры, так і мы, Забэлы, спавядалі рымска-каталіцкую веру і што да праваслаўя, а таксама

да былой уніі мы не належалі. Таму данясенне святара Шанца засталося без увагі.


З цягам часу, калі адбыліся разбіральніцтвы паміж рымскім і праваслаўным духавенствам, святар Шанец вырашыў нас і Татураў звярнуць у праваслаўе і прад'явіў іск ксяндзу Грозаўскага рымска-каталіцкага касцёла Маўчановічу. Падмануты і даверлівы Маўчановіч без учынення разбораў выключыў нас і Татураў са спісаў даверанага яму храма».


МИНСКОЙ ДУХОВНОЙ КОНСИСТОРІИ

ДѢЛО

Справа аб спакушэнні ў лацінства дваранкі Ганны Забэлы (Татур) і яе дзяцей (гл. «Татуры» 67/25). *НГАБ, ф. 136, воп. 1, спр. 23566.*

А вось паведамленне Мінскай духоўнай кансісторыі: «У 1843 г. 23 лістапада Пукаўскай царквы святар Ксенафонт Шанец і настаяцель Грозаўскага касцёла Міхаіл Маўчановіч па патрабаванні епархіяльнага начальства чынілі разбіральніцтва па Найвышэйшым указе пра ўсіх тых пукаўскіх прыхаджан, якія ў розныя часы з былой уніі і з праваслаўя пачалі спавядаць рымска-каталіцкую рэлігію. І па ўзаемным метадзе сабор можа з царкоўных дакументаў даведацца пра сапраўды збітых з правільнага шляху, а таму абавязаць іх вярнуцца ў нетры праваслаўя. У ліку іншых асоб была і Ганна Самуілаўна Забэлава, удава. І па акце разбіральніцтва ксёндз Маўчановіч з прыкладаннем касцельнай пячаткі ўласнаручна напісаў, што ён усім асобам, якія маюць адносіны да праваслаўя, паведаміў пра выключэнне са спісаў і што ім не прадаставяць хрысціянскіх трэб. Таму з боку праваслаўнага епархіяльнага начальства даведзены да ведама святару Пукаўскай царквы абавязак праводзіць адпаведныя павучанні, у ліку іншых асоб і Ганны Забэлавай з прапісанымі дзецьмі, на вяртанне ў праваслаўе. Але паколькі яны пасля ўсіх угавораў засталіся ў цвёрдасці, то Ганна Забэлава і старэйшы сын Сімяон былі выкліканы ў кансісторыю для пераконванняў. І выклікаліся тройчы



Рапарт у Мінскую духоўную кансісторыю глускага дабрачыннага святара Іаана Смоліча аб смерці Ганны Самуілаўны Забэлы 15.12.1855 г. і пахаванні яе на праваслаўных могілках у Машнічах. *НГАБ, ф. 136, воп. 1, спр. 23566, арк. 24.*

17, 18, 19 ліпеня 1844 г. [Усе гэтыя дні Ганна з сынам удзельнічала ў праваслаўнай літургіі ў Мінскім Свята-Духавым кафедральным саборы.] Там Сімяон Забэлаў даў падпіску добраахвотна вярнуцца з дзецьмі сваімі ў праваслаўную веру і быць спавяданым і прычашчоным у Кафедральным саборы. А маці яго Ганна Забэлава засталася ў сваёй цвёрдасці і была адпушчана на месца жыхарства. Але паколькі яна перасялілася цяпер у аколіцу Малінава Бабруйскага павета, у прыход Глускай Уваскрэсенскай царквы, то прадпісана глускаму дабрачыннаму протаіерэю Смолічу настаўляць дзяцей яе ў сапраўднасці праваслаўнай царквы, пераконваць іх у прыняцці праваслаўя».

Але і на новым месцы ўгаворы і пераконванні Іаана Смоліча не паўплывалі на пазіцыю Ганны Забэлы. У сваіх данясеннях у Мінскую духоўную кансісторыю, якія святар пасылаў на працягу некалькіх гадоў, ён паведамляў: «Ганна Забэлава і дзеці, якія знаходзяцца з ёю, сцвярджаюць, што яны народжаны ў каталіцызме і застануцца ў ім да старасці, свайму веравызнанню ніколі не здрадзяць і будуць у цвёрдасці сваёй непахісныя, і дзеці бяруць прыклад з маці».

Ганна Самуілаўна памерла ў 1855 г., застаючыся каталічкай, але адпявалася святаром Іаанам Смолічам і пахавана па праваслаўным абрадзе на могілках у Машнічах (цяпер Клетнае). Дзеці яе праз шлюб і па ўласных перакананнях станавіліся або праваслаўнымі, або каталіцкімі хрысціянамі.



Могілкі ў вёсцы Клетнае (да 1917 г. Машнічы) Глускага раёна Магілёўскай вобласці. Тут 15.12.1855 г. пахавана Ганна Самуілаўна Татур, у замужжы Забэла. У час Вялікай Айчыннай вайны на адным з дрэў гэтых могілак немцы абсталявалі назіральны пункт. У выніку многія помнікі, у тым ліку і Ганне Татур, былі знішчаны. На пярэднім плане помнік Вікенцію Якаўлевічу Сацкевічу-Статкевічу, прапрадзеду Анатоля Статкевіча-Чабаганава.

Деревенское кладбище.
Здесь лежит моя родня.
Тут последней меркой взыщут
Что-то главное с меня.

Наталля Татур.



Касьма (Кузьма) Феліксавіч Татур. Слуцк. 1890-я гг. (гл. «Татуры» 514/318).

А вось як склаліся лёсы некаторых іншых прадстаўнікоў роду Татураў.

Адна з найцікавейшых асоб – Касьма Феліксавіч Татур. Ён нарадзіўся ў 1870 г. у Барысаўскім павеце Мінскай губерні і быў незаконнанароджаным сынам Фелікса Фаміча Татура.

Так здарылася, што хлопчык нарадзіўся яшчэ да шлюбу Фелікса Фаміча Татура і Ганны Навумаўны Кавалінскай. У 1883 г. было пададзена прашэнне «Яго Імператарскай Вялікасці... аб дазваленні сыну Фелікса Фаміна Татура Касьме Феліксаву Татуру прыняць прозвішча бацькі». Пасля чаго «Іменным Найвышэйшым Указам, дадзеным 6 чэрвеня 1883 г. Урадаваму сенату, Уселітасцівейша дазволена сыну яго Касьме прыняць яго Татура прозвішча і ўступіць ва ўсе правы і прывілеі, якія належаць... законным дзецям». Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 31.05.1885 г. Касьма далучаны да дваранскага роду Татураў. Паводле сямейнага спіса дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў разам з маці і сёстрамі ў вёсцы Заастравечча.

З 1885 г. Касьма Татур служыў памочнікам валаснога пісара Засульскай, Самахвалавіцкай і Сенніцкай валасцей Мінскага павета, потым валасным пісарам Круговіцкай і Заастравецкай валасцей Слуцкага павета, пісьмаводам канцылярыі слуцкага павятовага і мінскага губернскага прадвадзіцеляў дваранства. З лютага 1897 г. быў губернскім сакратаром і сакратаром Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу. Магчыма, менавіта ён дапамог нашчадкам Ганны Татур, роду Забэлаў, зацвердзіцца ў дваранстве. Узнагароджаны цёмна-бронзавым медалём за сумленную працу па перапісе 1897 г., срэбраным медалём «В память царствования в Бозе почившего Государя императора Александра III» і ордэнам Святой Ганны III ступені.



Стаяць: Алена Феліксаўна Чыж (Татур), муж Алены – N Чыж; сядзіць: Ганна Навумаўна Татур (Кавалінская), побач дзеці Алены Феліксаўны і Марыі Феліксаўны. Тарнау. 1910-я гг. (гл. «Татуры» 318/147).



Касьма (Кузьма) Феліксавіч Татур з жонкай Алімпіядай Іванаўнай (Залюбоўскай) і сёстрамі Марыяй і Аленай. Санкт-Пецярбург. 1900-я гг. (гл. «Татуры» 514/318, 513/318, 512/318).




N, Марыя Феліксаўна, Касьма (Кузьма) Феліксавіч, Алена Феліксаўна Татуры, N Чыж. Мінск. 1905 г. (гл. «Татуры» 513/318, 514/318, 512/318).



Касьма (Кузьма)
Феліксавіч Татур. Мінск.
1900-я гг.

У цэнтры сядзіць Касьма (Кузьма)
Феліксавіч Татур. Мінск. 1900-я гг.





По описи № 432

Минскаго Дворянскаго Депутатскаго Собранія


НАРЯДЪ

о службѣ секретаря Мин. Дв. Деп. Соб. Космы Феликсовича Татура

За 1907 годъ

Тип. Ильи Каплана, Минскъ.

Нарад аб службе сакратара Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу Касьмы (Кузьмы) Феліксавіча Татура. *НГАБ, ф. 319, воп. 9, спр. 294.*



54

Копія

ФОРМУЛЯРНЫЙ СПИСОКЪ

О СЛУЖБѢ

Секретаря Минскаго Дворянскаго Депутатскаго Собранія, Губернскаго Секретаря, Косьмы Феликсовича Татура

Составленъ [illegible] октября 1901 года

Фармулярны спіс аб службе сакратара Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу Касьмы (Кузьмы) Феліксавіча Татура. *НГАБ, ф. 319, воп. 9, спр. 294, арк. 54.*

Цікавы той факт, што ў сям'і двараніна Касьмы Феліксавіча Татура і яго жонкі Алімпіяды Іванаўны, у дзявоцтве Залюбоўскай, трое сыноў – Сяргей, Генадзь і Пётр – сталі прафесарамі. Сяргей Кузьміч Татур – заслужаны дзеяч навукі РСФСР, доктар эканамічных навук, заснавальнік і загадчык кафедры бухгалтарскага ўліку і аналізу гаспадарчай дзейнасці эканамічнага факультэта МДУ імя М. В. Ламаносава. Аўтар больш як 140 навуковых прац, многія з якіх перакладзены на балгарскую, венгерскую, нямецкую, польскую, славацкую, чэшскую мовы. Пад яго кіраўніцтвам выкананы і абаронены 54 кандыдацкія дысертацыі, па сямі доктарскіх дысертацыях ён быў навуковым кансультантам.

За навуковую і педагагічную дзейнасць С. Татур узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. У яго гонар у МДУ ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

Другі сын Касьмы Генадзь Татур – заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі Беларусі, доктар тэхнічных навук. Вучыўся ў Мінску, потым у Тульскім і Казанскім камерцыйных вучылішчах, апошняе скончыў у 1918 г. з залатым медалём. У 1919 г. пераехаў ва Уладзівасток, дзе паступіў на механічнае аддзяленне Далёкаўсходняга політэхнічнага інстытута. З 1931 г. – загадчык кафедры будаўнічай механікі. У 1937 г. за страту палітычнай пільнасці і сваяцкую сувязь з «ворагам народа» быў выключаны з кандыдатаў у партыю бальшавікоў. У красавіку 1955 г. быў зацверджаны ў вучонай ступені доктара тэхнічных навук і ў вучоным званні прафесара Крыварожскага інстытута, а ў 1958 г. абраны па конкурсе на пасаду загадчыка кафедры тэарэтычнай механікі Беларускага політэхнічнага інстытута (БПІ) у Мінску.

Малодшы сын Касьмы Пётр Татур – доктар эканамічных навук, заслужаны землеўпарадчык Узбекістана. Вучыўся ў чыгуначнай школе ў Мінску. Потым працаваў у Крыме, будаваў малыя плаціны – «метраў сто па грэбні, метраў пяць – сем вышынёй». (Да сёння гэтыя плаціны стрымліваюць націск вады мясцовых вадасховішчаў.) Потым паступіў на рабфак пры Маскоўскім інстытуце інжынераў землеўпарадкавання, які выдатна скончыў у 1937 г., быў накіраваны ва Узбекістан на навукова-даследчую станцыю арганізацыі тэрыторыі. У час Вялікай Айчыннай вайны пасля паскораных курсаў Ваенна-інжынернай акадэміі імя Куйбышава трапіў на фронт. Ваяваў у складзе 1-га і 3-га Украінскіх франтоў. Перамогу сустрэў у Германіі ў званні маёра. Узнагароджаны баявымі ордэнамі і шматлікімі медалямі.

Уверсе: Генадзь Кузьміч Татур (стаіць) з жонкай Лізаветай Іванаўнай і сынамі Юрыем і Вадзімам. Крывы Рог. 1957 г. (гл. «Татуры» 641/514, 669/641, 668/641).
Унізе злева: Сяргей Кузьміч Татур. Масква. 1932 г. (гл. «Татуры» 640/514).
Справа: Пётр Кузьміч Татур з жонкай Аленай Якаўлеўнай Татур (Рыслінг). 1937 г. (гл. «Татуры» 643/514).









Мікалай Ігнатавіч Татур. 1970-я гг. (гл. «Татуры» 665/630).

Пасля вайны П. Татур вярнуўся ва Узбекістан. Быў загадчыкам кафедры планіроўкі і добраўпарадкавання сельскіх населеных пунктаў Ташкенцкага інстытута ірыгацыі і меліярацыі, падрыхтаваў сотні вучоных і практыкаў, якія і цяпер працуюць ва Узбекістане і іншых краінах Сярэдняй Азіі.

Яго сын Сяргей Пятровіч Татур – член Саюза пісьменнікаў Узбекістана. Цікава, што першае яго апавяданне «Доктор, доктор!» было апублікавана ў 1965 г. у часопісе «Звезда Востока», куды праз дваццаць гадоў Сяргей Пятровіч прыйшоў на пасаду галоўнага рэдактара. Аўтар 40 раманаў і аповесцей, больш як 150 апавяданняў, сярод якіх «Мания величия», «Пики Тянь-Шаня», «Стена», «Слава Творцу» і інш.

У родзе Татураў былі і яшчэ прафесійныя пісьменнікі. Адзін з іх – Мікалай Татур, бацька Наталлі Татур, пісьменнік – перакладчык са славянскіх моў, член Саюза пісьменнікаў Беларусі. Ён нарадзіўся ў маёнтку Урочышча Застар’е, выхоўваўся ў дзіцячым доме. Пасля заканчэння факультэта мовы і літаратуры Мінскага настаўніцкага інстытута працаваў на Віцебшчыне. У час Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у партызанскім руху, быў цяжка паранены. За баявыя заслугі ўзнагароджаны шматлікімі ордэнамі і медалямі. У мірны час узнагароджаны медалём «Ветэран працы», шматлікімі юбілейнымі медалямі, ганаровымі знакамі «За творчыя поспехі», «За выдатную працу».

Бацька Мікалая Татура Ігнацій, у мінулым афіцэр царскай арміі, быў расстраляны ў 1931 г. у Мядзведжагорску.

Не менш цікавыя лёсы і іншых шматлікіх прадстаўнікоў роду Татураў.

Вікенцій Татур – кадравы вайсковец, удзельнік грамадзянскай вайны, палкоўнік Чырвонай Арміі. Нарадзіўся ў г. Буй Кастрамской

губерні. Але як маглі апынуцца там бацькі Вікенція? Высветлілася, што яго дзед Юльян загінуў на руска-турэцкай вайне, пакінуўшы сына Антона, бацьку Вікенція, сіратою. Спадар Шпілеўскі, дзядзька хлопчыка па лініі маці, які некалі быў высланы царскім урадам за ўдзел у паўстанні пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага ў г. Буй Кастрамской губерні, забраў Антона да сябе, змог яго выхаваць і даць належную адукацыю.

У час Вялікай Айчыннай вайны Вікенцій Антонавіч Татур служыў намеснікам камандзіра аператыўнай групы па артылерыі Паўднёва-Заходняга фронту. У 1941 г. быў паранены каля беларускага мястэчка Парычы. У сакавіку 1942 г. узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, а ў чэрвені таго ж года прапаў без вестак пад Харкавам.



Вікенцій Антонавіч Татур, палкоўнік, прапаў без вестак у час Вялікай Айчыннай вайны. 1940 г. (гл. «Татуры» 626/504).

Яшчэ адна заўважная асоба гэтага роду – Анджэй Татур. Ён нарадзіўся ў 1944 г. у Варшаве. Дзед Анджэя Зыгмунд-Ілья – палкоўнік царскай арміі, у час грамадзянскай вайны ў Расіі ваяваў на баку белых. Пасля рэвалюцыі разам з сям'ёй апынуўся на тэрыторыі Польшчы. Адзін з яго сыноў – Генрых, бацька Анджэя, вучоны-хімік, – быў удзельнікам Варшаўскага паўстання 1944 г. Сам Анджэй – геолаг-палярнік, дырэктар Інстытута біялогіі Антарктыкі Польскай акадэміі навук, дырэктар польскай антарктычнай станцыі імя Хенрыка Арктоўскага, прафесар Люблінскага ўніверсітэта прыроды, удзельнік шматлікіх палярных экспедыцый – аргенцінскіх, нарвежскіх, расійскіх, польскіх.

Прадстаўнікі роду пакінулі значны след у навуцы і культуры. А калі ўзнікала неабходнасць, яны мужна абаранялі Радзіму. І сёння нашчадкі роду Татураў памятаюць мінулае, ведаюць і шануюць свае карані.

РАДАВОДНЫЯ РОСПІСЫ

Род Татураў герба «Данброва» прызнаны ў дваранстве вызначэннямі Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 02.03.1802 г. і 24.01.1808 г. Зацверджаны ўказамі Сената ад (?).10.1849 г., № 7275, і 18.12.1861 г., № 9913.

I КАЛЕНА

1 **Васіль,** аршанскі скарбнік, палкоўнік літоўскіх войскаў. 10.07.1596 г. па прывілеі польскага караля Жыгімонта III Вазы атрымаў у леннае валоданне Бярэзніцкае староства з сялянамі «и всякими землями, борами, лесами, сенокосными лугами, мурожными и болотными, речками... не имея ни от кого никакого препятствия, пока меча [ ]станет никому ничего не уплачивая, а только из того староства сам и потомки его земскую военную службу нам, королю, и Речи Посполитой исполняти...», што засведчыў запіс ад 06.11.1780 г. у Навагрудскім земскім судзе[1].

II КАЛЕНА

2/1 **Іван,** маёр літоўскіх войскаў. Па прывілеі польскага караля Яна II Казіміра ад 07.05.1660 г. пры звальненні са службы ўганараваны чынам падпалкоўніка[2].

III КАЛЕНА


3/2 **Лявон.** Служыў у літоўскіх войсках і граматай польскага караля Аўгуста II Моцнага* ад 28.08.1669 г. пераведзены з капітанаў у маёры, палкоўнік палявой літоўскай булавы. Валодаў спадчыннымі фальваркамі Грывіцы і Шылаўшчызна ў Слуцкім княстве Навагрудскага ваяводства. Па прывілеі польскага караля Яна II Казіміра атрымаў 25.02.1651 г. у трохгадовае валоданне каралеўскія маёнткі Пажыжма і Пагельша. 09.01.1679 г. атрымаў пасведчанне ад Емяльяна Іванавіча Татура, што ён з'яўляецца яго родным братам[3]. Вотчынны маёнтак Жыжма Куноўская з 14 сялянамі ў вёсках Дзяўгуны і Пяцюны ў Лідскім павеце аддаў 11.01.1688 г. у заклад Вайніловічам за 16 тысяч польскіх злотых (актыкацыя 14.01.1688 г. у Лідскім земскім судзе)[4]. Падараваў 12.12.1700 г. сыну Івану закладны маёнтак Жыжма і арэндны фальварак Юневічы[5]. Атрымаў 20.05.1704 г. ахоўную грамату польскага караля Аўгуста II Моцнага, актыкаваную ў Лідскім земскім судзе 05.08.1704 г., а 10.02.1772 г. – у Мінскім земскім судзе[6].

3а/2 **Емяльян.** Даў пасведчанне 09.01.1679 г. Лявону Татуру, што з'яўляецца яго родным братам.

IV КАЛЕНА

4/3 **Геранім.** Судзіўся 30.05.1740 г. з Мацкевічам.

* Так пазначана ў дакуменце.



По описи утвержденныхъ дѣлъ №

ДѢЛО

Минскаго Дворянскаго Депутатскаго Собранія

о дворянскомъ происхожденіи

рода Татуров

Первоначальныя опредѣленія Депут. Собранія

Указъ Правительствующаго Сената объ утвержденіи

отъ 18 года, за №

Справа Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу аб дваранскім паходжанні роду Татураў. *НГАБ, ф. 319, воп. 2, спр. 3207.*

5/3 **Феадор,** палкоўнік літоўскіх войскаў. Пасля перамогі над шведамі польскі кароль Аўгуст II Моцны выдаў 31.08.1703 г. на яго імя рэскрыпт. 16.09.1718 г. звольнены са службы. Валодаў спадчынным па дзеду Івану Васільевічу і бацьку Лявону фальваркам Альжэў Даўлядоўскі з сялянамі ў Лідскім павеце, які выкупіў з закладу ў родных братоў Геранiма, двух Іванаў, Іосіфа, Юрыя, Міхаіла і Самуіла, і прадаў яго 08.04.1725 г. літоўскаму крайчаму Гінету. Па завяшчанні ад 05.03.1728 г. (актыкацыя 19.04.1728 г. у Навагрудскім земскім судзе і 18.02.1772 г. у Мінскім земскім судзе) спадчынны пасля бацькі і набыты ад родных братоў Івана-Непамуцэна, Гераніма, Івана, Іосіфа, Ягора (Юрыя), Міхаіла і Самуіла маёнтак Каросна з сялянамі завяшчаў сынам Антону і Станіславу, паведаміўшы пры гэтым, што падараванае прадзеду ў леннае валоданне Бярэзніцкае староства трапіла ў казённае ведамства за даўгі прадзеда, дзеда і бацькі[7].

6/3 **Іван-Непамуцэн.** Прадаў 23.12.1747 г. камергеру Антону Багдашэўскаму вотчынны маёнтак Пурневічы з сялянамі ў Навагрудскім ваяводстве, частка якога дасталася яму ў спадчыну ад бацькі, а частка набыта ад родных братоў Івана, Юрыя, Міхаіла і Самуіла, ручаючыся за сыноў Іосіфа, Пятра, Сцяпана, Франца і Андрэя[8].

Жонка – Крысціна Лазоўская.

7/3 **Іван.** 17.08.1722 г. атрымаў ад княжны Ганны Радзівіл прывілей [?]. Паводле «изрекательного» дакумента ад 10.03.1726 г. разам з братамі Юрыем, Міхаілам і Самуілам прыналежныя ім ад бацькі часткі маёнтка Пурневічы з сялянамі ў Навагрудскім ваяводстве пераўступіў роднаму брату Івану-Непамуцэну[9]. Падпалкоўнік, што пацвярджаў адстаўны прывілей караля Аўгуста III ад 08.05.1735 г. Заключыў 02.01.1740 г. на тры гады арэндны кантракт са старостам Браніславам Пржэрадоўскім на зямлю Снусцік. Спадчынны ўладальнік маёнтка Жыжма, які 05.02.1750 г. прадаў разам з сялянамі лідскаму ротмістру Андрэю Куноўскаму (актыкацыя 25.03.1751 г. у Трыбунале ВКЛ), ручаючыся за сыноў Аляксандра, Антона і Дамініка. У завяшчанні брата Самуіла Лявонавіча названы старадубаўскім чашнікам, прызначаны апекуном над маёнткам Грывец з сялянамі да паўналецця пляменніка Сцяпана[10]. Пакінуў 13.01.1761 г. тастамент (актыкацыя 10.03.1781 г. у Навагрудскім земскім судзе), у якім завяшчаў пахаваць сябе пры касцёле францысканцаў у Навагрудку, на памінальную службу вызначыў 200 злотых, чатыром сынам і дзвюм дочкам пакінуў рухомую маёмасць з маёнтка Жыжма, а таксама даўгавыя дакументы (аблігі) на розныя сумы грошай, дочкам – па 3000 злотых. Слугам Антонію Таўрысу і Міхалу Шарамею даў вольную[11].

Жонка – **Канстанцыя Касынская.**

8/3 **Іосіф.** Валодаў часткай спадчыннага па дзеду Івану Васільевічу і бацьку Лявону фальварка Альжэў Даўлядоўскі з сялянамі ў Лідскім павеце, якую заклаў брату Фёдару, а пасля перадаў яму ўсе правы на валоданне.

9/3 **Юрый,** стольнік Бельскай зямлі. 10.03.1726 г. паводле «изрекательного» дакумента разам з братамі Іванам, Міхаілам і Самуілам прыналежныя ім ад бацькі часткі маёнтка Пурневічы з сялянамі ў Навагрудскім ваяводстве пераўступіў роднаму брату Івану-Непамуцэну[12]. Быў прыхаджанінам Бабовенскага касцёла. Пакінуў тастамент ад 02.09.1758 г. (актыкацыя 09.12.1758 г. у

168/55 **Антаніна,** *1818 г. н. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета ад 05.09.1832 г., жыла ў акаліцы Усохі на зямлі бацькі[216].

169/55 **Антоній.**

170/55 **Ануфрый,** нарадзіўся 27.11.1827 г. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета ад 05.09.1832 г., жыў у акаліцы Усохі на зямлі бацькі[217].

171/55 **Ігнацій,** нарадзіўся 03.08.1819 г. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета ад 05.09.1832 г., жыў у акаліцы Усохі на зямлі бацькі[218].

172/56 **Мікалай,** нарадзіўся 13.09.1814 г. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета ад 05.09.1832 г., жыў у акаліцы Усохі на зямлі бацькі[219].

173/56 **Ігнацій,** нарадзіўся 30.06.1817 г. Па сямейных спісах дваран Ігуменскага павета ад 05.09.1832 г., жыў у акаліцы Усохі на зямлі бацькі[220], 1893 г. – у засценку Завішын Пагарэльскай воласці, зямлі не меў[221].

Жонка – Кацярына Васільеўна.

174/56 **Станіслаў,** нарадзіўся 20.05.1820 г. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета ад 05.09.1832 г., жыў у аколіцы Усохі на зямлі бацькі[222].

175/57 **Адам-Іосіф,** нарадзіўся 19.12.1811 г. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыў у вёсцы Рэпішча Пухавіцкай воласці, зямлі не меў[223].

Жонка – Уршуля Антонаўна, *1823 г. н.

176/58 **Фларыян,** *1827 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у аколіцы Вінкаў на зямлі бацькі[224].

177/58 **Ігнацій,** *1830 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у аколіцы Вінкаў на зямлі бацькі[225].

178/60 **Сільвестр,** нарадзіўся 24.02.1824 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у аколіцы Вінкаў на зямлі бацькі[226]. У 1886 г. разам з сынам Іванам жыў у фальварку Усцерхі Бабруйскага павета.

Жонка – Іаанна (Югася) Маркава.

179/60 **Гілярый,** нарадзіўся 18.07.1826 г. Праваслаўны. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у аколіцы Вінкаў на зямлі бацькі[227], па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г. – у вёсцы Белічаны, меў 80 дзесяцін зямлі[228].

Жонка – Паўліна Іосіфаўна, *1848 г. н. У першым шлюбе жонка Іосіфа Татура. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыла ў вёсцы Белічаны[229].

180/60 **Іосіф,** нарадзіўся 03.06.1835 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у аколіцы Вінкаў на зямлі бацькі[230]. Памёр да 1888 г.

Жонка – Паўліна Іосіфаўна, *1848 г. н., пасля смерці Іосіфа Татура выйшла замуж за яго роднага брата Гілярыя.

181/61 **Банавентура,** нарадзіўся 20.02.1832 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у аколіцы Вінкаў на зямлі бацькі[231].

182/61 **Антаніна,** *1825 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў аколіцы Вінкаў на зямлі бацькі[232].

183/61 **Іазэфа,** *1830 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў аколіцы Вінкаў на зямлі бацькі[233].

184/61 **Эдмунд,** *1835 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у аколіцы Вінкаў на зямлі бацькі[234].

185/62 **Іосіф.**

186/63 **Адам,** нарадзіўся 13.11.1844 г. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыў у засценку Барок Пухавіцкай воласці на ўласнай зямлі (100 дзесяцін)[235].

Жонка – Юлія, *1855 г. н.

187/63 **Баляслаў,** нарадзіўся 13.01.1847 г., ахрышчаны 19.01.1847 г. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыў у засценку Барок Пухавіцкай воласці на ўласнай зямлі (100 дзесяцін)[236].

Жонка – Амілія, *1860 г. н.

188/63 **Эдвард,** нарадзіўся 18.05.1858 г., ахрышчаны 22.05.1858 г. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыў у засценку Барок Пухавіцкай воласці на ўласнай зямлі (100 дзесяцін)[237].

Жонка – Ядвіга, *1866 г. н.

189/65 **Вікторыя-Гелена.**

190/65 **Дыянізій-Міхаіл,** ахрышчаны 05.01.1833 г. у Старожыцкім касцёле.

191/65 **Аляксандр,** ахрышчаны 30.08.1830 г. «вадою», а 05.11.1833 г. – «алеем» у Старожыцкім касцёле.

192/66 **Карл,** ахрышчаны 05.03.1829 г. ксяндзом Сымонам Незяловічам у Грозаўскім

касцёле. Хросныя бацькі – Міхаіл Іодка і Францішка Андрусевіч[238]. Атрымаў хатнюю адукацыю. Зацверджаны ў дваранстве ўказам Сената ад 19.10.1849 г. Звярнуўся ў 1869 г. з прашэннем у Мінскі дваранскі дэпутацкі сход аб далучэнні да дваранскага роду Татураў яго сыноў-блізнят Станіслава і Франца[239]. Месца жыхарства ў 1878 г. – урочышча Бярозаўшчына Слуцкага павета на ўласнай зямлі, у 1893 г. – на хутары [Калубіна] Ігуменскага павета на арэнднай зямлі. Пазначаны ў сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г.[240]

Жонка – Соф'я Васільеўна Каліцкая, дачка Васіля і Ганны Чыгіраўны Каліцкіх. Шлюб 27.01.1863 г. у Грозаўскім касцёле. Ксёндз – Уладзіслаў Пяткевіч. Сведкі – памешчык Рамуальд Шпакоўскі, Антоній Пякарскі і Канстанцін Асіповіч[241].

193/66 **Валенцій,** нарадзіўся 28.10.1838 г., ахрышчаны 30.10.1838 г. ксяндзом Міхаілам Маўчановічам у Грозаўскім касцёле. Хросныя бацькі – Іван Забэла і Францішка Андрушэвічава з засценка Хвойнікі[242]. Далучаны да роду вызначэннямі Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 20.10.1865 г. і 23.03.1874 г. Зацверджаны ўказам Сената ад 01.11.1877 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у фальварку Бярозаўшчына Пукаўскай воласці Ігуменскага павета на ўласнай зямлі (26 дзесяцін)[243].

194/66 **Ісідор,** ахрышчаны 11.04.1826 г. ксяндзом Валенціем Манкевічам у Грозаўскім касцёле. Хросныя бацькі – Міхаіл Іодка і Францішка Татурава з засценка Хвойнікі[244]. 19.12.1855 г. звярнуўся ў Слуцкі земскі суд з прашэннем аб вяртанні зямлі, страчанай у выніку ўсталявання межавых знакаў участка зямлі Пярцоўшчызна ў Слуцкім павеце землямерам памешчыка Ф. Іодкі. Зацверджаны ў дваранстве ўказам Сената ад 19.10.1849 г. Халасты.

195/66 **Антон,** ахрышчаны 06.02.1821 г. ксяндзом Марцінам Стазюневічам у Грозаўскім касцёле. Хросныя бацькі – Васіль Сцяпура і Францішка Беразневічава з Бярозаўшчызны[245]. Зацверджаны ў дваранстве ўказам Сената ад 19.10.1849 г.

Жонка – Багуміла Матусевіч.

196/66 **Сцяпан,** нарадзіўся 20.01.1819 г., ахрышчаны 16.05.1819 г. святаром Адамам Пякарскім у Навасадскай уніяцкай царкве. Хросныя бацькі – Лявон Сасноўскі і Ганна Тымінская[246]. Жыў у 1858 г. у вёсцы Бабічы Слуцкага павета. У 1864 г. пазначаны сярод аднадворцаў 4-га Касыніцкага ўчастка Слуцкага павета. Вызначэннямі Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 18.02.1864 г. і 16.06.1867 г. далучаны да дваранскага роду Татураў. У 1878 г. жыў у сяле Чаплічы Слуцкага павета.

Жонкі: 1. Саламія Францава Лагвіновіч, каталіцкага веравызнання. Далучана да роду вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 16.06.1867 г.; 2. Суклюта Іванава.

197/66 **Марцыяна,** ахрышчана 02.01.1809 г. ксяндзом Іаанам Пабрэзам у Бабовенскім касцёле. Хросныя бацькі – Іаан Высоцкі і Рэгіна Семацелава[247].

198/66 **Канстанцін,** нарадзіўся 09.02.1841 г. Далучаны да роду вызначэннямі Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 20.10.1865 г. і 23.03.1874 г. Зацверджаны ўказам Сената ад 01.11.1877 г.

Жонка – Кацярына Пузіноўская.

199/66 **Анэля.**

200/66 **Хрызастом,** нарадзіўся 14.03.1835 г., ахрышчаны 17.03.1835 г.

ксяндзом Сымонам Несяловічам у Гродзаўскім касцёле. Хросныя бацькі – Іван Забэла і Францішка Андрушэвічава з засценка Хвойнікі[248].

201/68 **Іосіф,** *1860 г. н. Па рэвізскай сказцы ад 31.12.1864 г., пазначаны сярод аднадворцаў Чарнагубаўскага ўчастка Слуцкага павета.

202/68 **Аляксандр,** *1863 г. н. Па рэвізскай сказцы ад 31.12.1864 г., пазначаны сярод аднадворцаў Чарнагубаўскага ўчастка Слуцкага павета.

203/68 **Кацярына,** *1846 г. н. Па рэвізскай сказцы ад 31.12.1864 г. пазначана сярод аднадворцаў Чарнагубаўскага ўчастка Слуцкага павета.

204/68 **Марыя,** *1859 г. н. Па рэвізскай сказцы ад 31.12.1864 г. пазначана сярод аднадворцаў Чарнагубаўскага ўчастка Слуцкага павета.

205/75 **Казімір,** нарадзіўся 05.11.1836 г. У 1882–1895 гг. жыў у засценку Затур'е Гавязнянскай воласці на чыншавай зямлі, быў прыхаджанінам Нясвіжскага касцёла.

Жонкі: 1.(?) Юлія Сацкевіч-Статкевіч, ад яе сын Іосіф; 2. Ганна Адольфаўна Давідоўская, 1863 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыла ў засценку Затур'е Гавязнянскай воласці на чыншавай зямлі[249], ад яе сыны Вячаслаў і Вікенцій.

206/75 **Франц.** Жонка – Іазэфа Іосіфаўна Галавень.

207/75 **Людвіг.** У 1889 г. разам з сынамі Вікенціем і Канстанцінам жыў у вёсцы Пахабаўшчына.

Жонка – Анэля Астрэйка.

208/75 **Антон,** *1822 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Ліпніцкія[250].

209/75 **Людвіка,** *1830 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў засценку Ліпніцкія[251].

210/75 **Францішка,** *1833 г. н. Па сямейных спісах дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў засценку Ліпніцкія[252], 1893 г. – у засценку Затур'е Гавязнянскай воласці на чыншавай зямлі.

211/76 **Анэля,** *1819 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў засценку Ліпніцкія[253].

212/76 **Юстына,** *1822 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў засценку Ліпніцкія[254].

213/77 **Іосіф,** *1825 г. н. Непісьменны. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Ліпніцкія[255], у 1889–1893 гг. разам з сынам Станіславам жыў у засценку Слаўкава Гавязнянскай воласці на чыншавай зямлі.

214/77 **Іван,** *1831 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Ліпніцкія[256].

215/77 **Людвіка,** *1822 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў засценку Ліпніцкія[257].

216/77 **Ева,** *1827 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў засценку Ліпніцкія[258].

217/78 **Тамаш (Фама),** нарадзіўся 14.12.1827 г. Па сямейных спісах дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Ліпніцкія,[259] 1893 г. – у фальварку Гансаўшчызна Гавязнянскай воласці, зямлі не меў[260].

Жонка – Ядвіга Матусевіч, *1843 г. н.

218/78 **Казімір,** *1825 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Ліпніцкія[261].

219/78 **Антаніна,** *1830 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў засценку Ліпніцкія[262].

220/82 **Стэфан,** нарадзіўся 23.12.1783 г. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 02.03.1802 г. прызнаны ў дваранстве з унясеннем у 1-ю частку радаводнай кнігі дваран Мінскай губерні[263].

221/82 **Адам.** Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 02.03.1802 г. прызнаны ў дваранстве з унясеннем у 1-ю частку радаводнай кнігі дваран Мінскай губерні[264].

222/82 **Павел,** ахрышчаны 26.06.1796 г.

223/83 **Ігнацій,** нарадзіўся 16.08.1827 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Затур'е на зямлі князя Радзівіла[265].

224/83 **Фабіян,** нарадзіўся 19.01.1810 г., ахрышчаны 20.01.1810 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Затур'е на зямлі князя Радзівіла[266].

Жонка – Іазефата Гардзевіч.

225/83 **Іван,** нарадзіўся 12.12.1820 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Затур'е на зямлі князя Радзівіла[267].

226/83 **Караліна,** *1807 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў засценку Затур'е на зямлі князя Радзівіла[268].

227/83 **Феліцыяна,** *1820 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў засценку Затур'е на зямлі князя Радзівіла[269].

228/84 **Адам,** *1802 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Затур'е на зямлі князя Радзівіла[270].

Жонка – Антаніна Главінская, *1807 г. н.

229/84 **Франц,** ахрышчаны 10.02.1797 г. у Нясвіжскім касцёле. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 02.03.1802 г. прызнаны ў дваранстве з унясеннем у 1-ю частку радаводнай кнігі дваран Мінскай губерні[271].

230/85 **Франц,** *1819 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Затур'е на зямлі князя Радзівіла[272].

231/85 **Анастасія,** *1821 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў засценку Затур'е на зямлі князя Радзівіла[273].

232/87 **Ядвіга,** *1830 г. н. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета ад 08.12.1832 г., жыла ў сяле Лявонавічы на зямлі дзеда[274].

233/87 **Іна,** *1831 г. н. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета ад 08.12.1832 г., жыла ў сяле Лявонавічы на зямлі дзеда[275].

234/90 **Канстанцін,** *1826 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Шаловічы Раманаўскай воласці на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[276].

235/90 **Тэадор,** *1833 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Шаловічы Раманаўскай воласці на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[277].

236/90 **Мар'яна,** *1828 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў засценку Шаловічы Раманаўскай воласці на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[278].

237/90 **Ганна,** *1831 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў засценку Шаловічы Раманаўскай воласці на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[279].

238/90 **Іван,** *1820 г. н. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыў у аколіцы Пратасаўшчына, меў 80 дзесяцін зямлі[280].

Жонка – Вікторыя Ільінічна, *1838 г. н.

239/90 **Франц,** *1832 г. н. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыў у аколіцы Пратасаўшчына, меў 80 дзесяцін зямлі[281].

Жонка – Антаніна, *1838 г. н.

VIII КАЛЕНА

240/96 **Антон,** ахрышчаны 07.03.1832 г. у Слуцкім касцёле.

241/96 **Фадзей,** ахрышчаны 02.11.1819 г. у Слуцкім касцёле.

242/98 **Іван-Валянцін,** ахрышчаны 14.03.1831 г. у Нясвіжскім касцёле. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Качановічы Нясвіжскай ардынацыі на арэнднай зямлі[282].

243/98 **Міхаліна,** *1834 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў засценку Качановічы Нясвіжскай ардынацыі на арэнднай зямлі[283].

244/99 **Іван,** нарадзіўся 22.10.1829 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Балотчыцы на зямлі князя Вітгенштэйна[284].

245/99 **Антон,** *1827 (1825) г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Балотчыцы на зямлі князя Вітгенштэйна[285].

Жонкі: 1. N; 2. Варвара, 25 гадоў, дачка Дамініка і Ганны, народжанай Бялькевіч, Умінскіх. Шлюб 05.02.1861 г. у Слуцкім касцёле.

246/99 **Марцін,** ахрышчаны 03.11.1821 г. у Слуцкім касцёле. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Балотчыцы на зямлі князя Вітгенштэйна[286].

247/99 **Валерыя,** *1819 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў засценку Балотчыцы на зямлі князя Вітгенштэйна[287].

248/99 **Паўліна,** *1823 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў засценку Балотчыцы на зямлі князя Вітгенштэйна[288].

249/100 **Іосіф.**

250/101 **Генрых-Франц,** нарадзіўся 17.09.1846 г. Каталіцкага веравызнання. Далучаны да роду вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 14.11.1853 г. Зацверджаны ўказам Сената ад 01.06.1854 г. Скончыў Мінскую (? Лідскую) гімназію. Па духоўным завяшчанні стацкай саветніцы А. Мезенцавай ад 09.04.1866 г. павінен быў атрымаць у спадчыну маёнтак Крушыны Ігуменскага павета, але атрымаў адмову на падставе загада ад 10.12.1865 г. з прычыны каталіцкага веравызнання. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыў у мястэчку Бярэзіна, зямлі не меў[289].

«...Беларускі археолаг, гісторык, краязнавец, калекцыянер. Член Мінскага статыстычнага камітэта, павятовы маршалак дваранства. З 1874 вёў археалагічныя раскопкі ў Мінскай губерні, склаў яе археалагічную карту з апісаннем помнікаў. У 1884–1885 заснаваў часовы археалагічны музей у Беразіно, дзе ў наваколлі вёў раскопкі... Толькі ў 1890 ён раскапаў 120 курганоў каля в. Дулебаў і Няюнішчаў Ігуменскага павета, у 1892 – 40 курганоў каля Станькава, у 1893 – 40 курганоў каля в. Прылукі Мінскага павета. У выніку паездак па Міншчыне падрыхтаваў вялікі альбом археалагічных помнікаў (1893). Стварыў у Мінску багаты прыватны музей па гісторыі матэрыяльнай культуры Беларусі і ўнікальную бібліятэку (калекцыі рукапіснай і старадрукаванай кнігі, у тым ліку “Біблія” Ф. Скарыны, беларускага жывапісу). Выказваўся за стварэнне агульнанацыянальнага музея ў Мінску. Пасля смерці яго зборы былі прададзены, многія вывезены за мяжу. Аўтар прац “Археалагічнае значэнне Мінскай губерні” (1878) і “Нарыс археалагічных помнікаў на прасторы Мінскай губерні і яе археалагічнае значэнне” (1892). ...У рукапісах засталіся “Гістарычны нарыс мястэчка Турава, ранейшай сталіцы ўдзельнага Тураўскага княства”, “Гісторыя Станькава”, “Гісторыя Заслаўя”; праект

адкрыцця публічнай бібліятэкі ў Мінску і іншыя (зберагаюцца ў Дзяржаўным гістарычным архіве Літвы)».

Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 6, кн. 1. – Мінск, 2001.

У Літоўскім дзяржаўным гістарычным архіве (*LVIA, ф. 716, воп. 4, № 221*) захоўваецца ліст да Генрыха Татура ад яго маці А. Татуравай, напісаны на польскай мове 03.03.1884 г. З ліста вынікае, што ў Слоніме памёр яго дзядзька – ксёндз, сястра Ганна вучыцца ў жаночым пансіянаце ў Варшаве. Прапануецца магчымы варыянт жаніцьбы Генрыха, выказваецца пажаданне маці быць пахаванай побач з магілай мужа. Згадваюцца таксама Мангуся і Бася (магчыма, сёстры Генрыха). Жыла А. Татурава ў доме Касінскіх у Слоніме.

На агульным сходзе Расійскай акадэміі навук акадэмік А. А. Шахматаў 07.04.1907 г. паведаміў: «...недавно в Минске скончался известный собиратель Татур. После него осталось обширное собрание древностей и библиотека...» (*Пратакол Агульнага сходу № 118 ад 07.04.1907 г.*).

Дакументы, якія захоўваюцца ў бібліятэцы Акадэміі навук Літвы, адлюстроўваюць фінансавыя абавязацельствы Г. Татура (*LMAB, ф. 29–88*).

Генрых Татур падтрымліваў адносіны з уладальнікам маёнтка Станькава графам Эмерыкам Чапскім і князем Антоніем Радзівілам. З перапіскі відаць, што важнымі былі тэмы гісторыі, археалогіі, пытанні набыцця рэдкіх кніг і іншых антыкварных рарытэтаў (*LVIA, ф. 716, 4, 98–105*). Надпісы на канвертах засведчылі адрасы, дзе бываў і жыў Г. Татур: «Въ Слоним – По Моск. Брест. Ж.Д. Въ С. Петербургъ, Мойка № дом. 30, Квартира № 3» (1879), «Минская губ., им. Крушины 3-го Стана», «На почтовую станцию Березина Минской губ. Игуменского уезда с передачей в имение Крушина». У 1890 г.: Мінск, «ул. Торговая, 8», «Торговая, 6» (1899), «Торговая, дом Фурса», «Торговая, дом Гурвича, д. 6», «Торговая, д. 5».

У 1907 г. калекцыі Г. Татура размяшчаліся ў двух драўляных дамах, якія яму належалі (Лагойскі завулак, 8).

250а/101 **Ганна.**

250б/101 **Мангуся.**

250в/101 **Бася.**

251/101 **Іосіф,** нарадзіўся 19.03.1855 г., ахрышчаны 28.04.1855 г. у Бярэзінскім касцёле[290]. Далучаны да роду вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад (?).01.1862 г.

252/102 **Іосіф,** *1879 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у вёсцы Кацельнікі на зямлі бацькі (30 дзесяцін)[291].

253/102 **Гелена,** *1878 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыла ў вёсцы Кацельнікі на зямлі бацькі[292].

254/102 **Аляксандра,** *1881 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыла ў вёсцы Кацельнікі на зямлі бацькі[293].


255/102 **Марыя,** *1884 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыла ў вёсцы Кацельнікі на зямлі бацькі[294].

256/103 **Тэафіля,** *1829 г. н. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета ад 06.10.1832 г., жыла ў засценку Татуры на зямлі княгіні Стэфаніі Радзівіл[295].


257/107 **Іван,** *1835 г. н. Каталік. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыў у вёсцы Забалоцце[296].


258/107 **Аўгусцін,** *1835 г. н. Каталік. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыў у вёсцы Яўсевічы, меў 51 дзесяціну зямлі[297].

Жонка – А н т а н і н а А д а м а ў н а, *1858 г. н.




Вызначэнне Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 14.11.1853 г. аб далучэнні да дваранскага роду Татураў Генрыха-Франца Хрызастомава Татура (на 4 старонках; гл. «Татуры» 250/101). *НГАБ, ф. 319, воп. 1, спр. 383, арк. 883–884 адв.*





Сямейны спіс дваран Ігуменскага павета 1888 г., дзе пад № 951 пазначана, што 17.09.1846 г. нарадзіўся Генрых Хрыстафоравіч Татур (на 2 старонках; гл. «Татуры» 250/101). *НГАБ, ф. 319, воп. 1, спр. 621, арк. 380 адв. – 381.*

ЖЕНСКІЙ ПОЛЪ



ЦѢНА 40 КОП. СЕРЕБРОМЪ


ВСЕПРЕСВѢТЛѢЙШІЙ, ДЕРЖАВНѢЙШІЙ

ВЕЛИКІЙ ГОСУДАРЬ ИМПЕРАТОРЪ

АЛЕКСАНДРЪ НИКОЛАЕВИЧЪ,

САМОДЕРЖЕЦЪ ВСЕРОССІЙСКІЙ, ГОСУДАРЬ ВСЕМИЛОСТИВѢЙШІЙ!


Справа канцылярыі Мінскага губернатара за 1879 г. па прашэнні двараніна Ігуменскага павета Генрыха Хрыстафоравіча Татура аб уступленні ў права валодання завешчаным яму маёнткам Крушыны Ігуменскага павета (на 15 старонках). *НГАБ, ф. 147, воп. 3, спр. 15392, арк. 1–8.*


ЦѢНА 40 КОП.
СЕРЕБРОМЪ

Мелещевая вторую ея мужа не принимать,
первую же принять къ мужу, не въ надписи
не завещан, въ предупрежденіи можетъ и
лицо, какимъ оно можетъ быть представлено
къ исполненію, полагаетъ, что переходъ Дворя-
нину Осипу Татуру недвижимаго имѣнія
Крушинки въ собственность, какъ лицу Римско-
Католическаго исповѣданія, допущенъ быть
не можетъ. Опредѣленіе это Минской Со-
единенной Палаты Уголовнаго и Гражданска-
го Суда было обжаловано Правительствую-
щему Сенату, который постановленіемъ
своимъ отъ 24 Августа 1870 г. призналъ озна-
ченное опредѣленіе Палаты правильнымъ,
а затѣмъ оно вошло въ законную силу.

5, прочтено

Послѣ сего, вдова Коллежскаго Секретаря
Мелещева съ дѣтьми отъ перваго брака ея
Анною и Надеждою Богушевичами въ 1869 г.
обратилась въ Игуменскій Уѣздный Судъ
съ просьбою объ утвержденіи ихъ въ пра-
вахъ наслѣдства къ имуществу, оставше-
муся послѣ смерти Мелещевой, вмѣстѣ
съ тѣмъ, ходатайствовала и о томъ, чтобы не-
движимое имѣніе покойной Мелещевой,
впредь до разграниченія наслѣдственнаго
ихъ права было взято въ опеку. Въ просьбѣ
Мелещевой съ дѣтьми ея Игуменскимъ
Уѣзднымъ Судомъ было отказано: въ от-
ношеніи утвержденія ихъ въ правахъ
наслѣдства за пропускомъ 6-ти мѣсячнаго


ЦѢНА 40 КОП.
СЕРЕБРОМЪ

быть только лицо, которое [illegible]
[illegible] права его на таковое наследство, —
а таковымъ лицомъ является исключи-
тельно Отставной Генералъ Александро-
вичъ Татуръ, который, въ силу завещания
покойной Мерещевой, является претен-
дентомъ на оставшееся после нее на-
следство. Вдовы

5)

Изъ представленныхъ при семъ докумен-
товъ видно, что [illegible] являют-
ся [illegible] по закону наследниками
покойной Мерещевой: ея [illegible], [illegible]
какъ [illegible] [illegible] сына Мерещевой
отъ 1го брака, Людвига (въ православии [illegible]
[illegible]) Богдановича, а [illegible] и Ва-
димъ Богдановичи — какъ родные внуки
наследодательницы. Въ силу этого род-
ства, ст. 1120, 1127, 3го [illegible] Х т. 1ч., а равно то-
го обстоятельства, что по указу 10 Де-
кабря 1865 г., [illegible] [illegible] [illegible]
быть [illegible] [illegible] лицу
Татуру, лицу [illegible] [illegible],
[illegible] [illegible] [illegible] [illegible]
по праву законнаго наследования, какъ
[illegible] [illegible] покойной Мереще-
вой, такъ и все [illegible] ея въ ча-
стяхъ, определенныхъ законами въ ст.
1128, 1130, 1148 и 1149 Х т. 1ч. Коммерсковъ

6)


Такъ какъ [illegible] [illegible]


9

4

недвижимаго имущества покойной Менцевой къ Генриху Татуру сполна подлежитъ по значенію, то остановившаяся повѣркѣ по этому предмету, с [illegible]; не считаю необходимымъ войти въ соображеніе по вопросу о наслѣдственныхъ правахъ самихъ дарителей на движимое имущество покойной Менцевой. Движимое имущество состояло [illegible]. Движимость въ имѣніи Крушины, находившаяся въ охранительной описи Временнаго Отдѣленія Игуменскаго Полицейскаго Управленія и выкупныя ссуды за имѣніе Крушины, распоряженіемъ Главнаго Выкупнаго Учрежденія и хранящіяся по распоряженію Минскаго Губернскаго по крестьянскимъ дѣламъ Присутствія въ сохранномъ количествѣ. Всѣ эти движимости, безъ исключенія, должно перейти по наслѣдству къ самимъ дарителямъ исключительно и безъ всякаго участія въ ней Генриха Татура. Для дарительства [illegible] свободно обратиться къ частному [illegible] Духовнаго завѣщанія покойной Менцевой, опредѣляющаго [illegible] волю завѣщательницы [illegible], утвердившаго права самихъ дарителей. Что касается выкупной ссуды за имѣніе Крушины, то хотя [illegible]

[illegible]





ЦѢНА 40 КОП.
СЕРЕБРОМЪ

259/107 **Сцяпан,** *1838 г. н. Праваслаўны. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., разам з братам Аўгусцінам жыў у вёсцы Яўсевічы[298].

260/107 **Аляксандр,** *1839 г. н. Праваслаўны. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., разам з братам Іванам жыў у вёсцы Забалоцце[299].

Жонка – Аляксандра Рамуальдаўна, *1858 г. н.

261/109 **Аляксандр.** Памёр да 1888 г.

Жонка – Алімпія Францаўна Крампульц, *1838 г. н. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыла ў засценку Татуры на ўласнай зямлі (50 дзесяцін)[300].

262/109 **Рамуальд-Казімір,** *1853 г. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыў у засценку Татуры на ўласнай зямлі (88 дзесяцін)[301].

263/109 **Іосіф-Уладзіслаў,** *1855 г. н. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыў у засценку Татуры[302].

264/109 **Уладзіслаў,** *1863 г. н. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыў у засценку Татуры[303].

265/109 **Вячаслаў,** *1866 г. н. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыў у засценку Татуры[304].

266/109 **Аляксандра,** *1860 г. н. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыла ў засценку Татуры[305].

267/109 **Стэфанія,** *1862 г. н. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыла ў засценку Татуры[306].

268/109 **Эмілія,** *1870 г. н. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыла ў засценку Татуры[307].

269/109 **Алена,** *1873 г. н. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыла ў засценку Татуры[308].

270/110 **Феафілакт,** нарадзіўся 02.03.1861 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Церабохава Вызнянскай воласці на арэнднай зямлі[309].

Жонка – Марыя Сямёнаўна, народжаная Татур, *1865 г. н.

271/112 **Мікалай,** *1860 г. н. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыў у засценку Глінкі[310].

272/112 **Феафіла,** *1864 г. н. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыла ў засценку Глінкі[311].

273/115 **Іосіф,** нарадзіўся 23.05.1840 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у вёсцы Шацкая Ліпка (за 5 вёрстаў ад г. Нясвіжа) на чыншавай зямлі княгіні Гагенлоэ[312].

Жонкі: 1. Іазэфа Ліпніцкая, ад яе сыны Вікенцій, Валяр'ян, Анастасій, Антон, Серафін, Казімір; 2. Феафіла Іванаўна Секяржыцкая, *1853 г. н., ад яе дзеці Іван, Франц, Канстанцін і Анэля.

274/115 **Антон,** нарадзіўся 06(27).12.1846 г. Пісьменны. У 1893–1899 гг. жыў на хутары Маркачы Клецкай воласці Слуцкага павета на арэнднай зямлі, у 1902 г. – у засценку Усокі, быў прыхаджанінам Капыльскага касцёла.

Жонка – Валерыя Іванаўна, народжаная Татур, *1858 г. н.

275/115 **Іван,** нарадзіўся 10.02.1856 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў на хутары Маркачы Клецкай воласці на арэнднай зямлі[313].

276/117 **Франц,** *1861 г. н. У 1883–1913 гг. жыў у засценку Слаўкава Гавязнянскай воласці на чыншавай зямлі, быў прыхаджанінам Нясвіжскага касцёла.

Жонка – Міхаліна Францаўна Пяткевіч, *1864 г. н.

277/117 **Дамінік,** нарадзіўся 07.07.1866 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Сейлавічы Гавязнянскай воласці[314].

278/117 **Міхаіл,** нарадзіўся 27.12.1871 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Сейлавічы Гавязнянскай воласці[315].

279/117 **Іосіф,** нарадзіўся 13.02.1875 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Сейлавічы Гавязнянскай воласці[316].

280/117 **Антон,** нарадзіўся 20.01.1880 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Сейлавічы Гавязнянскай воласці[317].

281/117 **Магдалена,** *1872 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета1893 г., жыла ў засценку Сейлавічы Гавязнянскай воласці[318].

282/120 **Антон,** нарадзіўся 26.01.1845 г. Каталік. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Суднікі Гавязнянскай воласці на чыншавай зямлі[319].

Жонка – Міхаліна Фамінічна Петрашэўская, *1848 г. н.

283/121 **Ізабэла,** *1833 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў засценку Галяўшчызна Нясвіжскай ардынацыі на арэнднай зямлі[320].

284/125 **Міхаіл,** нарадзіўся 08.12.1852 г. Каталік. Па сямейным спісе дваран 2-га разраду Слуцкага павета 1867 г., жыў у засценку Язвіны[321], у 1882–1886 гг. – у сяле Заўшыцы, у 1893–1898 гг. – у сяле Старчыцы Вызнянскай воласці на зямлі памешчыка Прушынскага.

Жонка – Марыя Іванаўна Лагвіновіч, *1859 г. н. Праваслаўная.

285/125 **Сымон,** *1848 г. н. Па сямейным спісе дваран 2-га разраду Слуцкага павета 1867 г., жыў у засценку Язвіны[322].

286/125 **Антоній,** нарадзіўся 05.12.1849 г. Каталік. Пісьменны. Па сямейных спісах дваран 2-га разраду Слуцкага павета 1867 г., жыў у засценку Язвіны[323], 1893 г. – у засценку Заўшыцы Старобінскай воласці на арэнднай зямлі памешчыка Прушынскага[324].

Жонкі: 1. Карнелія Адамаўна Гардзяевіч, ад яе дзеці Адам, Іван і Францішка; 2. Караліна Зянонаўна Амбражэвіч, *1854 г. н., ад яе дзеці Атон і Багумілія.

287/125 **Каятан,** нарадзіўся 09.08.1856 г. Непісьменны. Па сямейных спісах дваран 2-га разраду Слуцкага павета 1867 г., жыў у засценку Язвіны[325], 1893 г. – у засценку Асмолава на арэнднай зямлі[326].

Жонка – Мар'я Іванаўна, народжаная Татур, 1863 г. н.

288/125 **Антаніна,** *1849 г. н. Па сямейным спісе дваран 2-га разраду Слуцкага павета 1867 г., жыла ў засценку Язвіны[327].

289/125 **Сафія,** *1861 г. н. Па сямейным спісе дваран 2-га разраду Слуцкага павета 1867 г., жыла ў засценку Язвіны[328].

290/126 **Антон,** нарадзіўся 24.06.1847 г. Праваслаўны. Пісьменны. Па сямейных спісах дваран 2-га разраду Слуцкага павета 1867 г. і 1893 г., жыў у вёсцы Жываглодавічы Вызнянскай воласці на арэнднай зямлі[329].

Жонка – Марыя Сцяпанаўна Слюковіч, *1853 г. н.

291/126 **Юліян,** нарадзіўся 07.01.1834 г. Па сямейных спісах дваран 2-га разраду Слуцкага павета 1867 г. і 1893 г., жыў у вёсцы Жываглодавічы Вызнянскай воласці на арэнднай зямлі.

Жонкі: 1. Стэфанія Васільеўна Акуліч, *1842 г. н.; 2. Паўліна Грыгор'еўна Умінская, *1853 г. н.

292/126 **Сафія,** *1834 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., разам з бацькамі

жыла ў засценку Пахабаўшчына на арэнднай зямлі Нясвіжскай ардынацыі.

293/129 **Іван.** Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Пахабаўшчына на арэнднай зямлі Нясвіжскай ардынацыі.

294/130 **Адольф,** нарадзіўся 11.02.1836 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у г. Нясвіжы на ўласнай зямлі[330].

Жонка – Саламея Геранімаўна Невяроўская, *1848 г. н.

295/131 **Віктар.**

296/131 **Аляксандр-Франц.**

297/131 **Пётр-Мікалай.**

298/137 **Баляслаў,** нарадзіўся ў засценку Рудаўка, ахрышчаны 04.12.1879 г. у Паланецкім касцёле. У 1889 г. жыў у фальварку Галяўшчызна Капыльскага стану. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 20.12.1897 г. далучаны да дваранскага роду Татураў.

299/138 **Восіп,** нарадзіўся 10.06.1870 г., ахрышчаны 14.06.1870 г. у Нясвіжскім касцёле. У 1889–1893 гг. жыў у фальварку Галяўшчызна Капыльскага стану на ўласнай зямлі. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 20.12.1897 г. далучаны да дваранскага роду Татураў.

300/138 **Валенцій,** нарадзіўся 03.06.1864 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў ва ўрочышчы Галяўшчызна на ўласнай зямлі[331].

301/138 **Вікенцій,** нарадзіўся 30.03.1866 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў ва ўрочышчы Галяўшчызна на ўласнай зямлі[332].

302/138 **Філамена,** нарадзілася 23.10.1875 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыла ва ўрочышчы Галяўшчызна на ўласнай зямлі[333].

303/143 **Стэфан,** нарадзіўся 27.12.1859 г., ахрышчаны 28.12.1859 г. у Старчыцкай царкве.

Жонка – Сафія Іванаўна.

304/145 **Пётр.**

305/145 **Васіль.**

306/145 **Іван.** Жонка – Юлія Манцэвіч.

307/145 **Марыяна.**

308/145 **Ганна.**

309/145 **Канстанцыя.**

310/145 **Стэфанія.**

311/146 **Іван (Ян),** ахрышчаны 04.05.1816 г. ксяндзом Якубам Сушчынскім у Блонскім касцёле. Хросныя бацькі – Антоній Быкоўскі і Разалія Асташкевічаўна[334]. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1832 г., жыў з сям'ёй дзядзькі Фамы Мікалаевіча ў аколіцы Рэпішча на яго зямлі[335].

312/146 **Франц,** нарадзіўся 14.06.1818 г. Па сямейных спісах дваран Ігуменскага павета 1832 г.[336] і 1888 г., жыў у вёсцы Рэпішча, зямлі не меў[337].

313/146 **Антон,** ахрышчаны 30.07.1820 г. у Блонскім касцёле. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1832 г., жыў з сям'ёй дзядзькі Фамы Мікалаевіча ў аколіцы Рэпішча на яго зямлі[338]. У 1868 г. жыў у маёнтку Свіслач, быў прыхаджанінам Свіслацкага касцёла.

Жонка – Юлія Гараўская.

314/146 **Юліян,** нарадзіўся 15.07.1823 г., ахрышчаны 17.07.1823 г. ксяндзом Тэадорам Клімантовічам у Свіслацкім касцёле. Хросныя бацькі – Сымон Паўловіч і Сафія Талевічава[339]. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1832 г., жыў з сям'ёй дзядзькі Фамы Мікалаевіча ў аколіцы Рэпішча на яго зямлі[340].

Жонка – Касільда Шпілеўская.

315/146 **Ізабэла,** *1823 г. н. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1832 г., жыла з сям'ёй

дзядзькі Фамы Мікалаевіча ў аколіцы Рэпішча на яго зямлі[341].

316/147 **Яцак,** ахрышчаны 13.09.1831 г. ксяндзом Тэадорам Клімантовічам у Свіслацкім касцёле. Хросныя бацькі – эканом Халуйскага графства* Сымон Журомскі і Уршуля Радзевічава[342]. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1832 г., жыў у аколіцы Рэпішча на зямлі бацькі[343]. Прызнаны ў дваранстве вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 26.10.1834 г. з унясеннем у 1-ю частку радаводнай кнігі дваран Мінскай губерні. Зацверджаны ўказамі Сената ад 18.12.1861 г., № 9913, і ад 19.01.1862 г., № 9846. Падаў прашэнне 25.01.1877 г. у Мінскі дваранскі дэпутацкі сход аб далучэнні да роду сыноў Мікалая, Антона і іншых сваякоў, якія вызначэннем ад 15.09.1880 г. далучаны да роду[344]. У 1877 г. жыў у засценку Прышчэрня Свіслацкага стану Ігуменскага павета. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыў у засценку Застар'е Брадзецкай воласці, зямлі не меў[345].

Жонкі: 1. Ганна Матусевіч, ад яе сыны Мікалай і Антон; 2. Стэфанія Ануфрыеўна, *1840 г. н.

317/147 **Гілярый,** нарадзіўся ў мястэчку Халуй, ахрышчаны 03.05.1834 г. ксяндзом Мацеем Размантовічам у Свіслацкім касцёле. Хросныя бацькі – Феліцыян Смуглоўскі і Уршуля Радзевічава[346]. Зацверджаны ў дваранстве ўказам Сената ад 18.12.1861 г. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыў ва ўрочышчы Застарыны, зямлі не меў[347].

Жонка – Кіпрыяна Адамаўна Шышкоўская, *1831 г. н.

318/147 **Фелікс,** нарадзіўся ў мястэчку Халуй, ахрышчаны 19.11.1836 г. ксяндзом Мацеем Размантовічам у Свіслацкім касцёле. Хросныя бацькі – Феліцыян Смуглоўскі і Уршуля Радзевічава[348]. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 15.03.1852 г. далучаны да дваранскага роду Татураў з унясеннем у 1-ю частку радаводнай кнігі дваран Мінскай губерні. Дваранін Барысаўскага павета. Зацверджаны ў дваранстве ўказам Сената ад 18.12.1861 г., № 9913.

НГАБ, ф. 319, воп. 2, спр. 3181, арк. 476 адв.

Першы сын Фелікса Фаміча Татура Касьма быў «незаконнанароджаным» (прывенчаным).

У 1883 г. падаў прашэнне «Его Императорскому Величеству... о дозволении сыну Феликса Фомина Татура Косьме Феликсову Татуру принять отца фамилию» (*НГАБ, ф. 319, воп. 2, спр. 3181, арк. 479 адв.*). «Именным Высочайшим Указом данным 6 июня 1883 года Правительствующему Сенату Всемилостивейше дозволено сыну его Косьме принять его Татура фамилию и вступить во все права и преимущества на роду и наследию законным детям принадлежащее».

НГАБ, ф. 319, воп. 2, спр. 3181, арк. 475 адв.

Фелікс Фаміч Татур, узяўшы ў жонкі праваслаўную, перайшоў у праваслаўе. У 1875–1878 гг. жыў у маёнтку Скупліна Барысаўскага павета, быў прыхаджанінам Корсакавіцкай Праабражэнскай царквы, у 1882 г. –Дзяніскавіцкай царквы Рагачоўскага павета. Памёр да 1898 г.

Жонка – Ганна Навумава Кавалінская, сялянка Крупавецкай воласці Рэчыцкага павета. (*НГАБ, ф. 319, воп. 2, спр. 3181, арк. 475*), *1850 г. н., праваслаўная. Шлюб 06.06.1875 г. у Корсакавіцкай Праабражэнскай царкве Барысаўскага павета. Сведкі: з боку маладога – дваране сяла Корсакавічы Флор Іларыёнаў Пляшчынскі і Міхаіл Іларыёнаў Пляшчынскі; з боку маладой – памешчык Барысаўскага павета Аляксандр

* Так пазначана ў дакуменце.

Аляксандраў Іодка і грамадзянін з фальварка Скупліна Канстанцін Францаў Пракаповіч. Святар – Іларый Пляшчынскі (*НГАБ, ф. 136, воп. 22, спр. 36, арк. 244 адв. – 245*). Маладая 25 гадоў, малады 39 гадоў, каталік. Абое ў першым шлюбе. Ганна Навумаўна да шлюбу часова жыла ў фальварку Пабярэжжа Барысаўскага павета, была прыхаджанкай Корсакавіцкай Праабражэнскай царквы. 28.08.1898 г. падала прашэнне ў Мінскі дваранскі дэпутацкі сход аб далучэнні да дваранскага роду Татураў дачок Алены і Марыі. Вызначэннем 22.09.1898 г. дочкі былі далучаны да роду[349]. У 1898 г. жыла ў г. Мінску, на рагу Падгорнай і Петрапаўлаўскай вуліц, дом № 31.

319/147 **Філіп.**

320/147 **Мікалай,** ахрышчаны 29.08.1842 г. ксяндзом Е. А. Давейкам у Свіслацкім касцёле. Хросныя бацькі – Іван Рамановіч і Цэцылія Бародзічаўна[350]. Дваранін Ігуменскага павета. У 1888–1898 гг. жыў ва ўрочышчы Застар'е Брадзецкай воласці Ігуменскага павета. Падаў прашэнне 12.07.1898 г. у Мінскі дваранскі дэпутацкі сход аб далучэнні да дваранскага роду Татураў сыноў Іосіфа і Ігнація. Вызначэннем ад 22.09.1898 г. сыны былі далучаны.

Жонка – Міхаліна Восіпаўна Усціновіч, *1841 г. н.

321/147 **Ігнацій,** нарадзіўся ў мястэчку Хойна, ахрышчаны 25.07.1840 г. ксяндзом Мацвеем Размантовічам у касцёле. Хросныя бацькі – Антон Сакалоўскі і Іазэфа Жулткова. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыў у засценку Прыцерпа Пагарэльскай воласці, зямлі не меў[351].

Жонка – Міхаліна Адамаўна, *1840 г. н.

321а/147 **Вікенцій,** нарадзіўся 20.01.1845 г. у мястэчку Халуй Ігуменскага павета, ахрышчаны 20.01.1845 г. у Свіслацкім касцёле Бабруйскага павета, хросныя бацькі – Ян Рамановіч і Цэцылія Пецяржонава.

НГАБ, ф. 937, воп. 4, спр. 19, арк. 72.

321б/147 **Мікалай,** ахрышчаны 02.09.1825 г. ксяндзом Тэадорам Клімантовічам у Свіслацкім касцёле Бабруйскага павета, хросныя бацькі – Іаан Бародзіч і Анэля Бялаўская, асістэнты – Феліцыян Бялаўскі і Агата Івашкевічава.

НГАБ, ф. 937, воп. 4, спр. 18, арк. 35 адв.

322/147 **Брыгіда,** *1821 г. н. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1832 г., жыла ў аколіцы Рэпішча на зямлі бацькі[352].

323/147 **Разалія,** *1829 г. н. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1832 г., жыла ў аколіцы Рэпішча на зямлі бацькі[353].

324/149 **Антон,** нарадзіўся 17.07.1821 г. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1832 г., разам з бацькамі жыў у аколіцы Падкоссе на зямлі бацькі[354].

325/149 **Карл,** нарадзіўся 22.11.1824 г. Па сямейных спісах дваран Ігуменскага павета 1832 г.[355] і 1888 г., жыў у аколіцы Падкоссе Пухавіцкай воласці на ўласнай зямлі (20 дзесяцін)[356]. Падаў прашэнне 26.04.1899 г. у Мінскі дваранскі дэпутацкі сход аб далучэнні да дваранскага роду Татураў сына Антонія. Жыў у 1899 г. у аколіцы Падкоссе Пухавіцкай воласці Ігуменскага павета.

Жонка – Марыяна Сільвестраўна Пржэляскоўская.

326/149 **Дамінік,** нарадзіўся 02.01.1836 г. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыў разам з сям'ёй брата Карла ў аколіцы Падкоссе Пухавіцкай воласці на ўласнай зямлі (20 дзесяцін)[357]. Пазначаны ў «Списках политических преступников, лишенных по суду прав состояния, имущество коих подлежит конфискации в казну» 1864 г. Удзельнік

паўстання 1863 г. У 1864 г. як палітычны злачынца па судзе пазбаўлены правоў стану, маёмасць канфіскавана ў казну. Быў сасланы ў Сібір з пазбаўленнем правоў на жыхарства, з 1865 г. знаходзіўся ў г. Омску.

327/149 **Анэля,** *1819 г. н. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1832 г., разам з бацькамі жыла ў аколіцы Падкоссе на зямлі бацькі[358].

328/149 **Іазэфа,** *1824 г. н. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1832 г., разам з бацькамі жыла ў аколіцы Падкоссе на зямлі бацькі[359].

329/149 **Антаніна,** *1828 г. н. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1832 г., разам з бацькамі жыла ў аколіцы Падкоссе на зямлі бацькі[360].

330/149 **Даміцэля,** *1830 г. н. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1832 г., разам з бацькамі жыла ў аколіцы Падкоссе на зямлі бацькі[361].

331/151 **Феліцыян,** нарадзіўся 22.01.1857 г., ахрышчаны 27.01.1857 г.

332/152 **Іван,** нарадзіўся 01.08.1853 г., ахрышчаны 02.08.1853 г. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыў у аколіцы Падкоссе Пухавіцкай воласці на ўласнай зямлі (11 дзесяцін)[362].

Жонка – Флора Вікенцьеўна, *1853 г. н.

333/155 **Сімпліцыян,** нарадзіўся 02.03.1830 г. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыў у вёсцы Уборкі Пагарэльскай воласці, зямлі не меў[363].

Жонка – Караліна Міхайлаўна, *1838 г. н.

334/155 **Іосіф-Фама,** ахрышчаны 09.10.1832 г. у Блонскім касцёле.

335/156 **Сігізмунд-Франц,** ахрышчаны 05.10.1819 г. ксяндзом Якавам Сушчынскім у Свіслацкім касцёле. Хросныя бацькі – Пётр Аляшкевіч і Разалія Татурава. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыў у вёсцы Суцін на ўласнай зямлі (30 дзесяцін)[364].

Жонка – Тарэса Фамінічна Панятоўская, *1838 г. н.

336/156 **Лявон,** ахрышчаны 17.02.1824 г. ксяндзом Лявонам Талевічам у Свіслацкім касцёле Бабруйскага павета. Хросныя бацькі – Іосіф Мігільніцкі і Ганна Пацовічава, асістэнты – Іосіф Тарнагорскі і Сідалія Панкуцёўна.

НГАБ, ф. 937, воп. 4, спр. 18, арк. 33.

337/156 **Каятан,** нарадзіўся 07.05.1837 г. у засценку Камарын, ахрышчаны 09.05.1837 г. у Свіслацкім касцёле. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыў ва ўрочышчы Лідвядні Грабёнскай воласці, зямлі не меў[365].

Жонка – Міхаліна Антонаўна, *1842 г. н.

337а/156 **Ганарата**, ахрышчана 21.01.1834 г. ксяндзом Тэадорам Клімантовічам у Свіслацкім касцёле Бабруйскага павета. Хросныя бацькі – Адам Паўловіч і Ганна Навадворская.

НГАБ, ф. 937, воп. 4, спр. 19, арк. 38.

338/156 **Вікенцій-Іосіф,** нарадзіўся 12.07.1827 г., ахрышчаны 14.07.1827 г. ксяндзом Мацеем Размантовічам у Свіслацкім касцёле Бабруйскага павета. Хросныя бацькі – Станіслаў Мілашкевіч і дзяўчына Марыяна Сакалоўская. Жыў у аколіцы Суцін Ігуменскага павета Мінскай губерні. Быў сасланы ў Томскую губерню. У «Спісе жыхароў аколіцы Суцін, прызначаных да высялення з тутэйшага краю» 1867 г., складзеным ваенным начальнікам Ігуменскага павета палкоўнікам Сахаравым, запісана: «Дваранін Вікенцій Іванаў Татур, 40 гадоў, жонка Агата, 30, сыны: Марцін, 8, Эдуард, 2, дачка Марцыяна, 4».

Жонка – Агата Панятоўская, *1837 г. н.



Помнік на магіле Марыяны Сільвестраўны Пржэляскоўскай, в. Падкоссе (гл. «Татуры» 325/149).



Помнік на магіле Івана Татура, в. Падкоссе (гл. «Татуры» 332/152).

339/157 **Фама,** *1828 г. н. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1832 г., жыў у аколіцы Суцін на зямлі бацькі[366].

340/157 **Мар'яна,** *1831 г. н. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1832 г., жыла ў аколіцы Суцін на зямлі бацькі[367].

341/158 **Антон-Іван,** ахрышчаны 11.11.1834 г. ксяндзом Сымонам Урбановічам у Серафінскім касцёле. Хросныя бацькі – Вікенцій Станішэўскі і Анэля Горская.

342/159 **Восіп,** нарадзіўся 03.06.1862 г., ахрышчаны 10.06.1862 г.

343/161 **Фама,** нарадзіўся 29.12.1862 г., ахрышчаны 06.01.1863 г. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 16.11.1883 г. далучаны да дваранскага роду Татураў[368]. Закончыў Ігуменскае павятовае вучылішча. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыў у вёсцы Усохі Пухавіцкай воласці на зямлі бацькі[369]. Памёр 23.02.1899 г.

Жонка – Вінцэнта, *1866 г. н. У 1912 г. жыла ў вёсцы Усохі Пухавіцкай воласці[370].

344/161 **Людвіг,** нарадзіўся 13.08.1866 г., ахрышчаны 15.08.1866 г. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 16.11.1883 г. далучаны да дваранскага роду Татураў[371]. Закончыў Ігуменскае павятовае вучылішча. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыў у вёсцы Усохі Пухавіцкай воласці на зямлі бацькі[372].

345/172 **Міхаіл,** нарадзіўся 05.11.1887 г. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 06.06.1908 г. далучаны да дваранскага роду Татураў. Зацверджаны ўказам Сената ад 16.12.1908 г.

346/172 **Аляксандр,** нарадзіўся 29.08.1889 г. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 06.06.1908 г. далучаны да дваранскага роду Татураў. Зацверджаны ўказам Сената ад 16.12.1908 г.

347/172 **Уладзімір,** нарадзіўся 07.04.1893 г. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 06.06.1908 г. далучаны да дваранскага роду Татураў. Зацверджаны ўказам Сената ад 16.12.1908 г.

348/172 **Мікалай,** нарадзіўся 01.12.1898 г. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 06.06.1908 г. далучаны да дваранскага роду Татураў. Зацверджаны ўказам Сената ад 16.12.1908 г.

349/173 **Антон,** *1848 г. н. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыў у засценку Завішын Пагарэльскай воласці, зямлі не меў[373].

350/173 **Адам,** *1863 г. н. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыў у засценку Завішын Пагарэльскай воласці, зямлі не меў[374].

351/175 **Іван,** *1844 г. н. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыў у вёсцы Рэпішча Пухавіцкай воласці, зямлі не меў[375].

Жонка – Юзэфа Іахімаўна, *1853 г. н.

352/175 **Юльян,** *1856 г. н. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыў у вёсцы Рэпішча Пухавіцкай воласці, зямлі не меў[376].

353/175 **Ігнацій,** *1861 г. н. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыў у вёсцы Рэпішча Пухавіцкай воласці, зямлі не меў[377].

354/175 **Антон,** *1863 г. н. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыў у вёсцы Рэпішча Пухавіцкай воласці, зямлі не меў[378].

Жонка – Мальвіна Якаўлеўна, *1868 г. н.

355/178 **Іван,** нарадзіўся 05.01.1877 г., ахрышчаны 07.01.1877 г. У 1886 г. разам з сынам Іванам жыў у фальварку Усцерхі Бабруйскага павета. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 05.08.1886 г. далучаны да дваранскага роду Татураў.

356/178 **Антон,** нарадзіўся 04.12.1870 г., ахрышчаны 07.12.1870 г.

357/179 **Пётр,** *1861 г. н. У 1888 г. служыў «делопроизводителем управления Игуменского воинского начальника, выдержал испытания в первый классный чин»[379].

358/179 **Антоній,** нарадзіўся 07.06.1863 г., ахрышчаны 09.06.1863 г. У 1888 г. служыў канцылярскім чыноўнікам Ігуменскага павятовага казначэйства, «выдержал испытания в первый классный чин»[380].

359/179 **Міхаіл,** *1872 г. н. Закончыў Ігуменскае павятовае вучылішча[381].

360/179 **Алімпія,** *1873 г. н. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыла ў вёсцы Белічаны на зямлі бацькі[382].

361/179 **Серафіма,** *1883 г. н. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыла ў вёсцы Белічаны на зямлі бацькі[383].

362/186 **Атон,** *1881 г. н. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыў у засценку Барок Пухавіцкай воласці на зямлі бацькі[384].

363/186 **Віктар,** *1883 г. н. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыў у засценку Барок Пухавіцкай воласці на зямлі бацькі[385].

364/186 **Антон,** *1888 г. н. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыў у засценку Барок Пухавіцкай воласці на зямлі бацькі[386].

365/187 **Аляксандра,** *1881 г. н. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыла ў засценку Барок Пухавіцкай воласці на зямлі бацькі[387].

366/188 **Юльян,** *1884 г. н. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыў у засценку Барок Пухавіцкай воласці на зямлі бацькі[388].

367/188 **Фелікс,** *1885 г. н. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыў у засценку Барок Пухавіцкай воласці на зямлі бацькі[389].

368/192 **Станіслаў** (з двойні), нарадзіўся 29.01.1866 г., ахрышчаны 11.09.1868 г. у касцёле[390]. Далучаны да роду вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад (?).10.1869 г.

369/192 **Франц** (з двойні), нарадзіўся 29.01.1866 г., ахрышчаны 11.09.1868 г. у касцёле[391]. Вучыўся ў Слуцкай гімназіі. Далучаны да роду вызначэннямі Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 02.01.1861 г., (?).10.1869 г., 11.12.1869 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета1893 г., жыў на хутары [Калубіна] Ігуменскага павета.

370/192 **Людвіка,** *1876 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыла на хутары [Калубіна] Ігуменскага павета.

371/193 **Канстанцін,** *1883 г. н.

372/193 **Уладзіслаў,** *1885 г. н.

373/193 **Марыя,** *1880 г. н.

374/193 **Алена,** *1887 г. н.

375/196 **Марыя.** Далучана да роду вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 16.06.1867 г.

376/196 **Яўфім (Іахім),** нарадзіўся 25.12.1853 г., ахрышчаны 26.12.1853 г. Па рэвізскай сказцы ад 28.12.1864 г., пазначаны ў саслоўі аднадворцаў 4-га Касыніцкага ўчастка Слуцкага павета[392]. У 1874 г. далучаны да саслоўя сялян Чапліцкай воласці, у 1874 г. зацверджаны ў дваранстве. У 1878–1893 гг. жыў у сяле Чаплічы Слуцкага павета на ўласнай зямлі (14 1/2 дзесяціны).

Жонка – Марыя Мяфодзьеўна Корбут, нарадзілася 01.05.1860 г.

377/196 **Іван,** нарадзіўся 12.09.1847 г., ахрышчаны 13.09.1847 г. святаром Цімафеем Кранікоўскім у Чапліцкай царкве Слуцкага павета. Хросныя бацькі – шляхціч сяла Чаплічы Іван Францаў Лагвіновіч і шляхцянка Харыціна Венядзіктава Шулякоўская[393]. Па рэвізскай сказцы

ад 28.12.1864 г., пазначаны ў саслоўі аднадворцаў 4-га Касыніцкага ўчастка Слуцкага павета[394]. Далучаны да роду вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 16.06.1867 г. Жыў у 1878 г. у сяле Чаплічы Слуцкага павета, у 1893 г. – ва ўрочышчы Пераўвалокі на арэнднай зямлі.

Жонкі: 1. Анастасія Васільева, ад яе сыны Васіль, Андрэй, Іосіф і Стэфан; 2. Агафія Ануфрыеўна Вечар, нарадзілася 15.04.1849 г., ад яе дзеці Адам, Антон і Марыя.

602/405 **Іосіф,** нарадзіўся 09.10.1894 г. У 1894 г. жыў у аколіцы Пратасаўшчына на зямлі дзеда[592].

603/405 **Ганна,** *1884 г. н. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыла ў аколіцы Пратасаўшчына на зямлі дзеда[593].

604/405 **Мар'я,** *1886 г. н. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыла ў аколіцы Пратасаўшчына на зямлі дзеда[594].

605/406 **Сцяпан.** Жыў у 1898–1952 гг.

606/406 **Фаліся (Хваліся).** Памерла ў рабочым пасёлку Ялізава Асіповіцкага раёна.

607/406 **Іосіф,** нарадзіўся ў 1900 г. у Пратасаўшчыне. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, быў паранены, узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

Жонка – Алена Анатазіеўна Ваніслаўская, 1904 г. н.

X КАЛЕНА

608/414 **Вікенцій,** *1891 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Качановічы Пацейкаўскай воласці на чыншавай зямлі[595].

609/414 **Францішка,** *1892 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыла ў засценку Качановічы Пацейкаўскай воласці на чыншавай зямлі[596].

610/415 **Юзэфа,** *1891 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета1893 г., жыла ў засценку Чарнагубаў на чыншавай зямлі[597].

611/418 **Іван,** нарадзіўся 27.08.1881 г. у засценку Балотчыцы, ахрышчаны 08.09.1881 г. у Слуцкім касцёле. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Страхін Вызнянскай воласці на арэнднай зямлі памешчыка Узлоўскага[598]. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 24.07.1898 г. далучаны да дваранскага роду Татураў. Паводле крыніцы «Беларускі “Мемарыял”», «паляк; адукацыя н/пачатковая; вагаўшчык, калгас “Чырвоны бор”. Пражываў: Мінская вобл., Старобінскі р-н, в. Ляцінец. Арыштаваны 17.11.1932 г. Прыгавораны: Калегія АДПУ 10.08.1933 г., абвінавачанне: арт. 58/12 КК РСФСР – антысавецкая дзейнасць. Прыгавор: 3 гады выпраўленча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны 01.10.1957 г. Ваенны трыбунал БВА».

612/418 **Антон,** нарадзіўся 01.10.1884 г. у засценку Балотчыцы, ахрышчаны 14.10.1884 г. у Слуцкім касцёле. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Страхін Вызнянскай воласці на арэнднай зямлі памешчыка Узлоўскага[599]. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 24.07.1898 г. далучаны да дваранскага роду Татураў. Паводле крыніцы «Беларускі “Мемарыял”», «беларус; адукацыя н/пачатковая; калгаснік, калгас. Пражываў: Мінская вобл., Чырвонаслабодскі р-н, в. Дамінікава. Арыштаваны 08.02.1930 г. Прыгавораны: “тройка” 03.03.1930 г., абвінавачанне: арт. 76 КК БССР – антысавецкая дзейнасць. Прыгавор: 5 гадоў выпраўленча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны 13.05.1989 г. Пракуратура БССР».

613/418 **Адольф,** нарадзіўся 21.05.1888 г. у засценку Балотчыцы, ахрышчаны 10.07.1888 г. у Слуцкім касцёле. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Страхін Вызнянскай воласці на арэнднай зямлі памешчыка Узлоўскага[600]. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 24.07.1898 г. далучаны да дваранскага роду Татураў.

614/418 **Адам,** нарадзіўся 26.01.1895 г. у засценку Балотчыцы, ахрышчаны 16.04.1895 г. у Слуцкім касцёле. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 24.07.1898 г. далучаны да дваранскага роду Татураў.

615/418 **Юзэфа,** *1892 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыла ў засценку Страхін Вызнянскай воласці на арэнднай зямлі памешчыка Узлоўскага[601].

616/498 **Іван,** нарадзіўся 15.06.1867 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Ліпскія Цімкавіцкай воласці на чыншавай зямлі[602].

617/498 **Канстанцін,** нарадзіўся 13.02.1875 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Ліпскія Цімкавіцкай воласці на чыншавай зямлі[603].

618/499 **Юзэфа,** нарадзілася 10.03.1862 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыла ў засценку Ліпскія Цімкавіцкай воласці на чыншавай зямлі[604].







Уверсе злева: Антон Юльянавіч Татур. 1900-я гг. (гл. «Татуры» 504/314).
Справа: Вікенцій Антонавіч Татур, навучэнец рамеснага вучылішча. Буй. 1913 г. (гл. «Татуры» 626/504).
Унізе: Барыс Вікенцьевіч Татур. 1960-я гг. (гл. «Татуры» 660/626).

619/500 **Мікалай,** *1878 г. н. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыў у вёсцы Рэпішча[605].

620/500 **Пётр,** *1880 г. н. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыў у вёсцы Рэпішча[606].

621/500 **Браніслаў,** *1882 г. н. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыў у вёсцы Рэпішча[607].

622/500 **Мальвіна,** *1874 г. н. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыла ў вёсцы Рэпішча[608].

623/500 **Сцепаніда,** *1884 г. н. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыла ў вёсцы Рэпішча[609].

624/500 **Ізабэла,** *1884 г. н. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыла ў вёсцы Рэпішча[610].

625/504 **Ганна,** 1893 г. н. Жыла ў г. Буй Кастрамской губерні. Памерла ў 1963 г.

626/504 **Вікенцій,** нарадзіўся 06.06.1901 г., ахрышчаны 11.06.1901 г. святаром Іаанам Благавешчанскім у Саборнай Благавешчанскай царкве г. Буй Кастрамской епархіі. Хросныя бацькі – буйскі купецкі сын Мікалай Іванавіч Комін і купецкая жонка Анастасія Мікіцічна Коміна[611]. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 22.05.1912 г. далучаны да дваранскага роду Татураў з унясеннем у 1-ю частку радаводнай кнігі дваран Мінскай губерні.

Кадравы ваенны, удзельнік грамадзянскай вайны, палкоўнік Чырвонай Арміі. У час Вялікай Айчыннай вайны – намеснік камандзіра аператыўнай групы па артылерыі Паўднёва-Заходняга фронту. Паранены 29.07.1941 г. каля гарадскога пасёлка Парычы (Беларусь), у чэрвені 1942 г. прапаў без вестак пад г. Харкавам. Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга 27.03.1942 г. (ордэн № 19364) і медалём «20 гадоў РККА».

Жонка – Марыя Паўлаўна Шэпелева.

627/505 **Станіслаў,** *1886 г. н. Каталік. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыў разам з бацькамі ў засценку Застар'е Брадзецкай воласці[612].

628/505 **Адам,** *1887 г. н. Каталік. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыў разам з бацькамі ў засценку Застар'е Брадзецкай воласці[613].

629/505 **Ідалія,** *1885 г. н. Каталічка. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыла разам з бацькамі ў засценку Застар'е Брадзецкай воласці[614].

630/505 **Ігнацій,** 1892 г. н. У час калектывізацыі не згадзіўся ўступіць у калгас, раскулачаны. Паводле крыніцы «Беларускі "Мемарыял"», «нарадзіўся ў 1892 г., в. Застар'е Клічаўскага р-на Магілёўскай вобл.; паляк; адукацыя н/пачатковая; сталяр, г. п. Клічаў. Пражываў: Клічаў. Арыштаваны 18.05.1931 г. Прыгавораны: "тройка" 27.08.1931 г., абвінавачанне: арт. 76 – удзел у контррэвалюцыйнай кулацкай арганізацыі. Прыгавор: 10 гадоў выпраўленча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны 14.09.1962 г. Судовай калегіяй па крымінальных справах Вярхоўнага суда БССР». Расстраляны ў 1931 г. у Мядзведжагорску (Карэлія).

Жонкі: 1. Зося Адамаўна Лычкоўская, ад яе сын Мікалай. Памерла ад тыфу ў 20 гадоў. Бацькі Зосі Адамаўны: маці – Анэлія (Анэта Марцінаўна), бацька – Адам Феліцыянавіч Лычкоўскі. Жылі ў Малахаўцы недалёка ад урочышча Застар'е. Анэлія зацяжарала ад польскага паніча Адама да шлюбу, што было ў той час ганьбай. Яе выгналі з дому. Нарадзіла яна ў бульбяной яме блізнят Адама і Мікалая (пры савецкай уладзе

Обязательно все графы заполнить полностью

НАГРАДНОЙ ЛИСТ

Фамилия, имя и отчество ТАТУР [illegible] Антонович

Воинское звание Полковник

Должность, часть Заместитель командующего Оперативной Группы по Артиллерии

Представлен к Ордену «КРАСНОГО ЗНАМЕНИ»

1. Год рождения 1901

2. Национальность Русский

3. С какого времени состоит в Красной Армии 1919

4. Партийность Член ВКПб с 1940 г.

5. Участие в боях (где и когда) Участник гражданской войны

6. Имеет ли ранения и контузии Ранен 29 июля 1941 года района [illegible]

7. Чем ранее награжден (за какие отличия) Юбилейной медалью XX лет РККА

8. Каким РВК призван Кадровый

9. Постоянный домашний адрес: (представляемого к награждению или его семьи) Гор. [illegible]

1. Краткое, конкретное изложение личного боевого подвига или заслуг

[illegible]

Достоин правительственной награды орденом «КРАСНОГО ЗНАМЕНИ»

КОМАНДУЮЩИЙ ОПЕРГРУППОЙ
ГЕНЕРАЛ-МАЙОР
/[illegible]/

ВОЕННЫЙ КОМИССАР
ПОЛКОВОЙ КОМИССАР
/ВОРОНОВ/

[illegible] ноября 1941 г.

Узнагародны ліст Вікенція Антонавіча Татура (гл. «Татуры» 626/504). *Падольскі ваенны архіў, ЦАМО РФ.*

былі сасланы на Урал і там загінулі). Адам пашкадаваў Анэлію і ажаніўся з ёй, за што быў пазбаўлены спадчыны, і сям'я жыла ў беднаце. Пазней нарадзіліся: Косця (памёр ад тыфу), Зося і Марыя (у замужжы Марыя Адамаўна Эміліт, дзеці Вікторыя і Эдуард). Марыя ў маладосці страціла нагу (нацерла на першамайскай дэманстрацыі, але яе маці Анэлія не ведала пра гэта вельмі доўга, так мужна Марыя сябе паводзіла, гаварыла, што ў яе проста баліць нага, дрэнна згінаецца...); 2. Марыя Вячаславаўна, ад яе сын Лявонцій і дачка Аліса. Расстраляна партызанамі разам з другім мужам у час Вялікай Айчыннай вайны.

631/506 **Уладзімір,** нарадзіўся 05.12.1891 г. Праваслаўны. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., разам з бацькамі жыў у засценку Застар'е Брадзецкай воласці[615].

632/506 **Аляксандр,** нарадзіўся 16.04.1894 г. Праваслаўны. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., разам з бацькамі жыў у засценку Застар'е Брадзецкай воласці[616].

633/506 **Іван,** нарадзіўся 30.11.1896 г. Праваслаўны. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., разам з бацькамі жыў у засценку Застар'е Брадзецкай воласці[617].

634/506 **Юльян,** нарадзіўся 12.10.1911 г. Каталік. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., разам з бацькамі жыў у засценку Застар'е Брадзецкай воласці[618].

635/508 **Уладзімір,** нарадзіўся 04.10.1894 г. Вызначэннямі Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 16.09.1902 г. і 27.06.1903 г. далучаны да дваранскага роду Татураў.

636/511 **Зыгмунт,** таленавіты матэматык. Узнагароджаны за гераізм у час антыфашысцкага Варшаўскага паўстання ў 1944 г. Страціў ногі – няшчасны выпадак. Меў двух сыноў, жыў з сям'ёй у г. Варшаве. Памёр 26.09.2005 г.

Жонка – Барбара Дыпкоўска, яе сына Чарэка Зыгмунт усынавіў.

636а/511 **Марыя,** згубілася ў час грамадзянскай вайны пры пераездзе сям'і ў Польшчу. Са сваёй сям'ёй аб'яднацца не давялося. Жыла ў г. Бабруйску.

637/511 **Хенрык,** нарадзіўся ў 1913 г. у мястэчку Застар'е (Беларусь). Магістр-хімік, аўтар падручніка, які быў рэкамендаваны для інстытутаў у 1954 г. «Удзельнік антыфашысцкага Варшаўскага паўстання ў 1944 г., быў у лагеры ваеннапалонных у Аўстрыі, вызвалены амерыканскімі войскамі, далучыўся да арміі... Італія – Эдынбург і вярнуўся ў Польшчу». Памёр у 1978 г. у Варшаве.

Жонка – Галіна Шмальц, 1923 г. н. Евангелістка. З сям'і нямецкіх эмігрантаў, аселых у Польшчы ў XIX ст. Памерла ў 1995 г. у г. Варшаве.

638/511 **Вераніка-Ядвіга (Вяжбіцка),** нарадзілася 14.01.1918 г. ва ўрочышчы Застар'е (Беларусь). Працавала ў польскіх газетах тэхнічным рэдактарам. Памерла 03.08.1983 г. у г. Варшаве.

Дзеці: 1. Ганна-Данута Вяжбіцка, нарадзілася 07.04.1938 г. у Дзвяікозы пад Сандамірам. Памерла 05.12.1979 г. у г. Варшаве; 2. Крысціна Вяжбіцка, нарадзілася 09.06.1941 г. Працавала эканамістам. Жыве ў г. Варшаве.

639/511 **Ганна (Возьняк),** нарадзілася 28.11.1914 г. ва ўрочышчы Застар'е (Бярэзінская парафія, Мінская губерня). Працавала фармацэўтам. Памерла ў 1989 г. у г. Радаме (Польшча). Сын Томэк Возьняк, нарадзіўся 07.01.1954 г. у г. Радаме, інжынер. Пасля заканчэння юрыдычных курсаў – падатковы інспектар, жыве ў г. Радаме (жонка – Малгажата, нарадзілася 28.03.1958 г. у г. Радаме, дачка Ганна, нарадзілася 07.01.2000 г.).

640/514 **Сяргей,** нарадзіўся 28.06.1889 г., ахрышчаны 18.07.1899 г. святаром Міхаілам Вячоркам



Фабіяна Татур (Сарока), Зыгмунд Гіляр'евіч Татур і іх дзеці. Сядзіць Вераніка, стаяць: Ганна (Ханка Возьняк), Зыгмунт і Хенрык. Польшча. 1925 г. (гл. «Татуры» 511/317, 636/511, 637/511–639/511).

у Слуцкай Георгіеўскай царкве, хросныя бацькі – памочнік слуцкага павятовага спраўніка адстаўны паручнік Дзімітрый Сцяпанавіч Анапрыенка і жонка пісьмавода слуцкага павятовага прадвадзіцеля дваранства Марыя Апалінарыева Струкава.

НГАБ, ф. 319, воп. 2, спр. 3181, арк. 611.

Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 17.03.1909 г. далучаны да дваранскага роду Татураў. Зацверджаны ўказам Сената ад 16.11.1909 г., № 2755[619]. Заслужаны дзеяч навукі РСФСР. У гады рэвалюцыі, па некаторых звестках, быў членам прэзідыума партыі сацыял-дэмакратаў (эсэраў). З 1939 г. доктар эканамічных навук, з 1940 г. – прафесар, заснавальнік і загадчык кафедры бухгалтарскага ўліку і аналізу гаспадарчай дзейнасці эканамічнага факультэта МДУ імя М. В. Ламаносава (1943–1972). Пяру С. К. Татура належаць больш за 140 навуковых работ, 15 з якіх перакладзены на мовы народаў СССР, а таксама балгарскую, венгерскую, нямецкую, польскую, славацкую, чэшскую. У гэтых публікацыях былі закладзены асновы новага навуковага кірунку – комплекснага даследавання гасразліку, уліку і эканамічнага аналізу, які найбольш паслядоўна быў рэалізаваны ў манаграфіі «Гаспадарчы разлік у прамысловасці». 1-е выданне гэтай манаграфіі было адзначана ў 1959 г. граматай МДУ, 2-е ў 1966 г. – срэбраным медалём ВДНГ, 3-му выданню прысуджана Ламаносаўская прэмія МДУ. Пад яго кіраўніцтвам былі выкананы і абаронены 54 кандыдацкія дысертацыі, па сямі доктарскіх дысертацыях ён быў навуковым кансультантам. За навуковую і педагагічную дзейнасць С. К. Татур быў узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Памёр 08.06.1974 г. У МДУ ў яго гонар усталявана мемарыяльная дошка.

Жонка – Вольга Львоўна Анохіна, 04.07.1896 г. – 17.02.1962 г. Дзеці: Ніна, 01.10.1920 г. – 25.09.1926 г., Алег, 15.06.1934 г. – 21.08.1938 г.

641/514 **Генадзь,** нарадзіўся 23.01.1902 г., ахрышчаны 23.01.1902 г. святаром Іаанам Шанцом у Мінскім Кафедральным саборы. Хросныя бацькі – патомны дваранін Аляксей Аляксеевіч Шклярэвіч і ўдава маёра Аляксандра Аляксандрава Старжынская (*НГАБ, ф. 319, воп. 2, спр. 3181, арк. 611*). Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 17.03.1909 г. далучаны да дваранскага роду Татураў. Зацверджаны ўказам Сената ад 16.11.1909 г., № 2755[620].

Заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі Беларусі. Прафесар, доктар тэхнічных навук. Яго імя занесена ў Энцыклапедыю Беларусі.

Вучыўся ў г. Мінску, а пасля ў Тульскім і Казанскім камерцыйных вучылішчах, апошняе скончыў у 1918 г. з залатым медалём. У 1919 г. пераехаў у г. Уладзівасток, у 1927 г. скончыў Далёкаўсходні політэхнічны інстытут. З 1931 г. загадваў кафедрай будаўнічай механікі. У 1932 г. быў занесены ў Краявую Чырвоную кнігу сацыялістычных перамог. У 1933 г. – дацэнт, загадчык кафедры супраціўлення матэрыялаў. 05.12.1935 г. зацверджаны ў вучонай ступені кандыдата тэхнічных навук. У жніўні 1937 г. за страту палітычнай пільнасці і сваяцкую сувязь з «ворагам народа» (Ізвергіным) быў выключаны з кандыдатаў УКП(б). У 1939 г. выбраны па конкурсе ў Крыварожскі гарнарудны інстытут у якасці загадчыка кафедры супраціўлення матэрыялаў і тэарэтычнай механікі. У гады вайны працаваў у Ніжнім Тагіле, куды эвакуіраваўся разам з Крыварожскім інстытутам. За час працы ў



Помнік на магіле Касьмы (Кузьмы) Феліксавіча і Сяргея Кузьміча Татураў. Вядзенскія могілкі, Масква (гл. «Татуры» 514/318, 640/514).



Помнік на магіле Генадзя Кузьміча і Елізаветы Іванаўны Татураў. Паўночныя могілкі, Мінск (гл. «Татуры» 641/514).

гэтым інстытуце ім было апублікавана 22 работы. 02.04.1955 г. зацверджаны ў вучонай ступені доктара тэхнічных навук і ў вучоным званні прафесара Крыварожскага гарнаруднага інстытута. У 1958 г. выбраны па конкурсе на пасаду загадчыка кафедры тэарэтычнай механікі Беларускага політэхнічнага інстытута (БПІ) у г. Мінску. З 1963 г. працаваў на пасадзе прафесара гэтай кафедры. З 1958 г. апублікаваў 11 навуковых работ, у тым ліку 2 падручнікі. Кіраўнік новага навуковага кірунку ў БПІ «Аптымізацыя педагагічнага працэсу ў ВНУ».

Памёр 07.06.1979 г.

Жонка – Лізавета Іванаўна Шчарбакова, 07.05.1912 г. – 22.11.2003 г. Нарадзілася на станцыі Хантахеза, КВЧ, каля г. Харбіна.

642/514 **Георгій,** нарадзіўся 24.08.1904 г., ахрышчаны 03.09.1904 г. святаром Іаанам Шанцом у Мінскім Кафедральным саборы. Хросныя бацькі – дваранін Аляксей Аляксеевіч Шклярэвіч і жонка калежскага асэсара Вольга Грыгор'еўна Залюбоўская (*НГАБ, ф. 319, воп. 2, спр. 3181, арк. 611 адв.*). Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 17.03.1909 г. далучаны да дваранскага роду Татураў. Зацверджаны ўказам Сената ад 16.11.1909 г., № 2755[621].

643/514 **Пётр,** нарадзіўся 12.07.1907 г. у г. Мінску. Працаваў у Крыме, быў дзясятнікам, прарабам, тэхнікам. Будаваў малыя плаціны, якія да гэтай пары стаяць у Крыме на Эгізабінскім і Альмінскім вадасховішчах. У 1932–1937 гг. вучыўся ў Маскоўскім інстытуце інжынераў землеўпарадкавання. Атрымаў накіраванне ў Наркамзем Узбекскай ССР, на навукова-даследчую станцыю арганізацыі тэрыторыі. У 1942 г. скончыў паскораныя курсы Ваенна-інжынернай акадэміі імя Куйбышава і быў накіраваны на фронт. Ваяваў у складзе 1-га і 3-га Украінскіх франтоў 62-й Нікопальскай Чырванасцяжнай ордэна Багдана Хмяльніцкага інжынерна-сапёрнай брыгады рэзерву галоўнага камандавання. Узрываў умацаванні, будаваў пераправы, масты, дзоты, здымаў міны, хадзіў у атаку на танкі. Вызваляў Адэсу, фарсіраваў Днепр, Дон, Днестр, Віслу, Одэр. Перамогу сустрэў у Германіі ў нямецкім горадзе Брэслаў (Вроцлаў, Польшча) у званні маёра. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступеней, Чырвонай Зоркі і шматлікімі медалямі. Пасля вайны вярнуўся ва Узбекістан. Працаваў асістэнтам, старшым выкладчыкам, дацэнтам, прафесарам Ташкенцкага інстытута ірыгацыі і механізацыі сельскай гаспадаркі на факультэце землеўпарадкавання. У 1949–1982 гг. – загадчык кафедры планіроўкі і добраўпарадкавання сельскіх населеных мясцін. Доктар эканамічных навук, заслужаны дзеяч навукі Узбекістана. Пасля яго смерці інстытут заснаваў стыпендыю імя П. К. Татура. Памёр 02.05.1982 г.

Жонка – Алена Якаўлеўна Рыслінг, была дзявятым дзіцем у нямецкай сям'і. Памерла 15.07.1985 г. Яе маці Марыя Мартынаўна ў 1941 г. выехала ў г. Ташкент да дачкі.

644/545 **Юзэфа,** *1886 г. н. Па сямейным спісе дваран Ігуменскага павета 1888 г., жыла ў вёсцы Суцін на зямлі бацькі[622].

645/552 **Іван,** нарадзіўся 16.11.1898 г., ахрышчаны 16.11.1898 г. у Серафінскім касцёле. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 30.12.1909 г. далучаны да дваранскага роду Татураў. Зацверджаны ўказам Сената ад 31.05.1910 г., № 1554.

646/552 **Віт,** нарадзіўся 14.06.1902 г. у аколіцы Суцін, ахрышчаны ў Серафінскім касцёле. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 30.12.1909 г. далучаны да дваранскага

роду Татураў. Зацверджаны ўказам Сената ад 31.05.1910 г., № 1554.

647/594 **Мікалай,** нарадзіўся 09.05.1877 г. у засценку Свіранава, ахрышчаны 15.08.1877 г. у Свержанскім касцёле. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 20.12.1897 г. далучаны да дваранскага роду Татураў.

648/594 **Адам,** нарадзіўся 02.01.1888 г. у засценку Свіранава, ахрышчаны 03.01.1888 г. у Уздзенскім касцёле. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 20.12.1897 г. далучаны да дваранскага роду Татураў.

649/594 **Іван,** нарадзіўся 08.06.1893 г. у засценку Свіранава, ахрышчаны 15.08.1893 г. у Уздзенскім касцёле. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 20.12.1897 г. далучаны да дваранскага роду Татураў.

650/605 **Станіслава,** нарадзілася ў 1922 г. на хутары Церабуты.

651/605 **Франц,** нарадзіўся ў 1924 г. на хутары Церабуты. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, быў паранены. Узнагароджаны медалямі СССР.

Жонка – Дар'я Лаўрэнцьева, 1923 г. н.

652/605 **Карл,** нарадзіўся ў 1928 г. на хутары Церабуты. Загінуў у 1950-я гг. у Чалябінскай вобласці.

653/605 **Марыя,** нарадзілася ў 1930 г. на хутары Церабуты. У канцы 1950-х гг. была накіравана на цаліну ў Кустанайскую вобласць Казахстана.

654/607 **Станіслаў,** 1925 г. н. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Старшы лейтэнант, загінуў у 1967 г. у г. Слуцку пры выкананні службовых абавязкаў у час беспарадкаў у судзе. Узнагароджаны медалямі СССР. Пахаваны ў вёсцы Грэск Слуцкага раёна.

Жонка – Вольга Афанасьеўна Давідоўская, 1924 г. н.

655/607 **Пётр,** нарадзіўся ў 1929 г. на хутары Гнезнае Старадарожскага раёна Мінскай вобласці. Пахаваны ў г. Кыштыме Чалябінскай вобласці.

Жонкі: 1. Алена Антонаўна Пятровіч, ад яе дачка Таццяна; 2. Марыя Іванаўна, ад яе дзеці Валерый і Таццяна.

656/607 **Марыя,** нарадзілася ў 1930 г. на хутары Гнезнае Старадарожскага раёна.

Муж – Кузьма Грыгор'евіч Пятровіч (бацька Грыгорый Пятровіч рэпрэсіраваны ў 1937 г.).

Дзеці: 1. Аляксандр, 1952 г. н. Скончыў Вышэйшае ваенна-марское вучылішча ў г. Севастопалі, капітан 2-га рангу, атамны падводны флот. Працаваў ваенным прадстаўніком у В'етнаме. Мае трох сыноў; 2. Галіна, 1954 г. н., настаўніца; 3. Юрый, 1969 г. н., скончыў Магілёўскі машынабудаўнічы інстытут.

657/607 **Грыгорый,** нарадзіўся ў 1936 г. на хутары Гнезнае Старадарожскага раёна. Вучыўся ў тэхнікуме горнага машынабудавання ў г. Капейску Чалябінскай вобласці. Працаваў на заводзе імя С. М. Кірава. Пасля службы ў Савецкай Арміі ў Прыморскім краі вярнуўся ў Беларусь і працаваў у «Шахтаспецбудзе» Салігорскага калійнага камбіната. Напісаў гісторыю сваёй сям'і XX ст.

Жонка – Антаніна Андрэеўна Іванова, нарадзілася ў 1936 г. у г. Ржэў Цвярской вобласці. Закончыла Мінскі педагагічны інстытут імя Горкага, настаўніца. Жывуць у г. Салігорску.

658/607 **Казімір,** нарадзіўся ў 1939 г. на хутары Гнезнае Старадарожскага раёна.

659/607 **Ганна,** нарадзілася ў 1943 г. на хутары Церабуты.

Муж – Іван Іванавіч Баблеўскі. Дзеці: 1. Ала, 1963 г. н. (муж – Аляксандр Іванавіч Сташкевіч, 1965 г. н., дзеці: Сяргей і Дзмітрый); 2. Андрэй, 1965 г. н. Жывуць у г. Салігорску.

XI КАЛЕНА

660/626 **Барыс,** нарадзіўся 22.12.1928 у г. Краснаярску. Памёр 13.05.2007 у г. Сызрань. Кадравы ваенны.

Жонка – Валянціна Аляксееўна Сакалова.

661/626 **Ігар,** нарадзіўся 03.12.1938 г. у г. Томску. Памёр 17.02.2003 г. у г. Разань.

Жонка – Аляксандра Савельеўна Зубкова.

662/636 **Марэк.**

663/637 **Анджэй,** нарадзіўся ў 1944 г. у Варшаве, геолаг-палярнік. Дырэктар Інстытута біялогіі Антарктыкі Польскай акадэміі навук. Дырэктар польскай антарктычнай станцыі імя Хенрыка Арктоўскага. Прафесар універсітэта прыроды ў г. Любліне. Удзельнік палярных экспедыцый: аргенцінскіх, нарвежскіх, расійкіх, польскіх.

Жонка – Ганка. Дзеці: 1. Рэната, дачка Аня, сын Бартэк; 2. Юліка.

Бабуля Анджэя Эльжбэта Шмальц была да 2-й сусветнай вайны адной з самых багатых жанчын Польшчы, яе сям'і належала некалькі рэстаранаў у Варшаве. У час вайны была падпольшчыцай, прычым яе муж, немец па нацыянальнасці, пра гэта нічога не ведаў. У падполлі сваіх рэстаранаў хавала яўрэйскія сем'і і дзяцей. Многіх выратавала, рызыкуючы жыццём. Пасля вайны атрымала сотні лістоў з усяго свету са словамі ўдзячнасці. Дажыла да 100 гадоў.

664/637 **Эва,** нарадзілася 24.04.1949 г. у Варшаве. Працавала інспектарам мытні. Сын Яцак Баркоўскі.

665/630 **Мікалай,** нарадзіўся 03.03.1919 г. у маёнтку Урочышча Застар'е. Сірата, з 12 гадоў выхоўваўся ў дзіцячым доме і пры падтрымцы бабулі Анэліі. Скончыў факультэт мовы і літаратуры Мінскага настаўніцкага інстытута нацыянальных меншасцей (1937). Працаваў настаўнікам на Віцебшчыне. Пісьменнік – перакладчык са славянскіх моў, член Саюза пісьменнікаў Беларусі. Загадчык рэдакцыі мастацкай літаратуры ў Дзяржаўным выдавецтве БССР, дырэктар Беларускага аддзялення Літаратурнага фонду СССР, член Саюза пісьменнікаў БССР. У час Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у партызанскім руху, быў цяжка паранены. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны I ступені, медалямі «Партызану Айчыннай вайны» I ступені, «За выдатную працу ў час Вялікай Айчыннай вайны», «За выдатную працу ў гонар 100-годдзя У. І. Леніна», «Ветэран працы», многімі юбілейнымі медалямі, ганаровымі знакамі «За творчыя поспехі» (1955), «За выдатную працу».

Жонка – Нінэль Міхайлаўна Цімафеева, нарадзілася 12.08.1926 г. Выкладала англійскую мову ў Акадэміі навук БССР. Перакладала творы Марка Твэна.

666/630 **Лявонцій,** нарадзіўся 13.04.1923 г. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны медалямі СССР. Памёр 27.09.1982 г.

Жонкі: 1. Любоў Сцяпанаўна Тарасевіч, нарадзілася 05.04.1924 г., дачка Валянціна; 2. Марыя Сямёнаўна Шагава, нарадзілася 27.11.1921 г.

667/630 **Аліса,** 1926 г. н. Медсястра. Пайшла на фронт і прапала без вестак у час Вялікай Айчыннай вайны.

668/641 **Вадзім,** нарадзіўся 26.03.1933 г. у г. Уладзівастоку. Скончыў школу ў г. Крывы Рог з залатым медалём. Інжынер. Начальнік разліковага аддзела на адным з буйных заводаў г. Санкт-Пецярбурга.

Жонка – Рада Уладзіміраўна Сняжынская, нарадзілася 28.03.1933 г.



Юрый Генадзьевіч Татур. 1950-я гг. (гл. «Татуры» 669/641).



Вадзім Юр'евіч Татур. Масква. 2002 г. (гл. «Татуры» 698/669).



Уверсе: Марыя Вячаславаўна Татур. 1920-я гг. (гл. «Татуры» 630/505).
Унізе злева: Марыя Адамаўна Лычкоўская, малодшая сястра Зосі Адамаўны Лычкоўскай. 1920-я гг. (гл. «Татуры» 630/505).
Справа: Мікалай Ігнацьевіч Татур і Нінэль Міхайлаўна Цімафеева. 1950-я гг. (гл. «Татуры» 664/630).







Лявонцій і Аліса Татуры. 1932 г. (гл. «Татуры» 666/630, 667/630).

Лявонцій Ігнацьевіч Татур. 1940-я гг. (гл. «Татуры» 666/630).



669/641 **Юрый,** нарадзіўся 27.06.1936 г. у г. Уладзівастоку.

Скончыў школу ў г. Крывы Рог з срэбраным медалём. У 1954 г. паступіў у МІФІ (Маскоўскі інжынерна-фізічны інстытут). Быў старастам мужчынскага хору МІФІ, у 1956 і 1958 г. арганізоўваў камсамольскія атрады і сам удзельнічаў у асваенні цаліны. У 1957 г. удзельнічаў у складзе інстытуцкага хору ў Сусветным фестывалі моладзі і студэнтаў у г. Маскве. Вёў вялікую грамадскую работу. У 1960 г. паступіў у аспірантуру, уступіў у партыю, быў выбраны сакратаром камсамольскай арганізацыі ВНУ і адначасова стаў кіраўніком першага ў краіне Студэнцкага канструктарскага бюро. У 1967 г. перайшоў на працу ў Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР. Дзяржінспектар, начальнік аддзела, намеснік начальніка Дзяржінспекцыі і, нарэшце, у 1984 г. – намеснік начальніка Вучэбна-метадычнага ўпраўлення вядучага падраздзялення Мінвуза СССР. У 1986 г. узнагароджаны ордэнам «Знак пашаны». У 1991 г. перайшоў на працу ў Міністэрства адукацыі і навукі Расійскай Федэрацыі, дзе ўзначаліў Вучэбна-метадычны цэнтр і стаў членам калегіі гэтага міністэрства. Кіраваў распрацоўкай Дзяржаўных адукацыйных стандартаў першага пакалення, удзельнічаў у стварэнні нарматыўна-прававой базы для пераходу расійскіх ВНУ на шматузроўневую падрыхтоўку спецыялістаў. Аўтар каля ста навуковых артыкулаў, брашур і манаграфій, прысвечаных праблемам адукацыі. У 1994 г. яму было прысвоена вучонае званне прафесара па кафедры ўпраўлення якасцю вышэйшай адукацыі. Атрымаў званне «Ганаровы работнік вышэйшай школы». У 1996 г. зноў вярнуўся да педагагічнай дзейнасці на пасадзе прафесара кафедры інжынернай педагогікі МВТВ імя Н. Э. Баўмана. У 2001 г. яму была прысуджана вучоная ступень доктара педагагічных навук. У 2009 г. стаў лаўрэатам прэміі Урада РФ у галіне адукацыі за цыкл работ, прысвечаных перападрыхтоўцы і павышэнню кваліфікацыі выкладчыкаў.

Жонкі: 1. Аляксандра Рыгораўна Ліманская, нарадзілася 08.03.1936 г.; 2. Аліна Віктараўна Маркелава, нарадзілася 26.07.1939 г.

670/643 **Сяргей,** нарадзіўся 01.08.1937 г. у г. Ташкенце. Член саюза пісьменнікаў Узбекістана. Працаваў галоўным рэдактарам часопіса «Звезда Востока». Пад яго кіраўніцтвам часопіс стаў самым чытальным правінцыйным часопісам у Савецкім Саюзе з тыражом 212 тысяч экзэмпляраў. Аўтар 40 раманаў і аповесцей, 150 апавяданняў, у тым ліку «Тры вельмі розныя леты», «Перыферыя», «Аранжавае лета», «Плынь жыцця», «Жыццё ў Фрунзэ», «Цішыня», «Крутыя павароты».

Жонкі: 1. Дзіна Сяргееўна Раманава, дзеці: Ірына, н. 18.08.1961 г.; Ганна, н. 06.06.1966 г.; 2. Валянціна Паўлаўна Карпенка, дзеці: Алена, н. 01.12.1968 г.; Пётр, н. 15.07.1974 г.

671/643 **Вольга,** нарадзілася 24.10.1939 г. Інжынер-гідратэхнік, кандыдат тэхнічных навук, дацэнт.

Муж – Радзік Фасхіевіч Міфтахаў, сын Аляксандр.

672/651 **Галіна,** нарадзілася ў 1949 г. на хутары Церабуты Старадарожскага раёна.

Муж – Уладзімір Яўгеньевіч Марчанкаў, 1954 г. н. Жывуць у г. Петразаводску. Дзеці: 1. Наталля, 1977 г. н.; 2. Іна, 1973 г. н. (муж Алег Віктаравіч Казлоў, 1971 г. н., дзеці: Ксенія, 1999 г. н.; Арына, 2001 г. н.).

673/651 **Ганна,** нарадзілася ў 1951 г. на хутары Церабуты Старадарожскага раёна.

Муж – Павел Мікалаевіч Канаплянік. Дзеці: 1. Алена, 1974 г. н. (муж Дзмітрый

Аляксандравіч Бандарэнка, дачка Кацярына, 1996 г. н.); 2. Аксана, 1977 г. н. (муж Павел Аляксандравіч Сапажкоў, сын N). Жывуць у г. Салігорску.

674/651 **Валянціна,** нарадзілася ў 1954 г. на хутары Церабуты Старадарожскага раёна.

Муж – Мікалай Іванавіч Кунцэвіч. Дачка Вікторыя, 1976 г. н. Закончыла Магілёўскі тэхналагічны інстытут (муж Анатоль Антонавіч Пятровіч, інжынер-электрык, сын Аляксандр, 1995 г. н.). Жывуць у г. Салігорску.

675/651 **Марыя,** нарадзілася ў 1955 г. на хутары Церабуты Старадарожскага раёна.

Муж – Віктар Русак. Прыёмная дачка Вольга (дачка Дар'я Ранальдаўна, 2008 г. н.). Жывуць у г. Салігорску.

676/651 **Тамара,** нарадзілася ў 1958 г. на хутары Церабуты Старадарожскага раёна.

Муж – Аляксандр Пятровіч Качан, 1954 г. н. Дзеці: 1. Андрэй, 1979 г. н.; 2. Анастасія, 1985 г. н. (муж Сяргей Мікалаевіч Бялько). Жывуць у г. Салігорску.

677/651 **Ірына,** нарадзілася ў 1963 г. на хутары Церабуты Старадарожскага раёна.

Муж – Міхаіл Міхайлавіч Тарасаў, 1961 г. н. Дзеці: Юрый, 1984 г. н., і Алеся, 1986 г. н. Жывуць у г. Салігорску.

678/651 **Ларыса,** нарадзілася ў 1966 г. на хутары Церабуты Старадарожскага раёна. Скончыла Магілёўскі педагагічны інстытут.

Муж – Мікалай Васільевіч Галец. Дачка Юлія, 1989 г. н. Жывуць у г. Салігорску.

679/651 **Уладзімір,** нарадзіўся ў 1969 г. на хутары Церабуты Старадарожскага раёна. Закончыў БНТУ, інжынер.

Жонка – Ніна Аляксандраўна Сцешыц, 1972 г. н. Дзеці: Арцём, 1993 г. н.; Дар'я, 1996 г. н. Жывуць у г. Салігорску.

680/654 **Галіна,** нарадзілася 07.06.1953 г. у в. Грэск Слуцкага раёна.

Муж – Анатоль Уладзіміравіч Нямковіч, нарадзіўся 14.03.1954 г., перакладчык. Дзеці: 1. Максім, н. 15.05.1979 г., скончыў БНТУ, інжынер-будаўнік (жонка Наталля Мікалаеўна Якубенка, н. 11.06.1979 г., закончыла Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, урач-педыятр, сын Арцём, н. 26.12.2006 г.). Жывуць у ЗША, штат Каліфорнія; 2. Наталля, н. 01.01.1976 г., закончыла Акадэмію МУС Беларусі (муж Мікалай Мікалаевіч Макарэвіч, н. 12.05.1971 г., закончыў Акадэмію МУС Беларусі, дачка Вольга, н. 25.07.1999 г., сын Дзмітрый, н. 17.04.2009 г.).

681/654 **Людміла,** нарадзілася ў 1956 г. у в. Грэск Слуцкага раёна. Закончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, выкладчык беларускай і рускай мовы.

Муж – Анатоль Канстанцінавіч Чарвякоў. Скончыў БАТУ, галоўны інжынер рыбгаса «Волма». Дзеці: 1. Вольга, 1983 г. н., бухгалтар-эканаміст (муж Вадзім Іванавіч Філончык, сын Ягор, н. 08.02.2007 г.); 2. Алена, 1986 г. н., студэнтка.

682/654 **Ніна,** нарадзілася ў 1962 г. у в. Грэск Слуцкага раёна. Скончыла Мінскі медыцынскі інстытут.

Муж – Аляксандр Пятровіч Мельнікаў, н. 12.08.1964 г. Дзеці: 1. Кацярына, 1986 г. н., студэнтка Мінскага дзяржаўнага ўніверсітэта; 2. Анастасія, 1990 г. н., студэнтка.

683/657 **Расціслаў,** нарадзіўся ў 1961 г. Закончыў Магілёўскі машынабудаўнічы інстытут. Жыве ў г. Салігорску.

Жонка – Вольга Вячаславаўна Сташкевіч, 1961 г. н., г. Глыбокае. Дзеці: 1. Паліна, студэнтка Гродзенскага медыцынскага інстытута (муж

Юрый Аляксандравіч Тамашэўскі, сын Яраслаў); 2. Усевалад, 1989 г. н., студэнт БНТУ.

684/657 **Валерый,** 1963 г. н. Закончыў Магілёўскі машынабудаўнічы інстытут.

Жонка – Людміла Уладзіміраўна Слізская, 1963 г. н., інжынер-канструктар. Жывуць у г. Салігорску. Дзеці: 1. Аляксандра, 1986 г. н. Закончыла БНТУ, менеджар-эканаміст; 2. Марына, 1987 г. н., студэнтка БНТУ; 3. Ульяна, 1996 г. н.

685/658 **Ірына,** нарадзілася на хутары Церабуты Старадарожскага раёна. Сын Кірыл, дачка (?). Жывуць у г. Мінску.

686/658 **Ігар,** нарадзіўся на хутары Церабуты Старадарожскага раёна. Дзеці: Вераніка, Андрэй.

XII КАЛЕНА

687/660 **Алена (Галавіна),** нарадзілася 20.03.1952 г. у г. Буй. Жыве ў г. Велінградзе (Балгарыя).

688/660 **Сяргей,** нарадзіўся 25.12.1959 г. у Маскве. Закончыў Чарнавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт, інжынер-оптык.

Жонка – Ірына Міхайлаўна Юдзіна. Дзеці: 1. Аляксандр, н. 17.04.1987 г. у г. Сызрань, студэнт юрыдычнага факультэта Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта; 2. Антон, н. 10.01.1989 г. у г. Сызрань, студэнт факультэта інфарматыкі Маскоўскага ўніверсітэта нафты і газу.

689/661 **Вольга (Гарнастаева),** нарадзілася 25.10.1969 г. у г. Разань.

690/661 **Андрэй,** нарадзіўся 22.02.1974 г. у г. Разань.

691/661 **Ігар,** нарадзіўся 25.12.1976 г. у г. Разань.

692/665 **Наталля,** нарадзілася 29.05.1949 г. Закончыла Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут. Працавала журналістам у газетах і рэдактарам на тэлебачанні. Выкладала ў Мінскім інстытуце культуры. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі і Расіі. Аўтар кнігі «Песні душы народнай» (у суаўтарстве з Л. Шчагловым), паэтычных зборнікаў «Я ўяўляю гэта так...», «Цэнтр горада». Арганізатар дэманстрацыі ў гонар 100-годдзя М. Шагала (Мінск, 1987), першай у Мінску выставы мастакоў-авангардыстаў, якая паклала пачатак сучаснаму беларускаму авангарду. Жыве ў г. Нью-Ёрку (ЗША).

Дзеці: 1. Ягор Юр'евіч Любімаў. Закончыў Мінскае мастацкае вучылішча, скульптар (жонка Наталля, сын Джордж). Жывуць у ЗША; 2. Вера Юр'еўна Любімава (Хортан), нарадзілася 22.01.1971 г. у г. Мінску. Закончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, аддзяленне філасофіі. Жыве ў Англіі (дзеці: 1. Ірына Сяргееўна Несцяровіч, н. 04.05.1990 г. у г. Мінску; 2. Катажына Вадзімаўна Радзікульцава, н. 02.11.1993 г. у г. Варшаве).

693/665 **Уладзімір,** нарадзіўся 24.02.1954 г. Памёр 01.02.2008 г. Дачка Нінэль (Неаніла) Анціпава-Татур, н. 25.05.1977 г. Закончыла паліграфічны каледж. Член аб'яднання праваслаўных пісьменнікаў «Духоўнае слова» (дзеці: Мікалай, н. 01.12.1996 г.; Наталля, н. 12.01.2000 г.; Павел, н. 12.01.2000 г.).

694/666 **Валянцін,** нарадзіўся ў 1952 г. Закончыў Севастопальскае вышэйшае ваенна-марское вучылішча, афіцэр-падводнік. Памёр у 2007 г.

Дзеці: 1. Катарына, 1975 г. н., кінааператар, жыве ў г. Маскве; 2. Ганна, 1984 г. н., юрыст, жыве ў г. Уладзівастоку.

695/666 **Алег,** нарадзіўся 01.04.1953 г. Закончыў Вільнюскае вышэйшае ваеннае радыётэхнічнае вучылішча. Дзеці: 1. Алег, н. 14.04.1977 г. (дачка Паліна); 2. Максім, н. 31.01.1987 г.



Уладзімір Мікалаевіч Татур. 1990-я гг. (гл. «Татуры» 693/665).



Вера Юр'еўна Любімава (Хортан). 2010 г. (гл. «Татуры» 692/665).



Ірына Сяргееўна Несцяровіч (злева) і Катажына Вадзімаўна Радзікульцава. Лондан, карнавал. 2010 г. (гл. «Татуры» 692/665).

696/666 **Людміла,** нарадзілася 24.04.1954 г. Жыве ў г. Мінску.

Дачка Рэната Сяргееўна Татур, н. 14.04.1983 г. (муж Дзяніс Сяргеевіч Снегураў). Закончыла Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт з адзнакай, псіхолаг. Жыве ў г. Адэсе.

697/668 **Дзмітрый,** нарадзіўся 13.09.1959 г. у г. Ленінградзе. Закончыў Беларускі політэхнічны інстытут. З 1995 г. начальнік тэхнічнага аддзела філіяла Сібірскага гандлёвага банка ў г. Санкт-Пецярбургу. З 1997 г. намеснік галоўнага ўрача Цэнтральнай медыка-санітарнай часткі № 122 (ЦМСЧ-122) па пытаннях матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння.

Жонка – Наталля Мікалаеўна Марусенка.

698/669 **Вадзім,** нарадзіўся 24.09.1958 г. у г. Маскве. Вучыўся ў школах Масквы, Мінска, Мурама (Вербаўскі пасёлак). У 1975 г. закончыў фізіка-матэматычную школу № 50 г. Мінска, у 1981 г. – Маскоўскі інжынерна-фізічны інстытут (МІФІ). У 1981–1982 гг. па асабістай ініцыятыве арганізаваў у МІФІ камуністычны (дабрачынны) будаўнічы атрад «Пошук». У 1983–1984 гг. быў удзельнікам нелегальнай групы па падрыхтоўцы новай Канстытуцыі СССР. У 1984 г. разам з 10 удзельнікамі групы быў затрыманы КДБ СССР і абвінавачаны ў антысавецкай дзейнасці. У 1985–1990 гг. працаваў у ІМГ АН СССР, ІМГРЭ АН СССР. З 1991 г. займаўся прадпрымальніцкай дзейнасцю ў галіне ўкаранення новых тэхналогій. З 1996 да 2010 г. – старшыня Савета дырэктараў і намеснік дырэктара ТАА «ЦАМАКС» па ўкараненні новых тэхналогій у сельскай гаспадарцы і ветэрынарыі на аснове экалагічна чыстага прыроднага мінералу цэаліту (клінаптылаліту). З 1997 да 2005 г. – генеральны дырэктар ТАА «Суперкамп'ютарныя сістэмы», створанай на базе тэхналогій ЗАТ «РеСКо» і ЗАТ «Мультыкон». Адзін з ініцыятараў у 1998 г. расійска-беларускай праграмы Саюзнай дзяржавы па распрацоўцы і вытворчасці суперкамп'ютараў «СКІФ». З 2002 г. – віцэ-прэзідэнт Акадэміі Трынітарызму. З 2003 г. – галоўны рэдактар СМІ «Акадэмія Трынітарызму». Аўтар манаграфіі, больш за 100 артыкулаў у расійскіх і замежных часопісах, мноства вынаходніцтваў і адкрыццяў.

Жонка – Наталля Віктараўна Навумава, нарадзілася 13.07.1961 г.

699/669 **Алена,** нарадзілася 27.05.1966 г.

Муж – Дзмітрый Сяргеевіч Краснікаў. Дачка Юлія.

700/670 **Ірына,** нарадзілася 18.08.1961 г.

701/670 **Ганна,** нарадзілася 06.06.1966 г.

702/670 **Алена,** нарадзілася 01.12.1968 г.

703/670 **Пётр,** нарадзіўся 15.07.1974 г.

Жонка – Вікторыя Уладзіміраўна.

704/671 **Аляксандр.**

XIII КАЛЕНА

704/697 **Таццяна,** нарадзілася 25.01.1982 г.

705/697 **Аляксей,** нарадзіўся 24.11.1986 г.

706/698 **Дзмітрый,** нарадзіўся 28.11.1985 г. у г. Маскве. У 2003 г. Закончыў школу № 1679 г. Масквы з залатым медалём. З 2003 да 2009 г. вучыўся ў МІФІ. У 2009–2010 гг. працаваў у Інстытуце касмічных даследаванняў.

707/698 **Кірыл,** нарадзіўся 14.06.1987 г. У 2005 г. закончыў школу № 1679 г. Масквы са срэбраным медалём. У 2005–2011 гг. вучыўся ў МДТУ імя Баўмана на факультэце спецыяльнага машынабудавання.

Жонка – Кацярына Андрэеўна Акарачкова, нарадзілася 11.06.1987 г.

708/703 **Фёдар,** нарадзіўся 13.11.2011 г.

ТАТУРЫ, ЯКІЯ НЕ ЎВАЙШЛІ Ў РАДАВОДНЫЯ РОСПІСЫ

Андрэй Антонавіч Татур. Родам з Беларусі. Падпалкоўнік, ветэран Вялікай Айчыннай вайны. Быў рэпрэсіраваны, пасля рэабілітаваны.

Жонка – Анастасія Восіпаўна Лось.

Дочкі: 1. Лідзія; 2. Таццяна, 1918–2000 гг., г. Масква. Закончыла школу № 325 г. Масквы. Прыйшла ў МІЭМ з МЭІ ў 1969 г. і больш за 20 гадоў загадвала кафедрай тэарэтычных асноў электратэхнікі (ТАЭ). Была вучаніцай і яскравай прадстаўніцай вядомай электратэхнічнай школы акадэміка Карла Адольфавіча Круга, першай жанчынай у СССР – кандыдатам тэхнічных навук, а пасля доктарам навук, прафесарам у галіне ТАЭ. Пры ёй МІЭМ валодаў адной з найлепшых вучэбных лабараторый па электратэхніцы. У МІЭМ на кафедру прыязджалі прадстаўнікі іншых ВНУ з усёй Расіі пераймаць вопыт і асвойваць метадычныя распрацоўкі выкладчыкаў.

Аўтар 5 падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, выдадзеных у цэнтральных расійскіх выдавецтвах, па якіх навучаліся і навучаюцца некалькі пакаленняў студэнтаў МІЭМ і іншых ВНУ:

Татур Т. А. Основы теории электрических цепей. – М.: Высшая школа, 1980. – 270 с.

Татур Т. А. Основы теории электромагнитного поля. – М.: Высшая школа, 1989. – 271 с.

Татур Т. А., Татур В. Е. Анализ электрических цепей. Часть I: Установившиеся процессы. – М.: МЭИ, 1994. – 182 с.

Татур Т. А., Татур В. Е. Анализ электрических цепей. Часть II: Переходные процессы. – М.: МЭИ, 1997. – 232 с.

Татур Т. А., Татур В. Е. Установившиеся и переходные процессы в электрических цепях. – М.: Высшая школа, 2001. – 407 с.

Пад яе кіраўніцтвам абаранілі кандыдацкія дысертацыі больш за 10 аспірантаў, у тым ліку прафесар Ю. П. Башкіраў, дацэнты В. В. Лебедзеў, Е. Г. Осіпаў, якія паспяхова працуюць на кафедры да цяперашняга часу.

Заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі РФ, яна была абрана акадэмікам Расійскай электратэхнічнай акадэміі.

Татур Адам Бярнардавіч. Нарадзіўся ў 1883 г., в. Гарэлец Пухавіцкага р-на; беларус; адукацыя н/пачатковая; рабочы. Саўгас «Зазер'е». Жыў: Мінская вобл., Пухавіцкі р-н, в. Гарэлец. Арыштаваны 18.03.1933 г. Прыгавораны: «тройка» 23.04.1933 г., абвінавачанне: арт. 72 КК БССР – антысавецкая агітацыя. Прыгавор: 5 гадоў выпраўленча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны 14.06.1989 г. Пракуратурай БССР. *Беларускі «Мемарыял».*

Татур Адам Іосіфавіч. Нарадзіўся ў 1887 г., в. Свержынава Койданаўскага р-на Мінскай вобл.; паляк; адукацыя н/пачатковая; селянін, аднаасобная гаспадарка. Жыў: Мінская вобл., Дзяржынскі р-н, хутар Тур'якава. Арыштаваны 30.06.1932 г. Прыгавораны: «тройка» 30.07.1932 г., абвінавачанне: арт. 76 КК БССР – антысавецкая дзейнасць. Прыгавор: 3 гады высылкі. Рэабілітаваны 17.07.1989 г. Пракуратурай БССР. *Беларускі «Мемарыял».*

Татур Аляксандр Адамавіч. Нарадзіўся ў 1908 г., в. Валочыцы, Бабруйская акр., Беларуская ССР; рускі. Жыў: в. Валочыцы, Бабруйская акр., Беларуская ССР. Арыштаваны 04.08.1930 г. Прыгавораны: «тройка» пры АДПУ Беларускай ВА 12.08.1930 г., абвінавачанне: арт. 58-1а КК РСФСР. Прыгавор: 10 гадоў пазбаўлення волі. Варкута. Прыбыў

30.11.1930 г. Вызвалены 04.08.1940 г. *Кніга памяці Рэспублікі Комі*.

Татур Аляксандр Адамавіч. Нарадзіўся 16.03.1893 г., в. Варонічы Грэскага р-на Мінскай акр.; беларус; адукацыя н/пачатковая; селянін, аднаасобная гаспадарка. Жыў: Мінская вобл., Грэскі р-н, в. Варонічы. Арыштаваны 16.02.1930 г. Прыгавораны: «тройка» 26.02.1930 г., абвінавачанне: арт. 76 КК БССР – антысавецкая агітацыя. Прыгавор: 5 гадоў выпраўленча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны 19.05.1989 г. Пракуратурай БССР. *Беларускі «Мемарыял»*.

Татур Аляксандр Пятровіч. Нарадзіўся ў 1904 г., в. Лучнае Чэрвеньскага р-на Мінскай вобл.; беларус; адукацыя н/пачатковая; калгаснік, калгас імя Молатава. Жыў: Мінская вобл., Чэрвеньскі р-н, в. Лучнае. Арыштаваны 18.07.1937 г. Прыгавораны: «тройка» 17.09.1937 г., абвінавачанне: арт. 72 КК БССР – антысавецкая агітацыя. Прыгавор: вышэйшая мера пакарання (ВМП), канфіскацыя маёмасці. Расстраляны 04.10.1937 г. Месца пахавання – Мінск. Рэабілітаваны 22.03.1989 г. Пракуратурай БССР. *Беларускі «Мемарыял»*.

Татур Ганна Вацлаўна. Нарадзілася ў 1936 г., Брэсцкая губ., Пружанскі р-н, Перадзельск; полька. Жыла: Брэсцкая вобл., Пружанскі р-н, Перадзельск. Прыгавор: прыб. на спецпасяленне ў Архангельскую вобл. 01.03.1940 г., Емецкі р-н, Ліпавік. *База дадзеных «Польскія спецперасяленцы ў Архангельскай вобл.»*.

Татур Антон Адамавіч. Нарадзіўся ў 1876 г., Брэст-Літоўская губ., Пружанскі р-н, Сухаполь; паляк; адукацыя ніжэйшая. Жыў: Брэсцкая вобл., Пружанскі р-н, Сухаполь. Прыгавор: высылка, прыб. на спецпасяленне ў Архангельскую вобл. 04.03.1940 г., Вінаградаўскі р-н, Карговіна. Памёр 05.10.1940 г. *База дадзеных «Польскія спецперасяленцы ў Архангельскай вобл.»*.

Татур Антон Вацлавіч. Нарадзіўся ў 1940 г., Палескае ваяводства, Пружанскі р-н, Перадзельск; паляк. Жыў: Брэсцкая вобл., Пружанскі р-н, Перадзельск. Прыгавор: высылка, прыб. на спецпасяленне ў Архангельскую вобл. 01.03.1940 г., Емецкі р-н, Ліпавік. *База дадзеных «Польскія спецперасяленцы ў Архангельскай вобл.»*.

Татур Антон Мартынавіч. Нарадзіўся ў 1905 г., в. Суцін Пухавіцкага р-на Мінскай вобл.; паляк; адукацыя н/пачатковая; рабочы. Саўгас «Залог Пяцігодкі». Жыў: Мінская вобл., Пухавіцкі р-н, в. Суцін. Арыштаваны 25.10.1937 г. Прыгавораны: Камісія НКУС СССР і Пракурора СССР 09.12.1937 г., абвінавачанне: арт. 68, 76 КК БССР – член шпіёнска-паўст. групы. Прыгавор: ВМП. Расстраляны 13.01.1938 г. Месца пахавання – Бабруйск. Рэабілітаваны 26.04.1960 г. Ваенны трыбунал БВА. *Беларускі «Мемарыял»*.

Татур Антон Міхайлавіч. Нарадзіўся ў 1914 г., в. Рахавічы Ленінскага р-на Пінскай вобл.; беларус; адукацыя пачатковая; селянін, аднаасобная гаспадарка. Жыў: Брэсцкая вобл., Ленінскі р-н, в. Рахавічы. Арыштаваны 30.10.1940 г. Прыгавораны: Асобая нарада пры Калегіі ДПУ 12.05.1941 г., абвінавачанне: арт. 64, 76 КК БССР – член к/р арганізацыі. Прыгавор: 8 гадоў ВПЛ, адбыв.: «Севвостлаг». Рэабілітаваны 06.05.1989 г. УКГБ і Пракуратурай Брэсцкай вобл. *Беларускі «Мемарыял»*.

Татур Антон Мікалаевіч. Нарадзіўся ў 1905 г., в. Свірынава Стаўпецкага павета; паляк; адукацыя пачатковая; селянін, аднаасобная гаспадарка. Жыў: Мінская вобл., Дзяржынскі р-н, хутар Тур'янава. Арыштаваны 10.02.1932 г. Прыгавораны: «тройка» 11.05.1932 г., абвінавачанне: арт. 68, 72 КК БССР – агент польскіх разведорганаў. Прыгавор: 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны

30.06.1989 г. Пракуратурай БВА. *Беларускі «Мемарыял».*

Татур Антон Ульянавіч. Нарадзіўся ў 1906 г., в. Трубяціна Любанскага р-на Мінскай вобл.; беларус; адукацыя пачатковая; механік, Любанская МТС. Жыў: Мінская вобл., Любанскі р-н, Любань. Арыштаваны 12.11.1937 г. Прыгавораны: «тройка» 27.11.1937 г., абвінавачанне: арт. 24-70 КК БССР – тэрарыстычныя намеры. Прыгавор: ВМП, канфіскацыя маёмасці. Расстраляны 23.01.1938 г. Месца пахавання – Слуцк. Рэабілітаваны 25.04.1959 г. Судовай калегіяй па крымінальных справах ВС БССР. *Беларускі «Мемарыял».*

Татур Антаніна Вікенцьеўна. Нарадзілася ў 1902 г., Брэст-Літоўская губ., Пружанскі р-н, Сухаполь; полька; адукацыя ніжэйшая. Жыла: Брэсцкая вобл., Пружанскі р-н, Сухаполь. Прыгавор: высылка, прыб. на спецпасяленне ў Архангельскую вобл. 04.03.1940 г., Вінаградаўскі р-н, Карговіна. Вызвалена са спецпасялення па амністыі 07.09.1941 г. *База дадзеных «Польскія спецперасяленцы ў Архангельскай вобл.».*

Татур Баляслаў Баляслававіч. Нарадзіўся ў 1892 г., в. Барок Пухавіцкага р-на БССР; паляк; непісьменны; беспрацоўны. Жыў: Мінская вобл., Барысаўскі р-н, Барысаў, вул. Паштовая, 59. Арыштаваны 02.02.1933 г. Прыгавораны: «тройка» 26.05.1933 г., абвінавачанне: арт. 72, 64, 118 КК БССР – ухіленне ад высялення, уцёкі з-пад канвою, антысавецкая агітацыя. Прыгавор: 3 гады ВПЛ. Рэабілітаваны 23.10.1989 г. Пракуратурай БССР. *Беларускі «Мемарыял».*

Татур Валянціна Іосіфаўна. Нарадзілася ў 1911 г., Томская губ.; руская; урач-лабарант палiклінікі мясакамбіната. Жыла: г. Барнаул. Арыштавана 05.11.1937 г. Прыгаворана: Асобая нарада пры НКУС СССР 21.10.1938 г., абвінавачанне: арт. 58-10. Прыгавор: пазбаўленне волі на тэрмін папярэдняга зняволення. Рэабілітавана 29.12.1992 г. Пракуратурай Алтайскага краю. *Кніга памяці Алтайскага краю.*

Татур Валерыян Адамавіч. Нарадзіўся ў 1902 г., в. Балотчыцы Старобінскага р-на Бабруйскай акругі; паляк; адукацыя н/пачатковая; селянін, аднаасобная гаспадарка. Жыў: Мінская вобл., Старобінскі р-н, в. Балотчыцы. Арыштаваны 02.11.1929 г. Прыгавораны: Калегія АДПУ 03.01.1930 г., абвінавачанне: арт. 72 КК БССР – антысавецкая агітацыя. Прыгавор: 3 гады ВПЛ, адбыв.: Цемнікаўскі ВПЛ, ст. Поцьма. Рэабілітаваны 12.12.1989 г. Пракуратурай Мінскай вобл. *Беларускі «Мемарыял».*

Татур Васіль Адамавіч. Нарадзіўся ў 1870 г., в. Варонічы Грэскага р-на Мінскай акр.; беларус; адукацыя н/пачатковая; селянін, аднаасобная гаспадарка. Жыў: Мінская вобл., Грэскі р-н, в. Варонічы. Арыштаваны 12.12.1929 г. Прыгавораны: Калегія АДПУ 20.01.1930 г., абвінавачанне: арт. 58-10, 11 КК РСФСР – антысавецкая агітацыя. Прыгавор: 3 гады высылкі, канфіскацыя маёмасці, адбыв.: г. Архангельск. Рэабілітаваны 27.12.1989 г. Пракуратурай Мінск. вобл. *Беларускі «Мемарыял».*

Татур Вацлаў Антонавіч. Нарадзіўся ў 1909 г., Брэсцкая губ., Пружанскі р-н, Перадзельск; паляк; адукацыя ніжэйшая. Жыў: Брэсцкая вобл., Пружанскі р-н, Перадзельск. Прыгавор: высылка, прыб. на спецпасяленне ў Архангельскую вобл. 01.03.1940 г., Емецкі р-н, Ліпавік. Вызвалены са спецпасялення па амністыі 07.09.1941 г. *База дадзеных «Польскія спецперасяленцы ў Архангельскай вобл.».*

Татур Вікенцій Міхайлавіч. Нарадзіўся ў 1903 г., Мінская губ., Чэрвеньскі р-н; беларус;

с/г арцель, рабочы. Жыў: Н.-Амурская вобл., хутар Герман, ДВК. Арыштаваны Н.-Амурскім АУНКУС 25.08.1937 г. Прыгавораны: нач-к Ніжне-Амурскага АУНКУС па ДВК 22.02.1939 г., абвінавачанне: арт. 58-10 КК РСФСР. Прыгавор: справа спынена за недаказанасцю абвінавачання, рэабілітаваны. *Кніга памяці Алтайскага краю.*

Татур Віктар Мартынавіч. Нарадзіўся ў 1902 г., в. Суцін Пухавіцкага р-на Мінскай вобл.; паляк; адукацыя н/пачатковая; рабочы, с-з «Залог Пяцігодкі». Жыў: Мінская вобл., Пухавіцкі р-н, в. Суцін. Арыштаваны 25.10.1937 г. Прыгавораны: Камісія НКУС СССР і Пракурора СССР 09.12.1937 г., абвінавачанне: 68, 76 КК БССР – член шпіёнска-паўст. групы. Прыгавор: ВМП. Расстраляны 13.01.1938 г. Месца пахавання – Бабруйск. Рэабілітаваны 26.04.1960 г. Ваенным трыбуналам БВА. *Беларускі «Мемарыял».*

Татур Віктар Францавіч (Табур). Нарадзіўся ў 1872 г., Баранавіцкая вобл., Стаўбцоўскі р-н, Коласаў; беларус; на с/п – на ўтрыманні сына. Жыў: Беларуская ССР, Баранавіцкая вобл., Стаўбцоўскі р-н, Паркаўшчына. Прыгавораны: 10.02.1940 г., абвінавачанне: асаднік. Прыгавор: высылка 24.02.1940 г., прыб. на спецпасяленне: Валагодская вобл., Важагодскі р-н, пас. Зеленаборскі. 25.08.1940 г. памёр на спецпасяленні, месца пахавання: пас. Зеленаборскі, Важагодскі раён. *База дадзеных «Польскія спецперасяленцы ў Валагодскай вобл.».*

Татур Вікторыя Вікенцьеўна. Нарадзілася ў 1911 г., хут. Падкаменне Пухавіцкага р-на Мінскай акр.; полька; адукацыя пачатковая; сялянка, аднаасобная гаспадарка. Жыла: Мінская вобл., Пухавіцкі р-н, хутар Падкаменне. Прыгаворана: Калегія АДПУ 23.08.1929 г., абвінавачанне: арт. 24-68 КК БССР – спрыянне шпіянажу. Прыгавор: 3 гады высылкі, адбыв.: Паўночны край. Рэабілітавана 09.09.1991 г. Пракуратурай БВА. *Беларускі «Мемарыял».*

Татур Уладзімір Адамавіч. Нарадзіўся ў 1917 г., в. Чаплічы Чырвонаслабодскага р-на Бабруйскай вобл.; беларус; адукацыя н/сярэдняя; шафёр, калгас «Майскі прамень». Жыў: Мінская вобл., Чырвонаслабодскі р-н, в. Чаплічы. Арыштаваны 05.04.1950 г. Прыгавораны: судовы орган 17.08.1950 г., абвінавачанне: арт. 63-2 КК БССР – здрада Радзіме. Прыгавор: 15 гадоў ВПЛ, 5 гадоў пазбаўлення правоў, канфіскацыя маёмасці, адбыв.: Краснаярскі ВПЛ. Вызвалены: 03.06.1955 г. Рэабілітаваны 19.06.1986 г. Ваеннай калегіяй ВС БССР. *Беларускі «Мемарыял».*

Татур Уладзімір Дзмітрыевіч. Нарадзіўся ў 1906 г., хутар Беразнякі Глускага р-на Магілёўскай вобл.; беларус; адукацыя пачатковая; вартаўнік, Глускі лягсас. Жыў: Магілёўская вобл., Глускі р-н, хутар Беразнякі. Арыштаваны 24.08.1937 г. Прыгавораны: «тройка» 08.10.1937 г., абвінавачанне: арт. 72 – удзел у к/р кулацкай арганізацыі. Прыгавор: 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны 16.04.1960 г. Магілёўскім абласным судом. *Беларускі «Мемарыял».*

Татур Уладзіслаў Антонавіч. Нарадзіўся ў 1892 г., в. Застар'е Клічаўскага р-на Магілёўскай вобл.; паляк; калгаснік, калгас в. Застар'е. Жыў: Магілёўская вобл., Клічаўскі р-н, в. Застар'е. Арыштаваны 18.05.1931 г. Прыгавораны: «тройка» 27.08.1931 г., абвінавачанне: арт. 76 – удзел у к/р кулацкай арганізацыі. Прыгавор: 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны 14.09.1962 г. Судовай калегіяй па крымінальных справах Вярхоўнага суда БССР. *Беларускі «Мемарыял».*

Татур Галіна Канстанцінаўна. Нарадзілася ў 1929 г., Брэст-Літоўская губ., Пружанскі

р-н, Сухаполь; полька; адукацыя ніжэйшая. Жыла: Брэсцкая вобл., Пружанскі р-н, Сухаполь. Прыгавор: высылка, прыб. на спецпасяленне ў Архангельскую вобл. 04.03.1940 г., Вінаградаўскі р-н, Карговіна. *База дадзеных «Польскія спецперасяленцы ў Архангельскай вобл.».*

Татур Генадзь Станіслававіч. Нарадзіўся ў 1943 г., п. Сівакі Тыгдзінскага р-на Амурскай вобл. Прыгавор: нарадзіўся на спецпасяленні бацькоў. Рэабілітаваны 18.10.2004 г. УУС Амурскай вобл. *УУС Амурскай вобл.*

Татур Грыгорый Дамініканавіч. Нарадзіўся ў 1907 г., в. Суціна Пухавіцкага р-на Мінскай акругі; паляк; адукацыя н/пачатковая; селянін, аднаасобная гаспадарка. Жыў: Мінская вобл., Пухавіцкі р-н, в. Суціна. Арыштаваны 12.09.1930 г. Прыгавораны: «тройка» 26.10.1930 г., абвінавачанне: арт. 72, 118 КК БССР – антысавецкая дзейнасць. Прыгавор: 3 гады ВПЛ. Рэабілітаваны 13.07.1989 г. Пракуратурай БССР. *Беларускі «Мемарыял».*

Татур Дамінік Францавіч. Нарадзіўся ў 1863 г., хут. Ліпнікі Пухавіцкага р-на Мінскай вобл.; паляк; непісьменны; селянін, аднаасобная гаспадарка. Жыў: Мінская вобл., Пухавіцкі р-н, хутар Ліпнікі. Арыштаваны 07.02.1930 г. Прыгавораны: «тройка» 05.03.1930 г., абвінавачанне арт. 76 КК БССР – член к/р групы. Прыгавор: высылка. Рэабілітаваны 24.08.1989 г. Пракуратурай БССР. *Беларускі «Мемарыял».*

Татур Кацярына Аляксееўна. Нарадзілася ў 1884 г., Маскоўская вобл., в. Гур'ева; без пэўных заняткаў. Жыла: Маскоўская вобл., пас. Клязьма. *Кніга памяці Маскоўскай вобл.*

Татур Алена Кастанаўна (варыянты імя: Марыя; варыянты імя па бацьку: Віктараўна). Нарадзілася ў 1900 г. (1892), Баранавіцкая вобл., Стаўбцоўскі р-н, Сверанава; полька. Жыла: Беларуская ССР, Баранавіцкая вобл., Стаўбцоўскі р-н, Паркаўшчына. Прыгаворана: 10.02.1940 г., абвінавачанне: асаднік. Прыгавор: высылка. 24.02.1940 г. прыб. на спецпасяленне: Валагодская вобл., Važагодскі р-н, Зеленаборскі. Вызв. 03.09.1941 г. па Указе ПВС СССР «Аб амністыі польскіх грамадзян». *База дадзеных «Польскія спецперасяленцы ў Валагодскай вобл.».*

Татур Іван Іосіфавіч. Нарадзіўся ў 1895 г., в. Балотчыцы Старобінскага р-на Бабруйскай акругі; паляк; адукацыя н/пачатковая; селянін, аднаасобная гаспадарка. Жыў: Мінская вобл., Старобінскі р-н, в. Балотчыцы. Арыштаваны 02.11.1929 г. Прыгавораны: Калегія АДПУ 03.11.1930 г., абвінавачанне: арт. 76 КК БССР – антысавецкая дзейнасць. Прыгавор: 3 гады ВПЛ, адбыв.: Паўночны лагер, г. Котлас. Рэабілітаваны 26.12.1989 г. Пракуратурай Мінскай вобл. *Беларускі «Мемарыял».*

Татур Ігнат Антонавіч. Нарадзіўся 17.08.1890 г., в. Ясень Асіповіцкага р-на Магілёўскай вобл.; паляк; адукацыя н/пачатковая; слесар, рабочы НСПР-2 ст. Асіповічы. Жыў: Магілёўская вобл., Асіповічы. Арыштаваны 28.03.1938 г. Прыгавораны: судовы орган 21.04.1938 г., абвінавачанне: арт. 68, 71, 76 – шпіёнская дзейнасць. Прыгавор: ВМП. Расстраляны 24.05.1938 г. Рэабілітаваны 30.11.1959 г. вызначэннем ВТ Беларускай ВА. *Беларускі «Мемарыял».*

Татур Іосіф Аляксандравіч. Нарадзіўся ў 1899 г., в. Пратасаўшчына Мінскай губ., Беларусь; беларус. Працаваў на прыіску «Марыінскі» ў Селямжынскім р-не. Прыгавораны: «тройка» УНКУС па ДВК 29.03.1938 г., абвінавачанне: арт. 58 КК РСФСР. Прыгавор: ВМП. Расстраляны 29.03.1938 г. Рэабілітаваны 26.01.1990 г. заключэннем пракурора Амурскай вобласці. *Кніга памяці Амурскай вобл.*

Татур Іосіф Мартынавіч. Нарадзіўся ў 1909 г., хут. Зарэчча Пухавіцкага р-на Мінскай вобл.; паляк; адукацыя н/пачатковая; рабочы, саўгас «Залог Пяцігодкі». Жыў: Мінская вобл., Пухавіцкі р-н, хутар Зарэчча. Арыштаваны 25.10.1937 г. Прыгавораны: Камісія НКУС СССР і Пракурора СССР 09.12.1937 г., абвінавачанне: арт. 68, 76 КК БССР – член шпіёнска-паўст. групы. Прыгавор: ВМП. Расстраляны 13.01.1938 г. Месца пахавання – Бабруйск. Рэабілітаваны 26.04.1960 г. Ваенным трыбуналам БВА. *Беларускі «Мемарыял»*.

Татур Ірэнь Канстанцінавіч. Нарадзіўся ў 1931 г., Брэст-Літоўская губ., Пружанскі р-н, Сухаполь; паляк; адукацыя ніж. Жыў: Брэсцкая вобл., Пружанскі р-н, Сухаполь. Прыгавор: высылка, прыб. на спецпасяленне ў Архангельскую вобл. 04.03.1940 г., Вінаградаўскі р-н, Карговіна. *База дадзеных «Польскія спецперасяленцы ў Архангельскай вобл.»*.

Татур Казімір Вікенцьевіч. Нарадзіўся 10.01.1910 г., засценак Ліпніцкія Гавязнянскай вол. Нясвіжскага павета; паляк; адукацыя пачатковая; селянін, аднаасобная гаспадарка. Жыў: Мінская вобл., Нясвіжскі р-н, Гавязнянская вол., пас. Грасноўшчына. Арыштаваны 15.12.1939 г. Прыгавораны: Асобая нарада пры НКУС СССР 10.02.1940 г., абвінавачанне: арт. 74 КК БССР – агент польскай паліцыі. Прыгавор: 8 гадоў ВПЛ, адбыв.: Варкутапечлаг, вызв. 03.04.1942 г. Рэабілітаваны 30.05.1989 г. Пракуратурай БССР. *Беларускі «Мемарыял»*.

Татур Канстанцін Антонавіч. Нарадзіўся ў 1898 г., Брэст-Літоўская губ., Пружанскі р-н, Сухаполь; паляк; адукацыя н/с. Жыў: Брэсцкая вобл., Пружанскі р-н, Сухаполь. Прыгавор: высылка, прыб. на спецпасяленне ў Архангельскую вобл. 04.03.1940 г., Вінаградаўскі р-н, Карговіна. Вызвалены са спецпасялення па амністыі 07.09.1941 г. *База дадзеных «Польскія спецперасяленцы ў Архангельскай вобл.»*.

Татур Міхаіл Міхайлавіч. Нарадзіўся ў 1886 г., в. Старчыцы Чырвонаслабодскага р-на; беларус; адукацыя сярэдняя; настаўнік, школа. Жыў: Мінская вобл., Старобінскі р-н, в. Даманавічы. Арыштаваны 28.07.1931 г. Прыгавораны: Калегія АДПУ 07.02.1932 г., абвінавачанне арт. 58-2, 11 КК РСФСР – антысавецкая дзейнасць. Прыгавор: 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны 31.05.1989 г. Пракуратурай БВА. *Беларускі «Мемарыял»*.

Татур Мікалай Іосіфавіч. Нарадзіўся ў 1913 г., в. Старчыцы Чырвонаслабодскага р-на; беларус; адукацыя н/пачатковая; селянін, аднаасобная гаспадарка. Жыў: Мінская вобл., Чырвонаслабодскі р-н, в. Старчыцы. Арыштаваны 31.01.1931 г. Прыгавораны: Калегія АДПУ 07.02.1932 г., абвінавачанне: арт. 58-2, 11 КК РСФСР – антысавецкая дзейнасць. Прыгавор: 3 гады ВПЛ. Рэабілітаваны 31.05.1989 г. Пракуратурай БВА. *Беларускі «Мемарыял»*.

Татур Восіп Аляксандравіч. Нарадзіўся ў 1898 г., в. Пратасаўшчына Пухавіцкага р-на Мінскай вобл.; беларус; адукацыя н/пачатковая; селянін, аднаасобная гаспадарка. Жыў: Мінская вобл., Пухавіцкі р-н, в. Пратасаўшчына. Арыштаваны 05.04.1930 г. Прыгавораны: «тройка» 18.04.1930 г., абвінавачанне: арт. 66, 72 КК БССР – антысавецкая дзейнасць, антысавецкая агітацыя. Прыгавор: высылка. Рэабілітаваны 18.03.1961 г. Прэзідыумам Мінскаблсуда. *Беларускі «Мемарыял»*.

Татур Атон Адамавіч. Нарадзіўся ў 1876 г., в. Барок Пухавіцкага р-на Мінскай вобл.; беларус; непісьменны; селянін, аднаасобная гаспадарка. Жыў: Мінская вобл., Пухавіцкі р-н, в. Буйнічы. Арыштаваны 25.12.1932 г. Прыгавораны:

«тройка» 09.06.1933 г., абвінавачанне: арт. 72, 76, 75, 63 КК БССР – антысавецкая агітацыя. Прыгавор: 5 гадоў высылкі. Рэабілітаваны 22.05.1959 г. Судовай калегіяй па крымінальных справах ВС БССР. *Беларускі «Мемарыял»*.

Татур Павел Лонгінавіч (варыянты імя па бацьку: Логінавіч). Нарадзіўся ў 1908 г., в. Татуры, Грэскі р-н, БССР; беларус. Жыў: п. Усць-Анолва, Качэўскі р-н, Пермская вобл. Арыштаваны 01.01.1938 г. Прыгавораны: 27.03.1939 г. Прыгавор: справа спынена за недастатковасцю ўлік. Вызвалены 28.03.1939 г. *Кніга памяці Пермскай вобл.*

Татур Сафія Пятроўна. Нарадзілася ў 1912 г., Брэсцкая губ., Пружанскі р-н, Перадзельск; полька; адукацыя ніж. Жыла: Брэсцкая вобл., Пружанскі р-н, Перадзельск. Прыгавор: высылка, прыб. на спецпасяленне ў Архангельскую вобл. 01.03.1940 г., Емецкі р-н, Ліпавік. Памерла 09.03.1941 г. *База дадзеных «Польскія спецперасяленцы ў Архангельскай вобл.»*.

Татур Станіслаў Адольфавіч. Нарадзіўся ў 1898 г., Томская губ.; паляк. Бухгалтар лестрангаса. Жыў: Троіцкі р-н, с. Пясьянка. Арыштаваны 20.08.1937 г. Прыгавораны: Асобая нарада пры НКУС СССР 15.12.1937 г., абвінавачанне: арт. 58-2, 6, 9, 11. Прыгавор: ВМП. Расстраляны 30.12.1937 г. Рэабілітаваны 05.06.1959 г. ваенным трыбуналам СібВА, справа спынена за адсутнасцю складу злачынства. *Кніга памяці Алтайскага краю.*

Татур Станіслаў Віктаравіч. Нарадзіўся ў 1914 г., Баранавіцкая вобл., Стаўбцоўскі р-н, Застар'е; беларус; ляснічы. Жыў: Беларуская ССР, Баранавіцкая вобл., Стаўбцоўскі р-н, Паркаўшчына. Прыгавораны: 10.02.1940 г., абвінавачанне: асаднік. Прыгавор: высылка. 24.02.1940 г. прыб. на спецпасяленне: Валагодская вобл., Важагодскі р-н, Зеленаборскі. Вызвалены. 03.09.1941 г. па Указе ПВС СССР "Аб амністыі польских грамадзян". *База дадзеных «Польскія спецперасяленцы ў Валагодскай вобл.»*.

Татур Феліцыян Фаміч. Нарадзіўся ў в. Смалярня Чэрвеньскага р-на Мінскай акр.; паляк; адукацыя н/пачатковая; селянін, аднаасобная гаспадарка. Жыў: Мінская вобл., Чэрвеньскі р-н, в. Смалярня. Арыштаваны 04.04.1930 г. Прыгавораны: «тройка» 18.04.1930 г., абвінавачанне: арт. 66, 72 КК БССР – антысавецкая агітацыя, член банды. Прыгавор: высылка. Рэабілітаваны 27.12.1989 г. Пракуратурай БССР. *Беларускі «Мемарыял»*.

Татур Францішка Іванаўна. Нарадзілася ў 1924 г., м. Мікашэвічы Лунінецкага р-на Брэсцкай вобл.; полька; адукацыя н/сярэдняя; не працавала. Жыла: Брэсцкая вобл., Лунінецкі р-н, в. Рудня. Арыштавана 26.03.1940 г. Прыгаворана: Асобая нарада пры НКУС СССР 19.10.1940 г., абвінавачанне: арт. 64, 76 КК БССР – член к/р арганізацыі. Прыгавор: 5 гадоў ВПЛ, адбывала: Барнаул, вызвалена 05.12.1941 г. Рэабілітавана 21.08.1989 г. Пракуратурай Брэсцкай вобл. *Беларускі «Мемарыял»*.

Татур Юзэфа Францаўна. Нарадзілася ў 1884 г., в. Трасцянец Мінскай акр.; полька; непісьменная; аднаасобнік, аднаасобная гаспадарка. Жыла: Мінская вобл., Пухавіцкі р-н, хутар Падкаменне. Прыгаворана: калегія АДПУ 23.08.1929 г., абвінавачанне: арт. 24-68 КК БССР – спрыянне шпіянажу. Прыгавор: 3 гады высылкі, адбывала: Паўночны край. Рэабілітавана 09.09.1991 г. Пракуратурай БВА. *Беларускі «Мемарыял»*.

Татур Юліян Антонавіч. Нарадзіўся ў 1913 г., в. Застар'е Клічаўскага р-на Магілёўскай вобл.; беларус; адукацыя н/пачатковая; калгаснік, калгас в. Застар'е. Жыў: Магілёўская вобл., Клічаўскі р-н,

в. Застар'е. Арыштаваны 18.05.1931 г. Прыгавораны: «тройка» 27.08.1931 г., абвінавачанне: арт. 76 – удзел у к/р кулацкай арганізацыі. Прыгавор: утрыманне пад вартай 3 месяцы, вызвалены 27.08.1931 г. Рэабілітаваны 14.09.1962 г. Судовай калегіяй па крымінальных справах Вярхоўнага суда БССР. *Беларускі «Мемарыял»*.

Татур Юльян Антонавіч. Нарадзіўся ў 1912 г., хутар Застар'е Клічаўскага р-на Магілёўскай вобл.; паляк; адукацыя пачатковая; калгаснік, калгас «Н. Шлях» Клічаўскага р-на. Жыў: Магілёўская вобл., Клічаўскі р-н, хутар Застар'е. Арыштаваны 09.07.1938 г. Прыгавораны: «тройка» 11.10.1938 г., абвінавачанне: арт. 68 – шпіянаж. Прыгавор: ВМП. Расстраляны 28.11.1938 г. Месца пахавання – Магілёў. Рэабілітаваны 07.06.1963 г. Вызначэннем Ваеннага Трыбунала БВА. *Беларускі «Мемарыял»*.

Татур Ядвіга Іванаўна. Нарадзілася ў м. Пухавічы Пухавіцкага р-на Мінскай вобл.; полька; адукацыя н/пачатковая; сялянка, аднаасобная гаспадарка. Жыла: Мінская вобл., Пухавіцкі р-н, м. Пухавічы. Арыштавана 28.06.1932 г. Прыгаворана: Калегія АДПУ 23.09.1932 г., абвінавачанне: арт. 58-10, 17-58-2 КК РСФСР – сувязь з польагентамі, ведала пра к/р арганізацыю. Прыгавор: 3 гады высылкі. Рэабілітавана 28.12.1960 г. Ваенным Трыбуналам БВА. *Беларускі «Мемарыял»*.

Татур-Гіліцкая Леанардзія Мікалаеўна. Нарадзілася ў 1895 г., в. Буйнічы Пухавіцкага р-на Мінскай вобл.; полька; адукацыя н/пачатковая; сялянка, аднаасобная гаспадарка. Жыла: Мінская вобл., Пухавіцкі р-н, в. Буйнічы. Арыштавана 08.01.1933 г. Прыгаворана: «тройка» 09.06.1933 г., абвінавачанне: арт. 72, 75, 76, 63 КК БССР – антысавецкая агітацыя. Прыгавор: 3 гады высылкі. Рэабілітавана 22.05.1959 г. Судовай калегіяй па крымінальных справах ВС БССР. *Беларускі «Мемарыял»*.

Татур Адам Антонавіч. Нарадзіўся ў 1860 г., засценак Балотчыцы Старобінскага р-на Бабруйскай акругі; паляк; адукацыя н/пачатковая; без пэўных заняткаў. Жыў: Мінская вобл., Старобінскі р-н, засценак Балотчыцы. Прыгавораны: «тройка» 13.07.1930 г., абвінавачанне: арт. 72, 118 КК БССР – антысавецкая дзейнасць. Прыгавор: дазволена свабоднае пражыванне ў БССР. Рэабілітаваны 30.05.1989 г. Пракуратурай БССР. *Беларускі «Мемарыял»*.

Сеўрукі герба «Курч»



Герб «Курч»
роду Сеўрукаў.

У нашым родзе ва ўсе часы былі людзі, якія з вялікай любоўю і асаблівым хваляваннем вывучалі свае вытокі, сваё мінулае. Так, мы памятаем братоў Іллю і Паўла Карафа-Корбутаў: яны і ў няпростыя часы першай паловы XX ст. не пабаяліся апісаць і захаваць генеалагічнае дрэва сваіх продкаў і сваякоў па некалькіх дваранскіх родах, што жылі ў Бабруйскім павеце.

Такімі ж неабыякавымі да свайго мінулага былі кандыдат філасофіі са Слуцка Іосіф Ян Курчэвіч з Сотвы Сеўрук і тытулярны саветнік Васіль Міхайлаў Курчэвіч-Сеўрук, якія жылі ў XIX ст.

Васіль Міхайлавіч яшчэ ў гімназіі захапіўся гісторыяй свайго роду і паходжаннем прозвішча. Сабранага ім матэрыялу хапіла на кнігу «Выводъ о происхождении прозвищъ: Севрукъ и Курчевичъ-Севрукъ», якая была выдадзена ў Мінску ў 1896 г., а ў 1897 г. выйшаў яе дапоўнены і выпраўлены варыянт. Гэтае выданне, якое стала бібліяграфічнай рэдкасцю, мне ўдалося знайсці ў Расійскай нацыянальнай бібліятэцы ў Санкт-Пецярбургу.

Восіп Ян Курчэвіч у 1813 г. закончыў Віленскі ўніверсітэт, атрымаўшы званне кандыдата філасофіі. Выкладаў у Слуцкім дваранскім вучылішчы і зрабіў асноўны ўнёсак у збор дакументаў пра дваранскае паходжанне Сеўрукаў: у 1824 г. падаў звесткі ў Мінскі дэпутацкі дваранскі сход пра 125 прадстаўнікоў роду.


Лёсам было адмерана яму толькі 43 гады жыцця. Пахаваны ў Слуцку. На магіле – вялікі камень з надпісам на польскай мове: «Святой памяці Іосіфа Сеўрука, прафесара Слуцкай гімназіі, мужа Праўды і Дабрадзейнасці 1836 года». З горыччу піша пра гэта Васіль Міхайлавіч Курчэвіч-Сеўрук: «Помнік паклалі яго вучні і таварышы з павагі да яго асобы, але Сеўрукі не здагадаліся паставіць, як ён таго заслужыў...»


Неабходна сказаць і пра іншых прадстаўнікоў роду, што дапамагалі Іосіфу Сеўруку ў яго высакароднай справе, і перш за ўсё пра Мацея Пятровіча Сеўрука, які шмат зрабіў для збору сямейных дакументаў. Так здарылася, што ў час збору дадатковых звестак у студзені 1838 г. ён памёр па дарозе з Мінска ў Слуцк.

На апошнім этапе ў падрыхтоўцы дакументаў роду для падачы ў Мінскі дваранскі дэпутацкі сход браў удзел Павел Іванавіч Сеўрук, па словах Васіля Курчэвіча-Сеўрука, «арандатар маёнтка Галіцы, характару цярплівага, выпрацаванага і разважлівага».

Вось што піша на генеалагічнай схеме роду Курчэвічаў з Сотвы герба «Курч», якая захоўваецца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі, Васіль Міхайлавіч Курчэвіч-Сеўрук, абапіраючыся на даследаванне М. Стрыйкоўскага: «Курч ёсць герб Курчоў князёў рускіх, узяты ад Карыята, князя Навагрудскага, аднаго з сыноў Гедыміна Віценевіча, князя літоўскага Карыята». Карыят Гедымінавіч, пасля хрышчэння названы Міхаілам, нарадзіўся ў 1301 г., меў сына па імені Юрый-Аляксандр-Фёдар-Глеб.

Аднаго з Курчоў, які жыў на Валыні ў маёнтку Сотва і называўся ў прастамоўі Корташам, празвалі Сеўрукам, Сеўрукам-Северуком, што звязана з Северскім княствам, магчыма, з яго сталіцай Ноўгарад-Северскім. Як адзначае Васіль Міхайлавіч Курчэвіч-Сеўрук у названай кнізе-даследаванні, прозвішчы ў Паўночна-Заходнім краі паходзяць ад мясцовасці, назваў маёнткаў і гарадоў. Прозвішча Сеўрук, хутчэй за ўсё, пайшло ад назвы мясцовасці, як, напрыклад, Пінчук – ад Пінск, Мінчук – ад Мінск, так і «Севрукъ отъ Северщизны».


Herb Kurcz



Радаводнае дрэва Сеўрукаў.
НГАБ, ф. 319, воп. 1, спр. 126, арк. 12.



ВЫВОДЪ
о
ПРОИСХОЖДЕНІИ
прозвищъ:
СЕВРУКЪ
и
Курчевичъ-Севрукъ.
дополненный и исправленный.

МИНСКЪ.

Кніга В. М. Курчэвіча-Сеўрука пра паходжанне прозвішчаў Сеўрук і Курчэвіч-Сеўрук. *Расійская нацыянальная бібліятэка, Санкт-Пецярбург.*

Васіль Міхайлавіч прапануе нашчадкам з роду Сеўрукаў прадоўжыць даследаванне сваіх каранёў і раіць шукаць звесткі ў Валынскіх і Літоўскіх хроніках. Дзякуючы яго імкненням звесткі пра род Сеўрукаў значна пашыраны: «...у гэтым радаводзе [Сеўрукаў] 230 душ, мяркую, што палавіна з іх жывыя: старыя і маладыя, колькасць значная; але да вялікага майго незадавальнення, вельмі мала тых, што шанавалі сваё дваранскае званне, служылі на дзяржаўнай рускай службе: ваеннай, цывільнай, усяго толькі чатырнаццаць асоб, а іншыя да іх сораму (калі яго ведаюць) непісьменныя, цёмныя, дзікія, не вучацца, не служаць дзяржаве ні ў якіх установах, а хаваюцца ў цёмных хлявах ад святла навукі, як краты пад зямлёю. Сакавіка 2 дня 1889 года. Тытулярны саветнік Васіль Міхайлаў Сеўрук». Вось так! З аднако боку, гонар за свой старажытны род, з другога – жаданне прысароміць і заахвоціць суродзічаў-сучаснікаў да вучобы і дзяржаўнай службы.

У сваім даследаванні Васіль Міхайлавіч Курчэвіч-Сеўрук з любоўю і глыбокай павагай выказваўся пра адукаваных прадстаўнікоў роду і не ўхваляў нежаданне вучыцца, ляноту, пасіўнасць, у цэлым даўшы наступную характарыстыку роду: «У грамадскім жыцці яны, Сеўрукі, спакойныя, мірныя, прыстойныя, сумленныя, але былі б лепшыя, калі б разумелі грамату і вялі жыццё, адпаведнае двараніну, чыстае, а не неахайнае».

Пазнаёмім чытача з найбольш значнымі, на наш погляд, старонкамі ўжо згаданай кнігі Васіля Курчэвіча-Сеўрука.

Васіль Міхайлавіч лічыў, што паходзіць род «Сеўрукаў ад двух родных братоў, якія жылі ў XV ст. і карысталіся гербам “Курч”, Мікалая

Сеўрука, гараднічага Луцкага павета, і Карла Сеўрука, ад якога і пайшло прозвішча Курчэвічы. <…> Род Сеўрукаў з прыдомкам "з Сотвы", які ўжывае герб "Курч", са старажытных часоў карыстаўся ў польскім краі шляхецкай годнасцю і свабодай». Прадстаўнікі роду служылі манархам і Радзіме на ваеннай і цывільнай службах, валодалі маёнткамі з падданымі. Гэта стала вядома Васілю Міхайлавічу з рукапісу, створанага за 130 гадоў да яго кнігі Іванам Сеўрукам і ўнесеным у акты Навагрудскага ваяводства 9 студзеня 1785 г.

З названага рукапісу відаць, што луцкі гараднічы Мікалай Сеўрук і яго жонка Крысціна з Альшэўскіх валодалі ў Луцкім павеце маёнткам Сотва, у якім было 42 валокі зямлі з падданымі. Мікалай памёр у 1448 г., а маёнтак перайшоў да яго сына Івана, які, саступіўшы гэтую нерухомасць брату Луку, паступіў на ваенную службу пад сцягі падканцлера Сапегі.

Іван Сеўрук служыў пры сваім дзядзьку Рамане, які быў канюшым спачатку вялікага князя літоўскага, а потым караля польскага Ягайлы. Па завяшчанні дзядзькі Рамана Іван Сеўрук атрымаў маёнткі Касынічы і Шастакі.

Як лічыць Васіль Курчэвіч-Сеўрук, Мікалай і Карл Курчэвічы-Сеўрукі маглі тытулавацца князямі і па спадчынным тытуле ад князёў Курчэвічаў, але для гэтага трэба было яшчэ мець і пэўнае багацце, а іх 42 валокі не адпавядалі гэтаму патрабаванню. Таму браты лічыліся не вельмі багатымі, «а княжацкі тытул для бедных – насмешка: голы князь, таму яны маглі перастаць тытулавацца князямі, як Сеўрукі ў трыццатыя гады ператалі пісацца Курчэвічамі»*.

Такім чынам, нашы продкі з роду Курчэвічаў з Сотвы, што пасяліліся пад Слуцкам, лічаць сябе нашчадкамі Курча, які жыў на Валыні ў маёнтку Сотва, а прыдомак да прозвішча Сеўрук звязаны з назвай Северскага княства.

Меркаванне маіх продкаў, якія жылі ў XIX ст. і лічылі, што Курчэвічы з Сотвы Сеўрукі – гэта нашчадкі княжацкага роду Курчэвічаў, недастаткова абгрунтавана дакументамі і патрабуе дадатковых доказаў.

А вось што сказана ў пастанове Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 7 лютага 1824 г. пра паходжанне роду Курчэвічаў з Сотвы Сеўрукаў

* Курчевич-Севрук В. М. Вывод о происхождении прозвищ Севрук и Курчевич-Севрук. – Минск, 1896. – С. 20–28.

герба «Курч». Як ужо згадвалася, неабходныя матэрыялы падаў кандыдат філасофіі Іосіф Ян Курчэвіч-Сеўрук.

«...Прадстаўлены вывад прозвішча народжаных Сеўрукаў прыдомка з Сотвы Курчэвічаў... намі, дэпутатамі, у васьмі пакаленнях, а імёнах 125 за выключэннем пяці падпісаны, пры разглядзе якога высветлілася, што Курчэвічы з Сотвы Сеўрукі карысталіся гербам Курч: у чырвоным полі быццам літара “Т” вялікая ўверх нагамі звернутая, канец яе зверху раздвойваецца, пад раздваеннем белы крыж, з левага боку таксама пад крыжам паўмесяц канцамі да літары павернуты, з правага боку насупраць паўмесяца шасцівугольная зорка, у шлеме тры страусавыя пёры, з даўніх часоў перавагаю шляхецкага паходжання ў Каралеўстве Польскім былі абаронены...»

Пачынаецца генеалогія прозвішча Сеўрукаў, як ужо гаварылася, ад двух родных братоў – Мікалая, гараднічага Луцкага павета, і Караля, якія жылі ў XV ст. і валодалі спадчыннымі маёнткамі Касынічы і Шастакі. Продкі Сеўрукаў часта перамяшчаліся з аднаго месца ў другое, таму нашчадкам складана было знайсці звесткі пра прадстаўнікоў першых пакаленняў. Тым не менш пэўная інфармацыя ёсць: «...рукапісны дакумент да гэтага часу захаваў прыдомак Сотва і ўласны герб, гэта прыводзіць да высновы, што прозвішча народжаных Курчэвічаў з Сотвы Сеўрукаў, якія цяпер доказ свайго знатнага паходжання прадставілі, ад аднаго з двух вышэйзгаданых братоў прамой лініяй паходзіць... узяўшы за родапачынальніка роду народжанага Лявона-Густафія Змітравіча Курчэвіча з Сотвы Сеўрука ў першым пакаленні...»

Як сведчыць выпіс з актавай кнігі Слуцкага земскага суда ад 3 студзеня 1811 г., у час барацьбы з татарамі наш продак Лявон-Густафій Змітравіч збяднеў, а таму 20 кастрычніка 1587 г. атрымаў ад князя Юрыя Юр’евіча Алелькі прывілей на зямлю ў маёнтку Кутнева з будынкамі і трыма падданымі:

«Юрий Олелько князь киевский, белорусский, Слуцкий, копыльский, черниговский, граф и др., и др., и др. ознаймуем сим листом нашим ныне и на потом будущим людям, кому бы о том знать следовало, что земянин господарский Луцкого повета Сотвов Левон Севрук Змитрович, будучи немалое время в войске польском, служачи воину и от того же войска имея от [вельможных] хорошее доказательство отважных дел своих, тепер для службы под хоругву в наше Слуцкое княжество прибыл, которому по прошению и просьбе как в бою пострадавшему и разоренному

огнем и мечом заграничного неприятеля все его имущество и имущество его родителей, даю и дарую ему и именью его трех подданных тяглых и волок шесть грунту со строением Кутнев названное, в Новогрудском воеводстве Слуцком княжестве лежащее, на котором грунте 6 волок ограничено на особом месте, урочищами ему принадлежащими, и тому же Леону Севруку данное, во всем утверждаю, и что упомянутый Леон Севрук спокойно тем грунтом мог владеть сам, потомки его аж до последнего поколения мужского пола...»*



Герб «Слепаворан» роду Сеўрукаў.

Такім чынам наша галіна Курчэвічаў-Сеўрукаў асталявалася пад Слуцкам у XVI ст., атрымаўшы ад князя Юрыя Алелькі маёнтак Кутнева і набыўшы землі ў Чыжэвічах. Як бачым з вызначэння Мінскага дваранскага сходу, родапачынальнікам стаў Лявон-Густафій Змітравіч Курчэвіч Сеўрук з Сотвы, які жыў у Луцкім павеце, таварыш і харунжы войска Каралеўства Польскага. Яго сын Якуб, уладальнік маёнтка Касынічы, стаў родапачынальнікам роду Сеўрукаў герба «Слепаворан».

Сын Лявона-Густафія Іван – прадаўжальнік роду Курчэвічаў-Сеўрукаў герба «Курч». Дачка яго прапраўнука Аляксандра Іванавіча Сеўрука, які, па споведнай ведамасці 1760 г. быў прыхаджанінам Пагосцкай царквы, Марыя Сеўрук выйшла замуж за двараніна Данііла Пількевіча з засценка Сыцянец, паклаўшы пачатак яшчэ адной галіне ў магутным дрэве роду Сеўрукаў.

Пляменнік Лявона-Густафія Аляксандр, паручнік яго каралеўскай міласці, праславіўся ў турэцкай, маскоўскай і шведскай ваенных кампаніях. 8 сакавіка 1617 г. у Вільні атрымаў ад вялікага гетмана Яна Караля Хадкевіча патэнт на чын ротмістра і як узнагароду за ўзорную мужнасць – месца найвышэйшай ступені ў палку каралевіча Уладзіслава. Пасля адной з бітваў у маёнтку Аляксандра Курчэвіча-Сеўрука Праходы адбылося няшчасце. Яго жонка Яўжэба Іванаўна Пласкавіцкая даведалася ад вайскоўцаў, якія прыбылі ў абозе з-пад Смаленска, што

* НГАРБ, ф. 319, воп. 2, спр. 2931, т. 1, арк. 8–9.



Герб «Гейштар» роду Сеўрукаў.

Аляксандр трапіў у маскоўскі палон і там быццам бы забіты, пасля чаго «з гора захварэла і памерла», пакінуўшы двух сыноў. Аднак на самай справе Аляксандр застаўся жывы і вярнуўся дадому пазней з другім абозам. Праз нейкі час ён ажаніўся другі раз – з Ганнай Кярсноўскай. У іх нарадзіліся два сыны Іван і Марцін. Ад Івана і працягнуўся наш род.

Страціўшы здароўе ў бітвах, Аляксандр Курчэвіч-Сеўрук не мог далей несці ваенную службу і вярнуўся з-пад Нарвы, пакінуўшы ў лагеры каралевіча Уладзіслава сваіх сыноў.

Захаваўся дакумент, дзе гаворыцца, што Аляксандр жыў у спадчынным маёнтку Сеўрукоўшчызна каля Капыля, на мяжы з Цімкавічамі. Пасля ваенных паходаў ён вырашыў заняцца мірнай працай: насыпаў грэблю і пабудаваў млын, але так атрымалася, што гэта прывяло да частых затапленняў суседскіх цімкавіцкіх сенажацей.


Гаспадар «Цімкавіцкага княства» пан Беркаш разам з натоўпам людзей тройчы нападалі на млын, патрабуючы разбурыць грэблю, але Аляксандр Сеўрук не выканаў іх патрабаванняў. Цікава, што млын выстаяў і пасля чацвёртага нападу. Неяк на "зялёныя святкі" (Тройцу) пан Беркаш і Аляксандр Сеўрук сутыкнуліся ў Капыльскім касцёле на святочным набажэнстве. Пасля службы, выйшаўшы з храма, Беркаш, абураны незгаворлівасцю Сеўрука, выклікаў яго на дуэль. Мой продак вымушаны быў прыняць выклік.

У час двубою Сеўрук знёс Беркашу галаву, потым, ускочыўшы на каня, вярнуўся ў свой фальварак. Закончылася трагічная гісторыя тым, што Аляксандр Сеўрук павінен быў выплаціць вялікую суму грошай сям'і загінулага ў гэтай недарэчнай дуэлі.

Пазней жонка нябожчыка Беркаша атрымала дакумент, па якім Сеўрук згадзіўся плаціць пагалоўшчыну. Аднак выплаціць адразу ўсю суму не здолеў, таму залажыў Сеўрукоўшчызну за 100 коп, а сынам аддаў права на тры валокі зямлі ад таго фальварка.

10 снежня 1625 г. пакінуў тастамент, па якім усю набытую рухомую і нерухомую маёмасць раздзяліў паміж сынамі як ад першай, так і ад другой жонкі. Памёр Аляксандр у 1626 г. у маёнтку Праходы.

Сын Аляксандра Іван валодаў гэтым маёнткам па завяшчанні бацькі. За заслугі на вайсковай службе 10 верасня 1626 г. атрымаў ад вялікага гетмана Сапегі патэнт на чын ротмістра. Быў жанаты з Элізабэтай Узлоўскай. Адзін з сыноў Івана – Адам – стаў родапачынальнікам дзвюх галін Сеўрукаў герба «Гейштар». Другі сын – Рафал – прадоўжыў род Курчэвічаў-Сеўрукаў. Сын Рафала Іван прадаў у 1682 г. спадчынны маёнтак Праходы дваюраднаму брату, каралеўскаму харунжаму Пятру Адамавічу Сеўруку.



Фотаздымак з кнігі В. М. Курчэвіча-Сеўрука «Вывод о происхождении прозвищ Севрук и Курчевич-Севрук». *Расійская нацыянальная бібліятэка, Санкт-Пецярбург.*

Як бачым, на працягу многіх стагоддзяў прадстаўнікі гэтага роду вывучалі і захоўвалі свае карані, бо, як піша беларуская паэтэса Таіса Янучок, «сэнс жыцця, як крок за крокам, – у вяртанні да вытокаў».

Я часта ўзгадваю Васіля Міхайлавіча Курчэвіча-Сеўрука, які правёў значныя даследаванні свайго радаводу, але не быў упэўнены, што нехта з нашчадкаў прадоўжыць яго справу: «Я сколько могъ, то и открылъ потемки для потомковъ, хотя, быть можетъ, ни одинъ не помянетъ и добрымъ словомъ за трудъ». За больш чым 20 гадоў даследчай працы мне ўдалося адшукаць звесткі пра 657 прадстаўнікоў роду Сеўрукаў (13 кален), якія жылі з XV ст. на Валыні і з XVI да XX ст. – на землях Случчыны і Нясвіжчыны. Такім чынам, мара майго родзіча пра тое, што нашчадкі будуць вывучаць свой радавод, здзейснілася.

Хочацца верыць, што і ў наступных пакаленнях знойдуцца прадстаўнікі роду, шчырыя энтузіясты, якія прадоўжаць гэтую важную справу...

РАДАВОДНЫЯ РОСПІСЫ

Род Сеўрукаў прызнаны ў дваранстве пастановамі Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу: герба «Курч» ад 07.02.1824 г., зацверджаны ўказам Сената ад 13.04.1842 г., герба «Слепаворан» ад 04.09.1802 г., не зацверджаны ўказам Сената, герба «Гейштар» ад 22.01.1816 г., зацверджаны ўказам Сената ад 24.05.1860 г., № 4755, і герба «Гейштар» ад 27.02.1817 г., зацверджаны ўказам Сената ад 04.12.1846 г.

У гэты радавод уключаны ўсе асобы, указаныя ў прыведзеных вывадавых пратаколах, а таксама ў пададзенай 09.01.1785 г. Іванам Сеўрукам у Навагрудскі земскі суд копіі радаводнага роспісу ад 15.04.1686 г. і іншых дакументаў, якія паступілі ад двух дваюрадных братоў. У розных дакументах пазначана, што многія асобы з іх нашчадкамі паходзяць ад іншых продкаў і часта нават згадваюцца ў розных пакаленнях, таму некаторыя сямейства паўтараюцца. Дакладна вядома, што тыя асобы існавалі, але немагчыма з пэўнасцю сказаць, ад якога продка яны паходзяць, бо ў дакументах змяшчаецца супярэчлівая інфармацыя.


Самы далёкі прадстаўнік роду Сеўрукаў – Раман, відавочна, дзядзька Мікалая і Карла, канюшы вялікага князя літоўскага, караля польскага Ягайлы, нёс ваенную службу пад сцягамі падканцлера Сапегі. Валодаў маёнткамі Касынічы і Шастакі, якія завяшчаў дваюраднаму ўнуку Івану Мікалаевічу Сеўруку[1]*.*

Лявон-Густафій (Лявон-Яўстафій), прыняты за родапачынальніка роду Сеўрукаў з Сотвы (? Сотняў) Курчэвічаў герба «Курч», па бацьку быў названы Дзмітрыевічам. І сапраўды, у XVI ст. існаваў Дзмітрый, камандзір войскаў на Літве і Валыні, у яго быў брат Аляксандр. Але ў дакуменце ад 15.04.1686 г. бацькам Лявона-Яўстафія названы Карл. Час жыцця Лявона-Яўстафія – 2-я палова XVI ст., а яго

бацькі (? Карла) – 1-я палова XV ст., таму сынам Карла ён не мог быць. Верагодна, іх аддзяляла яшчэ некалькі пакаленняў, і бацькам Лявона-Густафія сапраўды мог быць Дзмітрый. Відаць вялікая разбежка ў часе і ў іншых прадстаўнікоў роду.

«Стрыйковский написал: Курч есть герб Курчов князей русских, взят от Корыята, князя Новогрудскаго одного из сыновей Гедемина Витениевича князя Литовскаго Корыята... В книге под заглавием "Описание Польши" автора Симеона Окольскаго на стр. 511 напечатано... фамилия военных Курч [известна] на Волыни и Литве Курчевич Дмитрий был командиром войск, отдавал приказания, не победим на войне и между неприятельскими татарскими войсками; а единоутробный его брат Александр не похожий ни духом, ни храбростью на своего брата в командовании войсками, всегда находился председательствующим Литовского суда... На Волыни в 1528 г. жил земянин князь Иван Курчевич, что видно из Волынской метрики за тот год...

Начинается генеалогия фамилии Севруков от двух родных братьев Николая Севрука, городничего Луцкого повета, и Карла Севрука, пользовавшихся гербом "Курч", от коего произошло и название Курчевичи, живших в тысяча четыреста сороковом году... род шляхт Севруков придомка с Сотвы Севруков, употребляющих герб, знак Курч, с древних веков пользовались в польском крае шляхецким достоинством и свободою; служили Монархам и краю в военной и гражданской службах; владели недвижимыми с подданными имениями. Это оказалось из рукописи, за сто тридцать лет перед сим написанной и явленной Иваном Севруком в акты Новогрудскаго воеводства тысяча семьсот восемдесят пятаго, января девятаго дня... Так как Николай и Карл Курчевичи Севруки могли титуловаться и князьями по наследственному титулу, но к этому титулу надобно было и богатство, а сорок две уволоки не соответствовали требованию, были бедны, а княжеский титул бедным есть насмешка: голый князь, потому они могли перестать титуловаться князьями, как Севруки в тридцатых годах перестали писаться Курчевичами»[2].



Wywód Familij Urodzonych z Sotwy Kurczewiczów Siewruków

Herbu Kurcz

Roku Tysiąc Ośmset Dwudziestego Czwartego Miesiąca Februarij Siódmego dnia. —

Вызначэнне Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу аб дваранскім паходжанні роду з Сотвы Курчэвічаў Сеўрукаў герба «Курч» ад 07.02.1824 г. (на 11 старонках; польская мова). *НГАБ, ф. 319, воп. 1, спр. 911, арк. 21–26.*

Księżyc, rogami do litery obrócony, z prawej strony prze-
szła mu pozostałe Księżyca ostatnie rogach, w polu czerwo-
nym, na którym trzy pióra strusie / w odległych wiekach
dostojności, obdarzony rodowitością w kraju tutejszym będą-
cym zastrzeżona, odpowiednie swym prerogatywom przystoj-
ności wolności a wraz tego okazanie przyjęte dowody
z różnych okolicznych wiadomych dla Szlachty stanu się
godnie, urzędów piastowanych Siewruków i przez Ma-
ter swych miała wolność posiadania Dóbr Ziemskich,
oraz piastowanie Urzędów Wojskowych i Cywilnych, czy-
nią, że dziś widoczne zrzeczeniem przez Ich Wyższości tej-
dla wiadomości następców ustalonego, dla uzupełnienia Franci-
szków ku Metryce Oświecanego do Akt Ziemskich Wo-
jewództwa Nowogródzkiego w Roku Tysiąc Siedemset Dwu-
dziestym piątym Januarii dziewiątego dnia wniesione-
go, w którym zawiera się Genealogia Familii Siewruków
od dwóch Braci rodzonych Mikołaja Hrehorowicza po-
mimo Łukasza i Stanisława w Tysiącznym Sześćsetnym Pięć-
dziesiątym Roku Tysiącznych, czas niewątpliwy otrzymywa-
nia tej Familii znana i edukacyjnym posiadaniem
przez Romana Siewruka, wspomniany Kaniowskiego, W. Xią-
żęcia, przodem Króla polskiego Władysława Jagiełły,
Małżonków Kosynów i Szadaków zwanych wspo-
mnia, a lubo dla przeniesienia się z jednej do drugiej
prowincyi dziś trzymającej się nieznajdująca pierw-
szych pokoleń, jednakże wymienione w rękopiśmie
i dotąd dostarczone Dokumenta przyjęte Sądu i
herb właściwy ponieważ następującą wniosek, że
Familia Urodzonych Siewruków z domu Siewru-
ków która teraz dowody swej rodowitości składa, od
jednego z dwóch wymienionych Braci w prostej li-
nii pochodzi, jak również upoważnienie by Familii wła-
ści-

22

Mości powiatu Lidzkiego Towarzyszem Chorągwianym w
Woysku Polskim Koronnym, przez który w nadgrodę [illegible]
[illegible] Nieprzyjaciela Zagranicznego [illegible], nazwany
Majątek Kutnow na wieczne czasy prawem Ziemskim
Dziedzicznym dał i darował. Roku Tysiąc pięćset Dziewięć-
[illegible] ósmego Apryla dwudziestego [illegible], tegoż ro-
ku i Miesiąca dwudziestego ósmego dnia w Zamku Jego
Królewskiey Mości Grodzkim Nowogródzkim przyznana
Intromissya Woźnieńska [illegible] do przyjęcia [illegible]
wyrażonego od JW. Jerzego [illegible] Urodzonemu
drugą [illegible] Kurczewiczom Siewrukom
nadanego, podająca Janie w Possessyą dziedziczną Ma-
jątek Kutnow z [illegible] z dys-
pozycyą do Namiestnika [illegible], aby wsząd z
Wojskiem Królewskim [illegible]
[illegible] przez które razem
[illegible] daty y dla syna Jego Alexandra [illegible] Woźny
Intromitował i Majątek [illegible] za prawem [illegible]
[illegible] po [illegible]
gu [illegible] pod Rokiem Tysiąc [illegible]
[illegible] Generalną od [illegible]
[illegible] Nowogródzkiego Seymem Warszawskim Tysiąc
[illegible] roku uchwalonych [illegible] Urodzony Alexan-
der Kurczewicz Siewruk porucznik Jego Królewskiey Mości
[illegible] z Dóbr [illegible] za dy-
mów [illegible] za dymów [illegible]
[illegible] za dymów [illegible] Włok [illegible], któ-
re [illegible] Aktualnego Dóbr Ziemskich [illegible]
[illegible] oficerską, [illegible]
go [illegible] produkowa-
ne, pod Rokiem Tysiąc Siedemset [illegible] Marca [illegible]
go dnia w [illegible] datę [illegible]
[illegible] Urodzonemu Alexandrowi Kurczewiczowi [illegible]

Siewruk

23

Siewrukowi od JW^o Hetmana Wojsk Koronnych pospolitey
Nayiaśnieyszego Wodza Jana Karola Chodkiewicza, w którym
tenże Hetman mianuie go Porucznikiem chorągwi wło-
ściwym Tytułem z przydomkami Herbami, oraz zaszczy-
ceniem dystyngwuiących się zasług na wyprawach Tu-
reckiey, Moskiewskiey i Szwedzkiey w nadgrodę przy-
kładney waleczności Jego, posunięcie na wyższy stopień
w Półku Nayiaśnieyszego Króla Władysława Jemu kon-
ferował — Że w spokrewnieniu trzecim tenże Alexander Leo-
nowicz Rotmistrz Jego Królewskiey Mości i Rzeczy po- 3
spolitey Husarów spłodził czterech Synów Tymoteusza
Krzysztofa, Iwana i Marcina, z których z nich pomiędzy
Marcin urzędowny, A sam iako sprawny postąpił, Sy-
nowny w Bitwach i wielkim podeszłym nabytym wieku
się z dobrym do dalszych trudów woiennych, powró-
cił z pod Narwy, zostawiwszy w skutek Królewskie Włady-
sława dwóch Synów Jana y Marcina, tam w Dobrach
swoich przechodnich Życie zakończył, dowodem tego ś. ich
równie że w spokrewnieniu czwartym wywodzi się potom- 4.
stwo, z Tymoteusza Synów dwoch Teodor i Jan — z Krzy-
sztofa Bazyli Iwan i Jan, oraz z Iwana Alexandrowicza
Dominik, Adam y Rafał, następnie Franciszka Roku
Tysiąc siedemset dwudziestego piątego grudnia dziesiątego
daty, a Tysiąc siedemset dwudziestego szóstego Juni Sió-
dmego dnia w Ziemstwie Nowogrodzkim Aktykowany,
Testament Alexandra Leonowicza Kurcz Siewruka Rot-
mistrza Jego Królewskiey Mości, w którym pamię-
cia Oyca swoiego Leona Gustawa Leonowicza Siewru-
ka i Brata rodzonego Bazylego i Samuela, a rozdziela-
iąc Synów swoich iak sprawny tak i drugiey Żony wyrazie
Ich Imionami, iako to: Tymoteusza wyżej Limieńskie Krzyszto-
fa z Stachowickiey, z Ich Synami, a swoimi wnukami,

Teodor

Teodorem i Janem Tymoteuszowiczami, Bazylim, Janem
y Janem Krzysztofowiczami, oraz synów z Nieboszczyków
Urodzonych Jana i Maryanny w obecie na Boyu pole-
głych z małżeństwa swemi synami Jana Do-
minikiem, Adamem y Rafałem — Roku Tysiąc Ośmset
dwudziestego drugiego Januarij Siedmnastego Deputacya
Generalna Litewska Wywodem Nowogródzkiego
po za przyjęciem Wywodu na opisanie siedmnastu
włók w Dobrach Dziedzicznych Urodzonego Iwana
Alexandrowicza Siewruka Strażnika i Starostów Dzi-
dzica, w którym lustratorowie wyznali: że z Siedmiu włók
według danych kwitów za Ojca Alexandra Siewruka
Rotmistrza Jego Królewskiej Mości opłacane — w tey się
wymienia, że Jan był synem Alexandra, i miał swego Po-
rucznika, tudzież okazuiąc dla pamięci zasług Ojca swo-
iego patent Jego na Porucznikostwo przydanego i inny
rakom na Towarzyszostwo w roku Tysiąc Sześćset
dwudziestym Szóstym Septembra dziewiątego od JW.
Hetmana Sapiehy wydany, w którym zasługi i gorli-
wość iego pochwala — Daty roku Tysiąc Sześćset pięćdzie-
siąt drugiego Februarij Siódmego Reskrypt zapewniony
J.O. Xcia Bogusława Radziwiłła Koniuszego W. X. Litew.
do wszystkich swoich Generalnych Namiestników, Guber-
natorów, Kommissarzy y Rządców, aby maiąc wzgląd,
szczególne baczenie i respekt na zasługi, niegdyś przy-
wierne Xiążętom Ich i w Domu Xiążąt Radziwiłłów
spełniane, na wolność i przyjaźne czyny, oraz wierne w
różnych okazyach Rycerskie dzieła przez Przodków
Familij Siewruków dokonane, oraz przez swoje respekt
uwzględnili dla nich nagrodę, stanowią aby wyrażone
swobody nienaruszenie się pociągał JW. Teodora Tymoteu-
szowicza, Bazylego i Jana Krzysztofowiczów, naostatek i in-
nych —

21

i Innych Sierrukow pochodzących od Alexandra Rotmi-
strza Jego Królewskiey Mości i Jego prawnych Sukcess-
sorów płci męzkiey, iako posiadaiących Dobra donati-
one Ziemskie w Oyczyźnie Naszey pod kondycyami len-
nemi, do których sposób lub powinności przez samey
Służby Woyskowey. – Roku Tysiąc Szesćset piędziesiąt
czwartego Januar: Dwudziestego Osmego dnia list
graniczny od JW Xięcia Marszałka Brasławskiego
pełnomocnego plenipotenta Xięcia Bogusława Radziwi-
łła dziedzica Włości Ziemi Dąbrowy za samą doliną Za-
dubowna i Horodyszcza dla Bazylego, Iwana i Jana
Krzysztofowiczow Sierrukow na kondycyą 20 kopy
Koziackich prawem lennym dopóki ten obowiązek pełni
[illegible] wiernie do przyiętego Starych Oyczyzny Oyców ogrom-
nego [illegible] i [illegible] podał. Familia ta zaraz się rozro-
dziwszy, potrzebowała koniecznie liczniejszych dla siebie działów
pracy y kondycyonalne grunta, iako nie [illegible] prerogaty-
wy Szlacheckiey przypominała i w [illegible] Oryginałach Starych
dowodem tego list potwierdzony Nayiaśnieyszego Króla Jana
Kazimierza w Roku Tysiąc Szesćset piędziesiąt [illegible] Marca
dwunastego dnia dany tegoż roku [illegible] w Grodzie
Nowogródzkim Oblatowany, w którym Król mówi: dowie-
dział od Xiążęcia Bogusława Radziwiłła Koniuszego W. X. L.
iż ze starszych [illegible] Sierruków [illegible] po [illegible]
[illegible] i wiernie [illegible] [illegible] Szlachty [illegible], [illegible] się
[illegible] [illegible], [illegible] się [illegible], y [illegible] nad-
grodę ze skarbu [illegible] [illegible] za [illegible] [illegible]
[illegible] [illegible] [illegible] służbę, [illegible] się [illegible]
[illegible], [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible]
Sierrukowie. – W Pokoleniu piątym potomni Jan syn Do- 5
minika pomieniony, Bazyli syn Adama Starszego, Jan syn
Bazylego, Mateusz syn Jana, Mikołay Ambroży syn Do-
minika

Dominika; i Andrzej Janowicz [illegible], który w roku
Tysiąc ośmset [illegible] [illegible] dla pamięci zasług swoich
[illegible] z Grodu Nowogródzkiego wziął, ale nigdy do Zam-
ku [illegible] i prerogatywami Szlacheckiemi zaszczycona była,
[illegible] się [illegible] [illegible] w possessyi i grunta jeden drugie-
mu przedawali i kupowali, czego ciż dowodem Tysiąc Ośmset
[illegible] [illegible] Maia [illegible] dnia datu[illegible] tegoż ro-
ku Augusta czwartego dnia w Zamku Słuckim [illegible]
prawa wieczysto przedażne na Folwarku [illegible] od Urodzonego
Szymona [illegible] Urodzonemu Alexandrowi [illegible]
dane. — Co do dalszego pochodzenia wywodzącej się prosapii
przywiedzionych przez Jana Bazylego i Alexandra z Fedo-
ra [illegible] — Jana z Bazylego, i Mateusza z Jana [illegible]
[illegible] — Mikołaja Emiliana dwóch Janów i Jana z Dominika
Bazylego, i Piotra z Adama, oraz Antoniego, Grzegorza, Jana, Hie-
ronima, i Marcina [illegible] [illegible] y Stefana z Rafała
6 Iwanowiczów — A mianowicie w pokoleniu [illegible], iż Jan
miał Synów Trzech: Stanisława, Andrzeja i Jana — Jan Syna Jana
Mateusz także Jana — a Mikołaj Emilian Synów trzech: Stefana,
Samuela, y Jana — Jan dwóch: [illegible] i Stefana; Bazyli Jana [illegible]
[illegible] Jana — Antoni Synów dwóch Jakuba, Szymona — Grzegorz Jaku-
ba — Jan Synów trzech Jana, Józefa y Michała — Hieronim Synów
trzech Sylwestra, Władysława, y [illegible] — Ku wyprowadzeniu
[illegible] [illegible] dwóch Pokoleń [illegible] się i [illegible] [illegible]
[illegible] [illegible] były [illegible] Szlacheckim; [illegible] [illegible]
[illegible] [illegible] się Datami i dokładną [illegible] wymienio-
ne się Transakta pod rokiem Tysiąc Ośmset [illegible] [illegible]
[illegible] Augusta dwudziestego [illegible] roku Septembra [illegible] dnia
[illegible] z [illegible] [illegible] pierwsza [illegible] [illegible] Jano-
wi, Bazylemu i Alexandrowi [illegible], [illegible] [illegible]
[illegible]: a drugie [illegible] w [illegible] Nowogródzkim
[illegible] Mikołajowi Emilianowi i Janowi [illegible]


oraz z—

25


z ojców Jej Synów Adama i Rafała Jwanowiczów Kurczewiczów
z Sołtysy Sierczuków z Wsi Osmołow z Całej sprawy na pozyd-
łe rozumie uchwalony za podpisem Sędzia Protokolarza Podsta-
rego i Rotmistrza Nowogród. powydawane pod rokiem Tysiąc
Siedem Osiemdziesiąt drugim Vidimus z Akty Trybunału Głó-
wnego W. Xiąstwa Litt. spraw [illegible] w Nowogródku Ex-
pedyjowanych Manifestu wespół z Remanifestem w Sprawie
Trybunału Głów. zaniesionego przez Urodzonych Jana, Bazy-
lego y Alexandra Fedorowiczów, Jana Wadowicza i Matu-
sza Jwanowicza Kurczów Sierczuków przeciwko Urodzonym
Mikołajowi Amelianowi i Janowi Dominikowiczom, Ba-
zylemu i Piotrowi Adamowiczom, Antoniemu, Grzegorzo-
wi, Janowi, Hieronimowi, Karpowi, Maciejowi i Stefa-
nowi Rafałowiczom Kurczewiczom z Sołtysy Sierc-
kom o przywłaszczenie Sukcessyjnej Majętności Prze-
chod i innych pod rokiem Tysiąc Siedem dziewięćdziesiąt
[illegible] Aprylia dwudziestego trzeciego dnia datny, z Tysiąc
Siedem dziewięćdziesiąt dziewiątego Juny dziewiątego w Try-
bunale Głównym Litt. przyjęty, Dokument wyprzedaży
Dobr Przechod w Województwie Nowogród. leżących, od
Urodzonych Mikołaja Amelana dwóyga Imion i Jana
Dominikowiczów, Bazylego Adamowicza, Antoniego Grze-
gorza, Jana, Hieronima, Macieja y Stefana Rafałowiczów
z Sołtysy Sierczuków Bratu swoiemu Stryjecznemu Pio-
trowi Adamowiczowi Sierczukowi Kurczewiczowi Jego Wie-
lmożney Mości wydany, w Oryginale z Akty Trybu-
nału Głównego w Nowogródku expedyowanego pokła-
dany się roku Tysiąc Siedmsetnego Aprylia szóstego
czynienia, tegoż roku y Miesiąca dziewiątego dnia w
Grodzie Nowogródzkim zeznana Intromissya do ro-
Tuszowy y na własność przedany od Majętności dzie-
dziczney Przechod Ziemi, od Jadwigi z Łukaszewiczów
Adamowey Sierczukowy Matki, o Piotra Syna Grzy-

kowiczowy

Szczyptowiczom Maciejowi — Roku Tysiąc Siedemset Pięćdzie-
siąt trzeciego Msca Februarij piętnastego dnia, zaś tego
roku Maja ósmego w Trybunale Głównym przyznana
asekuracyja Konwikcyjna oraz Kontrowersyjna mię-
dzy JmćPanem Janem Szpitownym Pisarzem Mysli-
borskim teraz Powiatu Grodzień. a Urodzonym Janem
Hieronimowiczem [illegible] Siewrukiem Chorążym Jego Kró-
lewskiej Mości z [illegible] posagowej i na długi suk-
cessyji, gdzie powinności Ojca Bazylego Adamowicza Sie-
wruka Hieronimowicz Brata rodzonego Piotra i Jego Sy-
na Jana, niemniej Stryjecznych Braci Eliasza i Stefa-
na Janowiczów, tudzież Stanisława, Andrzeja i Jana Ja-
nowiczów — Roku Tysiąc Siedemset Siedemdziesiąt dziewiątego
Junij Siedmnastego dnia Dekret zaoczny Trybunalski
w sprawie Urodzonych Jana i Anny z Mysłków Siewru-
ków z W. [illegible] [illegible] [illegible] Sędzikiem
Wojewódstwa Nowogródzkiego, z Stefanem y Zuzanną Wal-
nami Generał adiutantami Buławy wielkiej W. X. Litew.
o różne summy ferowany — Roku Tysiąc Siedemset Dwu-
dziestego dwudziestego Marca dwunastego dnia Testament
Urodzonego Władysława Hieronimowicza Siewruka po-
zostawiony na Braci swoich Sylwestra i Atanazego uczy-
niony z [illegible] [illegible] do rady i pomocy dla
Syna Jego [illegible] wyszczególnionych Siedmiu mie-
szkającego się — Aby mu tego gruntu dokąd po by-
ciu ich Hieronimie Rafałowiczu nierozdzielonego
była dana. Zamieszania [illegible] Stryjecznych Braci
Jana, Jonasza i Michała Janowiczów Stryjów Jana
Rafałowicza Antoniego i Grzegorza, oraz dalszą Fa-
milię Jana Bazylewicza Chorążego, Bazylego Ada-
mowicza i Jego Brata Piotra Antoniego, Grzego-
rza




Выпіс з актавай кнігі Навагрудскага земскага суда ад 17.06.1626 г. тастамента зямяніна Навагрудскага ваяводства Аляксандра Курчэвіча Сеўрука ад 09.12.1625 г. (на 7 старонках). *НГАБ, ф. 319, воп. 2, спр. 2931, т. 1, арк. 79–82.*





Выпіс з актавай кнігі Навагрудскага гродскага суда ад 28.04.1588 г. інтрамісіі вознага навагрудскім зямянам Лявону-Густафію і яго сыну Аляксандру Курчэвічам Сеўрукам на маёнткі Кутнева і Праходы Навагрудскага ваяводства ад 23.04.1588 г. (на 3 старонках). *НГАБ, ф. 319, воп. 2, спр. 2931, т. 1, арк. 84–85.*




По описи утвержденныхъ дѣлъ №

ДѢЛО

АК

Минскаго Дворянскаго Депутатскаго Собранія

о дворянскомъ происхожденіи


рода

Первоначальныя опредѣленія Депут. Собранія


Указъ Правительствующаго Сената объ утвержденіи

отъ 18 года, за №

Справа Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу аб дваранскім паходжанні роду Сеўрукаў.
НГАБ, ф. 319, воп. 2, спр. 2931, т. 2.



Генеалагічная схема дваранскага роду Курчэвічаў з Сотвы Сеўрукаў герба «Курч» ад 02.03.1889 г. Склаў тытулярны саветнік Васіль Міхайлаў Сеўрук (на 2 старонках). *НГАБ, ф. 319, воп. 2, спр. 2931, т. 2, арк. 1210.*



I КАЛЕНА

1 **Мікалай з Сотняў (? Сотвы) Сеўрук,** гараднічы Луцкага павета. Валодаў маёнткам Сотня (? Сотва) (42 валокі зямлі) у Луцкім павеце Валынскага ваяводства. Памёр у 1448 г.[3]

Жонка – Крысціна Альшэўская, кіеўская мастаўнічанка.

2 **Карл (? Дзмітрый).** Родны брат Мікалая.

Жонка – Фрузына Вінчанка, каморнікавая [Лідскага] павета.

II КАЛЕНА

3/1 **Сямён з Сотняў (? Сотвы) Сеўрук,** старэйшы сын Мікалая Сеўрука. Атрымаўшы ад брата Лукаша грошы і рухомую маёмасць за сваю частку спадчыннага маёнтка Сотня (? Сотва), пераехаў у Смаленскае ваяводства да дзядзькі і там застаўся. Валодаў маёнткам над ракой Днепр. У час «казачызны» і вялікіх бунтаў пераехаў з сынамі ў Ашмянскі павет[4].

Жонка – N Сакалінская са Смаленскага ваяводства.

4/1 **Лукаш з Сотняў (? Сотвы) Сеўрук,** малодшы сын Мікалая Сеўрука. Пасля заканчэння працяглых войнаў з Масквой, казакамі, Прусіяй, татарамі і туркамі ў 1528 г., у час кіравання караля Жыгімонта І Старога, выплаціўшы двум братам за іх часткі, застаўся ў спадчынным маёнтку на Валыні ва ўрочышчы Сотня (? Сотва) з падданымі[5].

Жонка – N Загароўская, ад яе тры сыны (двое сыноў памерлі непаўналетнімі) і дзве дачкі.

5/1 **Ян з Сотняў Сеўрук.** Саступіў сваю частку маёнтка брату Лукашу, паступіў на ваенную службу пад сцягі падканцлера ВКЛ Льва Сапегі, пасля заканчэння якой дваюрадны дзед Раман Сеўрук, канюшы вялікага князя літоўскага і караля польскага Ягайлы, узяў яго да сябе. Будучы ўжо вельмі старым, бяздзетны Раман Сеўрук завяшчаў унучатаму пляменніку Яну два спадчынныя маёнткі – Касынічы і Шастакі (Сеўрукоўшчызна) у Слуцкім княстве Навагрудскага ваяводства.

Жонка – N Пуцятаўна.

6/2 **Юрый,** старэйшы сын Карла Сеўрука. Разам з братам Янам падзяліў спадчынныя маёнткі Сеўрукі і Падсады над ракой Суртоўкай з 12 падданымі ў Заблодзецкай парафіі ў Лідскім павеце.

7/2 **Васіль,** разам з братам Лявонам-Яўстафіем у маладосці служыў пры двары пана Валадковіча, пасля, стаўшы паўналетнім, – у харугве Рэчы Паспалітай.

Жонка – N Кернажыцкая з Навагрудскага ваяводства.

8/2 **Лявон-Густафій (Лявон-Яўстафій) з Сотвы (? з Сотняў) Курч Сеўрук,** зямянін гаспадарскі Луцкага павета, таварыш і харунжы войска Каралеўства Польскага. Жыў у маёнтку Сотва Луцкага павета. Разам з братам Васілём у маладосці служыў пры двары пана Валадковіча. Пасля жаніцьбы валодаў фальваркам Падбалоцце ў Мазырскім павеце, атрыманым ад паноў Доўнараў (у заклад або «па пасагу»). Пасля пераехаў у Навагрудскае ваяводства Слуцкага княства[6]. Збяднеўшы ў час ваенных дзеянняў з татарамі, атрымаў 20.10.1587 г. прывілей ад князя Юрыя Юр'евіча Алелькі на зямлю Кутнеў з будынкам і 3 падданымі, што пацвярджае выпіс з актавай кнігі Слуцкага земскага суда ад 03.01.1811 г.:

«Юрий Олелько князь киевский, белорусский, слуцкий, копыльский, черниговский, граф и др. ознаймуем сим листом нашим ныне и на потом будущим людям, кому бы о том знать следовало, что земянин господарский Луцкого повета Сотвов Левон Севрук Змитрович, будучи немалое время в войске польском служачи воину и от того же войска имея от [вельможных] хорошее

доказательство отважных дел своих, тепер для службы под хоругву в наше Слуцкое княжество прибыл, которому по прошению и просьбе как в бою пострадавшему и разоренному огнем и мечом заграничного неприятеля все его имущество и имущество его родителей, даю и дарую ему и именью его трех подданных тяглых и волок шесть грунту со строением Кутнев названное в Новогрудском воеводстве Слуцком княжестве лежащее, на котором грунте 6 волок ограничено на особом месте, урочищами ему принадлежащими, и тому же Леону Севруку данное, во всем утверждаю, и что упомянутый Леон Севрук спокойно тем грунтом мог владеть сам, потомки его аж до последнего поколения мужского пола...»[7]

23.04.1588 г. уведзены ў валоданне падараваным яму ў спадчыннае валоданне маёнткам Кутнеў з падданымі ў вёсцы Чыжэвічы, і ў той жа дзень яго сын Аляксандр уведзены ў валоданне маёнткам Праходы, атрыманым па пасагу ад Яўжэбы Пласкавіцкай, што пацвярджала актыкацыя ад 28.04.1588 г. у Навагрудскім гродскім судзе: «...В року 1588 месяца апреля 23 дня, маючи я, возни, при собе сторону людей добрих трех шляхтицов Иосифа Коссаковского намесника князят слуцких, а пана Павла Васкевича и пана [Лу]каша Пласковицкого били есмо на справе у земян господарских земли Новгородское их милости панове Леона-Густафий и сына его мезинаго Александра Курчевичов Севруков товарыства воисковио хоругвой его королевское милости в имении их Кутневе и Проходах, в воеводстве Новгородском лежащих, где дей передо мною, ввозным, и перед стороною шляхтами всех описанными, его милость пан Леон Густафий Севрук, показавши листи на вечность на имения и фольварка Кутнова собе от князяти з божой ласки слуцкого Юря Юревича Олельки в року прошлом 1587 октября 20 дня собе выдани, при котором той же дати диспозиция до намесника своего Коссакоского, абы подал имение и фольварок Кутнов Густафию Леону с Сотвы Севруку правное увязания, где я, возни, будучи видел и покладание листи читал, иж дей то вси справом згодно велели есмо подданим с села Чижевич и Кутнова на громаду удвух ставитися и приказали есмо, абы дей уже тыя подданыя не князю слуцкому, але его милость пану Леону Густафию Курчевичу Севруку, яко пану своему [ ]му до двора Кутнова послушни будут и венние данины и повинность отдавать служить [ ] ему Леону Севруку послушними были ведлог вижей помяненого листу привилею княжати его милости и инвентара заводчаго от того пана наместника Косакосскаго подписанного и того ж дня и року поехали есмо до имения и фольварка Проход его милости пана Александра Леоновича Густафеевича Курчевича Севрука двора и села Мотушов, где пан Александер Курчевич Севрук з малжонкою своею показывали два листа от их милости панов родицов своих пана Ивана Пласковицкого в року теперешним 1588 месяца марца 10 дня и той же даты от пана Яна Гурина на село Матуши, в которие то листи я, возни, [ ]чивши дей знаними имение Проходи вечностию им малжонком належать на громаду подданим велели есмо прибет до двора и приказал я, возни, аби уже не Пласковицким и Гуринам, але пану Александру Курчевичу Севруку послушни будут, а так ставши уже его милость пан Леон Густафий имение Кутнова, а сын его пан Александер имение Проходов Курчевичи Севрукове вечистими панами и дедицами мною возним и стороною шляхтою при мне будочою то все осветчили, а я, возни, што видел и слышал, то всее на сей мой квит интромисийный списал з моею печатью и с печатьми сторонни шляхты...»[8]

Родапачыначальнік Курчэвічаў з Сотвы Сеўрукаў герба «Курч», прызнаных у дваранстве вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 07.02.1824 г. і зацверджаных указам Урадавага сената ад 13.04.1842 г.[9]

Жонка – **N Доўнараўна** з Мазырскага павета.

9/2 **Ян з Сотняў (? Сотвы) Сеўрук,** малодшы сын Карла Сеўрука. Разам з братам Юрыем падзяліў спадчынныя маёнткі Сеўрукі і Падсады з 12 падданымі над ракой Суртоўкай у Заблодзецкай парафіі Лідскага павета[10].

III КАЛЕНА

10/3 **Лук'ян.** Разам з братамі Марцінам і Багданам купіў фальварак Сенкаўшчызна ў Ашмянскім павеце. Яго сыны валодалі фальваркамі Мешкацішкі і Асады ў гэтым жа павеце[11].

11/3 **Марцін.** Разам з братамі Лук'янам і Багданам купіў фальварак Сенкаўшчызна ў Ашмянскім павеце. Яго сыны валодалі фальваркамі Мешкацішкі і Асады ў гэтым жа павеце.

12/3 **Багдан.** Разам з братамі Марцінам і Лук'янам купіў фальварак Сенкаўшчызна ў Ашмянскім павеце. Яго сыны валодалі фальваркамі Мешкацішкі і Асады ў гэтым жа павеце.

13/4 **N,** сын Лукаша Сеўрука і Загароўскай.

14/4 **N,** сын Лукаша Сеўрука і Загароўскай, памёр непаўналетнім.

15/4 **N,** сын Лукаша Сеўрука і Загароўскай, памёр непаўналетнім.

16/4 **N,** дачка Лукаша Сеўрука і Загароўскай.

17/4 **N,** дачка Лукаша Сеўрука і Загароўскай.

18/5 **Цімох**. Пасяліўся ва ўрочышчы Чыжэвічы Слуцкага княства Навагрудскага ваяводства.

Жонка – N Куневічаўна.

19/5 **Дзям'ян**. Пасяліўся ва ўрочышчы Сыцянец Слуцкага княства Навагрудскага ваяводства.

Жонка – N Мацевічаўна.

20/5 **Якаў.** Служыў у князёў Алелькаў сакратаром, што пацвярджаў пашпарт, выдадзены яму для паездкі па справах князёў у Львоў (гл. «Сеўрукі» 23/9). Пасля жаніцьбы жыў на спадчыннай зямлі ад дваюраднага прадзеда Рамана ў Касынічах.

Жонка – N Казарынаўна.

21/8 **Іван.** Купіў зямлю без будынка (6 валок) ва ўрочышчы Кутні, ажаніў сыноў і падзяліў ім зямлю, пра што сведчыў яго тастамент (? гл. «Сеўрукі» 44/26).

Жонка – **N Узлоўская.**

22/8 **Стэфан.** Нёс ваенную службу і загінуў на Букавіне.

23/8 **Якуб.** Валодаў спадчынным маёнткам Касынічы ў Навагрудскім павеце. Атрымаў 15.01.1575 г. ад князя Алелькі пашпарт (?), што пацвярджала актыкацыя 10.03.1732 г. у Навагрудскім гродскім судзе (гл. «Сеўрукі» 20/5). Атрымаў 28.02.1588 г. ад караля Жыгімонта III Вазы ахоўную грамату, якой Якуб Сеўрук вызваляўся ад усякіх збораў і атрымліваў пацверджанне на валоданне маёнткам Касынічы, пра што сведчылі актыкацыі 24.06.1660 г. у Навагрудскім гродскім судзе, 20.02.1795 г. – у Навагрудскім земскім судзе і 26.10.1793 г. у Случарэцкім гродскім судзе. Згаданы ў тастаменце брата Аляксандра ад 10.12.1625 г. Пакінуў тастамент ад 10.05.1640 г., размеркаваўшы ўсю рухомую маёмасць і зямлю ў маёнтку Касынічы паміж сынамі Іванам, Логвінам, Янам і Васілём[12].

Родапачыначальнік Сеўрукаў герба «Слепаворан», прызнаны ў дваранстве вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 04.09.1802 г., не зацверджаны ўказам Урадавага сената[13].

24/8 **Васіль.** Служыў пры двары пана Гялчэўскага, войскага смаленскага і харунжага брэсцкага, з якім прыехаў у Брэсцкае ваяводства (або на Падляшша),

ажаніўся і застаўся жыць на Падляшшы ў «пасагавым» маёнтку жонкі. Згаданы ў тастаменце брата Аляксандра ад 10.12.1625 г.

Жонка – N Мунінская.

25/8 **Самуіл.** Згаданы ў тастаменце брата Аляксандра ад 10.12.1625 г.

Жонка – N Шубянка з засценка Трасцянец.

26/8 **Аляксандр Лявонавіч з Сотняў (? Сотвы) Курч Сеўрук,** паручнік. Уведзены 23.04.1588 г. у валоданне маёнткам Праходы, які атрымаў «па пасагу» ад Яўжэбы Пласкавіцкай, што пацвярджала актыкацыя 28.04.1588 г. у Навагрудскім гродскім судзе. За «пасагавыя» грошы ад першай жонкі дакупіў да фальварка Кутнева зямель у сяле Чыжэвічы і заклаў там новы фальварак Чыжэвічы. Заплаціў збор са сваіх маёнткаў: з Праходаў за 10 дымоў, з Шастакоў за 16 дымоў, з Кутнева за 4 дымы і з 7 валок пустэчы, што пацвярджала генеральная квітанцыя ад зборшчыкаў Навагрудскага ваяводства ад 04.09.1610 г.[14] У Вільні 08.03.1617 г. вялікі гетман Ян Караль Хадкевіч уручыў патэнт на чын ротмістра, у якім указваліся заслугі Аляксандра ў турэцкай, маскоўскай і шведскай кампаніях, і ва ўзнагароду за ўзорную мужнасць прапанаваў яму прасоўванне ў палку каралевіча Уладзіслава. Страціўшы здароўе ў бітвах, не мог далей несці вайсковую службу, вярнуўся з-пад Нарвы, пакінуўшы ў лагеры каралевіча Уладзіслава сыноў Яна і Марціна.

Захаваўся дакумент, у якім гаворыцца, што, вярнуўшыся з войска, Аляксандр Лявонавіч (Яўстаф'евіч) жыў у спадчынным маёнтку Сеўрукоўшчызна Капыльскай парафіі, які межаваў з «Цімкавіцкім княствам», насыпаў грэблю і заклаў млын, затапляючы цімкавіцкія сенажаці. «Губернатар Цімкавіцкага княства» пан Беркаш разам з натоўпам тройчы нападаў на млын, патрабуючы разбурыць грэблю, але Аляксандр Сеўрук «не ўважыў» іх патрабаванні, млын выстаяў і пасля чацвёртага нападу. На «зялёныя святкі» (Тройцу) пан Беркаш і Аляксандр Сеўрук прыехалі ў Капыль на службу ў касцёл, а выйшаўшы з касцёла, Беркаш выклікаў Сеўрука на дуэль. Сеўрук не хацеў дуэлі, але быў вымушаны яе прыняць і ў час двубою знёс Беркашу галаву, а сам ускочыў на каня і вярнуўся ў свой фальварак Сеўрукі. Пазней жонка нябожчыка Беркаша атрымала дэкрэт ад пана Сеўрука, паводле якога той згадзіўся плаціць пагалоўшчыну. Не даплаціўшы рэшты грошай, залажыў свой фальварак Сеўрукоўшчызна за 100 коп, а сынам даў права на 3 валокі зямлі ад таго фальварка, а праз два гады памёр[15].

Памёр у сваім маёнтку Праходы ў 1626 г. Пакінуў тастамент ад 10.12.1625 г. (актыкаваны 17.06.1626 г. у Навагрудскім земскім судзе), у якім згадваў бацьку Лявона-Густафія Зміцравіча Сеўрука і родных братоў Якуба, Васіля і Самуіла. Нажытую рухомую і нерухомую маёмасць раздзяліў паміж сынамі, як ад першай, так і ад другой жонкі: старэйшаму сыну Цімоху – фальварак Чыжэвічы, Крыштафу – фальварак Кутнева, унукам Цімоху, Тэадору і Яну Цімафеевічам – па 100 злотых і Васілю Крыштафавічу – 1000 злотых і каня са збруяй; Івану – маёнтак Праходы, Марціну – маёнтак Шастакі (Сеўрукоўшчызна). У выпадку смерці Івана і Марціна, да паўналецця ўнукаў Дамініка, Адама і Рафала, прызначыў апекуном «швагра» Каспара Кярсноўскага[16].

Жонкі: 1. Яўжэба Іванаўна Пласкавіцкая. Прынесла «ў пасаг» 2000 коп грошаў літоўскіх. Ад яе сыны: Цімафей (Цімох) і Крыштаф. Даведалася ад абозу, які прыбыў з-пад Смаленска, што Аляксандр быў узяты ў маскоўскі палон і там быццам бы забіты, пасля чаго «ад гора захварэла і памерла»[17]; 2. Ганна Кярсноўская, ад яе сыны Іван і Марцін.

IV КАЛЕНА

27/14 **Фёдар.** Жыў у Слуцкім княстве Навагрудскага ваяводства.

Жонка – N Статкевічаўна.

28/14 **Ян.**

29/15 **Геранім.** Жыў у Слуцкім княстве Навагрудскага ваяводства.

Жонка – N Томкавічаўна.

30/16 **Крыштаф.** Жыў у Слуцкім княстве Навагрудскага ваяводства.

Жонка – N Корзунаўна.

31/16 **Стэфан.** Жыў у засценку Залессе Слуцкага княства Навагрудскага ваяводства.

Жонка – N Бараноўская з Залесся.

32/21 **Дзям'ян.** Жыў у Слуцкім княстве Навагрудскага ваяводства (? гл. «Сеўрукі» 77/44).

Жонка – **N Забэлаўна.**

33/21 **Адам.** Ажаніўся ў Клецкай парафіі. Меў трох сыноў: двое памерлі непаўналетнімі, застаўся сын Васіль (? гл. «Сеўрукі» 78/44).

Жонка – N Лукашэвічаўна.

34/21 **Рафал** (? гл. «Сеўрукі» 79/44).

Жонка – N Паўлавічоўна.

35/23 **Ян.** Разам з братамі атрымаў па завяшчанні бацькі ад 10.05.1640 г. рухомую маёмасць і зямлю ў маёнтку Касынічы. Лістом ад 07.02.1657 г. князя Багуслава Радзівіла, канюшага ВКЛ, вызвалены ад усіх службаў (выплаты чыншу, адбывання пастою, ад выканання коннай службы і інш.) з вёскі Чыжова (Чыжэвічы) Пагосцкага тракту на 3 гады. 07.10.1659 г. атрымаў ад Казіміра Клячкі, Уладзіслава Гурыны, камісараў князя Багуслава Радзівіла, другі ліст, які вызваляў ад тых самых службаў з той жа вёскі Чыжэвічы. Купіў 14.06.1696 г. у Аляксандра Янавіча Юрэвіча зямлю ў засценку Кутнева, што пацвярджала актыкацыя 28.09.1697 г. у Слуцкім гродскім судзе[18].

36/23 **Логвін**. Разам з братамі атрымаў па завяшчанні бацькі ад 10.05.1640 г. усю яго рухомую маёмасць і зямлю ў маёнтку Касынічы.

37/23 **Іван.** Судзіўся 25.04.1636 г. у Навагрудскім гродскім судзе са Скарабагатым. Разам з братамі атрымаў па завяшчанні бацькі ад 10.05.1640 г. рухомую маёмасць і зямлю ў маёнтку Касынічы. Пакінуў тастамент ад 27.06.1655 г. , размеркаваўшы на сыноў Матыса, Амяльяна і Крыштафа зямлю ў вёсцы Касынічы[19].

38/23 **Васіль,** разам з братамі атрымаў па завяшчанні бацькі ад 10.05.1640 г. рухомую маёмасць і зямлю ў маёнтку Касынічы.

39/24 **Іосіф.**

40/24 **Казімір.**

41/25 **Пратасій.** Ажаніўся ў засценку Сарога.

Жонка – N Чарнушэвічаўна.

42/26 **Цімафей (Цімох),** старэйшы сын Аляксандра Лявонавіча і Яўжэбы Іванаўны, народжанай Пласкавіцкай, Сеўрукаў. Па тастаменце бацькі ад 10.12.1625 г. (актыкаваны 17.06.1626 г. у Навагрудскім земскім судзе) атрымаў фальварак Чыжэвічы, а яго сыны Тэадор і Ян – па 100 злотых.

Жонка – N Рудкевічаўна.

43/26 **Крыштаф.** Атрымаў па тастаменце бацькі ад 10.12.1625 г. (актыкаваны 17.06.1626 г. у Навагрудскім земскім судзе) фальварак Кутнева.

44/26 **Іван.** Разам з братам Марцінам застаўся ў ваенным лагеры пасля вяртання бацькі дадому. Па тастаменце бацькі ад 10.12.1625 г. (актыкаваны 17.06.1626 г. у Навагрудскім земскім судзе) атрымаў маёнтак Праходы; у выпадку яго гібелі, да паўналецця сыноў Дамініка, Адама і Рафала, апекуном прызначаўся Каспар Кярсноўскі[20]. Атрымаў чын ротмістра, паручніка, што пацвярджаў патэнт ад 10.09.1626 г.

вялікага гетмана Сапегі. Пасля смерці бацькі Аляксандра сустрэў нямала перашкод у валоданні спадчынным маёнткам Сеўрукоўшчызна (Шастакі) з боку «Цімкавіцкага княства», суседзяў і даўжнікоў. Аплаціў збор на інфлянцкае жаўнерства з 7 валок у спадчынных маёнтках Праходы і Шастакі, за бацьку Аляксандра Сеўрука і з 11 валок спустошаных, што пацвярджала генеральная рэвізорская квітанцыя ад 17.01.1632 г. паборцы Навагрудскага ваяводства Крыштафа Пракопавіча Калдычэўскага. Разам з братам Марцінам быў узяты пад пратэкцыю генерала гвардыі Багуслава Радзівіла, з якім абодва паехалі ў Маскву (? Прусію) і адтуль не вярнуліся (?).

Жонка – Элізабэта Узлоўская.

45/26 **Марцін.** Разам з братам Іванам заставаўся ў ваенным лагеры пасля вяртання бацькі дадому. Атрымаў па тастаменце бацькі ад 10.12.1625 г. (актыкаваны 17.06.1626 г. у Навагрудскім земскім судзе) маёнтак Шастакі (Сеўрукоўшчызна). Сустрэў нямала перашкод у валоданні спадчынным маёнткам Сеўрукоўшчызна (Шастакі) з боку «Цімкавіцкага княства», суседзяў і даўжнікоў. Разам з братам Іванам быў узяты пад пратэкцыю генерала гвардыі Багуслава Радзівіла, з якім абодва паехалі ў Маскву (? Прусію) і адтуль не вярнуліся (?).

V КАЛЕНА

46/27 **Міхал.**

Жонка – N Бранавіцкая.

47/29 **Грыгорый.** Бяздзетны.

Жонка – N Свідзяньская.

48/29 **Павел.**

Жонка – N Крукоўская.

49/30 **Іван.**

Жонка – N Крытвіньская.

50/30 **Васіль** (? гл. «Сеўрукі» 108/67).

Жонка – N Камінская.

51/30 **Ян.**

Жонка – N Лявіцкая.

52/31 **Марцін.** Памёр маладым.

53/31 **Міхал.**

Жонка – N Малушчыцкая.

54/32 **Мікалай (Міхал).**

Жонка – N Чарнушэвічаўна.

55/32 **Ян,** (?) па рэестры шляхты Слуцкага княства ад 18.05.1733 г.[21] і інвентары маёнтка Пагост Навагрудскага ваяводства 1733 г.[22], жыў у засценку Кутнева, валодаў 9/16 «вольнай» валокі зямлі.

Жонка – **N Разанавічаўна,** пратэстантка.

56/32 **Грыгорый.**

Жонка – N Бенядзіктавічаўна.

57/33 **N,** сын Адама Сеўрука, памёр непаўналетнім.

58/33 **Васіль** (? гл. «Сеўрукі» 121/78).

59/33 **N,** сын Адама Сеўрука, памёр непаўналетнім.

60/34 **Каспій** (? гл. «Сеўрукі» 127/79).

61/34 **Тэадор.**

62/34 **Марк.**

63/34 **Стэфан** (? гл. «Сеўрукі» 128/79).

64/35 **Тэадор.** Па дарчым запісе ад 04.10.1685 г. атрымаў ад Дзімітравічавай зямлю з будынкам у Залессі. Прадаў 16.06.1689 г. зямлю ў вёсцы Чыжэвічы таксама Тэадору Сеўруку. Судзіўся 10.09.1692 г., 02.04.1703 г. і 13.02.1715 г. у Слуцкім гродскім судзе з зямянамі Слуцкага княства за зямлю.

65/35 **Іван.**

66/37 **Матыс.** Разам з братамі атрымаў па завяшчанні бацькі ад 27.06.1655 г. зямлю ў вёсцы Касынічы[23].

67/37 **Крыштаф.** Разам з братамі атрымаў па завяшчанні бацькі ад 27.06.1655 г. зямлю ў вёсцы Касынічы[24]. Судзіўся 24.04.1686 г. са Шчацінай у Навагрудскім гродскім судзе за зямлю. Пакінуў тастамент ад 17.10.1691 г. , у якім зямлю ў вёсцы Касынічы з усёй рухомай маёмасцю завяшчаў сыну Васілю і дочкам.

68/37 **Амяльян.** Разам з братамі атрымаў па завяшчанні бацькі ад 27.06.1655 г. зямлю ў вёсцы Касынічы[25].

69/41 **Іван.**

70/42 **Тэадор (Фёдар).** 07.02.1652 г. канюшы ВКЛ князь Багуслаў Радзівіл выдаў запаветную грамату сваім генеральным намеснікам, губернатарам, камісарам і рэвізорам, што «имея благосклонность... и принимая в расчет заслуги когда-то в отчизне князьям Слуцким и в дому князьям Радзивиллам совершенные, доблестные и благоприятные чины, притом военные в различных рыцерских сражениях предками фамилии Севруков заслуженные, желая через таковую грамоту совершить для них вознаграждение, постановил, чтобы объяснить должностным лицам, чтобы не смели привлекать урожденных Теодора Тимоховича, Василия и Яна Крыштофовичей напоследок и других Севруков, произошедших от Александра, ротмистра его королевской милости и его законных наследников мужской линии как проживающих в наследственном имении в Слуцком княжестве в ленном состоянии к никаким выплатам и повинностям, кроме военной службы». Купіў 16.06.1689 г. у Тэадора Янавіча Сеўрука зямлю ў вёсцы Чыжэвічы[26].

71/42 **Ян.**

72/42 **Мікалай.**

73/42 **Крыштаф.**

74/43 **Васіль.** Вызваляўся ад усіх відаў павіннасцей, акрамя ваеннай, згодна з запаветнай граматай ад 07.02.1652 г. князя Багуслава Радзівіла. Разам з братамі Янам і Іванам атрымаў 27.01.1654 г. ад князя Багуслава Радзівіла ў часовае карыстанне 10 валок зямлі дубровы за Осавай далінай, за Дубачам і Гарадзішчам, на ўмове пастаўкі 2 коней казацкіх, што пацвярджаў межавы ліст браслаўскага маршалка Пуцяты.

75/43 **Іван.** Разам з братамі Васілём і Янам атрымаў 27.01.1654 г. ад князя Багуслава Радзівіла ў часовае карыстанне 10 валок зямлі дубровы за Осавай далінай, за Дубачам і Гарадзішчам, на ўмове пастаўкі 2 коней казацкіх, што пацвярджаў межавы ліст браслаўскага маршалка Пуцяты.

76/43 **Ян.** Вызваляўся ад усіх відаў павіннасцей, акрамя ваеннай, згодна з запаветнай граматай 07.02.1652 г. князя Багуслава Радзівіла. Разам з братамі Васілём і Іванам атрымаў 27.01.1654 г. ад князя Багуслава Радзівіла ў часовае карыстанне 10 валок зямлі дубравы за Осавай далінай, за Дубачам і Гарадзішчам, на ўмове пастаўкі 2 коней казацкіх, што пацвярджаў межавы ліст браслаўскага маршалка Пуцяты.

77/44 **Дамінік (Дзям'ян).** Згаданы ў тастаменце дзеда Аляксандра Лявонавіча Курчэвіча Сеўрука ад 10.12.1625 г., дзе гаварылася, што ў выпадку гібелі яго бацькі Івана Аляксандравіча, які быў на ваеннай службе, да паўналецця апекуном Дамініка прызначаўся Каспар Кярсноўскі[27] (? гл. «Сеўрукі» 32/21).

78/44 **Адам.** Згаданы ў тастаменце дзеда Аляксандра Лявонавіча Курчэвіча Сеўрука ад 10.12.1625 г., дзе гаварылася, што ў выпадку гібелі яго бацькі Івана Аляксандравіча, які быў на ваеннай службе, да паўналецця апекуном Адама прызначаўся Каспар Кярсноўскі[28]. Разам з жонкай купіў 27.07.1657 г. у цешчы Кацярыны

Ліпніцкай Янавай Лукашэвічавай паўвалокі зямлі ў маёнтку Праходы: «...я, Екатерина Липницкая Янова Лукашевичева, и я, Габриель Янович Лукашевич, потомок оное, земяне господарские земли Новгородское, чынем явно и вызнаваем сами на себе сым нашим вызнанным листом добровольным вечисто продажным записем нинешним и на потом будучим людям, кому бы о том ведати належало, иж мы заживаючи вольности шляхецкое ровно с другими обывателями воеводства Новогродского в праве посполитом описанного, а маючи во влады своей волоку грунту в Проходах лежачую в воеводстве Новогродском лежачую, без невеликой части моргов килька на мне Катерину Липницкую Лукашевичевую по малжонку моему небожчику Яну Лукашевичу, а мне Габриелю Лукашевичу по родичу моему правом спадковым купным и природным належачим, которую мы я, Катерина Липницкая, с малжонком моим паном Лукашевичем волоку так же купным вечистым правом за сполные же от пана Стефана Керсновского и малженки его мели есмо, а, будучи на тот час мы выш поменены особы потребны сумы пенезей... урожденному пану Адаму Яновичу Севруку и малженце его, а дочце моей Лукашевичевой пани Ядзвизе Лукашевичевне Адамовой Севруковой за спольные их гроши суму пенезей коп пятьдесят готовых, которую суму до рук наших отличивши и взели есми им самим, детем, потомком и нащадком их земянам воеводства Новогрудского и все от даты и дня сего листу запису нашаго с того грунту пол волоки я, Лукашевичова, и я, Лукашевич сын ее, вырекся...»[29] (? гл. «Сеўрукі» 33/21).

Родапачынальнік дзвюх галін роду Сеўрукаў герба «Гейштар»: 1) галіна ад Адама і яго сына Васіля, прызнана ў дваранстве вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 22.01.1816 г. і зацверджана ўказам Урадавага сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 24.05.1860 г.[30]; 2) галіна ад Адама і яго сына Аляксандра прызнана ў дваранстве вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 27.02.1817 г. Не зацверджана ўказам Урадавага сената ад 04.12.1846 г.[31]

Жонка – Ядвіга Янаўна Лукашэвіч, дачка Яна і Кацярыны, народжанай Ліпніцкай, Лукашэвічаў. У 1690 г. абавязалася зрабіць пераўступачны (пераказны) запіс сыну Аляксандру на частку зямлі ў маёнтку Праходы і ў іншых месцах[32]. Разам з сынам Пятром 06.04.1700 г. прадалі Ежыковічам зямлю ў маёнтку Праходы, што пацвярджала інтрамісія, актыкаваная 09.04.1700 г. у Навагрудскім гродскім судзе.

79/44 **Рафал.** Згаданы ў тастаменце дзеда Аляксандра Лявонавіча Курчэвіча Сеўрука ад 10.12.1625 г., дзе гаварылася, што ў выпадку гібелі яго бацькі Івана Аляксандравіча, які быў на ваеннай службе, да паўналецця Рафала апекуном прызначаўся Каспар Кярсноўскі[33] (? гл. «Сеўрукі» 34/21).

VI КАЛЕНА

80/46 **Казімір.**

81/48 **Сымон.**

82/48 **Абрам.**

83/49 **Стэфан.**

84/49 **Самуэль.** Жыў у вёсцы Касынічы. Быў сведкам у Слуцкім магістраце пры разглядзе 19.02.1744 г. справы па абвінавачванні падданай Слуцкага княства Ганны Андрэеўны Цішкевічавай у злоўжыванні знахарствам[34].

85/49 **Васіль.**

86/50 **Ян.**

87/50 **Караль.**

88/51 **Станіслаў.**

89/51 **Крыштаф.** Па споведнай ведамасці прыхаджан Пагосцкай царквы 1760 г.[35], жыў у засценку Кутнева.

Жонка – (?) Марыяна. Пазначана ў споведнай ведамасці прыхаджан Пагосцкай царквы 1760 г.[36]

90/51 **Тэадор.**

91/53 **Іосіф.**

92/53 **Тамаш.**

93/54 **Лаўрэнцій.** Па рэестры шляхты Слуцкага княства ад 18.05.1733 г.[37] і інвентары маёнтка Пагост Навагрудскага ваяводства 1733 г.[38], жыў у засценку Кутнева.

94/54 **Яўстафій** (? гл. «Сеўрукі» 147/107, 168/119).

95/54 **Васіль.**

96/54 **Геранім.**

97/55 **Станіслаў.** Жыў у засценку Кутнева, быў прыхаджанінам Пагосцкай царквы. Магчыма, памёр да 1751 г.

Жонка – N. Пазначана ў інвентары маёнтка Пагост Навагрудскага ваяводства 1751 г., валодала 2 маргамі зямлі і 1 моргам 15 прэнтамі на Высокай гары ў засценку Кутнева[39].

98/55 **Андрэй.** Жыў у засценку Кутнева, быў прыхаджанінам Пагосцкай царквы.

Жонка – Агапа.

99/55 **Аляксандр (Аляксей).** (?) Па інвентары маёнтка Пагост Навагрудскага ваяводства 1751 г.[40] і споведнай ведамасці прыхаджан Пагосцкай царквы 1760 г., разам з дзецьмі жыў у засценку Кутнева[41], валодаў у 1751 г. 1/7 «аселай» валокі зямлі ў «Кані Старым», 2 валамі і 1/4 «аселай» валокі зямлі ў «Кані Новым», 3 маргамі 47 прэнтамі зямлі.

100/56 **Фёдар.**

101/64 **Васіль.**

102/65 **Якуб.** Судзіўся з Чарапаньскім, што пацвярджаў дэкрэт Прускага двара ад 30.09.1717 г. аб пасведчанні на зямлю, выдадзеным эканомамі і пацверджаным княжной Радзівілавай. Па рэестры шляхты Слуцкага княства ад 18.05.1733 г.[42] і інвентарах маёнтка Пагост Навагрудскага ваяводства 1733 г.[43] і 1751 г.[44] , жыў у засценку Залессе, валодаў у 1733 г. 2/3 і 1/4 «вольнай» валокі зямлі і ў засценку Малое Залессе – 1/4 валокі зямлі пад будынкам; у 1751 г. – 1/3 і 1/8 «аселай» валокі зямлі.

103/65 **Ілья** (? гл. «Сеўрукі» 164/118).

104/65 **Стэфан** (? гл. «Сеўрукі» 165/118).

105/66 **Рафал.** Атрымаў 05.10.1673 г. ад полацкага стольніка Казіміра Клакоцкага, апекуна княжны Радзівілавай, канюшанкі ВКЛ, дакумент на «пол коня земли». Судзіўся 28.09.1683 г. у Слуцкім гродскім судзе з Яроцкім за падданых.

106/66 **Ян.**

107/66 **Мікалай.** Атрымаў у 1696 г. ліст ад Андрэя Юрэвіча на 45 злотых за заставу 1/6 валокі зямлі.

108/67 **Васіль (Базыль).** Атрымаў па завяшчанні бацькі ад 17.10.1691 г. зямлю ў вёсцы Касынічы з усёй рухомай маёмасцю. Судзіўся з Бялькевічамі за збіванне, што пацвярджаў вайсковы дэкрэт ад 08.08.1723 г.[45] (?). Па інвентарах маёнтка Пагост Навагрудскага ваяводства 1733 г.[46] і 1751 г.[47] і па споведнай ведамасці прыхаджан Пагосцкай царквы 1760 г., жыў у засценку Кутнева[48], валодаў у 1733 г. 1/4 «аселай» валокі зямлі, у 1751 г. – 1/12 «аселай» валокі зямлі, 2 валамі (? гл. «Сеўрукі» 50/30).

Жонка – (?) Ксенія.

109/67 **Станіслаў.** Па інвентарах маёнтка Пагост Навагрудскага ваяводства 1733 г.[49] і 1751 г.[50] і па споведнай ведамасці прыхаджан Пагосцкай царквы 1760 г., жыў у засценку Кутнева[51]; валодаў у 1733 г. 1/4 «аселай» валокі зямлі, у 1751 г. 1/12 «аселай» валокі зямлі ў «Кані Старым» і 1/12 валокі зямлі ў «Кані Новым», 2 валамі.

Пасямейны спіс дваран Слуцкага павета 1796 г. (на 6 старонках; польская мова). *НГАБ, ф. 319, воп. 1, спр. 791, арк. 53 адв. – 56.*

5 54

Imię y Nazwisko Obywatela	Imię y Nazwisko Żony	Imiona Dzieci: Płci Męzkiey	Imiona Dzieci: Płci Niewieściey	Wiek [illegible]	Miejsce pomieszkania	[illegible]	[illegible]
[illegible] lat [illegible]	Joanna [illegible] lat 60	Paweł lat [illegible]			w zaścianku Szymanie		
Jan lat 20	Anna [illegible] lat [illegible]						
[illegible] lat 30, z [illegible] lat [illegible]	Agata [illegible] lat [illegible]; Wdowiec		Anastazya lat [illegible]		w Szymanie		
Szymon [illegible] lat 40	Zofia [illegible] lat 30	Tomasz lat 10	Anna lat 12		w Szymanie		
[illegible] lat [illegible]	Agata [illegible] lat 40	Aleksander lat 20, Jan 13, Marcyn 10	Anna lat 16, Apolonia 9, Maryanna 7		w zaścianku [illegible]		
[illegible] lat 60	Maryanna [illegible] lat 60	Konrad lat 25, Paweł 16	Anna lat 20		w zaścianku [illegible]		
[illegible] Jan lat 40	Agata [illegible] lat [illegible]	Józef lat 10, Bazyli 8, Łukasz 6, Teodor 2			w zaścianku [illegible]		
Teodor lat 30	Katarzyna [illegible] lat 27	Paweł lat 6	Teofila lat 4				
[illegible] Jan [illegible] lat [illegible], z Ojcem [illegible] lat 70	Zofia [illegible] lat [illegible]; Wdowiec		Maryanna lat 20, Helena 12, Helena 3		w zaścianku Korzeniszki		
[illegible] lat 70, [illegible] lat 36	Katarzyna [illegible] lat 60; Regina [illegible] lat 20	Maciej lat [illegible], Jakub 12	Anastazya lat 16		w Korzeniszkach		
[illegible] Jan [illegible] lat 39	Helena [illegible] lat 40	Piotr lat 7			w Korzeniszkach		
[illegible] Jan [illegible] lat 80	Zofia [illegible] lat 70				w Korzeniszkach		
[illegible] Michał lat [illegible]	Anna [illegible] lat 20	Niema	[illegible]				

Imię y Nazwisko Obywatela	Imię y Nazwisko Żony	Imiona Dzieci: Płci Męskiey	Płci Niewieściey	Wiele posiada [illegible]	Mieysce pomieszkania	Ranga Obywatela	[illegible]
Siewrukowie Szymona Synowie — Bazyli Lat 50	Ludwika [illegible] Lat 28	Szymon Lat 10, Stefan 8	Tekla Lat 12		w Zaścianku [illegible]		
Piotr Lat 42	Ludwika [illegible] Lat 30	Hieronim Lat 10, Maciey 6	Agata Lat 12				
Kondrat Lat 40	Helena [illegible] Lat 30	Łukasz Lat 10, Józef 8	Joanna Lat 5				
Stefan Lat 30	Joanna [illegible] Lat 26	Jan Lat 7	Agata(?) Lat 3				
Siewrukowie Leona Synowie Antoni Lat 60	Dorota [illegible] Lat 52	Paweł Lat 12, Stefan 7	Regina Lat 10		w [illegible]		
Jan Lat 30	Joanna [illegible] Lat 26	Jan Lat 7					
Siewrukowie Marcina Synowie Michał Lat 50	Marianna [illegible] Lat 30	Stefan Lat 16			w [illegible]		
Szymon Lat 40	Katarzyna [illegible] Lat 33						
Siewruk Mateusz Andrzeja Syn Lat 50	Marianna [illegible] Lat 65	Jan Lat 3	Marianna Lat 3		w Zaścianku [illegible]		
Siewruk Jan [illegible] Syn Lat 66	Marianna [illegible] Lat 60		Anna Lat 3		w Zaścianku [illegible]		
Siewruk Antoni Bazylego Syn Lat 47	Anna [illegible] Lat 30	Leon Lat 7, Bazyli 2	Marianna Lat 4		w Zaścianku [illegible]		
Siewrukowie [illegible] Synowie Aleksander Lat 40	Eleonora [illegible] Lat 30	Leon Roku 1			w Zaścianku [illegible]		
[illegible] Lat 30	Katarzyna [illegible] Lat 30	Stefan Lat 3	Tekla Lat 10, Agata Lat 6				
Stefan Lat 29	Bez Żony						
Siewruk Antoni [illegible] Syn Lat 50	Wdowiec	Grzegorz Lat 20			w [illegible]		
[illegible] Szymon Lat 30	Regina [illegible] Lat 30						

Imiony y Nazwisko Obywatela	Imiony y Nazwisko Żony	Imiona Dzieci: Płci Męzkiey	Imiona Dzieci: Płci Niewieściey	Wiek [illegible]	Mieysce zamieszkania	[illegible]	[illegible]
Siemaszkowicz Szymon Jerzego [illegible]	Dorota Korbutowna Lat [illegible]	Wawrzyniec Lat [illegible]	Maryanna Lat [illegible]		w Zaścianku [illegible]		
[illegible] Lat [illegible], Antoni Lat [illegible]	Maryanna [illegible] Lat [illegible]	[illegible] Lat [illegible]	Agata Lat [illegible]				
Siemaszko Szymon [illegible] Lat [illegible]	Dominika [illegible] Lat [illegible]	Jakub Lat [illegible]	Katarzyna Lat [illegible]		w Zaścianku [illegible]		
Siemaszko [illegible] Lat [illegible]	Maryanna [illegible] Lat [illegible]	Grzegorz Lat [illegible]	Jadwiga Lat [illegible]		w [illegible]		
Siemaszko [illegible] Lat [illegible]	[illegible] Lat [illegible]	Antoni Lat [illegible]	[illegible]		w [illegible]		
Siemaszkowicz Szymon [illegible] Jakub Lat [illegible]	Maryanna [illegible] Lat [illegible]	[illegible] Lat [illegible]			w Zaścianku [illegible]		
Szymon Lat [illegible]	[illegible] Lat [illegible]	Szymon Lat [illegible]					
Szydłowski [illegible] Lat [illegible]	Anna [illegible] Lat [illegible]	Stefan Lat [illegible]	Anastazya [illegible]		w Zaścianku [illegible]		
Szydłowski Jan [illegible] Lat [illegible]	Katarzyna [illegible] Lat [illegible]				w [illegible]		
Kazimierz [illegible] Antoni Lat [illegible]	Maryanna [illegible] Lat [illegible]	Piotr Lat [illegible]	[illegible] Lat [illegible]				
Sukiennicki [illegible] Dominik Lat [illegible], Stefan Lat [illegible]	Maryanna [illegible] Lat [illegible], [illegible] Lat [illegible]	Franciszek Lat [illegible]			w Zaścianku [illegible]		
[illegible] Lat [illegible]	Ludowika [illegible] Lat [illegible]		Anna Lat [illegible]		w [illegible]		

48

Imie y Nazwisko Obywatelów	Imie y Nazwisko Żony	Imiona Dzieci: Płci Męskiey	Imiona Dzieci: Płci Żeńskiey	[illegible]	Mieysce pomieszkania	[illegible]	[illegible]
[illegible] Szymonowicz Jana: Jan lat 60	Wdowiec	Jan lat 7	[illegible] lat 10		w Zaścianku [illegible]		
Antoni [illegible] Paweł lat 66	Natalia [illegible] lat 60, Anna [illegible] lat 29	Jan lat 18, Szymon lat 4					
[illegible] Gabryela Syn lat 60	Anastazya [illegible] lat 48	Jan lat 15	Anna lat 9		w [illegible]		
[illegible] Jan [illegible] lat 50	Agata [illegible] lat 46				w [illegible]		
[illegible] Jana [illegible] lat 46	[illegible] lat 40.	Teodor lat 8, Bogusław 2	Anna lat 10, Marianna 2		w Zaścianku [illegible]		
[illegible] Szymona Jana — Gabryel lat 50, Stefan lat 27	[illegible] lat 56, Bez Żony	Paweł lat 20			w [illegible]		
[illegible] Jana Szymonowicz Grzegorz lat 50, Stefan lat 20	Iwanowiczówna lat 38, Bez Żony	Józef lat 10			w [illegible]		
[illegible] Grzegorz Stefana Syn lat 40	[illegible] lat 38	Stanisław lat 3	Marianna lat 10, Marcella 6, Marya 4		w Zaścianku [illegible]		
[illegible] Szymona Andrzeja Jakub lat 40, Dymitr lat 30	Kazimierowiczówna lat 37, Bez Żony	Michał lat 9	Marianna lat 10		w [illegible]		
[illegible] Jakub lat 20, Paweł 22, Teodor 18, Alexander 13	Bez Żoni		Siostry ich Anna lat 15, Natalia 7		w [illegible]		
[illegible] Jan Jana Syn lat 50	Matuszewiczówna lat 38	Grzegorz lat 4	Anna lat 9, Helena 6, Anastazya 1		w [illegible]		
[illegible] Maciey Jana Syn lat 30	[illegible] lat 29				w Zaścianku [illegible]		

Жонка – [Агата].

110/67 **N,** дачка Крыштафа. Згадана ў тастаменце бацькі ад 17.10.1691 г., па якім зямлю ў вёсцы Касынічы з усёй рухомай маёмасцю ён завяшчаў дочкам і сыну Васілю[52].

111/67 **N,** дачка Крыштафа. Згадана ў тастаменце бацькі ад 17.10.1691 г., па якім зямлю ў вёсцы Касынічы з усёй рухомай маёмасцю ён завяшчаў дочкам і сыну Васілю[53].

112/70 **Ян,** паручнік. За смеласць пры абароне Слуцкай крэпасці ад ворага і ваенныя заслугі разам са сваякамі атрымаў 12.03.1658 г. ад польскага караля Яна II Казіміра Вазы пахвальны ліст[54]. Разам з братамі Васілём і Аляксандрам заплаціў 23.08.1664 г. з 10 валок маёнтка Кутнева па 2 фларыны ахвяравання на ўсеагульнае апалчэнне[55]. Разам з Васілём і Аляксандрам Тэадоравічамі, Янам Васілевічам і Матэвушам Іванавічам Курчамі Сеўрукамі судзіўся супраць Мікалая-Амяльяна і Яна Дамінікавічаў, Васіля і Пятра Адамавічаў, Грыгорыя, Яна, Гераніма, Каспера, Мацея і Стэфана Рафаілавічаў Курчэвічаў з Сотвы Сеўрукаў аб прысваенні маёнтка Праходы і іншых, пра што засведчыў выпіс 1682 г. з кніг спраў паточных Трыбунала ВКЛ аб пратэстацыі і рэпратэстацыі на Трыбунале ВКЛ, які адбыўся ў Навагрудку[56].

113/70 **Васіль,** харунжы. За смеласць пры абароне Слуцкай крэпасці ад ворага і ваенныя заслугі разам са сваякамі атрымаў 12.03.1658 г. ад польскага караля Яна II Казіміра Вазы пахвальны ліст. Разам з братамі Янам і Аляксандрам заплаціў 23.08.1664 г. з 10 валок маёнтка Кутнева па 2 фларыны ахвяравання на ўсеагульнае апалчэнне[57]. Судзіўся ў 1682 г. з Сеўрукамі за прысваенне маёнтка Праходы[58].

114/70 **Аляксандр.** Купіў 04.(?).1664 г. у Сымона Няронскага фальварак Сарокі, што пацвярджала актыкацыя 04.08.1664 г. у Слуцкім гродскім судзе. Разам з братамі Васілём і Янам заплаціў 23.08.1664 г. з 10 валок маёнтка Кутнева па 2 фларыны ахвяравання на ўсеагульнае апалчэнне[59]. Судзіўся ў 1682 г. з Сеўрукамі за прысваенне маёнтка Праходы[60].

115/74 **Ян,** таварыш Слуцкай харугвы. За смеласць пры абароне Слуцкай крэпасці ад ворага і ваенныя заслугі разам са сваякамі атрымаў 12.03.1658 г. ад польскага караля Яна II Казіміра Вазы пахвальны ліст. Судзіўся ў 1682 г. з Сеўрукамі за прысваенне маёнтка Праходы[61].

116/75 **Андрэй,** таварыш Слуцкай харугвы. За смеласць пры абароне Слуцкай крэпасці ад ворага і ваенныя заслугі разам са сваякамі атрымаў 12.03.1658 г. ад польскага караля Яна II Казіміра Вазы пахвальны ліст.

117/76 **Матэвуш,** таварыш Слуцкай харугвы. За смеласць пры абароне Слуцкай крэпасці ад ворага і ваенныя заслугі разам са сваякамі атрымаў 12.03.1658 г. ад польскага караля Яна II Казіміра Вазы пахвальны ліст. Судзіўся ў 1682 г. з Сеўрукамі за прысваенне маёнтка Праходы[62].

118/77 **Ян,** паручнік. Разам з братам Мікалаем-Емяльянам заплаціў 10.09.1664 г. з 18 валок маёнтка Праходы і з часткі іх дзядзькоў Адама, Рафала Іванавічаў Курчэвічаў з Сотвы Сеўрукаў ахвяраванні на ўсеагульнае апалчэнне[63]. У 1682 г. быў выкліканы ў суд Сеўрукамі, якія абвінавачвалі яго ў прысваенні маёнтка Праходы[64]. Разам з братамі Мікалаем-Емяльянам Дамінікавічам, Васілём Адамавічам, Антоніем, Грыгорыем, Янам, Геранімам, Мацеем і Стэфанам Рафалавічамі з Сотвы Сеўрукамі прадаў 23.04.1698 г. дваюраднаму брату харунжаму Пятру Адамавічу Сеўруку маёнтак Праходы ў Навагрудскім ваяводстве з

30 дварамі падданых і з усёй маёмасцю за 2000 талераў бітых грубай срэбранай манеты, што пацвярджала актыкацыя 10.06.1699 г. у Трыбунале ВКЛ.

119/77 **Мікалай-Емяльян,** таварыш Слуцкай харугвы. За смеласць пры абароне Слуцкай крэпасці ад ворага і ваенныя заслугі разам са сваякамі атрымаў 12.03.1658 г. ад польскага караля Яна II Казіміра Вазы пахвальны ліст. Разам з братам Янам заплаціў 10.09.1664 г. з 18 валок маёнтка Праходы і з часткі іх дзядзькоў Адама, Рафала Іванавічаў Курчэвічаў з Сотвы Сеўрукаў ахвяраванні на ўсеагульнае апалчэнне[65]. У 1682 г. быў выкліканы ў суд Сеўрукамі, якія абвінавачвалі яго ў прысваенні маёнтка Праходы[66]. Разам з братамі прадаў 23.04.1698 г. дваюраднаму брату харунжаму Пятру Адамавічу Сеўруку маёнтак Праходы ў Навагрудскім ваяводстве з 30 дварамі падданых і з усёй маёмасцю за 2000 талераў бітых грубай срэбранай манеты.

120/78 **Аляксандр,** каралеўскі зямянін Навагрудскага павета. У 1706–1716 гг. жыў у засценку Шастакі (Сеўрукоўшчызна), быў прыхаджанінам Капыльскага касцёла. Разам з Ганнай Радкевічавай быў хросным у Капыльскім касцёле 29.06.1706 г. у Пятра, сына Іаана і Гелены з Качкоўскіх Сеўрукаў[67]. Купіў 27.07.1716 г. у падстолія Бельскай зямлі Амброжыя і яго жонкі Варвары, народжанай Палубінскай, Закжэўскіх маёнтак Касагоры, або Сеўрукі, за 12 000 злотых польскіх[68]. Па прывілеі польскага караля Аўгуста II Моцнага ад 11.12.1725 г. зацверджаны на пасаду генерала (match: вознага)[69].

Жонка – Ефрасіння Пяткевіч.

121/78 **Васіль,** харунжы. У 1682 г. быў выкліканы ў суд Сеўрукамі, якія абвінавачвалі яго ў прысваенні маёнтка Праходы[70]. У рэестры зямян Навагрудскага ваяводства 1690 г. пазначана, што ён заплаціў падымнае «с кондиции своей вечистой Проходов дым – 1»[71]. Разам з братамі прадаў 23.04.1698 г. свайму брату харунжаму Пятру Адамавічу Сеўруку маёнтак Праходы ў Навагрудскім ваяводстве. Саступіў сыну Міхаілу (?) 08.02.1745 г. спадчынны маёнтак Праходы з сялянамі Навагрудскага ваяводства[72] (? гл. «Сеўрукі» 58/33).

122/78 **Пётр,** харунжы. У 1682 г. быў выкліканы ў суд Сеўрукамі, якія абвінавачвалі яго ў прысваенні маёнтка Праходы[73]. Купіў у братоў Мікалая-Емяльяна Дамінікавіча, Васіля Адамавіча, Антонія, Грыгорыя, Яна, Гераніма, Мацея і Стэфана Рафалавічаў з Сотвы Сеўрукаў 23.04.1698 г. маёнтак Праходы ў Навагрудскім ваяводстве, што пацвярджала актыкацыя 10.06.1699 г. у Трыбунале ВКЛ. Разам з маці 06.04.1700 г. прадаў Ежыковічам зямлю ў маёнтку Праходы, што пацвярджала інтрамісія, актыкаваная 09.04.1700 г. у Навагрудскім гродскім судзе.

123/79 **Антон.** У 1682 г. быў выкліканы ў суд Сеўрукамі, якія абвінавачвалі яго ў прысваенні маёнтка Праходы[74]. Разам з братамі прадаў 23.04.1698 г. дваюраднаму брату харунжаму Пятру Адамавічу Сеўруку маёнтак Праходы ў Навагрудскім ваяводстве.

124/79 **Іван.** У 1682 г. быў выкліканы ў суд Сеўрукамі, якія абвінавачвалі яго ў прысваенні маёнтка Праходы[75]. Разам з братамі прадаў 23.04.1698 г. дваюраднаму брату харунжаму Пятру Адамавічу Сеўруку маёнтак Праходы ў Навагрудскім ваяводстве.

125/79 **Грыгорый.** У 1682 г. быў выкліканы ў суд Сеўрукамі, якія абвінавачвалі яго ў прысваенні маёнтка Праходы[76]. Разам з братамі прадаў 23.04.1698 г. дваюраднаму брату харунжаму

Пятру Адамавічу Сеўруку маёнтак Праходы ў Навагрудскім ваяводстве. (?) Па рэестры шляхты Слуцкага княства ад 18.05.1733 г.[77] і інвентарах маёнтка Пагост Навагрудскага ваяводства 1733 г.[78] і 1751 г.[79], жыў у засценку Кутнева, валодаў у 1733 г. 1/4 «аселай» валокі зямлі, у 1751 г. – 1/8 «аселай» валокі зямлі ў «Кані Старым» і 1/8 «аселай» валокі зямлі ў «Кані Новым».

126/79 **Геранім.** У 1682 г. быў выкліканы ў суд Сеўрукамі, якія абвінавачвалі яго ў прысваенні маёнтка Праходы[80]. Разам з братамі прадаў 23.04.1698 г. дваюраднаму брату харунжаму Пятру Адамавічу Сеўруку маёнтак Праходы ў Навагрудскім ваяводстве. Па рэестры шляхты Слуцкага княства ад 18.05.1733 г.[81] і інвентары маёнтка Пагост Навагрудскага ваяводства 1733 г.[82], жыў у засценку Кутнева, валодаў 5/24 «аселай» валокі зямлі.

Жонка – N. Па інвентары маёнтка Пагост Навагрудскага ваяводства 1751 г.[83], жыла ў засценку Кутнева («Конь Стары»), валодала 5/24 «аселай» валокі зямлі («Конь Стары»), 5/24 «аселай» валокі зямлі («Конь Новы»), 23 прэнтамі, 1 канём, 1 валом.

127/79 **Марцін-Карп (Мацвей).** У 1682 г. быў выкліканы ў суд Сеўрукамі, якія абвінавачвалі яго ў прысваенні маёнтка Праходы[84]. Разам з братамі прадаў 23.04.1698 г. дваюраднаму брату харунжаму Пятру Адамавічу Сеўруку маёнтак Праходы ў Навагрудскім ваяводстве (? гл. «Сеўрукі» 60/34).

128/79 **Сцяпан.** У 1682 г. быў выкліканы ў суд Сеўрукамі, якія абвінавачвалі яго ў прысваенні маёнтка Праходы[85]. Разам з братамі прадаў 23.04.1698 г. дваюраднаму брату харунжаму Пятру Адамавічу Сеўруку маёнтак Праходы ў Навагрудскім ваяводстве (? гл. «Сеўрукі» 63/34).

VII КАЛЕНА

129/98 **Ян.** Ахрышчаны 08.07.1758 г. святаром Аляксандрам Прорвічам у Пагосцкай царкве, хросныя бацькі – жыхары вёскі Сялец Стэфан Корбут і Еўдакія Макавецкая[86].

130/99 **Грыгорый.** Па споведнай ведамасці прыхаджан Пагосцкай царквы 1760 г., жыў разам з бацькам і сёстрамі ў засценку Кутнева[87].

Жонка – (?) Агата. Па споведнай ведамасці прыхаджан Пагосцкай царквы 1760 г., жыла ў засценку Кутнева[88].

131/99 **Марыя (Марыяна, Ганна),** *1753 г. н. Па споведнай ведамасці прыхаджан Пагосцкай царквы 1760 г., разам з бацькам, братам і сястрой жыла ў засценку Кутнева[89]. Па рэвізскай сказцы ад 29.08.1795 г. і па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1796 г., жыла ў засценку Сыцянец, двор № 3, а ў дварах №№ 1, 2, 6, 7 жылі яе сваякі Грыгорый і Іван Міхайлавічы, Сямён Іосіфавіч Сеўрукі[90]. Разам з Якавам Васільевічам Некрашэвічам была хроснай 01.04.1800 г. у Яфімія[91], 22.07.1802 г. – у Марыі[92], 14.07.1807 г. – у Стэфана[93], дзяцей Грыгорыя Янавіча і Агафіі Васільеўны Сеўрукаў.

Муж – **Данііл Пількевіч,** дваранін, сын **Філона Якаўлевіча і Таццяны, народжанай Смольскай, Пількевічаў** (гл. «Пількевічы» 11/3).

132/99 **Тарэса.** Па споведнай ведамасці прыхаджан Пагосцкай царквы 1760 г., разам з бацькам, братам і сястрой жыла ў засценку Кутнева[94].

133/101 **Уладзіслаў.** 16.09.1718 г. у актавыя кнігі Слуцкага гродскага суда ўнесены «вликовый» (перадатачны) ліст ад 02.05.1716 г. паміж Корзунавай і Уладзіславам Сеўрукам аб эксдатацыі. Атрымаў 01.05.1761 г. па тастаменце Андрэевай Лявонавічавай зямлю.

134/101 **Геранім.**

135/101 **Ян.** (?) Па інвентарах маёнтка Пагост Навагрудскага ваяводства 1733 г.[95] і 1751 г.[96], жыў у засценку Залессе, валодаў у 1733 г. 1/4 «аселай» валокі зямлі; у 1751 г. – 1/4 валокі пусткі. Судзіўся 17.06.1779 г. з Волкамі па пытанні даўгавога абавязацельства.

136/101 **Антоній.** Пакінуў 15.09.1792 г. тастамент, у якім зямлю «в коню Курыловском» завяшчаў сынам Якубу і Сымону.

137/102 **Іосіф.**

138/103 **Грыгорый.** (?) Па інвентарах маёнтка Пагост Навагрудскага ваяводства 1733 г.[97] і 1751 г.[98], жыў у засценку Залессе, валодаў 1/3 «аселай» валокі зямлі.

139/103 **Міхаіл.**

140/103 **Данііл (? Давід).** (?) Па інвентары маёнтка Пагост Навагрудскага ваяводства 1733 г.[99], жыў у засценку Залессе, валодаў 1/3 «аселай» валокі зямлі.

141/104 **Андрэй.**

142/104 **Пётр.**

143/104 **Ян.** (?) Па інвентарах маёнтка Пагост Навагрудскага ваяводства 1733 г.[100] і 1751 г.[101], жыў у засценку Залессе, валодаў у 1733 г. 1/12 «вольнай» і 1/12 пад будынкам валокі зямлі; у 1751 г. – 1/2 і 1/4 валокі пусткі.

144/105 **Ян.** Разам з братам Андрэем судзіўся 20.08.1698 г. з Цярпекамі за зямлю ў вёсцы Касынічы.

145/105 **Андрэй.** Разам з братам Янам судзіўся 20.08.1698 г. з Цярпекамі за зямлю ў вёсцы Касынічы. (?) Па споведнай ведамасці прыхаджан Пагосцкай царквы 1760 г., жыў у засценку Кутнева[102].

Жонка – Алена.

146/106 **Станіслаў (Стахій).**

147/107 **Астафій** (? гл. «Сеўрукі» 94/54, 168/119).

148/107 **Марцін.** (?) Па споведнай ведамасці прыхаджан Пагосцкай царквы 1760 г., жыў у засценку Кутнева[103].

Жонка – Настасся. (?)

149/108 **Ян,** *1756 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыў у засценку Кутнева[104]. Разам з Еўдакіяй Сеўрук быў хросным 25.06.1801 г. у Пятра[105], 19.11.1806 г. – у Стэфаніды[106], дзяцей Ільы Хрыстафоравіча і Марыі Іванаўны Сеўрукаў.

Жонка – Ганна Крышэвіч, *1761 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыла ў засценку Кутнева[107].

150/108 **Крыштаф (Хрыстафор),** *1723 г. н. Па споведнай ведамасці прыхаджан Пагосцкай царквы 1760 г.[108] і сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыў у засценку Кутнева[109].

Жонка – Ганна Салімская, *1726 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыла ў засценку Кутнева[110].

151/108 **Марыя.** У 1760 г. жыла ў засценку Кутнева, была прыхаджанкай Пагосцкай царквы[111].

152/108 **Марцін.** Па споведнай ведамасці прыхаджан Пагосцкай царквы 1760 г., жыў у засценку Кутнева[112].

Жонка – (?) Ганна.

153/108 **Іосіф,** *1736 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыў у засценку Кутнева[113]. Разам з жонкай Мікалая Корбута Ганнай Пятроўнай быў хросным 17.02.1791 г. у Еўфрасінні[114], дачкі Гарасіма і Таццяны Якаўлеўны Савіцкіх.

Жонка – Марыяна Макавецкая, *1740 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыла ў засценку Кутнева[115].

154/108 **Станіслаў (Стахій, Яўстафій),** *1776 г. н. Па сямейным спісе шляхты

Слуцкага павета 1796 г., жыў у засценку Кутнева[116]. Разам з Марыяй Мікалаеўнай Сеўрук быў хросным 16.10.1799 г. у Параскевіі[117], з Марыяй Мікалаеўнай Сеўрук 07.10.1802 г. – у Алены[118], дачок Гераніма і Алены Макавецкіх.

Жонка – Ефрасіння Мохарт, *1777 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыла ў засценку Кутнева[119].

155/108 **Афанасій,** (?) *1776 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыў у засценку Кутнева[120].

156/109 **Аляксандр,** *1756 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыў у засценку Кутнева[121]. Разам з Агафіяй Якаўлеўнай Корбут быў хросным 22.08.1789 г. у Наталіі[122], з Ганнай Андрэеўнай Корбут 09.08.1790 г. – у Матфея[123], дзяцей Марціна і Кацярыны Сеўрукаў; з жонкай Івана Тарынскага Ірынай 30.07.1799 г. у Міхаіла[124], 30.07.1802 г. – у Еўдакіма[125], 10.09.1805 г. – у Ганны[126], дзяцей Яўстафія і Ефрасінні Сеўрукаў.

Жонка – Элеанора (Алена) Пятроўна Леановіч, *1761 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыла ў засценку Кутнева[127]. Разам з жыхаром засценка Застарынь Андрэем Мохартам 02.01.1805 г. была хроснай у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве Слуцкага павета ў Васіля[128], сына Сільвестра Іванавіча і Алены Пятроўны Савіцкіх.

157/109 **Марцін,** *1761 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыў у засценку Кутнева[129].

Жонка – Кацярына Рудзінская, *1761 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыла ў засценку Кутнева[130].

158/109 **Стэфан,** *1777 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыў у засценку Кутнева[131].

159/112 **Іван.**

160/112 **Андрэй.**

161/112 **Станіслаў.**

162/115 **Іван.**

163/117 **Іван.**

164/118 **Ілья.** Жыў у засценку Залессе, быў прыхаджанінам Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царквы Слуцкага павета. Памёр ва ўзросце 70 гадоў, пахаваны 09.09.1801 г. святаром Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царквы Стэфанам Прорвічам[132] (? гл. «Сеўрукі» 103/65).

Жонка – Наталля Сямёнаўна. Разам з Іванам Фёдаравічам Рэутам была хроснай 21.11.1786 г. у Грыгорыя[133], сына Іаана і Тацціяны Фёдараўны Рэутаў.

165/118 **Стэфан.** Жыў у засценку Залессе, быў прыхаджанінам Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царквы. Разам з Адарыяй Ільінічнай Сеўрук быў хросным 28.11.1787 г. у Стэфана[134], сына Грыгорыя і Ксеніі Грыгор’еўны Рэутаў (? гл. «Сеўрукі» 104/65).

166/119 **Іван.**

167/119 **Самуіл.** Па рэестры шляхты Слуцкага княства ад 18.05.1733 г.[135] і інвентарах маёнтка Пагост Навагрудскага ваяводства 1733 г.[136] і 1751 г.[137], жыў у засценку Кутнева, валодаў у 1733 г. 1/8 «аселай» валокі зямлі ў «Кані Старым» і 1/8 «аселай» валокі зямлі ў «Кані Новым».

168/119 **Яўстафій.** Па рэестры шляхты Слуцкага княства ад 18.05.1733 г.[138] і інвентары маёнтка Пагост Навагрудскага ваяводства 1733 г.[139], жыў у засценку Кутнева (прыбыў з засценка Сарога), валодаў 1/8 «вольнай» валокі зямлі (? гл. «Сеўрукі» 94/54, 147/107).

169/119 **Станіслаў,** харунжы. Разам са Станіславам Манкоўскім і Андрэем Здановічам быў сведкам у Капыльскім касцёле пры шлюбе 02.02.1728 г. Міхаіла Сеўрука і Кацярыны Масялевіч[140]; з Гілярыем Кернажыцкім – пры шлюбе 30.11.1747 г. Францішка Карчэўскага і Агаты Асіеўскай[141]. У 1734 г. жыў у засценку Шастакі, быў прыхаджанінам Капыльскага касцёла. Разам з Агатай Асіеўскай быў хросным у Капыльскім касцёле 14.05.1734 г. у Адама, сына Міхаіла і Кацярыны Сеўрукаў[142]. Пасля смерці бацькі разам з братамі Міхаілам і Геранімам уведзены 17.03.1739 г. у валоданне маёнткам Касагоры (Сеўрукі)[143], які яны прадалі 05.04.1759 г. харунжаму Фадзею Аўсянаму за 14 000 злотых польскіх, ручаючыся за непаўналетняга сына Іосіфа[144].

Жонка – Фразына.

170/120 **Гэлена,** нарадзілася ў засценку Шастакі, ахрышчана 27.02.1707 г. у Капыльскім касцёле, хросныя бацькі – Лаўрэнцій Антонавіч і Агата Ліхадзіеўчанка[145]. Разам з Казімірам Сеўрукам была хроснай у Капыльскім касцёле 09.03.1734 г. у Іосіфа, сына Станіслава і Фразыны Сеўрукаў[146].

171/120 **Казімір,** нарадзіўся ў засценку Шастакі, ахрышчаны 05.07.1716 г. у Капыльскім касцёле, хросныя бацькі – Іаан Кныш і Кацярына Радкевічава[147]. Разам з сястрой Гэленай Сеўрук быў хросным у Капыльскім касцёле 09.03.1734 г. у Іосіфа, сына Станіслава і Фразыны Сеўрукаў[148].

Жонка – Марыяна Міхалевічаўна. Шлюб 10.02.1766 г. у Клецкім касцёле. Сведкі – Іаан Самуцэвіч і Тэадор Смоліч[149].

172/120 **Міхаіл.** У 1734 г. жыў у засценку Шастакі, быў прыхаджанінам Капыльскага касцёла. Пасля смерці бацькі разам з братамі Станіславам і Геранімам уведзены 17.03.1739 г. у валоданне маёнткам Касагоры (Сеўрукі)[150], які яны прадалі 05.04.1759 г. харунжаму Фадзею Аўсянаму за 14 000 польскіх злотых, ручаючыся за непаўналетніх сыноў Івана і Пятра[151].

Жонкі: 1. Кацярына Масялевіч. Шлюб 02.02.1728 г. у Капыльскім касцёле. Ксёндз – Ігнацій Станіслаў [ ]. Сведкі – Станіслаў Манкоўскі, Андрэй Здановіч, Станіслаў Сеўрук[152]. Ад яе сын Адам; 2. Тэрэза Масялевіч. Шлюб 02.08.1739 г. у Капыльскім касцёле. Сведкі – Андрэй Здановіч, Казімір Зубкевіч, Міхаіл Ляпінскі[153].

173/120 **Геранім.** Пасля смерці бацькі разам з братамі Міхаілам і Станіславам уведзены 17.03.1739 г. у валоданне маёнткам Касагоры (Сеўрукі)[154], які яны прадалі 05.04.1759 г. харунжаму Фадзею Аўсянаму за 14 000 польскіх злотых, ручаючыся за непаўналетняга сына Іосіфа[155].

Жонкі: 1. N; 2. Разалія Беразневічаўна. Шлюб 01.02.1742 г. у Клецкім касцёле. Сведкі – Антоній Міладоўскі і Іаан Цярпіцкі.

174/121 **Іван,** харунжы. У Трыбунале ВКЛ прызнана 06.05.1753 г. асекурацыя (распіска) ад 15.02.1753 г., у той жа дзень замацаваная паміж панам Янам з Плонняў Птшаніцкім Мысьлікам, мечнікам Гродзенскага павета, і Янам Курчэвічам з Сотвы Сеўрукам, «на пасагавую» выплату і на атрыманне валодання. У дакуменце ўпамінаецца бацька Васіль Адамавіч Сеўрук, яго брат Пётр і пляменнік Ян, а таксама дваюрадныя браты Івана – Ілья і Стэфан Янавічы, Станіслаў, Андрэй і Ян Янавічы[156]. Разам з жонкай судзіўся 17.06.1779 г. са стольнікам Навагрудскага ваяводства Самуілам Ланеўскім і генеральным адміністратарам Вялікай

булавы Стэфанам і Зузанай Воланамі па грашовых пытаннях.

Жонка – Ганна Мысьлік.

175/121 **Міхаіл.** Атрымаў ад бацькі 08.02.1745 г. спадчынны маёнтак Праходы з сялянамі Навагрудскага ваяводства[157].

176/122 **Іван.**

177/123 **Якаў,** *1758 (1755) г. н. Па рэвізскай сказцы дваран ад 23.08.1795 г.[158] і сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыў у засценку Сарога[159].

Жонка – Марыяна Лаўрынаўна Тарасевіч, *1765 (1766) г. н. Па рэвізскай сказцы дваран ад 23.08.1795 г.[160] і сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыла ў засценку Сарога[161].

178/123 **Сямён,** *1769 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыў у засценку Сарога[162]. Разам з Сямёнам Міхневічам быў сведкам 16.04.1811 г. пры шлюбе ў Яроміцкай Раство-Багародзіцкай царкве Грыгорыя Васільевіча Тарасевіча і Алены Іванаўны Тарасевіч.

Жонка – Элеанора (Алена) Сеўрук, *1772 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыла ў засценку Сарога[163]. Разам з Кандраціем Сеўрукам была хроснай 03.10.1797 г. у Стэфана[164], сына Васіля і Еўдакіі Міхайлаўны Тарасевічаў.

179/124 (?) **Іосіф,** *1727 г. н. Жыў у засценку Сыцянец, быў прыхаджанінам Старобінскай Мікалаеўскай царквы. Разам з Соф'ей Уладзіславаўнай Некрашэвіч быў хросным 02.06.1787 г. у Нікіфара[165], сына Васіля і Ірыны Іванаўны Некрашэвічаў. Памёр 29.11.1789 г. ва ўзросце 62 гадоў, пахаваны святаром Старобінскай Мікалаеўскай царквы Гаўрыілам Бабарыкіным[166].

180/124 **Міхаіл.** Разам з братамі Іванам і Іванам частку вотчыннага маёнтка Ліснёўка Мінскага ваяводства, які дастаўся ад бацькі Івана і дзеда Рафала, а таксама другую частку маёнтка Праходы з сялянамі прадаў 22.01.1787 г. Стэфану Гадыцкаму за 10 000 польскіх злотых[167].

181/124 **Іван.** Разам з братамі Міхаілам і Іванам частку вотчыннага маёнтка Ліснёўка Мінскага ваяводства, які дастаўся ад бацькі Івана і дзеда Рафала, а таксама другую частку маёнтка Праходы з сялянамі прадаў 22.01.1787 г. Стэфану Гадыцкаму за 10 000 польскіх злотых[168]. Жыў у засценку Кутнева, быў прыхаджанінам Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царквы Слуцкага павета.

Жонкі: 1. N; 2. Магдалена, ад яе сын Грыгорый.

182/124 **Іван.** Разам з братамі Міхаілам і Іванам частку вотчыннага маёнтка Ліснёўка Мінскага ваяводства, які дастаўся ад бацькі Івана і дзеда Рафала, а таксама другую частку маёнтка Праходы з сялянамі прадаў 22.01.1787 г. Стэфану Гадыцкаму за 10 000 польскіх злотых[169].

183/125 **Кандрат,** нарадзіўся ў засценку Кутнева, ахрышчаны 25.06.1758 г. святаром Аляксандрам Прорвічам у Пагосцкай царкве, хросныя бацькі – Васіль Кулакоўскі і Анэля Корбут[170]. Жыў у засценку Сарога, быў прыхаджанінам Языльскай Праабражэнскай царквы. Разам з жонкай Сямёна Сеўрука Аленай быў хросным 03.10.1797 г. у Стэфана[171], сына Васіля і Еўдакіі Міхайлаўны Тарасевічаў.

Жонка – Марыя Антонаўна. Разам з Грыгорыем Фамічом Браткоўскім была хроснай 12.01.1801 г. у Паўла[172], сына Міхаіла і Ганны Герасімаўны Тарасевічаў.

184/125 **Якаў.**

185/126 **Афанасій (Апалінарый),** *1716 г. н. Па інвентары маёнтка Пагост Навагрудскага ваяводства 1751 г.[173] і па споведнай ведамасці прыхаджан Пагосцкай царквы 1760 г.[174], жыў у засценку Кутнева, валодаў 1/12 «аселай» валокі зямлі («Конь Стары»), 1/12 «аселай» валокі зямлі («Конь Новы»), 1 канём, 2 валамі. Па сямейным спісе дваран 1796 г., жыў у засценку Сарога[175].

Жонка – Ганна (Агата) Сыцько, *1720 г. н. Па сямейным спісе дваран 1796 г., жыла ў засценку Сарога[176].

186/126 **Уладзімір (Уладзіслаў).** Пакінуў тастамент ад 20.03.1789 г., у якім ён размеркаваў сваім братам Сільвестру і Афанасію частку маёмасці, абавязваючы іх раіць і дапамагаць яго сыну Паўлу, каб яму была выдзелена частка зямлі, якая пасля бацькі Гераніма Рафалавіча засталася непадзеленай. Не атрымаўшы ў валоданне маёнтак Праходы, засталіся незадаволенымі сваякі: дваюрадныя браты Ян, Іван і Міхаіл Янавічы, дзядзькі Ян, Антоній, Грыгорый, Мацвей, Сцяпан Рафаілавічы, а таксама далёкія сваякі – Ян Васільевіч, харунжы, Васіль Адамавіч і яго брат Пётр, Якуб Грыгор'евіч, Якуб і Сымон Антонавічы, Астафій, Самуіл і Ян Мікалаевічы, таксама Ілья і Стэфан Янавічы.

187/126 **Сільвестр.** Па рэестры шляхты Слуцкага княства ад 18.05.1733 г.[177] і інвентарах маёнтка Пагост Навагрудскага ваяводства 1733 г.[178] і 1751 г.[179], жыў у засценку Кутнева, валодаў у 1733 г. 1/4 «аселай» валокі зямлі; у 1751 г. – у «Кані Старым» 3/16 «аселай» валокі зямлі, 1 валом; у «Кані Новым» – 3/16 «аселай» валокі зямлі.

VIII КАЛЕНА

188/133 **Павел.** Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 04.09.1802 г. прызнаны ў дваранстве з унясеннем у 1-ю частку радаводнай кнігі дваран Мінскай губерні[180].

189/133 **Кандрат.** Па рэестры шляхты Слуцкага княства ад 18.05.1733 г.[181] і інвентары маёнтка Пагост Навагрудскага ваяводства 1751 г.[182], жыў у засценку Сыцянец, валодаў у 1751 г. 1/4 і 5/8 «казацкай» валокі зямлі, 2 коньмі і 1 валом. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 04.09.1802 г. прызнаны ў дваранстве з унясеннем у 1-ю частку радаводнай кнігі дваран Мінскай губерні[183].

190/133 **Марцін.**

191/133 **Ян,** *1726 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыў у засценку Касынічы[184].

Жонка – Кацярына Сарока, *1736 г. н.

192/134 **Іван,** *1756 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыў у засценку Раткаў[185].

Жонка – Агата Пількевіч, *1767 г. н.

193/134 **Тэадор,** *1766 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыў у засценку Раткаў[186].

Жонка – Кацярына Забродская, *1769 г. н.

194/135 **Сымон.** Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 04.09.1802 г. прызнаны ў дваранстве з унясеннем у 1-ю частку радаводнай кнігі дваран Мінскай губерні[187]. Не пакінуў нашчадкаў.

195/136 **Лявон (? Сымон).** Разам з братам атрымаў па завяшчанні бацькі ад 15.09.1792 г. зямлю ў «Кані Курылаўскім». Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 04.09.1802 г. прызнаны ў дваранстве з

унясеннем у 1-ю частку радаводнай кнігі дваран Мінскай губерні[188].

196/136 **Якуб.** Разам з братам атрымаў па завяшчанні бацькі ад 15.09.1792 г. зямлю ў «Кані Курылаўскім». Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 04.09.1802 г. прызнаны ў дваранстве з унясеннем у 1-ю частку радаводнай кнігі дваран Мінскай губерні[189].

197/137 **Марцін.**

198/137 **Тэадор.**

199/138 **Мацей.**

200/138 (?) **Васіль.** Па інвентары маёнтка Пагост Навагрудскага ваяводства 1751 г.[190], жыў у засценку Залессе, валодаў 1/4 «аселай» валокі зямлі.

201/139 (?) **Васіль.** Па інвентарах маёнтка Пагост Навагрудскага ваяводства 1733 г.[191] і 1751 г.[192], жыў у засценку Залессе, валодаў 1/3 «аселай» валокі зямлі.

202/143 (?) **Васіль.** Па інвентары маёнтка Пагост Навагрудскага ваяводства 1751 г.[193], жыў у засценку Залессе, валодаў 1/8 «аселай» валокі зямлі.

203/144 **Пётр.**

204/145 **Андрэй.** Па споведнай ведамасці прыхаджан Пагосцкай царквы 1760 г., жыў у засценку Кутнева[194].

Жонка – (?) Фрузына.

205/145 **Ян.** Па споведнай ведамасці прыхаджан Пагосцкай царквы 1760 г., жыў у засценку Кутнева[195].

Жонка – (?) Ганна.

206/146 **Пётр.** Жыў у засценку Кутнева, быў прыхаджанінам Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царквы Слуцкага павета. Разам з жонкай Іаана Корбута Марыяй быў хросным 18.06.1794 г. у Лявонція[196], сына Аляксандра і Алены Сеўрукаў.

Жонка – Алена Іванаўна. Разам з жыхаром засценка Гарахавец Стэфанам Іванавічам Яновічам была хроснай 03.12.1789 г. у Фёдара[197], сына Хрыстафора і Пелагіі Іванаўны Сеўрукаў; 06.12.1789 г. – у Стэфана[198], сына Грыгорыя Іванавіча і Кацярыны Сыцько; з Марцінам Якаўлевічам Корзунам 09.11.1791 г. – у Міхаіла[199], сына Хрыстафора і Пелагіі Сеўрукаў.

207/146 **Іосіф.** Жыў у засценку Кутнева, быў прыхаджанінам Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царквы Слуцкага павета. Разам з жонкай Іаана Сеўрука Аленай Кандратаўнай быў хросным 12.01.1791 г. у Таццяны, дачкі Пятра і Алены Іванаўны Сеўрукаў[200].

Жонка – Марыяна (Ганна) Якаўлеўна. Разам з жыхаром засценка Смольгава Васілём Забродскім была хроснай 09.10.1799 г. у Ганны, дачкі Васіля Пятровіча і Еўдакіі Фамінічны Сеўрукаў[201]; з Фёдарам Сеўрукам 23.05.1805 г. – у Міхаіла[202], сына Матфея Іванавіча і Варвары Іванаўны Сеўрукаў.

208/147 **Самуіл.** (?) Па інвентары маёнтка Пагост Навагрудскага ваяводства 1751 г.[203], жыў у засценку Кутнева, валодаў 1/8 «аселай» валокі зямлі ў «Кані Старым» і 1/8 «аселай» валокі зямлі ў «Кані Новым», 23 прэнтамі зямлі, 1 валом.

209/147 **Ян.** Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 04.09.1802 г. прызнаны ў дваранстве з унясеннем у 1-ю частку радаводнай кнігі дваран Мінскай губерні[204].

210/147 **Сымон.**

211/147 **Крыштаф.** Жыў у засценку Кутнева, быў прыхаджанінам Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царквы.

Жонкі – 1. N; 2. Пелагія, *1759 г. н. Памерла 05.04.1793 г. ва ўзросце 34 гадоў, пахавана

святаром Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царквы Іаанам Бараноўскім[205].

212/148 **Павел.**

213/149 **Ефрасіння,** *1781 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыла ў засценку Кутнева[206].

214/149 **Апалонія,** *1784 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыла ў засценку Кутнева[207].

215/150 **Ілья,** *1777 г. н. Жыў у засценку Кутнева, быў прыхаджанінам Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царквы Слуцкага павета.

Жонка – Марыя Іванаўна Сеўрук, 20 гадоў, жыхарка засценка Кутнева. Шлюб 11.10.1797 г. у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Святар – Іаан Бараноўскі[208].

216/150 **Ефрасіння,** *1772 г. н.

Муж – Павел Пятровіч Лderivative Левановіч, 21 года, жыхар засценка Сарога, прыхаджанін Языльскай царквы. Шлюб 16.02.1791 г. у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Святар – Аляксандр Прорвіч[209].

217/150 **Тэадор (Фёдар),** *1776 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыў у засценку Кутнева[210]. Разам з Васілём Макавецкім быў сведкам пры шлюбе 03.06.1807 г. Лявона Іосіфавіча Сеўрука і Настассі Іванаўны Смоліч[211].

Жонка – Варвара Аляксандраўна.

218/150 **Марыяна,** *1777 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыла ў засценку Кутнева[212].

219/152 **Стэфан.**

220/153 **Лявон,** *1782 (1784) г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыў у засценку Кутнева[213]. Быў прыхаджанінам Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царквы.

Жонка – Настасся Іванаўна Смоліч, 20 гадоў, жыхарка засценка Язовінь. Шлюб 03.06.1807 г. у Старобінскай Мікалаеўскай царкве. Святар – Гаўрыіл Бабарыкін. Сведкі – жыхар засценка Кутнева Феадор Сеўрук і жыхар засценка Язовінь Васіль Макавецкі[214].

221/153 **Анастасія,** *1776 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыла ў засценку Кутнева[215].

222/154 **Міхаіл,** нарадзіўся 30.07.1799 г. у засценку Кутнева ў сям'і Яўстафія і Ефрасінні Сеўрукаў, ахрышчаны святаром Іаанам Бараноўскім у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Кутнева Аляксандр Сеўрук і жонка Івана Тарынскага Ірына[216].

223/154 **Еўдакім,** нарадзіўся 30.07.1802 г. у засценку Кутнева ў сям'і Яўстафія і Ефрасінні Сеўрукаў, ахрышчаны святаром Іаанам Бараноўскім у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Кутнева Аляксандр Сеўрук і жонка Івана Тарынскага Ірына[217].

224/154 **Ганна,** нарадзілася 10.09.1805 г. у засценку Кутнева ў сям'і Яўстафія і Ефрасінні Сеўрукаў, ахрышчана святаром Іаанам Бараноўскім у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Кутнева Аляксандр Сеўрук і жонка Івана Тарынскага Ірына[218].

225/156 **Лявон,** нарадзіўся 18.06.1794 г. у засценку Кутнева ў сям'і Аляксандра Станіслававіча і Алены Сеўрукаў, ахрышчаны святаром Іаанам Бараноўскім у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Кутнева Пётр Сеўрук і жонка Іаана Корбута Марыя[219]. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыў у засценку Кутнева[220].

226/157 **Стэфан,** *1788 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыў у засценку Кутнева[221].

227/157 **Павел,** нарадзіўся 15.01.1799 г. у засценку Кутнева ў сям'і Марціна Станіслававіча і Кацярыны Сеўрукаў, ахрышчаны святаром Іаанам Бараноўскім у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхар засценка Бабылі Якаў Рудзінскі і дачка жыхара засценка Кутнева Пятра Сеўрука Дарыя, дзяўчына[222]. Памёр 19.03.1802 г., пахаваны святаром Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царквы Іаанам Бараноўскім[223].

228/157 **Тарэса (Параскевія),** *1783 (1786) г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыла ў засценку Кутнева[224].

Муж – Антоній Пятровіч Бараноўскі, 18 гадоў, жыхар засценка Чыжэвічы, прыхаджанін Чыжэвіцкай Пакроўскай царквы. Шлюб 19.01.1802 г. у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Святар – Іаан Бараноўскі[225].

229/157 **Матфей,** нарадзіўся 09.08.1790 г. у засценку Кутнева ў сям'і Марціна і Кацярыны Сеўрукаў, ахрышчаны святаром Аляксандрам Прорвічам у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Кутнева Аляксандр Станіслававіч Сеўрук і жонка Якава Корбута Ганна Андрэеўна[226].

230/157 **Наталія (Анастасія),** нарадзілася 22.08.1789 г. у засценку Кутнева ў сям'і Марціна і Кацярыны Сеўрукаў, ахрышчана святаром Аляксандрам Прорвічам у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Кутнева Аляксандр Яўстафіеў Сеўрук і дачка Якава Корбута Агафія[227]. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыла ў засценку Кутнева[228].

231/157 **Юстын,** нарадзіўся 01.07.1792 г. у засценку Кутнева ў сям'і Марціна і Кацярыны Сеўрукаў, ахрышчаны святаром Аляксандрам Прорвічам у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Кутнева Антоній Фёдаравіч Сеўрук і жонка Якава Корбута Ганна[229].

232/159 **Фама,** *1772 (1767) г. н. Жыў у засценку Кутнева, быў прыхаджанінам Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царквы. Памёр у 1814 г.

Жонкі: 1. (?) Наталія. Разам з Герасімам Савіцкім была хроснай 09.08.1791 г. у Матфея[230], сына Стэфана і Ганны Сеўрукаў; з Іаанам Сеўрукам 25.11.1792 г. – у Пятра[231], сына Іосіфа і Агафіі Сеўрукаў; з Іаанікіем Макавецкім 27.07.1796 г. – у Параскевіі[232], дачкі Грыгорыя і Алены Ждановічаў (? Гурыновічаў); 2. Марцэла, *1766 г. н. Па спісе дваран ад 20.03.1816 г.[233] і рэвізскай сказцы ад 04.08.1816 г.[234], жыла ў засценку Кутнева.

233/159 **Мацвей,** *1774 г. н. Пазначаны ў спісе дваран ад 20.03.1816 г.[235]

Жонка – Марыя Грыгор'еўна Корбут. Па спісе дваран ад 20.03.1816 г.[236], жыла ў засценку Кутнева.

234/160 **Сямён,** *1771 г. н. Пазначаны ў спісе дваран ад 20.03.1816 г.[237]

Жонка – Марыяна Пількевіч.

235/161 **Іосіф,** *1731 (1746, 1759) г. н. Разам з жонкай Мацвея Корбута Марыяй быў хросным 22.02.1797 г. у Цімафея, сына Фамы Іванавіча і Марыі Сеўрукаў[238]. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета ад 04.08.1816 г.[239], жыў у засценку Кутнева. Быў прыхаджанінам Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царквы.

Жонка – Агафія Тшэраванская, памерла 10.08.1806 г. ва ўзросце 60 гадоў, пахавана святаром Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царквы Іаанам Бараноўскім[240].

236/162 **Сымон,** *1780 г. н. Быў прыхаджанінам Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царквы. Разам з Саламоніяй Беразоўскай быў хросным 04.07.1803 г. у Старобінскай Мікалаеўскай царкве ў Філіпа[241], сына Гервасія Іванавіча і Агафіі Фёдараўны Тычынаў. Разам з жыхаром засценка Іздрашава Іванам Беразоўскім быў сведкам у Чыжэвіцкай Пакроўскай царкве пры шлюбе 24.05.1813 г. Аляксандра Дзям'янавіча Рэута і Марыі Грыгор'еўны Беразоўскай[242]. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета 1816 г.[243] і спісе шляхты Пагосцкага ключвойцтва 1822 г.[244], жыў у засценку Залессе на зямлі княжны Стэфаніі Дамінікаўны Радзівіл.

Жонка – Агафія Іванаўна Тычына, 18 гадоў[245], жыхарка засценка Тычыны. Шлюб 18.09.1797 г. у Старобінскай Мікалаеўскай царкве. Святар – Гаўрыіл Бабарыкін (гл. «Тычыны» 50/15). Разам з Іаанам Тарынскім была хроснай 14.02.1809 г. у Антонія[246], сына Сімяона Васільевіча і Параскевіі Васільеўны Корбутаў. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета 1816 г., жыла ў засценку Залессе на зямлі княжны Стэфаніі Дамінікаўны Радзівіл[247].

237/164 **Даніл,** разам з жонкай Марціна Сеўрука Ефрасінняй быў хросным 22.07.1801 г. у Агафіі, дачкі Сімяона Іванавіча і Агафіі Іванаўны Сеўрукаў[248]. Па спісе дваран ад 20.03.1816 г., жыў у засценку Залессе[249], пасля пераехаў у Ігуменскі павет.

Жонка – Ганна Фёдараўна Ванькові ч. Разам з Грыгорыем Тарынскім была хроснай 03.11.1806 г. у Анастасіі[250], дачкі Грыгорыя Якаўлевіча і Анастасіі Іванаўны Рэутаў.

238/164 **Адарыя.** Жыла ў засценку Залессе, была прыхаджанкай Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царквы. Разам са Стэфанам Сеўрукам была хроснай 28.11.1787 г. у Стэфана[251], сына Грыгорыя і Ксеніі Грыгор'еўны Рэутаў.

239/164 **Міхаіл,** *1771 г. н. У 1805–1809 гг. жыў у засценку Кутнева, у 1815 г. – у засценку Залессе. Разам з жонкай Сімяона Корбута Параскевіяй Васільеўнай быў хросным 04.06.1811 г. у Мітрафана[252], сына Аляксандра Янавіча і Ефрасінні Грыгор'еўны Рэутаў. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета 1816 г.[253] і спісе шляхты Пагосцкага ключвойцтва 1822 г.[254], жыў у засценку Залессе на зямлі княжны Стэфаніі Дамінікаўны Радзівіл, пасля пераехаў у Ігуменскі павет.

Жонка – Стэфаніда Лявонаўна (Іосіфаўна) Камінская, *1780 г. н. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета 1816 г., жыла ў засценку Залессе на зямлі княжны Стэфаніі Дамінікаўны Радзівіл[255]. Разам з салдатам Нізоўскага мушкецёрскага палка Кірэем Цімафеевічам [Еквепік] была хроснай 16.12.1801 г. у Іўліаніі[256], дачкі Пятра Сцяпанавіча і Марыі Сеўрукаў; з Фёдарам Рэутам 08.11.1803 г. – у Матроны[257], 17.04.1806 г. – у Сімяона[258], дзяцей Сімяона Іванавіча і Агафіі Іванаўны Сеўрукаў; з Андрэем Сеўрукам 21.05.1806 г. – у Алены[259], дачкі Мацвея Іванавіча і Еўдакіі Васільеўны Крышэвічаў; з Аляксандрам Рэутам 02.01.1822 г. – у Сільвестра[260], сына Сімяона Якаўлевіча і Еўдакіі Грыгор'еўны Рэутаў.

240/164 **Грыгорый,** *1779 г. н. У 1786 г. жыў у засценку Залессе, у 1805 г. – у засценку Галіца Слуцкага павета, быў прыхаджанінам Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царквы. Разам з жонкай Дзям'яна Рэута Феадосіяй Андрэеўнай быў хросным 02.10.1786 г. у Юстыны[261], дачкі

Грыгорыя і Настассі Загароўскіх. Па спісе дваран ад 20.03.1816 г., жыў у засценку Кулакі[262].

Жонка – Стэфаніда (Стэпа) Аляксандраўна Некрашэвіч. Разам з Антоніем Сеўрукам была хроснай 24.02.1801 г. у Еўдакіі, дачкі Васіля і Ульяны Рэутаў[263].

241/165 **Андрэй,** *1771 г. н. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета 1816 г., жыў у засценку Залессе на зямлі княжны Стэфаніі Дамінікаўны Радзівіл[264]. Разам з жонкай Міхаіла Сеўрука Стэфанідай Лявонцьеўнай быў хросным 21.05.1806 г. у Алены[265], дачкі Мацвея Іванавіча і Еўдакіі Васільеўны Крышэвічаў.

Жонка – Марыя, *1770 г. н. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета 1816 г., жыла ў засценку Залессе на зямлі княжны Стэфаніі Дамінікаўны Радзівіл[266].

242/165 **Пётр,** *1786 г. н. Разам з Настассяй Загароўскай быў хросным 13.09.1799 г. у Івана, сына Пятра і Ефрасінні Сеўрукаў[267]. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета 1816 г.[268] і спісе шляхты Пагосцкага ключвойцтва 1822 г.[269], жыў у засценку Залессе на зямлі княжны Стэфаніі Дамінікаўны Радзівіл.

Жонка – Марыя (Марыяна, Ірына) Фёдараўна Міхневіч, *1781 г. н. Разам з Сімяонам Корбутам была хроснай 24.08.1805 г. у Пятра[270], 06.08.1814 г. – у Марыі[271], 29.08.1817 г. – у Івана[272], дзяцей Міхаіла Грыгор’евіча і Ефрасінні Рэутаў. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета 1816 г., жыла ў засценку Залессе на зямлі княжны Стэфаніі Дамінікаўны Радзівіл[273].

243/165 **Іван.** Жыў у засценку Кутнева, быў прыхаджанінам Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царквы. Разам з Фядорай Загароўскай быў хросным 17.09.1790 г. у Сафіі[274], 26.11.1793 г. – у Якава[275], дзяцей Іаана і Ганны Сеўрукаў; з жонкай маркаўскага пісара Вінцэнція Зяневіча Агафіяй Фёдараўнай, каталіцкага веравызнання, 19.03.1807 г. – у Дарыі[276], дачкі Міхаіла Ільіча і Стэфаніды Лявонаўны Сеўрукаў; з Параскевіяй Андрэеўнай Сеўрук 22.12.1811 г. – у Ваніфацыя[277], сына Пятра Стэфанавіча і Ірыны Фёдараўны Сеўрукаў. Памёр у 1813 г.

244/166 **Сцяпан,** *1780 г. н. Жыў у засценку Залессе, быў прыхаджанінам Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царквы. Пазначаны ў спісе дваран ад 20.03.1816 г.[278] Разам з жонкай Івана Рэута Марыяй быў хросным 28.10.1797 г. у Стэфана[279], сына Грыгорыя і Марыі Рэутаў.

Жонка – Кацярына.

245/166 **Сямён,** *1773 г. н. Жыў у засценку Залессе, быў прыхаджанінам Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царквы. Пазначаны ў спісе дваран ад 20.03.1816 г.[280]

Жонка – Марцэля.

246/167 **Фёдар (Тэадор),** *1769 (1756, 1777) г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г.[281] і рэвізскай сказцы ад 04.08.1816 г.[282], жыў у засценку Кутнева.

Жонка – Агата (Марыяна) Бараноўская, *1761 (1767) г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г.[283] і рэвізскай сказцы ад 04.08.1816 г.[284], жыла ў засценку Кутнева.

247/167 **Грыгорый,** *1736 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыў у засценку Кутнева[285].

Жонка – Ганна (Пракседа) Чарнушэвіч, *1741 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыла ў засценку Кутнева[286].

248/168 **Іван,** *1776 г. н. Пазначаны ў спісе дваран ад 20.03.1816 г.[287]

Жонка – Гертруда Яблоньская, *1778 г. н.

249/169 **Іосіф,** нарадзіўся ў засценку Шастакі, ахрышчаны ксяндзом Іаанам Пенскім 09.03.1734 г. у Капыльскім касцёле. Хросныя бацькі – Казімір Сеўрук і Гелена Сеўрукаўна[288].

Жонка – Мар'яна.

250/172 **Іван,** нарадзіўся 22.06.1741 г. у засценку Шастакі ў сям'і Міхаіла і Тэрэзіі Сеўрукаў, ахрышчаны ксяндзом Адальбертам Іванам Канопкам у Капыльскім касцёле. Хросныя бацькі – Юрый Радкевіч і Алена Меркішава[289].

Жонка – Агафія Іодка. Шлюб 21.11.1773 г. у Капыльскім касцёле. Сведкі – Дамінік Міхневіч і Мікалай Даўгіерт[290].

251/172 **Адам,** нарадзіўся ў засценку Шастакі, ахрышчаны ксяндзом Іаанам Пенскім 14.05.1734 г. у Капыльскім касцёле. Хросныя бацькі – Станіслаў Сеўрук і Агата Асіеўская[291].

252/172 **Пётр,** нарадзіўся 19.05.1748 г. у засценку Шастакі ў сям'і Міхаіла і Кацярыны Сеўрукаў, ахрышчаны ксяндзом Хрызастомам Кліётам у Капыльскім касцёле. Хросныя бацькі – Казімір Міцулевіч і Алена Сеўрукава[292].

Жонка – Варвара.

253/173 **Іосіф,** нарадзіўся 17.10.1741 г. у засценку Шастакі ў сям'і Гераніма і Іаанны Сеўрукаў, ахрышчаны ксяндзом Адальбертам Іванам Канопкам у Капыльскім касцёле. Хросныя бацькі – Юрый Радкевіч і Марыяна Вінкоўская[293].

254/174 **Баніфацый (Беніямін).**

255/174 **Сцяпан,** *1763 г. н.

256/174 **Сямён-Мікалай.** Заключыў 25.09.1795 г. канвенцыю з гарадзенскім мечнікам Мысьлікам Птшаніцкім па пытанні вяртання доўгу да канкрэтнага тэрміну і заканчэння працэсаў з Сеўрукамі, Воланамі і іншымі.

257/175 **Фёдар (Тэадор).** 08.08.1763 г. уведзены ў валоданне маёнткам з сялянамі Праходы (актыкацыя 18.08.1763 г. у Навагрудскім земскім судзе), які прадаў 03.03.1781 г. Антону Сакалоўскаму, ручаючыся за сваіх сыноў Варфаламея і Антона[294]. Памёр у 1783 г.

Жонка – Юстына Мілеўская. Шлюб 16.05.1762 г. у Клецкім касцёле. Ксёндз – Андрэй Макрыцкі. Сведкі – Аляксандр Мілеўскі, Тэадор Мілеўскі, Станіслаў Галаўня[295].

258/177 **Фёдар (Тэадор),** *1792 (1780) г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., разам з бацькамі жыў у засценку Сарога[296]. Разам з Мікалаем Корбутам быў сведкам у Языльскай Праабражэнскай царкве пры шлюбе 11.05.1824 г. Пятра Сямёнавіча Тарасевіча і Еўдакіі Сямёнаўны Сеўрук[297].

259/177 **Сямён,** *1776 г. н.

260/178 **Сцяпан.**

261/178 **Сымон,** *1792 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыў у засценку Сарога[298].

262/179 **Сімяон,** *1753 (1755) г. н. Па рэвізскай сказцы ад 29.08.1795 г.[299] і сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г.[300], жыў у засценку Сыцянец. Быў прыхаджанінам Старобінскай Мікалаеўскай царквы. Памёр 21.09.1799 г. ва ўзросце 46 гадоў, пахаваны святаром Старобінскай Мікалаеўскай царквы Гаўрыілам Бабарыкіным[301].

Жонкі: 1. Алена. Памерла 18.09.1789 г. ва ўзросце 27 гадоў, пахавана святаром Старобінскай Мікалаеўскай царквы Гаўрыілам Бабарыкіным. Ад яе дачка Настасся[302]; 2. Соф'я Андрэеўна (Пятроўна) Корбут, *1765 г. н. Па рэвізскай сказцы ад 29.08.1795 г.[303] і сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г.[304], жыла ў засценку Сыцянец. Пасля смерці мужа Сімяона Іосіфавіча Сеўрука выйшла замуж за

жыхара засценка Раткаў, прыхаджаніна Прускай Раство-Багародзіцкай царквы Іосіфа Іаанавіча Сеўрука, *1780 г. н. (гл. «Сеўрукі» 209/113). У метрычнай кнізе Старобінскай Мікалаеўскай царквы шлюб запісаны 14.06.1799 г. і Соф'я Андрэеўна пазначана ўдавой, хоць муж яе памёр на некалькі месяцаў пазней[305].

263/180 **Грыгорый,** *1771 г. н. Па рэвізскай сказцы ад 29.08.1795 г.[306], сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г.[307], жыў у засценку Сыцянец. Разам з жонкай Фамы Сеўрука Параскевіяй Аляксандраўнай быў хросным 14.06.1810 г. у Ануфрыя[308], з жонкай Рамана Некрашэвіча Параскевіяй 30.03.1820 г. – у Алены[309], дзяцей Грыгорыя Уладзіслававіча і Еўдакіі Данілаўны Некрашэвічаў; з Марыяй Нікіфараўнай Некрашэвіч 12.12.1823 г. – у Данііла[310], 17.11.1825 г. – у Грыгорыя[311], 17.01.1828 г. – у Таццяны[312], дзяцей Рамана Іванавіча і Параскевіі Грыгор'еўны Некрашэвічаў.

Жонка – Іаана (Хіма, Яфімія) Уладзіславаўна Некрашэўская, *1776 г. н. Па рэвізскай сказцы ад 29.08.1795 г.[313], сямейных спісах шляхты Слуцкага павета 1796 г.[314] і ад 20.03.1816 г.[315], жыла ў засценку Сыцянец. Разам з Фамой Сеўрукам была хроснай 14.03.1806 г. у Венядзікта[316], сына Івана Уладзіслававіча і Феафілы Некрашэвічаў.

264/180 **Дарота,** *1791 г. н. Па рэвізскай сказцы шляхты Слуцкага павета ад 29.08.1795 г.[317], жыла разам з братам Грыгорыем, яго жонкай і сынам Паўлам у засценку Сыцянец.

265/180 **Іван (Ян),** *1776 г. н. Па рэвізскай сказцы ад 29.08.1795 г.[318] і сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г.[319], жыў у засценку Сыцянец.

Жонка – Ганна Мілушчыцкая, *1778 г. н. Па рэвізскай сказцы ад 29.08.1795 г.[320] і сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г.[321], жыла ў засценку Сыцянец.

266/180 **Тарэса,** *1793 г. н. Па рэвізскай сказцы шляхты Слуцкага павета ад 29.08.1795 г.[322], разам з братам Іванам і яго жонкай жыла ў засценку Сыцянец.

267/181 **Грыгорый,** *1772 г. н. Па спісе дваран ад 20.03.1816 г., жыў у засценку Сыцянец[323].

Жонка – Агапа Некрашэвіч.

268/181 **Грыгорый,** нарадзіўся 20.12.1790 г. у засценку Кутнева ў сям'і Івана Іванавіча і Магдалены Сеўрукаў, ахрышчаны святаром Аляксандрам Прорвічам у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Кутнева Сымон Бразоўскі і жонка Паўла Яблонскага Еўфрасіння[324].

269/182 **Мацвей,** *1795 г. н.

Жонка – Агапа.

270/183 **Ілья.**

271/183 **Фёдар.**

272/184 **Марцін.**

273/184 **Андрэй.**

274/185 **Іван,** *1774 г. н. Па спісах дваран 1796 г.[325] і ад 14.03.1816 г., жыў у засценку Сарога на зямлі княгіні Стэфаніі Радзівіл[326]. Быў прыхаджанінам Языльскай Свята-Праабражэнскай царквы.

Жонка – Параскевія (Тарэса) Іванаўна Сеўрук, 15 гадоў, жыхарка засценка Кутнева. Шлюб 18.01.1792 г. у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Святар – Аляксандр Прорвіч[327].

275/185 **Апалінарый (Афанасій),** *1766 г. н. Па сямейным спісе дваран 1796 г., жыў у засценку Сарога[328].

Жонка – Анастасія Леановіч, *1768 г. н.

276/106 **Якаў,** нарадзіўся ў засценку Кутнева, ахрышчаны 30.04.1753 г. у Пагосцкай царкве. Хросныя бацькі – Кандрат Сеўрук і Марыя Якубаўна Макавецкая[329].

277/185 **Міхаіл,** *1776 г. н. Па спісах дваран 1796 г.[330] і ад 14.03.1816 г., жыў у засценку Сарога на зямлі княгіні Стэфаніі Радзівіл[331].

278/186 **Павел,** *1758 (1755) г. н. Па рэвізскай сказцы ад 23.08.1795 г.[332] і спісе дваран ад 14.03.1816 г., жыў у засценку Сарога на зямлі княгіні Стэфаніі Радзівіл[333]; па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1796 г. – у засценку Урэчча[334]. Быў прыхаджанінам Языльскай Праабражэнскай царквы.

Жонка – Марыя Фёдараўна Рэут, *1765 г. н. Разам з Антонам Сцяпанавічам Шубам была хроснай 22.07.1805 г. у Марыі[335], дачкі Марціна Аляксеевіча і Параскевіі Іванаўны Тарасевічаў.

279/186 (?) **Кандрат,** *1765 (1868) г. н. Па рэвізскай сказцы ад 23.08.1795 г., жыў у засценку Сарога[336]; па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1796 г. – у засценку Урэчча[337].

Жонка – Фядора (Тэадора) Фёдараўна Ермаліцкая, *1768 г. н.

280/186 (?) **Сымон,** *1746 (1751) г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1796 г., жыў у засценку Урэчча[338].

Жонка – Дамініка (Домна) Дзям'янаўна Кунцэвіч, *1750 г. н.

281/187 **Рафал,** *1774 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г.[339] і спісе дваран ад 14.03.1816 г.[340], жыў у засценку Сарога на зямлі княгіні Стэфаніі Радзівіл.

Жонкі: 1. Анастасія Гурыновіч, *1776 г. н.; 2. (?) Цыцылія, *1775 г. н., па спісе дваран ад 14.03.1816 г., жыла ў засценку Сарога на зямлі княгіні Стэфаніі Радзівіл[341].

282/187 **Іеранім (Герасім),** *1766 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыў у засценку Сарога[342]. Быў прыхаджанінам Языльскай Свята-Праабражэнскай царквы. Разам з Еўдакіяй Паўлаўнай Сеўрук быў хросным 13.06.1808 г. у Цімафея[343], сына Марціна Аляксеевіча і Параскевіі Іванаўны Тарасевічаў.

Жонка – Мар'яна Крышэвіч, *1768 г. н.

283/187 (?) **Ян,** *1756 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыў у засценку Кутнева[344]. Разам з жонкай Іаана Сеўрука Ганнай быў хросным 09.07.1794 г. у Яўфіміі[345], 25.09.1799 г. – у Іаана[346], 16.05.1802 г. – у Феадора[347], з Ефрасінняй Іванаўнай Прылуцкай 10.04.1805 г. – у Марыі[348], дзяцей Сымона Антонавіча і Ірыны Герасімаўны Сеўрукаў.

Жонка – Элеанора (Алена) Корбут, *1758 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыла ў засценку Кутнева[349]. Разам з Мікалаем Корбутам была хроснай 08.11.1792 г. у Матроны[350], дачкі Антонія і Марыі Сеўрукаў.

284/187 (?) **Антоній,** *1725 (1729) г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыў у засценку Кутнева[351]. Памёр 14.09.1799 г. ва ўзросце 70 гадоў, пахаваны святаром Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царквы Іаанам Бараноўскім[352].

Жонка – Марыя, памерла 04.01.1795 г. ва ўзросце 58 гадоў, пахавана святаром Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царквы Іаанам Бараноўскім[353].

285/187 (?) **Грыгорый,** *1716 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыў у засценку Сарога[354].

Жонка – N, памерла да 1796 г.

IX КАЛЕНА

286/188 **Грыгорый.** Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 04.09.1802 г. прызнаны ў дваранстве з унясеннем у 1-ю частку радаводнай кнігі дваран Мінскай губерні[355].

287/189 **Ян,** *1725 г. н., верагодна, нарадзіўся ў засценку Сыцянец. «Зямянін вольны, аселы, веры грэчаскай». Жыў у засценку Сыцянец Слуцкага павета на зямлі князя Дамініка Геранімавіча Радзівіла, плацячы за зямлю грашовы чынш і «исполняя по инвентарю услужение», што пацвярджае рэвізская сказка ад 29.08.1795 г.[356] Памёр 11.05.1800 г. ва ўзросце 76 гадоў, пахаваны святаром Старобінскай Мікалаеўскай царквы Гаўрыілам Бабарыкіным[357]. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 04.09.1802 г. прызнаны ў дваранстве з унясеннем у 1-ю частку радаводнай кнігі дваран Мінскай губерні[358].

Жонка – N, памерла да 1795 г.

288/190 **Міхаіл,** *1746 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыў у засценку Касынічы[359].

Жонка – Марыяна Жывалкоўская, *1746 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыла ў засценку Касынічы[360].

289/19 **Сымон,** *1756 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыў у засценку Касынічы[361].

Жонка – Кацярына Некрашэвіч, *1757 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыла ў засценку Касынічы[362].

290/191 **Васіль,** *1760 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыў у засценку Касынічы[363].

Жонка – Рэгіна Перагуд, *1776 г. н.

291/191 **Мацей,** *1776 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыў у засценку Касынічы[364].

292/191 **Якуб,** *1784 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыў у засценку Касынічы[365].

293/191 **Анастасія,** *1780 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыла ў засценку Касынічы[366].

294/192 **Іосіф,** *1780 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыў у засценку Раткаў[367]. Быў прыхаджанінам Прускай Раство-Багародзіцкай царквы. Разам з Марыяй Грыгор'еўнай Некрашэвіч быў хросным 07.11.1799 г. у Матроны[368], дачкі Сільвестра і Яўгеніі Васільеўны Тычынаў.

Жонка – Сафія, жыхарка засценка Сыцянец, удава Сімяона Сеўрука, 23 гадоў. Шлюб 14.06.1799 г. у Старобінскай Мікалаеўскай царкве. Святар – Гаўрыіл Бабарыкін[369].

295/192 **Васіль,** *1788 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыў у засценку Раткаў[370].

296/192 **Лукаш,** *1790 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыў у засценку Раткаў[371].

297/192 **Тэадор,** *1794 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыў у засценку Раткаў[372].

298/193 **Павел,** *1790 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыў у засценку Раткаў[373].

299/193 **Тарэса,** *1792 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыла ў засценку Раткаў[374].

300/196 **Сымон,** *1769 г. н. Па рэвізскай сказцы дваран Случарэцкага павета ад 23.08.1795 г., жыў у засценку Сарога[375]. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 04.09.1802 г. прызнаны ў дваранстве з унясеннем у 1-ю частку радаводнай кнігі дваран Мінскай губерні[376].

Жонка – Алена Лаўрынаўна, *1768 г. н.

301/196 **Ісідор (Сідар),** *1780 г. н. Па рэвізскай сказцы дваран Случарэцкага павета ад 23.08.1795 г., жыў у засценку Сарога[377]. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 04.09.1802 г. прызнаны ў дваранстве з унясеннем у 1-ю частку радаводнай кнігі дваран Мінскай губерні[378].

302/204 **Сымон,** *1768 г. н., жыў у засценку Кутнева, быў прыхаджанінам Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царквы. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета ад 04.08.1816 г.[379] і спісе шляхты Пагосцкага ключвойцтва 1822 г.[380], жыў у засценку Кутнева на зямлі княгіні Стэфаніі Дамінікаўны Радзівіл.

Жонка – Варвара Іванаўна (Сцяпанаўна), *1771 г. н.

303/205 **Тамаш (Фама).** Жыў у засценку Кутнева, быў прыхаджанінам Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царквы.

Жонка – Матрона (?).

304/205 **Мацей.** Жыў у засценку Кутнева, быў прыхаджанінам Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царквы. Разам з жонкай Антонія Корбута Пелагіяй Іосіфаўнай быў хросным 06.12.1805 г. у Ганны[381], дачкі Сімяона Андрэевіча і Варвары Стэфанаўны Сеўрукаў.

305/206 **Васіль,** *1777 г. н. Жыў у засценку Кутнева, быў прыхаджанінам Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царквы.

Жонка – Еўдакія Фамінічна Касабуцкая, 15 гадоў, жыхарка засценка Кутнева. Шлюб 08.11.1795 г. у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Святар – Іаан Бараноўскі[382]. Разам з Іаанам Сеўрукам была хроснай 25.06.1801 г. у Пятра[383], 19.11.1806 г. – у Стэфаніды[384], дзяцей Ільі Хрыстафоравіча і Марыі Іванаўны Сеўрукаў.

306/206 **Таццяна,** нарадзілася 12.01.1791 г. у засценку Кутнева ў сям'і Пятра і Алены Іванаўны Сеўрукаў, ахрышчана святаром Аляксандрам Прорвічам у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Кутнева Іосіф Стахіеў Сеўрук і жонка Іаана Сеўрука Алена Кандратаўна[385].

307/206 **Усціння (Юстына),** нарадзілася 11.10.1794 г. у засценку Кутнева ў сям'і Пятра і Алены Іванаўны Сеўрукаў, ахрышчана святаром Іаанам Бараноўскім у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Кутнева Аляксандр Іосіфавіч Сеўрук і жонка Пятра Корбута Анастасія[386]. Памерла 28.01.1802 г., пахавана святаром Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царквы Іаанам Бараноўскім[387].

308/206 **Сімяон,** нарадзіўся 17.04.1797 г. у засценку Кутнева ў сям'і Пятра і Алены Іванаўны Сеўрукаў, ахрышчаны святаром Іаанам Бараноўскім у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Кутнева Аляксандр Іосіфавіч Сеўрук і жонка Пятра Корбута Анастасія[388].

309/206 **Дарыя**, *1781 г. н. Жыла ў засценку Кутнева, была прыхаджанкай Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царквы. Разам з жыхаром д. Бабылі Якавам Рудзінскім была хроснай 15.01.1799 г. у Паўла[389], сына Марціна і Кацярыны Сеўрукаў.

Муж – Павел Самуілавіч Рэут, 20 гадоў[390] (гл. «Рэуты» 20/11), жыхар засценка Застарынь. Шлюб 14.06.1801 г. у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Святар – Іаан Бараноўскі.

310/206 **Марыя,** *1787 г. н. Жыла ў засценку Кутнева, была прыхаджанкай Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царквы.

Муж – Грыгорый Васільевіч Макавецкі, 16 гадоў[391], жыхар засценка Застарынь. Шлюб

25.10.1803 г. у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Святар – Іаан Бараноўскі.

311/207 **Аляксандр.** Жыў у засценку Кутнева, быў прыхаджанінам Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царквы. Разам з жонкай Матфея Корбута Марыяй быў хросным 22.12.1793 г. у Анастасіі[392], з жонкай Пятра Корбута Анастасіяй 11.10.1794 г. – у Усцінні[393], 17.04.1797 г. – у Сімяона[394], дзяцей Пятра і Алены Іванаўны Сеўрукаў.

312/207 **Ян.** Жыў у засценку Кутнева, быў прыхаджанінам Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царквы. Разам з жонкай Антонія Корбута Пелагіяй Арцёмаўнай быў хросным 12.03.1811 г. у Васіля[395], сына Васіля Пятровіча і Еўдакіі Фамінічны Сеўрукаў.

313/207 **Марцін.**

314/207 **Палагія.** Жыла ў засценку Кутнева. Разам з жыхаром засценка Смольгава Васілём Зямброўскім была хроснай 18.10.1797 г. у Лукі[396], сына Васіля Пятровіча і Еўдакіі Фамінічны Сеўрукаў; з Паўлам Загароўскім 03.01.1801 г. – у Сільвестра[397], 15.02.1803 г. – у Фацініі[398], дзяцей Сімяона Андрэевіча і Варвары Сеўрукаў.

315/207 **Ганна (Марыя),** нарадзілася 11.12.1790 г. у засценку Кутнева ў сям'і Іосіфа і Марыі Якаўлеўны Сеўрукаў, ахрышчана святаром Аляксандрам Прорвічам у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Кутнева Іосіф Антонавіч Корбут і дачка Васіля Сеўрука Дамнікія[399]. Разам з Антоніем Корбутам была хроснай 09.05.1806 г. у Міхаіла[400], сына Аляксандра Іосіфавіча і Марыі Андрэеўны Сеўрукаў.

316/207 **Яфімія,** нарадзілася 20.09.1797 г. у засценку Кутнева ў сям'і Іосіфа і Марыяны Сеўрукаў, ахрышчана святаром Іаанам Бараноўскім у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Кутнева Антоній Корбут і жонка Мікалая Сеўрука Дарыя[401].

317/207 **Трафім,** нарадзіўся 23.09.1791 г. у засценку Кутнева ў сям'і Іосіфа і Марыі Сеўрукаў, ахрышчаны святаром Аляксандрам Прорвічам у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхар засценка Кутнева Антоній Корбут і жонка жыхара засценка Панічы Фамы Корбута Дамнікея[402].

318/208 **Грыгорый.**

319/208 **Тэадор.** Жыў у засценку Кутнева.

Жонка – Марыя Іванаўна (?).

320/209 **Сымон.** Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 04.09.1802 г. прызнаны ў дваранстве з унясеннем у 1-ю частку радаводнай кнігі дваран Мінскай губерні[403].

321/209 **Стэфан.** Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 04.09.1802 г. прызнаны ў дваранстве з унясеннем у 1-ю частку радаводнай кнігі дваран Мінскай губерні[404].

322/210 **Пётр.**

323/211 **Ян.**

324/211 **Міхаіл,** нарадзіўся 09.11.1791 г. у засценку Кутнева ў сям'і Хрыстафора і Пелагіі Сеўрукаў, ахрышчаны святаром Аляксандрам Прорвічам у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Кутнева Марцін Якаўлевіч Корзан і жонка Пятра Сеўрука Алена Іванаўна[405].

325/211 **Фёдар,** нарадзіўся 03.12.1789 г. у засценку Кутнева ў сям'і Хрыстафора і другашлюбнай жонкі Пелагіі Іванаўны Сеўрукаў, ахрышчаны святаром Аляксандрам Прорвічам у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхар засценка Гарахавец Стэфан Іванавіч Яновіч і жонка жыхара засценка Кутнева Пятра Сеўрука Алена Іванаўна[406]. Памёр

09.11.1790 г., пахаваны святаром Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царквы Аляксандрам Прорвічам[407].

326/211 **Грыгорый,** нарадзіўся *1792 г. Памёр 04.04.1799 г. ва ўзросце 7 гадоў, пахаваны святаром Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царквы Іаанам Бараноўскім[408].

327/212 **Марцін.**

328/215 **Стэфаніда,** нарадзілася 19.11.1806 г. у засценку Кутнева ў сям'і Ільы Хрыстафоравіча і Марыі Іванаўны Сеўрукаў, ахрышчана святаром Іаанам Бараноўскім у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Кутнева Іаан Сеўрук і жонка Васіля Сеўрука Еўдакія[409].

329/215 **Пётр,** нарадзіўся 25.06.1801 г. у сям'і Ільы і Марыі Сеўрукаў, ахрышчаны святаром Іаанам Бараноўскім у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Кутнева Іаан Сеўрук і жонка Васіля Сеўрука Еўдакія[410].

330/217 **Ануфрый,** нарадзіўся 12.06.1809 г. у засценку Кутнева ў сям'і Фёдара Крыштафавіча і Варвары Аляксандраўны Сеўрукаў, ахрышчаны 13.06.1809 г. святаром Іаанам Бараноўскім у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Кутнева Якаў Загароўскі і жонка Фёдара Касабуцкага Агафія Трафімаўна[411].

331/232 **Цімафей (Мацей, Матвей),** нарадзіўся 22.02.1797 г. у засценку Кутнева ў сям'і Фамы Іванавіча і Марыі Іванаўны Сеўрукаў, ахрышчаны святаром Іаанам Бараноўскім у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Кутнева Іосіф Сеўрук і жонка Мацвея Корбута Марыя[412]. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета ад 04.08.1816 г. і спісе шляхты Пагосцкага ключвойцтва 1822 г.[413], жыў у засценку Кутнева[414].

332/232 **Тэафіля,** *1803 г. н. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета ад 04.08.1816 г., жыла ў засценку Кутнева[415].

333/232 **Агафія,** нарадзілася 10.02.1807 г. у засценку Кутнева ў сям'і Фамы Іванавіча і Марыі Іванаўны Сеўрукаў, ахрышчана святаром Іаанам Бараноўскім у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Кутнева Грыгорый Корбут і жонка Мацвея Корбута Марыя Антонаўна[416].

334/232 **Фёкла,** нарадзілася 20.09.1802 г. у засценку Кутнева ў сям'і Фамы Іванавіча і Марыі Іванаўны Сеўрукаў, ахрышчана святаром Іаанам Бараноўскім у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Кутнева Грыгорый Корбут і жонка Івана Корбута Сафія[417].

335/233 **Якуб,** нарадзіўся 08.10.1794 г. у засценку Кутнева ў сям'і Матфея Іванавіча і Марыі Грыгор'еўны Сеўрукаў, ахрышчаны святаром Іаанам Бараноўскім у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Кутнева Васіль Корбут і жонка Матфея Корбута Марыяна[418]. Пазначаны ў спісе дваран ад 20.03.1816 г.[419]

336/233 **Лука,** нарадзіўся 07.02.1803 г. у засценку Кутнева ў сям'і Матфея Іванавіча і Марыі Грыгор'еўны Сеўрукаў, ахрышчаны святаром Іаанам Бараноўскім у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Кутнева Васіль Корбут і жонка Матфея Корбута Марыяна[420].

337/233 **Ігнацій,** нарадзіўся 11.05.1806 г. у засценку Кутнева ў сям'і Матфея Іванавіча і Марыі Грыгор'еўны Сеўрукаў, ахрышчаны святаром Іаанам Бараноўскім у Пагосцкай Іаана-

Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Кутнева Васіль Корбут і жонка Матфея Корбута Марыя Антонаўна[421].

338/233 **Таццяна,** нарадзілася 16.01.1800 г. у засценку Кутнева ў сям'і Матфея Іванавіча і Марыі Грыгор'еўны Сеўрукаў, ахрышчана святаром Іаанам Бараноўскім у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Кутнева Васіль Корбут і жонка Матфея Корбута Марыяна[422]. Памерла 02.04.1802 г., пахавана святаром Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царквы Іаанам Бараноўскім[423].

339/233 **Мацей,** нарадзіўся 06.07.1797 г. у засценку Кутнева ў сям'і Матфея і Марыі Сеўрукаў, ахрышчаны святаром Іаанам Бараноўскім у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Кутнева Васіль Корбут і жонка Матфея Корбута Марыяна[424]. Пазначаны ў спісе дваран ад 20.03.1816 г.[425] Разам з жонкай Івана Іванавіча Гурыновіча Агаф'яй Ільінічнай быў хросным 12.02.1835 г. у Парфірыя[426], 13.02.1838 г. – у Памфіла[427], 18.08.1840 г. – у Феадоры[428], дзяцей Сімяона Фёдаравіча і Еўдакіі Грыгор'еўны Гурыновічаў.

340/233 **Васіль,** *1815 г. н. Пазначаны ў спісе дваран ад 20.03.1816 г.[429]

341/234 **Ян,** *1815 г. н. Пазначаны ў спісе дваран ад 20.03.1816 г.[430]

342/234 **Пракседа,** *1804 г. н. Пазначана ў спісе дваран ад 20.03.1816 г.[431]

343/235 **Аляксандр,** *1788 (1781) г. н. Па спісах дваран 1796 г.[432], ад 20.03.1816 г.[433], рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета ад 04.08.1816 г.[434] і спісе шляхты Пагосцкага ключвойцтва 1822 г.[435], жыў у засценку Кутнева.

Жонкі: 1. Кацярына Пятроўна Забродская, *1791 г. н. Разам з Матфеем Корбутам была хроснай 07.01.1815 г. у Іаана[436], сына Сімяона Андрэевіча і Варвары Сеўрукаў. Памерла (?) паміж 1815 і 1817 гг.; 2. (?) Гіятфіна, ад яе дачка Ефрасіння.

344/235 **Ян,** *1790 (1783) г. н. Па спісах дваран 1796 г.[437], ад 20.03.1816 г., рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета ад 04.08.1816 г.[438] і спісе шляхты Пагосцкага ключвойцтва 1822 г.[439], жыў у засценку Кутнева[440].

Жонка – Марыяна Грыгор'еўна Масакоўская.

345/235 **Марцін,** *1794 г. Па спісах дваран 1796 г.[441], ад 20.03.1816 г.[442], жыў у засценку Кутнева.

346/235 **Пётр,** нарадзіўся 25.11.1792 г. у засценку Кутнева ў сям'і Іосіфа і Агафіі Сеўрукаў, ахрышчаны святаром Аляксандрам Прорвічам у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Кутнева Іаан Сеўрук і жонка Фамы Сеўрука Наталія[443]. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета ад 04.08.1816 г.[444] і спісе шляхты Пагосцкага ключвойцтва 1822 г.[445], жыў у засценку Кутнева на зямлі княгіні Стэфаніі Дамінікаўны Радзівіл. Разам з Іванам Іванавічам Вечарам быў сведкам з боку маладой пры шлюбе 23.05.1838 г. Івана Сімяонавіча Тарасевіча і Ефрасінні Аляксандраўны Сеўрук[446].

347/235 **Ганна,** *1780 г. н. Па спісе дваран 1796 г.[447], жыла ў засценку Кутнева.

348/235 **Апалонія,** *1787 г. н. Па спісе дваран 1796 г.[448], жыла ў засценку Кутнева.

349/235 **Марыяна,** *1789 г. н. Па спісе дваран 1796 г.[449], жыла ў засценку Кутнева.

Муж – Міхаіл Аляксандравіч Некрашэвіч, 21 года, жыхар засценка Язовінь, прыхаджанін Старобінскай Мікалаеўскай царквы. Шлюб 25.05.1811 г. у Пагосцкай Іаана-

Прадцечанскай царкве. Святар Іаан Бараноўскі. Сведкі – Венядзікт Некрашэвіч і Грыгорый Корбут[450].

350/236 **Сімяон,** нарадзіўся 17.04.1806 г. у засценку Залессе ў сям'і Сімяона Іванавіча і Агафіі Іванаўны Сеўрукаў, ахрышчаны святаром Філіпам Салаўевічам у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Залессе Фёдар Рэут і жонка Міхаіла Сеўрука Стэфаніда Лявонцьеўна[451]. Пазначаны ў спісе дваран ад 20.03.1816 г.[452]

351/236 **Настасся,** *1802 г. н. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета 1816 г., жыла ў засценку Залессе на зямлі княжны Стэфаніі Дамінікаўны Радзівіл[453]. Разам са Сцяпанам Іванавічам Тарынскім была хроснай 12.04.1813 г. у Васіля[454], сына Фёдара Іванавіча і Марыі Іванаўны Гурыновічаў.

352/236 **Матрона,** нарадзілася 08.11.1803 г. у засценку Залессе ў сям'і Сімяона Іванавіча і Агафіі Іванаўны Сеўрукаў, ахрышчана святаром Прорвічам у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Залессе Феадор Рэут і жонка Міхаіла Сеўрука Стэфаніда[455].

353/236 **Агафія,** нарадзілася 22.07.1801 г. у засценку Залессе ў сям'і Сімяона Іванавіча і Агафіі Іванаўны Сеўрукаў, ахрышчана святаром Прорвічам у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Залессе Данііл Ільіч Сеўрук і жонка Марціна Сеўрука Ефрасіння[456].

354/237 **Венядзікт**, нарадзіўся 19.03.1806 г. у засценку Залессе ў сям'і Данііла Ільіча і Ганны Фёдараўны Сеўрукаў, ахрышчаны святаром Філіпам Салаўевічам у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Залессе Грыгорый Бранавіцкі і дачка Васіля Бранавіцкага Марыя, дзяўчына[457]. Па сямейным спісе дваран ад 20.03.1816 г., жыў у засценку Залессе[458], пасля разам з бацькамі пераехаў у Ігуменскі павет.

355/237 **Стэфан,** *1801 г. н. Па спісе дваран ад 20.03.1816 г., жыў у засценку Залессе[459], пасля разам з бацькамі пераехаў у Ігуменскі павет.

356/237 **Сымон.**

357/237 **Дзям'ян.**

358/239 **Якуб,** *1804 г. н. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета 1816 г.[460] і спісе шляхты Пагосцкага ключвойцтва 1822 г.[461], жыў у засценку Залессе на зямлі княжны Стэфаніі Дамінікаўны Радзівіл, пасля разам з бацькамі пераехаў у Ігуменскі павет. Вучыўся ў кальвінісцкай народнай школе.

359/239 **Васіль,** нарадзіўся 22.03.1817 г. у засценку Залессе ў сям'і Міхаіла Ільіча і Стэфаніды Лявонаўны (Іосіфаўны) Сеўрукаў, ахрышчаны святаром Матфеем Шпілеўскім у Пагосцкай Срэценскай царкве. Хросныя бацькі – памешчык двара Каты Каятан Акунь, каталіцкага веравызнання, і жонка святара Матфея Шпілеўскага Дарыя Стэфанаўна, праваслаўнага веравызнання[462]. Вучыўся ў кальвінісцкай народнай школе. Пасля заканчэння Мінскай духоўнай семінарыі служыў з 1841 г. пісьмаводам у прыстава 1-га стану Мінскага павета. Уведзены ў калежскія рэгістратары 26.06.1843 г. Перамешчаны 01.07.1847 г. у Віленскую гарадскую паліцыю. Загадам па ваенным ведамстве ад 03.08.1854 г., № 34, прызначаны ў правіянцкі штат арміі камісіянерам, у 1854 г. – наглядчыкам барысаўскага правіянцкага магазіна. Загадам па ваенным ведамстве ад 13.02.1856 г., № 58, уведзены за выслугу гадоў у калежскія сакратары пачынаючы з 08.03.1854 г. Пасля скасавання барысаўскага правіянцкага магазіна залічаны 23.01.1858 г.

камісіянерам пры Віленскім камісіянерстве. Пасля пераўтварэння інтэнданцтва 1-й арміі загадам № 56 аб цывільных чыноўніках ваеннага ведамства ад 10.08.1858 г. звольнены са службы з выплатай на працягу года поўнага забеспячэння. На падставе прадпісання Ляснога дэпартамента ад 11.05.1859 г. і згодна з прашэннем Сеўрука прызначаны на пасаду падляснічага пры Мінскай палаце дзяржаўных маёмасцей. Служачы па лясным ведамстве, загадваў лясніцтвамі ў Мазырскім і [ ]інскім паветах, а па прашэнні, пададзеным 14.06.1872 г. у Мінскае губернскае ўпраўленне дзяржаўных маёмасцей, звольнены з ведамства. Па прашэнні старшыні з'езда міравых суддзяў Рэчыцка-Мазырскай міравой акругі Васіль Міхайлавіч Сеўрук прызначаны 12.07.1872 г. судовым прыставам, звольнены 06.05.1876 г. па прашэнні. На падставе прашэння вызначэннем Мінскай аб'яднанай палаты крымінальнага і грамадзянскага суда ад 15.12.1876 г. прызначаны архіварыусам палаты. Пасля скасавання Мінскай аб'яднанай палаты крымінальнага і грамадзянскага суда і стварэння Мінскага акруговага суда вызначэннем старшыні суда ад 30.11.1883 г. прызначаны архіварыусам суда, 11.09.1886 г. звольнены ў адстаўку. Указам Урадавага сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 17.12.1886 г. за выслугу гадоў узведзены ў тытулярныя саветнікі пачынаючы з 15.05.1883 г. [463]

Напісаў брашуру «Выводъ о происхождении прозвищъ Севрукъ и Курчевичъ-Севрукъ», выдадзеную ў Мінску ў 1896 г., цяпер яна захоўваецца ў Расійскай нацыянальнай бібліятэцы, г. Санкт-Пецярбург.

На радаводзе Курчэвічаў Сеўрукаў, пададзеным у Мінскі дэпутацкі сход 02.03.1889 г., Васіль Міхайлавіч зрабіў запіс: «В этой родословной 230 душ, предполагаю, что половина из них в живых: старых и младых, количество порядочное; но к великому моему неудовольствию очень мало ценивших свое дворянское звание, служили в государственной русской службе: военной, гражданской, всего только четырнадцать лиц, а прочие к стыду (если таковой знают) их не грамотны, темны, дики, не учатся, не служат государству ни в каких учреждениях, но кроются в темных сараях от света науки, как кроты под землею»[464]. У сваім даследаванні з любоўю і глыбокай павагай адгукаўся пра адукаваных прадстаўнікоў роду і не ўхваляў нежаданне вучыцца, ляноту, пасіўнасць, у цэлым даўшы наступную характарыстыку роду: «В общественной жизни они, Севруки, спокойны, мирны, добронравны, честны, но были бы лучше, если бы понимали грамоту и вели приличную жизнь, соответствующую дворянину, чистую, а не неряшливую»[465].

У 1893 г. жыў у г. Слуцку ў доме Аколавай, зямлі не меў. Халасты.

360/239 **Марфта (Марцэля),** нарадзілася 08.06.1809 г. у засценку Кутнева ў сям'і Міхаіла Ільіча і Стэфаніды Лявонаўны Сеўрукаў, ахрышчана 09.06.1809 г. святаром Іаанам Бараноўскім у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – каморнік князя Радзівіла Іосіф Чарыноўскі і дачка святара Іаана Бараноўскага Ганна, дзяўчына[466]. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета 1816 г., жыла ў засценку Залессе на зямлі княжны Стэфаніі Дамінікаўны Радзівіл[467].

361/239 **Агаф'я,** нарадзілася 10.02.1805 г. у засценку Кутнева ў сям'і Міхаіла Ільіча і Стэфаніды Лявонаўны Сеўрукаў, ахрышчана святаром Іаанам Бараноўскім у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхар двара Горкі Антоній Малянчыцкі, каталіцкага веравызнання,

і дачка пагосцкага святара Іаана Бараноўскага Ганна, дзяўчына[468].

362/239 **Агафія,** нарадзілася 05.02.1815 г. у засценку Залессе ў сям'і Міхаіла Ільіча і Стэфаніды Лявонаўны Сеўрукаў, ахрышчана святаром Іаанам Бараноўскім у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Залессе Марцін Лаўрэнцьевіч Ранчынскі і дачка святара Матфея Шпілеўскага Ганна[469].

363/239 **Дарыя,** нарадзілася 19.03.1807 г. у засценку Кутнева ў сям'і Міхаіла Ільіча і Стэфаніды Лявонаўны Сеўрукаў, ахрышчана святаром Іаанам Бараноўскім у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхар засценка Кутнева Іван Сеўрук, праваслаўнага веравызнання, і жонка маркаўскага пісара Вінцэнція Зяневіча Агафія Фёдараўна, каталіцкага веравызнання[470].

364/240 **Мацей,** *1793 г. н. Па спісе дваран ад 20.03.1816 г., жыў у засценку Кулакі[471].

365/240 **Ян,** нарадзіўся 24.02.1797 г. у засценку Залессе ў сям'і Грыгорыя Ільіча і Сцепаніды Сеўрукаў, ахрышчаны святаром Аляксандрам Прорвічам у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Залессе Іосіф Некрашэвіч і жонка Андрэя Тарынскага Ганна[472]. Па спісе дваран ад 20.03.1816 г., жыў у засценку Кулакі[473].

366/240 **Гаўрыіл (Габрыэль),** нарадзіўся 21.03.1805 г. у засценку Галіца ў сям'і Грыгорыя Ільіча і Стэфаніды Аляксандраўны Сеўрукаў, ахрышчаны святаром Аляксандрам Прорвічам у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхар засценка Галіца Марцін Тарынскі і дачка жыхара засценка Трасцянец Пятра Івашкевіча Марыя, дзяўчына[474]. Па спісе дваран ад 20.03.1816 г., жыў у засценку Кулакі[475].

367/240 **Іосіф,** *1806 г. н. Па спісе дваран ад 20.03.1816 г., жыў у засценку Кулакі[476].

368/240 **Андрэй,** *1810 г. н. Па спісе дваран ад 20.03.1816 г., жыў у засценку Кулакі[477].

369/240 **Мар'я,** *1797 г. н. Па спісе дваран ад 20.03.1816 г., жыла ў засценку Кулакі[478].

370/241 **Міхаіл,** *1801 г. н. Па спісе дваран ад 20.03.1816 г.[479] і спісе шляхты Пагосцкага ключвойцтва 1822 г.[480], жыў у засценку Залессе.

Жонка – Пелагія Васільеўна.

371/241 **Параскевія,** *1790 г. н. Жыла ў засценку Залессе, была прыхаджанкай Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царквы. Разам з Матфеем Некрашэвічам была хроснай 20.02.1809 г. у Агафіі[481], з Янам Сеўрукам 22.12.1811 г. – у Ваніфацыя[482], дзяцей Пятра Стэфанавіча і Марыі Фёдараўны Сеўрукаў.

Муж – Грыгорый Філіпавіч Гурыновіч, 25 гадоў, жыхар засценка Кутнева. Шлюб 27.07.1813 г. у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Святар – Матфей Шпілеўскі. Сведкі – жыхар засценка Кутнева Пётр Гурыновіч і жыхар засценка Залессе Фёдар Гурыновіч[483].

372/242 **Мацей,** *1800 г. н. Быў прыхаджанінам Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царквы. Па спісе дваран ад 20.03.1816 г.[484] і спісе шляхты Пагосцкага ключвойцтва 1822 г.[485], жыў у засценку Залессе. Вучыўся ў кальвінісцкай народнай школе. У 1816 г. вучыўся ў Слуцкім павятовым вучылішчы. Служыў землямерам пры Слуцкім межавым апеляцыйным судзе, адкуль падаў [у Мінскі дваранскі дэпутацкі сход] пасведчанне ад 09.07.1825 г. аб прынясенні прысягі на вернасць службы. Працягнуў справу, пачатую Іосіфам-Янам Сеўрукам, па зборы неабходных дакументаў для пацвярджэння дваранскага роду Курчэвічаў Сеўрукаў. Аднак не паспеў усё давесці да канца, памёр (?).01.1838 г. на шляху з

Мінска ў Слуцк у сяле Старыца «от стрела. Могила его осталась родственникам не ведома. Характера он был нетерпеливого, раздражительного, мнительного»[486].

373/242 **Ян (Іван),** нарадзіўся 27.03.1799 г. у засценку Залессе ў сям'і Пятра Стэфанавіча і Марыі Сеўрукаў, ахрышчаны святаром Іаанам Бараноўскім у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Залессе Грыгорый Бранавіцкі і жонка Андрэя Тарынскага Ганна[487]. Па спісе дваран ад 20.03.1816 г., жыў у засценку Залессе[488]. У 1816 г. вучыўся ў Слуцкім павятовым вучылішчы. Разам з Аленай Аляксандраўнай Ранчынскай быў хросным 06.10.1817 г. у Пелагіі[489], з Дар'яй Сцяпанаўнай Шпілеўскай 02.08.1820 г. – у Сцяпана[490], 23.07.1823 г. – у Феафілакта[491], дзяцей Аляксандра Дзям'янавіча і Марыі Грыгор'еўны Рэутаў.

374/242 **Ваніфацый (Баніфацый),** нарадзіўся 22.12.1811 г. у засценку Залессе ў сям'і Пятра Стэфанавіча і Ірыны (Марыны) Фёдараўны Сеўрукаў, ахрышчаны святаром Іаанам Бараноўскім у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Залессе Ян Сеўрук і дачка Андрэя Сеўрука Параскевія, дзяўчына[492]. Па спісе дваран ад 20.03.1816 г.[493] і спісе шляхты Пагосцкага ключвойтства 1822 г.[494], жыў у засценку Залессе. Вучыўся ў кальвініскай народнай школе.

375/242 **Алена (Гелена),** *1801 г. н. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета 1816 г., жыла ў засценку Залессе на зямлі княжны Стэфаніі Дамінікаўны Радзівіл[495].

376/242 **Агата,** нарадзілася 20.02.1809 г. у засценку Залессе ў сям'і Пятра Стэфанавіча і Марыі Фёдараўны Сеўрукаў, ахрышчана святаром Іаанам Бараноўскім у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Залессе Матфей Некрашэвіч і дачка Андрэя Сеўрука Параскевія[496]. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета 1816 г., жыла ў засценку Залессе на зямлі княжны Стэфаніі Дамінікаўны Радзівіл[497].

377/242 **Іуліянія,** нарадзілася 16.12.1801 г. у засценку Залессе ў сям'і Пятра Сцяпанавіча і Марыі Сеўрукаў, ахрышчана святаром Стэфанам Прорвічам у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – салдат Нізоўскага мушкецёрскага палка Кірэй Цімафееў [Еквепік] і жонка жыхара засценка Залессе Міхаіла Сеўрука Стэфаніда[498].

378/242 **Стэфаніда,** нарадзілася ў *1803 г. у засценку Залессе. Памерла 10.02.1806 г. ва ўзросце 3 гадоў, пахавана святаром Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царквы Філіпам Салаўевічам[499].

379/242 **Данііл,** нарадзіўся ў *1794 г. у засценку Залессе, памёр 09.09.1799 г. ва ўзросце 5 гадоў, пахаваны святаром Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царквы Іаанам Бараноўскім[500].

380/243 **Павел,** арандаваў маёнтак Галіца. Працягнуў справу, пачатую Іосіфам-Янам Сямёнавічам-Мікалаевічам і Мацвеем Пятровічам Сеўрукамі па зборы неабходных дакументаў для пацвярджэння дваранскага роду Курчэвічаў Сеўрукаў. «Характера терпеливого, выработанного и рассудительного и кончил дело»[501]. Герольдыя зацвердзіла род Курчэвічаў Сеўрукаў у дваранскім званні.

381/243 (?) **Марыя,** *1791 г. н. Жыла ў засценку Залессе. Памерла 19.05.1799 г. ва ўзросце 8 гадоў, пахавана святаром Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царквы Іаанам Бараноўскім[502].

382/244 **Ян,** *1811 г. н. Пазначаны ў спісе дваран ад 20.03.1816 г.[503]

383/245 **Пётр,** *1811 г. н. Пазначаны ў спісе дваран ад 20.03.1816 г.[504]

384/246 **Ян,** нарадзіўся 20.04.1802 г. у засценку Кутнева ў сям'і Фёдара і Марыі Сеўрукаў, ахрышчаны святаром Іаанам Бараноўскім у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – Якаў Загароўскі і Ірына Грыгор'еўна Сеўрук, дзяўчына[505]. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета ад 04.08.1816 г., жыў у засценку Кутнева[506]. Разам з Іванам Івашкевічам быў сведкам пры шлюбе 16.01.1827 г. Андрэя Іосіфавіча Івашкевіча і Марыі Фёдараўны Сеўрук[507]. Разам з жонкай Івана Івашкевіча Параскевіяй быў хросным 28.04.1829 г. у Сімяона[508], сына Андрэя Іванавіча і Феадоры Феафілатаўны Бараноўскіх.

Жонка – Дарыя Логвінаўна, разам з Фамой Бараноўскім была хроснай 20.06.1828 г. у Лявонція[509], сына Андрэя Іосіфавіча і Марыі Фёдараўны Івашкевічаў.

385/246 **Мар'яна (Марыя),** нарадзілася 10.04.1805 г. у засценку Кутнева ў сям'і Фёдара Самуілавіча і Марыі Іванаўны Сеўрукаў. Ахрышчана святаром Іаанам Бараноўскім у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Кутнева Якаў Загароўскі і жонка Міхаіла Цішкевіча Ксенія Фёдараўна[510]. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета ад 04.08.1816 г., жыла ў засценку Кутнева[511].

Муж – Андрэй Іосіфавіч Івашкевіч, 26 гадоў, удавец, жыхар засценка Кутнева. Шлюб 16.01.1827 г. у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Святар – Антоній Бараноўскі. Сведкі – жыхары засценка Кутнева Іван Івашкевіч і Іван Сеўрук[512].

386/247 **Міхаіл,** *1766 (1779) г. н. Па сямейным спісе шляхты 1796 г.[513], рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета ад 04.08.1816 г.[514] і спісе шляхты Пагосцкага ключвойцтва 1822 г.[515], жыў у засценку Кутнева на зямлі княгіні Стэфаніі Дамінікаўны Радзівіл.

Жонка – Еўдакія Грыгор'еўна Цішкевіч, 18 гадоў, жыхарка засценка Кутнева. Шлюб 14.02.1799 г. у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Святар – Іаан Бараноўскі[516].

387/247 **Агата,** *1778 (1780) г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыла ў засценку Кутнева[517].

Муж – N, 18 гадоў, жыхар засценка Сарога, прыхаджанін Языльскай Праабражэнскай царквы. Шлюб 12.02.1799 г. у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Святар – Іаан Бараноўскі [518].

388/247 **Рэгіна (Ірына),** *1780 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыла ў засценку Кутнева[519]. Разам з Якавам Загароўскім была хроснай 20.04.1802 г. у Іаана[520], сына Фёдара і Марыі Сеўрукаў.

389/247 **Віктар,** нарадзіўся 08.11.1786 г. у засценку Кутнева ў сям'і Грыгорыя і Ганны Марцінаўны Сеўрукаў, ахрышчаны святаром Іаанам Бараноўскім у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Кутнева Сямён Якаўлевіч Макавецкі і жонка Івана Сеўрука Алена Кандрацьеўна[521].

390/248 **Павел,** *1811 г. н. Пазначаны ў спісе дваран ад 20.03.1816 г.[522]

391/249 **Мацвей-Іван,** нарадзіўся 24.02.1766 г. у засценку Шастакі ў сям'і Іосіфа і Марыяны Сеўрукаў, ахрышчаны ксяндзом Іванам Ляпкоўскім у Капыльскім касцёле. Хросныя бацькі – Іван Васілеўскі і Мар'яна Сеўрукава[523].

Жонка – Іаана Пяткевіч.

392/249 **Ігнацій,** нарадзіўся 28.07.1773 г. у засценку Шастакі ў сям'і дваран Іосіфа і Марыяны Сеўрукаў, ахрышчаны 01.08.1773 г. ксяндзом Кліменціем Лапам у Капыльскім касцёле. Хросныя бацькі – Іосіф Сеўрук і Мар'яна Барташэвіч[524].

393/249 **Мікалай.**

394/249 **Пётр.**

395/250 **Антон,** нарадзіўся 25.12.1776 г., ахрышчаны ксяндзом Іосіфам Мялешкам у Капыльскім касцёле. Хросныя бацькі – Антоній Іодка і Варвара Цвіркаўна[525].

396/250 **Міхаіл.**

397/252 **Міхаіл,** нарадзіўся 01.06.1789 г.

398/252 **Фларыян.**

399/253 **Іван.**

400/253 **Міхаіл.**

401/256 **Іосіф-Ян,** нарадзіўся 01.01.1793 г., ахрышчаны 09.01.1793 г. па евангелічна-рэфарматарскім абрадзе ў Клеўленскім касцёле ў Самагаціі, што пацвярджаў выпіс ад 12.08.1819 г. за подпісам ксяндза Адама Мачульскага суперінтэнданта Жамойцкага дыстрыкта.

28.08.1813 г. скончыў Віленскі ўніверсітэт са званнем кандыдата філасофіі. У 1813 г. паступіў на службу ў Слуцкае павятовае дваранскае вучылішча выкладчыкам арыфметыкі і геаграфіі ў 1 і 2-м класах. У сакавіку 1823 г. узведзены ў чын калежскага сакратара, працягнуў службу ў вучылішчы. У 1824 г. сабраў дакументы па дваранскім родзе Курчэвічаў Сеўрукаў з Сотвы (у радаводзе пазначана 125 чалавек) і падаў для прызнання ў Мінскі дваранскі дэпутацкі сход. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 07.02.1824 г. род Курчэвічаў Сеўрукаў з Сотвы прызнаны ў дваранстве. Памёр у 1836 г. халастым. Пахаваны на кальвінісцка-лютэранскіх могілках. На магіле пастаўлены помнік – вялікі камень з надпісам на польскай мове: «Святой памяці Іосіфу Сеўруку, прафесару Слуцкай гімназіі, мужу Праўды і Дабрачыннасці 1836 года».

402/256 **Васіль.**

403/257 **Бартламей,** нарадзіўся 08.08.1778 г.

404/257 **Антоній,** нарадзіўся 10.06.1767 г.

405/259 **Еўдакія,** *1800 г. н. Жыла ў засценку Сарога, была прыхаджанкай Языльскай Праабражэнскай царквы.

Муж – Пётр Сямёнавіч Тарасевіч, 27 гадоў, жыхар засценка Мардвілавічы, прыхаджанін Тальскай Троіцкай царквы. Шлюб 11.05.1824 г. у Языльскай Праабражэнскай царкве. Святар – Якаў Пігулеўскі. Сведкі – жыхар засценка Мардвілавічы Мікалай Корбут і жыхар засценка Сарога Фёдар Якаўлевіч Сеўрук[526].

406/260 **Іван.**

407/262 **Ганна,** *1784 г. н. Па рэвізскай сказцы ад 29.08.1795 г.[527] і сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г.[528], жыла ў засценку Сыцянец. Разам з Якавам Васільевічам Некрашэвічам была хроснай 05.12.1798 г. у Варвары[529], дачкі Грыгорыя і Агафіі Васільеўны Сеўрукаў.

Муж – Грыгорый Бадзякоўскі, 20 гадоў, жыхар засценка Раткаў, прыхаджанін Прускай Раство-Багародзіцкай царквы. Шлюб 02.06.1799 г. у Старобінскай Мікалаеўскай царкве. Святар – Гаўрыіл Бабарыкін[530].

408/262 **Тамаш (Фама),** *1786 (1782) г. н. Па рэвізскай сказцы ад 29.08.1795 г.[531] і сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г.[532], жыў у засценку Сыцянец. Быў прыхаджанінам Старобінскай Мікалаеўскай царквы. Разам з Марыяй Некрашэвіч быў хросным 25.03.1802 г. у Матроны[533], з Яфіміяй Уладзіслаўаўнай Сеўрук 14.03.1806 г. – у Венядзікта, дзяцей Іаана і Таццяны Лук'янаўны Некрашэвічаў.

Жонкі: 1. Еўдакія Іванаўна Кулакоўская, 16 гадоў, жыхарка засценка Кулакі. Шлюб 07.05.1801 г. у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Святар – Аляксандр Прорвіч[534]; 2. Параскевія Аляксандраўна. Разам з Грыгорыем Сеўрукам была хроснай 14.06.1810 г. у Ануфрыя[535], сына Грыгорыя Уладзіслававіча і Еўдакіі Данілаўны Некрашэвічаў.

409/262 **Дзімітрый,** нарадзіўся 25.10.1797 г. у сям'і Сімяона Іосіфавіча і Сафіі Андрэеўны

Сеўрукаў, ахрышчаны святаром Гаўрыілам Бабарыкіным у Старобінскай Мікалаеўскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Сыцянец Пётр Данілавіч Пількевіч і Феадора Грыгор'еўна[536].

410/262 **Настасся,** *1785 г. н. Жыла ў засценку Сыцянец. Памерла 02.07.1789 г. ва ўзросце 4 гадоў, пахавана святаром Старобінскай Мікалаеўскай царквы Гаўрыілам Бабарыкіным[537].

411/263 **Ян (Іван),** *1796 (1813) г. н. Па спісе дваран ад 20.03.1816 г.[538] і рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета ад 04.08.1816 г.[539], жыў у засценку Сыцянец на зямлі княжны Стэфаніі Дамінікаўны Радзівіл. Быў прыхаджанінам Старобінскай Мікалаеўскай царквы. Разам з Фёдарам Грыгор'евічам Матусевічам быў сведкам з боку маладой пры шлюбе 09.05.1838 г. Івана Фёдаравіча Чарнышэвіча і Ганны Пятроўны Пількевіч[540].

Жонка – Ефрасіння Пятроўна.

412/263 **Марыя,** нарадзілася 21.11.1797 г. у засценку Сыцянец у сям'і Грыгорыя і Яўфіміі Уладзіславаўны Сеўрукаў, ахрышчана святаром Гаўрыілам Бабарыкіным у Старобінскай Мікалаеўскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Сыцянец Сільвестр Мікалаевіч Тычына і дачка Данііла Пількевіча Марыя, дзяўчына[541]. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета ад 04.08.1816 г.[542], жыла ў засценку Сыцянец на зямлі княжны Стэфаніі Дамінікаўны Радзівіл.

413/263 **Аўдоцця (Еўдакія),** нарадзілася 06.03.1802 г. у засценку Сыцянец у сям'і Грыгорыя і Яўфіміі Уладзіславаўны Сеўрукаў, ахрышчана святаром Гаўрыілам Бабарыкіным у Старобінскай Мікалаеўскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Сыцянец Ігнацій Некрашэвіч і жонка Грыгорыя Некрашэвіча Еўдакія Данілаўна[543]. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета ад 04.08.1816 г.[544], жыла ў засценку Сыцянец на зямлі княжны Стэфаніі Дамінікаўны Радзівіл. Разам з Іаанам Некрашэвічам была хроснай 18.07.1821 г. у Іаана[545], сына Стэфана Іванавіча і Ганны Андрэеўны Некрашэвічаў.

414/263 **Павел,** *1794 г. н. Па рэвізскай сказцы ад 29.08.1795 г.[546] і сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г.[547], жыў у засценку Сыцянец.

415/267 **Марцін,** *1794 г. н. Па спісе дваран ад 20.03.1816 г., жыў у засценку Сыцянец[548]. Быў прыхаджанінам Старобінскай Мікалаеўскай царквы. Разам з Майсеем Грыгор'евічам Некрашэвічам быў сведкам з боку маладога пры шлюбе 30.06.1839 г. Грыгорыя Нікіфаравіча Некрашэвіча і Сінкліцыі Міхайлаўны Ермалінскай[549].

Жонка – Ірына Паўлаўна.

416/267 **Ян,** *1813 г. н. Па спісе дваран ад 20.03.1816 г., жыў у засценку Сыцянец[550]. Быў прыхаджанінам Старобінскай Мікалаеўскай царквы.

Жонка – Агафія Пятроўна.

417/267 **Раіна.**

418/267 **Настасся.**

419/268 **Лявонцій.**

420/269 **Ян.**

421/269 **Васіль.**

422/269 **Мікалай.**

423/269 **Міхаіл.**

424/269 **Іўсцін.**

425/270 **Якаў.**

426/270 **Ігнацій.**

427/270 **Ісідор.**

428/270 **Сцяпан.**

429/270 **Васіль.**

430/271 **Якаў.**

431/271 **Мікалай.**

432/271 **Даніла.**

433/274 **Тэадор,** *1802 г. н. Па спісе дваран ад 14.03.1816 г., жыў у засценку Сарога на зямлі княгіні Стэфаніі Радзівіл[551].

434/275 **Ян,** *1792 г. н. Па сямейным спісе дваран 1796 г., жыў у засценку Сарога[552].

435/277 **Аляксандр,** *1801 г. н. Па спісе дваран ад 14.03.1816 г., жыў у засценку Сарога на зямлі княгіні Стэфаніі Радзівіл[553].

436/278 **Грыгорый,** *1795 (1780) г. н. Па рэвізскай сказцы ад 23.08.1795 г.[554] і спісе дваран ад 14.03.1816 г., жыў у засценку Сарога на зямлі княгіні Стэфаніі Радзівіл[555]; па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1796 г. – у засценку Урэчча[556]. Быў прыхаджанінам Языльскай Праабражэнскай царквы.

Жонка – Сафія Грыгор'еўна. Разам з Іванам Грыгор'евічам Браткоўскім была хроснай 14.10.1828 г. у Праскоўі[557], дачкі Фамы Лук'янавіча і Еўдакіі Сцяпанаўны Гурыновічаў.

437/278 **Еўдакія (Ядвіга),** *1788 (1792) г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1796 г., жыла ў засценку Урэчча[558]. Жыла ў засценку Сарога, была прыхаджанкай Яроміцкай Раство-Багародзіцкай царквы. Разам з Фёдарам Грыгор'евічам Браткоўскім была хроснай 06.07.1810 г. у Афанасія[559], з Герасімам Сіліным Сеўрукам 13.06.1808 г. – у Цімафея[560], сыноў Марціна Аляксеевіча і Параскевіі Іванаўны Тарасевічаў.

438/279 **Іван,** *1790 г. н. Па рэвізскай сказцы ад 23.08.1795 г., жыў у засценку Сарога[561].

439/279 **Антоній,** *1794 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1796 г., жыў у засценку Урэчча[562].

440/279 **Еўдакія,** *1795 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1796 г., жыла ў засценку Урэчча[563].

441/280 **Якуб,** *1776 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1796 г., жыў у засценку Урэчча[564].

442/280 **Кацярына,** *1784 (1785) г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1796 г., жыла ў засценку Урэчча[565].

443/280 **Элеанора (Алена),** *1788 (1783) г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1796 г., жыла ў засценку Урэчча[566].

444/281 **Іеранім (Геранім),** *1802 г. н. Па спісе дваран ад 14.03.1816 г., жыў у засценку Сарога на зямлі княгіні Стэфаніі Радзівіл[567]. Быў прыхаджанінам Языльскай Праабражэнскай царквы. Разам з жонкай Лявонція Прахарэвіча Ганнай Грыгор'еўнай быў хросным 29.07.1821 г. у Параскевіі[568], дачкі Гераніма і Еўдакіі Гурыновічаў; з Марыяй Андрэеўнай Некрашэвіч 22.09.1824 г. – у Іаана[569], сына Паўла Геранімавіча і Марыі Гурыновічаў.

Жонка – Ефрасіння. Разам з Іванам Гурыновічам была хроснай 27.03.1825 г. у Матроны[570], дачкі Грыгорыя і Алены Гурыновічаў.

445/281 **Дар'я (Адарыя),** *1797 г. н. Жыла ў засценку Сарога, была прыхаджанкай Языльскай Праабражэнскай царквы. Разам з Янам Геранімавічам Гурыновічам была хроснай 18.09.1818 г. у Сафіі[571], 02.08.1821 г. – у Стэфана[572], дзяцей Грыгорыя Геранімавіча і Ірыны Грыгор'еўны Гурыновічаў; з феерверкерам 29-й конна-артылерыйскай роты Іванам Іванавічам Якаўлевым 12.03.1821 г. – у Сафронія[573], сына Сцяпана Іеранімавіча і Дарыі Янаўны Гурыновічаў. Па сямейным спісе дваран 2-га разраду Слуцкага павета 1835 г., разам з мужам і дзецьмі жыла ў засценку Смольгава на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[574].

Муж – Мацвей Іванавіч Тарасевіч, 27 гадоў, жыхар засценка Смольгава, прыхаджанін Яроміцкай Раство-Багародзіцкай царквы

(гл. «Тарасевічы» 54/25). Шлюб 13.05.1823 г. у Языльскай Праабражэнскай царкве Бабруйскага павета. Святар – Антоній Субоцкі з Урэцкай Мікалаеўскай царквы. Сведкі – жыхар засценка Смольгава Аляксандр Масакоўскі і жыхар засценка Сарога Грыгорый Сеўрук[575].

446/282 **Іеранім (Геранім),** *1803 г. н. Па спісе дваран ад 14.03.1816 г., жыў у засценку Сарога на зямлі княгіні Стэфаніі Радзівіл[576].

447/282 **Кандрат,** *1795 г. н. Па сямейных спісах шляхты Слуцкага павета 1796 г.[577] і ад 14.03.1816 г.[578], разам з бацькамі жыў у засценку Сарога.

448/282 **Марыяна,** *1790 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., разам з бацькамі жыла ў засценку Сарога[579].

449/283 **Аляксандра,** *1788 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., разам з бацькамі жыла ў засценку Кутнева[580].

450/283 **Тэадора,** *1790 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., разам з бацькамі жыла ў засценку Кутнева[581].

Муж – Марцін Іванавіч Макавецкі, 20 гадоў, жыхар засценка Сарога, прыхаджанін Языльскай Праабражэнскай царквы. Шлюб 26.01.1811 г. у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Святар – Іаан Бараноўскі. Сведкі – жыхар засценка Ляшковічы Міхаіл Валатовіч і жыхар засценка Кутнева Антоній Корбут[582].

451/284 **Грыгорый,** *1776 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыў у засценку Кутнева[583]. У 1823 г. жыў у засценку Сарога. Разам з Аляксандрам Масакоўскім быў сведкам пры шлюбе 13.05.1823 г. у Языльскай Праабражэнскай царкве Мацвея Іванавіча Тарасевіча і Дар'і Рафаілаўны Сеўрук[584].

452/284 **Якаў,** *1755 г. н. Па спісе дваран ад 14.03.1816 г., жыў у засценку Сарога на зямлі княгіні Стэфаніі Радзівіл[585].

Жонка – Ганна.

453/284 **Сымон,** *1761 г. н. У 1789 г. жыў у сяле Мардвілавічы Забалоцкай воласці Бабруйскага павета, быў прыхаджанінам Яроміцкай Раство-Багародзіцкай царквы (?). Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыў у засценку Кутнева[586]; па спісе дваран ад 14.03.1816 г.[587] – у засценку Сарога на зямлі княгіні Стэфаніі Радзівіл.

Жонкі: 1. Раніна (Ірына) Геранімаўна Крукоўская[588], жыхарка сяла Мардвілавічы. Шлюб 18.01.1789 г. у Яроміцкай Раство-Багародзіцкай царкве Бабруйскага павета. Святар – Міхаіл Гаховіч (гл. «Крукоўскія» 18/13); 2. (?) Марцыся, па спісе дваран ад 14.03.1816 г., жыла ў засценку Сарога на зямлі княгіні Стэфаніі Радзівіл[589].

454/284 **Матрона,** нарадзілася 08.11.1792 г. у засценку Кутнева ў сям'і Антонія і Марыі Сеўрукаў, ахрышчана святаром Аляксандрам Прорвічам у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – Мікалай Корбут і жонка Іаана Сеўрука Алена[590].

455/284 **Еўдакія,** нарадзілася 04.08.1790 г. у засценку Кутнева ў сям'і Антонія і Марыі Сеўрукаў, ахрышчана святаром Аляксандрам Прорвічам у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – Мікалай Антонавіч Корбут і жонка Іаана Корбута Ганна Іванаўна[591].

456/285 **Станіслаў,** *1768 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыў у засценку Сарога[592].

457/285 **Якуб,** *1762 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыў у засценку Сарога[593].

Жонка – Марыяна Тарынская, *1766 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыла ў засценку Сарога[594].

X КАЛЕНА

458/287 **Марыяна,** *1775 г. н. Па рэвізскай сказцы шляхты Слуцкага павета ад 29.08.1795 г., жыла ў засценку Сыцянец[595].

Муж – Якаў Фёдаравіч Русецкі, 20 гадоў, жыхар засценка Альшанка, прыхаджанін Вызнянскай Мікалаеўскай царквы. Шлюб 10.09.1797 г. у Старобінскай Мікалаеўскай царкве. Святар – Гаўрыіл Бабарыкін[596].

459/287 **Грыгорый,** *1756 (1761, 1766) г. н. «Земянин вольный, оседлый, веры греческой». Жыў у засценку Сыцянец Слуцкага павета на зямлі князя Дамініка Геранімавіча Радзівіла, плацячы за зямлю грашовы чынш і «исполняя по инвентарю услужение», што пацвярджае рэвізская сказка ад 29.08.1795 г.[597] Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета ад 04.08.1816 г.[598], жыў у засценку Сыцянец на зямлі княжны Стэфаніі Дамінікаўны Радзівіл.

Жонка – Агафія (? Марыя) Васільеўна Некрашэвіч, *1765 (1771, 1774) г. н. Разам з Марцінам Грыгор'евічам Некрашэвічам была хроснай 06.11.1797 г. у Іаана[599], 20.11.1800 г. – у Грыгорыя[600], сыноў Іаана і Ксеніі Іаанаўны Некрашэвічаў; з Васілём Некрашэвічам 16.08.1805 г. – у Марыі[601], дачкі Нікіфара Васільевіча і Ганны Іванаўны Некрашэвічаў.

460/288 **Стэфан,** *1790 г. н. Па сямейным спісе шляхты Слуцкага павета 1796 г., жыў у засценку Касынічы[602].

461/294 **Фёдар,** нарадзіўся 17.02.1801 г. у засценку Сыцянец, у сям'і Іосіфа Іванавіча і Сафіі Сеўрукаў, ахрышчаны святаром Гаўрыілам Бабарыкіным у Старобінскай Мікалаеўскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Сыцянец Пётр Данілавіч Пількевіч і жонка Івана Марына Паўлаўна[603].

462/302 **Сільвестр,** нарадзіўся 03.01.1801 г. у засценку Кутнева ў сям'і Сімяона Андрэевіча і Варвары Сеўрукаў, ахрышчаны святаром Іаанам Бараноўскім у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Кутнева Павел Загароўскі і дачка Іосіфа Сеўрука Пелагія, дзяўчына[604].

463/302 **Фацінія,** нарадзілася 15.02.1803 г. у засценку Кутнева ў сям'і Сімяона Андрэевіча і Варвары Сеўрукаў, ахрышчана святаром Іаанам Бараноўскім у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Кутнева Павел Загароўскі і дачка Іосіфа Сеўрука Пелагія, дзяўчына[605].

464/302 **Ганна,** нарадзілася 06.12.1805 г. у засценку Кутнева ў сям'і Сімяона Андрэевіча і Варвары Сеўрукаў, ахрышчана святаром Іаанам Бараноўскім у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Кутнева Матфей Сеўрук і жонка Антонія Корбута Пелагія Іосіфаўна[606].

465/302 **Іаан,** нарадзіўся 07.01.1815 г. у засценку Кутнева ў сям'і Сімяона Андрэевіча і Варвары Сеўрукаў, ахрышчаны 09.01.1815 г. святаром Іаанам Бараноўскім у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Кутнева Матфей Корбут і жонка Аляксандра Сеўрука Кацярына Пятроўна[607].

466/302 **Таццяна,** нарадзілася 15.01.1794 г. у засценку Кутнева ў сям'і Сімяона Андрэевіча і Варвары Сеўрукаў, ахрышчана святаром Іаанам Бараноўскім у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Кутнева Павел Загароўскі і жонка Іаана Корбута Марыя[608]. Разам з Грыгорыем Корбутам была хроснай 20.02.1812 г. у Марыяны[609], з Іванам Ялніцкім 15.06.1816 г. – у Алены[610], дачок Івана Іосіфавіча і Марыі Сеўрукаў. Па

рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета ад 04.08.1816 г.[611], жыла ў засценку Кутнева на зямлі княгіні Стэфаніі Дамінікаўны Радзівіл.

Муж – Амяльян Грыгор'евіч Гурыновіч, 20 гадоў, жыхар засценка Кутнева. Шлюб 22.10.1816 г. у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Святар – Іаан Бараноўскі. Сведкі – жыхары засценка Кутнева Іван Ялніцкі і Матфей Корзун[612].

467/303(?) **Анастасія,** нарадзілася 22.12.1793 г. у засценку Кутнева ў сям'і Фамы і Матроны Сеўрукаў, ахрышчана святаром Іаанам Бараноўскім у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Кутнева Аляксандр Сеўрук і жонка Матфея Корбута Марыя[613].

468/305 **Васіль,** нарадзіўся 07.03.1811 г. у засценку Кутнева ў сям'і Васіля Пятровіча і Еўдакіі Фамінічны Сеўрукаў, ахрышчаны 12.03.1811 г. святаром Іаанам Бараноўскім у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Кутнева Іван Сеўрук і жонка Антонія Корбута Пелагія Арцёмаўна[614].

469/305 **Лука,** нарадзіўся 18.10.1797 г. у засценку Кутнева ў сям'і Васіля Пятровіча і Еўдакіі Фамінічны Сеўрукаў, ахрышчаны святаром Іаанам Бараноўскім у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхар засценка Смольгава Васіль Забродскі і дачка Іосіфа Сеўрука Палагія[615].

470/305 **Ганна,** нарадзілася 09.10.1799 г. у засценку Кутнева ў сям'і Васіля Пятровіча і Еўдакіі Фамінічны Сеўрукаў, ахрышчана святаром Іаанам Бараноўскім у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхар засценка Смольгава Васіль Забродскі і жонка Іосіфа Сеўрука Ганна[616].

471/305 **Майсей,** нарадзіўся 04.09.1805 г. у засценку Кутнева ў сям'і Васіля Пятровіча і Еўдакіі Фамінічны Сеўрукаў, ахрышчаны святаром Іаанам Бараноўскім у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Кутнева Васіль Жаброўскі і жонка Антонія Корбута Меланія Іванаўна[617].

472/311 **Міхаіл,** нарадзіўся 09.05.1806 г. у засценку Кутнева ў сям'і Аляксандра Іосіфавіча і Марыі Андрэеўны Сеўрукаў, ахрышчаны святаром Іаанам Бараноўскім у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Кутнева Антоній Корбут і дачка Іосіфа Сеўрука Марыя, дзяўчына[618].

473/311 **Сафія,** нарадзілася 20.09.1807 г. у засценку Кутнева ў сям'і Аляксандра Іосіфавіча і Марыі Андрэеўны Сеўрукаў, ахрышчана 22.09.1807 г. святаром Іаанам Бараноўскім у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Кутнева Антоній Корбут і дачка Івана Сеўрука Феадора, дзяўчына[619].

474/331 **Лявонцій,** *1833 г. н. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 06.04.1861 г. далучаны да дваранскага роду Сеўрукаў з унясеннем у 6-ю частку радаводнай кнігі дваран Мінскай губерні. Зацверджаны ўказам Сената ад 19.10.1861 г., № 8534. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Кутнева на чыншавай зямлі[620].

Жонка – Марыя Прохараўна Цішкевіч, *1853 г. н.

475/340 **Якаў.**

476/340 **Леў.**

477/340 **Зоцік,** нарадзіўся 30.12.1846 г. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 16.05.1872 г. далучаны да дваранскага роду Сеўрукаў. Зацверджаны ўказам Сената ад 09.01.1873 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага

павета 1893 г., жыў у засценку Кутнева на чыншавай зямлі княгіні Гагенлоэ[621].

Жонка – Ірына Пятроўна Чарнышэвіч, *1858 г. н.

478/340 **Іоў,** нарадзіўся 14.05.1841 г. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 16.05.1872 г. далучаны да дваранскага роду Сеўрукаў. Зацверджаны ўказам Сената ад 09.01.1873 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Кутнева на чыншавай зямлі княгіні Гагенлоэ[622].

Жонка – Вольга Пракоф'еўна Пракаповіч, *1853 г. н.

479/343 **Фама,** нарадзіўся 06.10.1831 г. Жыў у засценку Кутнева, быў прыхаджанінам Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царквы. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 14.03.1852 г. далучаны да дваранскага роду Сеўрукаў. Зацверджаны ўказам Сената ад 17.07.1852 г., № 6441. Разам з Марцінам Іванавічам Бараноўскім быў сведкам з боку маладога пры шлюбе 06.07.1869 г. Івана Васільевіча Гурыновіча і Агафіі Семёнаўны Сеўрук[623]. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Кутнева на зямлі княгіні Гагенлоэ[624].

Жонка – Параскевія Іванаўна Яльніцкая, *1833 г. н.

480/343 **Канстанцін,** жыў у засценку Кутнева, быў прыхаджанінам Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царквы.

Жонка – Дамнікія Пятроўна. Разам з Пятром Фамічом Бараноўскім была хроснай 24.04.1866 г. у Аляксандры[625], дачкі Уладзіміра Андрэевіча і Мар'яны Паўлаўны Некрашэвічаў.

481/343 **Васіль.**

482/343 **Ефрасіння,** нарадзілася 25.06.1817 г. у засценку Кутнева ў сям'і Аляксандра Іосіфавіча і другашлюбнай жонкі Гіятфіны Сеўрукаў, ахрышчана 29.06.1817 г. святаром Іаанам Бараноўскім у Пагосцкай Срэценскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Кутнева Грыгорый Бераздо[ ] і жонка Гераніма Казлоўскага Ефрасіння Іванаўна[626]. Разам з Герасімам Якаўлевічам Гурыновічам была хроснай у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве 11.09.1831 г. у Феадоры[627], дачкі Васіля Якаўлевіча і Ефрасінні Іванаўны Гурыновічаў.

Муж – Іван Сімяонавіч Тарасевіч, 19 гадоў, дваранін з засценка Сарога. Шлюб 23.05.1838 г. у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Святар – Іаан Бараноўскі. Сведкі: з боку маладога – жыхары засценка Сарога Марцін Іванавіч Масакоўскі і Цімафей Іванавіч Брадкоўскі; з боку маладой – жыхары засценка Кутнева Іван Іванавіч Вечар і Пётр Іосіфавіч Сеўрук[628].

483/344 **Марыяна,** нарадзілася 20.02.1812 г. у засценку Кутнева ў сям'і Івана Іосіфавіча і Марыі Грыгор'еўны Сеўрукаў, ахрышчана святаром Іаанам Бараноўскім у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Кутнева Грыгорый Корбут і дачка Сямёна Сеўрука Таццяна, дзяўчына[629]. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета ад 04.08.1816 г.[630], жыла ў засценку Кутнева на зямлі княгіні Стэфаніі Дамінікаўны Радзівіл.

484/344 **Алена,** нарадзілася 13.06.1816 г. у засценку Кутнева ў сям'і Івана Іосіфавіча і Марыі Іванаўны Сеўрукаў, ахрышчана 15.06.1816 г. святаром Іаанам Бараноўскім у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Кутнева Іван Ялніцкі і дачка Сямёна Сеўрука Таццяна, дзяўчына[631].

485/345 **Ульянія,** нарадзілася 07.03.1816 г. у сям'і Марціна Іосіфавіча і Дарыі Грыгор'еўны Сеўрукаў, ахрышчана 09.03.1816 г. святаром Іаанам Бараноўскім у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай

царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Кутнева Аляксандр Сеўрук і жонка Фёдара Гурыновіча Фядора Іванаўна[632].

486/346 **Георгій,** нарадзіўся 07.04.1836 г., ахрышчаны ў Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве.

487/346 **Касіян,** нарадзіўся 28.02.1833 г. Непісьменны. Жыў у засценку Кутнева, быў прыхаджанінам Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царквы. У 1866 г. пазначаны ў саслоўі аднадворцаў. Разам з Іўсцінам Лявонавічам Прылуцкім быў сведкам з боку маладога пры шлюбе 24.04.1866 г. Мітрафана Данілавіча Гурыновіча і Алены Андрэеўны Берасневіч[633]. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 18.05.1870 г. далучаны да дваранскага роду Сеўрукаў, зацверджаны ўказам Сената ад 18.07.1870 г. Па сямейных спісах дваран Слуцкага павета ад 03.04.1878 г., жыў у засценку Кутнева на чыншавай зямлі князя Гагенлоэ, 1893 г. – на ўласнай зямлі (12 дзесяцін)[634].

Жонкі: 1. Палагія Аляксандраўна, ад яе сын Васіль; 2. Еўдакія Васільеўна, ад яе сын Ілья, дочкі Марфа, Стэфанія, Яўгенія, Дарыя. Разам з Захарыем Якаўлевічам Тычынам была хроснай 08.11.1864 г. у Касьмы[635], сына Фамы Іванавіча і Арыны Пятроўны Гурыновічаў; 25.05.1869 г. – у Феадосіі[636], дачкі Фамы Іванавіча і Еўдакіі Ляўкоўны Гурыновічаў. Памерла да 1893 г.

488/356 **Сімяон.**

489/358 **Семіон (Сямён),** нарадзіўся 15.03.1850 г. Пісьменны. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Кутнева на зямлі князя Гагенлоэ[637], у тым жа годзе выкупіў 24 дзесяціны зямлі.

Жонка – Еўдакія Андрэеўна Некрашэвіч, *1856 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыла разам з мужам, дзецьмі і бацькам у засценку Кутнева на зямлі князя Гагенлоэ[638]. Памерла ў 1893 г.

490/370 **Ануфрый.**

491/370 **Ефрасіння,** нарадзілася 23.05.1816 г. у засценку Залессе ў сям'і Міхаіла Андрэевіча і Пелагіі Васільеўны Сеўрукаў, ахрышчана святаром Матфеем Шпілеўскім у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Залессе Фёдар Рэут і жонка Грыгорыя Гурыновіча Агафія Андрэеўна[639].

492/373 **Дзмітрый.**

493/373 **Пётр.**

494/380 **Васіль,** маёр.

495/380 **Цімафей.**

496/380 **Пётр.** Пасля заканчэння Слуцкай гімназіі паступіў 01.09.1850 г. у штат Мінскай казённай палаты. Загадам па грамадзянскім ведамстве ад 03.08.1852 г. узнагароджаны чынам калежскага рэгістратара. Па прашэнні прызначаны 19.09.1855 г. засядацелем па піцейнай частцы ў Слуцкі земскі суд. 28.12.1855 г. уганараваны чынам губернскага сакратара. Атрымаў медаль на памяць аб Крымскай вайне 1853–1856 гг. 10.04.1859 г. прызначаны приставам 5-га стану Навагрудскага павета. З таго часу служыў приставам у розных станах Мінскай губерні. Па прашэнні залічаны 11.05.1882 г. у штат Мінскай казённай палаты. Камандзіраваны ў Бабруйскае казначэйства. 25.05.1884 г. прызначаны малодшым чыноўнікам Мінскай казённай палаты. Загадам Міністэрства фінансаў ад 15.05.1885 г., № 33, прызначаны падатковым інспектарам і 31.08.1885 г. камандзіраваны ў 3-і ўчастак Слуцкага павета. Указам Урадавага сената ад 25.11.1886 г., № 136, узведзены ў надворныя саветнікі са старшынством з 25.07.1884 г. Памёр 07.07.1888 г.[640]

497/380 **Іван,** капітан.

498/382 **Лаўрэнцій.** Зацверджаны ў дваранстве ўказам Сената ад 19.10.1866 г., № 8534.

Жонка – Настасся Філіпаўна Некрашэвіч, *1843 г. н. Па сямейным спісе дваран 2-га разраду 1893 г., не далучаных да роду, жыла разам з сынам Дзмітрыем у засценку Касынічы на чыншавай зямлі[641].

499/382 **Грыгорый.**

500/384 **Іван.**

501/384 **Андрэй.** Памёр да 1893 г.

Жонка – Матрона Пятроўна, *1834 г. н. У сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г. пазначана ўдавой, якая жыла разам з сынамі ў засценку Кутнева на чыншавай зямлі княгіні Гагенлоэ[642].

502/384 **Іосіф.**

503/386 **Самуіл.**

504/386 **Іван,** нарадзіўся 29.06.1816 г. у засценку Кутнева ў сям'і Міхаіла Грыгор'евіча і Еўдакіі Грыгор'еўны Сеўрукаў, ахрышчаны 30.06.1816 г. святаром Іаанам Бараноўскім у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Кутнева Іван Сеўрук і жонка Якава Сеўрука Марыя Мікалаеўна[643].

505/386 **Тарэса,** *1809 г. н. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета ад 04.08.1816 г.[644], жыла ў засценку Кутнева на зямлі княгіні Стэфаніі Дамінікаўны Радзівіл.

506/391 **Франц.**

507/391 **Іосіф.**

508/392 **Раман.**

509/392 **Павел.**

510/393 **Іосіф.**

511/395 **Станіслаў.**

512/395 **Іван.**

513/395 **Міхаіл.**

514/396 **Іван.**

515/396 **Геранім.**

516/397 **Іосіф.**

517/397 **Амброзій.**

518/400 **Іосіф.**

519/404 **Нікадзім-Іван,** нарадзіўся 15.07.1809 г., ахрышчаны ва Урвіцкай царкве.

520/404 **Пётр,** нарадзіўся 28.05.1807 г., ахрышчаны ва Урвіцкай царкве.

521/404 **Іосіф,** нарадзіўся 27.02.1791 г., ахрышчаны ва Урвіцкай царкве.

Жонкі: 1. Зузана, ад яе сын Франц; 2. Рэгіна, ад яе сыны Сямён і Юльян.

522/408 **Ксенія,** нарадзілася 20.08.1802 г. у засценку Кутнева ў сям'і Фамы Сямёнавіча і Еўдакіі Іванаўны Сеўрукаў, ахрышчана святаром Гаўрыілам Бабарыкіным у Старобінскай Мікалаеўскай царкве. Хросныя бацькі – жыхар засценка Кулакі Дзям'ян Іванавіч Кулакоўскі і жонка жыхара засценка Сыцянец Марціна Некрашэвіча Афанасія Пятроўна[645].

523/411 **Аляксей,** нарадзіўся 17.03.1835 г., ахрышчаны ў Старобінскай Мікалаеўскай царкве. Зацверджаны ў дваранстве ўказам Сената ад 19.10.1861 г., № 8534. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Сыцянец на чыншавай зямлі княгіні Гагенлоэ[646].

Жонка – Марыя Мікалаеўна Некрашэвіч, *1834 г. н.

524/411 **Іосіф,** нарадзіўся 09.09.1828 г. у засценку Сыцянец у сям'і Івана Грыгор'евіча і Ефрасінні Пятроўны Сеўрукаў, ахрышчаны 10.09.1828 г. святаром Гаўрыілам Бабарыкіным у Старобінскай Мікалаеўскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Сыцянец Андрэй Казлоўскі і дачка Рамана Некрашэвіча Дамнікія, дзяўчына[647].

525/411 **Сімяон,** нарадзіўся 17.04.1826 г., ахрышчаны 18.04.1826 г. у Старобінскай Мікалаеўскай царкве.

526/415 **Грыгорый.**

527/415 **Іван.**

528/415 **Марыя,** нарадзілася 03.06.1832 г. у засценку Сыцянец у сям'і Марціна Грыгор'евіча і Ірыны Паўлаўны Сеўрукаў, ахрышчана святаром Гаўрыілам Бабарыкіным у Старобінскай Мікалаеўскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Сыцянец Грыгорый Нікіфаравіч Некрашэвіч і жонка Венядзікта Іванавіча Некрашэвіча Глікерыя Дзям'янаўна[648].

529/416 **Васіль,** *1843 г. н. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 04.12.1872 г. далучаны да дваранскага роду Сеўрукаў. Зацверджаны ўказам Сената ад 08.01.1874 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Сыцянец на чыншавай зямлі княгіні Гагенлоэ[649].

Жонкі: 1. N, ад яе сын Канстанцін і дачка Анастасія; 2. Пелагея Пятроўна, ад яе сын Іван і дачка Ганна.

530/416 **Ганна,** нарадзілася 18.07.1837 г. у засценку Сыцянец у сям'і Івана Грыгор'евіча і Агафіі Пятроўны Сеўрукаў, ахрышчана святаром Іаанам Дзям'янавічам Айціновічам у Старобінскай Мікалаеўскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Сыцянец Іван Нікіфаравіч Некрашэвіч і жонка Андрэя Некрашэвіча Марыя Дзям'янаўна[650].

531/416 **Сцяпан,** нарадзіўся 23.12.1844 г. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 04.12.1872 г. далучаны да дваранскага роду Сеўрукаў. Зацверджаны ўказам Сената ад 08.01.1874 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Сыцянец на чыншавай зямлі княгіні Гагенлоэ[651].

Жонка – Матрона Захар'еўна Некрашэвіч, *1863 г. н.

532/419 **Данііл.**

533/419 **Давід.**

534/419 **Антон.**

535/420 **Георгій.**

536/420 **Іван.**

537/420 **Дзмітрый.**

538/420 **Фёдар.**

539/420 **Сцяпан.**

540/420 **Міхаіл,** нарадзіўся 18(12).07.1837 г. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 06.03.1874 г. далучаны да дваранскага роду Сеўрукаў. Зацверджаны ўказам Сената ад 12.08.1875 г., № 2924. У 1874–1882 гг. быў прыхаджанінам Харастоўскай царквы Мазырскага павета. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у вёсцы Пузічы Мазырскага павета на арэнднай зямлі[652].

Жонка – Марцэлія Іванаўна, *1853 г. н.

541/421 **Мікалай.**

542/422 **Іван.**

543/422 **Сямён.**

544/422 **Міхаіл.**

545/444 **Мацвей.**

546/444 **Гаўрыіл.**

547/444 **Ігнацій.**

548/447 **Ілья.**

549/447 **Аляксей.**

550/447 **Сафроній.**

551/447 **Фёдар.**

552/447 **Сямён.**

553/447 **Антон.**

554/452 **Фёдар,** *1781 г. н. Па спісе дваран ад 14.03.1816 г., жыў у засценку Сарога на зямлі княгіні Стэфаніі Радзівіл[653].

555/453 **Майсей,** нарадзіўся 28.08.1792 г. у засценку Кутнева ў сям'і Сымона Антонавіча і Ірыны Сеўрукаў, ахрышчаны святаром Аляксандрам Прорвічам у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхар засценка

Мардвілавічы Іаан Крукоўскі і жонка жыхара засценка Кутнева Іаана Сеўрука Ганна[654].

556/453 **Яўфімія,** нарадзілася 09.07.1794 г. у засценку Кутнева ў сям'і Сымона Антонавіча і Ірыны Сеўрукаў, ахрышчана святаром Іаанам Бараноўскім у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Кутнева Іаан Сеўрук і жонка Іаана Сеўрука Ганна[655].

557/453 **Іаан,** нарадзіўся 25.09.1799 г. у засценку Кутнева ў сям'і Сымона Антонавіча і Ірыны Сеўрукаў, ахрышчаны святаром Іаанам Бараноўскім у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Кутнева Іаан Сеўрук і жонка Іаана Сеўрука Ганна[656].

558/453 **Феадор,** нарадзіўся 16.05.1802 г. у засценку Кутнева ў сям'і Сымона Антонавіча і Ірыны Герасімаўны Сеўрукаў, ахрышчаны святаром Іаанам Бараноўскім у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Кутнева Іаан Сеўрук і жонка Іаана Сеўрука Ганна[657].

559/453 **Стэфан,** *1797 г. н. Па спісе дваран ад 14.03.1816 г., жыў у засценку Сарога на зямлі княгіні Стэфаніі Радзівіл[658].

560/453 **Марыя,** нарадзілася 10.04.1805 г. у засценку Кутнева ў сям'і Сымона Антонавіча і Ірыны Герасімаўны Сеўрукаў, ахрышчана святаром Іаанам Бараноўскім у Пагосцкай Іаана-Прадцечанскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Кутнева Іаан Сеўрук і жонка Іосіфа Прылуцкага Ефрасіння Іванаўна[659].

561/457 **Андрэй,** *1794 г. н. Па сямейных спісах шляхты Слуцкага павета 1796 г.[660] і ад 14.03.1816 г.[661], жыў разам з бацькамі ў засценку Сарога.

Жонка – Марыяна.

562/457 **Марцін,** *1810 г. н. Па спісе дваран ад 14.03.1816 г., жыў у засценку Сарога на зямлі княгіні Стэфаніі Радзівіл[662].

XI КАЛЕНА

563/459 **Яфімій,** нарадзіўся 01.04.1800 г. у засценку Сыцянец у сям'і Грыгорыя Янавіча і Агафіі Васільеўны Сеўрукаў, ахрышчаны святаром Гаўрыілам Бабарыкіным у Старобінскай Мікалаеўскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Сыцянец Якаў Васільевіч Некрашэвіч і жонка Данілы Пількевіча Марыя Аляксееўна[663].

564/459 **Марцін,** *1805 г. н. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета ад 04.08.1816 г.[664], жыў у засценку Сыцянец на зямлі княжны Стэфаніі Дамінікаўны Радзівіл.

565/459 **Настасся,** *1794 г. н. Па рэвізскай сказцы ад 29.08.1795 г., сямейным спісе шляхты 1796 г. і рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета ад 04.08.1816 г., жыла разам з бацькамі ў засценку Сыцянец[665].

566/459 **Стэфан,** нарадзіўся 13.07.1807 г. у засценку Сыцянец у сям'і Грыгорыя Янавіча і Агафіі Васільеўны Сеўрукаў, ахрышчаны 14.07.1807 г. святаром Гаўрыілам Бабарыкіным у Старобінскай Мікалаеўскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Сыцянец Якаў Васільевіч Некрашэвіч і жонка Данілы Пількевіча Марыя Аляксандраўна[666].

567/459 **Марыя,** нарадзілася 22.07.1802 г. у засценку Сыцянец у сям'і Грыгорыя Янавіча і Агафіі Васільеўны Сеўрукаў, ахрышчана святаром Гаўрыілам Бабарыкіным у Старобінскай Мікалаеўскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Сыцянец Якаў Васільевіч Некрашэвіч і жонка Данілы Пількевіча Марыя Аляксандраўна[667].

568/459 **Рэгіна,** *1800 г. н. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета ад 04.08.1816 г.[668], жыла ў засценку Сыцянец на зямлі княжны Стэфаніі Дамінікаўны Радзівіл. Была прыхаджанкай Старобінскай Мікалаеўскай царквы.

Муж – Фёдар Казлоўскі, 23 гадоў, жыхар засценка Іздрашава, прыхаджанін Чыжэвіцкай Пакроўскай царквы. Шлюб 02.05.1820 г. у Старобінскай Мікалаеўскай царкве. Святар – Гаўрыіл Бабарыкін. Сведкі – жыхар засценка Іздрашава Павел Казлоўскі і жыхар засценка Сыцянец Грыгорый Некрашэвіч[669].

569/459 **Варвара,** нарадзілася 05.12.1798 г. у засценку Сыцянец у сям'і Грыгорыя Янавіча і Агафіі Васільеўны Сеўрукаў, ахрышчана святаром Гаўрыілам Бабарыкіным у Старобінскай Мікалаеўскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Сыцянец Якаў Васільевіч Некрашэвіч і дачка Сімяона Сеўрука Ганна[670]. Памерла 20.12.1798 г., пахавана святаром Старобінскай Мікалаеўскай царквы Гаўрыілам Бабарыкіным[671].

570/459 **Варвара,** нарадзілася 23.12.1817 г. у сям'і Грыгорыя Іванавіча і Марыі (? Агафіі) Васільеўны Сеўрукаў, ахрышчана 24.12.1817 г. святаром Гаўрыілам Бабарыкіным у Старобінскай Мікалаеўскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Сыцянец Грыгорый Некрашэвіч і дачка Івана Некрашэвіча Ганна, дзяўчына[672].

571/459 **Кацярына,** нарадзілася 17.11.1820 г. у засценку Сыцянец у сям'і Грыгорыя Янавіча і Агафіі Васільеўны Сеўрукаў, ахрышчана 18.11.1820 г. святаром Гаўрыілам Бабарыкіным у Старобінскай Мікалаеўскай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Сыцянец Грыгорый Некрашэвіч і дачка Івана Некрашэвіча Матрона, дзяўчына[673].

572/474 **Стэфан,** нарадзіўся 27.12.1872 г., ахрышчаны 28.01.1873 г.

573/474 **Максім,** нарадзіўся 28.04.1890 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Кутнева на чыншавай зямлі[674]. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 27.05.1914 г. далучаны да дваранскага роду Сеўрукаў. Зацверджаны ўказам Сената ад 20.12.1914 г., № 04840[675].

574/474 **Сінкліцыя,** *1870 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыла ў засценку Кутнева на чыншавай зямлі[676].

575/474 **Елізавета,** *1881 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыла ў засценку Кутнева на чыншавай зямлі[677].

576/474 **Фядот.**

577/474 **Уладзімір,** нарадзіўся 16.07.1877 г., ахрышчаны 17.07.1877 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Кутнева на чыншавай зямлі[678].

578/477 **Васіль,** нарадзіўся 12.04.1873 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Кутнева на чыншавай зямлі княгіні Гагенлоэ[679].

579/477 **Яфімій,** нарадзіўся 15.09.1886 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Кутнева на чыншавай зямлі княгіні Гагенлоэ[680].

580/477 **Іван**, нарадзіўся 25.09.1891 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Кутнева на чыншавай зямлі княгіні Гагенлоэ[681].

581/477 **Фяўронія,** *1884 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыла ў засценку Кутнева на чыншавай зямлі княгіні Гагенлоэ[682].

582/478 **Мікалай,** нарадзіўся 05.12.1884 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Кутнева на чыншавай зямлі княгіні Гагенлоэ[683].

583/478 **Ілья,** нарадзіўся 19.07.1886 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Кутнева на чыншавай зямлі княгіні Гагенлоэ[684].

584/478 **Ануфрый,** нарадзіўся 08.06.1888 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Кутнева на чыншавай зямлі княгіні Гагенлоэ[685].

585/478 **Ганна,** *1874 г. н. (з блізнят). Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыла ў засценку Кутнева на чыншавай зямлі княгіні Гагенлоэ[686].

586/478 **Еўдакія,** *1874 г. н. (з блізнят). Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыла ў засценку Кутнева на чыншавай зямлі княгіні Гагенлоэ[687].

587/478 **Феадора,** *1878 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыла ў засценку Кутнева на чыншавай зямлі княгіні Гагенлоэ[688].

588/478 **Матрона,** *1881 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыла ў засценку Кутнева на чыншавай зямлі княгіні Гагенлоэ[689].

589/479 **Стэфан,** нарадзіўся 03.08.1871 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Кутнева на зямлі княгіні Гагенлоэ[690].

Жонка – Ірына Іванаўна Муравіцкая, *1871 г. н.

590/480 **Нестар,** зацверджаны ў дваранстве ўказам Сената ад 13.04.1842 г., № 5684. Памёр да 1893 г.

Жонка – Марыя Міхайлаўна Вішнеўская, *1858 г. н. Пасля смерці Нестара выйшла замуж за N Вечара. Па сямейным спісе дваран 2-га разраду 1893 г., не далучаных да роду, разам з сынам Фёдарам жыла ў засценку Кутнева на арэнднай зямлі княгіні Гагенлоэ[691].

591/481 **Грыгорый.**

592/486 **Мікалай,** нарадзіўся 07.05.1887 г., ахрышчаны 09.05.1887 г.

593/486 **Фёдар,** нарадзіўся 06.06.1874 г., ахрышчаны 07.06.1874 г.

594/486 **Іосіф,** нарадзіўся 09.09.1876 г.

595/487 **Васіль,** нарадзіўся 01.01.1861 г. у сям'і Касіяна Пятровіча і Палагеі Аляксандраўны. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Кутнева на зямлі бацькі (12 дзесяцін)[692].

Жонка – Марыя Сільвестраўна Зяневіч, *1850 г. н.

596/487 **Ілья,** нарадзіўся 18.07.1872 г. у сям'і Касіяна Пятровіча і Еўдакіі Васільеўны, ахрышчаны 20.07.1872 г. Па сямейных спісах дваран Слуцкага павета ад 03.04.1878 г. і 1893 г., жыў у засценку Кутнева на чыншавай зямлі княгіні Гагенлоэ[693].

597/487 **Яўгенія,** нарадзілася 25.12.1869 г. Па сямейных спісах дваран Слуцкага павета ад 03.04.1878 г. і 1893 г., жыла ў засценку Кутнева на чыншавай зямлі княгіні Гагенлоэ[694].

598/487 **Марфа (Маўра),** *1864 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыла ў засценку Кутнева на чыншавай зямлі княгіні Гагенлоэ[695].

599/487 **Стэфанія,** *1866 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыла ў засценку Кутнева на чыншавай зямлі княгіні Гагенлоэ[696].

600/487 **Дарыя,** нарадзілася 08.03.1875 г. Па сямейных спісах дваран Слуцкага павета ад 03.04.1878 г. і 1893 г., жыла ў засценку Кутнева на чыншавай зямлі княгіні Гагенлоэ[697].

601/489 **Дзмітрый,** нарадзіўся 26.10.1878 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Кутнева[698]. Зацверджаны ў дваранстве ўказам Сената ад 30.10.1903 г.

602/489 **Сцяпан,** нарадзіўся 13.06.1891 г. (? 12.07.1891 г.). Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Кутнева[699].

603/489 **Еўдакія,** *1879 (1885) г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыла ў засценку Кутнева[700].

604/489 **Марыя,** *1887 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыла ў засценку Кутнева на зямлі бацькі (24 дзесяціны)[701].

605/492 **Фядот.**

606/495 **Мікалай.**

607/495 **Аляксандр.**

608/496 **Аляксандр,** скончыў Рыжскі палітэхнічны інстытут са званнем інжынера, займаўся тэхнічнымі работамі на будоўлях Вольна-Роменскай* і Самарскай чыгунак. Памёр маладым.

609/498 **Сцяпан.**

610/498 **Дзмітрый,** нарадзіўся 25.10.1875 г. Па сямейным спісе дваран 2-га разраду 1893 г., не далучаных да роду, жыў разам з маці ў засценку Касынічы на чыншавай зямлі[702].

611/499 **Іосіф,** нарадзіўся 12.09.1853 г. Непісьменны. Зацверджаны ў дваранстве ўказам Сената ад 08.01.1874 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Касынічы на чыншавай зямлі княгіні Гагенлоэ[703].

612/499 **Павел,** нарадзіўся 28.07.1852 г. Непісьменны. Зацверджаны ў дваранстве ўказам Сената ад 08.01.1874 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Касынічы на чыншавай зямлі княгіні Гагенлоэ[704].

613/499 **Іван,** нарадзіўся 12.11.1860 г. Пісьменны. Зацверджаны ў дваранстве ўказам Сената ад 08.01.1874 г. У 1893 г. быў на ваеннай службе ў ніжнім чыне.

614/499 **Андрэй,** нарадзіўся 15.10.1864 г. Хатняга выхавання, пісьменны. Зацверджаны ў дваранстве ўказам Сената ад 19.10.1861 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Касынічы на чыншавай зямлі княгіні Гагенлоэ[705].

615/499 **Нікіфар,** нарадзіўся 03.02.1869 г. Скончыў народнае вучылішча. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Касынічы на чыншавай зямлі княгіні Гагенлоэ[706].

616/499 **Феадора,** *1874 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыла ў засценку Касынічы на чыншавай зямлі княгіні Гагенлоэ[707].

617/499 **Сцяпан,** нарадзіўся 14.12.1862 г.

618/500 **Андрэй.** Далучаны да дваранскага роду Сеўрукаў вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 15.09.1870 г. Памёр да 1893 г.

Жонка – Феадосія Фамінічна Ждановіч-Гурыновіч, *1869 г. н. Па сямейным спісе дваран 2-га разраду 1893 г., не далучаных да роду, жыла разам з сынам Сямёнам у засценку Кутнева на арэнднай зямлі княгіні Гагенлоэ[708].

619/501 **Аляксей,** нарадзіўся 13.02.1876 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Кутнева на чыншавай зямлі княгіні Гагенлоэ[709].

620/501 **Стэфан,** нарадзіўся 11.07.1865 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Кутнева на чыншавай зямлі княгіні Гагенлоэ[710].

Жонка – Маўра Касьянаўна Сеўрук, *1864 г. н. (гл. «Сеўрукі» 598/487).

621/501 **Яфімій,** нарадзіўся 25.12.1868 г., ахрышчаны 26.12.1868 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Кутнева на чыншавай зямлі княгіні Гагенлоэ[711].

622/507 **Нікадзім.**

623/507 **Карл.**

624/507 **Адольф.**

625/521 **Франц,** нарадзіўся 01.04.1817 г.

* Так пазначана ў дакуменце.

626/521 **Сямён,** нарадзіўся 03.03.1822 г. Зацверджаны ў дваранстве ўказам Сената ад 24.05.1860 г., № 4755. Памёр да 1893 г.

627/521 **Юльян,** нарадзіўся 17.07.1832 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у фальварку Гара на арэнднай зямлі[712]. Зацверджаны ў дваранстве ўказам Сената ад 24.05.1860 г., № 4755.

628/523 **Фама,** нарадзіўся 06.10.1859 г. Зацверджаны ў дваранстве ўказам Сената ад 08.01.1874 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Сыцянец на чыншавай зямлі княгіні Гагенлоэ[713].

Жонка – Марыя Андрэеўна Кулакоўская, *1864 г. н.

629/523 **Марыя,** *1875 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыла ў засценку Сыцянец на чыншавай зямлі княгіні Гагенлоэ[714].

630/523 **Сцяпан.**

631/523 **Анастасій.**

632/529 **Канстанцін,** *1877 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Сыцянец на чыншавай зямлі княгіні Гагенлоэ[715].

633/529 **Іван,** *1881 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Сыцянец на чыншавай зямлі княгіні Гагенлоэ[716].

634/529 **Анастасія,** *1876 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыла ў засценку Сыцянец на чыншавай зямлі княгіні Гагенлоэ[717].

635/529 **Ганна,** *1888 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыла ў засценку Сыцянец на чыншавай зямлі княгіні Гагенлоэ[718].

636/531 **Сцяпан,** нарадзіўся 02.10.1887 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Сыцянец на чыншавай зямлі княгіні Гагенлоэ[719].

637/531 **Елізавета,** *1890 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыла ў засценку Сыцянец на чыншавай зямлі княгіні Гагенлоэ[720].

638/540 **Флор,** ахрышчаны 17(23).12.1874 г. у Харастоўскай царкве Мазырскага павета. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у вёсцы Пузічы Мазырскага павета на арэнднай зямлі[721]. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 02.03.1899 г. далучаны да дваранскага роду Сеўрукаў з унясеннем у 6-ю частку радаводнай кнігі дваран Мінскай губерні[722], зацверджаны ўказам Сената ад 31.01.1900 г., № 212.

639/540 **Іван,** ахрышчаны 21(29).08.1882 г. у Харастоўскай царкве Мазырскага павета. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у вёсцы Пузічы Мазырскага павета на арэнднай зямлі[723]. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 02.03.1899 г. далучаны да дваранскага роду Сеўрукаў з унясеннем у 6-ю частку радаводнай кнігі дваран Мінскай губерні[724]. Зацверджаны ўказам Сената ад 31.01.1900 г., № 212.

640/540 **Матфей,** нарадзіўся 03.08.1887 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у вёсцы Пузічы Мазырскага павета на арэнднай зямлі[725].

641/540 **Міхаіл,** ахрышчаны 23.07.1889 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у вёсцы Пузічы Мазырскага павета на арэнднай зямлі[726].

642/540 **Марыя,** *1884 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыла ў вёсцы Пузічы Мазырскага павета на арэнднай зямлі[727].

643/550 **Уладзімір.**

644/550 **Леанід.**

XII КАЛЕНА

645/589 **Іпаліт,** *1892 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Кутнева на зямлі княгіні Гагенлоэ[728].

646/590 **Фёдар,** нарадзіўся 08.02.1886 г. Пісьменны. Па сямейным спісе дваран 2-га разраду 1893 г., не далучаных да роду, разам з маці і сёстрамі жыў у засценку Кутнева на арэнднай зямлі княгіні Гагенлоэ[729], а па сямейным спісе дваран Слуцкага павета ад 11.01.1913 г. – у тым жа засценку Кутнева на ўласнай зямлі (12 і 1/2 дзесяціны)[730]. Зацверджаны ў дваранстве 09.02.1912 г.

Жонка – Вольга Лукіна Вечар, *1890 г. н.

647/590 **Ганна,** нарадзілася 08.09.1879 г. Па сямейным спісе дваран 2-га разраду 1893 г., не далучаных да роду, разам з маці, братам Фёдарам і сястрой жыла ў засценку Кутнева на арэнднай зямлі княгіні Гагенлоэ[731].

648/590 **Анастасія,** нарадзілася 22.12.1882 г. Па сямейным спісе дваран 2-га разраду 1893 г., не далучаных да роду, разам з маці, братам Фёдарам і сястрой жыла ў засценку Кутнева на арэнднай зямлі княгіні Гагенлоэ[732].

649/591 **Міхаіл.**

650/591 **Сцяпан.**

651/595 **Аляксандр,** нарадзіўся 30.08.1884 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Кутнева на зямлі дзеда (12 дзесяцін)[733].

652/595 **Еўдакія,** нарадзілася 17.08.1886 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыла ў засценку Кутнева на зямлі дзеда (12 дзесяцін)[734].

653/595 **Матрона,** *1890 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыла ў засценку Кутнева на дзедавай зямлі (12 дзесяцін)[735].

654/618 **Сямён,** *1891 г. н. Па сямейным спісе дваран 2-га разраду 1893 г., не далучаных да роду, разам з маці жыў у засценку Кутнева на арэнднай зямлі княгіні Гагенлоэ[736].

655/626 **Іосіф,** нарадзіўся 15.01.1877 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у фальварку Гара на арэнднай зямлі[737]. Атрымаў пасведчанне № 18 Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 29.01.1883 г. аб далучэнні да дваранскага роду Сеўрукаў.

656/626 **Ямілія,** *1875 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыла ў фальварку Гара на арэнднай зямлі[738].

XIII КАЛЕНА

657/646 **Марыя,** *1909 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета ад 11.01.1913 г., жыла ў засценку Кутнева на бацькавай зямлі (12 і 1/2 дзесяціны)[739].

Кернажыцкія герба «Юноша» і Маствіловічы герба «Даленга»







Герб «Юноша» роду Кернажыцкіх.

У XVIII ст. род Забэлаў парадніўся са шляхецкім родам Кернажыцкіх, прадстаўнікі якога праславіліся як на палях бітваў, так і ў мірных справах. Мой продак Казімір Пятровіч Забэла абвянчаўся з Кацярынай, дачкою рэчыцкага чашніка Валяр'яна Кернажыцкага, чалавека вядомага і паважанага. Пра заслугі роду Кернажыцкіх гаворыцца ў прашэнні дваraніна Барысаўскага павета асэсара Тадэвуша-Яна Янава ў Мінскі дваранскі дэпутацкі сход ад 20 кастрычніка 1832 г.

«Дом Керножицких, перейдя с Короны в Литву, в том княжестве польском от непамятных времен оселясь, дворянским достоинством приличным сословию своему, похвальными своими деяниями и заслугами в помещичьем обществе защищался у престола королей польских, был известен земскими имениями в разных воеводствах лежащими, правом вотчинным приобретенными. Где и поднесь, в том же самом достоянии не престал быть. Наследники, приобрев огромные имения при столь личном размножении своей фамилии заедва посредством неутомимых своих трудов и старательств в достоинстве своем в небольших имениях удерживались».

Продкам Кернажыцкіх належаў спачатку герб «Астоя», затым яны атрымалі герб «Юноша». Чаму так адбылося, невядома: дакументаў не захавалася. Бярэ пачатак гэты герб з Германіі. Згодна з легендай, рыцар па імені Юноша, што ў перакладзе з нямецкай мовы азначае «малады баран», лоўка абхітрыў непрыяцеля. Прыкінуўшыся пастухом, ён загнаў варожы табун коней на пашу, якая знаходзілася вельмі далёка. Гэта дало магчымасць хутка расправіцца з пешымі ворагамі. Пра подзвіг рыцара стала вядома каралю, і той надаў яму названы герб.



Герб «Даленга» роду Маствіловічаў.

На шчыце герба ў чырвоным полі – выява белага барана з рогамі, у правы бок звернутага, на баках таго барана відаць кроў; у шлеме, па-шляхецку каранаваным, пяць страусавых пёраў.


Пра заснавальніка роду Івана Мікіціча Кернажыцкага захавалася няшмат звестак з-за «древности времени и пришествия книг в совершенную ветхость». Аднак дакладна вядома, што ён «владел имениями прилично дворянскому званию».

Сын Івана Ленард, ці Ленарт, быў палкоўнікам войска польскага, што пацвярджае прывілей караля Жыгімонта III Вазы ад 6 мая 1591 г. З дакумента вынікае, што за ваенныя подзвігі ў якасці ўзнагароды Ленарту і яго нашчадкам перададзены «двор Кернажыцы з 50 дварамі сялян у Навагрудскім ваяводстве».

Ленарт ажаніўся з Раінай Іванаўнай Маствіловіч, падчашанкай троцкай, якая прынесла яму ў пасаг частку маёнтка Усы. Праз некаторы час гэты маёнтак разам з урадлівымі землямі і млынам цалкам перайшоў у валоданне Кернажыцкіх.

Раіна паходзіла са шляхецкага роду, вядомага ў ВКЛ яшчэ з XIV ст. І не выпадкова, што, калі ў адпаведнасці з Гарадзельскай уніяй 1413 г. 48 родаў каталіцкага паходжання ВКЛ былі надзелены ўласнымі гербамі, сярод іх быў і продак Раіны Маствіл – сын Жадзейкі.

Род Маствіловічаў, меўшы жамойцкае паходжанне, атрымаў герб «Даленга».


Wawrziniec Kirnożycki.
ręką własną

Рэестр спісання валок сяла Любанскага (уваходзіла ў маёнтак Лахва), складзены Ваўжынцам Кернажыцкім пры падачы сяла пану Мікалаю Турчыну. 26.06.1589 г. Подпіс В. Кернажыцкага (па-польску). *НГАБ, ф. 694, воп. 2, спр. 4186, арк. 2–5 адв.*

Па гарадзельскім прывілеі кароль польскі Ягайла і вялікі князь літоўскі Вітаўт павінны былі прызначаць на дзяржаўныя пасады толькі шляхцічаў-каталікоў, якія мелі гербы.

У Маствіла было пяць унукаў, двое з якіх, Іван і Станіслаў Багданавічы, засталіся на Жамойцкай зямлі, а Мікалай, Андрэй і Габрыэль Багданавічы пасяліліся ў Ашмянскім павеце і валодалі маёнткамі Ашмянскім, Уса, Амлішава.

Адзін з братоў, Мікалай Багданавіч, не меў нашчадкаў і частку маёмасці, што яму належала па тастаменце 1525 г., перадаў пляменніку Івану Андрэевічу. Менавіта з-за гэтай маёмасці паміж дваюраднымі братамі Іванам Габрыэлевічам і Янам Андрэевічам Маствіловічамі некалькі гадоў ішла цяжба, якая скончылася для апошняга трагічна.

У метрыках ВКЛ захаваліся дакументы шматлікіх судовых разбораў па гэтай справе. Зямянін Віленскага павета Юрый Хршчановіч Дакурновіч разам з удавой свайго дваюраднага брата Яна Андрэевіча Маствіловіча Зафеяй 15 студзеня 1541 г. падалі прашэнне да «пана віленскага», дзе гаварылася пра забойства Яна Маствіловіча Васькам Чорным, намеснікам доўнараўскім, пры ўдзеле Шчаснага Мажэйкавіча.

Сутнасць справы ў тым, што Васька Чорны разам са сваімі памочнікамі і дваранінам гаспадарскім Шчасным Мажэйкавічам прыехаў у маёнтак Амлішава да Яна Андрэевіча Маствіловіча, дзе, як сведчыць Дакурновіч, Васька двума стрэламі (адным – у руку, а другім – у нагу) параніў Яна, «не маючы к нему жадное потребы». Яны забралі шмат чаго з маёнтка – «...п(е)н(е)зей, серебра, шатъ, цыну, котловъ, коней, стадо свирепъ и инъшых всякихъ домовыхъ статъковъ», а самога Яна схапілі, пасадзілі ў клетку і ў ланцугах павезлі ў Вільню. Па дарозе забілі, і каля Краснага Сяла цела ўтапілі ў рацэ, дзе яго выпадкова знайшлі пастухі.



Подпіс і пячатка Альбрыхта Радзівіла пад лістом Ваўжынцу Кернажыцкаму, гарадзецкаму намесніку і рэвізору князя Радзівіла. Гарадок (Давыд-Гарадок). 02.[05].1578 г. *НГАБ, ф. 694, воп. 4, спр. 1270, арк. 20–20 адв.*

Юрый Дакурновіч і ўдава Яна Маствіловіча Зафея прасілі «пана віленскага» Марка Лубніцкага пакараць забойцу, але той вырашыў на пэўны час справу адкласці і абавязаў зрабіць заклад на тры тысячы коп грошаў.


Праз два месяцы, 15 сакавіка 1541 г., у Вільні вярнуліся да разгляду гэтай складанай справы. Да таго часу не стала і ўдавы Яна Маствіловіча. Яго дваюрадны брат, Юрый Хршчановіч Дакурновіч, які стаў апекуном над дзецьмі Зафеі і Івана Маствіловічаў, падаў скаргу на Ганну Мацееўну Кандратовіч, чый муж, Іван Габрыэлевіч Маствіловіч, як сведчыцца ў дакуменце, «замордоваль дядковича своего Яна Анъдреевича Мостվиловича». Са скаргі вынікае, што пасля забойства Яна Андрэевіча Маствіловіча зніклі дакументы, і, скарыстаўшыся гэтым, Ганна, жонка Івана Габрыэлевіча, заняла маёнтак Уса. Ганна сцвярджала, што мае на гэта права, паколькі яе муж раней перадаў дваюраднаму брату Яну Андрэевічу 200 коп грошаў, якія Ганна прынесла ў пасаг.

З іншага боку, Юрый Хршчановіч паведаміў, што муж Ганны свой маёнтак Усу выменяў у Яна Андрэевіча на маёнтак у Валожыне, таму Ганна на Усу не мае правоў.

Справу слухалі князь Венцлаў, біскуп жамойцкі, пан Ян Юр'евіч Глебавіч, ваявода полацкі, пан Мацей Вайцяховіч [Янавіча], ваявода віцебскі, пан Шымко Мацковіч, цівун і гараднічы віленскі. Па прычыне новых абставін справа зноў была адкладзена.

Наступнае слуханне адбылося 24 кастрычніка 1542 г. На гэты раз стала вядома, што забойства Яна Андрэевіча Маствіловіча Васька Чорны ўчыніў не адзін, а па змове з дзецкім Шчасным Мажэйкавічам і Іванам Габрыэлевічам Маствіловічам.





Подпіс і пячатка-кустодыя Юрыя Кернажыцкага, продка Анатоля Статкевіча-Чабаганава, пад лістом пасагу Раіне Станіславаўне Грабенскай. Грэбень. 14.06.1604 г. (гл. «Кернажыцкія» 7/3). *НГАБ, ф. 694, воп. 4, спр. 6029, арк. 425–425 адв.*



Пячатка-кустодыя Андрэя Іванавіча Маствіловіча з яго тастамента. 19.01.1568 г.


Жонка Івана Габрыэлевіча Ганна, выгароджваючы мужа, усю віну за забойства ўскладвала на іншых: «На жалобу отпираючи, мовила: "В листе короля, ег(о) м(и)л(о)сти, описано, иж тот Щасный, будучи децкимъ по нег(о) посланымъ, ег(о) забил, которого он, поимавши до везенья осадити далъ, а потомъ, снать зъгодивши ся с ним, з везенья его выпустил, а теперъ на мужа моего жалуеть"».

Юрый Дакурновіч падрабязна сведчыў, што Іван Габрыэлевіч са Шчасным Мажэйкавічам пры падтрымцы дваццаці пяці татарскіх коннікаў, накіраваных віленскім панам, нечакана напалі на маёнтак Ашмянскі, дзе Яна Маствіловіча не знайшлі. Засталі толькі яго нявестку і дзяцей, якіх абрабавалі і выгналі з маёнтка. Затым паехалі да Усы, другога маёнтка брата. Яна Андрэевіча і там не было, а «тое именье со всими людьми и тежъ со всими маетъностями, што – колвекъ у клетехъ, у свинехъ схованья было, они позабирали, ку тому тежъ челядь и кони, и быдло ку своей моцы побрали и, бывъши в томъ именьи, на Усе, и взявши тое именье ку своеи моцы, и ехалъ с тымъ же Щаснымъ Можейковичомъ а з намесникомъ пана виленъского(о) дайнаровскимъ, зВаскомъ Чорънымъ, и с помочники своими до третего именья того жъ брата моего, до Омълишова».

Яна Андрэевіча знайшлі толькі ў трэцім маёнтку – у Амлішаве. Там і здарылася тая трагедыя. Праз некалькі гадоў судовых разбораў у забойстве Яна Андрэевіча

Маствіловіча быў абвінавачаны Шчасны Мажэйкавіч, «за которое вбоиство, кгды деи в казнь былъ осажонъ, онъ деистое казни втекъшы, побегъ былъ на Москву и на границы былъ поиманъ, а потомъ за то за все горлом скаранъ».

Чытаючы пра гэта праз некалькі стагоддзяў, цяжка адназначна сцвярджаць, хто быў вінаваты ў тым, што здарылася. Застаецца толькі шкадаваць, што родзічы так і не змаглі дамовіцца паміж сабою і варожасць прывяла да трагедыі...



Подпіс Габрыэля Кернажыцкага, продка Анатоля Статкевіча-Чабаганава, пад лістом зямяніна Навагрудскага ваяводства Аляксандра Волка (гл. «Кернажыцкія» 12/7). Цэпра. 18.04.1653 г. *НГАБ, ф. 694, воп. 4, спр. 1808, арк. 27–27 адв.*

Але вернемся да дзяцей Яна Андрэевіча Маствіловіча. Раіна, Андрэй, Рожа і Ганна выхоўваліся пад апекай дваюраднага дзядзькі Юрыя Хршчановіча Дакурновіча. Іх лёсы склаліся ўдала. Пасталеўшы, яны парадніліся з прадстаўнікамі вядомых у той час родаў. Андрэй Маствіловіч ажаніўся з Анастасіяй Войнай. Рожа выйшла замуж за Гаўрыіла Зябку, Ганна – за Юрыя Копаця, Раіна, як ужо згадвалася, стала жонкай палкоўніка польскіх войскаў Ленарта Кернажыцкага.

У Ленарта з Раінай было тры сыны: Іван, Юрый і Ілья. Пра Ілью і Івана звестак захавалася вельмі мала, пра Юрыя ёсць некалькі архіўных дакументаў. Ён браў шлюб з Варварай Іванаўнай Кавецкай і, валодаючы маёнткамі ў Навагрудскім павеце, прырошчваў да іх землі, пра што сведчаць здзелкі з Пятром Русанам у лютым і маі 1598 г. на зямлю з пабудовамі ў маёнтку Мажэйкаўшчызна.

20 чэрвеня 1601 г. Кернажыцкі атрымлівае «вечисто продажное право» на пяць валок зямлі ў той жа Мажэйкаўшчызне, а 13 верасня 1603 г. у яго карысць пераходзіць маёнтак Дарагавіца.

Юрый Ленартавіч і Варвара Іванаўна мелі чатырох сыноў. Вядома, што адзін з іх, Сігізмунд, служыў у польскіх войсках харунжым (гэта пацвярджаецца выпісам з прывілея караля польскага Уладзіслава IV Вазы ад 25 верасня 1637 г.), акрамя таго, ён быў харунжым пяцігорскім і чашнікам рэчыцкім. Сігізмунд Кернажыцкі купіў 9 студзеня 1660 г. у Багуслава Ляшчынскага маёнтак Ратамка.



Адам Іванавіч Кернажыцкі. Краншат. 1919 г.

Вядомым чалавекам быў і брат Сігізмунда Гаўрыіл, капітан польскіх войскаў, уладальнік вотчыннага маёнтка Дарагавіца пад Навагрудкам і маёнтка Уса ў Мінскім ваяводстве.

Сыны Гаўрыіла і Сігізмунда – Валяр'ян Гаўрыілавіч і Геранім-Міхаіл Сігізмундавіч – сталі рэчыцкімі чашнікамі. Яны вылучаліся польскімі каралямі і атрымлівалі ўзнагароды, «у пацвярджэнне чаго прадстаўляецца 1669 года прывілей караля Міхаіла на чын чашніка гаспадзіну Валерыяну Кернажыцкаму за заслугі нададзены».

У Валяр'яна нарадзіліся сыны Аляксандр і двухіменны Іван-Антон. Аляксандр стаў стольнікам драгічынскім, а Іван-Антон – чашнікам рэчыцкім. Гэта было ўжо пятае калена роду Кернажыцкіх. Для нас яно цікавае тым, што ў Валяр'яна, акрамя сыноў, была дачка Кацярына, якая стала ў будучым, як ужо адзначалася, жонкай Казіміра Пятровіча Забэлы.

Кацярына была прыхаджанкай Капыльскага касцёла, і звесткі пра яе мы знаходзім у метрычных кнігах гэтага храма, якія добра захаваліся. З іх даведваемся, што Кацярына жыла разам з бацькамі і родзічамі ў засценку Дарагавічы, за некалькі кіламетраў ад маёнтка Крывое Сяло, які з даўніх часоў належаў прадстаўнікам роду Забэлаў. У Казіміра і Кацярыны было чацвёра сыноў. У 1704 г. нарадзіўся Аляксандр-Хрызастом, у 1706 г. – Канстанцін, у 1708 г. – Уладзіслаў-Валяр'ян, мой продак, і ў 1710 г. – Людовік-Антоній. Сярод іх хросных бацькоў узгадваецца Ефрасіння Кернажыцкая.



ЛИЧНАЯ КНИЖКА ЗАПАСНОГО
КРАСНОФЛОТЦА.

Асабовая кніжка запаснога чырванафлотца Адама Іванавіча Кернажыцкага (гл. «Кернажыцкія» 245/128).

Захаваліся цікавыя звесткі пра нашчадкаў рэчыцкага чашніка Гераніма-Міхаіла Сігізмундавіча Кернажыцкага, жонкай якога была Ганна Гейштар. Амаль праз дзвесце гадоў дзве галіны яго нашчадкаў, прыняўшы да таго часу праваслаўе, перабраліся пад Слуцк, дзе жылі ў засценках Балотчыцы, Гарохаўка, Альшанка, Язвіла...

Прадстаўнікі гэтых дзвюх галін роду – Стэфанія Сцяпанаўна Кернажыцкая і Іван Грыгор'евіч Кернажыцкі – як часам здаралася паміж далёкімі родзічамі, ажаніліся. Гэта быў другі шлюб Івана Грыгор'евіча, ад якога нарадзілася трое дзяцей: Адам, Міхаіл і Дар'я. (Ад першага шлюбу, з Таццянай Сямёнаўнай Кернажыцкай, было чацвёра дзяцей.)

Вядома, як склаўся лёс Адама, старэйшага сына Івана і Стэфаніі Кернажыцкіх. Ён працаваў сельскім хатнім настаўнікам. У час Першай сусветнай вайны служыў на Балтыйскім флоце. У 1916 г. закончыў курсы ў электратэхнічным батальёне Петраграда і быў камандзіраваны ў штаб Галоўнага камандавання Паўночнай Арміі фронту. Пасля дэмабілізацыі вярнуўся ў родныя Балотчыцы. Ажаніўся з Марыяй Іосіфаўнай Малевіч.

Сын Адама і Марыі Валянцін да Вялікай Айчыннай вайны вучыўся ў Слуцкім педвучылішчы ў адзін час з маёй мамай Аляксандрай Міхайлаўнай Статкевіч. У час вайны пайшоў на фронт. Вярнуўся ў званні капітана з баявымі ўзнагародамі – ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны і Славы III ступені, медалямі "За адвагу", "За ўзяцце Варшавы". У мірны час выкладаў матэматыку, стаў заслужаным настаўнікам. Працаваў дырэктарам школы, затым дырэктарам дзіцячага дома.



Валянцін Адамавіч Кернажыцкі. Свярдлоўск. 13.07.1947 г. (гл. «Кернажыцкія» 338/245).



Вольга Несцераўна Кернажыцкая (Барташэвіч; гл. «Кернажыцкія» 338/245).



Іван Іванавіч Папылёў. 1950-я гг.
(гл. «Кернажыцкія» 244/128).



Валянціна Папылёва (Кернажыцкая).
1950-я гг. (гл. «Кернажыцкія» 244/128).

Пляменніца Адама Валянціна, дачка яго сястры Дар'і, была замужам за контр-адміралам Ваенна-марскога флоту СССР Іванам Іванавічам Папылёвым, чалавекам гераічнага лёсу, выдатным ваенным спецыялістам і камандзірам, які зрабіў значны ўнёсак у развіццё падводнага флоту і ў агульную перамогу над фашысцкай Германіяй.

Валянціна Аляксандраўна Папылёва і яе дачка, Ала Іванаўна Грыгор'ева, захавалі для нашчадкаў рукапісы, што ляглі ў аснову кнігі "Из Полярного во Владивосток", выдадзенай у Санкт-Пецярбургу ў 2007 г., пра якую неабходна сказаць колькі слоў.

У кнізе апублікаваны дзённік Івана Іванавіча Папылёва, дзе гаворыцца пра незвычайна складаны паход у час вайны савецкіх падводных лодак з Каспійскага ў Баранцава мора, а таксама пра паход падводных лодак у Англію па водах, усеяных мінамі. Старонкі гэтай кнігі з'яўляюцца гістарычным дакументам...



Анатоль Статкевіч-Чабаганаў
і Аляксандр Кернажыцкі. Сёмкава, Мінскі раён.
2008 г. (гл. «Кернажыцкія» 392/338).

Вяртаючыся да гісторыі роду Кернажыцкіх, варта адзначыць, што ў XIX ст. Сенат зацвердзіў прадстаўнікоў гэтага вядомага роду ў старажытнай дваранскай годнасці з унясеннем у 6-ю частку дваранскай радаводнай кнігі. У той час у іх ужо не было вялікіх маёнткаў Уса, Ратамка, Кернажыцы, але быў «неутомимый труд и старания в достоинстве своем».

На схеме дваранскага роду Кернажыцкіх герба «Юноша» за 1856 г. запісаны 94 прадстаўнікі роду ў 10 пакаленнях.

РАДАВОДНЫЯ РОСПІСЫ

Род Кернажыцкіх герба «Астоя», пазней «Юноша», прызнаны ў дваранстве вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 22.12.1802 г. Зацверджаны ўказам Сената ад 15.12.1855 г., № 1707.

I КАЛЕНА

1 **Мікіта.**

II КАЛЕНА

2/1 **Ян (Іван).**

III КАЛЕНА

3/2 **Ленарт (Леанард) Янавіч Мікіціч,** каралеўскі зямянін Навагрудскага павета. Разам з братамі і іх маёнткам Керножычы быў далучаны 08.01.1568 г. пад харугву і падсуднасць Навагрудскага павета:

«Жикгимонт Августъ

Ознаймуемъ симъ листомъ нашимъ. Поведил перед нами земенинъ нашъ Ленартъ Яновичъ Микитича, ижъ которое дей именье, лежачое у волости замъку н(а)шого Ляховицъкого, Керножичи онъ з братьею своею Анъдреемъ а Станиславомъ Микитичами здавна отъ продковъ своихъ держать. Ино дей державъца ляховицъкий Володимер Заболоцъкий, держачи отъ нас замокъ Ляховичи, ихъ самыхъ с тымъ именемъ помененымъ под присуд замъку Ляховицъкого приворочаеть и з собою на служъбу земскую военъную ездити примушаеть, а они дей завжды сполокъ з ынъшою шляхтою повету Новгородского служъбу земъскую военъную служать. И били намъ чоломъ, абыхъмо ласку нашу г(оспо)д(а)ръскую вчинили, а ихъ по тому яко и инъшихъ некоторыхъ земянъ, которые у волости замъку нашого Ляховицъкого именья свои мели, при всяких волностяхъ заховавъши, с тымъ именьемъ ихъ верху помененымъ Керножичами подъ хоругов и присуд земъский и кгродский повету Новгородского прилучили, яко жъ и воевода браславъский, староста житомирский княз Романъ Санъкгушковичъ у причине нас за тымъ Ленартомъ Микитичомъ жедаючи, служъбы, по которые онъ з ынъшим рицерствомъ нашимъ под справою его в служъбе жолнерской будучи, противъко войскамъ неприятелскимъ великого кн(я)зя московъского оказывал, намъ, г(о)с(по)д(а)ру, залецал. А такъ мы, г(о)с(по)д(а)ръ, яко есмо не звыкли никому подданымъ нашимъ волностей и свобод шляхетскихъ умнейшати, такъ и тепер за чоломъ битьемъ того Мартина* Яновича Микитича и брати его, маючи ласкавый взгляд на служъбы его, которые онъ будучи на служъбе жолнерской противко войскамъ неприятеля нашого кн(я)зя великого московъского оказывал, делаючи ему в томъ ласку нашу г(о)с(по)д(а)ръскую оного Ленарта самого з братею его рожоною Анъдреемъ а Станиславомъ Микитичами с тымъ именьемъ ихъ, у волости замъку нашого Ляховицъкого лежачимъ,

* Памылка ў тэксце, трэба – *Ленарта*.



По описи утвержденныхъ дѣлъ № 55

ДѢЛО

Минскаго Дворянскаго Депутатскаго Собранія

о дворянскомъ происхожденіи

рода Керножицкихъ

Первоначальныя опредѣленія Депут. Собранія

Декабря 22 дня [illegible] года

Указъ Правительствующаго Сената объ утвержденіи

отъ 15 Декабря 1855 года, за № 1707

томъ I

Справа Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу аб дваранскім паходжанні роду Кернажыцкіх. *НГАБ, ф. 319, воп. 2, спр. 1386.*

Керножичами и зо всими кгрунъты, которыхъ они якимъ колвекъ правомъ до оного именья набыли и што потомъ набыти могуть, от присуду и владности всякое отъ враду нашого Ляховицького ихъ самых и потомъковъ ихъ на вечные часы выймуемъ, а под хоругов, владность, присуд и уживанье всякихъ свобод и волностей шляхетскихъ повету Новгородского прилучаемъ. Мают они сами, жоны, дети и потомъки ихъ з онымъ именьемъ впрод речонымъ Керножичами, зо всими кгрунъты, ку тому именью набылыми и што еще тамъ ку тому именью на потомъ прибавити и розширити могли, с присуду и всякое владности державецъ ляховицъкихъ *волни будучи, под присудомъ суду земъского и кгродского** в повете Новгородскомъ быти и службу земъскую под хоруговю новгородскою восполокъ з ынъшою шляхтою повету Новгородского водлугъ уфалы земъское служити, уживаючи волностей, правъ и свобод всякихъ по тому, яко и инъшие обыватели стану шляхетского в паньстве нашомъ Великомъ Князстве Литовъскомъ и в томъ повете Новгородскомъ уживають. А державъца теперешний ляховицъкий и на потомъ будучий ихъ самыхъ, детей и потомъковъ ихъ ку жадной владности державы и присуду ляховицъкого притегати и никоторое трудности задавати не мають. И хотя бы потомъ замокъ нашъ Ляховицъкий отъ столу нашог(о) за даниною нашою або потомъковъ нашихъ кому отъшол, тогды преречоный Ленартъ Микитичъ и братья его Анъдрей а Станиславъ Микитичи и потомъки ихъ во всякихъ волностяхъ и свободахъ з ынъшою шляхътою повету Новгородского захованы быти мають по тому, яко и инъшая шляхта рыцерство наше Великого Князства Литовъского, служачи службу земъскую военъную никому инъшому, одно намъ, г(о)с(по)д(а)ру, потомъкомъ нашимъ и Речи Посполитое того паньства, захованы суть, и на вси часы вечные с примноженьемъ волностей и свобод шляхетскихъ от нас, г(о)с(по)д(а)ра, и потомъковъ нашихъ захованы будуть. И на то есмо Ленарту, Анъдрею а Станиславу Микитичомъ дали сес нашъ листъ, до которого на твердость того и печать нашу привесити казали. Писанъ в Койданове, Лет(а) Божъего нароженья тисеча пятсотъ шестдесят осмого, м(е)с(я)ца генъвара осмого дня»[1].


Палкоўнік польскіх войскаў. Ва ўзнагароду за ваенныя заслугі яму і яго нашчадкам польскі кароль Жыгімонт III Ваза 06.05.1591 г. падараваў маёнтак Керножыцы з 50 сялянскімі дварамі ў Навагрудскім ваяводстве. Удзельнічаў у вайне з Маскоўскай дзяржавай пад кіраўніцтвам князя Сангушкі.

Жонка – **Раіна Янаўна Маствіловіч,** троцкая падчашанка, дачка Івана Андрэевіча і Зафеі Маствіловічаў (гл. «Маствіловічы» 32/21). У дакументах, пададзеных у Мінскі дваранскі дэпутацкі сход патомкамі Леанарда Кернажыцкага, яго жонкай памылкова названа Ганна, сястра Раіны Янаўны Маствіловіч[2]. Яе брат Андрэй Янавіч Маствіл у пасаг даў частку маёнтка Уса, які сам атрымаў 13.08.1558 г. у пасаг па сваёй жонцы Настассі Войне Грычыновіч: «...сестре свои рожоные две, Рожу а Раину, за добрих людеи в малженство светое посагомъ слушнымъ подлуг важности тых име199ничок моих выправил, и именича моего Усы тою ж маетностю жоны моее есми дошол...»[3]

Ленарт Янавіч разам з жонкай Раінай Янаўнай Маствілавай, яе сёстрамі і іх мужамі 06.10.1568 г. заключыў пагадненне з жонкай іх брата Настассяй Андрэевай Маствілавай: «...земяне г(о)с(по)д(а)ра короля его м(и)л(о)сти повету Новъгородского Ленартъ Янович зъ жоною своею Раиною Мостъвиловъною, а Юръи Копоть зъ жоною своею Ганъною

* Фраза, пазначаная курсівам, прапушчана ў тэксце арыгінала, вынесена ў зноску пад тэкстам.

Яновъною Мостволовъною, а с ними восполокъ сестра третея Раинина и Ганънина, земянъка повету Пиньского Гавриловая Зябъчиная Рожа Яновъна Мостволовъна жъ, в небытъности мужа своего Гаврила за зупольнымъ порученьемъ Ленарту Яновичу и той Рожи отъ мужа ее на листе даном, вси очевисте и одностайне перед нами и до книгъ земъскихъ оповедали и властъными усты своими то сознали, што были Ленартъ зъ жоною своею Раиною, а Гаврило Зябъка зъ жоною своею Рожою земянъку повету Новъгородского, а жону рожоного брата своего Ганъниного, Раининого и Рожина Анъдреевую Мостволовую панюю Настасю Войновъную именья Менидиковичи в повете Новъгородскомъ, а Усу в повете Меньскомъ, а Ошмену в повете Ошменьскомъ лежачие, што пани Анъдреевая Мостволовая по смерти мужа своего пана Анъдрея Мостволa державала, такъже и гроши готовые, золото, серебро, мед, цыну, перла, шаты, клейноты, стада, быдла и о инъшие речи рухомые, которые впродречоные сестры небожчика Андрея Мостволa по смерти мужа ее, а брата своего, при ей, невестце своей зосталые, быти меновали… Ганъна Юревая Коптевая, Реина Ленартовая а Рожа Гавриловая з мужами своими за слушъные и во всем за досконале моцъные записы невестъки своее паней Анъдреевое Мостволовое обачивъши и признавъши, а не хотечи ся далей противъ записовъ слушъныхъ в право вдавати, то ижъ водле записовъ и тестаменъту небожъчика малъжонъка своего пани Анъдреевая Мостволовая третюю часть именей Менидиковичъ и Усы на вечность, а две части в шестисотъ копахъ грошей долъгу ее властъного, а в сту тридцати семи копахъ грошей тыхъ долъговъ, которые по смерти своей с тыхъ же двохъ частей именей заплатити тестаменътом своимъ малъжонокъ ее злетилъ, слушъне записаные маеть. Тогды они в тыхъ именьяхъ розделеньемъ третее части отъ двохъ частей по розну розривати не хотечи, а семисотъ тридцати семи копъ грошей, на двохъ частехъ именей записаное, платити чимъ не маючи, на томъ ся з вынайденья приятелей своихъ, з обу сторонъ на то обраныхъ, приятелский згодили и на вечъные ч(а)сы постановили, ижъ невестъка ихъ пани Анъдреевая Мостволовая Настася Войновъна тымъ вышей менованымъ сестрамъ небожъчика малъжонъка своего Анъдрея Мостволa Ганъне Юревой Коптевой, а Рожи Гавриловой Зябъчиной и Раине Ленартовой именья Усы, в повете Меньскомъ лежачого, з будованьемъ и пашнею дворною… з бояры путъными, людми тяглыми и с паробъками невольными… а к тому в Ошмене ч(е)л(о)в(е)ковъ три, а пустовъщинъ две в повете Ошменскомъ лежачихъ, зо всимъ на все, якъ ся тое именье Уса и именьице ув Ошмене само в себе маеть, кромъ жадного отъдаванья сумы п(е)н(е)зей, на вечъность поступила и зо всего права, которое бы колвекъ на оное именье Усу и менейце Ошмену в себе мела, за разомъ сама передурадомъ земъскимъ повету Новъгородского при бытъности всихъ, в семъ листе описаныхъ, вечъне вырекла, и к тому долъгу малъжонъка своего, который на именьицу Ошменьскомъ ротмистръ его королевъское м(и)л(о)сти панъ Григорей Война, братъ ее, сорокъ копъ грошей мелъ, сама платити обовезала ся, и еще сестрамъ небожъчика малъжонъка своего Ганъне, Рожи и Раине некоторую суму певную готовыхъ п(е)н(е)зей своихъ дала и перед урадомъ земъскимъ повету Новъгородского заплатила, и вже ся пани Настася Войновъна в тые именья помененые вступовати не маеть вечъными ч(а)сы под заруками на г(о)с(по)д(а)ра короля его м(и)л(о)сти тисечъю копъ грошей, а на сестры небожъчика мужа своего Анъдрея Мостволa другую тисечу копъ грошей, а зяти тежъ пана Анъдрея Мостволa з малъжонъками своими, а сестрами небожъчиковъскими, то естъ Гаврило Зябъка зъ




Рэестр спісання валок сяла Любанскага, якое ўваходзіла ў маёнтак Лахва, складзены Ваўжынцам Кернажыцкім пры падачы сяла пану Мікалаю Турчыну. 26.06.1589 г. Подпісы В. Кернажыцкага (па-польску) і М. Турчына (па-руску; на 2 старонках). *НГАБ, ф. 694, воп. 2, спр. 4186, арк. 2–5 адв.*


58

Temu siołu błota odmierzono, zjednego Boku
wedle sciany Jeziernickiey y Lachowieckiey . . .
Z drugiego Boku wedle sciany Lubaczynskiey.
Tey sstuky wszerz nad przypiecią od sciany do
sciany sznurow .30. Trzydziescie Ten Regestr
przyslicie w wiązczy moim Wawrzinca Kirnozyckiego
panu Turczynowi pod moią pieczęcią y y podpisem
ręki moiey iest Dan Dnia 26 Junij 1589


Wawrziniec Kirnozycki.
ręką własną





Ліст зямяніна Навагрудскага ваяводства Аляксандра Волка аб арэндзе на 3 гады маёнтка Цэпра Лаўрынаўская Далматоўшчына Клецкага прысуда Навагрудскага ваяводства яўрэю Гошку Якубовічу і яго жонцы Роўзе Лазараўне, арандатарам Цэперскай карчмы падчашага ВКЛ князя Міхала Караля Радзівіла, за 1500 злотых польскіх. Цэпра (на 2 старонках; польская мова).
НГАБ, ф. 694, воп. 4, спр. 1808, арк. 27–27 адв.


Alexander Wolk
ręką własną


Ліст гаспадарскіх зямян Навагрудскага і мінскага ваяводстваў Аўдоцці Рагазянкі Станіслававай Мацясевіча-Грабенскай і яе сыноў Мікалая і Войцэха аб запісе ў пасаг яе дачцэ Раіне (муж – Грыгорый Пятровіч Русіян) часткі бацькоўскага маёнтка Душава Навагрудскага ваяводства (на 2 старонках; польская мова). Грэбень. 14.06.1604 г. Пячаткі на кустодыі і подпісы істцоў і сведкаў, сярод якіх – Юрый Кернажыцкі.
НГАБ, ф. 694, воп. 4, спр. 6029, арк. 425–425 адв.









Ліст надворнага маршалка ВКЛ Мікалая Крыштафа Радзівіла, які пацвярджае яго гарадзецкаму зямяніну Панцялею Ворану Люберскаму квіт Ваўжынца Кернажыцкага, гарадзецкага намесніка князя Радзівіла, на астравок Муравін. Вільна (польская мова). 15.06.1576 г. *НГАБ, ф .694, воп. 4, спр. 1270, арк. 18.*



Ліст Альбрыхта Радзівіла на пацвярджэнне яго гарадзецкаму зямяніну Панцялею Ворану Люберскаму ліста свайго брата Мікалая Крыштафа Радзівіла (гл. папярэдні ліст). Гарадок (Давыд-Гарадок). 02.05.1578 г. У тэксце дакумента згадваецца квіт гарадзецкага намесніка Ваўжынца Кернажыцкага. *НГАБ, ф. 694, воп. 4, спр. 1270, арк. 19.*



Ліст Альбрыхта Радзівіла, які пацвярджае яго гарадзецкаму зямяніну Панцялею Ворану Люберскаму квіт Ваўжынца Кернажыцкага, гарадзецкага намесніка і рэвізора князя Радзівіла, і генеральнага рэвізора Ераніма Макавецкага на замену яго зямель гарадзецкімі землямі. Гарадок (Давыд-Гарадок). 02.[05].1578 г. (на 2 старонках). *НГАБ, ф. 694, воп. 4, спр. 1270, арк. 20–20 адв.*


428

Выпіс з кніг Трыбунала ВКЛ у Мінску актыкацыі папярэдняга дакумента. Мінск. 14.10.1605 г. (на 3 старонках). *НГАБ, ф. 694, воп. 4, спр. 6029, арк. 428–429 адв.*

жоною своею Рожою, Ленартъ Яновичъ зъ жоною своею Раиною а Юри Копоть зъ жоною своею Ганьною Яновьнами Мoствиловьнами, знаючи таковую склонъность и учинъность невестъки своее паней Настаси Войновъны… сами добровольне с тое жъ спольное угоды, межи собою вделаное, вступили и пустили сами отъ себе и отъ всихъ детей и потомъковъ своих на вечьность именья небожъчика брата своего Анъдрея Мoствила в повете Новъгородскомъ недалеко Клецъка лежачого Менидиковичъ з будованьемъ и пашнею дворною… с паробъки неволными, з бояры путъными, з людми тяглыми и зъ ихъ служъбами, и всякими подачъками, платы и повинъностьми, с корчмами… зъ ставы, млыны и зъ ихъ вымелъки, и отъ мала до велика, а зо всим на все, якъ ся оное именье Менидиковичи сами в собе мают, на вечъност, такъже золото, серебро, гроши готовые, клейноты, перла, шаты и всякие речи рухомые небожъчика брата своего Анъдрея Мoствила Ганъна, Рожа и Раина Мoствиловъны при невестъце своей паней Анъдреевой Мoствиловой Настаси Войнянъце вечъными ч(а)сы зоставили и… сами отъ себе, детей и потомъковъ своихъ вырекли… оного именья верху писаного Менидиковичъ… и всихъ речей рухомыхъ… А есть ли бы Юри Копоть *зъ жоною своею Ганъною, альбо Гаврило Зябъка** зъ жоною своею Рожею, альбо тэжъ Ленартъ Яновичъ зъ жоною своею Раиною, альбо дети и потомъки ихъ над тое постановене што инъшого вынайдовати, а о тое альбо и речи рухомые ку праву поволокати и чимъ кольвекъ якую трудность задавати мели, таковый кожъдый повиненъ будеть заплатити заруки г(о)с(по)д(а)ру королю его м(и)л(о)сти тисечу копъ грошей, а паней Настаси Войновъне… другую тисечу копъ грошей… а есть ли бы хто кольвекъ з ынъшихъ кревныхъ и близскихъ нашихъ або людей объчихъ в ыменье помененое вступовати и чимъ кольвекъ якую переказу ей самой, або кому она запишеть, чинити мелъ, то все мы сами и потомъки наши очищати повинъни будем под такими жъ заруками вышей писаными. Которую всю угоду и постановенье в семъ листе описаное и перед нами, врадомъ земъскимъ повету Новъгородского, в семъ листе помененомъ, зознаного обедве стороне, якъ Юри Копоть зъ жоною своею Ганьною, Гавриловая Зябъчиная Рожа а Ленартъ Яновичъ зъ жоною своею Раиною, такъ и Анъдреевая Мoствиловая пани Настася Войновъна просили, абы до книгъ земъскихъ повету Новъгородского записано было, што водле сознанья обудвухъ сторонъ до книгъ земъскихъ записано и выпис к книгъ паней Анъдреевой Мoствиловой Настаси Войновъне данъ естъ з н(а)шими печатьми. Писанъ у Новегородку. Василей Туминьский, писар земъский новъгородский.

И кгды жъ тые земяне вышей мененые Ленартъ Яновичъ зъ жоною своею Раиною, Юри Копоть зъ жоною своею Ганъною Мoствиловънами и сестра Раинина и Ганънина Гавриловая Зябъчиная зъ Анъдреевою Мoствиловою Настасею Войнянъкою около именей и маетности небощиковъское межи собою згодивъшися доброволне перед судомъ земъскимъ повету Новъгородского сознали… Писанъ в Люблине, Лета Божего нароженья тисеча пятсотъ шестдесятъ девятого, м(е)с(я)ца генъвара к ѕ (26) дня»[9].

4/2 **Андрэй [Янавіч] Макаціч.** Разам з братамі і іх маёнткам Керножычы быў далучаны 08.01.1568 г. пад харугву і падсуднасць Навагрудскага павета[10].

5/2 **Станіслаў [Янавіч] Мікіціч.** Разам з братамі і іх маёнткам Керножычы быў далучаны 08.01.1568 г. пад харугву і падсуднасць Навагрудскага павета[11].

* Фраза, пазначаная курсівам, прапушчана ў тэксце арыгінала, вынесена ў зноску пад тэкстам.

IV КАЛЕНА

6/3 **Ян (Іван).** Прадаў 22.07.1598 г. сваю частку спадчыннага па маці маёнтка брату Юрыю. На Вальным сейме ў Варшаве 03.03.1605 г. польскі кароль Жыгімонт III Ваза пазбавіў правоў і маёмасці Яна Кернажыцкага, паручніка роты Юрыя Чахоўскага, за рабаванне мірнага насельніцтва ў час інфлянцкай вайны:

«Жикгимонт Третий Божью м(и)л(о)стью король полский

Ознаймуемъ симъ вырокомъ нашимъ… Ижъ кгды приточиласе перед нас, г(о)с(по)д(а)ра, и паны рады н(а)ши на Соймъ теперешний вальный Варшавский справа за делятою велможного Яна Кароля Ходкевича, старосты жомоитского, на тотъ часъ гетмана н(а)шого Великого Князства Литовског(о), и за попираньемъ инъстыкгатора н(а)шого Великого Князътва Литовского урожоного Миколая Мархача Пузелевского, зъ Яномъ Керножицъкимъ, жолнеромъ, который, будучи поручникомъ роты пешое Юря Чеховского, и розъныхъ часовъ пехоту до Ифлянтъ выводечи, а запомневши боязни Божое срокгости на своводьных, в праве посполитомъ описаное, и арътыкуловъ военъныхъ, в тягненью крывды, лупезства, бои, морды и кгвалъты людемъ посполитымъ, стацые п(е)н(е)жные вытегаючи и на домы шляхетские находечи, чинилъ. О што, кгды отъ розныхъ людей на него жалобы доношоны были, пречечоный Керножицкий шлюбомъ черезъ вельможного старосту н(а)шого жомоитъского завезаный былъ, же бы се на Сойме теперешнемъ перед нами и паны рады н(а)шими становилъ и того справовал, чого се онъ поднял, и рокъ принявши, на Сойме справитисе обецалъ. За которымъ то обовезаньемъ шлюбовымъ инъстыкгаторъ нашъ, вписавъши тую справу межи инъшие справы соймовые в реестръ, через увесь Соймъ теперешний пильность чинилъ и пречечоного Керножицкого непоодного кроть через енерала возного нашого дворного Яна Кожуховского до права приволыват давалъ. А кгды се Керъножицъкий ни на одное воланье не отозвалъ и никоторое ведомости нестаня своего намъ, г(о)с(по)д(а)ру, не учинилъ, тогды инъстыкгатор нашъ, доведъши року шлюбомъ завезанья его становенья се ку росправе на Сойме теперешнемъ сведецътвомъ листовнымъ вельможного старосты нашого жомоитъского, такъже розныхъ крывдъ, лупежства и екъсцесовъ, черезъ него починеныхъ, домавялъ се, же бы Керножицъкий за нестанъного на упадъ зданъ и чсти отъсужонъ былъ. Мы, г(о)с(по)д(а)рь, с паны радами нашими, на Сойме при насъ будучими, бачечи, ижъ Янъ Керъножицъкий о многие крывды, лупезства, вытеганья и бранье стацыи пенежъные над аръткулы рыцеръские, надъ то о бои, моръды и кгвалъты объвиненъ, и шлюбомъ отъ гетмана нашого, же бы се того на Сойме справилъ, обовезанъ будучи, не становилъ се, ведомости никоторое намъ, г(о)с(по)д(а)ру, и гетману нашому нестанья своего не далъ и того объвиненья не справовалъ ся. Про то его за нестанъного яко на року за шлюбомъ завитомъ на упадъ здавши, яко лупежъцу, мордеръцу и кгвалътовника права посполитого и зъвиръхности нашое непослушъного и шлюбу недодеръжачого чсти отъсудили есмо, и симъ вырокомъ нашимъ вечне отъсужаемъ. Который вжо отъ сего часу за безецъного быти маеть, а с права посполитого и инъшихъ вольностей шляхетскихъ веселитисе и оныхъ уживати сполъку и объцованья жадного, яко безецъный, з добрыми мети не маеть. И овшемъ, если бы где постигненъ был, тогды яко злочиньца и чсти отъсужоный иманъ и через врадъ нашъ кгродъский альбо местъский на горле каранъ

быти маеть, и хоть бы его хто забилъ, за то никоторое вины каранья поносити не маеть. А маетност его всю лежачую и рухомую, если бы се где показала, до вольного шафунъку нашого присужаемъ. Што про паметь до книгъ нашихъ канцелярейскихъ записати и сес вырокъ подъ печатью Великого Князтва Литовского впеpодъ речоному инъстыкгаторови н(а)шому выдати есмо казали. Писанъ у Варъшаве на Сойме Вальномъ, Лета Божого нароженья тисеча шестьсотъ пятого, м(е)с(я)ца маръца третего дня. Левъ Сапега, канцлер Вел(икого) Княз(ства) Литовского»[12].

Жонка – N, сваячка (дачка ці сястра?) старосты жамойцкага.

7/3 **Юрый.** Валодаў рознымі маёнткамі ў Навагрудскім ваяводстве, аб чым сведчаць: продаж яму 28.02.1598 г. Пятром Марцінавічам Русанам зямлі з будынкам; заклад 15.07.1598 г. тым жа Русанам маёнтка Мазейкаўшчызна ў Навагрудскім ваяводстве за 140 коп грошаў літоўскіх, з якога Юрый 20.06.1601 г. прадаў Валентаму Цяльшэўскаму 5 валок зямлі з дваром Савіцкі за 140 коп грошаў літоўскіх. Уведзены 13.09.1603 г. у валоданне маёнткам Дарагавіца Навагрудскага ваяводства, пра што сведчыць выпіс ад 13.12.1603 г. з кнігі Навагрудскага гродскага суда. У якасці сведкі 14.06.1604 г. паставіў свой подпіс (па-польску) пад лістом гаспадарскіх зямян Навагрудскага і Мінскага ваяводстваў Аўдоцці Рагазянкі Станіслававай Мацясевіч-Грабенскай і яе сыноў Мікалая і Войцеха Станіслававічаў Мацясевічаў-Грабенскіх, у якім «у пасаг» іх дачцэ і сястры Раіне Станіславаўне, якая выйшла замуж за гаспадарскага зямяніна Навагрудскага ваяводства Грыгорыя Пятровіча Русіяна, запісвалася частка бацькоўскага маёнтка Душава Навагрудскага ваяводства[13].

Жонка – **Варвара Іванаўна Кавецкая.** Згодна з дзельчым дакументам ад 03.09.1636 г. (актыкаваны 20.06.1638 г. у Навагрудскім гродскім судзе) выдзеліла і запісала з маёнтка Дарагавіца чатыры часткі сынам Самуілу, Гаўрыілу, Крыспіну і Сігізмунду Кернажыцкім.

8/3 **Ілья.** Прадаў 22.07.1598 г. сваю частку спадчыннага па маці маёнтка брату Юрыю. Заклаў 29.07.1600 г. маёнтак Уса Кернажэўшчызна ў Мінскім ваяводстве Мацвею Ламжынскаму за 260 коп грошаў літоўскіх (актыкацыя 03.08.1600 г. у Мінскім гродскім судзе). Купіў спадчынныя часткі маёнтка Уса Кернажэўшчызна ў брата Івана і сястры Марыяны з Кернажыцкіх Здановічаў Войнаў.

9/3 **Марыяна.** Разам з мужам прадала 03.08.1600 г. брату частку маёнтка Уса Кернажэўшчызна.

Муж – Іван Здановіч Война.

УКАЛЕНА

10/7 **Самуіл.** Невядома, ці меў нашчадкаў. Плаціў падымнае ў 1690 г. з 1 дыма ў маёнтку Кернажыцы[14].

11/7 **Сігізмунд,** харунжы пяцігорскі, чашнік рэчыцкі, што пацвярджае выпіс прывілея польскага караля Уладзіслава IV Вазы ад 25.09.1637 г., пададзены 22.03.1762 г. у Мінскі павятовы суд. Купіў 09.01.1660 г. маёнтак Ратамка ў Багуслава Ляшчынскага. Па рэестры падымнага падатку з маёнткаў зямян Навагрудскага ваяводства 1673 г., меў нявыплату з 1 дыма маёнтка Дарагавіца[15].

12/7 **Габрыэль (Гаўрыіл) Юр'евіч Кернажыцкі,** капітан войскаў польскіх. Прывілеем караля Уладзіслава IV Вазы ад 05.01.1639 г. яму за заслугі падараваны маёнтак. Судзіўся 23.07.1650 г. у Навагрудскім земскім судзе з Гаціцкім. У якасці сведкі 18.04.1653 г. паставіў свой подпіс пад

лістом зямяніна Навагрудскага ваяводства Аляксандра Волка, дзе значылася, што апошні аддаваў у арэнду на тры гады маёнтак Цэпра Лаўрынаўская Далматоўшчына Клецкага прысуда Навагрудскага ваяводства, які трымаў у закладзе, габрэю Гошку Якубовічу і яго жонцы Роўзе Лазараўне, арандатарам Цэперскай карчмы падчашага ВКЛ князя Міхала Караля Радзівіла, за 1500 злотых польскіх[16]. Перадаў Казіміру Фурсу ў арэнднае ўтрыманне вотчынны маёнтак Дарагавіца, склаўшы пры гэтым 01.01.1671 г. інвентар. У рэестры падымнага падатку з зямян Навагрудскага ваяводства 1670 г. значыўся пан Габрыэль Кернажыцкі з Дарагобыля[17].

13/7 **Крыспін (Крышпін).** Невядома, ці меў нашчадкаў.

VI КАЛЕНА

14/11 **Міхаіл-Геранім,** рэчыцкі чашнік. Разам з пляменнікам Аляксандрам узяў у заклад 24.06.1699 г. у рэчыцкага скарбніка Уладзіслава Яна Красоўскага і яго жонкі Кацярыны Пукеманкі маёнтак Луконе Віленскага ваяводства на рацэ Шырвінта за 3000 талераў бітых[18]. Валодаў рознымі маёнткамі, што пацвярджалі: інвентар ад 24.07.1703 г. маёнтка Макулін Віцебскага ваяводства, складзены пры продажы яго Цеханоўскім Міхаілу Кернажыцкаму; прадпісанне старосты Пацея ад 05.12.1711 г. чашніку рэчыцкаму Міхайлу-Гераніму Кернажыцкаму аб прыпыненні даручанага яму выканання па пастанове кампрамісарскага аршанскага суда ў маёнтку Юхноўскага, а таксама аб выключэнні заёмнага пісьма на 15 талераў; пераўступны дакумент ад 23.11.1717 г. Міхайлу-Гераніму Кернажыцкаму на выкуп маёнтка Ратамка Мінскага ваяводства Міхайлам Дулічам; пераўступная здзелка ад 15.02.1719 г. на выкуп маёнтка Ратамка Міхайлам-Геранімам пляменніку Івану-Антонію Валерыянавічу.

Жонка – Ганна Г е й ш т а р. Па завяшчанні мужа ад 15.04.1720 г. стала ўладальніцай маёнтка Ратамка, спадчынныя і набытыя маёнткі Міхаіл-Геранім пакінуў сыну Івану.

15/12 **Валерыян-Казімір.** У верасні 1669 г. па прывілеі караля Міхаіла Вішнявецкага за заслугі атрымаў чын чашніка. Валодаў акрамя вотчыннага маёнтка Уса Кернажэўшчызна яшчэ маёнткам Гуслаў, што пацвярджае квітанцыя Навагрудскага ваяводства ад 06.02.1686 г. на выплату ім з маёнтка Гуслаў устаноўленага Сеймам збору ўхвальных падаткаў. У 1690 г. плаціў падымнае з 2 дымоў закладнога маёнтка Дарагавіца[19]. У рэестры пагалоўнага падатку з маёнткаў зямян Навагрудскага ваяводства 1685 г. значыўся «пан Валериан Керножицкий с той же Дороговицы и по тому же пану Керножицкому части своей от себя и от матери и за подданых особ 7 – 10 злотых 22 1/2 грошей»[20].

VII КАЛЕНА

16/14 **Іван,** чашнік. У Трыбунале ВКЛ 12.10.1719 г. адбыўся працэс па справе Казіміра Ільяшэвіча з Іванам і Аляксандрам Кернажыцкімі па забеспячэнні сумы 100 талераў 7512 злотых польскіх і 15 грошаў на дзвюх частках маёнтка Дарагавіца ў Навагрудскім ваяводстве. Па завяшчанні бацькі ад 15.04.1720 г. стаў уладальнікам спадчынных маёнткаў. 20.01.1778 г. пакінуў завяшчанне (актыкавана 27.03.1779 г. у кнігах Ашмянскага земскага суда), у якім спадчынны маёнтак Ратамка пакінуў пяці сынам.

Жонка – Э в а.

17/15 **Аляксандр,** дарагавіцкі стольнік па прывілеі польскага караля Яна III Сабескага ад 16.10.1694 г. (актыкацыя 21.03.1782 г. у Мінскім

гродскім судзе). Чашнік пінскі разам з дзядзькам Геранімам 24.06.1699 г. узяў у заклад у рэчыцкага скарбніка Уладзіслава Яна Красоўскага і яго жонкі Кацярыны Пукеманкі маёнтак Луконе Віленскага ваяводства на рацэ Шырвінта за 3000 талераў бітых[21]. Князь Карл-Станіслаў Радзівіл 30.07.1700 г. падараваў Аляксандру Кернажыцкаму Смаленскае княства ў Аршанскім павеце Віцебскага ваяводства. 20.12.1703 г. судзіўся ў Віцебскім гродскім судзе з Паўлам Любартовічам Сангушкам аб учыненні гвалту ў фальварку Смаляны Смаленскага княства, 27.10.1705 г. – з Іванам Юхноўскім аб нявыплаце доўгу ў 500 злотых.

Каталіцкага веравызнання. Быў хросным 28.06.1710 г. у Капыльскім касцёле разам з Карлам Залускім, Кацярынай Кернажыцкай Забэлінай і Іаанай Лябковічавай Радкевічавай у Зафіі, дачкі Якава і Марыяны з Петрашэвічаў Радзіевічаў з маёнтка Дарагавіца[22]; разам з Сямёнам Карловічам і Міхаілам Глебкам быў сведкам пры шлюбе 08.02.1728 г. Францыска Маліноўскага і Марыяны Глебкаўны з Крывога Сяла[23].

Яго слуга Міхаіл Грабоўскі падаў 07.08.1721 г. да актыкацыі ў Навагрудскі гродскі суд ахоўны ліст караля Аўгуста II Моцнага ад 07.01.1721 г., выдадзены Аляксандру Кернажыцкаму на 6 месяцаў[24].

Актыкаваў 13.07.1725 г. у Трыбунале ВКЛ ліст на ўнясенне сваёй жонцы 5000 злотых, забяспечаных на яго маёнтках[25]. 07.05.1726 г. быў выкліканы ў Навагрудскі гродскі суд панам Мікалаем Вярыгам Дарэўскім і яго жонкай Тэкляй з Ванікевічаў за раненне яго «нявіннага» шабляй.

НГАБ, ф. 1730, воп. 1, спр. 8, арк. 549–550 адв.

Разам з братам Іванам-Антонам даў 29.09.1727 г. дваюраднаму брату Івану Міхаілаву-Геранімаву квітацыйны дакумент на ўтрыманне маёнтка Гуслаўе[26].

Разам з панам Адамам і Антонам Крогерамі быў выкліканы ў Навагрудскі гродскі суд 08.07.1730 г. (*НГАБ, ф. 1730, воп. 1, спр. 10, арк. 724–725 адв.*) і 25.04.1732 г. (*НГАБ, ф. 1730, воп. 1, спр. 2, арк. 198–198 адв.*) браслаўскім скарбнікам Янам Рымшам за адмову селяніна Міхалкі Якшы з вёскі Кавалі (? Крэглі) Навагрудскага ваяводства, якога Кернажыцкі аддаў бацьку Крогераў за доўг у 200 злотых, выконваць паншчыну і пагрозы. Генерал Навагрудскага ваяводства 30.11.1735 г. беспаспяхова спрабаваў спагнаць з Аляксандра Кернажыцкага і яго жонкі пану Яну Санікоўскаму 200 талераў (*НГАБ, ф. 1730, воп. 1, спр. 12, арк. 256–256 адв.*). 07.01.1736 г. судзіўся ў Навагрудскім гродскім судзе з панамі Санікоўскім, Берасневічам, Станіславам Варатынцам, Юрыем і Станіславам Ліберчаямі, Аляксандрам Пырскім, Янам і Васілём Маневічамі, Себесцьянам Бербашам,Ваўрынцом Міхалеўскім, Казімірам Бжажэўскім, Тамашом Скуратам, Станіславам Кадлубаем за ўзнаўленне справы па аддадзеным у 1721 г. у заклад на тры гады Мікалаю Санікоўскаму фальварку Дарагавічы Навагрудскага ваяводства з 8 падданымі за 2000 злотых, пераразліку сумы спустошанага фальварка, а таксама вяртанні захопленага фальварка Кавалі і вёскі Кавалі з 15 падданымі (*НГАБ, ф. 1730, воп. 1, спр. 12, арк. 341–344 адв.*).

У маршалковым кампрамісарскім судзе 22.11.1795 г. адбыўся працэс па справе слуцкіх езуітаў з князямі Радзівіламі, Кунцэвічамі і іншымі аб размежаванні маёнткаў езуітаў ад іншых уладальнікаў, а 12.10.1807 г. у актавыя кнігі Мінскага павятовага суда ўнесена пастанова, якая тлумачыла, што вотчынны маёнтак

Уса Кернажэўшчызна Ленарта Кернажыцкага знаходзіўся на ўтрыманні яго праўнука Аляксандра.

Жонка – Рахель Гудзіеўская, скарбнікаўна лідская.

18/15 **Іван-Антон,** рэчыцкі чашнік. Быў хросным у Капыльскім касцёле разам з Дамінікам Копцам і асістэнтамі Канстанцыяй Якімовічаўнай і Еўфрасінняй Кернажыцкай 16.05.1707 г. у Пятра, сына Станіслава і Марыяны з Зяляновічаў Вілімаўскіх[27]; з Іаанай Рыбінскай і асістэнтамі Аленай Слонскай і Багуславам Слонскім 21.12.1707 г. – у Марыяны, дачкі Іосіфа і Ганны з Камінскіх Слонскіх з Шастакоў[28]; з Апалоніяй Карловічавай 09.05.1717 г. – у Крысціны, дачкі Іаана і Кацярыны Грыневічаў[29]; з Апалоніяй Карловічавай і асістэнтамі Паўлам Белакоўскім і Ганнай Забэлаўнай 09.05.1718 г. – у Крысціны, дачкі Іаана і Кацярыны Грыневічаў[30]; з N Гардынінай 23.04.1721 г. – у Клары-Гелены, дачкі Іосіфа і Ганны Слонскіх[31]; з Еўфрасінняй Зягальскай 24.06.1727 г. – у Антонія, сына Багуслава і Тэрэсы Давідовічаў са Ржаўкі[32]; асістэнтам з Леанорай з Ліхадзіеўскіх Вішнеўскай і хроснымі Янам Рашнеўскім і Рэгінай са Слонскіх Кернажыцкай 16.10.1728 г. – у Тамаша, сына Міхаіла і Разаліі з Камінскіх Вішнеўскіх[33].

Разам з жонкай Кацярынай Слонскай згаданы ў ахоўным лісце караля Аўгуста II Моцнага, выдадзеным Аляксандру Кернажыцкаму на 6 месяцаў (актыкацыя 07.01.1721 г. у Навагрудскім гродскім судзе)[34].

Разам с жонкай атрымаў 18.11.1721 г. ад Міхала Тальквіна Жураўскага 150 злотых польскіх згодна з трыбунальскім рашэннем. Разам з братам Аляксандрам 29.09.1727 г. даў дваюраднаму брату Івану Міхаілаву-Геранімаву квітацыйны дакумент на ўтрыманне маёнтка Гуслаўе[35].

20.05.1732 г. быў выкліканы ў Навагрудскі гродскі суд мальтанскім кавалерам Станіславам Данброўскім для вяртання законным парадкам трох падданых з вёскі Траянава маёнтка Пацейкі, якія здаўна былі ўнесены ў інвентар і якім Ян-Антоній разам з жонкай дапамог пераехаць у свой маёнтак (*НГАБ, ф. 1730, воп. 1, спр. 2, арк. 680–680 адв.*). У той жа дзень у Навагрудскім гродскім судзе кашталян Станіслаў Серуць і яго жонка Іаана са Слонскіх Серуцева патрабавалі ад Яна-Антонія Кернажыцкага вярнуць пазыку на суму 65 злотых польскіх (*НГАБ, ф. 1730, воп. 1, спр. 2, арк. 681–682 адв.*). 13.07.1734 г. атрымаў ад рэчыцкага каморніка Франца Кржывіцкага падатковую квітанцыю аб уплаце падымнага з маёнтка Дарагавіца.

Жонка – Кацярына з Бокшаў Слонская. Шлюб 06.11.1708 г. у Капыльскім касцёле. Ксёндз – [Іаан Калакоўскі]. Хросныя бацькі – Іосіф Слонскі, Казімір Забэла, Дамінік Копец[36]. Была хроснай разам з сынам Іаанам і асістэнтамі Тамашом Ліхадзіеўскім і Канстанцыяй Сжэйтаравай у 1732 г. у Мікалая-Андрэя, сына Адама і Іааны Рассудоўскіх[37]; асістэнткай з Іосіфам Слонскім, Міхаілам Рассудоўскім і Соф'яй Швеглеваўнай пры хрышчэнні Георгіем Бярновічам і Ганнай Катарынай Рассудоўскай 05.02.1736 г. Антонія-Людвіга, сына Адама і Іааны Рассудоўскіх[38]; хроснай з Мацеем Карловічам 08.09.1745 г. – у Антонія-Раймунда, сына жыхароў засценка Цяцеравічы Фамы і Канстанцыі Дзердзіеўскіх[39]; асістэнткай з Дзіянісіем Лаўрыновічам, Казімірам Струнскім і дзяўчынай Барбарай Кернажыцкай пры хрышчэнні Ігнаціем Трэскам і Кацярынай Рондфельдавай 19.09.1745 г. Пятра, сына Антонія і Кацярыны Карловічаў[40]; асістэнткай з Тамашом Багацкім пры хрышчэнні Францішкам Нацэлевічам і Канстанцыяй Рондфельдавай 06.10.1745 г.

Тэклі, дачкі Івана Фадзея і Марыяны Кернажыцкіх[41]. Пасля смерці рэчыцкага чашніка Івана-Антонія Кернажыцкага яна і сын Іван-Фадзей, як яго нашчадкі, атрымалі 19.01.1739 г. позву вознага ў суд з подпісам навагрудскага пісара Аляксандра Корсака Савіча ад князя Мікалая Фаўстына Радзівіла аб нявыплаце пазычанай у Дабкоўскіх сумы ў маёнтку Дарагавіца.

19/15 **Кацярына,** каталіцкага веравызнання, прыхаджанка Капыльскага касцёла. Была хроснай у Капыльскім касцёле разам з Карлам Залускім, Аляксандрам Кернажыцкім і Іаанай Лебкавічавай Радкевічавай 28.06.1710 г. у Зафіі, дачкі Якава і Марыяны з Петрашэвічаў Радзіевічаў з Дарагавіцы[42]; з Ганнай Сыцьковай [Жаўрыд] і Кацярынай Жаўрыдавай 06.01.1707 г. – у Іосіфа, сына Хрыстафора і Крысціны Багдановічаў з засценка Кацельнікі[43]. Разам з мужам узяла ў заклад 20.04.1709 г. у Яна-Станіслава Забэлы і яго жонкі Гелены Паморскай палову маёнтка Душава Крывое Сяло (актыкацыя ў кнізе Навагрудскага гродскага суда ад 22.04.1717 г.)[44].

Муж – **Казімір Пятровіч Забэла,** дваранін, сын **Пятра** і **Евы Адамаўны,** народжанай **Глебкі, Забэлаў** (гл. «Забэлы» 2/1). Маці Евы Адамаўны Глебкі – княгіня **Марыяна Мікалаеўна Глінская-Ліхадзіеўская** (гл. «Глінскія-Ліхадзіеўскія»).

Дзеці: Людвіг-Антоній, нарадзіўся 28.04.1710 г., Уладзіслаў-Валяр'ян, нарадзіўся 18.04.1708 г., Аляксандр-Хрызастом, нарадзіўся 28.07.1704 г., Канстанцін, нарадзіўся 13.03.1706 г.

VIII КАЛЕНА

20/16 **Ян,** *1774 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1796 г., разам з жонкай і сям'ёй брата Лукаша жыў у засценку Балотчыцы[45].

Жонка – Гелена Жаўрыд, *1776 г. н.

21/16 **Міхаіл,** ахрышчаны 24.03.1735 г. у Каменскім касцёле (?). Прынёс прысягу на вернасць і падданства Расійскай імперыі, што пацвярджаецца пасведчаннем ад 18.03.1798 г., выдадзеным камісарам Багуславам Лазарэвічам. Па рэвізскіх дваранскіх сказках 1795 г., жыў у сяле Малыя Дзічкі маёнтка Доктаравічы Слуцкага павета[46].

Жонка – N, памерла да 1795 г.

22/16 **Пётр-Павел,** ахрышчаны 29.09.1760 г. у Каменскім касцёле. Прынёс прысягу на вернасць і падданства Расійскай імперыі, што пацвярджаецца пасведчаннем 18.03.1798 г., выдадзеным камісарам Багуславам Лазарэвічам. Па рэвізскай дваранскай сказцы 1795 г., жыў у сяле Малыя Дзічкі маёнтка Доктаравічы Слуцкага павета[47], па спісе дваран Слуцкага павета 1796 г. – у засценку Альшанка. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 22.12.1802 г. прызнаны ў дваранстве. 28.07.1815 г. заключыў арэнды кантракт з Мержаеўскім на 3 гады на паўвалокі зямлі з будынкам у засценку Альшанка Малая. Памёр да 1835 г. Дзеці Антон, Кацярына і Ганна.

Жонкі: 1. Тэафіля (Таццяна) Міхайлаўна Забродская, *1767 г. н. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета ад 30.09.1795 г., жыла ў сяле Дзічкі маёнтка Доктаравічы на зямлі князя Дамініка Геранімавіча Радзівіла[48]; 2. Мар'яна Булат, *1765 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў засценку Альшанка на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[49].

23/16 **Павел (? Пётр-Павел),** *1846 (1755) г. н. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета, жыў у сяле Дзічкі маёнтка Доктаравічы на зямлі князя Дамініка Геранімава Радзівіла[50], па сямейным спісе 1896 г. – у засценку Балотчыцы[51].

Жонка – Разалія Юр'еўна Сцепужынская, *1756 (1765) г. н. Дзеці Венядзікт, Антон і Алена.

24/16 **Гаўрыіл,** ахрышчаны 29.09.1766 г. у Каменскім касцёле (?). Прынёс прысягу на вернасць і падданства Расійскай імперыі, што пацвярджаецца пасведчаннем ад 18.03.1798 г., выдадзеным камісарам Багуславам Лазарэвічам. Па рэвізскай дваранскай сказкцы 1795 г., жыў у сяле Малыя Дзічкі маёнтка Доктаравічы Слуцкага павета[52]. У 1810 г. жыў у засценку Балотчыцы. Разам з дачкой Лукі Кернажыцкага Варварай быў хросным 23.01.1810 г. у Прускай Раство-Багародзіцкай царкве ў Матфея[53], сына Дзям'яна Іванавіча і Марыі Васільеўны Кернажыцкіх. 01.04.1812 г. заключыў з Адамам Непакойчыцкім кантракт на арэнду зямлі на тры гады.

Жонка – Ганна Іванаўна, *1770 г. н.

25/16 **Лука (Лукаш),** ахрышчаны 10.07.1769 г. у Каменскім касцёле. Па рэвізскай сказкцы дваран Слуцкага павета 1795 г., жыў у сяле Малыя Дзічкі маёнтка Доктаравічы[54]. У 1796 г. жыў у засценку Балотчыцы Слуцкага павета. Прынёс прысягу на вернасць і падданства Расійскай імперыі, што пацвярджаецца пасведчаннем ад 18.03.1798 г., выдадзеным камісарам Багуславам Лазарэвічам. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 22.12.1802 г. прызнаны ў дваранстве. 11.04.1812 г. заключыў кантракт з Непакойчыцкім на зямлю. Памёр 14.10.1834 г. ад падучай хваробы.

Жонка – Апалонія (Пелагія) Іванаўна Заброцкая, *1768 г. н. Разам з Іванам Сапоцкім была хроснай 26.09.1805 г. у Івана[55], сына Дамініка Іванавіча і Марыі Васільеўны Кернажыцкіх.

26/16 **Дамінік-Данііл,** ахрышчаны 17.07.1774 г. у Каменскім касцёле (?). Прынёс прысягу на вернасць і падданства Расійскай імперыі, што пацвярджаецца пасведчаннем 18.03.1798 г., выдадзеным камісарам Багуславам Лазарэвічам. Па рэвізскай сказцы дваран Слуцкага павета 1795 г., жыў у сяле Малыя Дзічкі маёнтка Доктаравічы[56]; па сямейных спісах дваран 1796 г. – у засценку Альшанка Слуцкага павета, у 1805–1835 гг. – у засценку Балотчыцы на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[57]. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 22.12.1802 г. прызнаны ў дваранстве.

Жонкі: 1. Ганна (Марыя) Васільеўна Гуршовіч, *1775 г. н., ад яе дзеці Уладзімір (Уладзіслаў), Марыяна і Тэкля; 2. Марыяна Бараноўская, ад яе дзеці Іван, Мацвей, Грыгорый, Пётр, Ганна, Агаф'я, Тэрэса.

27/17 **Гілярый,** падчашы Навагрудскага ваяводства па прывілеі польскага караля Аўгуста III ад 05.12.1752 г., актыкаваным 21.03.1782 г. у Мінскім гродскім судзе. Разам са Станіславам Сеўрукам быў сведкам у Капыльскім касцёле пры шлюбе 30.11.1747 г. Францішка Карчэўскага і Агаты Асіеўскай[58]. Выдаў даверанасць 20.09.1782 г. мінскаму гараднічаму Крыштафу Ліхадзіеўскаму на аднаўленне яго ў законных правах валодання спадчынным маёнткам Уса Кернажэўшчызна супраць Ламжынскіх, Войнаў і іншых, а 07.09.1775 г. у Мінскім земскім судзе адбыўся працэс Гілярыя Кернажыцкага з Крыштафам Ліхадзіеўскім аб праве валодання маёнткам, а таксама са Сцяпанам Плявакам за прысваенне прывілея Юрыя Кадзіцы на той жа маёнтак. 10.07.1774 г. Гілярый вярнуў па асекурацыйным дакуменце палову маёнтка Уса Кернажэўшчызна. Падзяліў 07.09.1775 г. з Іванам-Фадзеем маёнтак Уса Кернажэўшчызна.

28/18 **Іван-Андрэй,** ахрышчаны 29.11.1710 г. ксяндзом Іаанам-Іосіфам Калакоўскім у Капыльскім касцёле. Хросныя бацькі – N Басацкі і Гядвіга Буйневічаўна з Шастакоў[59].

29/18 **Іван-Фадзей,** рэчыцкі чашнік па прывілеі польскага караля Аўгуста III ад 25.05.1740 г. (актыкаваны 05.09.1773 г. у Мінскім павятовым судзе). Разам з маці Кацярынай са Слонскіх Кернажыцкай, як нашчадкі нябожчыка рэчыцкага чашніка Івана-Антонія Кернажыцкага, атрымаў 19.01.1739 г. позву вознага ў суд з подпісам навагрудскага пісара Аляксандра Корсака Савіча ад князя Мікалая Фаўстына Радзівіла аб нявыплаце пазычанай у Дабкоўскіх сумы ў маёнтку Дарагавіца. Разам з Людвікам Карніцкім і Іаанам Нарановічам быў сведкам у Капыльскім касцёле пры шлюбе 25.02.1741 г. Людвіка Хлявінскага і Схаластыкі Невяроўскай[60]; з Міхаілам Мержаеўскім, Ізабэлай Мержаеўскай, Іосіфам Лазаровічам, Мацеем Карловічам, Казімірам Свірскім, Ганнай Беразневічаўнай – пры шлюбе 08.04.1742 г. Станіслава Антонія з Памянава Слонскага з Розай Невяроўскай[61].

Абозны Навагрудскага ваяводства Казімір Ігнацій Корсак 19.01.1751 г. зрабіў прадпісанне па справе Міхаіла і Мар'яны з Кернажыцкіх Ляпкоўскіх, а таксама Івана-Фадзея Кернажыцкага з Вайніловічамі да займання па трыбунальнай пастанове ўсіх маёнткаў, якімі яны валодаюць.

Генерал Навагрудскага ваяводства ўручыў 05.01.1756 г. ад Яна-Фадзея Кернажыцкага і яго сястры Марыяны Кернажыцкай Ляпкоўскай позву ў Навагрудскі гродскі суд Даніэлю Вайніловічу і яго сыну Антонію Вайніловічу.

НГАБ, ф. 1730, воп. 1, спр. 30, арк. 8–8 адв.

15.02.1756 г. у Мінску Трыбунал ВКЛ прыняў рэмісійную пастанову ў справе Івана-Фадзея Кернажыцкага з Вайніловічамі, якая дазваляла арыштаваць Вайніловічаў і заняць усе іх маёнткі. 02.01.1758 г. Трыбунал ВКЛ выдаў прадпісанне ашмянскаму старосту Антонію Свяжынскаму па справе Івана-Фадзея Кернажыцкага з Вайніловічамі для займання ўсіх маёнткаў Вайніловічаў. Разам з жонкай 23.(?).1760 г. заключыў арэндны дагавор з Праксэдай і Казімірам Дамброўскімі на маёнтак Нялюбаўшчызна Мінскага ваяводства.

04.02.1762 г. купіў маёнтак Рамізаўшчызна (актыкацыя 09.07.1763 г. у Нясвіжскім гродскім судзе). Зноў судзіўся з Вайніловічамі, што пацвярджаў выпіс рашэння Трыбунала ВКЛ ад 20.02.1762 г. Судзіўся 07.09.1762 г. у Навагрудскім гродскім судзе з Дабкоўскімі, Дышэвічамі і іншымі. 09.11.1762 г. атрымаў пасведчанне ад розных асоб, якое пацвярджала ўцёкі яго сялянкі Тэрэсы з рэчамі і дакументамі. 30.05.1764 г. атрымаў ад маршала канфедэрацыі Міхайла Бржастоўскага ахоўную грамату аб рабаванні маёнтка Кернажыцы войскамі і выдачы ім правіянтаў. 02.07.1765 г. атрымаў квітацыйны дакумент ад Людвіга і Дамінікі з Кернажыцкіх Драздовічаў аб атрыманні пасагу і вызначэнні далейшай спадчыны. Возны Станіслаў Васілеўскі 02.05.1767 г. выдаў пасведчанне Івану-Фадзею аб выплаце Драздовічамі грошай за фальварак Рамізаўшчызна Навагрудскага ваяводства. Іван-Фадзей прадаў 10.07.1773 г. Крыштафу Ліхадзіеўскаму частку маёнтка Уса Кернажэўшчызна Мінскага ваяводства, за выключэннем другой часткі, якая належала Гілярыю Кернажыцкаму (актыкацыя 17.12.1774 г. у Мінскім земскім судзе). Разам з Іаанам Корзунам быў сведкам у Капыльскім касцёле пры шлюбе 24.10.1773 г. Марціна Забэлы і Петранэлі Корзун[62].

Жонкі: 1. Марыяна Л і х а д з і е ў с к а я; 2. Ганна С к а р б к а (Скарбек), *1714 г. н. У 1779 г. жыла ў маёнтку Рамізаўшчызна. Памерла ва ўзросце 65 гадоў, пахавана 04.06.1779 г. ксяндзом Капыльскага касцёла Іосіфам Мялешкам[63].

30/18 **Станіслаў-Марцін,** ахрышчаны 29.12.1709 г. ксяндзом Іаанам-Іосіфам Калакоўскім у Капыльскім касцёле. Хросныя бацькі – Іаан Гардына, Іаан Пульман, Іосіф Камінскі, Катарына Гардыніна, Ганна Пульманава, Гядвіга N з маёнтка Дарагавіца[64].

31/18 **Мар'яна,** разам з мужам Міхаілам і братам Іванам-Фадзеем судзілася з Вайніловічамі і іншымі за права валодання маёнткамі, пра што сведчыць паязны ліст ад 19.01.1751 г. абознага Навагрудскага ваяводства Ігнацыя Корсака і рэляцыйны квіт генерала Навагрудскага ваяводства ад 05.01.1756 г. аб уручэнні позвы ў Навагрудскі гродскі суд Даніэлю Вайніловічу і яго сыну Антонію Вайніловічу.

НГАБ, ф. 1730, воп. 1, спр. 30, арк. 8–8 адв.

Мела дачку Элеанору (ахрышчана 19.08.1742 г. у Капыльскім касцёле).

Муж – Міхаіл Ляпкоўскі.

IX КАЛЕНА

32/21 **Іосіф,** *1750 (1759) г. н. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета ад 30.09.1795 г., жыў у сяле Дзічкі маёнтка Доктаравічы на зямлі князя Дамініка Геранімавіча Радзівіла[65], па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1796 г. – у засценку Альшанка[66].

Жонкі: 1. Ганна Паўлаўна Дашкевіч, *1764 г. н., ад яе дзеці Іван, Леў-Лявонцій і Васіль; 2. Ганна Гаўрылаўна Гершановіч, *1772 г. н., ад яе дзеці Стэфан і Ганна. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла з сям'ёй сына Стэфана ў маёнтку Міцявічы памешчыка Корсака[67].

33/21 **Сцяпан-Станіслаў,** *1755 г. н. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета ад 30.09.1795 г., жыў у сяле Дзічкі маёнтка Доктаравічы на зямлі князя Дамініка Геранімавіча Радзівіла[68], па бірчаку 1795 г.[69] і сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1796 г.[70] – у засценку Альшанка – 2, валодаў 1/4 валокі аселай зямлі, плаціў чынш 16 злотых і 7 1/2 гроша.

Жонка – Тэрэза (Параска) Васільеўна Корбут, *1765 г. н.

34/21 **Іван,** *1762 г. н. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета ад 30.09.1795 г., жыў у сяле Дзічкі маёнтка Доктаравічы на зямлі князя Дамініка Геранімавіча Радзівіла[71], па бірчаку 1795 г.[72] і сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1796 г.[73] – у засценку Альшанка – 2, валодаў 1/4 валокі аселай зямлі, плаціў чынш 16 злотых 7 і 1/2 грошай.

Жонка – Даніэля (Дамініка) Пятроўна Цяковіч, *1765 г. н.

35/21 **Сымон,** *1783 г. н. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета ад 30.09.1795 г., жыў у сяле Дзічкі маёнтка Доктаравічы на зямлі князя Дамініка Геранімавіча Радзівіла[74].

36/22 **Кацярына,** *1785 г. н. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета ад 30.09.1795 г., жыла з сям'ёй брата Пятра-Паўла ў сяле Дзічкі маёнтка Доктаравічы на зямлі князя Дамініка Геранімавіча Радзівіла[75].

37/22 **Ганна,** *1793 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1896 г., жыла ў засценку Альшанка[76].

38/22 **Антон,** *1792 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Альшанка на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[77]. Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[78].

Жонка – Агафія Есьмантовіч.

39/23 **Антон,** *1789 (1792) г. н. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета, жыў у сяле Дзічкі маёнтка Доктаравічы на зямлі князя

Дамініка Геранімава Радзівіла[79], па сямейным спісе 1896 г. – у засценку Балотчыцы[80].

Жонка – Канстанцыя.

40/23 **Венядзікт,** нарадзіўся 04.07.1787 г. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета, жыў у сяле Дзічкі маёнтка Доктаравічы на зямлі князя Дамініка Геранімава Радзівіла[81], па сямейным спісе 1896 г. – у засценку Балотчыцы[82].

Жонка – Кацярына.

41/23 **Алена,** *1793 г. н. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета, жыла ў сяле Дзічкі маёнтка Доктаравічы на зямлі князя Дамініка Геранімава Радзівіла[83].

42/24 **Феафіл (Тэафіль),** *1793 г. н. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета ад 30.09.1795 г., жыў у сяле Дзічкі маёнтка Доктаравічы на зямлі князя Дамініка Геранімавіча Радзівіла[84], па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г. – у засценку Васіль Барок на арэнднай зямлі генерала Прушынскага[85]. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 22.12.1802 г. прызнаны ў дваранстве. Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[86].

Жонка – Тэадора Пятроўна Бржазоўская, *1799 г. н.

43/24 **Фёдар.** Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Балотчыцы на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[87]. Быў прыхаджанінам Прускай Раство-Багародзіцкай царквы. Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[88].

Жонка – Дарыя Мікалаеўна Хартановіч.

44/24 **Эльжбета,** *1791 г. н. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета ад 30.09.1795 г., жыла ў сяле Дзічкі маёнтка Доктаравічы на зямлі князя Дамініка Геранімавіча Радзівіла[89].

45/25 **Карл,** *1791 г. н. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета ад 30.09.1795 г., жыў у сяле Дзічкі маёнтка Доктаравічы на зямлі князя Дамініка Геранімавіча Радзівіла[90].

46/26 **Віктар,** *1793 г. н. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета ад 30.09.1795 г., жыў у сяле Дзічкі маёнтка Доктаравічы на зямлі князя Дамініка Геранімавіча Радзівіла[91], па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г. – у засценку Заброцкія на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[92]. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 22.12.1802 г. прызнаны ў дваранстве. Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[93].

Жонка – Марыя Некрашэвіч, *1797 г. н.

47/25 **Якаў,** *1797 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Балотчыцы на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[94]. Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[95].

Жонка – Фядора Чарнушэвіч.

48/25 **Фама,** *1814 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Балотчыцы на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[96].

Жонка – Стэфанія Муравіцкая.

49/25 **Антоній,** *1812 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Балотчыцы на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[97]. Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[98].

Жонка – Ганна Мохарт.

50/25 **Агата,** *1791 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1796 г., жыла ў засценку Балотчыцы[99].

51/25 **Барбара (Варвара),** *1792 г. н. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета ад 30.09.1795 г., жыла ў сяле Дзічкі маёнтка

Доктаравічы на зямлі князя Даменіка Геранімавіча Радзівіла[100], у 1796–1810 гг. – у засценку Балотчыцы, была прыхаджанкай Прускай Раство-Багародзіцкай царквы. Разам з Гаўрыілам Кернажыцкім была хроснай 23.01.1810 г. у Матфея[101], сына Дзям'яна Іванавіча і Марыі Васільеўны Кернажыцкіх.

52/26 **Параскевія,** нарадзілася 17.10.1822 г., ахрышчана 19.10.1822 г. святаром Іаанам Міцкевічам у Прускай Раство-Багародзіцкай царкве, хросныя бацькі – жыхары засценка Балотчыцы Іосіф Сухоцкі, каталіцкага веравызнання, і жонка Мацвея Зяленскага Ганна Паўлава[102].

53/26 **Уладзімір (Уладзіслаў),** *1791 (1794) г. н. Па рэвізскіх сказках чыншавай шляхты Слуцкага павета ад 30.09.1795 г., жыў у сяле Дзічкі маёнтка Доктаравічы на зямлі князя Даменіка Геранімавіча Радзівіла[103], 1796 г. – у засценку Альшанка Слуцкага павета. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 22.12.1802 г. прызнаны ў дваранстве, заключыў кантракт на зямлю з Мяржэўскім 28.07.1815 г. Памёр да 1835 г.

Жонка – Аўдакія Вішнеўская, *1792 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў засценку Альшанка на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[104].

54/26 **Грыгорый,** нарадзіўся ў засценку Балотчыцы 10.04.1819 г., ахрышчаны 11.04.1819 г. святаром Іякавам Шыманоўскім у Прускай Раство-Багародзіцкай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Балотчыцы Іосіф Сухоцкі, каталіцкага веравызнання, і жонка Мацвея Зяленскага Ганна[105]. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Балотчыцы на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[106]. Разам з жонкай Антонія Кернажыцкага быў хросным 20.09.1849 г. у Міхаіла, з дачкой Антона Кернажыцкага Стэфанідай 27.12.1855 г. – у Стэфана, сыноў Стэфана Грыгор'евіча і Фёклы Сямёнаўны Валадковічаў. Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[107]. Памёр 25.03.1880 г. ад удушша, пахаваны 27.03.1880 г. святаром Прускай Раство-Багародзіцкай царквы Паўлам Маскалевічам[108].

55/26 **Мацвей (Фама),** нарадзіўся 22.01.1810 г., ахрышчаны 23.01.1810 г. святаром Андрэем Kраніkоўскім у Прускай Раство-Багародзіцкай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Балотчыцы Гаўрыіл Кернажыцкі і дачка Лукі Кернажыцкага Варвара, дзяўчына[109]. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Балотчыцы на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[110]. Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. не зацверджаны ў дваранстве, таму што ў пасведчанні прадвадзіцеля дваранства быў названы Фамой[111]. У пасведчанні ад 15.10.1857 г. Слуцкага павятовага прадвадзіцеля дваранства ў Мінскі дваранскі дэпутацкі сход гаварылася: «...что же относится Матвея сына Доминика-Даниила Керножицкого, коему отказано утверждение в дворянстве за то, что показан в свидетельстве под именем Фомы, то сие последовало от того, что во время разбора бывшей польской шляхты в 1835 году податель списка о нескольких семействах ошибочно показал его Фомою, но в метрической о рождении и крещении его выписи и дворянских списках, поданных в 1854 году, показан он действительно не Фомою, а Матфеем или Матвеем сыном Демяна или Доминика-Даниила. В чем надлежащим подписом и печатью удостоверяется 1857 года октября 15 дня. Г. Слуцк».

Значыўся па рэвізскай сказцы 4-га Касыніцкага ўчастка ад 22.12.1864 г., у 1869 г. далучаны да Чапліцкай воласці[112].

Жонкі: 1. Еўдакія, памерла 20.11.1838 г. ва ўзросце 18 гадоў ад моцнай гарачкі[113]; 2. Алена

Якаўлеўна, *1822 г. н., ад яе дзеці Міхаіл, Мікалай, Іван, Юстын, Васіль, Раман, Пётр, Ганна.

56/26 **Пётр,** нарадзіўся 04.10.1827 г. у засценку Балотчыцы, ахрышчаны 05.10.1827 г. святаром Іосіфам Міцкевічам у Прускай Раство-Багародзіцкай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Балотчыцы Іосіф Сухоцкі, каталіцкага веравызнання, і ўдава Ганна Аляксандрава[114]. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Балотчыцы на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[115]. Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[116].

57/26 **Іван,** ахрышчаны 26.09.1805 г. святаром Андрэем Кранікоўскім у Прускай Раство-Багародзіцкай царкве. Хросныя бацькі – жыхар засценка Мліна Іван Сапоцкі і жонка жыхара засценка Балотчыцы Лук'яна Кернажыцкага Пелагія[117]. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Балотчыцы на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[118]. Памёр 07.09.1838 г. ад болю ў страўніку, пахаваны святаром Прускай Раство-Багародзіцкай царквы Іосіфам Кузьмічом Жуpакоўскім[119].

58/26 **Ганна,** *1822 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў засценку Балотчыцы на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[120]. Разам з жыхаром засценка Васіль Барок Іеранімам Мацвеевым Беразоўскім была хроснай 17.05.1836 г. у Феадора[121] і 29.10.1838 г. у Анастасіі[122], дзяцей Феадора Гаўрылава і Дарыі Мікалаевай Кернажыцкіх.

59/26 **Агафія,** *1826 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў засценку Балотчыцы на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[123].

60/26 **Тэрэса,** *1832 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў засценку Балотчыцы на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[124].

61/26 **Стэфан,** нарадзіўся 27.09.1814 г. у засценку Балотчыцы, ахрышчаны 28.09.1814 г. у Прускай Раство-Багародзіцкай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Балотчыцы Іосіф Сухоцкі і дачка Гервасія Корзуна Саламонія, дзяўчына[125].

62/26 **Марыяна,** *1789 г. н. У 1796 г. жыла ў засценку Альшанка Слуцкага павета.

63/26 **Тэкля,** *1795 г. н. У 1796 г. жыла ў засценку Альшанка Слуцкага павета.

64/27 **Іван,** ротмістр янычарскай харугвы, пасля падчашы Навагрудскага павета. Па прадпісанні гетмана літоўскіх войскаў князя Міхаіла-Казіміра Радзівіла ад 14.12.1761 г. дастаўляў арыштантаў у Нясвіжскі замак. У завяшчанні ад 20.11.1792 г. спадчынны маёнтак Уса Кернажэўшчызна пакінуў жонцы.

Жонка – Петрунэля Кучэўская. Судзілася са стольнікам Іванам Ліхадзіеўскім за маёнткі Уса Кернажэўшчызна і Навасады, што пацвярджаецца выклікамі ў Мінскі земскі суд ад 15.02.1798 г., 08.07.1802 г., 22.05.1807 г. Прынесла прысягу ў [Мінскім павятовым судзе] 11.07.1808 г. аб валоданні яе мужам Іванам Гілярыевым маёнткам Уса Кернажэўшчызна. Мінскі галоўны суд 2-га дэпартамента 15.12.1810 г. прыняў рашэнне, па якім Іван Ліхадзіеўскі павінен быў выплаціць ёй 1333 злотых 10 грошаў цяжбавых выдаткаў.

65/29 **Кацярына,** ахрышчана 02.12.1738 г. ксяндзом [Адальбертам-Іаанам Канопкам] у Капыльскім касцёле. Хросныя бацькі – Іосіф Слонскі і Пудзенцыяна Ліхадзіеўская, асістэнты – Іосіф Яцкоўскі і Марыяна Рафаловічава, Станіслаў Ліхадзіеўскі і Іаана Рассудоўская[126].

66/29 **Міхаіл-Казімір,** ахрышчаны 19.09.1743 г. ксяндзом Адальбертам-Іаанам Канопкам у

Капыльскім касцёле. Хросныя бацькі –Тэадор Шам і Канстанцыя Дамброўская з маёнтка Дарагавіца[127]. Пераўступіў 01.09.1785 г. Гераніму Кернажыцкаму частку фальварка Дарагавіца, атрымаўшы 1500 злотых польскіх для непаўналетняга сына Сымона. Па завяшчанні ад 01.09.1791 г. Міхаіл пакінуў свой спадчынны маёнтак Дарагавіца сыну Сямёну і далёкім сваякам Іосіфу, Сцяпану-Станіславу і Івану, сынам Міхаіла Іванава.

67/29 **Фама,** ахрышчаны 19.12.1741 г. ксяндзом [Адальбертам-Іаанам Канопкам] у Капыльскім касцёле. Хросныя бацькі – Міхаіл Мірзяеўскі і Кацярына Кернажыцкая, асістэнты – Станіслаў Слонскі і Віргінія Бярновічаўна, Міхаіл Рафаловіч і Разалія Мірзяеўская[128].

68/29 **Тэкля,** ахрышчана 06.10.1745 г. святаром Пацейкаўскай уніяцкай царквы Лукашам Рагалевічам. Хросныя бацькі – Францішак Нацялевіч і Канстанцыя Рондфельдава, асістэнты – Тамаш Багацкі і Кацярына Кернажыцкая[129].

69/29 **Барбара,** ахрышчана 10.12.1733 г. ксяндзом Іаанам Пенскім у Капыльскім касцёле. Хросныя бацькі – Георгій Бярновіч і Канстанцыя Сжэйцерава, асістэнты – Андрэй Сжэйтар і Элеанора Выняўская[130]. Была асістэнткай з Кацярынай Кернажыцкай, Казімірам Струнскім, Дзіянісіем Лаўрыновічам пры хрышчэнні Ігнаціем Трэскам і Кацярынай Рондфельдавай 19.09.1745 г. Пятра, сына Антонія і Кацярыны Карловічаў[131].

70/29 **Дамініка,** разам з мужам 02.07.1765 г. далі квітацыйны дакумент Івану-Фадзею Кернажыцкаму аб атрыманні пасагу і вызначэнні далейшай спадчыны. Выплацілі грошы Івану-Фадзею за фальварак Рамізаўшчызна Навагрудскага ваяводства, што пацвярджала пасведчанне ад 02.05.1767 г. вознага Станіслава Васілеўскага.

Муж – Людвіг Драздовіч.

X КАЛЕНА

71/32 **Іван,** *1781 (1785) г. н. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета ад 30.09.1795 г., жыў у сяле Дзічкі маёнтка Доктаравічы на зямлі князя Дамініка Геранімавіча Радзівіла[132], па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1796 г. – у засценку Альшанка[133].

72/32 **Сцяпан,** *1803 г. н. Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[134]. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у маёнтку памешчыка Корсака, «занимается должностию економиской»[135].

Жонка – Ганна Забэла, *1807 г. н.

73/32 **Ганна,** *1812 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла з сем'ёй брата Стэфана ў маёнтку Міцявічы памешчыка Корсака[136].

74/32 **Леў-Лявонцій,** *1786 (1787) г. н. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета ад 30.09.1795 г., жыў у сяле Дзічкі маёнтка Доктаравічы на зямлі князя Дамініка Геранімавіча Радзівіла[137], па сямейных спісах дваран Слуцкага павета 1796 г.[138] і 1835 г. – у засценку Альшанка на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[139]. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 22.12.1802 г. прызнаны ў дваранстве. Зацверджаны ўказам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г.[140]

Жонка – Кацярына Корбут.

75/32 **Васіль,** *1794 г. н. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета ад 30.09.1795 г., жыў у сяле Дзічкі маёнтка Доктаравічы на зямлі князя Дамініка Геранімавіча Радзівіла[141]. Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[142].

76/33 **Марыяна,** *1778 (1780) г. н. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета ад 30.09.1795 г., жыла ў сяле Дзічкі маёнтка

Доктаравічы на зямлі князя Дамініка Геранімавіча Радзівіла[143], па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1796 г. – у засценку Альшанка[144].

77/33 **Самуіл-Сымон,** *1778 г. н. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета ад 30.09.1795 г., жыў у сяле Дзічкі маёнтка Доктаравічы на зямлі князя Дамініка Геранімавіча Радзівіла[145], па сямейных спісах дваран Слуцкага павета 1796 г.[146] і 1835 г. – у засценку Альшанка на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[147]. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 22.12.1802 г. прызнаны ў дваранстве.

Жонка – Францішка Міхайлаўна Смоліч.

78/33 **Іван,** *1793 г. н. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета ад 30.09.1795 г., жыў у сяле Дзічкі маёнтка Доктаравічы на зямлі князя Дамініка Геранімавіча Радзівіла[148], па сямейных спісах дваран Слуцкага павета 1796 г.[149] – у засценку Альшанка, 1835 г. – у засценку Гарохаўцы на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[150]. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 22.12.1802 г. прызнаны ў дваранстве. Зацверджаны ўказам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г.[151]

Жонкі: 1. N, ад яе дзеці Якаў, Гаўрыіл, Сымон; 2. Тэрэса Корзун, ад яе сын Нікадзім.

79/33 **Міхаіл,** *1787 г. н. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета ад 30.09.1795 г., жыў у сяле Дзічкі маёнтка Доктаравічы на зямлі князя Дамініка Геранімавіча Радзівіла[152], па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г. – у засценку Альшанка на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[153]. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 22.12.1802 г. прызнаны ў дваранстве. Зацверджаны ўказам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г.[154]

Жонка – Анастасія Бараноўская.

80/33 **Андрэй,** *1789 (1791) г. н. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета ад 30.09.1795 г., жыў у сяле Дзічкі маёнтка Доктаравічы на зямлі князя Дамініка Геранімавіча Радзівіла[155], па сямейных спісах дваран Слуцкага павета 1796 г.[156] і 1835 г. – у засценку Альшанка на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[157]. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 22.12.1802 г. прызнаны ў дваранстве. Зацверджаны ўказам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г.[158]

Жонка – Ганна Есьмант.

81/33 **Грыгорый,** *1782 (1794) г. н. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета ад 30.09.1795 г., жыў у сяле Дзічкі маёнтка Доктаравічы на зямлі князя Дамініка Геранімавіча Радзівіла[159], па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г. – у засценку Гарохаўцы[160]. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 22.12.1802 г. прызнаны ў дваранстве.

Жонка N, памерла да 1835 г.

82/33 **Еўдакія,** *1790 (1783) г. н. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета ад 30.09.1795 г., жыла ў сяле Дзічкі маёнтка Доктаравічы на зямлі князя Дамініка Геранімавіча Радзівіла[161], па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1796 г. – у засценку Альшанка[162].

83/34 **Фама-Цімафей (Тамаш),** *1789 (1787) г. н. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета ад 30.09.1795 г., жыў у сяле Дзічкі маёнтка Доктаравічы на зямлі князя Дамініка Геранімавіча Радзівіла[163], па сямейных спісах дваран Слуцкага павета 1796 г.[164] і 1835 г. – у засценку Альшанка на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[165]. Пастановай Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 22.12.1802 г. прызнаны ў дваранстве. Зацверджаны ўказам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г.[166]

Жонка – Ганна Міхайлаўна Булат.

84/34 **Іван,** *1792 г. н. Па рэвізскай сказцы чыншавай шляхты Слуцкага павета ад 30.09.1795 г., жыў у сяле Дзічкі маёнтка Доктаравічы на зямлі князя Дамініка Геранімавіча Радзівіла[167], па сямейных спісах дваран Слуцкага павета 1796 г.[168] і 1835 г. – у засценку Альшанка на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[169].

Жонка – Сафія Андруховіч.

85/34 **Ганна,** *1781 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1796 г., жыла ў засценку Альшанка[170].

86/34 **Людовіка,** *1787 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1796 г., жыла ў засценку Альшанка[171].

87/38 **Іван,** *1817 г. н. Па сямейных спісах дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Язвіны пры сваяку Івану Смолічу[172], 1878 г. – у вёсцы Прусы на арэнднай зямлі[173]. Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[174].

Жонка – Ганна Венядзіктаўна, *1820 г. н.

88/38 **Васіль,** *1824 г. н. Па сямейных спісах дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Язвіны пры сваяку Івану Смолічу[175], 1878 г. – у вёсцы Прусы на арэнднай зямлі[176]. Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[177]. Памёр да 1893 г.

Жонка – Параскевія Васільеўна Пількевіч, *1848 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыла з сям'ёй сына Андрэя ў вёсцы Прусы Цараўскай воласці на чыншавай зямлі[178].

89/40 **Павел.**

Жонка – Ганна Антонава.

90/40 **Іосіф,** нарадзіўся 27.04.1820 г., каталіцкага веравызнання. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Гедронаўшчына Клецкай воласці на зямлі князя Радзівіла[179].

Жонка – Феафіла Антонаўна Таўрогінская.

91/40 **Карл,** *1823 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1878 г., жыў у засценку Кухцічы Клецкай воласці на арэнднай зямлі[180]. Зацверджаны ў дваранстве ўказам Сената ад 12.08.1875 г., № 2773. Памёр да 1893 г.

Жонка – Эмілія Антонава Таўроцінская, *1837 г. н. Па сямейных спісах дваран Слуцкага павета 1878 г.[181] і 1893 г.[182], жыла ў засценку Кухцічы на арэнднай зямлі.

92/42 **Калікст,** нарадзіўся 01.09.1817 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Васіль Барок на арэнднай зямлі генерала Прушынскага[183]. Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[184].

93/42 **Фёдар,** нарадзіўся 16.05.1820 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Васіль Барок на арэнднай зямлі генерала Прушынскага[185]. Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[186]. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у фальварку Заастравечча Заастравецкай воласці[187].

94/42 **Васіль,** нарадзіўся 22.03.1828 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Васіль Барок на арэнднай зямлі генерала Прушынскага[188]. Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[189].

95/42 **Якаў,** нарадзіўся 25.10.(?1831) г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Васіль Барок на арэнднай зямлі генерала Прушынскага[190]. Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[191].

96/42 **Адам,** нарадзіўся 30.02.1832 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Васіль Барок на арэнднай зямлі генерала Прушынскага[192]. Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[193].

97/42 **Елізавета,** *1835 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў засценку Васіль Барок на арэнднай зямлі генерала Прушынскага[194].

98/43 **Павел,** *1826 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Балотчыцы на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[195]. Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г., № 1707, зацверджаны ў дваранстве[196].

Жонка – Магдалена Адамаўна.

99/43 **Канстанцін,** *1831 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Балотчыцы на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[197]. Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[198].

У 1889 г. у Мінскім акруговым судзе разглядалася справа па абвінавачванні дваран Івана Антонава і Аксінні Міхайлавай Кернажыцкіх у нанясенні ран дваранам Канстанціну Фёдараву і Фёдару Антонаву Кернажыцкім. У прадпісанні Мінскага акруговага суда Чапліцкаму валасному праўленню Слуцкага павета аб выкліку аднаго сведкі на пасяджэнне суда ад 19.04.1889 г. сказана: «Окружной суд предписывает Волостному правлению немедленно объявить дворянам Федору Антонову и Константину Федорову Керножицким, проживающим в заст. Болотчицах, что, так как при предварительном следствии Игнатий Белькевич, Андрей Корбут и Гавриил Керножицкий были допрошены на ссылке обвиняемых Ивана и Аксиньи Керножицких, что по ссылке их были допрошены на предварительном следствии Гавриил Керножицкий и Иван Корзун, из коих первый на допросе при предварительном следствии показал, что по делу ничего не знает, и что они в прошении своем не указывают фамилий тех свидетелей, коих желали бы вызвать ко дню разбора дела, а потому... будет вызван ко дню судебного по их делу с Иваном и Аксинью Керножицкими заседания один лишь Иван Домиников Корзун, как свидетель события»[199].

У прыгаворы Мінскага акруговага суда ад 20.05.1889 г. сказана: «...частные обвинители двор. Федор Антонов и Константин Федоров Керножицкие... не явились... Окружной суд... постановил настоящее дело производством прекратить навсегда...»[200]

100/43 **Фёдар,** нарадзіўся 16.05.1836 г. у засценку Балотчыцы ў сям'і Фёдара Гаўрыілавіча і Дарыі Мікалаеўны Кернажыцкіх. Ахрышчаны 17.05.1836 г. святаром Іосіфам Кузьмічом Журакоўскім у Прускай Раство-Багародзіцкай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Васіль Барок Іеранім Мацвеевіч Беразоўскі і дачка жыхара засценка Балотчыцы Дзям'яна Іванавіча Кернажыцкага Ганна, дзяўчына[201].

101/43 **Анастасія,** нарадзілася 29.10.1838 г. у засценку Балотчыцы ў сям'і Фёдара Гаўрыілавіча і Дарыі Мікалаеўны Кернажыцкіх. Ахрышчана 29.10.1838 г. святаром Іосіфам Кузьмічом Журакоўскім у Прускай Раство-Багародзіцкай царкве. Хросныя бацькі – жыхары засценка Васіль Барок Іеранім Мацвеевіч Беразоўскі і дачка жыхара засценка Балотчыцы Дзям'яна Іванавіча Кернажыцкага Ганна, дзяўчына[202].

102/43 **Ганна,** *1824 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў засценку

Балотчыцы на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[203].

103/43 **Палагія,** *1833 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў засценку Балотчыцы на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[204].

104/43 **Тэкля.**

105/43 **Агафія.**

106/45 **Аляксандр.** Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[205].

107/45 **Лявон (Леў),** *1820 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Балотчыцы на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[206]. Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[207].

108/46 **Іван,** *1817 (1823) г. н. Па сямейных спісах дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Заброцкія на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[208], 1893 г. – у фальварку Скользкі Пагосцкай воласці[209]. Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[210].

109/46 **Нікіфар,** *1827 г. н. Па сямейных спісах дваран Слуцкага павета 1835 г.[211] і 1893 г., жыў у засценку Заброцкія на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[212]. У 1913 г. жыў у вёсцы Танежычы Чапліцкай воласці Слуцкага павета. Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г., № 1707, зацверджаны ў дваранстве[213].

Жонка – Анастасія Паўлаўна.

110/46 **Лука,** *1829 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Заброцкія на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[214]. Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[215].

111/46 **Якаў,** нарадзіўся 20.03.1833 г. Па сямейных спісах дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Заброцкія на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[216], 1893 г. – у засценку Навінкі Вызнянскай воласці на арэнднай зямлі[217].

Жонкі: 1. N; 2. Ксенія Якаўлеўна Загароўская, *1843 г. н.

112/46 **Марыя,** *1822 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў засценку Заброцкія на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[218].

113/46 **Матрона,** *1826 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў засценку Заброцкія на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[219].

114/47 **Ануфрый,** *1827 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Балотчыцы на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[220]. Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[221].

115/47 **Васіль,** *1832 (1823) г. н. Па сямейных спісах дваран Слуцкага павета 1835 г.[222] і 1893 г.[223], жыў у засценку Балотчыцы спачатку на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна, а пасля на выкупленай. Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[224].

Жонка – Уршуля Антонаўна Каліноўская, *1833 г. н.

116/47 **Фларыян.** Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[225].

117/48 **Варвара,** *1833 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў засценку Балотчыцы на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[226].

118/49 **Іван,** нарадзіўся 04.07.1848 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у

засценку Балотчыцы Чапліцкай воласці на чыншавай зямлі княгіні Гагенлоэ[227]. Быў прыхаджанінам Прускай царквы.

Жонка – Ксенія Міхайлаўна Бранавіцкая, *1853 г. н.

119/493 **Гаўрыіл,** нарадзіўся 12.07.1845 г. У 1878–1893 гг. жыў у засценку Балотчыцы Чапліцкай воласці Слуцкага павета, быў прыхаджанінам Прускай царквы.

Жонка – Акіліна Андрэеўна Корбут, *1854 г. н.

120/49 **Фёдар,** нарадзіўся 13.05.1842 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Балотчыцы Чапліцкай воласці на арэнднай зямлі[228].

Жонка – Кацярына Аляксандраўна Жывалкоўская, *1843 г. н.

121/49 **Павел,** *1832 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Балотчыцы на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[229]. Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[230].

122/49 **Дарамітон,** *1834 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Балотчыцы на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[231].

123/53 **Сымон,** *1818 г. н. Па сямейных спісах дваран Слуцкага павета 1835 г.[232] і 1878 г.[233], жыў у засценку Малая Альшанка на арэнднай зямлі. Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[234].

Жонка – Фёкла Іванаўна, *1820 г. н.

124/53 **Васіль,** нарадзіўся 03.03.1825 г. Па сямейных спісах дваран Слуцкага павета 1835 г.[235] і 1878 г.[236], жыў у засценку Малая Альшанка на арэнднай зямлі, 1893 г. – на ўласнай зямлі (16 дзесяцін)[237], 1894 г. – у маёнтку Белае Балота Слуцкага павета. Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[238].

12.08.1894 г. падаў скаргу судоваму следчаму на жыхара засценка Вялікая Альшанка Феафіла Бараноўскага, які 08.08.1893 г. ударыў ствалом ружжа па галаве яго сына Уладзіміра, пасля чаго Васіль Кернажыцкі вазіў сына ў Варшаву, дзе яму была зроблена аперацыя. Справу разглядаў Мінскі акруговы суд[239].

Жонка – Еўдакія Васільеўна Есмантовіч, *1838 г. н.

125/53 **Агата,** *1815 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў засценку Альшанка на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[240].

126/53 **Ганна,** *1821 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў засценку Альшанка на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[241].

127/53 **Малгарата,** *1828 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў засценку Альшанка на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[242].

128/54 **Іван,** нарадзіўся 15.09.1845 г. Быў прыхаджанінам Прускай Раство-Багародзіцкай царквы. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г.[243], жыў у засценку Балотчыцы на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна, 1893 г. – на выкупленай зямлі[244]. Па спісе землеўладальнікаў Слуцкага павета 1916 г., валодаў у засценку Балотчыцы зямлёй: двары і паркі – 1743 сажні, ворнай іржаной – 9 дзесяцін 574 сажні; сенакоснай па сухадоле – 3 дзесяціны, па балоце – 1 дзесяціна 589 сажняў, пашавай па лясным парасніку – 1 дзесяціна 1515 сажняў, усяго зручнай зямлі – 15 дзесяцін 2026 сажняў, нязручнай – 207 сажняў. Ацэнка маёнтка – 710 рублёў, падатак – 2 рублі 48 капеек[245].

Жонкі: 1. Таццяна Сямёнаўна Кернажыцкая (гл. «Кернажыцкія» 233/123), памерла 13.03.1885 г. ва ўзросце 36 гадоў ад чахоткі, пахавана 15.03.1885 г. святаром Прускай Раство-Багародзіцкай царквы[246]. Ад яе дзеці Васіль, Фёдар, Марыя, Ганна; 2. Сцепаніда Сцяпанава Кернажыцкая (гл. «Кернажыцкія» 261/144), шлюб 21.04.1885 г. у Вызнянскай царкве. Святар – Ваніфацій Васінскі. Сведкі – дваране засценка Альшанка Ануфрый Сямёнаў Кернажыцкі і Васіль Уладзіміраў Кернажыцкі, Лявонцій Грыгорыеў Бараноўскі і Іван Якаўлеў Кернажыцкі[247]. Ад яе дзеці Адам, Міхаіл, Вольга і Дарыя.

129/55 **Юстын,** *1847 г. н. Значыўся па рэвізскай сказцы 4-га Касыніцкага ўчастка ад 22.12.1864 г.[248]

130/55 **Міхаіл,** *1839 г. н. Значыўся па рэвізскай сказцы 4-га Касыніцкага ўчастка ад 22.12.1864 г.[249]

Жонка – Настасся Ігнацьеўна, *1841 г. н.

131/55 **Мікалай,** *1844 г. н. Значыўся па рэвізскай сказцы 4-га Касыніцкага ўчастка ад 22.12.1864 г., у 1869 г. далучаны да Чапліцкай воласці[250]. Па спісе землеўладальнікаў Слуцкага павета 1916 г., валодаў у засценку Балотчыцы зямлёй: двары і паркі – 1778 сажняў, ворнай іржаной – 9 дзесяцін 1774 сажні; сенакоснай па сухадоле – 2 дзесяціны, па балоце – 1 дзесяціна 838 сажняў, пашавай па лясным параснiку – 1 дзесяціна 1515 сажняў, усяго зручнай зямлі – 15 дзесяцін 1075 сажняў, нязручнай – 205 сажняў. Ацэнка маёнтка – 690 рублёў, падатак – 2 рублі 42 капейкі[251].

132/55 **Іван,** *1846 г. н. Значыўся па рэвізскай сказцы 4-га Касыніцкага ўчастка ад 22.12.1864 г., у 1869 г. далучаны да Чапліцкай воласці[252].

133/55 **Васіль,** *1850 г. н. Значыўся па рэвізскай сказцы 4-га Касыніцкага ўчастка ад 22.12.1864 г., у 1869 г. далучаны да Чапліцкай воласці[253]. Па спісе землеўладальнікаў 1-га стану Слуцкага павета 1915 г., валодаў сенакоснай зямлёй па балоце – 2 дзесяціны 1464 сажні, лесу – 22 328 сажняў, усяго зручнай зямлі – 3 дзесяціны 1296 сажняў, нязручнай – 144 сажні. Ацэнка маёнтка – 34 рублі[254].

134/55 **Раман,** *1856 г. н. Значыўся па рэвізскай сказцы 4-га Касыніцкага ўчастка ад 22.12.1864 г., у 1869 г. далучаны да Чапліцкай воласці[255].

135/55 **Пётр,** нарадзіўся 23.08.1859 г. у засценку Балотчыцы Чапліцкай воласці. Значыўся па рэвізскай сказцы 4-га Касыніцкага ўчастка ад 22.12.1864 г., у 1869 г. далучаны да саслоўя сялян Чапліцкай воласці[256]. У 1905 г. жыў у вёсцы Вялікая Альшанка Вызнянскай воласці. Непісьменны. Дзяцей не было. Займаўся земляробствам. Меў 4 дзесяціны чыншавай зямлі, хату і гаспадарку. Воінскую павіннасць не адбываў («правая нога сагнута»). 18.04.1904 г. старшыня Вызнянскай воласці Слуцкага павета Мікалай Гаражанка ў суправаджэнні сельскага старасты Васіля Санюковіча і панятых прыбыў у вёску Вялікая Альшанка для спагнання мірскіх нядоімак з селяніна Пятра Мацвеева Кернажыцкага, якому было прапанавана добраахвотна выплаціць грошы. «Кернажицкий, бывший в нетрезвом виде, внести деньги отказался и когда старшина заметил ему, что вынужден будеть приступить к описи его имущества, схватил кол и, угрожая им старшине, сказал: “Ты – сукин сын, арестант, я тебя побью, вон со двора моего, не имеешь права описывать моего имущества, а то тебе смерть будеть или мне, все равно”.

Старшина прекратил взысканье и об оскорблении его при исполнении обязанностей службы составил акт…

Привлеченный к следствию в качестве обвиняемого, Петр Керножицкий виновным себя не признал и объяснил, что когда старшина Горожанко, которого он раньше не знал, явился к нему

взыскивать недоимки, он был пьян и спал. Разбуженный женой, он стал ее ругать, но при этом старшины не оскорблял и колом ему не угрожал, в подтверждение чего сослался на жену свою Агрипину Кернажицкую, которая показанье его подтвердила»[257].

Мінскі акруговы суд 21.02.1906 г. прыгаварыў Пятра Кернажыцкага да двух тыдняў арышту[258].

Жонка – Агрыпіна Іванаўна.

136/55 **Ганна,** *1844 г. н. Значылася па рэвізскай сказцы 4-га Касыніцкага ўчастка ад 22.12.1864 г., у 1869 г. далучана да Чапліцкай воласці[259].

137/64 **Іван-Фадзей,** ахрышчаны 28.05.1793 г. У непаўналетнім узросце разам з маці Петрунэляй з Кучэўскіх Кернажыцкай судзіўся са стольнікам Іванам Ліхадзіеўскім за спадчынныя маёнткі Уса Кернажэўшчызна і Навасады. Згодна са сведчаннем чыноўнікаў і памешчыкаў Бабруйскага павета 06.02.1820 г., 4 гады займаў засядальніцкую пасаду. Валодаў па вотчынным праве зямлёй з сялянамі ў Барысаўскім павеце. Па прадпісанні Мінскага павятовага аб халеры камітэта за подпісам прадвадзіцеля дваранства Бжазоўскага 02.04.1831 г. прызначаны на пасаду камісара ў г. Мінску, а 15.10.1831 г. – на пасаду папячыцеля.

Жонка – Ганна Крушынская.

138/66 **Сямён,** ахрышчаны 01.02.1783 г. Згаданы ў духоўным завяшчанні бацькі Міхаіла Івана-Фадзеева ад 01.09.1791 г., па якім ён з далёкімі сваякамі атрымаў у спадчыну маёнтак Дарагавіца. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 22.12.1802 г. прызнаны ў дваранстве. У 1835 г. працаваў у маёнтку Горкі аканомам[260].

Жонка – Вікторыя Янаўна Дзедалевіч.

139/66 **Іван,** *1756 г. н. У 1796 г. жыў у засценку Гарохаўцы.

Жонка – Марыяна Брытвічава.

140/66 **Кацярына.**

XI КАЛЕНА

141/71 **Грыгорый.** Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[261].

142/72 **Стэфан-Фелікс,** *1835 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у маёнтку Міцявічы памешчыка Корсака[262]. Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[263].

143/74 **Якаў,** *1810 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Альшанка на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[264]. У 1835 г. быў халастым. Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[265]. Памёр да 1893 г.

Жонка – Тэрэса Паўлаўна, народжаная Кернажыцкая, *1814 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыла з сям'ёй сына Васіля ў засценку Вялікая Альшанка на арэнднай зямлі[266].

144/74 **Стэфан (Сцяпан),** *1818 (1820) г. н. Па сямейных спісах дваран Слуцкага павета 1835 г.[267] і 1878 г.[268], жыў у засценку Альшанка на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна. Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[269].


Жонка – N, памерла паміж 1872 і 1878 гг.

145/75 **Сямён.** Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[270].


146/75 **Грыгорый.** Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[271].


147/75 **Ілья.** Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[272].


148/77 **Тэадор (Фёдар),** *1814 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у



Заклад ад 24.06.1699 г. рэчыцкага скарбніка Уладзіслава Яна Красоўскага і яго жонкі Кацярыны Пукеманкі маёнтка Луконе Віленскага ваяводства на рацэ Шырвінта за 3000 талераў бітых рэчыцкаму чашніку Міхаілу-Гераніму і яго пляменніку Аляксандру (на 4 старонках; польская мова). *LVIA, ф. 8, воп. 1, спр. 50, арк. 409–410 адв.*







Extrakt Dekretu Wyprowadzonego z Xięgi Deputacyi Wywodowey Gubernii Mińskiey


Wywod Familii Urodzonych Kiernożyckich

Herbu Junosza

Выпіс з кнігі Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 09.09.1816 г. вызначэння аб прызнанні ў дваранстве роду Кернажыцкіх герба «Юноша» ад 22.12.1802 г. (на 5 старонках; польская мова). *НГАБ, ф. 319, воп. 2, спр. 1386, т. 1, арк. 2–4.*




na Rodowitego Polskiego Szlach[illegible]
uznany, i onego do Xięgi Szlache[illegible]
[illegible] Minskiey Części [illegible]
wpisujemy, a [illegible]
[illegible] na świat tegoż Urodzonego [illegible]
na tem Wiarygodnego Wydać [illegible]
winniśmy. W tego Dekretu [illegible]
Podpisy następne. — Stanisław [illegible]
Marszałek Gubernii Minskiey Kawal[illegible]
[illegible] Anny drugiey Klassy — [illegible]
[illegible] Deputat z Powia[illegible]
[illegible]skiego. — Melchior Wołodkowi[illegible]
[illegible] Deputat — [illegible]
[illegible] Deputat z Powiatu
[illegible] i Kawaler Orderu Ś[illegible]
[illegible] — Bonawentura O[illegible]
Deputat z Powiatu Borys[illegible]
Michał Szyrma [illegible]
nik Woysk Polskich Deputat
tu Rzeczyckiego. — Antoni [illegible]
Deputat z Powiatu Ihum[illegible]
Paweł Jelenski Deputat z [illegible]
Mozyrskiego. — Julian [illegible]
Deputat z Powiatu Pinskiego
[illegible] Deputat z Powiatu [illegible]





№ 1430.


Extrakt Dekretu Wywodowego Familii WWo Kiernożyckich



Do Prześwietney Mińskiey Wywodowey Deputacyi


Прашэнне двараніна Барысаўскага павета, асэсара Бабруйскага павета Тадэвуша-Яна Янава Кернажыцкага ў Мінскі дваранскі дэпутацкі сход аб далучэнні да дваранскай справы роду Кернажыцкіх дадатковых дакументаў ад (20?).10.1832 г. (на 29 старонках; польская і руская мовы). *НГАБ, ф. 319, воп. 2, спр. 1386, т. 1, арк. 135–149 адв.*






136
























143
13
ЦѢНА ОДИНЪ РУБЛЬ






ЦѢНА ОДИНЪ РУБЛЬ







засценку Альшанка на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[273]. Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[274].

Жонка – Еўдакія.

149/77 **Марыяна,** *1811 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў засценку Альшанка на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[275].

150/77 **Марцыяна,** *1820 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў засценку Альшанка на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[276].

151/77 **Людвіка,** *1825 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў засценку Альшанка на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[277].

152/78 **Якаў,** *1817 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Гарохаўцы на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[278].

153/78 **Гаўрыіл,** нарадзіўся 25.03.1817 г. Па сямейных спісах дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Гарохаўцы на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[279], 1893 г. – у засценку Вялікая Млынка Цараўскай воласці на арэнднай зямлі[280]. Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[281].

154/78 **Сымон,** *1820 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Гарохаўцы на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[282]. Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[283].

155/78 **Нікадзім,** нарадзіўся 20.10.1833 г. Па сямейных спісах дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Гарохаўцы на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[284], 1878 г.[285] і 1893 г. – у засценку Вялікая Млынка Цараўскай воласці на арэнднай зямлі[286]. Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[287].

Жонка – Кацярына Нікіфараўна, народжаная Кернажыцкая, *1837 г. н.

156/78 **Людвіка,** *1825 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў засценку Гарохаўцы на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[288].

157/78 **Марыяна,** *1829 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў засценку Гарохаўцы на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[289].

158/79 **Павел,** *1819 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Альшанка на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[290]. Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[291].

159/79 **Андрэй,** *1825 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Альшанка на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[292]. Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[293].

160/79 **Грыгорый,** *1826 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Альшанка на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[294].

161/79 **Мар'яна,** *1817 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў засценку Альшанка на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[295].

162/79 **Аляксандра,** *1819 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў засценку Альшанка на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[296].

163/79 **Агата,** *1828 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў засценку Альшанка на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[297].

164/79 **Мар'яна,** *1830 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў засценку Альшанка на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[298].

165/79 **Людвіга,** *1833 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў засценку Альшанка на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[299].

166/79 **Нікіфар.** Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[300].

167/80 **Стэфан,** *1826 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Альшанка на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[301]. Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[302].

168/80 **Якаў,** нарадзіўся 27.10.1836 г. Па сямейных спісах дваран Слуцкага павета ад 15.03.1878 г., жыў у засценку Каралінкі на арэнднай зямлі[303], 1893 г. – у вёсцы Бранчыцы на арэнднай зямлі[304]. Зацверджаны ў дваранстве ўказам Сената ад 02.07.1873 г.

Жонкі: 1. N, памерла паміж 1873 і 1876 гг., ад яе дзеці Сямён, Кіпрыян, Васіль, Юстына; 2. Фёкла Міхайлаўна, ад яе дзеці Дзмітрый, Аляксандра.

169/80 **Тэкля,** *1827 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў засценку Альшанка на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[305].

170/80 **Агафія,** *1829 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў засценку Альшанка на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[306].

171/81 **Андрэй,** *1805 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Гарохаўцы[307].

Жонка – Магдалена Шуба.

172/81 **Марыяна,** *1815 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў засценку Гарохаўцы[308].

173/81 **Марыяна,** *1820 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў засценку Гарохаўцы[309].

174/83 **Міхаіл,** *1818 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Альшанка на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[310]. Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[311].

175/83 **Іван,** *1820 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Альшанка на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[312]. Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[313].

176/83 **Гіпаліт (Іпаліт),** *1826 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Альшанка на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[314]. Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[315].

177/83 **Феадор.**

Жонка – Юлія Францава.

178/83 **Яльяш,** *1834 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Альшанка на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[316].

179/83 **Францішка,** *1830 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў засценку Альшанка на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[317].

180/84 **Фёдар,** *1818 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Альшанка на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[318]. Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[319].

181/84 **Васіль,** нарадзіўся 07.03.1821 г., ахрышчаны 08.03.1821 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у засценку Альшанка на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[320]. Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. не зацверджаны ў дваранстве, таму што не быў указаны ў пасведчанні прадвадзіцеля дваранства[321].

182/84 **Тарэса,** *1817 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў засценку Альшанка на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[322].

183/84 **Аксення,** *1822 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыла ў засценку Альшанка на арэнднай зямлі князя Вітгенштэйна[323].

184/87 **Марыя,** *1857 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1878 г., жыла ў вёсцы Прусы на арэнднай зямлі[324].

185/87 **Параскоўя,** *1862 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1878 г., жыла ў вёсцы Прусы на арэнднай зямлі[325].

186/88 **Андрэй,** нарадзіўся 02.10.1847 г. Па сямейных спісах дваран Слуцкага павета 1878 г.[326] і 1893 г.[327], жыў у вёсцы Прусы на арэнднай зямлі.

Жонка – Алена Геранімаўна (? Кандрацьеўна) Муравіцкая, *1847 г. н.

187/88 **Казьма.** Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[328].

Жонка – Прасковія Васільеўна Барысовіч, *1848 г. н.

188/89 **Людвіг,** *1854 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у фальварку Гуцыне Цімкавіцкай воласці на арэнднай зямлі[329].

Жонка – Марыя Адамаўна Баркоўская, *1858 г. н.

189/89 **Пётр.**

190/89 **Антон,** нарадзіўся 01.12.1857 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Чайчыцы на арэнднай зямлі[330].

Жонка – Феафіла Дзмітрыеўна Яновіч, *1858 г. н.

191/90 **Антон,** нарадзіўся 11.06.1859 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Гедронаўшчына Клецкай воласці на зямлі князя Радзівіла[331].

Жонка – Міхаліна Валенцьеўна Якубоўская, *1863 г. н.

192/90 **Браніслаў,** нарадзіўся 07.03.1872 г. у засценку Сакаляцічы, ахрышчаны 03.04.1872 г. у Клецкім касцёле. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 28.02.1904 г. далучаны да дваранскага роду Кернажыцкіх з унясеннем у 6-ю частку радаводнай кнігі дваран Мінскай губерні[332].

193/90 **Казімір-Зянон,** нарадзіўся 12.07.1863 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Гедронаўшчына Клецкай воласці на зямлі князя Радзівіла[333].

194/90 **Казімір,** нарадзіўся 04.02.1869 г. у засценку Ліпка, ахрышчаны 07.04.1869 г. у Клецкім касцёле. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 28.02.1904 г. далучаны да дваранскага роду Кернажыцкіх з унясеннем у 6-ю частку радаводнай кнігі дваран Мінскай губерні[334].

195/90 **Люцыян,** нарадзіўся 29.08.1874 г. у засценку Яновічы, ахрышчаны 01.09.1874 г. у

Клецкім касцёле. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 28.02.1904 г. далучаны да дваранскага роду Кернажыцкіх з унясеннем у 6-ю частку радаводнай кнігі дваран Мінскай губерні[335].

196/90 **Уладзіслаў,** *1877 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Гедронаўшчына Клецкай воласці на зямлі князя Радзівіла[336].

196а/91 **Антон,** нарадзіўся 14.08.1866 г. Па сямейных спісах дваран Слуцкага павета 1878 г.[337] і 1893 г.[338], жыў у засценку Кухцічы на арэнднай зямлі.

197/91 **Люцыян,** нарадзіўся 02.11.1871 г. Па сямейных спісах дваран Слуцкага павета 1878 г.[339] і 1893 г.[340], жыў у засценку Кухцічы на арэнднай зямлі.

198/91 **Схаластыка,** *1873 г. н. Па сямейных спісах дваран Слуцкага павета 1878 г.[341] і 1893 г.[342], жыла ў засценку Кухцічы на арэнднай зямлі.

199/91 **Міхаліна,** *1877 г. н. Па сямейных спісах дваран Слуцкага павета 1878 г.[343] і 1893 г.[344], жыла ў засценку Кухцічы на арэнднай зямлі.

200/91 **Валерыя,** *1861 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1878 г., жыла ў засценку Кухцічы на арэнднай зямлі[345].

201/91 **Канстанцыя,** *1859 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1878 г., жыла ў засценку Кухцічы на арэнднай зямлі[346].

202/92 **Іўстын,** нарадзіўся 01.06.1846 г., праваслаўны. Значыўся ў саслоўі сялян. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у фальварку Заастравечча Заастравецкай воласці на зямлі дзядзькі Фёдара Феафілавіча (120 дзесяцін)[347]. Зацверджаны ў дваранстве ўказам Сената ад 05.10.1873 г., № 3594.

Жонка – Ганна Сцяпанаўна Л я ў к о в і ч, *1853 г. н.

203/92 **Пётр,** нарадзіўся 25.08.1851 г., праваслаўны. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у фальварку Заастравечча Заастравецкай воласці на зямлі дзядзькі Фёдара Феафілавіча (120 дзесяцін)[348].

Жонка – Юлія Антонаўна М а з а н, *1859 г. н.

204/92 **Грыгорый,** нарадзіўся 26.09.1853 г., праваслаўны. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у фальварку Заастравечча Заастравецкай воласці на зямлі дзядзькі Фёдара Феафілавіча (120 дзесяцін)[349].

Жонка – Мальвіна Іосіфаўна Р ы т в і н с к а я, *1867 г. н.

205/94 **Адам.**

206/98 **Міхаіл,** ахрышчаны 19.10.1855 г. у Прускай царкве. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 02.03.1899 г. далучаны да дваранскага роду Кернажыцкіх з унясеннем у 6-ю частку радаводнай кнігі дваран Мінскай губерні. Зацверджаны ўказам Сената ад 17.07.1900 г., № 99[350].

Жонка – В о л ь г а Ф ё д а р а ў н а.

207/98 **Феадор,** нарадзіўся 18.09.1863 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Гуткава Горкаўскай воласці Бабруйскага павета[351]. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 02.03.1899 г. далучаны да дваранскага роду Кернажыцкіх з унясеннем у 6-ю частку радаводнай кнігі дваран Мінскай губерні[352]. Зацверджаны ўказам Сената ад 17.01.1900 г., № 99.

Жонка – Аўдоцця Юстынаўна З а б р о ц к а я, *1873 г. н.

208/108 **Ануфрый,** 1867 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у фальварку Скользкі Пагосцкай воласці[353].

209/108 **Дамінік,** *1869 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у фальварку Скользкі Пагосцкай воласці[354].

210/108 **Міхаіл,** *1873 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у фальварку Скользкі Пагосцкай воласці[355].

211/108 **Тэрэса,** *1865 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыла ў фальварку Скользкі Пагосцкай воласці[356].

212/109 **Дзмітрый,** нарадзіўся 14.05.1866 г. у засценку Заброцкія, ахрышчаны 15.05.1866 г. у Чыжэвіцкай царкве. Лічыўся ў саслоўі аднадворцаў. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Забродскія Старобінскай воласці на чыншавай зямлі[357]. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 27.05.1914 г. далучаны да дваранскага роду Кернажыцкіх з унясеннем у 6-ю частку радаводнай кнігі дваран Мінскай губерні[358]. Зацверджаны ўказам Сената ад 28.11.1914 г., № 04392.

Жонка – Ева Грыгор'еўна Гурыновіч, *1887 г. н.

213/111 **Васіль,** *1859 г. н. У 1893 г. са сваёй сям'ёй жыў асобна ад бацькоў.

214/111 **Стэфан,** нарадзіўся 16.05.1865 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Навінкі Вызнянскай воласці на арэнднай зямлі[359].

Жонка – Марыя Станіславаўна Суднік, *1868 г. н.

215/111 **Іўліан,** нарадзіўся 10.08.1877 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Навінкі Вызнянскай воласці на арэнднай зямлі[360].

216/111 **Юлія,** па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыла ў засценку Навінкі Вызнянскай воласці на арэнднай зямлі[361].

217/115 **Марцініян,** нарадзіўся 09.02.1858 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Балотчыцы на выкупленай зямлі[362].

Жонка – Марыя Іўльянаўна, *1863 г. н.

218/118 **Георгій,** нарадзіўся 20.02.1877 г., ахрышчаны ў Прускай царкве. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Балотчыцы Чапліцкай воласці на чыншавай зямлі княгіні Гагенлоэ[363]. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 02.07.1898 г. далучаны да дваранскага роду Кернажыцкіх з унясеннем у 6-ю частку радаводнай кнігі дваран Мінскай губерні[364]. Зацверджаны ўказам Сената ад 28.12.1899 г., № 4127.

219/118 **Феафіл,** нарадзіўся 10.10.1878 г., ахрышчаны ў Прускай царкве. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Балотчыцы Чапліцкай воласці на чыншавай зямлі княгіні Гагенлоэ[365]. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 02.07.1898 г. далучаны да дваранскага роду Кернажыцкіх з унясеннем у 6-ю частку радаводнай кнігі дваран Мінскай губерні[366]. Зацверджаны ўказам Сената ад 28.12.1899 г., № 4127.

220/118 **Марыя,** *1881 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыла ў засценку Балотчыцы Чапліцкай воласці на чыншавай зямлі княгіні Гагенлоэ[367].

221/118 **Вольга,** *1886 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыла ў засценку Балотчыцы Чапліцкай воласці на чыншавай зямлі княгіні Гагенлоэ[368].

222/119 **Іван,** нарадзіўся 01.11.1878 г. у засценку Балотчыцы, ахрышчаны 05.11.1878 г. у Прускай царкве. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Балотчыцы Чапліцкай воласці на чыншавай зямлі[369].

Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 22.09.1898 г. далучаны да дваранскага роду Кернажыцкіх з унясеннем у 6-ю частку радаводнай кнігі дваран Мінскай губерні[370]. Зацверджаны ўказам Сената ад 12.08.1899 г., № 2746.

223/119 **Ганна.**

224/120 **Мікалай,** нарадзіўся 02.11.1868 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Балотчыцы Чапліцкай воласці на арэнднай зямлі[371]. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 31.12.1898 г. далучаны да дваранскага роду Кернажыцкіх з унясеннем у 6-ю частку радаводнай кнігі дваран Мінскай губерні[372]. Зацверджаны ўказам Сената ад 09.10.1899 г., № 3161.

225/120 **Канстанцін,** нарадзіўся 18.04.1870 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Балотчыцы Чапліцкай воласці на арэнднай зямлі[373]. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 31.12.1898 г. далучаны да дваранскага роду Кернажыцкіх з унясеннем у 6-ю частку радаводнай кнігі дваран Мінскай губерні[374]. Зацверджаны ўказам Сената ад 09.10.1899 г., № 3161.

226/120 **Іван,** нарадзіўся 19.04.1874 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Балотчыцы Чапліцкай воласці на арэнднай зямлі[375].

227/120 **Стэфан,** нарадзіўся 06.12.1878 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Балотчыцы Чапліцкай воласці на арэнднай зямлі[376].

228/120 **Міхаіл,** нарадзіўся 21.04.1882 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Балотчыцы Чапліцкай воласці на арэнднай зямлі[377].

229/123 **Ануфрый,** нарадзіўся 11.06.1847 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1878 г., жыў у засценку Малая Альшанка на арэнднай зямлі[378], у 1893 г. меў 16 дзесяцін зямлі ў засценку Малая Альшанка і 110 дзесяцін зямлі ў засценку Жываглядавічы[379]. Разам з Аляксандрай Дзмітрыеўнай Загароўскай быў хросным у Прускай Раство-Багародзіцкай царкве 07.03.1871 г. у Васіля[380], з Акілінай Дзмітрыеўнай Загароўскай 17.09.1872 г. – у Феадора[381], з Акілінай Андрэеўнай Корбут 25.08.1874 г. – у Марыі[382], дзяцей Івана Грыгор'евіча і Таццяны Сямёнаўны Кернажыцкіх.

Жонка – Антаніна Сцяпанаўна Ляўковіч, *1859 г. н.

230/123 **Сафія,** *1844 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1878 г., жыла ў засценку Малая Альшанка на арэнднай зямлі[383].

231/123 **Ульяна,** *1859 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1878 г., жыла ў засценку Малая Альшанка на арэнднай зямлі[384].

232/123 **Кацярына,** *1861 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1878 г., жыла ў засценку Малая Альшанка на арэнднай зямлі[385].

233/123 (?) **Таццяна,** *1849 г. н. Памерла 13.03.1885 г. ва ўзросце 36 гадоў ад чахоткі, пахавана 15.03.1885 г. святаром Прускай Раство-Багародзіцкай царквы[386]. Дзеці: Васіль (гл. «Кернажыцкія» 242/128), Фёдар (гл. «Кернажыцкія» 249/128), Марыя (гл. «Кернажыцкія» 243/128), Ганна (гл. «Кернажыцкія» 248/128).

Муж – Іван Грыгор'евіч Кернажыцкі (гл. «Кернажыцкія» 128/54).

234/123 (?) **Якаў.**

235/124 **Феафіл,** нарадзіўся 28.04.1863 г., ахрышчаны ў Вызнянскай царкве. Пісьменны. Па сямейных спісах дваран Слуцкага павета 1878 г., жыў у засценку Малая Альшанка Вызнянскай воласці на арэнднай зямлі[387], 1893 г. – на ўласнай зямлі[388].

Быў абвінавачаны селянінам засценка Малая Альшанка Сямёнам Грыгор'евічам Вечарам у «обольщении девицы», яго дачкі, Юліі Вечар (у выніку нарадзілася дзяўчынка Ганна). Шлюб Феафіл збіраўся ўзяць з іншай дзяўчынай. Вызначэннем ад 12.11.1886 г. Віленская судовая палата вырашыла: «1. Следствие... дальнейшим производством прекратить...; 2. Дело по обвинению тех же Керножицкого и Юлию Вечер в преступ. пред. ст. 994 улож. о наказ. передать на распоряжение прокурорского надзора...»[389]

Выступіў сведкам у Мінскім акруговым судзе па абвінавачванні мешчаніна г. Слуцка Феафіла Іванава Бараноўскага ў нанясенні ўдару ў галаву 08.08.1893 г. яго брату Уладзіміру Васільеву Кернажыцкаму[390].

236/124 **Уладзімір,** нарадзіўся 01.03.1871 г. Па сямейных спісах дваран Слуцкага павета 1878 г., жыў у засценку Малая Альшанка Вызнянскай воласці на арэнднай зямлі[391], 1893 г. – на ўласнай зямлі[392], 1894 г. – у маёнтку Белае Балота Слуцкага павета.

У 1895–1896 гг. Мінскі акруговы суд разглядаў справу па абвінавачванні мешчаніна г. Слуцка Феафіла Іванава Бараноўскага ў нанясенні ўдару ў галаву Уладзіміру Васільеву Кернажыцкаму. У абвінаваўчым акце таварыша пракурора Томсана для правядзення следства ад 21.01.1896 г. сказана: «Проживающий в имении Белое Болото Слуцкого уезда дворянин Василий Керножицкий 12 августа 1894 года письменно заявил местному судебному следователю, а затем показал ему и на допросе, что 8 августа 1893 года житель застенка Большая Ольшанка Феофил Барановский, застигнутый на поле имения, где он ходил по посевам с ружьем и собаками, нанес его сыну Владимиру Керножицкому ударом ружейного ствола в голову столь тяжкия повреждения черепа, что спустя некоторое время он сошел с ума. А так как таковое состояние продолжалось несколько месяцев, то он, Керножицкий, повез своего сына в Варшаву и поместил в хирургический барак, где 12 мая ему и произвели операцию, состоявшую в извлечении куска вдавленной черепной кости. Но и после того его сын продолжал проявлять признаки умственного разстройства и только в последнее время пришел в нормальное состояние.

Допрошенный 26 сентября 1894 года сам потерпевший Владимир Керножицкий объяснил, что 8 августа 1893 года, проходя со своими братьями: Николаем и Феофилом и соседом Федором Барановским по отцовским полям, он застал на них жителей застенка Большая Ольшанка: Феофила, Александра, Иосифа и Григория Барановских и Петра Понтуса, которые с ружьями и собаками ходили по яровым посевам, вследствие чего он, при содействии братьев, прогнал их оттуда. Отойдя затем несколько шагов, он услышал за собою крик: "Стой, а то убьем!" и, испугавшись таких угроз, так как у вышеназванных людей были ружья, остановился. В эту минуту к нему подскочил Феофил Барановский и стволом ружья так сильно ударил его в голову, что он лишился сознания. После первой помощи, поданной местным фельдшером, рана на голове стала постепенно заживать, и он, потерпевший, никаких бурных последствий от нанесенного ему удара не испытывал, но спустя несколько месяцев у него стали появляться сильныя головные боли и, по словам его родных, он потерял розсудок, и пришел в нормальное состояние лишь после произведенной в Варшаве операции.

При судебно-медицинском освидетельствовании потерпевшего, произведенном того же

26 сентября 1894 года, Слуцкий уездный врач нашел у него в области левой темянной кости углубление, произошедшее от извлечения путем операции придавленного в этом месте куска черепной кости, каковое повреждение и отнес к разряду тяжких, причем между прочим высказал, что хотя в момент освидетельствования Керножицкий и оказался психически вполне здоровым, но при известных неблагоприятных обстоятельствах разстройство умственных способностей у него может повториться.

Допрошенные же в качестве свидетелей доктора: Васильев и Цунге, производившие в Варшавском хирургическом бараке операцию Кернажицкому, удостоверили на следствии, что он поступил в их пользование 11 мая 1894 года с признаками психического разстройства, известного под названием аментической мании (mania amentica). По изследовании Керножицкого у него оказалось вдавление куска левой темянной кости величиною в двухкопеечную монету и глубиною в 1/2 сантиметра; путем операции, произведенной 12 мая этот кусок кости был извлечен, но несмотря на это, в состоянии больного до самого выхода его из барака улучшения не последовало, и если спустя некоторое время он и выздоровел совершенно, тем не менее констатированное у него психическое разстройство может снова повториться, так как от нанесенного Керножицкому удара должно было произойти сотрясение мозга. Во всяком же случае они признают причиненное ему повреждение черепа тяжким, условно смертельным.

Спрошенные затем... Феофил и Николай Керножицкие вполне подтвердили... как Феофил Барановский ударил их брата по голове стволом ружья...

Привлеченный... мещанин Феофил Иванов Барановский не признавая себя виновным в сем преступлении, заявил, что он никакого удара Керножицкому не наносил, ружья вовсе не имеет и 8 августа 1893 года на поле с ним даже не встречался...»[393]

У прыгаворы Мінскага акруговага суда ад 08.05.1896 г. сказана: «...принимая во внимание несовершеннолетие осужденного, его крайнее невежество и по обстоятельствам дела Окружной суд... признает справедливым означенное нормальное наказание понизить по отношению к Барановскому на две степени, назначив ему таковое... по лишении всех прав состояния, сослать на поселение в места Сибири, не столь отдаленные. Последствием ссылки на поселение для Барановского... должны быть потеря им прежних прав семейственных и прав собственности... на осужденного Барановского должна пасть и уплата судебных издержек, а в случае несостоятельности его к платежу издержек, таковые надлежит принять на счет казны...»[394]

237/124 **Мікалай,** нарадзіўся 05.10.1875 г. Па сямейных спісах дваран Слуцкага павета 1878 г., жыў у засценку Малая Альшанка Вызнянскай воласці на арэнднай зямлі[395], 1893 г. – на ўласнай зямлі[396]. Выступіў сведкам у Мінскім акруговым судзе па абвінавачванні мешчаніна г. Слуцка Феафіла Іванава Бараноўскага ў нанясенні ўдару ў галаву 08.08.1893 г. яго брату Уладзіміру Васільеву Кернажыцкаму[397].

238/124 **Алена,** *1862 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1878 г., жыла ў засценку Малая Альшанка на арэнднай зямлі[398].

239/124 **Юлія,** *1869 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1878 г., жыла ў засценку Малая Альшанка на арэнднай зямлі[399].

240/124 **Вольга,** *1875 (1874) г. н. Па сямейных спісах дваран Слуцкага павета 1878 г., жыла ў засценку Малая Альшанка Вызнянскай воласці на арэнднай зямлі[400], 1893 г. – на ўласнай зямлі[401].

241/124 **Ганна,** *1877 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1878 г., жыла ў засценку Малая Альшанка на арэнднай зямлі[402].

242/128 **Васіль,** нарадзіўся 05.03.1871 г. у засценку Балотчыцы Чапліцкай воласці ў сям'і Івана Грыгор'евіча і Таццяны Сямёнаўны Кернажыцкіх. Ахрышчаны 07.03.1871 г. святаром Паўлам Маскалевічам у Прускай Раство-Багародзіцкай царкве. Хросныя бацькі – дваранін засценка Вялікая Альшанка Ануфрый Сямёнаў Кернажыцкі і дачка аднадворца засценка Касынічы Дзмітрыя Загароўскага Аляксандра, дзяўчына[403]. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Балотчыцы на выкупленай зямлі[404]. Памёр 23.04.1903 г. ад чахоткі, пахаваны 25.04.1903 г. святаром Прускай Раство-Багародзіцкай царквы[405].

243/128 **Марыя,** нарадзілася 24.08.1874 г. у засценку Балотчыцы Чапліцкай воласці ў сям'і Івана Грыгор'евіча і Таццяны Сямёнаўны Кернажыцкіх. Ахрышчана 25.08.1874 г. святаром Паўлам Маскалевічам у Прускай Раство-Багародзіцкай царкве. Хросныя бацькі – дваранін засценка Вялікая Альшанка Ануфрый Сямёнаў Кернажыцкі і дачка аднадворца засценка Касынічы Андрэя Васільева Корбута Акіліна, дзяўчына[406]. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыла ў засценку Балотчыцы на выкупленай зямлі[407]. Мела дзяцей Адама, Паўла, Уладзіміра.

Муж – Іван Стэфанаў М а с а к о ў с к і, селянін засценка Сарога Бабруйскага павета, першым шлюбам, 26 гадоў. Шлюб 30.01.1900 г. у Прускай Раство-Багародзіцкай царкве. Святар – Феадор Маскалевіч. Сведкі: з боку маладога – сяляне засценка Сарога Іван Якаўлеў Шуба і засценка Балотчыцы Максім Нікіфараў Хаўстовіч, з боку маладой – селянін засценка Балотчыцы Венядзікт Іванаў Карповіч і дваранін Мікалай Мацвееў Кернажыцкі[408].

244/128 **Дар'я,** нарадзілася 06.03.1889 г. у засценку Балотчыцы Чапліцкай воласці ў сям'і Івана Грыгор'евіча і Стэфаніды Стэфанаўны Кернажыцкіх. Ахрышчана 10.03.1889 г. святаром Феадорам Маскалевічам у Прускай Раство-Багародзіцкай царкве. Хросныя бацькі – дваранін засценка Балотчыцы Маркіян Васільеў Кернажыцкі і дачка Івана Карлава Татура Іосіфа, дзяўчына[409]. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыла ў засценку Балотчыцы на выкупленай зямлі[410]. Разам з Міхаілам Максімавічам Гурбановічам была хроснай 05.12.1910 г. у Івана[411], сына Фёдара Іванавіча і Іуліі Фёдараўны Кернажыцкіх.

Муж – Васіль Пракопіеў К е р н а ж ы ц к і, 32 гадоў, дваранін засценка Вялікая Альшанка Вызнянскага прыхода. Шлюб 30.10.1911 г. у Прускай Раство-Багародзіцкай царкве. Святар – Іаан Кульчыцкі. Сведкі: з боку маладога – дваране засценка Вялікая Альшанка Іван Стэфанаў Яновіч і Аляксандр Пракопіеў Кернажыцкі; з боку маладой – дваране засценка Балотчыцы Адам Іванаў Кернажыцкі і Васіль Марцініянаў Кернажыцкі[412].

Дзеці: 1. Міхаіл, загінуў у час Вялікай Айчыннай вайны; 2. Валянціна, муж – Іван Іванавіч Папылёў, контр-адмірал Ваенна-Марскога флоту СССР; 3. Ніна; 4. Яўгенія, муж – Віктар Дзядовіч, дзеці: Уладзімір (жонка Зоя, дзеці Сяргей, Аляксандр), Зінаіда (муж Мікалай Сакалоўскі, дзеці Наташа, Валерый, Ігар).

245/128 **Адам,** нарадзіўся 18.01.1886 г. у засценку Балотчыцы Чапліцкай воласці ў сям'і Івана Грыгор'евіча і Стэфаніды Стэфанаўны Кернажыцкіх. Ахрышчаны 23.11.1886 г. святаром Феадорам

Маскалевічам у Прускай Раство-Багародзіцкай царкве. Хросныя бацькі – дваранін засценка Балотчыцы Маркіян Васільевіч Кернажыцкі і дачка аднадворца Мацвея Грыгор'ева Корбута Параскевія, дзяўчына[413]. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Балотчыцы на выкупленай зямлі[414]. Разам з Васілём Марцініянавічам Кернажыцкім быў сведкам з боку маладой пры шлюбе 30.10.1911 г. Васіля Пракаповіча Кернажыцкага і Дарыі Іванаўны Кернажыцкай[415]; з Міхаілам Канстанцінавым Кернажыцкім – з боку маладой пры шлюбе 29.06.1912 г. двараніна засценка Вялікая Альшанка Вызнянскага прыхода Віктара Васільевіча Кернажыцкага і дваранкі засценка Балотчыцы Анастасіі Марцініянавай Кернажыцкай[416]. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 21.03.1908 г. далучаны да дваранскага роду Кернажыцкіх[417].

Працаваў вясковым хатнім настаўнікам. З 1908 да 1911 г. служыў на Балтыйскім флоце. У час Першай сусветнай вайны ў 1916 г. быў мабілізаваны і накіраваны спачатку ў 103-і запасны батальён, а пасля ў запасны электратэхнічны батальён Петраграда, дзе скончыў курсы і быў камандзіраваны ў штаб галоўнага камандавання Паўночнай Арміі фронту. Дэмабілізаваны ў снежні 1918 г. Неаднаразова запрашаўся на розныя пасады ў органы Савецкай улады, але заўсёды адмаўляўся. Адмоўна ставіўся да калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Працаваў пчаляром. Памёр у 1939 г. ад інфаркту.

Жонка – Марыя Іосіфаўна Малевіч, *1893 г. н., дачка Іосіфа і Еўдакіі Малевічаў, мела брата Платона і сясцёр Алесю (Бранавіцкую), Ганулю. Брат Іван Сасноўскі.

246/128 **Міхаіл,** нарадзіўся 23.03.1891 г. у засценку Балотчыцы Чапліцкай воласці ў сям'і Івана Грыгор'евіча і Стэфаніды Стэфанаўны Кернажыцкіх. Ахрышчаны 25.03.1891 г. святаром Феадорам Маскалевічам у Прускай Раство-Багародзіцкай царкве. Хросныя бацькі – дваранін засценка Балотчыцы Маркіян Васільеў Кернажыцкі і дачка Івана Карлава Татура Іосіфа, дзяўчына[418]. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Балотчыцы на выкупленай зямлі[419]. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 21.03.1908 г. далучаны да дваранскага роду Кернажыцкіх[420].

247/128 **Вольга,** нарадзілася 22.11.1893 г. у засценку Балотчыцы Чапліцкай воласці ў сям'і Івана Грыгор'евіча і Стэфаніды Стэфанаўны Кернажыцкіх. Ахрышчана 23.11.1893 г. святаром Феадорам Маскалевічам у Прускай Раство-Багародзіцкай царкве. Хросныя бацькі – аднадворац засценка Балотчыцы Міхаіл Іеранімаў Корбут і жонка Венядзікта Іванавіча Карповіча Аляксандра Грыгор'ева[421]. Была хроснай разам з селянінам засценка Балотчыцы Антоніем Шулякоўскім 14.06.1909 г. у Любові, дачкі Івана Гаўрылава і Антаніны Іванавай Кернажыцкіх[422].

Муж – Міхаіл Іўліянаў Муравіцкі-Умрэйка, 30 гадоў, мешчанін з хутара Старое Селішча Амговіцкага прыхода Бабруйскага павета. Шлюб 24.10.1910 г. у Прускай Раство-Багародзіцкай царкве. Святар – Іаан Кульчыцкі. Сведкі: з боку маладога – мяшчане з урочышча Крывая Хвоя Феадор Лукін Глінскі і Васіль Іванаў Глінскі, з боку маладой – дваране засценка Балотчыцы Іван Гаўрыілаў Кернажыцкі і Феафіл Іванаў Кернажыцкі[423].

248/128 **Ганна,** нарадзілася 22.02.1882 г. у засценку Балотчыцы ў сям'і Івана Грыгор'евіча і Таццяны Сямёнаўны Кернажыцкіх. Ахрышчана 24.02.1882 г. у Прускай Раство-Багародзіцкай царкве. Святар – Павел Маскалевіч. Хросныя бацькі – дваранін засценка Малая Альшанка

Ануфрый Сямёнаў Кернажыцкі і жонка двараніна засценка Балотчыцы Якава Іванава Ляўковіча Юлія. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыла ў засценку Балотчыцы на выкупленай зямлі[424]. Памерла 02.03.1912 г. ад хваробы нырак, пахавана 04.03.1912 г. святаром Прускай Раство-Багародзіцкай царквы Іаанам Кульчыцкім[425].

249/128 **Феадор (Тэадор),** нарадзіўся 13.09.1872 г. у засценку Балотчыцы ў сям'і Івана Грыгор'евіча і Таццяны Сямёнаўны Кернажыцкіх. Ахрышчаны 17.09.1872 г. у Прускай Раство-Багародзіцкай царкве. Святар – Павел Маскалевіч. Хросныя бацькі – дваранін засценка Вялікая Альшанка Ануфрый Сямёнаў Кернажыцкі і дачка аднадворца засценка Касынічы Дзмітрыя Загароўскага Акіліна, дзяўчына[426]. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Балотчыцы на выкупленай зямлі[427]. Вызначэннем Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 21.03.1908 г. далучаны да дваранскага роду Кернажыцкіх[428].

Жонка – Юлія Феадорава.

250/130 **Аўдоцця.**

251/137 **Людамір-Аляксандр.** Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[429].

252/138 **Гіпаліт,** *1815 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1835 г., жыў у маёнтку Горкі, дзе яго бацька быў аканомам[430]. Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[431].

Жонка – Юзэфа Расцішэўская.

253/139 **Якаў,** *1793 г. н. Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. не зацверджаны ў дваранстве, таму што не быў указаны ў пасведчанні прадвадзіцеля дваранства[432].

254/139 **Андрэй,** *1795 г. н.

XII КАЛЕНА

255/141 **Ігнацій.**

256/141 **Ніканор,** нарадзіўся 28.07.1845 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Балотчыцы на арэнднай зямлі[433].

Жонка – Глікерыя Мацвееўна Бржазоўская, *1852 г. н.

257/141 **Іосіф,** нарадзіўся 30.09.1853 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Балотчыцы на чыншавай зямлі княгіні Гагенлоэ[434].

Жонка – Антаніна Васільеўна Цераховіч, *1863 г. н.

258/123 **Васіль,** нарадзіўся 26.04.1852 г.

259/143 **Іван,** нарадзіўся 28.06.1842 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Вялікая Альшанка на выкупленай зямлі[435].

Жонка – Варвара Якаўлеўна Вечар, *1850 г. н.

260/143 **Платон,** нарадзіўся 18.11.1849 г. Па сямейных спісах дваран Слуцкага павета 1878 г.[436] і 1893 г.[437], жыў у засценку Малая Альшанка Вызнянскай воласці спачатку на арэнднай зямлі, а пасля на ўласнай (16, 40 дзесяцін). Зацверджаны ў дваранстве ўказам Сената ад 05.10.1873 г.

Жонка –Матрона Грыгор'еўна Бараноўская, *1858 г. н.

261/144 **Стэфанія (Сцепаніда),** *1859 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1878 г., жыла ў засценку Малая Альшанка на арэнднай зямлі[438]. Мела дзяцей: Адама (гл. «Кернажыцкія» 245/128), Міхаіла (гл. «Кернажыцкія» 246/128), Вольгу (гл. «Кернажыцкія» 247/128) і Дарыю (гл. «Кернажыцкія» 244/128).

Муж – Іван Грыгор'еў Кернажыцкі, удавец (гл. «Кернажыцкія» 128/54). Шлюб 21.04.1885 г. у Вызнянскай царкве. Святар – Ваніфацій Васінскі. Сведкі – дваране засценка Альшанка Ануфрый

Сямёнаў Кернажыцкі і Васіль Уладзіміраў Кернажыцкі, Лявонцій Грыгор'еў Бараноўскі і Іван Якаўлеў Кернажыцкі[439].

262/144 **Ефрасіння,** *1861 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1878 г., жыла ў засценку Малая Альшанка на арэнднай зямлі[440].

263/144 **Іўсцінія,** *1867 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1878 г., жыла ў засценку Малая Альшанка на арэнднай зямлі[441].

264/144 **Вольга,** *1872 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1878 г., жыла ў засценку Малая Альшанка на арэнднай зямлі[442].

265/148 **Пракопій (Пракофій),** *1837 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Вялікая Альшанка на чыншавай зямлі княгіні Гагенлоэ[443]. Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[444].

Жонка – Акуліна Марцінаўна Бялькевіч, *1853 г. н.

266/148 **Міхаіл,** нарадзіўся 08.11.1854 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Танежычы Чапліцкай воласці на чыншавай зямлі [445]. Указам Сената па Дэпартаменце Герольдыі ад 15.02.1855 г. зацверджаны ў дваранстве[446].

Жонка – Еўдакія Феліксаўна Няпрэцкая, *1845 г. н.

267/148 **Гаўрыіл,** нарадзіўся 15.02.1844 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Альшанка на чыншавай зямлі княгіні Гагенлоэ[447].

268/148 **Сава,** нарадзіўся 06.12.1848 г. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1893 г., жыў у засценку Альшанка на чыншавай зямлі княгіні Гагенлоэ[448].

Жонка – Іўсцінія Антонаўна Бараноўская, *1866 г. н.

269/155 **Міхаіл,** нарадзіўся 11.01.1859 г. Па сямейных спісах дваран Слуцкага павета 1878 г.[449] і 1893 г., жыў у засценку Вялікая Млынка Цараўскай воласці на арэнднай зямлі[450].

Жонка – Соф'я Васільеўна Бараноўская, *1871 г. н.

270/155 **Фёдар,** нарадзіўся 19.09.1862 г. Па сямейных спісах дваран Слуцкага павета 1878 г.[451] і 1893 г., жыў у засценку Вялікая Млынка Цараўскай воласці на арэнднай зямлі[452].

Жонка – Соф'я Францаўна Крукоўская, *1863 г. н.

271/155 **Якаў,** нарадзіўся 09.10.1866 г. Па сямейных спісах дваран Слуцкага павета 1878 г.[453] і 1893 г., жыў у засценку Вялікая Млынка Цараўскай воласці на арэнднай зямлі[454]. Скончыў настаўніцкую семінарыю. У 1893 г. працаваў настаўнікам у народным вучылішчы ў г. Мінску. Прапрацаваў настаўнікам 7 гадоў.

У 1895–1897 гг. жыў у маёнтку Яромічы Забалоцкай воласці Бабруйскага павета. Рухомая маёмасць яго ацэньвалася ў 5000. У 1895 г. Якаў Нікадзімавіч Кернажыцкі ўзяў у арэнду Яроміцкі вінакурны завод, на якім у 1897 г. адбыўся няшчасны выпадак. У абвінаваўчым акце таварыша пракурора Томсана для правядзення следства па абвінавачванні двараніна Якава Нікадзімава Кернажыцкага і селяніна Андрэя Андрэева Чачота ў гібелі на Яроміцкім вінакурным заводзе Мікіты Еўдакімчыка ад 14.06.1897 г. сказана: «...на возникшем по сему поводу предварительном следствии совокупностью показаний свидетелей Сергея Чакуры, Федора Марынича, Ивана Горячки и Степана Горячки обнаружено, что Никита Евдокимчик поступил на завод 8 января, сменив Сергея Чакуру, ушедшего на неделю домой и, проработав весь день, 9 января, на следующее утро, еще до света, попросил рабочего Ивана Горячку

носить вместо него мешки с солодом, а сам отправился в манеж гонять лошадей, приводивших в действие помпу. Между тем вошедший туда через несколько минут Иван Горячка не застал уже в манеже Евдокимчика, а лошадей нашел стоящими на месте, каковому обстоятельству однако не придал особого значения, думая, что Евдокимчик совершенно бросил работу и ушел домой. Но когда спустя несколько часов на заводе оказались вещи Евдокимчика, то стали повсеместно его разыскивать и, наконец, нашли его труп на дне девятиаршинного колодца устроенного внутри полутемного манежа при одной из стен его, куда незнакомый человек весьма легко мог попасть, так как колодез этот, сруб которого доходил лишь до уровня земли, ничем огорожен не был и сверху прикрыт был только тремя бревнами, между которыми были широкие промежутки, куда свободно мог провалиться взрослый человек...

Привлеченные затем к делу в качестве обвиняемых... арендатор Еремичского винокуренного завода Яков Керножицкий и винокур Андрей Чечот, не признавая себя виновными в непринятии на заводе мер предосторожности... объяснили следующее:

Павел Кернажыцкі. Меў сыноў: **Казіміра,** *1736 г. н. (жонка Марыяна Іскрыцкая, дзеці: **Сымон,** *1781 г. н., **Грыгорый**, *1783 г. н., **Гелена,** *1779 г. н.); **Васіля,** *1746 г. н. (жонка Тэрэса Заблоцкая, сын **Стэфан,** *1780 г. н.). Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1796 г., Казімір і Васіль з сем'ямі жылі ў засценку Гарохаўцы[597].

Тамаш Кернажыцкі. Меў сына **Яна,** *1756 г. н., у якога ад шлюбу з Марыянай Перагуд было дзве дачкі: **Францішка,** *1784 г. н., і **Анастасія,** *1788 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1796 г., сям'я Яна жыла ў засценку Гарохаўцы[598].

Грыгорый Кернажыцкі. Меў сына **Міхаіла,** *1756 г. н., у якога ад шлюбу з Агатай Мацкевіч было трое дзяцей: **Сымон,** *1795 г. н., **Гелена,** *1778 г. н., і **Марыяна,** *1792 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1796 г., сям'я Міхаіла жыла ў засценку Гарохаўцы[599].

Ян Кернажыцкі. Меў двух сыноў: **Тэафіля,** *1751 г. н. (жонка – N Мастовіч, дзеці: **Павел,** *1771 г. н., **Ян,** *1774 г. н., **Міхаіл,** *1776 г. н., **Тэафіля,** *1791 г. н.); **Іосіфа,** *1756 г. н. (жонка – N Статкевіч, дзеці: **Міхаіл,** *1792 г. н., **Францішка,** *1789 г. н.). Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1796 г., сем'і Тэафіля і Іосіфа жылі ў засценку Язвіла[600].

Грыгорый Кернажыцкі. Меў дзяцей: **Стэфана,** *1766 г. н., і **Эльжбету,** *1776 г. н. Па сямейным спісе дваран Слуцкага павета 1796 г., Стэфан значыўся ўдаўцом, жыў са сваім сынам **Геранімам,** *1789 г. н., і сястрой у засценку Язвіла[601].

Барбара Кернажыцкая з Рамячоўшчызны.

Муж – Сымон З у б о в і ч. Шлюб 09.01.1781 г. у Капыльскім касцёле. Сведка Станіслаў Цяльшэўскі[602].

Апалонія Кернажыцкая з Доктаравіч. Памерла 20.06.1795 г. ва ўзросце 22 гадоў, пахавана ксяндзом Капыльскага касцёла[603].

Ян Кернажыцкі. Значыўся па бірчаку засценка Альшанка – 1 1795 г., валодаў 1/4 валокі аселай зямлі, плаціў чынш у 10 злотых[604].

Злева Марыя Іосіфаўна Кернажыцкая (Малевіч), сядзіць Платон Іосіфавіч Малевіч. Слуцк. 1920-я гг. (гл. «Кернажыцкія» 245/128).





Адам Іванавіч
Кернажыцкі.
Слуцк. 1920-я гг.
(гл. «Кернажыцкія»
245/128).



Аляксандр
Пракоф'евіч
Кернажыцкі.
Ленінград. 1949 г.
(гл. «Кернажыцкія»
361/265).

РАДАВОДНЫЯ РОСПІСЫ

Нейкі Андрэй Маствіловіч у 1450 г. фундаваў касцёл у мястэчку Клецк і ўдзельнічаў у паходах на Маскву ў 1444–1445 гг.[1]

I КАЛЕНА

1 **Жадзейка.** Згадваўся ў 1418 г.[2]

II КАЛЕНА

2/1 **Білій Жадзейкавіч.** Згадваўся ў 1448 г. Родапачынальнік Білевічаў[3].

3/1 **Маствіл Жадзейкавіч.** У перапісе родаў, прадстаўнікі якіх падпісалі Гарадзельскую унію ў 1413 г., пад № 32 значыцца «Монствилд герба “Даленга”: Монствилдовичи, Ж[а]м[ойтское] Кн[яжество]»[4]. Згадваўся ў 1440, 1450 гг.[5] Родапачынальнік Маствіловічаў.

III КАЛЕНА

4/2 **Даўгірд Білевіч,** 1447(?)–1489 гг.[6]

5/2 **Івашка Білевіч.** Згадваўся ў 1486 г. Родапачынальнік Івашковічаў (Станкевічаў)[7].

6/2 **Юшка Білевіч.** Родапачынальнік Юшковічаў Білевічаў[8].

7/2 **Андрэй Білевіч.** Родапачынальнік Андрушковічаў Білевічаў[9].

8/3 **Багдан Маствіловіч**[10].

9/3 **Юрый Маствіловіч**[11].

IV КАЛЕНА

10/4 **Вацлаў Даўгірдавіч.** Згадваўся ў 1488 г. Памёр у *1509 г.[12]

Жонка – Дарота Юндзілаўна.

11/8 **Ян Маствіловіч.**

Жонка – (?) Ганна Петрашкоўна[13]. Верагодна, памылкова ўказана жонкай Яна Багданавіча. Трэба лічыць жонкай Яна Габрыэлевіча Маствіла.

12/8 **Андрэй Маствіловіч.**

Жонка – N, верагодна, была з роду Хршчановіч Дакурна, а Юрый Хршчановіч Дакурна быў сынам яе брата, паколькі называў Яна Андрэевіча Маствіловіча «братом стриечным», «кровным», «двоюродным», «прырожоным». Ёсць і іншыя версіі: 1) N паходзіла з нейкага іншага роду, а Юрый быў сынам яе сястры, якая была замужам за Хршчановічам Дакурнам; 2) N у першым шлюбе была за Хршчановічам Дакурнам, ад якога мела сына Юрыя.

13/8 **Габрыэль Багданавіч Маствіловіч.** 02.05.1525 г. заключыў з пляменнікам Янам Андрэевічам Маствіловічам пагадненне аб маёнтках Менядзікава, Амлішава і Уса:

«Я, Кгабриял Богданович Моствиловича, явно чиню сим моимъ листом, хто на него посмотрит або, чтучи, его вслышить, нинишнимъ и потом будучим, кому будеть потреб того ведати. Иж есми згодилися з братаничом моим Яном Андреевичом Моствиловича о именья в тот обычай, што я мел свою часть именья в Менедикове половицу [и] в Омлишо[в]е ему поступую вечно и на веки непорушно, ему самому и его жоне и ихъ детем и на потом будучим их счадком, з людми и с челядю

неволною и со всим с тым, как тая часть моя в Менедикове и в Омлишове, моя половица, здавна ... [пропущено одно слово] в собе са [ся – *надо*] мает и как есми сам то держал, ничого на мене и на мои наследки не оставляючи. А братанич мой Ян напротивку того мне поступил свою часть именья на Усе, што он держал. И вжо мы с обу сторон черес то не маем тое [ме]ны рушати, а естли бы хто з нас мял тую мену взрушать, тот мает заплатити вины г(о)с(по)д(а)рю королю его м(и)л(о)сти сто коп грошей, а пану воеводе виленскому пятдесят коп грошей, а сторона стороне тридцад коп грошей. И на то есми братаничу моему Яну дал сесь мои листъ з моею печатю. А при том были пан Богдан Григориевич, державца горболский, а Матей ... [пропуск], на(ме)стник койдановский велможного пана Олбрахта Мартиновича Кгаштовта, его м(и)л(о)сти воеводы виленского, а Василей Гринкевич Гладкович. Яко ж ихъ м(и)л(о)с(ти) на мою прозбу и печати свои приложили к сему моему листу. П(и)сан у Вилни под леты Божего нарож(енья) а ф ке (1525), м(е)с(я)ца мая в (2) ден, индик(т) г і (13)». Чатыры пячаткі не захаваліся[14].

Жонка – Ядвіга Станкаўна (Станіславаўна) Вілдуковіча, гаспадарская баярыня, ад шлюбу з Габрыэлем Багданавічам мела дзяцей: Яна, Ганну, Кацярыну. Пасля смерці Габрыэля Багданавіча выйшла замуж за Станіслава Багданавіча Карызну. Выдаючы замуж сваю дачку Кацярыну за Мацея Буйвіда, пазычыла ў мужа Станіслава Багданавіча паўтары сотні коп грошаў, якія аддала ў выправу на маёнтку Мярэцкае. Праз гады, 18.03.1558 г., за гэтую суму яна аддала ў заклад мужу і дзецям, ад яго народжаным, Мікалаю, Венцлаву і Себестыяну частку маёнтка Мярэцкае, выдзеленую ёй пасля смерці яе сястры Паланеі Станіславаўны Вілдуковіча. Спадчынніцай гэтай часткі маёнтка Мярэцкае Ядзвіга Вілдуковіча прызначыла сваю ўнучку Ядвігу, дачку памерлай дачкі Кацярыны[15].

14/8 **Станіслаў Багданавіч Маствіловіч.** Згадваўся ў 1525, 1553 гг.[16]

15/8 **Мікалай Багдановіч Маствіловіч.** Пасля яго смерці маёмасцю валодалі пляменнікі, што пацвярджаецца судовымі дакументамі: Ян Габрыэлевіч Маствіловіч 01.05.1548 г. атрымаў з суда Віленскага ваяводства позву, па якой быў выкліканы ў суд Мікалаем Петрушкевічам, койданаўскім баярынам, віленскай ваяводзінай, канцлеравай ВКЛ Гаштолтавай па абвінавачванні ў валоданні пасля смерці свайго дзядзькі Мікалая і яго жонкі маёнткамі на Усе ў Валожыне, на Саланой і ў Ашмене[17]. Пляменніца Мікалая Ганна Габрыэлеўна Маствілаўна была выклікана ў суд 10.05.1548 г. па скарзе Анфора Пятровіча, трабскага намесніка віленскай ваяводзіны, канцлеравай ВКЛ Албрыхтавай Марціновіча Гаштолтавай Зафеі з абвінавачваннем, што яна пасля смерці свайго дзядзькі Мікалая Маствіловіча «хотечи прыити ку именямъ его водле права прирожоного и обачивши то, ижъ безъ накладу своего к тымъ именямъ приити не может, а не маючи за недостатком своимъ на тое право с чого наложити, просила мене, абыхъ еи тыхъ именеи накладомъ своимъ тоеи правомъ довелъ, ижъ она с тое дядковщины своеи именеи Миколоевскихъ на Усе и в Солономъ по половицы... взяла»[18]. Ян Габрыэлевіч разам з жонкай Ганнай падаў (?)14.10.1551 г. скаргу ў суд на баярына гаспадарскага Віленскага павета Станіслава Струса: «Ты нет ведома в которыи обычаи дворецъ мои Ошменъскии, которыи на мене з делу от дядка моего Миколая Моствила прышолъ, держышъ, а мне его, яко властности моее поступити не хочешъ...»[19] Мікалай Маствіловіч згаданы ў дарчых дакументах Яна Маствілы жонцы Ганне Кандратовічаўне: ад 04.12.1554 г. на 400 коп грошаў, забяспечаных з дзвюма часткамі маёнтка Уса, а таксама 1/3 часткі маёнтка Уса з нявольнай чэляддзю і табуном коней[20]; а таксама ад 18.12.1561 г. у

лісце продажу сыну яго пляменніка Андрэя Янавіча Маствіла Балтрамею Томкавічу Лодвіку маёнтка ў Ашмене Маствілішкі[21].

Мікалай Маствіловіч быў жанаты, але дзяцей, верагодна, не меў.

16/9 **Станіслаў**[22].

V КАЛЕНА

17/10 **Ганна**[23].

18/10 **Эльжбета**[24].

19/11 **Крыштаф.**

Жонка – Кацярына Семашкоўна[25].

20/11 **Альжбета,** зямянка гаспадарская Ашмянскага павета. Разам з мужам Станіславам Струсам скардзілася 16.03.1541 г. у суд на пасынка дваюраднага брата Яна Андрэевіча Маствіловіча – баярына Віленскага павета Станіслава Янавіча Нарушэвіча. «Наславшы, дей, онъ слугъ и помочниковъ своих на двор нашъ моцно кгвальтомъ, казалъ нас побити и зграбити. И тые слуги и помочники у дворе нашомъ ворота выбили, окна порубали и детей нашыхъ, и челяд(ь) побили, помордовали и скрынку с п[е]ненезми, с перълы, з листы потребными, а коня, а два возы, а тры бочъки солоду, волы два, корову ручницу и инъшые многие речы домовые рухомые побрали. И первей того по колькукроть многие крывды, кгвалъты, бои и грабежы поделалъ, и служебникъ его Ракъ, будучи у Кракове, украл у мене кони два, о чомъ же перъвей сего неоднокрот(ь) отъца его ку праву есмо пользывали, а за нестаньемъ отъца его дано было намъ увязанье в тры службы людей его в шкодах нашых, а онъ и тые люди отънялъ в нас моцно кгвалътомъ...»[26]

12.01.1558 г. звярнулася ў суд: «...вчорашнего дня... велели, абы сынъ мои Воитехъ зо мною ся угодилъ, где жъ и угожали насъ люди добрые, але и позовъ мои загамовали конъца не учинивши, для чого жъ просила о вижа до еднача, которыи был з руки того сына ее Воитеха Властного, хотячи ведати, для чого позовъ ее загамовалъ. Мы давали еи на то вижомъ служебника моего судиного Гришка Кравца, которыи у Властного бывши и перед нами созналь, ижъ деи перед нимъ, вижомъ, Властныи вызналъ, же вжо межи ними угода сталася, а то тымъ обычаем, ижъ Воитех тои матце своеи маеть дати две копе грошеи и жита бочку, а к тому мает еи поступити в ыменьи своемъ Лостовскомъ у земляхъ и в лесехъ ровную часть»[27].

08.05.1559 г. зноў скардзілася ў суд на свайго сына Войцеха Пятровіча Нарушэвіча «што жъ деи онъ нетъ ведома в которыи обычаи люди, земли, сеножати именья Лостоиского, на которомъ мужъ мои, а отецъ его мне заставил, и они сами мне мешкати дозволили до живота моего, такъ тежъ и которую часть отчизны своее небожчикъ Юреи Петровичъ сынъ мои, а братъ его тестаменътомъ своимъ мне записалъ и того поступити не хочеть...»[28]

21.11.1560 г. была выклікана ў суд Андрэем Маствілам па спрэчцы аб валоданні службай людзей і землямі ў Ашмене[29].

19.02.1561 г. была выклікана ў суд баярынам княгіні Ільіной Галшанскай Мацеем Цянюцічам «о кгвалътовное наеханье на домъ его и о *з*битье жоны и дете*и* и о взятье хорътицы само четве*р*тое зъ щеняты и о шкоды и о инъшые речы...». На скаргу Альжбета адказала, што «сынъ её, Венъцлавъ, пры не*и* не мешкаеть и не жыветь з нею, але на слу*ж*бе и ни именья его не де*р*жу для чого жъ не повинъна за сына в о*т*казе быти, бо ми тежъ его не прыпоручоно...»[30].

Прадала зямяніну Ашмянскага павета Балтрамею Томкавічу Лодвіку маёнтак Маствілаўскае ў Ашмене за 30 коп грошаў. Атрымаўшы толькі 15 коп грошаў, падала скаргу ў суд за невяртанне астатніх коп грошаў. Судовае пасяджэнне было прызначана на 14.10.1561 г., але Альжбета на яго не з'явілася і ўпаўнаважанага ад сябе не накіравала. 17.10.1561 г. Балтрамей Лодвік

падаў пільнасць у суд[31]. Быў прызначаны новы тэрмін судовага пасяджэння – 14.12.1561 г., на якое не з'явіўся ўжо сам Лодвік, і Альжбета Маствілаўна Пятрова Нарушэвічава падала 16.12.1561 г. пільнасць у суд[32]. На наступны дзень (17.12.1561 г.) адбылося судовае паседжанне па названай скарзе[33].

Мужы: 1. Пётр Н а р у ш э в і ч, ад яго сыны Венцлаў, Юрый, Ян, Войцех Пятровічы Нарушэвічы; 2. Станіслаў С т р у с. Скардзіўся на Яна Андрэевіча Маствіловіча, які наносіў шкоду яму і яго людзям, за што па рашэнні суда быў уведзены ў тры службы людзей маёнтка Крэўскага, але Ян Маствіловіч людзей адабраў, а пасля смерці Яна Андрэевіча паўторна 25.05.1543 г. Станіславу Струсу прысудзілі тры службы людзей у маёнтку Крэўскім. Па рашэнні паноў рады Васіль Хоміч увёў у валоданне Станіслава Струса ў службу людзей Яна Маствіловіча пад Ашменаю ў 33 капы грошаў, у Яна Мітковіча ў 10 коп грошаў, у 23 капы грошаў увязаў у дворныя пашні, у палову маёмасці Маствіловіча, у палі – на 50 бочак, у сенажаці – на 30 вазоў сена і ў палову гаю[34].

Ян Загорскі, баярын троцкага ваяводы Мікалая Юр'евіча Радзівіла, скардзіўся 08.09.1553 г. у суд Віленскага ваяводства, што пасынак баярына гаспадарскага Станіслава Струса Венцлаў «пришедши деи на беседу мою до корчмы Терешковое под Кревом, мене збил и зранил, при которомъ деи зраненьи шкоды ся немалые стали и кгды деи я, взявши вижа, на огледане шкодъ своихъ приехал деи до дому своего, то пак деи с ты самъ и тымъ пасынком своимъ мало на томъ маючи, того вижа з двора г(о)с(по)д(а)ръского Вышневъского, Онъдрея Кирута збили и зранили, и пасынокъ деи его Венъцлавъ, за початкомъ того отчима своего, хибивши деи вижа, ранил матку свою в нос. А сына деи его на тот жо часъ при вижи збили и зранили и на тот жо час бол того тому вижу и сыну его шкоды се стали...»[35].

21/12 **Ян (Іван) Андрэевіч Маствіловіч,** уладальнік часткі маёнтка Уса, якую 02.05.1525 г. памяняў з дзядзькам Габрыэлем Багданавічам Маствілам на яго часткі маёнткаў Менядзікава і Амлішава[36]. Ставіў 5 коней на вайну ў 1525 г.[37] Згаданы ў перапісе войска ВКЛ ад замка гаспадарскага Навагрудскага 1528 г.: «Ян Моствилович мает ставити 5 конеи»[38].

Ян Маствіловіч Станіславу Струсу і яго людзям «крывды великие кгва*л*ты, бои, кграбежы почынилъ з ыменья Кревъского пасынъка своего, которого з ыменьемъ его тымъ на онъ часъ в опеце свое*и* мелъ», за што быў выкліканы ў суд. Па рашэнні суда Станіслаў Янавіч Струс быў уведзены ў валоданне трыма службамі людзей маёнтка Крэўскага, але Ян Маствіловіч тых людзей адабраў, зноў быў выкліканы ў суд, але хутка быў забіты[39]. Яго жонка Зафея Янавая Маствіловіча разам з яго братам (зводным або дваюрадным) скардзіліся 15.01.1541 г. у суд на Шчаснага Мажэйкавіча і Яна Габрыэлевіча Маствіловіча за забойства свайго мужа: «Земенинъ повету Виленьского Юръи Хрщоновичъ Докурновича, стоячы пры жоне небощыка Яна Моствиловича, кровного своего, покладалъ лист г(о)с(по)д(а)рьский позовный, писанъ до пана виленьского, его м(и)л(о)сти, о поставенье наместника его м(и)л(о)сти довънаровъского, в которомъ же листе г(о)с(по)д(а)ръскомъ жалоба Яновое выписана в тотъ обычай: "Жаловала пани Яновая Моствиловича Зофея с прырожоными небощыка мужа своего о томъ, што жъ, дей, дворанинъ г(о)с(по)д(а)ръский Щастьный Можейковичъ зъ Яномъ Кгабрыяловичомъ а з наместником пана виленъского довънаровъскимъ Васкомъ, москвитиномъ, и з ынъшыми помочники соими, прыехавшы до именья небощыка мужа ее, до Омълишова, его самого початкомъ, тотъ наместникъ пана виленьского Васко двема стрелами застрелилъ – одною в руку, другою в ногу, не маючы к нему

жадное потребы. И его поймали, и што-кольвекъ пры собе там в томъ именьи мелъ: п(е)н(е)зей, серебра, шатъ, цыну, котловъ, коней, стадо свирепъ и инъшых всякихъ домовыхъ статъковъ, то все побрали, и его самого, оковавшы в ланцуху и в железах, и в ручницах, до Вильни повезли и на дорозе его убили, и у воду утопили. И тое, дей, именье небощыка мужа ее Омълишовъ, не ведати, в который способъ, панъ виленъский на себе держыть. А такъ, абы его м(и)л(о)сть пан виленьский того истъца, отъ кого тое именье маеть, и тежъ оного убойцу, наместника своего Васка ку праву поставилъ". На то отъ пана виленьского марьшалокъ его м(и)л(о)сти, панъ Марько Лубъницъкий имянемъ панъскимъ просилъ, штобы панъ его не прытискан ку становенью врадника своего тут, але штобы захованъ, водлугъ прывилья земъского и права посполитого Великого князъства, абы его м(и)л(о)сть врадника своего судилъ самъ и справедливост(ь) с ним чынил, кому бы до него дело было.

Панове, их м(и)л(о)сть, бачачы, ачъ-кольвекъ слушъна бъ то была от пана виленьского прозба в речахъ ровныхъ, але, ижъ то речъ а прыгода не посполита, прото отложыли то их м(и)л(о)сть до науки г(о)с(по)д(а)ръское.

И тутъ же стоячы, Юръи Докурновичъ поведилъ, ижъ еще зъ стороны того наместъника довнаровского а Щастного Можейковича похвалъки ся деють на нег(о) и на прыятелей его, которые пры немъ стоять, а так, просилъ о заклад для беспечъности.

Панове, их м(и)л(о)сть, положыли межы ними заклад тры тисячы копъ грошей»[40].

Цяжба Юрыя Хршчановіча з Янам Габрыэлевічам за забойства брата працягвалася і ў наступным годзе, 24.10.1542 г.: «…брата моего Яна Мостъвиловича в томъ именья зостали и его [в руку] застреливъши, поимала а поимавши, его били, моръдовали и што хотечы, то над нимъ чинили, и въ поиман(ь)и его осадивши, держали, и, маючи его у своей моцы, тое именье Омлишово з людьми и со всими маетъностями ку своеи моцы взяли, а его самого, оковавши, с того именья вывезли. И, яко его с то[го] именья везучи, на дорозе до смерти вбили, а въбивши под Краснымъ Селомъ тело его в реку втопили, которое жъ тело пастухи, пасучи животину, нашли тое тело в реце, в лубьи увязано… И Щасный жону Янову Моствиловича з детми с того именья выгналъ, а скриню зъ золотыми и с пенезми, и сребромъ, яко ковши, такъ и с кубками теж, з ложками серебными и зъ святостями, а тлумокъ великий скурасный з шатами, а чотыры скрыни великии з ыншими маетъностями забралъ, которыи жъ скрыни с тымъ со всимъ онъ, у свою моцъ побравъши и с тыхъ скрынь все выбравши, с того именья, на возы побравъши, своими и тамошними коньми выпровадилъ с того именья, и чотыры скрыни до костела Ошъменъского, до Светого Духа, отпровадилъ, што лепъшое выбравши с тыхъ скрынь, и в костеле Светого Духа поставилъ, а лепъшую скрыню со всими скарбы и тлумок великий и зъ шатами, не везучы до Светого Духа, тую скрыню и тлумок до своего дому, до Острозъчич повезъ»[41].

У забойстве Яна Андрэевіча быў абвінавачаны Шчасны Мажэйкавіч: «За которое вбо*и*ство, кгды де*и* в казнь былъ осажонъ, онъ де*и*стое казни втекъшы, побегъ былъ на Москву и на границы былъ по*и*манъ, а потомъ за то за все го*р*лом скаранъ»[42].

Пасля смерці Яна Андрэевіча Станіславу Струсу прысудзілі 25.05.1543 г. тры службы людзей у маёнтку Крэўскае. Па рашэнні паноў рады Васіль Хоміч увёў у валоданне Станіслава Струса ў службу людзей Яна Маствіловіча пад Ашменаю ў 33 капы грошаў, у Яна Мітковіча ў 10 коп грошаў, у 23 капы грошаў увязаў у дворныя пашні, у палову маёмасці Маствіловіча, у палі – на 50 бочак, у сенажаці – на 30 вазоў сена і ў палову гаю[43].

Жонка – З а ф е я, у першым шлюбе за Янам Нарушэвічам, ад яго сын Станіслаў Янавіч Нарушэвіч, зямянін (баярын) гаспадарскі Віленскага павета. Памерла паміж 15.01.1541 г. і 16.03.1541 г. Пасля смерці айчыма Яна Андрэевіча Маствіловіча і маці непаўналетні Станіслаў Янавіч Нарушэвіч 16.03.1541 г. быў выкліканы ў суд Станіславам Струсам і яго жонкай Альжбетай Маствілаўнай за насланне на іх двор слуг, якія збілі і абрабавалі Струсаў: «Я тепер недавно отъ кольконадцати недель г(о)с(по)д(а)ремъ домовымъ зосталъ. Держали именье мое по жывоте отца моего отчымъ мой Янъ Анъдреевичъ Моствиловичъ з матъкою моею через колькос летъ, нижли тых часовъ недавно, яко отъчима моего, а потомъ и матъки в жывоте не стало, я на именьи моемъ зосталъ, а такъ, не ведаю, што ся будеть деяло тамъ за отца або за отчима моего»[44].

Станіслаў Янавіч Нарушэвіч узяў у жонкі ўдаву Яна Габрыэлевіча Маствіла Ганну Кандратаўну. 06.05.1561 г. разам з ёй быў выкліканы ў суд зводным братам Андрэем Янавічам Маствілам за захоп маёмасці айчыма Станіслава – Яна Андрэевіча Маствілы[45].

22/13 **Ян (Іван) Габрыэлевіч Маствіловіч (Маствіла),** гаспадарскі баярын (зямянін) Віленскага павета. 24.10.1542 г. быў выкліканы ў суд Юрыем Дакурнам за напад на дом яго брата Яна Андрэевіча Маствіловіча, яго забойства і рабаванне маёмасці: «Под лет(о) Бож(его) нарож(енья) 1542, м(е)с(я)ца ок(тября) 24 ден(ь), индикт 1. Смотрели есмо того дела, стояли перед нами очевисто, жаловал нам Юрей Докурно на Яна Кгабрияловича Моствиловича в тот обычай: “Наехавши он на дом брата моег(о) Яна Андреевича Моствиловича с помочники своими, его самог(о) забил и в воду втопил, и всю маетност(ь) его розобрал, о чом же есми первей сего жаловал г(о)с(по)д(а)ру королю, ег(о) м(и)л(о)сти”. И покладалъ листы короля, ег(о) м(и)л(о)сти, в которых его м(и)л(о)сть писати рачил до дворенина его м(и)л(о)сти Щасног(о) Можейковича на жалобу Яновое Мостьвиловое, пани Зофеи, о том што его м(и)л(о)сть послати рачил децъкимъ по мужа ее Яна Мостъвила, и он, не ставячи его перед его м(и)л(о)стью, змовивши ся з Яномъ Кгабрияловичом, его забили и въ воду втопили, и всю маетьность его забрали, што меновите в томъ листе описано. В томъ же листе пишеть его м(и)л(о)сть, приказуючи, абы перед его м(и)л(о)стью стал и о томъ отказал, а естлы бы стати и о то отказати не хотел, казал его м(и)л(о)сть дворанину своему Михайлу Кузмичу, вземъши его за горло, перед собою поставити. А въ другомъ листе его м(и)л(о)сть, г(о)с(по)д(а)ръ, до всихъ кн(я)зей и пановъ писати рачил, в кого бы тот дворенин Михайло Козмичъ зосталъ того Щасного, абы ему его выдали, ничимъ не гамуючи от Яна Кгабрыяловича. Жона его Ганъна, на жалобу отпираючи, мовила: “В листе короля, ег(о) м(и)л(о)сти, описано, иж тот Щасный, будучи децкимъ по нег(о) посланымъ, ег(о) забил, которого он, поимавши до везенья осадити далъ, а потомъ, снать зъгодивши ся с ним, з везенья его выпустил, а теперъ на мужа моего жалуеть”. Докурно поведил: “Того децъкого тот дваранинъ королевъский Михайло, поимавши, до замку г(о)с(по)д(а)ръского в казнь дал, а Яна в тот час поимати не могли, але предся его искано и кгды его поймано, тот Щасный звезенья втекъ”.

Сторона противъная, отпираючи мовила: “Первей на децъкого того доходил, а кгды децкого впустил, на мне ищеть”. Юрей Докурно мовил: “Тот децъкий не з моее казни, але зъ замку г(о)с(по)д(а)ръского тутошнего втекъ”. И покладал, на писме менечи, судовый листъ безъ печатей и безъ подписанья руки писаръское, который такъ ся в собе маеть: “З росказанья г(о)с(по)д(а)ра короля, его м(и)л(о)сти, смотрели есмо того дела, жаловал намъ Юрей Хръщоно-

вичъ на Яна Кгабрыяловича тымъ обычаемъ, ижъ: "Он зъ Щаснымъ Можейковичомъ и з ынъшими многими помочъники своими, приехавши моцъно кгвалтомъ на именье брата моего Яна Мостъвиловича, на Ошъменъское, его самого в том имены не знашли, нижли жону его, невестку мою, в томъ имены зостали. И которую жону его, невестку мою, з детми с того именья они выгнали, а тое именье з людьми и со всим на все ку своеи моцы взяли, маетьности его в томъ имены, яко золото, такъ п(е)н(е)зи, сребро, шаты, челед(ь), кони, быдло и иншии многии маетьности, што-колвекъ в том имены было, то все ку своеи моцы забрали. А потомъ онъ с того именья Ошъменъского с тымъ же Щаснымъ Можейковичомъ до другого именья брата моего, да Усы, ехал и, приехавши до того именья, такъжо моцъно кгвалтомъ, и брата моег(о) Яна Мостъвиловича и в томъ имены не знашли. А тое именье со всими людьми и тежъ со всими маетъностями, што-колвекъ у клетехъ, у свинехъ схованья было, они позабирали, ку тому тежъ челядь и кони, и быдло ку своей моцы побрали и, бывъши в томъ имены, на Усе, и взявши тое именье ку своеи моцы, и ехалъ с тымъ же Щаснымъ Можейковичомъ а з намесникомъ пана виленъског(о) дайнаровскимъ, з Васкомъ Чорънымъ, и с помочники своими до третего именья того жъ брата моего, до Омълишова. До которого ж именья моцъно кгвалтомъ приехавъши, того брата моего Яна Мостъвиловича в томъ именья зостали и его [в руку] застреливъши, поимала а поимавши, его били, моръдовали и што хотечы, то над нимъ чинили, и въ поиман(ь)и его осадивши, держали, и, маючи его у своей моцы, тое именье Омлишово з людьми и со всими маетъностями ку своеи моцы взяли, а его самого, оковавши, с того именья вывезли. И, яко его с то[го] именья везучи, на дорозе до смерти вбили, а въбивши под Краснымъ Селомъ тело его в реку втопили, которое жъ тело пастухи, пасучи животину, нашли тое тело в реце, в лубьи увязано. Ино, едучи дворанину г(о)с(по)д(а)ръскому Федору Котну, трафило ся ку тому часу до тыхъ пастухов приехати, они ему тое тело в реце сказали. И онъ, доведавъши ся о томъ утопленомъ теле, ехавъши до Красного Села, то людемъ обьявилъ и, собравши ся з людьми красносельскими, тое тело з реки, у лубку вязаное, вынели и на сохах положили. Потомъ жона его, моя невестъка, и я доведали ся есмо о томъ и, доведавши ся, послали есмо по тое тело каплана биютишского, кн(я)зя Станислава, а з нимъ людей добрыхъ сторонъныхъ. И тот капланъ с тыми людьми добрыми тое тело знашли, которое жъ тело тут до Вильни в замокъ привожно и г(о)с(по)д(а)ру королю, его м(и)л(о)сти, оповедано. А тое именье Омлишово тогды жъ, коли его небожъчика с того именья вывезли, наместникъ пана виленъского дойнаровский ку своеи моцы взялъ и теперъ дерѫжить, нетъ ведома которымъ обычаемъ". И Ян Кгабрыяловичъ ему на то очевисте отповедал: "В которыхъ именьяхъ дядковыхъ мне от небожъчика Яна Мостьвиловича крывда была, я на него позвы г(о)с(по)д(а)ръскии брал, и он за позвы не стал, и г(о)с(по)д(а)ръ, его м(и)л(о)сть, мне на него Щасного Можейковича децъкимъ дал. Тот децъкий в ыймены Ошмене былъ и его в томъ имены не знашол, и, приехавъши до г(о)с(по)д(а)ра, поведил, ижъ онъ не хочеть стати, а я просил у г(о)с(по)д(а)ра ку тому децъкому собе на не[го] помочи. Его м(и)л(о)сть мне к тому децкому Щасному двадцатеро коней татаръ на помочъ рачылъ казати дати, с которыми жъ татары ехали есмо до именья его Ошъменъского. И кгды есмо тамъ до того именья приехали, ег(о) есмо в томъ именья не знашли, лечъ в нем жону его зостали. И Щасный жону Янову Мостьвиловича з детми с того именья выгналъ, а скриню зъ золотыми и с пенезми, и сребромъ, яко ковши, такъ и с кубками теж, з ложками серебными и зъ святостями, а тлумокъ великий скурасный з шатами, а чотыры скрыни великии

з ыншими маетьностями забралъ, которыи жъ скрыни с тымъ со всимъ онъ, у свою моцъ побравъшии с тыхъ скрынь все выбравши, с того именья, на возы побравъши, своими и тамошними коньми выпровадилъ с того именья, и чотыры скрыни до костела Ошъменъского, до Светого Духа, отпровадилъ, што лепъшое выбравши с тыхъ скрынь, и в костеле Светого Духа поставилъ, а лепъшую скрыню со всими скарбы и тлумок великий и зъ шатами, не везучы до Светого Духа, тую скрыню и тлумок до своего дому, до Острозъчич повезъ. И коли онъ тую скрыню везъ, а з нимъ и татарове вси в тот час были при немъ и, не доежъдчаючи намъ Лавского Броду от Словенъска в мили, он поехалъ на Лавски Брод до своего дому, а мне с татары сказал ехати до Воложина. Ино тот старший, который былъ над тыми татары, не хотелъ безъ него до Воложина ехати, ижъ имъ было нельзя безъ него его поимати, а однако жъ ехали есмо подле его науки к Воложыну. Приехавъши намъ къ Воложыну, тамъ же у Воложине есмо носовали, а назавътрее прислал Щасный Можейкович до насъ ч(е)л(о)в(е)ка и велелъ намъ ехати до именья своего, до Усы, которое Янъ Моствиловичъ держалъ ажъ до смерти. Я с тыми татары ехал до Усы. И Можейковичъ поткалъ нас на дорозе, и приехали есмо з нимъ весполокъ до того именья, до Усы, ино в том [и]меньи Яна Моствиловича есмо не знашли. И тот Можеиковичъ мене в тое именье, у-в Усу, со всимъ на все увезалъ и въ моцъ мне подал, и татаръ всихъ с того жъ именья, з Усы, назад до Вил(ь)ни отпустил. А такъ, татаръ отпустивши, мене съ собою оземъши, до своего дому споломъ со мною ехал ажъ до дому. Он со мною до пана виленъского тут до Вил(ь)ни приехавши, тое именье Омълишово у полторусту копахъ грошей п(а)ну виленъскому заставили: сто копъ грошей есмо взяли готовыхъ, а два кони есмо взяли в пятидесятъ копахъ грошей: валаха съ седломъ у трыдцати копахъ, а громака у двадцати копахъ. Побравши, ижъ есмо тыи п(е)н(е)зи и кони, з Вильни поехали до Олмишова. Тамъ же з Вил(ь)ни приехавши, в томъ именьи, в Омлешове, Яна Моствиловича застали есмо, а было на всихъ в тот час трыдцать коней, а яко есмо на дворъ въехали, Янъ Моствиловичъ вышол на дворъ хотечи ся доведати, хто есть. И Щасного Можейковича слуга Яна Моствиловича в тот час з лука в руку застрелил, а Щасный Можейковичъ, к нему прискочивши, и з Васкомъ Чорънымъ его поимали, и св(я)тость з мощъми, и сыгнетъ золотый с него сняли, яко з него тое зняли, в тот же час в ланъцухъ и въ пута его оковали и въклети его в поиманьи держали и назавтрее мне св(я)тость и сыгнетъ дали, а я ему валаха за трыдцать копъ грошей противку того дал Щасному Можейковичу. А знашли есмо в том именьи Омлишовскомъ свирепъ осмъдесеть а коня его кожубу. Мне свирепъ достало пятънадцать, а жеребятъ пятеро – то усихъ мне достало ся двадцать, а инъшии свирепы Щасный собе побралъ з Васкомъ Чорнымъ, а иныи свирепы они жъ кому хотели роздали, а тое именье Омлишово намесникъ пана виленъского дойнаровский Васко Чорны со всимъ на все, што было в томъ дворе, ку своеи моцы взялъ на пана виленского. Яна Моствиловича, окованного водивши, с того имен(ь)я з собою до своего дому припровадилъ, до Острозчичъ. Щастный Можейковичъ, у-в Острожъчичахъ ночъ ночовавши, попровадили его до Вил(ь)ни, нижли едучы дал ми ключъ от тыхъ железъ, у которыхъ Моствиловичъ былъ окованъ. Ино на перъвом ночлезе, не доежъдчаючи Красного Села у полмили, я спати лег, а навътрее, свитаючи, слуга Можейковича Матеймене обудилъ и мне адведилъ: "Братъ твой Янъ Моствилович втекъ". И я хвачу ся до ключов, ажъ ключов при мне нетъ, и я того слуги спытал: "А Щасны где?" И онъ мне поведилъ: "Побегъ мои панъ тогды жъ за нимъ в погоню, а тобе, дей, казал ехати до дому, а, едучи, казал тобе заповедати людемъ и закликати в Крессе на месте, кому бы ся пригодило, абы

его поимано было". Я, едучи до Усы, у Креве о томъ людемъ заповедал и на месте в Креве закликалъ, коли жъ мне приехавши до Усы, Можейкович Щасный третего дня до мене прислал, кажучи мне до Вильни ехати: "И я, дей, тамъ же у Вил(ь)ни буду". И поехал до Вил(ь)ни. И едучы ми до Вильни, поткалъ мя сын Можейковича Миколай и мовилъ мне от него тыми словы: "Вжо мой отецъ зъедналъ ся з Мотвилович(ом), а ты зъеждчай проч чимъ наборъздей, а естли не зъедешъ, исте от него живъ не будешъ". И я, боячи се того, втекъ есми был до Мазовши, а потом есми оттол з Мазовъши тут до Литвы, до жоны моее, был пришол, ино мя панъ Юрей Хрщонович, братъ Янов Мотвиловича, под Воложыномъ на дорозе поималъ и тут до Вильни, привезъши, и до казни г(о)с(по)д(а)ръское дал". И пытали есмо Яна Кгабрыяловича, чи мелъ онъ што до того именья, до Омълишова. Он перед нами поведил, же: "Я до Омлишова не мелемъ жадног(о) вступу, ани жадного презыску, але Щасный Можейковичъ тое именье пану виленъскому запродалъ". А потомъ есмо пытали о другое именье – о Сую, которымъ обычаемъ его жона держить тое именье Мотвилово, естли его вся Уса. Онъ поведилъ, ижъ: "Я маю тамъ половицу Усы по отцы моемъ, десеть ч(е)л(о)в(е)ковъ, а Мотвило держить по брате своимъ – Миколай другую половицу, и на тои же части записалемъ вено жоне своей, третюю часть, а в Мотвилову ся часть не вступалъ. Жона моя ведаеть ли, в который обычай уступила в тую часть Мостьвилову, бо, коли жону свою поималъ, тогды ми мели за нею дати сто копъ грошей, а я был есми записалъ тое вено, а такъ мне от нихъ не дали ничого, што па ней обецали. А што ся дотычеть Воложыны и Ошъмяны, тои на Мотвиловича, а ямъ до него ничого не мелъ". И мы, тог(о) выслухавши, казали записати. А при том были и того дела смотрели: панъ Шимко, тивунъ виленский, а кн(я)зь Семенъ Одинъцевичъ, а панъ Воитехъ Юнъдилъ, державца волькиницъкий и лепунъский, а панъ Кграба, подкоморый сирадски, а панъ Роски".

И в тот час, будучи при нас, кн(я)зь Семенъ и панъ тивунъ поведили, ижъ ся тая реч перед нами такъ точила. Мы, бачечы, ижъ Янъ Кгабрыяловичъ на онъ часъ сознал, што не одинъ самъ на домъ его наежъдчал, але с тымъ дворанинимъ г(о)с(по)д(а)ръскимъ Щаснымъ Можейковичомъ а з наместникомъ пана виленъского Васкомъ Чорным, пытали есмо Докурна, если бы тыхъ вызвалял, а на немъ одномъ того доходил. Онъ поведил, ижъ: "Тыхъ с того не вызволяю, бо тот вчинокъ тыи товарыши его з нимъ весполокъ чинили".

И мы, тому порозумевъши, кгды жъ онъ того Щасного и намесника пана виленъского с того не вызволяеть, але на всих их того доходить, казали есмо всих ихъ весполокъ правомъ ужывати и рокъ есмо ему зложили на новое лето. Маеть того дворанина Щасного а намесника пана виленъского, притягнувши ку праву, и всихъ трехъ ихъ мають о то правомъ ужывати, а до того часу Мостврила за паруку казали есмо дати. Тут жо стояли перед нами, Докурно просилъ, абыхмо заруку межи них вчинили, бо, дей, "ми отповедаеть, хотечы мя о горло приправити". Мы очевисто Яну приказали, абы словомъ ему шкодливымъ, ани рукою на него не сегал и во всемъ ся к нему спокоине заховалъ до того часу, поки ся того справить, в чом обвиненъ. А естли бы то на него переведено, ажъбы на него рукою або словомъ ему шкодливымъ торъгнул ся в томъ часе, поки ся того не справить, маеть каран быти горъломъ.

Писан у Вильни»[46].

01.05.1548 г. Ян Габрыэлевіч Маствіловіч атрымаў з суда Віленскага ваяводства дзве позвы: першай позвай быў выкліканы ў суд Мікалаем Петрушкевічам, койданаўскім баярынам, віленскай ваяводзінай, канцлеравай ВКЛ Гаштолтавай па абвінавачванні ў

валоданні пасля смерці свайго дзядзькі Мікалая і яго жонкі маёнткамі на Усе, у Валожыне, на Саланой і ў Ашмене. У другой позве гаварылася, што Ян Габрыэлевіч абяцаў «дати право на люде*и* своихъ людемъ панее его», а калі Мікалай Петрушкевіч прыехаў да Мастваловіча, той «его самого збилъ и зранилъ...». Было прызначана паўторнае пасяджэнне суда, але Петрушкевіч на суд не з'явіўся і ўпаўнаважаную асобу ад сябе не прыслаў[47].

Ян Габрыэлевіч разам з жонкай Ганнай падаў (?)14.10.1551 г. скаргу ў суд на баярына гаспадарскага Віленскага павета Станіслава Струса: «Ты не*т* ведома в которы*и* обыча*и* дворецъ мо*и* Ошменъски*и*, которы*и* на мене з делу о*т* дя*д*ка моего Миколая Моствила прышолъ, де*р*жышъ, а мне его, яко властности моее поступити не хочешъ...»[48] Станіслаў Струс ужо каля дзевяці гадоў валодаў адной службай людзей у маёнтку Ашменскім, і Ян Габрыэлевіч «никгды о то ему не припомина*л*». Ян Габрыэлевіч заявіў, што дзесяць гадоў таму Шчасны Мажэйкавіч аддзяліў яму і яго жонцы ад Яна Мастваловіча частку маёнтка Ашменскага. А Струс «тому листу веры не довалъ, мовячы, ижъ тотъ Щасны*и* оного Моствила забилъ». Суд вынес рашэнне Станіслава Струса ўвязаць у тры службы маёнтка Крэўскага і ў адну службу маёнтка Ашменскага, а Яну Габрыэлевічу неабходна дачакацца паўналецця дзяцей Яна Мастваловіча і тады ў судзе вырашаць з імі пытанне пра валоданне маёмасцю нябожчыка Мікалая Мастваловіча[49].

14.04.1554 г. падаў скаргу ў суд Віленскага ваяводства ад імя сястры Ганны Янаўны Маствілоўны на зямяніна гаспадарскага Анфора Пятровіча за тое, што ён не прыняў перад урадам суму грошай, якія яна павінна была за заклад двух палацаў Ускага і Салоннага, і палацаў не вярнуў[50].

11.07.1554 г. Ян Габрыэлевіч падаў скаргу на зямяніна Віленскага павета Балтрамея Томкавіча Лодвіка за захоп палаца Ашменскага Мастваілаўскага, вырубку саду (яблынь, ігруш і вішань) і пакос сенажацей на працягу 7 гадоў. Балтрамей Лодвік у апраўданне сказаў, што палац яму аддалі ў заклад баяры гаспадарскія Станіслаў Струс з жонкай Альжбетай Маствілоўнай і Мікалай Лянкевіч[51].

04.12.1554 г. падарыў жонцы Ганне Кандратовіч 400 коп грошаў, забяспечаных дзвюма часткамі маёнтка Уса, а таксама 1/3 частку маёнтка Уса, нявольную чэлядзь і табун коней (актыкацыя 06.12.1554 г. у кнізе суда Віленскага ваяводства)[52].

Жонка – Ганна Мацвееўна Кандратаўна (?) Петрашкоўна, баярыня Віленскага павета, дачка Мацвея Юр'евіча Кандратовіча (?) Петрашковіча[53]. 15.03.1541 г. была выклікана ў суд баярынам Віленскага павета Юрыем Хршчановічам Дакурнам: «Смотрели того: кн(я)з(ь) Венцлав, бис(куп) жомойть(ский), п(а)н Ян Юр(евич) Глеб(ович), воев(ода) полоц(кий), п(а)н Матей Войтехов(ич) [Яновича], воев(ода) витеб(ский), п(а)н Шымъко Мац(кович), тив(ун) и гор(одничий) виленъский.

Стояли у праве очевисто, жаловалъ боярынъ повету Виленъског(о) Юръи Хрщоновичъ Докурновича на боярыню Виленъского жъ повету Яновую Кгабрыяловича Мостъвиловича Анъну Матеевну Конъдратовича в тотъ обычай: "Кгды жъ мужъ тое Анъны Янъ Кгабрыяловичъ замордовалъ дядковича своего Яна Анъдреевича Моствиловича и кгды потомъ и жоны того Яна Анъдреевича в жывоте не стало, ино г(о)с(по)д(а)ръ, его м(и)л(о)сть, дети и именья того Яна Анъдреевича мне в опеку далъ, и кгды мя в ыймен(ь)я тые з росказанья г(о)с(по)д(а)ръского увязано, ино Анъна тая у одно имен(ь)ей тыхъ, на ймя в Усу, моцно кгвалътомъ ся увязала и шкоды тамъ починила". На то Яновая Кгабрыяловича Анъна поведила: "Мужъ мой Янъ Кгабрыяловичъ перъвей

сего от чотырох летъ вено мне на томъ именьи своемъ на Усе оправилъ, третюю часть именья того записалъ ми навечность, а две части того жъ именья – у двухсотъ копах грошей, што по мне посагу взялъ, я затымъ в держаньи есми именья того", – и положыла на то запис мужа своего, писанъ перъво сего от чотырох летъ, а, к тому, положыла листъ воеводы виленъского, небощыка пана Олбрахтов Кгаштольтов, в которомъ панъ воевода на жалобу Яновое тое Анъны Матеевны пишеть, абы вжо в мужа ее Яна Кгабрыяловича людей Ани земль именья оного Усы, ей у вене и внесеньи ее записанного, не куповалъ и не закуповал нихто. Юри поведилъ, ижъ Янъ Кгабрыяловичъ, мужъ тое Анъны, именье оное свое Усу променялъ небощыку Яну Анъдреевичу, дядковичу своему, взялъ в него отъмену у Воложыне. Анъна к тому ся не знала. Юръи поведилъ, ижъ листы, которые на то были меновные, побраны посполу з ынъшыми речами Яновыми Анъдреевича, кгды его забито, нижли покладалъ листы г(о)с(по)д(а)ръские увящые: одинъ, што по смерти Яна Анъдреевича жоне его, а другий, што по смерти жоны его брату его стрыечному тому Юрю Хрщоновичу по блискости, водлугъ поведан(ь)я его, яко опекуну, казалъ г(о)с(по)д(а)ръ, его м(и)л(о)сть, увязанье дати в ыйменья небощыка оного Яна Анъдреевича. А пры томъ, и увящого Юръи тотъ ставилъ, дворанина г(о)с(по)д(а)ръского Михайла Кузмича, который сознавалъ: "Ижъ, кгды увязывалъ Юря у Усу, зосталъ именье оное Усу в держаньи Яновое Моствиловича, але, дей, она вжо по смерти Яна Анъдреевича уехала в ыймен(ь)е оное, такъ, дей, есми слышалъ". А доводу на то сторона – Юри Докурновичъ – не чынилъ никоторого, нижли мовилъ: "Ижъ Яновая тая Кгабрыяловича не можеть одержати, водлугъ права, вена на именьи мужа того своего, бо, дей, она не есть права отъ злочынъства мужа того своего, которое онъ вчинилъ над дядковичомъ своимъ, онымъ небощыкомъ Яном Анъдреевичомъ, ижъ его замордовалъ и статокъ его забрал, которого жъ статъку его найдено, дей, у тое Анъны: сыгнетъ небощыка Яновъ и инъшые некоторые речы". Яновая Кгабрыяловича к тому мовила, ижъ хочеть ся того справити, естъли о то позвана ку праву будеть, а теперь, дей, о то не позвана, и просила, абы захована пры вене своем, водлугъ запису мужа своего, который ся листомъ врадовым воеводинымъ подпираеть.

Панове, их м(и)л(о)сть, выслухавшы ихъ в томъ з обу сторонъ, отложыли то до г(о)с(по)д(а)ра, его м(и)л(о)сти. И кгды поведили то его м(и)л(о)сти, ино его м(и)л(о)сть г(о)с(по)д(а)ръ, порозумевшы тому, кгды жъ тая Яновая Кгабрыяловича Анъна маеть вено, отъ мужа своего на именьи его записано перъвей, нижли ся онъ выступу того над дядковичомъ тымъ своимъ допустилъ, а кгды жъ на мену за тое именье доводу сторона поводовая Юри не чынил, прото его м(и)л(о)сть г(о)с(по)д(а)ръ Яновую тую Кгабрыяловича Анъну пры оправе ее той веновной, то естъ пры именьи ономъ Усе, водлугъ запису мужа ее, зоставити рачылъ. Нижли, што ся дотычеть того, ижъ найдено, дей, у нее сыгнетъ и инъшые некоторые речы забитого оного Яна Анъдреевича, о том вольно будеть мовити с нею тому, кому, водлугъ права, прыслушаеть, прыпознавшы ее к тому, водлугъ обычая права.

Панове, их м(и)л(о)сть, казали то записати, ижъ г(о)с(по)д(а)ръ, его м(и)л(о)сть, тыми часы послалъ пана Яна Хрщоновича на служъбу свою, на замъки украинъные, на Браславль а на Веницу, а такъ, которые роки ку праву отъ когокольвекъ пану Яну або отъ него кому зложоны были, тые вси роки и позвы казалъ его м(и)л(о)сть

г(о)с(по)д(а)ръ завесити и отложыти до тог(о) часу, ажъ зъ служъбы оное его м(и)л(о)сти г(о)с(по)д(а)ръское панъ Янъ зъездит(ь), и тогды за тыми жъ позвы оные позванные мають пану Яну в отказе бытии, кгды к тому прыпозваны будуть»[54].

25.10.1542 г. Янавая Габрыэлевіча скардзілася на гродзенскага габрэя Ілью, які будучы ў зняволенні ў Віленскім палацы разам з яе мужам Янам Габрыэлевічам, запатрабаваў вярнуць доўг, а сам, «лист чести» затаіўшы, «безъвинне ее зби*л*»: «Муж мой Ян, седечы в замъку с нимъ восполокъ, описалъ ся ему некоторую суму п(е)н(е)зей, я, хотечы его еднати за тые п(е)н(е)зи, пришла в замокъ и просила, абы листъ чести казалъ, который мужъ мой ему на себе дал, онъ дьяку лист чести казалъ. И кгды дьякъ листъ вычолъ, онъ, выръвавши листъ, и далъ сыну кн(я)зя Анъдрея Озерицъког(о), который на тот час в замъку у везеньи естъ, а мене взялъ за груди, а жона – за руку и почалъ мя бити по виденью, олижъ мя люди добрыи отретовали…»[55]

На наступны дзень, 26.10.1542 г., скардзілася на Юрыя Дакурновіча: «Панове рада присудили и сказали ему по*л*четверътa*д*цать свирепъ ста*д*ныхъ мне вернути, которые в ы*й*меньи на Усе взя*л*, онъ ми не верънулъ пяти жеребъцо*в* а тре*х* свирепъ»[56].

У 1541–1542 гг. неаднаразова судзілася з Юрыем Хршчановічам Дакурнам за маёнткі Уса і Клецк[57]. У 1542 г. судзілася з дзісенскім намеснікам Яна Хршчановіча Дзешуком «о шкоды»[58].

Гаспадарская зямянка Віленскага павета Янавая Маствілавая Ганна Петрашкоўна прадала службу людзей алгенянскую айрагольскаму гаспадарскаму цівуну Мікалаю Пашушвенскаму за 10 коп грошаў, пра што сведчыць запіс ад 21.01.1553 г. у актавай кнізе Віленскага ваяводства[59]. Сваёй дачцэ Гелене Маствілоўне і яе мужу Шчаснаму Каткоўскаму 08.02.1554 г. падарыла службу людзей каля Хмельніцкай пушчы[60]. Купіла 30.05.1556 г. у пляменніцы мужа Ганны Янаўны Маствілоўны тры пусткі і сенажаць сваёй часткі маёнтка на Саланой – Грыцалёўшчыну і Кротаўшчыну ў Старынах і Карасцелеўшчыну на Вазнікоўцы за 15 коп грошаў (актыкацыя 02.06.1556 г. у судзе Віленскага ваяводства)[61].

Пасля смерці Яна Габрыэлевіча Маствіла выйшла замуж за пасынка Яна Андрэевіча Маствіловіча Станіслава Янавіча Нарушэвіча і разам з ім была выклікана ў суд 06.05.1561 г. яго зводным братам Андрэем Янавічам Маствілам за захоп маёмасці яго айчыма[62].

23/13 **Ганна Маствілоўна,** баярыня гаспадарская Віленскага павета. Разам з мужам выклікалі 01.05.1548 г. у суд Віленскага ваяводства дзвюма позвамі яе брата Яна Габрыэлевіча Маствіловіча па спрэчцы аб праве валодання спадчыннымі па дзядзьку і яго жонцы маёнткамі на Усе, у Валожыне, на Саланой і ў Ашмене, а таксама за збіццё яе мужа. На пасяджэнне суда яе муж не з'явіўся і ўпаўнаважаную асобу ад сябе не прыслаў[63].

10.05.1548 г. была выклікана ў суд па скарзе трабскага намесніка віленскай ваяводзінай, канцлеравай ВКЛ Албрыхтавай Марціновіча Гаштолтавай Зафеі з абвінавачваннем, што яна пасля смерці свайго дзядзькі Мікалая Маствіловіча «хотечи прыити ку именямъ его водле права прирожоного и обачивши то, ижъ безъ накладу своего к тымъ именямъ приити не может, а не маючи за недостатком своимъ на тое право с чого наложити, просила мене, абыхъ еи тыхъ именеи накладомъ своимъ тоеи правомъ довелъ, ижъ она с тое дядковщины своеи именеи Миколоевскихъ на Усе и в Солономъ по половицы якъ у людех, такъ и в пашняхъ, и в сеножатехъ, и в гаехъ, и въвсемъ ровную

часть взяла и не маючи чимъ мне заплатити и накладов моихъ, што я наложилъ, доводячи еи, што права перееднала мене за наклады мои тритцатма и семи копами грошеи, и в тыхъ тридцати и семи копах грошеи поступила мне и в моцъ мою отдала держати до лет от братьи и сюстр своихъ меншихъ частку именя своего Усыского презысканого…». Але ваявода забраў гэтыя часткі маёнткаў у Анфора Пятровіча і перадаў дзецям Мастваіла. Ганна заявіла, што ніякага дазволу на валоданне часткамі маёнткаў Анфору Пятровічу не давала, а заплаціла яму 37 коп грошаў, а дакументы ён разам са сваімі прыяцелямі падрабіў. Было прызначана паўторнае пасяджэнне суда з запрашэннем двух бакоў, а таксама сведкаў[64].

Па просьбе Ганны яе брат Ян Габрыэлевіч падаў 14.04.1554 г. скаргу ў суд Віленскага ваяводства на зямяніна гаспадарскага Анфора Пятровіча за адмову вярнуць аддадзеныя ў заклад два палацы – Ускі і Салонны, нягледзячы на вяртанне Ганнай закладной сумы[65].

Муж – Мікалай Петрушкевіч (Петрашкевіч), койданаўскі баярын.

24/13 **Кацярына.** Згадваецца 18.03.1558 г. у закладным лісце маці Ядвігі Вільдуковіч яе другому мужу Станіславу Багданавічу Карызну на маёнтак Мярэцкае за 150 коп грошаў, якія маці аддала ёй у выправу. Памерла да 1558 г. Мела дачку Ядвігу, якой бабуля Ядвіга Вільдуковіч завяшчала частку маёнтка Мярэцкае[66].

Муж – Мацей Буйвід.

25/14 **Пётр Станіслававіч Маствіл.**

26/14 **Юрый Станіслававіч Маствіл[67].**

27/14 **Мікалай Станіслававіч Маствіл[68].**

28/14 **Іосіф Станіслававіч Маствіл.**

Жонка – Алена Білевічаўна[69].

29/16 **Габрыэль Станіслававіч Маствіл.**

Жонка – Кацярына Мацееўна.

VI КАЛЕНА

30/19 **Адам Крыштафавіч Маствіл[70].**

31/21 **Андрэй Янавіч Маствіл,** зямянін гаспадарскі Навагрудскай зямлі. Запісаў 13.02.1558 г. жонцы маёнтак Менідзікавічы[71]. Судзіўся 21.11.1560 г. са Станіслававай Струсавай Альжбетай Маствілаўнай за службу людзей і землі ў Ашмене: «За росказаньемъ и за позвы пана его м(и)л(о)сти судьи на повет Виленскии от его м(и)л(о)сти высажоные панъ Павел Островицкии хорожии Ошмянскии, а панъ Станислав Гамшеи наместникъ виленскии смотрели того дела. Жаловал земянин г(оспо)д(а)ръскии Андреи Яновичъ Моствило на земянку г(оспо)д(а)ръскую Станиславовую Струсовую Алжбету о том, што жъ она, не ведати за чимъ держаить властную близкость мою в Ошмене службу людеи и немало земли пашныхъ и пол яловых и гаевъ, а мне поступити не хочет. Станиславовая Струсовая на тую жалобу его чинячи отказ поведила: "же я то держу за слушным правомъ" и положила листъ увяжчии небожчика п(а)на Олбрыхта Кгаштолта воеводы виленского под датою року тисеча пятсотъ тридцать семого, в котором пишеть, иж его м(и)л(о)сть за нестаньем ку праву отца Аньдрея Яна Моствила посылать рачил служебника своего Яна Ладыгу, которому велел его м(и)л(о)сть водле позву за кгвалты, бои, кграбежи и за коня не резаного и за три свирипы в тридцати копах у три службы людеи Моствиловыхъ Станислава Труса и жону его увезати, при томъ Струсовая поведила, иж "кгды небожчикъ Янъ Моствило тые люди через увязанье кгвалтовые отнялъ и самъ потомъ врихле умер, мужъ мои небожчикъ мелъ право перед паны радами ихъ м(и)л(о)стью зъ опекуномъ тых детеи небожчика Яна Моствила Юремъ Докурною", чого доводячи положила листъ судовыи ихъ м(и)л(о)сти пановъ рад, то ест небожчика

